Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы

**Аляксей Пяткевіч**

# Людзі культуры з Гродзеншчыны

*Даведнік*

Гродна 2000

УДК 008 (036)
ББК 71 (4 Беи)
П 99

Рэцэнзент: С.А.Габрусевіч, кандыдат філасофскіх навук, прафесар кафедры беларускай культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

Пяткевіч А.М.

Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. — Гродна: ГрДУ, 2000.-356 с.

ISBN 985-417-199-Х.

Даведнік складаецца з артыкулаў-персаналій пра вядомых людзей культуры, якія нарадзіліся на Гродзеншчыне.

Выданне адрасуецца краязнаўцам, работнікам музеяў, бібліятэк, настаўнікам, студэнтам і ўсім, хто цікавіцца культурай гродзенскага рэгіёну.

УДК 008 (036)
ББК 71 (4 Бей)

ISBN 985-417-199-Х.

©А.М.Пяткевіч, 2000

## АД АЎТАРА

Кніга, што прапануецца ўвазе чытача, — першая ў Беларусі спроба рэгіянальнага выдання, якое змяшчае персаналіі пра людзей культуры. У шмат якіх краінах даўно ўжо выпушчаны даведнікі пра самыя лакальныя рэгіёны дзяржавы. Людзі ж павінны ведаць сваіх вядомых землякоў — продкаў і сучаснікаў, якія шмат зрабілі дзеля бацькаўшчыны, дзеля дабра і харaства на зямлі. А ведаць — гэта значыць і цаніць, і шанаваць, і ганарыцца. Таму выданне мусіць дапамагаць чытачу самаўсведамляцца, належна трактаваць сябе і суродзічаў, будзіць пачуццё годнасці, без якога няма асобы, будзіць, урэшце, пачуццё патрыятызму. Бо агульнанародныя каштоўнасці пачынаюцца з лакальных, мясцовых, нацыянальная культура складаецца з арыгінальных, адметных асаблівасцяў рэгіянальнага жыцця.

Гродзеншчына мае багатыя здабыткі на ніве інтэлектуальна-творчай дзейнасці, валодае і сёння немалым духоўным патэнцыялам як край, што здаўна мяжуе з Захадам, зведвае яго ўплывы і перадае яму свае культурныя каштоўнасці. Жыццё на этнічным і канфесійным сумежжы сфармавала тут спецыфічны менталітэт заходніка, блізкага, з аднаго боку, да народнай духоўнай традыцыі, прагнага, з другога боку, да ведаў, да ўсякіх навацый, здольнага ўспрымаць і творча спажываць самыя розныя ідэі, расці да вышынь навукі, мастацтва, культурнай чыннасці. Праўда, сыны і дочкі гэтай зямлі служылі часцей культуры іншых народаў і краін, але так ужо склаўся гістарычны лёс рэгіёну. І хоць многія з іх, інтэлігентаў-землякоў, далёка адышліся ад роднага Прынёмання, духоўна яны застаюцца часцінаю зямлі, на якой узраслі, часцінаю спадчыны нашага краю.

Збіранне і рэгістраванне постацяў культуры — справа складаная, якая патрабуе вялікіх калектыўных намаганняў. Таму аўтар вымушаны быў абмежавацца ў адборы матэрыялу. І ў даведнік увайшлі толькі тыя людзі культуры, якія нарадзіліся на Гродзеншчыне. Яе адміністрацыйныя межы гістарычна змяняліся, і рамкі рэгіёну супадаюць у выданні з тэрыторыяй сучаснай Гродзенскай вобласці. Дзеля звужэння аб'ёму працы давялося разглядаць людзей толькі гуманітарных кірункаў дзейнасці і, такім чынам, пакінуць убаку носьбітаў прыродазнаўча-тэхнічных спецыяльнасцяў: аднаму чалавеку проста не пад сілу ахапіць постаці з усяго абсягу культуры.

У даведніку прадстаўляюцца асобы, якія пакінулі прыкметны след у культуры краю, культуры Беларусі і свету. Напрыклад, педагогі, якія шмат друкуюцца, стварылі музеі, маюць ганаровыя званні, навукоўцы, у якіх ёсць вучоныя ступені, многа спецыяльных публі-

кацый, таксама культурныя дзеячы, літаратары, людзі мастацтва, краязнаўцы, духоўнікі, якія многа працавалі на ніве асветы і выхавання людзей. Іх лёс, творчая дзейнасць не аналізуюцца і не ацэньваюцца, а толькі канстатуюцца, бо даведнік — інфармацыйнае выданне, якое дае чытачу толькі фактычны матэрыял. У кнігу не ўвайшлі асобы, чыё месца нараджэння дакладна не высветлена. Даты жыцця прыводзяцца паводле новага стылю. Месца выдання кніг на абазначаецца, калі яны выходзілі ў Мінску. Не фіксуецца і мова выданняў, калі яна адпаведная дзяржаўнаму статусу рэгіёну (скажам, беларуская ў Беларусі, польская ў Польшчы).

Аўтар усведамляе, што сабраныя ім постаці зусім не вычэрпваюць той вялікай колькасці творчых асоб з тэрыторыі Гродзеншчыны, што плённа працавалі ці працуюць зараз на культурнай дзялянцы жыцця. Таму, магчыма, вернецца да гэтага матэрыялу, каб падрыхтаваць новае, больш поўнае выданне, калі будзе ў гэтым грамадская патрэба.

Самыя шчырыя словы ўдзячнасці — краязнаўцам, якія дапамагалі аўтару парадамі, фактычнымі звесткамі, — Уладзіміру Урбановічу, Алесю Белакозу, Сямёну Палубінскаму, Сяргею Чыгрыну, Аляксандру Каранеўскаму, Святлане Кошур, Пятру Марціноўскаму, Янку Трацяку, Мечыславу Яцкевічу, Міхасю Мельніку, Міколу Нікалаеву, Але Снітцы, Міколу Гайбу, Яўгену Лосеву.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы наяўных даведачных выданняў.

*Прафесар А.Пяткевіч.*

**Аблажэй Алег** (6.05.1954, в. Лезнявічы Дзятлаўскага р-на), беларускі і літоўскі мастак (жывапісец, графік). З сялянскай сям'і. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута (1977). Служыў у войску (1977-79). Вучыўся ў Вільнюскім мастацкім інстытуце (1980-85) па спецыяльнасці "графіка". Працуе як ілюстратар кніг мастацкай літаратуры. Сярод іх: "Гуканне вясны" В. Жуковіча, "Гараднiца" Д. Бічэль-Загнетавай, выдадзеныя ў Мінску, "Шведскія казкі" Э. Хэмінгуэя, зборнік "Сербская паэзія", выдадзеныя ў Маскве, "Казка пра Султана", выдадзеная ў Вільнюсе. Выдаў у Польшчы зборнік сваіх літаратурных твораў "Сем казак пра каралеўнаў" (1997), аформлены ім самім. З'яўляецца мастацкім рэдактарам газеты "Рунь". Афармляе дзіцячы часопіс "Лола". Аўтар партрэтаў грамадскіх і культурных дзеячаў Літвы, пейзажаў, серый карцін, у якіх увасоблены вобразы жанчын. Удзельнічаў у выставах у Літве, Латвіі, Эстоніі, Беларусі, Польшчы, Германіі. Сябра рады Таварыства беларускай культуры ў Літве, суполкі мастакоў краін Балтыі "Маю гонар".

**Абрамовіч Зоф'я** (20.11.1948, мяст. Волпа Ваўкавыскага р-на), польскі мовазнавец, педагог. Доктар філалагічных навук габілітаваны (1994). Вучылася ў беларускай школе ў Волпе, дзе скончыла 2 класы. У 1957 сям'я пераехала ў Польшчу. Жылі ў в. Арачы каля Элка. У Арачах скончыла пачатковую школу, у Элку — агульнаадукацыйны ліцэй. Вучылася на філалагічным факультэце Вроцлаўскага універсітэта (1966-71). Працавала ў Інстытуце славістыкі гэтага універсітэта (1971-72). З 1972 — на факультэце г уманітарных навук Беластоцкай філіі Варшаўскага універсітэта (універсітэта ў Беластоку). Вывучае руска-польскія і беларуска-польскія лексічныя сувязі, займаецца анамастыкай на матэрыяле Беласточчыны. Друкуецца з 1973. Сааўтар навукова-дыдактычнага слоўніка "Рускае слова" (Варшава, 1988).

**Абрамовіч Фабіян** (14.09.1884, г. Навагрудак — 1940), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, каталіцкі (уніяцкі) духоўнік, рэлігійны педагог. Доктар філасофіі (1912). Вучыўся ў школе ў Навагрудку. Скончыў каталіцкую духоўную семінарыю (1906) і каталіцкую духоўную акадэмію (1909) у Пецярбургу, дзе актыўна дзейнічаў у беларускім руху. Быў сябрам культурнага таварыства "Асьвета". Вучыўся ў каталіцкім універсітэце ў Лювене. (Бельгія). Выкладаў у Петраградскай каталіцкай духоўнай акадэміі (1914-18). Узначальваў у Петраградзе групу выдаўцоў каталіцкай газеты "Сьветач" (1916). Адзін з арганізатараў І-га з'езду беларускага каталіцкага духавенства (май

1917), на з'ездзе выступіў з дакладам пра ролю асветы ў нацыянальна-рэлігійным адраджэнні. Адзін з арганізатараў партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" (май 1917). Быў рэктарам каталіцкай духоўнай семінарыі ў Мінску (1918-20). У сакавіку 1920 — сябра дэлегацыі БНР на беларуска-польскай мірнай канферэнцыі. У 1920 з семінарыяй перабіраецца ў Навагрудак. З 1921 — у Пінску, тут ён — пралат мясцовай капітулы, рэктар, пасля выкладчык духоўнай семінарыі. Удзельнік з'езду беларускага каталіцкага духавенства ў Вільні (1921). З 1926 — у Друйскім кляштары Марыянаў (у гімназіі пры кляштары выкладае рэлігію і гісторыю, тут пісаў гісторыю царквы ў Беларусі). У 1928-38 — у Харбіне (Кітай), куды прызначаны кіраўніком грэка-каталіцкай епархіі рускай эміграцыі. Стварыў тут гімназію, выдаваў у 1932-38 часопіс "Католический вестник". У 1938 выехаў у Рым з справаздачаю. У 1939 заехаў у Навагрудак. Ад савецкіх войскаў уцёк у Львоў. Тут рэпрэсаваны Саветамі і закатаваны. Быў ідэолагам беларускага нацыянальнага адраджэння, прыхільнікам беларусізацыі касцёла. Выдаў у Вільні "філасофска-грамадскія нарысы" "Бог" (1928) і "Чалавек" (1929).

**Агурскі Самуіл Хаімавіч** (29.04.1884, г. Гродна — 19.08.1947), беларускі і яўрэйскі гісторык. Доктар гістарычных навук (1934). Член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі (1936). З сям'і рабочага. Быў чарнарабочым. Веды набываў самаадукацыяй. Удзельнік рэвалюцыйных падзей 1905. У 1906-17 — у эміграцыі ў Англіі, ЗША. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 — на радзіме. У 1918 з А.-Р. Вільямсам арганізуе атрад Чырвонай Арміі. Затым у Віцебску — камісар па справах яўрэйскай нацыянальнасці. З 1921 — у Мінску. У 1924-29 — загадчык Гістпарта ЦК КП(б)Б, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. У 1930-33 — дырэктар Гістпарта пры Маскоўскім камітэце ВКП(б). З 1934 — дырэктар Інстытута яўрэйскай пралетарскай культуры. З 1935 — намеснік дырэктара Інстытута нацыянальных меншасцяў Беларускай Акадэміі навук. У 1938 рэпрэсаваны, у 1939 сасланы ў Паўладарскую вобл. (Казахстан), дзе памёр. Друкаваўся з 20-х на гістарычныя тэмы ў беларускай і маскоўскай перыёдыцы (на беларускай, ідзіш, рускай мовах). Выдаў кнігі і брашуры: "Рэвалюцыйны рух у Беларусі" (1925), "Яўрэйскія камісарыяты і яўрэйскія камуністычныя секцыі, 1918-1921 гг." (1926), "Нарысы па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі 1863-1917" (1928, на рускай мове), "На гістарычным фронце: Супраць ідэалізацыі Бунда" (М., 1930), "'Кастрычніцкія баі ў Маскве" (М., 1932), "Барацьба

супраць Бунда: Ад станаўлення "Искры" да ПІ з'езду РСДРП", (М., 1932), "Ленінская "Искра" ў барацьбе супраць Бунда" (1934).

**Ададурава Валянціна Захараўна** (дзявоч. Клыбік, 9.01.1941, в. Хадзявічы Слонімскага р-на — 20.09.1995), беларускі педагог, паэтка. З сялянскай сям'і. Вучылася ў 7-годцы ў Хадзявічах, у Слонімскай СШ №1. Скончыла Сянькоўшчынскую СШ Слонімскага р-на (1958), Гродзенскую культасветвучэльню (1960). Працавала ў Дзераўнянскім і Харашэвіцкім клубах Слонімскага р-на (1960-62). Настаўнічала ў 8-годцы ў Ялуцавічах Зэльвенскага р-на (1962-76), у 1967 завочна скончыла аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ. З 1976 выкладала беларускую мову і літаратуру ў СШ у в. Казловічы (Елка) Зэльвенскага р-на. Друкавала вершы з 1975. Выдала зборнік паэзіі "Глыбінка" (Слонім, 1994).

**Адамовіч Іван Мікалаевіч** (10.11.1944, в. Верцялішкі Гродзенскага р-на), беларускі музычны педагог, фалькларыст. З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у роднай вёсцы. Працаваў тут загадчыкам сельскага клуба (1960-62). Вучыўся ў Гродне ў музычна-педагагічнай вучэльні (1962-66). Выкладаў музыку і спевы, беларускую мову і літаратуру ў Верцялішкаўскай СШ у 1966-76 (у 1974 завочна скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры Гродзенскага педінстытута). Настаўнічаў затым у Рыдзельскай 8-годцы, Лойкаўскай СШ, Губінкаўскай 8-годцы Гродзенскага р-на. У 1990-97 — музычны кіраўнік спецшколы-інтэрната ў мяст. Парэчча Гродзенскага р-на. З 1997 — выкладчык музыкі і спеваў у дапаможнай СШ № 4 г. Гродна. Збірае мясцовы фальклор з сярэдзіны 60-х. Выдаў збор народных песень з нотамі "Скарб сэрца роднай матулі" (Гродна, 1997). Піша музыку (песні на словы Р. Барадуліна. С.Валодзькі, А.Цыхуна), тэксты для песень.

**Адамчык Вячаслаў Уладзіміравіч** (1.11.1933, в. Варакомшчына Дзятлаўскага р-на), беларускі пісьменнік. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1960). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988). З сялянскай сям'і. У мяст. Наваельня (Дзятлаўскі р-н) скончыў 7 кл. рускай СШ і працаваў грузчыкам на мясцовай чыгуначнай станцыі. Атрымаў сярэднюю адукацыю ў школе рабочай моладзі ў Наваельні. Вучыўся на аддзяленні журналістыкі філфака БДУ (1952-57). Працаваў у газетах "Знамя юности" (1957-58), "За вяртанне на Радзіму" (1958-60), рэдактарам у Дзярж. выдавецтве БССР (1960-62), загадчыкам аддзела публіцыстыкі ў часопісе "Полымя" (1962-63). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры Літаратурным інстытуце ў

Маскве (1965). Быў літ.супрацоўнікам аддзела прозы ў часопісе "Неман" (1965-67), загадчыкам рэдакцыі ў часопісе "Полымя" (1967-69), рэдактарам аддзела прозы і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць" (1969-76), галоўным рэдактарам сцэнарнай майстэрні пры кінастудыі "Беларусьфільм" (1976-80), намеснікам галоўнага рэдактара выдавецтва "Мастацкая літаратура" (1980-81). У 1982-96 — галоўны рэдактар часопіса "Бярозка". З 1952 друкаваў вершы, з 1957 — прозу. Публікаваў апавяданні, аповесці, раманы, п'есы, нарысы. Выдаў зборнікі апавяданняў "Свой чалавек" (1958), "Млечны шлях" (1960). "Міг бліскавіцы" (1965), "Дзікі голуб" (1972), "Дзень ранняй восені" (1974), "Раяль з адламаным вечкам" (1990). Аўтар цыклу раманаў: "Чужая бацькаўшчына" (1978), "Год нулявы" (1983), "І скажа той, хто народзіцца..." (1987), "Голас крыві брата твайго" (1991). У зборнік "Яблык спакусы" (1995) увайшлі аповесць і драматычныя творы. У кнігу "Развітальная аповесць" (1999) — аповесць, апавяданні, дзённікі, нататкі. Выйшлі "Выбраныя творы" ў 2-х тамах (1983). Напісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў "Іван Мележ" (1977), "Валянцін Таўлай" (1978), "Дзядзька Якуб" (1981). Творы друкаваліся ў перакладах на многія мовы свету. Асобныя выданні — на рускай, польскай, літоўскай, туркменскай мовах. Перакладае рускіх празаікаў.

**Адважны Вінцук** (сапр. Германовіч Язэп Станіслававіч, 4.03.1890, мяст. Гальшаны Ашмянскага р-на — 26.12.1978), беларускі пісьменнік (паэт, празаік, перакладчык, мемуарыст), каталіцкі духоўнік. З сям'і рамесніка. Скончыў парафіяльную школу ў Гальшанах (1902), гарадскую ў Ашмянах (1906). Жыў у Вільні і тры гады рыхтаваўся ў духоўную семінарыю. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1913). Служыў ксяндзом на Беласточчыне, у 1918 — у Вялікай Лапеніцы (Ваўкавыскі р-н). У 1920-22 у Луконіцы (Зэльвенскі р-н), у 1923 у Лужках на Віцебшчыне. Скрозь праводзіў беларускую патрыятычную работу сярод прыхаджанаў, дабіваўся беларускай школы. Праследаваўся касцельнымі і свецкімі ўладамі. У 1924 уступіў у ордэн Марыянаў. У Друі быў пробашчам, выкладчыкам рэлігіі і лацінскай мовы ў гімназіі. У 1932 накіраваны місіянерам у Харбін (Кітай). Быў тут дырэктарам гімназіі, выхавальнікам у інтэрнаце. У 1936 прыбыў у Вільню, дзе кіраваў студэнцкім інтэрнатам марыянаў. У 1938 выселены ўладамі ў глыбіню Польшчы. У 1939 зноў выехаў у Харбін, праводзіў тут місійную дзейнасць, дапамагаў беспрытульным, выкладаў у ліцэі. У 1948 арыштаваны і перададзены ў СССР. Зняволены ў канцлагерах Сібіры. Выпушчаны ў 1955. Выехаў у Польшчу, у 1959 у Рым. Жыў пераважна ў Англіі. Рэдагаваў часопіс

"Божым шляхам" (1964-74). Друкаваў (з 1919) гумарыстычныя вершы, байкі, празаічныя творы, артыкулы, гутаркі з чытачом, вершаваныя інтэрпрэтацыі біблейскіх кніг (у газетах "Сын беларуса", "Беларуская крыніца", часопісах "Хрысціянская думка", "Калоссе", "Шлях моладзі", "Божым шляхам", "Зьніч"). У Вільні выйшлі празаічныя гутаркі "Як Казюк сабраўся да споведзі" (1928), "Казюкова жанімства" (1929), вершаванае апавяданне "Як Гануля збіралася ў Аргентыну" (1930), апавяданне "Адам і Анелька" (1931), сцэнічны абразок "Батлейка" (1932), зборнік вершаў "Беларускія цымбалы" (1933), аповесць "Хлопец" (1935), вершаваныя апавяданні "Гануліны клопаты" (1935), "На Далёкі ўсход" (1937), байка "Добраму і Бог памагае" (1939). У Альбертыне выдаў вершаваны дыялог "Унія на Палессі" (1932). Пасля вайны выйшлі яго "Пакутныя псальмы" (Рым, 1964), "сучасная казка" "Князь і Лапаць" (Лондан, 1964), "Байкі і іншыя вершы" (Лондан, 1973). Выйшла яго кніга "Кітай — Сібір — Масква. Успаміны місіянера з савецкіх лагераў" (Мюнхен, 1962), перакладзеная на многія мовы. Выдаў пераклады з П. Яршова ("Канёк-гарбунёк", Вільня, 1932), А. Пушкіна ("Сказка аб рыбаку і рыбцы", Вільня, 1935).

**Адула Тадэвуш Іванавіч** (14.09.1945, в. Хролы Астравецкага р-на), беларускі філосаф. Доктар філасофскіх навук (1994). У 1966-71 — студэнт філасофскага аддзялення гістфака БДУ. У 1971-74 — аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ. У 1974-81 выкладаў у БДУ (у 1978-79 стажыраваўся ў Кіеве). З 1981 працуе ў Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела філасофскіх праблем чалавека. Даследуе гісторыю філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, духоўную культуру, тэорыю гістарычнага працэсу. Выдаў (на рускай мове) кнігі: "Культура, філасофія і духоўны свет чалавека: Тэарэтычна-метадалагічны аспект" (1986), "Філасофія ў сістэме духоўнай культуры: праблемы сацыяльнага функцыянавання" (1993).

**Адынец Антон** (25.01.1804, в. Гяйстуны Ашмянскага р-на — 15.01.1885), польскі паэт, перакладчык, выдавец. З незаможнай шляхты. Вучыўся ў павятовай школе базыльянаў у Барунах (Ашмянскі р-н) у 1813-20, на факультэце права Віленскага універсітэта (1820-23). Па справе філаматаў сядзеў у турме (1823-24). З 1825 — у Варшаве, дзе быў рэдактарам навуковага аддзела "Gazety Warszawskiej" (1827-29). Падарожнічаў па Еўропе (Германія, Італія, Швейцарыя, Францыя, Англія) у 1829-32. Жыў з сям'ёй у Дрэздэне (1832-37), у Гяйстунах. З 1838 — у Вільні, рэдагаваў "Виленский вестник" (1840-59). З 1866 — у

Варшаве, рэдагаваў "Kurier Warszawski" (1866-67), супрацоўнічаў у іншых перыёдыках. Друкаваўся з пач. 20-х у віленскіх, варшаўскіх, львоўскіх выданнях. Перакладаў вершы і балады Г. Гётэ, Д. Байрана, В. Скота, Ф. Шылера, В. Жукоўскага, А. Пушкіна. Выдаў 2-томнік сваіх вершаў і перакладаў "Паэзія" (Варшава, 1825-26, 2-е выд. у Познані, 1832), 3-томнік "Перакладаў" (Ліпск, 1838-41), 4-томнік перакладных твораў (Вільня, 1842-43, 2-е выд. у Варшаве, 1874). Выйшлі вершаваныя драмы "Феліцыта, або Карфагенскія пакутнікі" (Вільня, 1847, 3-яе выд. у Варшаве, 1880), "Ежы Любамірскі, або ўнутраная вайна ў Польшчы" (Вільня, 1861). Яго драма "Барбара Радзівіл" пастаўлена ў Вільні ў 1860. Сааўтар "Альбома" ў гонар Аляксандра II (Вільня, 1858). Напісаў вялікія мемуары.

**Ажэшка Эліза** (дзявоч. Паўлоўская, 6.06.1841, маёнтак Мількаўшчына Гродзенскага р-на — 18.05.1910), польская пісьменніца (празаік, публіцыстка), культурны дзеяч Беларусі. З шляхецкай сям'і. Атрымала хатнюю адукацыю. Вучылася ў пансіёне пры кляштары ў Варшаве (1852-57). Выйшаўшы замуж, пераехала ў маёнтак Людвінава на Брэстчыне, дзе займалася асветніцкай дзейнасцю. Удзельнічала ў паўстанні 1863. У 1864 вярнулася ў Мількаўшчыну. З 1869 жыла ў Гродне. Тут працягвала культурна-асветную работу сярод дзяцей і дарослых (стварыла хатнюю школу). У Вільні заснавала выдавецкую суполку, якая дзейнічала ў 1879-82. Была апякункаю гродзенскага Таварыства "Муза", у рамках якога праўляла ў 1908-09 культурна-асветніцкія акцыі. Бывала летам у прынёманскіх вёсках: Квасоўка Гродзенскага р-на (1871, 1878), Свіслач Гродзенскага р-на (1879-80), Міневічы Мастоўскага р-на (1881-89), Панямонь Гродзенскага р-на (1890-96), Путрышкі Гродзенскага р-на (1898), мяст. Лунна Мастоўскага р-на (1902). Пісала раманы, аповесці, апавяданні, публіцыстыку. Друкавалася з 1866. Выдала ў Варшаве кнігі прозы "Апошняе каханне" (1868), "У клетцы" (1870), "Добрапрыстойныя" (1871), "Дзённік Вацлавы" (1871), "Пан Граба" (1872), "Марта" (1873), "Элі Маковер" (1875), "Пампалінскія" (1876), "Меір Эзафовіч" (1879), "Першабытныя" (1884), "Сям'я Брохвічаў" (1885), "Мірталя" (1886), "Зыгмунт Лавін і яго калегі" (1886), "Дзюрдзі" (1888), "Над Нёманам" (1888), "Хам" (1888), "Высакародныя" (1891), "Меланхолія" (1896), "Аўстраліец" (1896), "Іскры" (1898), "Арганаўты" (1900), "Імгненні" (1901), "Ad astra" (1904), "І песня хай заплача" (1905), "Gloria wictis" (1910). Выйшлі яе публіцыстачныя творы: "Некалькі слоў пра жанчын" (Львоў, 1873), "Патрыятызм і касмапалітызм" (Вільня, 1881), "Пра яўрэяў і яўрэйскае пытанне" (Вільня, 1882). Цыкл

краязнаўча-фалькларных нарысаў "Людзі і кветкі на берагах Нёмана" публікаваўся ў часопісе "Wisła" ў 1888-91. Друкавала вершы.

**Акудовіч Валянцін Васілевіч** (18.06.1950, мяст. Свіслач), беларускі культуролаг, літаратуразнавец, эсэіст, публіцыст. Брат Ю. Акудовіча. З сям'і рабочага. Скончыў СШ у Свіслачы (1967) і працаваў экспедытарам на мясцовым хлебазаводзе. З 1968 — у Мінску, працаваў тут на маторным заводзе токарам, слесарам, матарыстам-выпрабавальнікам. Служыў у войску. У 1975-80 вучыўся у Літаратурным інстытуце (Масква). Вярнуўшыся ў Мінск, працаваў у Доме піянераў інструктарам па турызме (меў званне майстра спорту па горным турызме), быў вартаўніком, намеснікам дырэктара школы турызму, ст. выкладчыкам Беларускага інстытута турызму (1980-91). З 1991 — супрацоўнік штотыднёвіка "Культура" (пазней адначасова ў часопісе "Крыніца"). Друкуецца з 1973. Аўтар шматлікіх артыкулаў, эсэ, літаратурна-філасофскіх рэфлексій, палемічных нататак (у перыёдыках "Літаратура і мастацтва", "Культура", "Крыніца", "Наша ніва", "Полымя", "Нёман"). Удзельнік навуковых канферэнцый, круглых сталоў, семінараў па сучаснай культуры. Аўтар кнігі "Мяне няма. Роздум на руінах чалавека" (1998).

**Акудовіч Юры Васілевіч** (6.05.1954, мяст. Свіслач), беларускі спартыўны педагог. Майстар спорту СССР па турызме (1982). Брат В. Акудовіча. З сям'і рабочага. Скончыў у Свіслачы СШ, Беларускі інстытут фізічнай культуры (па спецыяльнасці "турызм") у 1975. Служыў у войску (1975-77). Працаваў трэнерам па турызме на Мінскім падшыпнікавым заводзе (1977), быў трэнерам зборнай каманды Беларусі па турызме. У выніку траўмы праходзіў курс лячэння і рэабілітацыі па індывідуальна распрацаванай сістэме (1977-79), аб чым напісаў кнігу "Узыходжанне на Сафруджу" (1990). Працаваў выкладчыкам Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (1979), намеснікам дырэктара Рэспубліканскай станцыі юных турыстаў (1979-89), намеснікам дырэктара Беларускага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў турысцка-экскурсійных арганізацый (1989-91), дырэктарам Беларускай вышэйшай школы турызму (1991-95). З 1996 — дырэктар Беларускага інстытута турызму. Вядзе шырокую грамадскую работу па прапагандзе турызму.

**Акулевіч Рыгор Раманавіч** (19.04.1907, в. Вялікая Кракотка Слонімскага р-на — 28.10.1974), беларускі грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст. Адзін з арганізатараў гурткоў Грамады і

ТБШ, бібліятэкі імя Я. Купалы на радзіме. Ратуючыся ад рэпрэсій з боку польскіх уладаў, выехаў у 1928 у Канаду. Удзельнічаў тут у беларускім руху, у выпуску газеты "Канадский гудок", дзе была беларуская старонка. Адзін з стваральнікаў Федэрацыі рускіх канадцаў і яе друкаванага органа газеты "Вестник". Аўтар кніг: "Рускія ў Канадзе" (Таронта, 1952), "50 год Беларускай рэспублікі" (Таронта, 1968).

**Александровіч Віктар Францавіч** (28.08.1951, в. Слабодка Астравецкага р-на), беларускі мастак (графік, жывапісец). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1987). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе ў Астраўцы (1958-68). Працаваў там на аўтабазе №4 (1968-69). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1975). Выкладаў на кафедры графікі гэтага інстытута ў 1975-81 (у 1976-77 служыў у войску). Удзельнік мастацкіх выставаў з 1975. Працаваў пераважна ў галіне станковай графікі, пазней кніжнай. Ілюструе найбольш мастацкую літаратуру. З ранніх работ — афармленне кн. Я. Коласа "Рыбакова хата" (1975), літаграфічная серыя "Адвечная песня" па матывах паэмы Я. Купалы (1979), літаграфічны партрэт Цёткі (1980). Выканаў афармленне (гуаш, соўс, пастэль, акварэль, тэмпера) кніг "Вялікі Лес. Трылогія" Б.Сачанкі (1979-83), "Вершы Я. Купалы. Кніжка-мініяцюра" (1980), "РВС" А. Гайдара (1981), "Белая знічка" А. Савіцкага (1983), "Цяжкія часы" Ч. Дзікенса (1983), "Станаўленне" Г. Далідовіча (1984), "Цыганскія песні" (1984), "Алімпіяда" І. Пташнікава (1984), "Лес шуміць" У. Караленка (1984), "Кепска будзе" Ф. Багушэвіча (1985), "Чайкі на хвалях" І. Чыгрынава (1988), "Міколка-паравоз" М. Лынькова (1989), "Параненая памяць" І. Новікава (1990), "Людзі на балоце" І. Мележа (1991), "Подых навальніцы" І. Мележа (1991), "Завеі,, снежань" І. Мележа (1995), зб. беларускіх народных казак "Не сілай, а розумам" (1997). Адзначаны шматлікімі дыпломамі на конкурсах кнігі ў Беларусі і СССР.

**Альхімовіч Гіяцынт Дамінікавіч** (11.09.1841, маёнтак Дуброва Шчучынскага р-на — пасля 1897), беларускі і французскі мастак. Брат К. Альхімовіча. З шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію і каморніцкую вучэльню ў Вільні. Удзельнік паўстання 1863. У 1864 эміграваў у Францыю, жыў пераважна ў г. Перпіньян. Працаваў чарцёжнікам на будаўніцтве чыгункі. З 1872 вучыцца жывапісу ў Перпіньяне, пазней у Парыжы. З 1876 выкладаў маляванне ў гімназіі, пасля ў палітэхнічнай школе, у жаночым ліцэі ў Перпіньяне. Пісаў партрэты, пейзажы, тэматычныя кампазіцыі. Удзельнік выставаў (найбольш у Францыі) з 1864. Сярод твораў: "Чытанне Біблії",

"Флейціст", "У час адпачынку", "Пры святле месяца", "Аматар старажытнасцяў", "Амур, які карыстаецца тым, што Вернасць спіць", "Букет камеліяў", "Прачкі", "Араб з Перпіньяна".

**Альхімовіч Казімір Дамінікавіч** (20.12.1840, маёнтак Дуброва Шчучынскага р-на — 31.12.1916), беларускі мастак (жывапісец, графік, дэкаратар). Брат Г. Альхімовіча. З шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію ў Вільні. Удзельнічаў у паўстанні 1863, за што сасланы на Урал. Вярнуўся ў 1869. Вучыўся ў Варшаве ў мастацкай школе В. Герсана. Скончыў акадэмію мастацтваў у Мюнхене (1875). У 1876-80 жыў у Парыжы, затым у Варшаве. Наведваў родныя мясціны. Аўтар сюжэтна-тэматычных твораў на гістарычныя, сацыяльна-бытавыя, міфалагічныя тэмы. Удзельнік выстаў з 1873. Сярод работ: "Жніво" (1869), "У поце чала", "Дажынкі" (1880), "Вясковая дзяўчына", "Дзеці каля лесу", "Абарона Ольынтына" (1883), "Збор сена", "Дзяўчынка ў лесе" (1893), "Вясковы пейзаж", "Найманне работнікаў" (1893), "На этапе" (1894), "Пахаванне на Урале", "Смерць у выгнанні", "Хрысціянскія пакутнікі", "Вясельныя ўрачыстасці Сігізмунда Аўгуста", "Малітва тых, што церпяць", "Смерць Глінскага ў турме", "Пахаванне Гедыміна", "Адпачынак Кейстута", "Вітаўт на магіле Кейстута", "Падрыхтоўка да смерці Самуіла Збароўскага", "Апошні вайдэлот" (1900), "Багіня кахання Мільда", "Паганскія жрацы", "Апошні жрэц Літвы з дачкой Плёнтаю", "Ліздзейка з дачкой на руінах храма Перуна", "Пастушка" (1903), "Пасля бітвы", "Ля ручая" (1905), "Шляхціц і селянін" (1908). Выканаў графічны аўтапартрэт (1864), партрэты Паўла Сапегі, Крыштофа Радзівіла. Ілюстраваў творы А. Міцкевіча, У. Сыракомля І. Крашэўскага, Э. Ажэшкі. Аўтар жывапісных і пластычных работ для касцёлаў.

**Альхімовіч Пётр Пятровіч** (3.05.1946, мяст. Смаргонь), беларускі кампазітар. Сябра Беларускага Саюза кампазітараў (1982). З сям'і рабочага. Скончыў у Смаргоні дзіцячую музычную школу. Вучыўся ў Мінскай музычнай вучэльні (1960-64), дзе атрымаў спецыяльнасць кіраўніка аркестра народных інструментаў. Скончыў аддзяленне народных інструментаў Беларускай кансерваторыі (1972). Другі раз скончыў гэтую кансерваторыю па класе кампазіцыі (праф. А. Багатырова) у 1982. Прайшоў асістэнтуру-стажыроўку ў Маскоўскай кансерваторыі ў 1984. У 1990 выехаў з сям'ёй у Мексіку. Прыязджае на радзіму. Аўтар кантат, харэаграфічных мініяцюр, сімфанічных твораў, камерных твораў для габоя і аркестра, для саксафонаальта і аркестра, для эстраднага аркестра, для фартэпіяна, габоя і ка-

мернага аркестра, для баяна, скрыпкі і фартэпіяна, для кантрабаса і фартэпіяна. У галіне аркестравай музыкі таксама — канцэрт у джазавым стылі для саксафона-альта і аркестра (1984), Канцэрта гроса № I (1982), № 2 (1984), канцэрціна (1978), струнны квартэт (1980). Напісаў рамансы (на сл. Р. Барадуліна, Л.Дайнекі), хоры, дзіцячыя песні. Стварыў музыку да кінафільмаў "Алёхін — чалавек дарожны" (1975), "Лявоніха — душа ласкавая" (1976), "Жывы зрэз" (1977), "Берагі" (1978), "Дзень вяртання" (1979), "Чужая бацькаўшчына" (1982), "Жыў-быў Пётр" (1983, у сааўт.), "Радаўніца" (1984), "Сведка" (1985), "Экзамен на дырэктара" (1986), "Пераправа" (1987), да тэлефільмаў, тэлеспектакляў.

**Аляксандраў Сяргей Аляксеевіч** (21.06.1957, г. Масты), беларускі спартыўны педагог. Кандыдат педагагічных навук (1993). Дацэнт (1995). З сям'і службоўцаў. Скончыў 8 кл. у Мастоўскай СШ №2. Вучыўся ў Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (1972-75). Служыў у войску (1975-77). У 1977-80 — настаўнік фізкультуры ў 8-годцы ў в. Казловічы Зэльвенскага р-на і ў СШ у в. Пацэвічы Мастоўскага р-на. У 1980-89 выкладаў гімнастыку ў Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (у 1983 завочна скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры). Вучыўся ў аспірантуры Беларускай акадэміі фізічнай культуры і спорту (1989-92). З 1992 працуе на кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1989. Вывучае сюжэтна-гульнявы метад на ўроках фізкультуры для дзяцей старэйшага дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Выдаў навучальныя дапаможнікі (на рускай мове) "Гульні-казкі ў падрыхтоўцы юных гімнастаў" (1992), "Сюжэтна-гульнявы метад на ўроках гімнастыкі" (Гродна, 1994), у сааўтарстве: “Гульні-казкі на ўроках фізкультуры ў малодшых класах сярэдняй агульнаадукацыйнай школы" (1992), "Фармаванне тэхнікі рухаў у гімнастыцы з развіццём скорасных якасцяў" (1992).

**Аляксюк Павел Паўлавіч** (28.11.1892, г. Гродна — ?), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. З сям'і вайскоўца. Скончыў гродзенскую гімназію (1911). Падчас вучобы ўдзельнічаў у рабоце Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, быў актыўным карэспандэнтам "Нашай нівы" (у 1910 — 26 нататак, замалёвак). Скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1915). Адзін з заснавальнікаў Беларускага таварыства пацярпелых ад вайны. З пач. 1917 — сябра Беларускай сацыялістычнай Грамады. Удзельнік з'езду (намеснік старшыні) беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (сакавік

1917), дзе выбраны ў Беларускі нацыянальны камітэт. Сябра Рады БНР, пазней Народнага Сакратарыяту Беларусі (1918). Сябра Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны (1919). Адзін з кіраўнікоў клуба "Беларуская хатка" ў Гродне (1919). У 1919-20 кіраваў Беларускай вайсковай камісіяй. Падтрымліваў С. Булак-Булаховіча ў яго вайсковых дзеяннях супраць Саветаў. У 1921 стварыў арганізацыю "Беларуская краёвая сувязь", якая прапагандавала саюз з Польшчаю. Выдаваў газету "Jedność". У 20-я працаваў адвакатам у Навагрудку. Быў намеснікам старшыні Навагрудскай павятовай управы ТБШ.

**Аляхновіч Мсціслаў** (22.11.1905, г.Гродна — 24.07.1982), польскі мовазнавец, педагог. Доктар гуманітарных навук (1963). Доктар педагагічных навук (1966). Прафесар (1974). З сям'і настаўніка гімназіі. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне гуманітарнага факультэта Віленскага універсітэта (1934) і юрыдычнае аддзяленне факультэта права і грамадскіх навук гэтага універсітэта (1938). У 1939-41 працаваў журналістам у рускіх газетах у Вільні. У 1944-49 — у Камітэце нацыянальнага вызвалення ў Любліне. З 1949 выкладае рускую мову ў Лодзінскім універсітэце. Затым загадвае тут кафедрай замежных моваў (1954-66). У 1966-73 — загадчык кафедры рускай філалогіі, у 1973-75 — дырэктар Інстытута рускай філалогіі Лодзінскага універсітэта. Быў галоўным рэдактарам часопіса "Język Rosyjski" (1967-82), шмат гадоў узначальваў штотыднёвік "Studia Rossica". Асноўныя працы прысвечаны рускай акцэнтуацыі і словаўтварэнню. Даследаваў многія аспекты беларускай мовы. Выдаў кнігі: "Руская акцэнтуацыйная сістэма" (Лодзь, 1974), "Тэарэтычныя асновы дыстрыбуцыі рускага націску ў слове" (Лодзь, 1974), "Рускі акцэнт" (Вроцлаў, 1977), "Польскія даследчыкі беларускага фальклору і мовы ў XIX стагоддзі" (Лодзь, 1986). Аўтар фальклорна-этнаграфічных і краязнаўчых прац на беларускім матэрыяле.

**Анацэвіч Ігнат Сямёнавіч** (15.08.1780, в. Малая Бераставіца Бераставіцкага р-на — 18.02.1845), беларускі гісторык, археограф, педагог. Прафесар (1827). З сям'і ўніяцкага святара. Вучыўся ў школах у Ваўкавыску (1789-93), Гродне (1796-97). Быў гувернёрам на Сакольшчыне. Вучыўся ў настаўніцкай семінарыі ў Элку (1801-02), на філасофскім факультэце Кенігсбергскага універсітэта (1803-05). У Кёнігсбергу працаваў у архівах, захапіўся гісторыяй "Літвы". У 1809 па запрашэнні М. Румянцава вывучаў яго архівы ў Гомелі. У 1811 скончыў юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта. Быў хатнім

настаўнікам, выкладаў у гімназіі ў Беластоку (1813-17). Затым — выкладчык Віленскага універсітэта (усеагульнай і краёвай гісторыі ў 1818-21, дыпламатыі і статыстыкі Расіі ў 1821-28). Летам 1821 збіраў матэрыял па гісторыі "Літвы" ў Пецярбургу. Летам 1822 вывучаў архівы ў Гродзенскай губерні. У 1824 і 1826 выязджаў у Варшаву для вывучэння статыстыкі. Затым працаваў над гістарычнымі крыніцамі ў Кёнігсбергу. У 1828 па палітычных матывах высланы ў Гродна, пасля ў Малую Бераставіцу. У пач. 30-х кіраўніцтвам універсітэта ўцягнуты ў судовы працэс. З 1834 — у Пецярбургу, дзе працаваў у Археаграфічнай камісіі, у Румянцаўскім музеі. Даследаваў гісторыю Вялікага княства Літоўскага, збіраў крыніцы. Аўтар артыкулаў па гісторыі Беларусі. Друкаваўся ў часопісах "Вестник Европы", "Северный архив", "Северная пчела". Асноўная яго праца — "Гісторыя Літвы" засталася у рукапісе.

**Анішчык Аляксей Сцяпанавіч** (19.07.1912, хутар Мондзіна Навагрудскага р-на), беларускі краязнавец, педагог, пісьменнік (паэт, празаік, перакладчык). З сялянскай сям'і. Пачаў вучыцца ў в. Мондзіна. Затым паступіў у 3-ці клас Навагрудскай беларускай гімназіі, якую скончыў у 1930. Скончыў эканамічны факультэт Віленскага універсітэта (1935). Працаваў у псіхатэхнічным інстытуце ў Катавіцах (Польшча), кіраваў тут інжынерна-тэхнічнымі курсамі. З пачатку вайны Германіі з Польшчай — у польскім войску, удзельнік абароны Варшавы. У 1939-40 — настаўнік беларускай мовы і літаратуры Навагрудскай беларускай гімназіі (пазней СПІ). У 1940-41 — на Беласточчыне (працаваў на тэкстыльным камбінаце ў Гарадку, дырэктарам школы ў фабрычным пасёлку Чарнавесь). У 1941-42 — загадчык 7-годкі ў Уселюбе (Навагрудскі р-н). З 1942 — выкладчык беларускай настаўніцкай семінарыі ў Навагрудку. У 1944 — рэдактар навагрудскай газеты "За праўду", адначасова з лютага 1944 — загадчык Навагрудскай друкарні. З мая 1944 — супрацоўнік сектара радыёперадач у Мінску. Удзельнік 2-га Усебеларускага кангрэсу (1944). У 1945-48 — на журналісцкай рабоце ў Польшчы (у Катавіцах, Кракаве, Вроцлаве, Шчэціне). У 1948 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і зняволены ў канцлагерах у Запаляр'і. Выйшаўшы на волю ў 1957, быў хутка вернуты ў канцлагер у Комі АССР, адкуль пераведзены ў Дубраўлаг (Мардовія). Вызваліўся ў 1962. Працаваў эканамістам на Навагрудчыне, у Лідзе, Воранаве, у 1967-78 у Літве. Жыве ў Вільнюсе. Друкаваў (з 1936) апавяданні, крытычныя і публіцыстычныя артыкулы ў часопісах "Калоссе", "Шлях моладзі", "Беларускі летапіс". З 1950-х друкуе вершы. Выдаў (пад псеўданімам Андрэй Чэмер) у

Вільнюсе дакументальную аповесць вершам "Мондзінская балада" (1996), зборнік вершаў і перакладаў на рускай мове "Жыццё жывым належыць" (1996, у тым жа годзе зборнік перавыдадзены пад прозвішчам аўтара на польскай мове), краязнаўчае даследаванне "Наваградзкая беларуская гімназія" (1997), літаратурна-біяграфічны нарыс "Сяргей Хмара" (1998), кнігу пра Б. Кіта і яго вучняў — "Выбраныя Богам" (1999).

**Анішчык Аркадзь Аркадзевіч** (25.04.1945, г. Навагрудак), беларускі мастак (мастацкае шкло). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1984). Скончыў Вышэйшую школу прыкладнога мастацтва ў Празе (1975). У 1975-90 — мастак шклозавода "Нёман" (пас. Бярозаўка Лідскага р-на). З 1990 жыве ў Фінляндыі. Працуе ў бясколерным хрусталі і шкле. У мастацкіх выставах з 1976. Аўтар камплекта пітнога посуду (хрусталь, гладзь, 1975), блюда "Крылы" (хрусталь, алмазная грань, 1976), набору "Дэсертны" (хрусталь, алмазная грань, 1976) і інш.

**Арочка Мікола** (Мікалай Мікалаевіч, 10.12.1930, в. Вецявічы Слонімскага р-на), беларускі пісьменнік (паэт, празаік, крытык і літаратуразнавец, перакладчык). Доктар філалагічных навук (1981). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1958). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Сялявічы (Слонімскі р-н), скончыў сямігодку ў Вецявічах, СШ у мяст. Азярніца (Слонімскі р-н). Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1951-56). Працаваў літсупрацоўнікам, заг. аддзела культуры і быту часопіса "Сельская гаспадарка Беларусі" (1956-60), у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (1962). У 1966 скончыў аспірантуру Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі і працаваў у гэтым інстытуце да 1999. Жыве ў Вецявічах. Друкуецца як паэт з 1949. Выдаў кнігі паэзіі "Не ўсе лугі пакошаны..." (1958), "Ветраломная паласа" (1962), "Крылатае семя" (1967), "Кветкі бяссмертніка" (1972), "Матчына жыта" (1978), "Бяздонне" (1985), "Падземныя замкі" (1986), зборнікі выбранай паэзіі "Колас на ржышчы" (1980), "Памяць зярнятаў" (1991), драматычных паэм "Курганне, Крэва" (1982), "Судны дзень Скарыны" (1990), кнігу гумарыстычных вершаў "Рагуля на экскурсіі" (1962, у сааўт.), вершаў для дзяцей "У птушынай вёсцы" (1964), аповесць "Хай расце маладая таполя" (1964). Выйшлі літаратуразнаўчыя даследаванні "Валянцін Таўлай" (1969), "Беларуская савецкая паэма" (1979), "Максім Танк. Жыццё ў паэзіі" (1984), "Паэзія і вайна" (1987, на рус. мове), "Пад высокай зоркай: Паэзія М. Ю. Лермантава ў творчым лёсе Аркадзя

Куляшова" (1990), зборнікі крытычных артыкулаў "Галоўная служба паэзіі" (1974), "Сучасная беларуская паэзія" (1976), "Саюз часу і майстэрства" (1981). Перакладае з рускай, польскай, англійскай моваў. Творы яго перакладзены на многія мовы. Кніга вершаў у перакладзе на рускую мову выйшла ў Маскве (1975).

**Арэхва Мікалай Сямёнавіч** (24.11.1902, мяст. Баруны Ашмянскага р-на -16.07.1990), беларускі грамадскі дзеяч, гісторык, мемуарыст. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1981). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе ў Барунах. З 1915 — у бежанстве. У Ноўгарадзе вучыўся ў рэальнай вучэльні, з 1918 у школе 2-ой ступені. У 1920 ваяваў на польскім фронце. Быў сакратаром Ноўгарадскага павятова-гарадскога, потым губернскага камітэтаў камсамола (1920-23). З 1923 — у ЦК камсамола БССР. У 1924 — старшыня часовага Беларускага Бюро ЦК РКСМ, сакратар ЦК КСМБ, сябра ЦВК БССР. З 1925 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі — сакратар Віленскага акруговага камітэта, сябра ЦК КПЗБ. У 1926-31 зняволены ў турмах Польшчы. У 1934-35 узначальваў краёвы сакратарыят КПЗБ. З 1935 — сябра Бюро, з 1936 — прадстаўнік ЦК КПЗБ у ЦК кампартыі Польшчы ў Празе. З 1939 — у СССР, працаваў у Мінску, Горкім. У 1944 — у Войску Польскім. У 1945-55 — у апараце Міністэрства грамадскай бяспекі Польшчы. Затым працуе ў Інстытуце гісторы партыі пры ЦК КПБ (1956-84). Складальнік зборнікаў дакументаў і ўспамінаў пра рэвалюцыйны рух у Зах. Беларусі. Выдаў даследаванне "Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі" (1958, на рус. мове), успаміны "Справы і людзі КПЗБ" (1983, на рус. мове).

**Астраух Аліна Эдмундаўна** (16.05.1969, в. Навасёлкі Лідскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1998). Сястра Н. Шандрохі. З сям'і настаўнікаў. Скончыла СШ у в. Мінойты Лідскага р-на (1985), Лідскую педагагічную вучэльню (1987), факультэт беларускай філалогіі і культуры Гродзенскага універсітэта (1992). У 1994-97 — аспірантка Інстытута літаратуры Нац. Акадэміі навук Беларусі. У 1993 і з 1997 выкладае (з 1999 на пасадзе дацэнта) на кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага універсітэта. Друкуецца як літаратуразнавец з 1993. Даследуе сучасную беларускую паэзію, праблемы яе жанрава-стылёвай разнастайнасці.

**Асяненка Аляксандр Васілевіч** (28.06.1953, мяст. Астравец), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1979).

Скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут (1975) і працуе ў Віцебску ў Грамадзянпраекце (архітэктарам, ст. архітэктарам, кіраўніком майстэрні). Асноўныя работы (у сааўт.): комплекс інтэрнатаў на праспекце Перамогі, 82-кватэрны дом па вул. Чкалава, 24-кватэрны дом па вул. Леніна, жылыя дамы № 6, 7, 8 па праспекце Будаўнікоў, 12-павярховы жылы дом для маласямейных у Віцебску.

**Багдановіч Вацлаў Пятровіч** (28.09.1965, в. Буні Ашмянскага р-на), беларускі выдавец, журналіст. Скончыў у Ашмянах СШ № I. У 1988 скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Працаваў карэспандэнтам БелТА (1988-92), загадчыкам аддзела палітыкі і права штотыднёвіка "7 дней" (1992-94). Выдаваў газету "Мост Меркурыя" (1992-93). З 1994 — прэзідэнт незалежнай выдавецкай кампаніі "Тэхналогія", якая выпускае палітычную, культуралагічную, даведачную, мастацкую літаратуру на беларускай і замежных мовах (серыі "Адкрытае грамадства", "Бібліятэка беларускай дыяспары", "Вяртанне").

**Багдановіч Ірына Эрнстаўна** (30.04.1956, г. Ліда), беларуская пісьменніца (паэтка, крытык і літаратуразнавец). Кандыдат філалагічных навук (1985). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1989). З сям'і інжынераў. Дзяцінства прайшло ў Гомелі, у дзеда і бабулі. У Гомелі скончыла СШ, затым гістарычна-філалагічны факультэт універсітэта (1978). Вучылася ў аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1978-81). Працуе ў гэтым інстытуце ст. навуковым супрацоўнікам (адначасова з 1997 выкладае на кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ). Вершы друкуе з 1973, літаратурна-крытычныя артыкулы з 1979. Выдала зборнікі паэзіі "Чаравікі маленства" (1985), "Фрэскі" (1989), "Вялікдзень" (1993). Аўтар шматлікіх артыкулаў і рэцэнзій пра беларускую паэзію 20-х і сучаснага перыяду. Выйшла яе даследаванне "Янка Купала і рамантызм" (1989).

**Багдзевіч Анатоль Восіпавіч** (4.02.1973, г. Шчучын), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1999). З сям'і лекараў. У 1973 пераехалі ў в. Забалаць (Воранаўскі р-н), тут скончыў СШ (1990). У 1990-95 — студэнт філфака (аддзяленне беларускай філалогіі і культуры) Гродзенскага універсітэта. Вучыўся ў аспірантуры на кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства гэтага універсітэта (1995-98). Тут выкладае. Друкуецца як мовазнавец з 1996. Навуковыя інтарэсы звязаны з праблемамі беларускага словаўтварэння, тэрміналогіі.

**Бажко Алесь** (Аляксандр Цімафеевіч, 22.10.1918, в. Даўгінава Карэліцкага р-на), беларускі пісьменнік (паэт, празаік, публіцыст). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1957). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1977). З беднай сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў Даўгінаве, 7-годку ў Ярэмічах (Навагрудскі р-н) у 1932. Вучыўся ў Навагрудскім музычным інстытуце па класе скрыпкі (1936-38), у кансерваторыі ў Варшаве (1938-39). У 1940 працаваў дырэктарам РДК у Міры (Карэліцкі р-н). У гэтым жа годзе мабілізаваны ў савецкае войска, удзельнічаў у вайне, быў паранены. З 1942 — на абаронным будаўніцтве ў Волагдзе. Удзельнічаў у стварэнні Войска Польскага як генеральны інструктар прапаганды Валагодскай акруговай управы Саюза польскіх патрыётаў. У 1945-46 — інструктар Баранавіцкага абкама камсамола, першы сакратар Дзятлаўскага райкама камсамола. У 1946-62 — на журналісцкай рабоце (у Баранавіцкай абласной газеце "Чырвоная звязда", на абласным радыё, у рэспубліканскіх газетах "Савецкі селянін", "Чырвоная змена", маладзечненскай абласной газеце "Сталінскі шлях", у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", газеце "Голас Радзімы"). У 1955 завочна скончыў Літаратурны інстытут у Маскве. Затым — загадчык рэдакцыі выдавецтва "Беларусь" (1962-68), намеснік галоўнага рэдактара ў "Літаратуры і мастацтве" (1968-73), дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы (1973-77). У 1977-78 — намеснік начальніка ўправы па справах мастацтва Міністэрства культуры, галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі. Друкуецца з 1945. Аўтар палітычных памфлетаў, нарысаў, гумарыстычных апавяданняў, аповесцяў, вершаў, паэм, вершаваных аповесцяў. Выдаў аповесці "Перад вераснем" (1959), "Позняе ворыва" (1963), перавыдадзеныя асобнай кніжкай у 1979, вершаваныя аповесці "Карвіга пакідае хутар" (1961), "Блакітныя вербы" (1973), "Лясныя крушні" (1981), паэму "Татры", зборнік "Татры. Карвіга пакідае хутар" (1968), зборнік паэзіі "Суладдзе" (1975), кніжкі выбранай паэзіі "Каласы і скалы" (1978), "Выбраныя творы" (1987), зборнікі палітычных памфлетаў "Татальнае банкруцтва" (1973, 2-е выд. 1982), "Жывыя прывіды" (1986). Аповесці ў перакладзе на рускую мову выйшлі ў Маскве (у 1968). Перакладае з польскай, славацкай моваў.

**Базнікін Юры Іванавіч** (30.04.1946, г. Ваўкавыск), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1987). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1975). Жыве і працуе ў Мінску. Спецыялізуецца ў галіне індустрыяльнага дызайна. Удзельнік выставаў (з 1973) у Беларусі, Расіі, Германіі. Выконвае афармленне

пераносных радыёпрыёмнікаў. Сярод яго работ — "Акеан-209", "Акеан-214", "Акеан-215", "Селена РП 386", "Акеан-245" і інш.

**Байчораў Аляксандр Мухтаравіч** (4.10.1948, г. Гродна), беларускі палітолаг, філосаф. Доктар філасофскіх навук (1986). Прафесар (1988). Скончыў гістфак БДУ (1971), тут выкладаў з 1974. У 1980-87 — у Сакратарыяце ААН (Н'ю-Йорк). З 1987 — у Інстытуце кіравання і паліталогіі БДУ. З 1993 — начальнік управы міжнароднай бяспекі і раззбраення МУС Беларусі. Вывучае праблемы знешняй палітыкі ЗША, еўрапейскай бяспекі, міжнароднага кантролю над узбраеннямі. Выдаў кнігі (на рус. мове): "ЗША 70-х: сацыяльныя праблемы і супярэчнасці" (1979), "Ад "разбітага" пакалення да контркультуры" (1982), "Неакаланіялізм і міжнародны тэрарызм" (1985), "Уводзіны ў паліталогію" (1991).

**Бакст Леў Самойлавіч** (сапр. Розенберг, 9.05.1866, г. Гродна — 27.12.1924), рускі і французскі тэатральны мастак, графік, жывапісец. З сям'і гандляра, якая пераехала ў Пецярбург неўзабаве пасля нараджэння мастака. Тут скончыў гімназію. Вучыўся ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў (1983-87), у Парыжы (1893-96). Выкладаў жывапіс у прыватнай мастацкай школе ў Пецярбургу (1906-09). Да канца 90-х — сябра творчага аб'яднання "Свет мастацтваў". З 1910 жыў пераважна ў Парыжы. Ствараў дэкарацыі і касцюмы да драматычных спектакляў у Александрыйскім тэатры ("Іпаліт" Эўрыпіда, 1901; "Эдзіп у Калоне" Сафокла, 1901), да оперных і балетных спектакляў "рускіх сезонаў" С. Дзягілева ("Егіпецкія ночы" А. Арэнскага, 1909; "Шэхеразада" М. Рымскага-Корсакава, 1910; "Жар-птушка" І.Стравінскага,1910). Афармляў спектаклі ў тэатрах Парыжа ("Алена Спартанская" Э.Верхарна, 1912), Лондана, Рыма, Бруселя, Н'ю-Йорка. Яго кніжная графіка з ухілам да мадэрнізму (вокладкі, віньеткі) — у часопісах "Мир искусств", "Апполон", "Золотое руно", карыкатуры ў часопісах "Адская почта", "Сатирикон", "Жупел". Як жывапісец выстаўляўся з 1898 у Берліне, Празе, Вене, Бруселі, Венецыі, Рыме, Парыжы, Мюнхене. Пісаў сюжэтна-тэматычныя работы "Адмірал Авелан у Парыжы" (1894), "Імператрыца. Елізавета Пятроўна на паляванні" (1903), "Вячэра" (1902), дэкаратыўныя пано ("Ваза", 1906; "Элізіум", 1906; "Антычны жах", 1908), пейзажы, партрэты (І. Буніна, Д. Бенуа, І. Левітана, Л. Грыцэнкі, С. Дзягілева, А. Белага, З. Гіпіус, К. Дэбюсі, М. Балакірава, У. Розанава, Е. Набокава, аўтапартрэт). Пісаў тэарэтычныя працы ў галіне мастацтва.

**Баліцкі Антон Васілевіч** (17.09.1891, в. Балічы Гродзенскага р-на — 31.10.1937), беларускі грамадска-культурны дзеяч. З беднай сялянскай сям'і. Скончыў у Дашы (Гродзенскі р-н) царкоўнапрыходскую школу, у 1911 — Свіслацкую настаўніцкую семінарыю. Працаваў настаўнікам. У 1914-15 вучыўся ў Віцебскім настаўніцкім інстытуце. Быў мабілізаваны ў войска. З лютага 1917 — сябра палкавога камітэта, восенню 1917 — старшыня вайсковай Рады Паўднёва-заходняга фронту. Удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях у Пецярбургу (лістапад 1917). Працаваў на ніве адукацыі ў Расіі. У 1919 вучыўся ў Адэскім сельскагаспадарчым інстытуце. У 1920 — сябра калегіі Адэскага губернскага аддзела народнай асветы, старшыня губернскага саюза работнікаў асветы. Адкрываў у Адэсе беларускія школы. У 1921 адкліканы ў Мінск. Працаваў намеснікам наркома асветы БССР. Быў старшынёй секцыі беларускай мовы і літаратуры Інбелкульта (з 1925). З 1926 — нарком асветы БССР. Прымаў актыўны ўдзел у школьным будаўніцтве, у культурным жыцці рэспублікі. З 1929 — сябра Прэзідыуму Беларускай Акадэміі навук. Аўтар канцэптуальных артыкулаў па пытаннях нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Выдаў кн. "Аб сыстэме народнай асьветы" (1928). У 1930 рэпрэсаваны і зняволены на Салаўях, пазней расстраляны.

**Бандарына Зінаіда Аляксандраўна** (10.11.1909, г. Гродна — 16.04.1959), беларуская пісьменніца (паэтка, празаік, нарысіст ). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1957). З сям'і настаўніка гімназіі. З 1924 працавала ў саўгасе "Тарасава" (Мінская вобл.), у дзіцячым садзе ў Койданаве. Вучылася ў Белпедтэхнікуме (1925-27), удзельнічала ў рабоце літаратурнай студыі, створанай тут. Настаўнічала ў 1927-28 у беларускай пачатковай школе ў пас. Медзякова Новасібірскай вобл. Захварэўшы, вярнулася ў Беларусь і працавала ў газеце "Палеская праўда" (1928-29). У 1930-33 вучылася на літаратурна-сцэнарным факультэце Маскоўскага інстытута кінематаграфіі. Загадвала сцэнарным аддзяленнем Віцебскага кінатэхнікума (1933-34). У 1937 скончыла аспірантуру Акадэміі мастацтваў у Ленінградзе і працавала на кінастудыях і ў тэатрах Масквы, Архангельска, Горкага. У час вайны — санінструктар на фронце. Супрацоўнічала ў часопісе "Бярозка" і на Беларускім радыё (1945-46), была дырэктарам Дома народнай творчасці ў Гродне (1946-48), загадвала філіяй музея Я. Купалы ў Вязынцы (1948-50), працавала ў рэдакцыях газет "Зорька", "Літаратура і мастацтва" (1950-56). Першыя творы — у калектыўным зборніку "Вершы" (1926). Выдала зборнік паэзіі "Веснацвет" (1931), аповесць "Галіна Ільіна" (1959, на рус. мове). Выйшаў зборнік

апавяданняў "Лясныя госці" (1960), аповесць пра Я. Купалу "Ой рана на Івана" (1961, 2-е выд. 1979).

**Баравік Вольга Абрамаўна** (18.02.1909, г. Гродна — 5.08.1973), беларускі мастацтвазнавец. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1962). Скончыла завочна гістфак БДУ (1954). Працавала ў мастацкім музеі БССР (1952-73). Друкавалася як мастацтвазнавец з 1952. Вывучала жывапіс пасляваенных часоў. Пісала пра творчасць В. Бялыніцкага-Бірулі, А. Тычыны, В.Ціхановіча, Л. Лойтмана, С. Раманава, пра мастацкае жыццё Беларусі.

**Баран Сяргей Восіпавіч** (27.09.1892, в. Віцькі Гродзенскага р-на — 1937), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Гродне. Вучыўся на "вышэйшых навуковых курсах" у Кіеве. У 1914-17 — у войску, на Паўднёва-заходнім фронце. З 1919 — старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта ў Гродне. У 1920 — старшыня Грамады беларускай моладзі ў Гродне. Адзін з заснавальнікаў, настаўнік беларускай прагімназіі (гімназіі) у Гродне (1918-21). Узначальваў аддзел Гродзеншчыны ў Беларускім Таварыстве чырвонага крыжа (1921-22). Дэлегат Беларускай палітычнай канферэнцыі ў Празе (1921). Уваходзіў у склад управы "Саюза спажывецкіх кааператараў Гродзеншчыны". Быў выбраны ў польскі сейм (1922), уваходзіў у Беларускі пасольскі клуб. Апекаваўся беларускім прытулкам у Гродне. У 1923 асуджаны да зняволення за ўдзел у ўзброенай барацьбе супраць Польшчы. Выйшаў з брэсцкай турмы у 1927. Перайшоў у БССР. Працаваў тут у ЦК МАДРа. Вучыўся ў Вышэйшым педагагічным інстытуце ў Мінску. У 1933 рэпрэсаваны. З 1935 зняволены ў Дальлагу, пазней расстраляны.

**Баран Уладзімір Іванавіч** (17.10.1908, в. Пілюкі Гродзенскага р-на — 21.11.1991), беларускі педагог. Заслужаны настаўнік Беларусі (1960). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе ў в. Верцялішкі (Гродзенскі р-н), у настаўніцкай семінарыі ў Гродне (1925-31). У 1935 скончыў геаграфічны факультэт Варшаўскага універсітэта. Падчас вучобы (у 1934-35) быў выхавальнікам у дзіцячым доме "Наш дом" у Варшаве. З 1935 — настаўнік геаграфіі і чарчэння ліцэя №1 і гімназіі імя С. Баторыя ў Варшаве. З снежня 1939 выкладаў у рускай СШ № I у Гродне. У 1944-50 — намеснік дырэктара гродзенскай СШ №7. У 1950-72 працаваў дырэктарам СШ №1 у Гродне, у 1972-82 — настаўнік гэтай школы. Быў сябрам Вучонай Рады Гродзенскага педінстытута ў 60-я — пач. 70-х.

**Баранава Лідзія Іванаўна** (дзявоч. Рокат, 25.05.1949, в. Мядзведка Карэліцкага р-на), беларускі педагог. Кандыдат педагагічных навук (1990). У 1952 пераехала з бацькамі ў Мінск. Тут скончыла СШ № 8 (1966). Працавала на Мінскім гадзіннікавым заводзе (1966-68). У 1968-72 — студэнтка факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання Мінскага педінстытута. Затым працавала настаўніцай пачатковых класаў у школах Мінска. У 1981-83 была лабарантам на кафедры педагогікі Мінскага педінстытута. Вучылася ў аспірантуры на гэтай кафедры (1983-86). З 1986 выкладае на кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання (з 1996 на пасадзе дацэнта). Даследуе праблемы выхавання школьнікаў малодшых класаў.

**Бартосік Іван Станіслававіч** (1.11.1933, мяст. Бярозаўка Лідскага р-на), беларускі мастак, майстар шкловырабаў, шліфоўшчык-алмазчык. З 1949 на шклозаводзе "Нёман". Распрацаваў уласныя прыёмы ў тэхніцы алмазнай грані, шліфаваў малюнкі на творах з крышталёвага шкла. Сярод уласных твораў: камплекты святочнага посуду (1966), "Дэсертны" (1968), "Ваза" (1970), "Гранат" (1978), прыборы "'Хрусталёвае свята" (1967), "Стройны" (1980), пасуда пад гародніну (1972), сервіз (1977), ваза пад гародніну ў стылі "рэтра" (1982).

**Басюк Іван Аляксандравіч** (1.09.1942, в. Амневічы Навагрудскага р-на), беларускі гісторык, правазнавец, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1982). Дацэнт (1982). З сялянскай сям'і. Скончыў Амневіцкую СШ (1960). Вучыўся ў Саратаўскай ваеннай вучэльні (1960-63). Служыў у войску. У 1972 завочна скончыў гістфак Архангельскага педінстытута і ў 1981 аспірантуру пры Інстытуце гісторыі, філалогіі і філасофіі Сібірскага аддзялення Акадэміі навук СССР (Новасібірск). Працаваў на выкладчыцкай і кіраўнічай рабоце ў сістэме вышэйшых навучальных ваенных устаноў СССР у 1974-87 (у 1982-87 — начальнік кафедры Пермскай вышэйшай ваеннай вучэльні. Палкоўнік). З 1987 — дацэнт кафедры палітычнай гісторыі Гродзенскага універсітэта. З 1991 выкладае на кафедры гісторыі дзяржавы і права гэтага універсітэта. Вывучае пачатковы перыяд вайны 1941-45, гісторыю беларускай дзяржаўнасці. Сааўтар навучальных дапаможнікаў для студэнтаў "Асноўныя этапы беларускай дзяржаўнасці" (Гродна, 1992, 2-е выд. 1997), "Асновы тэорыі дзяржавы" (1995), даследаванняў "Беларуская дзяржаўнасць" (Гродна, 1997), "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: са старажытнасці да сённяшніх дзён" (Гродна, 1998). Выдаў кнігу "Навагрудскі кацёл" (Гродна, 1998).

**Батурын Аляксандр Восіпавіч** (17.06.1904, мяст. Ашмяны), рускі спявак (бас-барытон). Народны артыст РСФСР (1947). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1943). З сям'і настаўніка. У 1911 пераехалі ў Адэсу. Вучыўся тут у "механічнай" вучэльні (1917). Затым працаваў шафёрам, памочнікам механіка цэнтральнага гаража ў Адэсе. Спяваў у мастацкай самадзейнасці. У 1925 скончыў Ленінградскую кансерваторыю (клас К. Ісачанкі). У 1925-27 удасканальваў майстэрства ў музычнай акадэміі ў Рыме. Выступаў з канцэртамі ў гарадах Італіі, Францыі, Бельгіі, Германіі. У 1927-58 — саліст Вялікага тэатра оперы і балета (Масква). У оперным рэпертуары былі партыі Тэля ("Вільгельм Тэль" Дж. Расіні), Томскага ("Пікавая дама" П. Чайкоўскага), Ігара ("Князь Ігар" А. Барадзіна), Мефістофеля ("Фаўст" Ш. Гуно), Эбі-Хакія ("Іяланта" П. Чайкоўскага), Качубея ("Мазепа" П. Чайкоўскага), Руслана ("Руслан і Людміла" М. Глінкі), Дон Базіліа ("Севільскі цырульнік" Дж. Расіні), Дасіфея ("Хаваншчына" М. Мусаргскага), Пімена ("Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага). З 1948 вёў адначасова клас оперных спеваў у Маскоўскай кансерваторыі (з 1962 — прафесар). Выступаў як канцэртны спявак. Гастраляваў у пасляваенны час у Польшчы, Чэхіі, ГДР, Венгрыі, Італіі, Бельгіі, Англіі.

**Бахматовіч Казімір** (1808, в. Дабраўляны Смаргонскага р-на — 1837), беларускі мастак. З сям'і сялян. Вучыўся ў Віленскім універсітэце ў Я. Рустэма (1823-29). Летам 1827 і 1828 жыў у маёнтку Дабраўляны, быў хатнім настаўнікам малявання ў Гюнтараў. Летам 1828 выканаў насценны жывапіс у капліцы ў Дабраўлянах. У 1829-30 жыў у Вільні, меў майстэрню ў доме Гюнтараў. Пасля стала жыў у Дабраўлянах. Летам 1833 ездзіў па Віленшчыне, быў у Сэрвачы (Карэліцкі р-н). Найбольш працаваў у жанры літаграфіі, пісаў акварэллю тэматычныя кампазіцыі. Выканаў цыклы "Сувенір для Дабраўлян" (1835), "Успаміны пра Вільню" (1837), сцэны з жыцця маёнтка. Яму належаць малюнкі: "Марыя Магдалена-пакутніца", "У спальні", "Разня і рабунак мястэчка казакамі", "Алегарычная сцэна (апафеоз мастацтва)", "Анёлак", "Дзяўчынка з немаўлём", "Мужчынскі партрэт", "Партрэт Рустама", "Літоўская сялянка", "Бойка ў карчме".

**Башко Пётр Кузьміч** (12.01.1945, в. Некрашэвічы Карэліцкага р-на -27.06.1993), беларускі гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1978). З сялянскай сям'і. Пачатковую школу скончыў у роднай вёсцы, СШ — у в. Лукі Карэліцкага р-на (1962). Скончыў гістфак БДУ (1970). З 1972 працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (з 1981 — ст. навуковы супрацоўнік). Даследаваў гісторыю Кастрычніцкай

рэвалюцыі 1917. Выдаў кн. "Саветы рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Беларусі. Сакавік-кастрычнік 1917 г." (1987, на рус. мове). Сааўтар "Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР". Т. 2 (1985). Адзін з складальнікаў атласа "Вялікі Кастрычнік" (М.,1987).

**Баяровіч Мар'ян Андрэевіч** (1.01.1933, в. Альгецішкі Ашмянскага р-на), беларускі музыкант (баян, гармонік, акардэон, цымбалы, домра), музычны педагог, фалькларыст. З сям'і каваля. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Кракаўка (Ашмянскі р-н), у Ашмянскай СШ № І. Працаваў сакратаром (1951-53), старшынёй (1953-54) Ашмянскага сельсавета. Вучыўся ў Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні (1954-58), дзе пакінуты на працы. Быў выкладчыкам, загадчыкам аддзялення, намеснікам дырэктара па навучальнай рабоце (1958-75). З 1975 — у Лідскай музычнай вучэльні — намеснік дырэктара па навучальнай рабоце (1975-77), дырэктар (1977-96). Затым — выкладчык па класе баяна. Выступаў у 50-70-я ў канцэртах як баяніст-саліст. Рыхтуе апрацоўкі народных песень і танцаў для баяна. Запісвае (з 60-х) беларускія народныя песні Гродзеншчыны. Выдаў зборнік "Беларускія народныя песні і танцы: апрацоўкі для баяна, акардэона і двухрадавага храматычнага гармоніка" (1998). Старшыня Лідскага метадычнага аб'яднання выкладчыкаў дзіцячых музычных школ, Лідскага аддзялення Саюза музычных дзеячаў Беларусі.

**Белакоз Алесь** (Аляксандр Мікалаевіч, 11.09.1928, в. Ляткі Мастоўскага р-на), беларускі педагог, краязнавец, музеязнавец. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1987). З сялянскай сям'і. У в. Гудзевічы (Мастоўскі р-н) скончыў 7-годку (1944). Сярэднюю адукацыю атрымаў у Ваўкавыскай рускай школе (1947). Настаўнічаў у пачатковых класах у Гудзевічах. У 1950-52 служыў у войску. У 1953-55 — настаўнік пачатковай школы ў в. Струга Мастоўскага р-на. Выкладаў беларускую і нямецкую мовы ў Радзевіцкай 8-годкі Мастоўскага р-на (1955-59). Завочна скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры літфака Гродзенскага педінстытута (1958). У 1959-90 — настаўнік беларускай мовы і літаратуры СШ у в. Гудзевічы (быў намеснікам дырэктара па навучальнай частцы ў 1961-65). Вёў шырокую нацыянальна-патрыятычную работу з вучнямі (перапіска іх з пісьменнікамі, мастакамі, вучонымі на тэмы роднага слова, гісторыі, культуры, арганізацыя збору краязнаўчых матэрыялаў, выданне вучнёўскага часопіса-гадавіка "Праменьчык" (15 выпускаў). З 1965 экспануе ў школе літаратурна-краязнаўчыя матэрыялы.У 1968 адкрывае для наведвальнікаў школьны музей, у 1990 — дзяржаўны

музей у Гудзевічах. З 1990 працуе дырэктарам Гудзевіцкага літаратурна-этнаграфічнага музея. Удзельнік нацыянальных і міжнародных навуковых канферэнцый і семінараў па пытаннях краязнаўства і патрыятычнага выхавання школьнікаў.

**Бен-Авігдор** (сапр. Шалкевіч Аўрахам, 1867, мяст. Жалудок Шчучынскага р-на — 1921), яўрэйскі выдавец, пісьменнік. З 1891 жыў у Варшаве, дзе выдаваў на іўрыце кніжную серыю "Сіфрэй агора", разлічаную на масавага чытача. Стварыў у Варшаве друкарскі дом "Ахіясаф" (1893), дзе выпусціў тры тамы штогодніка "Луах Ахіясаф" (1894-96). У 1896 адыйшоў ад друкарскага дома і арганізаваў выдавецкае таварыства "Тушыя", якое выпускала пераклады з замежных моваў. У 1901 выпускаў тыднёвік для дзяцей "Алам катан". Заснаваў выдавецтва "Ахісефер" (1913). Выдаваў і ўласныя творы (аповесці, апавяданні). Адзін з першых папулярызатараў кнігі на сучасным іўрыце.

**Бергман Аляксандра Рыгораўна** (дзявоч. Кучкоўская, 1.05. 1906 г. Гродна), беларуская і польская грамадская дзяячка, гісторык, публіцыстка. Вучылася ў Гродне ў прыватных гімназіях, дзе далучылася да камуністычнага руху. У 1925 як інструктар камсамола Заходняй Беларусі выязджае з Гродна ў Вільню, затым у Брэст, Баранавічы. У 1927 вучылася ў партшколе КПЗБ у Мінску. Удзельніца І-га з'езду КПЗБ (1928). У 1929-31 — у Маскве, дзе працавала на электразаводзе і вучылася ў Міжнароднай "ленінскай" школе. З 1931 — сябра краёвага Сакратарыята КПЗБ. У 1932 — удзельніца нарады КПЗБ у Берліне. Працавала ў партшколе КПЗБ у Мінску (1932, 1933). У 1934-35 - рэдактар шматтыражовай газеты на абутковай фабрыцы ў Мінску, пазней — 2-гі сакратар партарганізацыі на Гомельшчыне. У канцы 1935 рэпрэсавана савецкімі ўладамі. Зняволена ў канцлагерах у Кіраве, Комі АССР, Кемераўскай вобл. У 1943 вызвалена, але затрымана. У 1945 выехала ў Польшчу. Працавала на паліграфічным камбінаце ў Лодзі (1945-48). Затым, пераехаўшы ў Варшаву, — у рэдакцыі часопіса "Życie partyi". Вывучала рэвалюцыйна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі (20-30-х), яго постаці. Друкавалася ў часопісах "Z pola walki", "Kwartalnik historyczny", "Rocznik Białostocki". Супрацоўнічала з беластоцкім тыднёвікам "Ніва", з Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы, выступала з лекцыямі ў Варшаўскім аддзеле БГКТ. Выдала (на польскай мове) манаграфію "Слова пра Браніслава Тарашкевіча" (Варшава, 1977, перавыдадзена на беларускай мове ў Мінску ў 1996). Зборнік гістарычных партрэтаў і нарысаў

"Беларускія справы ў II-ой Рэчы Паспалітай" выйшаў у Варшаве ў 1984.

**Берлін Нафталі** (1817, мяст. Мір Карэліцкага р-на — 1893), яўрэйскі духоўны дзеяч, рабін. У 1857-92 кіраваў ешыботам у Валожыне, стварыў тут духоўны цэнтр яўрэяў усходнеславянскага рэгіёну. Пісаў традыцыйна-рэлігійныя творы, каментарыі да Бібліі. Актыўна прапагандаваў рух за пасяленне яўрэяў у Палесціне.

**Бібіла Валянціна Мікалаеўна** (6.08.1949, в. Нацавічы Мастоўскага р-на), беларускі правазнавец, педагог. Доктар юрыдычных навук (1996). З сям'і старшыні калгаса. Вучылася ў пачатковай школе (2-3 кл.) у в. Сямашкі (Мастоўскі р-н). 8 кл. скончыла ў Гудзевічах (Мастоўскі р-н). Працягвала вучобу ў Ваўкавыскай філіі Слонімскай медычнай вучэльні (1964-68). Працавала загадчыцай фельчарска-акушэрскага пункта ў в.Мештуны Ваўкавыскага р-на (1968-70). Затым — студэнтка юрыдычнага факультэта БДУ (1970-75), аспірантка кафедры крымінальнага працэсу БДУ (1975-78). З 1978 выкладае (з 1985 на пасадзе дацэнта, з 1997 — прафесара) на кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду БДУ. Друкуецца з 1979. Аўтар шматлікіх публікацый на тэмы фармавання прававой дзяржавы, прынцыпаў правасуддзя, юрысдыкцыі суда, суда прысяжных, а таксама методыкі выкладання юрыдычных дысцыплін. Выдала (на рускай мове) даследаванні:"Канстытуцыйныя прынцыпы правасуддзя і іх рэалізацыя ў стадыі выканання прысуду" (1986), "Арганізацыя навучання студэнтаў у юрыдычных вышэйшых навучальных установах" (1998).

**Бібіла Юлія Восіпаўна** (29.12.1896, мяст. Поразава Свіслацкага р-на -9.12.1974), беларускі бібліёграф, майстар мастацкага ткацтва. З сям'і валаснога пісара. Скончыла жаночую гімназію ў Ваўкавыску (1914) і пераехала з маці ў Бабруйск, дзе вучылася ў 8 кл. Удзельнічала ў рабоце Бабруйскага аддзела Беларускай сацыялістычнай грамады, Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Была сябрам (з снежня 1917) "Беларускага культурна-асветнага таварыства" ў горадзе. Працавала ў гарадской бібліятэцы, дзе стварыла аддзел краязнаўства. З 1921 — у Мінску, працуе ў Дзяржаўнай бібліятэцы Беларусі, з 1922 — загадчыцай аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі (адначасова вучылася на педфаку БДУ, скончыла ў 1925), стварыла тут бібліяграфічную картатэку літаратуры пра Беларусь. Арганізавала выданне (з 1924) "Летапісу беларускага друку".

Адначасова выкладала беларускую літаратуру ў 13-ай 7-гадовай даследча-паказальнай школе пры педфаку БДУ. Была сакратарам бібліяграфічнай камісіі Інбелкульта. У 1937 рэпрэсавана і выслана ў Саратаў, дзе працавала майстрам у арцелі "Каруначніца" (1937-38). У 1938-39 зняволена ў турме. У 1939-59 была галоўным біблёграфам бібліятэкі Саратаўскага універсітэта. З 1959 — у Мінску, супрацоўнічала з беларускім аддзелам Дзяржаўнай бібліятэкі. Займалася мастацкім ткацтвам (паясы, гальштукі, закладкі для кніг), удзельнічала ў выставах, калекцыянавала ўзоры беларускага нацыянальнага ткацтва. Выдала бібліяграфічныя паказальнікі: "Летапіс беларускага друку". Ч. 3. 1917-1924 гг. Сш. І (1927); "Летапіс беларускага друку. Ч. 4. Перыядычны друк на беларускай мове" (1927); "Летапіс беларускага друку. Ч. 2. Паасобныя выданні на беларускай мове. 1835-1916 гг." (1929); "Беларускі перыядычны друк. 1917-1927 гг." (1929). Адзін з складальнікаў даведніка "Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм" (1969), паказальніка "Асвета ў Беларускай ССР за 50 гадоў Савецкай улады" (1973).

**Бітэль Пятро** (Пётр Іванавіч, 6.06.1912, мяст. Радунь Воранаўскага р-на — 18.10.1991), беларускі пісьменнік (паэт, перакладчык), педагог, праваслаўны святар. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1985). З сям'і паштальёна. Наведваў школу ў бежанстве, у Расіі. Па звароце дадому вучыўся ў Вішнеўскай школе (Валожынскі р-н). У 1925-31 — у Барунскай і Віленскай настаўніцкіх семінарыях. Прыхваткамі меў настаўніцкую працу на Нясвіжчыне (1931-33). У 1933-34 служыў у войску. Дэмабілізаваўшыся, быў беспрацоўным. У 1935-39 — загадчык пачатковай школы ў в. Даўгінава (Карэліцкі р-н). Актыўна ўдзельнічаў тут у вясковай мастацкай самадзейнасці. У жніўні 1929 скончыў завочна 3-гадовыя Вышэйшыя настаўніцкія курсы (гістарычна-філалагічнае аддзяленне) пры Віленскім універсітэце. У верасні 1939 зноў узяты ў польскае войска. Неўзабаве трапіў у савецкі палон. Вывезены ў глыбіню Расіі. Затым адпушчаны дадому. Працаваў настаўнікам у Вішнеўскай школе, дырэктарам 7-годкі №2 Валожына, інспектарам-метадыстам Валожынскага РайАНА (1939-41). У 1942-44 настаўнічаў у Валожыне ў школе, пасля ў сярэдняй гандлёвай вучэльні. У 1944 высланы з сям'ёй у Германію. Па дарозе ў выніку аварыі цягніка ўдалося ўцячы. Жылі ў г. Кашалін (Польшча), апекаваліся дзецьмі, вывезенымі з Беларусі. У маі 1945 узяты ў савецкае войска. У пач. 1946 вярнуўся дамоў. Настаўнічаў у в. Забрэззе Валожынскага р-на. Вясной 1947 звольнены па палітычных матывах. Скончыў падрыхтоўчыя курсы ў Жыровіцкім манастыры і

працаваў праваслаўным святаром у в. Міжэвічы Слонімскага р-на, з 1949 — у Докшыцах на Віцебшчыне. У 1950 рэпрэсаваны і зняволены ў Камышлагу, Омску, Джэсказгане. З 1956 — на радзіме. Зноў быў святаром (на Гомельшчыне). У 1962 страціў гэтую службу з-за праследавання ўладаў. У 1963-74 — настаўнік Вішнеўскай СШ (нямецкай мовы і малявання). Завочна скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Мінскага педінстытута (1970) і цэнтральныя курсы "Ин-яз" у Маскве (1970). Артыкулы на педагагічныя тэмы друкаваў з 1937, вершы з 1939. Выдаў кнігі паэзіі "Замкі і людзі" (1968), "Паэмы" (1984), "Дзве вайны" (1990). Пераклаў на польскую мову многія творы А Міцкевіча, таксама М. Канапніцкай, Ю. Славацкага, Ю. Крашэўскага, Г. Сянкевіча, Т. Шаўчэнкі, І. Франка, С. Ясеніна, А. Твардоўскага, Ф. Шылера, Б. Брэхта, І.-В. Гётэ.

**Біч Міхаіл Восіпавіч** (27.05.1937, в. Мілевічы Мастоўскага р-на — 17.05. 1999), беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук (1985). З сялянскай сям'і. Скончыў Мілевіцкую 7-годку, Дзярэчынскую СШ Зэльвенскага р-на (1953), гістфак БДУ (1958). Настаўнічаў у Цёплаўскай СШ Пастаўскага р-на (1958-59), у Курылавіцкай СШ Мастоўскага р-на (1959-61). З 1961 працуе ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (з 1983 — загадчыкам сектара, пасля аддзела гісторыі Беларусі канца XVIII — пач. XX ст., адначасова з 1989 — намеснік дырэктара інстытута). У 1992-95 узначальваў навуковую групу, якая распрацоўвала для сярэдняй школы новыя праграмы і новую перыядызацыю сусветнай і нацыянальнай гісторыі. Друкаваўся як гісторык з 1966. Вывучаў гістарычнае жыццё Беларусі XIX — пач. XX ст. Выдаў даследаванні: "Развіццё сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі ў 1883-1903 гг." (1973, на рус. мове), "Рабочы рух у Беларусі ў 1861 -1904 гг." (1983, на рус. мове), дапаможнік для вучняў 8-х кл. "Гісторыя Беларусі: Канец XVIII — 1917 г." (1993). Сааўтар "Гісторыі Беларускай ССР" Т. 2. (1972), калектыўнай манаграфіі "Гістарычныя карані дружбы і яднання ўкраінскага і беларускага народаў" (Кіеў, 1978, на рус. мове), "Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР". Т. І. (1984), калектыўнага даследавання "Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г." (1985), кнігі "Полацк: Гістарычны нарыс" (2-е выд., 1987), навучальнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. XX ст." (1992), "Нарысаў гісторыі Беларусі" Т. І. (1994).

**Бічэль Данута Янаўна** (Бічэль-Загнетава, у замужжы Загнетава, 1.01.1938, в. Біскупцы Лідскага р-на), беларуская паэтка.

Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1964). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984). З сялянскай сям'і. Дзяцінства прайшло на хутары Загасцінец. У Біскупцах вучылася ў пачатковай школе, у Дакудаве (Лідскі р-н) — у 5-ым кл., у Карнілках (Лідскі р-н) скончыла 7-годку (1953). Вучылася ў Лідскай, затым Навагрудскай педагагічных вучэльнях (1953-57), на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута (1957-62). Працавала настаўніцай СШ рабочай моладзі № 5 у Гродне. З 1982 — ст. навуковы супрацоўнік Гродзенскага абласнога гістарычна-археалагічнага музея. У 1994-98 — дырэктар музея М. Багдановіча ў Гродне. Сакратар Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). Друкуецца з 1958. Выдала зборнікі паэзіі: "Дзявочае сэрца" (1961), "Нёман ідзе" (1964), "Запалянка (1967), "Доля" (1972), "Ты — гэта ты" (1976), "Дзе ходзяць басанож" (1983), "Загасцінец" (1985), "А на Палессі" (1990), "Божа мой, Божа" (1993), "Крэсавякі" (1993, у сааўт.), "Ты не самотны..." (Гродна, 1997, у сааўт.). Выйшлі кніжкі вершаў для дзяцей: "Перапёлка" (1968), "Грыб-парасон"(1969), "Дзічка" (1971), "Рыжая палянка" (1971), "Дагані на кані" (1973), "Лузанцы" (1982), "Габрынька і Габрусь" (1985), "Гарадніца" (1993). Выбраныя творы сабраныя ў кнігах "Браткі" (1979), "Даўняе сонца" (1987), "Снапок" (1998). Вершы ў перакладах на польскую мову выйшлі ў Лодзі (у 1981), на рускую мову — у Маскве (у 1969 і 1990). Перакладае з польскай, рускай, украінскай моваў. Складальніца зборнікаў літаратурных твораў.

**Блакіт Валянцін** (сапр. Болтач Валянцін Уладзіміравіч, 7.10.1938, в. Вострава Шчучынскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, публіцыст), журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1981). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку у в. Дуброва Шчучынскага р-на, 10-ты кл. у Скідзелі (Гродзенскі р-н). Быў літсупрацоўнікам у Шчучынскай райгазеце "Чырвоны сцяг" (1956-60), у Жалудоцкай райгазеце "За Радзіму" (1960-62). Затым — у міжраённай газеце "Савецкая вёска" ў Шчучыне. У 1963-67 — адказны сакратар Воранаўскай раённай газеты "Ленінскі сцяг" (у 1966 завочна скончыў аддзяленне журналістыкі філфака БДУ). У 1967-68 — уласны карэспандэнт абласной газеты "Гродненская правда". З 1968 — загадчык сектара друку, радыё і тэлебачання, з 1971 — намеснік загадчыка аддела прапаганды Гродзенскага абкама КПБ. У 1972-74 вучыўся у Вышэйшай партшколе пры ЦК КПСС. З 1978 — загадчык сектара радыё і тэлебачання ЦК КПБ. З 1987 — галоўны рэдактар часопіса "Вожык". Пачынаў з вершаў, карэспандэнцый, якія апубліка-

ваў у школьныя гады. Празаічны дэбют — у 1967 у газеце "Звязда". Друкаваў нарысы, публіцыстычныя артыкулы, гумарэскі, апавяданні, аповесці. Выдаў зборнік гумарыстычных апавяданняў "Вынаходнік" (1974), зборнікі аповесцяў "Час прылёту журавоў" (1979), "Шануй імя сваё" (1981), "Усмешка фартуны" (1984), "Аповесці" (1988). Выйшла кніга прозы "Вырай" (1986). Зборнік аповесцяў у перакладзе на рускую мову выйшаў у Маскве ў 1985.

**Богуш Аляксандр Уладзіміравіч** (15.09.1930, в. Вялікая Мядзведка Карэліцкага р-на), беларускі журналіст, краязнавец, гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1971). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1987). Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1959). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Мір (Карэліцкі р-н) у 1949 і працаваў дома на гаспадарцы. З 1950 — карэспандэнт газеты Мірскай МТС "За высокі ўраджай". З 1954 — адказны сакратар, затым намеснік рэдактара Мірскай раённай газеты "Сцяг Свабоды". У 1956-69 працаваў рэдактарам Казлоўшчынскай райгазеты "Сцяг Перамогі" (завочна скончыў аддзяленне журналістыкі БДУ ў 1958, аспірантуру БДУ ў 1968). З 1969 працуе ў абласной газеце "Гродненская правда". Затым вучыўся ў Вышэйшай партшколе пры ЦК КПСС. Рэдагаваў у Лідзе аб'яднаную газету "Уперад". З 1979 — намеснік рэдактара, у 1980-91 — рэдактар абласной газеты "Гродненская правда". У 1991-98 працуе ў Гродзенскім абласным аддзяленні Беларускага фонду культуры. З 1998 — намеснік рэдактара часопіса "Ученые записки" (Гродна). З 1999 — рэдактар "Весніка" Гродзенскага універсітэта. Друкуецца як журналіст, краязнавец з 1950. Выдаў зборнік краязнаўчых нарысаў пра родныя мясціны і людзей "Жухавіцкае вымярэнне" (Ліда, 1997).

**Богуш-Сестранцэвіч Станіслаў Іванавіч** (3.09.1731, в. Занкі Свіслацкага р-на — 1.12.1826), беларускі грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч, асветнік, гісторык, мовазнавец-славіст, пісьменнік. З шляхецкай пратэстанцкай сям'і. Вучыўся ў пратэстанцкай школе. У 1745 выехаў у Германію, дзе ўступіў у войска. Затым вучыўся ў гімназіі ў Берліне. З 1748 — на філасофскім факультэце універсітэта Франкфурта на Одэры. З 1751 — на радзіме. Служыў у войску ў "Літоўскай" гвардыі. З 1754 — хатні настаўнік у Радзівілаў (перайшоў у каталіцтва). У 1763 скончыў Галоўную школу піяраў у Варшаве і быў высвечаны на ксяндза. Служыў у Гомелі, Бабруйску, Вільні, дзе ўзведзены ў сан епіскапа. З 1773 — біскуп Беларускага біскупства. З 1782 — магілёўскі арцыбіскуп. З 1798 — мітрапаліт каталіцкага

касцёла ў Расіі. У выніку прыдворных інтрыг двойчы зведаў ссылку. З 1801 жыў у Пецярбургу, часта выязджаў у Беларусь дзеля вывучэння краю і народу. Быў прыхільнікам ідэй гуманізму і Асветніцтва, выступаў супраць схаластыкі. Адкрываў у Беларусі школы. Заснаваў Магілёўскую друкарню (1774). Вёў даследаванні ў галіне гісторыі, філалогіі, медыцыны. З 1813 — прэзідэнт Вольнага эканамічнага Таварыства, сябра Расійскай Акадэміі навук. Пісаў на лацінскай, польскай, рускай мовах. Выдаў гістарычна-краязнаўчую працу "Пра Заходнюю Расію" (Магілёў, 1793), "Статут для касцёлаў і каталіцкіх манастыроў у Расійскай імперыі" (Вільня, 1798). Аўтар "Гісторыі Таўрыды" Т. 1-2 (Браўншвейг, 1800, СПб, 1806), "Гісторыі сарматаў і Славянаў" Т. 1-4 (СПб, 1812). У рукапісе засталася яго "Граматыка літоўская" (беларуская). Паставіў і выдаў у Магілёве трагедыю вершам "Гіцыя ў Таўрыдзе" (1785, 1788). Пісаў вершы, казанні. Выдаў свае пераклады заходнееўрапейскіх паэтаў. Збіраў старажытныя пісьмовыя помнікі.

**Богуш-Шышка Мар'ян** (16.02.1901, маёнт. Трокенікі Астравецкага р-на — 28.01.1995), польскі мастак (жывапісец, графік), мастацкі педагог. З шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію і вучыўся на мастацкім факультэце Віленскага універсітэта, затым у Кракаўскай Акадэміі мастацтваў. Быў выкладчыкам малявання. У 1939 мабілізаваны ў польскае войска. На пачатку вайны Германіі з Польшчай трапіў у нямецкі палон. З 1945 — у Італіі, дзе вучыў маляванню польскіх вайскоўцаў. З 1946 жыў у Англіі, дзе кіраваў мастацкай школай. Аўтар зборніка артыкулаў "Пра мастацтва" (Лондан, 1982). Творы зберагаюцца пераважна ў Англіі, часткова ў Польшчы.

**Болдак Ірына Аляксандраўна** (3.10.1955, г. Гродна), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1987). Дацэнт (1993). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ № I г. Гродна (1972), факультэт англійскай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў (1977). Працуе затым асістэнтам, ст. выкладчыкам, дацэнтам Гродзенскага педінстытута (універсітэта). У 1985 скончыла аспірантуру ў Мінскім інстытуце замежных моваў. Друкуецца з 1981. Асноўныя напрамкі навуковых інтарэсаў — лінгвістыка тэксту, тэматычная арганізацыя навуковага тэксту.

**Бохвіц Фларыян** (4.05.1799, мяст. Мір Карэліцкага р-на — 9.08.1856), беларускі асветнік, філосаф, пісьменнік. З сям'і памешчыка. Вучыўся ў канвікце дамініканаў у Нясвіжы, на юры-

дычным факультэце Кіеўскага, затым Віленскага універсітэтаў. Працаваў адвакатам у Навагрудку. З 1838 жыў з сям'ёй у маёнтку Вашкаўцы на Брэстчыне. Займаўся тут гаспадаркаю, літаратурнай працай, дабрачыннай дзейнасцю. У Вільні на польскай мове выйшла яго кніга "Выява думкі. На памятку маёй жонцы і дзецям" (1838, 2-е выд., 1839). Працяг гэтай маральна-філасофскай працы — "Выява маёй думкі пра мэты існавання чалавека" (Вільня, 1841). Першая кніжка ў перапрацаваным выглядзе выйшла ў 1842 пад назваю: "Асновы маіх думак і пачуццяў". Выдаў "Думкі пра выхаванне чалавека" (Вільня, 1847).

**Брагінскі Гедымін Генрыхавіч** (6.03.1933, в. Чычыноўшчына Іўеўскага р-на), беларускі педагог. Заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі (1981). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Эйгерды Іўеўскага р-на (1950), вучыўся ў Мінскім палітэхнікуме. У 1952-55 служыў у войску. У 1955-60 — студэнт Пскоўскага педінстытута (спецыяльнасць — хімія, біялогія, асновы сельскай гаспадаркі). Настаўнічаў у Іўеўскай СШ №2 (1960-62), быў дырэктарам Бакштанскай СШ Іўеўскага р-на (1962-65), загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Іўеўскага РК КПБ. У 1968-70 вучыўся ў Мінскай Вышэйшай партшколе. Працаваў затым інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі Гродзенскага абкама КПБ (1970-73), настаўнікам гісторыі Гродзенскай СШ №11 (1973-78), дырэктарам СШ №5 (1978-80). У 1980-93 быў дырэктарам Гродзенскай педагагічнай вучэльні.

**Бубновіч Іна Іванаўна** (дзявоч. Карпуць, 26.02.1968, в. Спудзвілы Бераставіцкага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1998). З сям'і настаўніка. У 1973 пераехалі ў в. Капцёўка Гродзенскага р-на, дзе скончыла СШ (1985). Вучылася на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1985-90). У 1990-92 выкладала тут на кафедры беларускай мовы. У 1992-95 — аспірантка кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага універсітэта. Затым працуе на гэтай кафедры (з 1998 на пасадзе дацэнта). Вывучае праблемы словаўтварэння, нармавання беларускай літаратурнай мовы. Друкуецца з 1993.

**Будзіловіч Антон Сямёнавіч** (5.06.1846, в.Коматава Гродзенскага р-на — 25.12.1908), рускі філолаг-славіст, гісторык, педагог, публіцыст. Доктар славянскай філалогіі (1879). Член-карэспандэнт Расійскай Акадэміі навук (1882). З сям'і ўніяцкага святара. Скончыў

Літоўскую духоўную семінарыю, гістарычна-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1866). Накінуты ў універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання па кафедры славянскай філалогіі. У 1869-72 выкладаў славянскія мовы ў духоўнай акадэміі і гістарычна-філалагічным інстытуце ў Пецярбургу. У 1972-75 вывучаў славістыку ў Германіі, Аўстрыі, Румыніі, Сербіі, Чарнагорыі, Турцыі. У 1875-81 — прафесар Нежынскага гістарычна-філалагічнага інстытута. У 1881-92 — загадчык кафедры рускай і царкоўнаславянскай моваў Варшаўскага універсітэта (у 1887-92 адначасова — дэкан гістарычна-філалагічнага факультэта). У 1892-1901 — рэктар Юраўскага (Тарту) універсітэта (узначальваў тут кафедру параўнальнай граматыкі славянскіх моваў). З 1901 — сябра Рады Міністэрства народнай асветы. Рэдагаваў "Мефодиевский юбилейный сборник" (з 1885), часопіс "Славянское обозрение", газету "Московские новости". Даследаваў старажытную славянскую пісьменнасць, літаратуру, гісторыю, літаратурныя мовы славянскіх народаў. Сааўтар гістарычнай працы "Чэхія і Маравія" (СПб, 1871). Выдаў кнігі: "Ю. Ламаносаў як натураліст і філолаг" (СПб, 1869), "Аналіз складаемых частак славянскага слова з марфалагічнага пункту гледжання" (Кіеў, 1877), "Нарысы з сербскай гісторыі" (СПб, 1877), "Першабытныя славяне ў іх мове, побыце і ўяўленнях па дадзеных лексікальных..." Ч. 1-2 (Кіеў, 1878-82), "Нарыс царкоўнаславянскай граматыкі" (Варшава, 1883), "Агульнаславянская мова ў шэрагу іншых агульных моваў старажытнай і новай Еўропы". Т. 1-2. (Варшава, 1892). Асвятляў у славістычных працах пытанні беларускай мовы. Шмат друкаваўся як публіцыст, абараняючы імперскую палітыку Расіі. Артыкулы сабраны ў кнізе "Навука і палітыка" (СПб., 1908). Быў сябрам расійскіх і замежных таварыстваў і навуковых арганізацый.

**Будзько Антаніна Піліпаўна** (дзявоч. Бушэйка, 2.02.1943, в. Альхоўка Навагрудскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1985). Дацэнт (1985). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыла 7-годку, у пас. Бярозаўка Лідскага р-на — СШ (1959). Працавала паляводам у калгасе "Праўда" (1959-60), ст. піянерважатай у Нягневіцкай СШ Навагрудскага р-на (1960-61). Вучылася на факультэце нямецкай мовы Мінскага інстытута замежных моваў (1961-66). Настаўнічала ў Глыбокім на Віцебшчыне (1966-68), у Сувораўскай ваеннай вучэльні ў Мінску (1968-69). З 1969 выкладае на кафедры нямецкай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў, з 1986 — на кафедры методыкі выкладання замежных моваў гэтага інстытута (лінгвістычнага універсітэта). Друкуецца з

1978 па пытаннях методыкі выкладання замежных моваў. Аўтар дапаможнікаў для студэнтаў, падручнікаў для школ: "Deutsch 2" (1993), "Deutsch 3" (1995), "Настольная кніга для выкладчыка замежнай мовы" (1993, 3-яе выд. 1997, у сааўт., на рус. мове). Сааўтар праграм па нямецкай мове для школы, для педагагічных вучэльняў.

**Булгак Ян** (6.10.1876, в. Астанкіна Навагрудскага р-на — 4.02.1950), беларускі і польскі фотамастак, этнограф, краязнавец. Скончыў рускую гімназію ў Вільні (1897). Вучыўся на філалагічным факультэце Кракаўскага універсітэта (1897-99). За мяжою вывучаў фотасправу. З 1905 займаўся фатаграфіяй. Жыў у в. Пярэсека (Навагрудскі р-н). З 1912 — у Вільні, дзе адкрыў фотамайстэрню. У 1919-39 — кіраўнік лабараторыі мастацкай фатаграфіі пры Віленскім універсітэце. Чытаў у універсітэце лекцыі па фотамастацтве. У 1935-39 быў адным з рэдактараў часопіса "Przegląd fotograficzny". У 1939 перабраўся ў Варшаву. Заснавальнік і старшыня фотаклуба Польшчы, Віленскага фотаклуба, польскага фатаграфічнага таварыства. Выканаў і апублікаваў мноства фотаздымкаў беларускіх краявідаў, людзей у віленскіх і іншых выданнях. Сярод твораў: "Беларуская дзяўчына з-пад Клецка ў народным убранні", "Беларус з-пад Клецка", "Беларус з Міншчыны", "Вечар (Міншчына)", "Краявід з Ашмянскага павета", "Белавежская пушча", "Цішыня", "Возера Нарач", "Бабулька-беларуска з маёнтка Пярэсека", цыкл здымкаў пра мясціны А. Міцкевіча. Збіраў і вывучаў беларускія народныя песні. Калекцыя яго здымкаў (каля 10 тысяч) загінула ў 1944 у Вільні. Выдаў на польскай мове ў Вільні даследаванні, падручнікі, успаміны: "Мая зямля" (1919), "Бромаграфіка, або метад паўтору" (1934), "Вандроўкі фатографа..." Т. 1-9. (1931-36), "Эстэтыка святла" (1936), "Дваццаць шэсць гадоў з Рушчыцам" (1939), "Пра першых віленскіх фатографаў з XIX ст." (1939), "Айчынная фатаграфія" выйшла ў Вроцлаве ў 1951. Адно з выданняў выдадзена ў Варшаве — "Фатаграфій. Нарыс мастацкай фатаграфіі" (1931).

**Булыка Аляксандр Мікалаевіч** (18.03.1935, в. Селішча Навагрудскага р-на), беларускі мовазнавец. Доктар філалагічных навук (1981). Прафесар (1992). Член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі (1994). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Молыгічы (Навагрудскі р-н). У 1950-54 вучыўся ў Навагрудскай педагагічнай вучэльні. У 1954-59 — студэнт аддзялення беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Працаваў настаўнікам СШ у в.Осава Воранаўскага р-на (1959-61), завучам

школы-інтэрната ў Воранаве (1961-62). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (1962-65). Затым працуе ў гэтым інстытуце (з 1984 — загадчык аддзела беларуска-рускіх моўных сувязяў, з 1992 — загадчык аддзела гісторыі беларускай мовы). Вывучае праблемы гістарычнай граматыкі і лексікалогіі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы і гістарычнай лексікаграфіі. Выдаў працы: "Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы" (1970), "Даўнія запазычанні беларускай мовы" (1972), "Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XVI-XVIII стст." (1980), "З моў блізкіх і далёкіх" (1986), "Слоўнік іншамоўных слоў" (1993). Сааўтар даследаванняў: "Гістарычная лексікалогія беларускай мовы" (1970), "Гістарычная марфалогія беларускай мовы" (1979), "Мова беларускай пісьменнасці XV-XVIII стст." (1988), "Мова выданняў Францыска Скарыны" (1990), "Беларуская мова канца XV — пачатку XVI стст." (1990). Навуковы рэдактар і сааўтар шматтомнага "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы". Друкаваў вершы.

**Булыка Галіна Аляксандраўна** (6.12.1960, в.Осава Воранаўскага р-на), беларуская паэтка. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1987). Дачка А. Булыкі. У 1966 пераехалі ў Мінск, тут скончыла школу. Вучылася на хімічным факультэце БДУ (1978-83). Працавала стажорам-даследчыкам у Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі Акадэміі навук Беларусі, выхавальнікам рабочага інтэрната Мінскага веласавода, інжынерам-наладчыкам управы пусканаладачных работ трэста "Аўтарамбудмантаж". Скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1989). У 1990-94 — працуе ў штотыднёвіку "Культура", затым у часопісе "Беларуская думка". Друкуецца як паэтка з 1983. Сааўтар калектыўнага зборніка вершаў "Сцяжына" (1983). Выдала кнігі лірыкі "Сінтэз" (1983), "Турмалін" (1994).

**Бульба Альгерд** (сапр. Чыж Вітольд Станіслававіч, 1884, фальв. Антонішкі Астравецкага р-на — 1939), беларускі грамадскі дзеяч, пісьменнік (крытык, празаік, перакладчык, публіцыст), этнограф. З дробнай шляхты. Вучыўся ў гімназіі ў Варшаве. Удзельнік рэвалюцыйнага руху на Ашмяншчыне, Смаргоншчыне, вёў рэвалюцыйную агітацыю супраць царызму (1905). У канцы снежня 1905 арыштаваны і аддадзены пад суд. Летам 1906 уцёк у Галіцыю. У Львове вучыўся ў палітэхнічным інстытуце (скончыў у 1910). Вярнуўся ў Вільню. Па даручэнні рэдакцыі "Нашай нівы" выехаў у Кіеў, дзе рэдагаваў беларускі аддзел часопіса "Pszegląnd krajowy". Зноў прыехаўшы ў Вільню, актыўна супрацоўнічаў з "Нашай нівай", уваходзіў у склад яе

рэдакцыі. У час І-ай сусветнай вайны займаўся гандлёвымі справамі. Быў актывістам Евангелісцкай царквы. У 20-я вёў грамадскую дзейнасць у Вільні, быў намеснікам прэзідэнта Вільні. Друкаваўся з 1910. Аўтар артыкулаў і рэцэнзіяў на тэмы літаратуры, музыкі, тэатра, народнага побыту. Пераклаў на беларускую мову апавяданні М. Ляскова, Р. Данілеўскага, Л. Андрэева, І.Гарбунова-Пасадава. Выдаў даследаванне "Колькі слоў аб дзявочай апратцы на Беларусі" (Вільня,1911).

**Бурлыка Іван Рыгоравіч** (14.02.1958, в. Гаравічы Навагрудскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1987). З сялянскай сям'і. Скончыў 9 кл. СШ у Амневічах (Навагрудскі р-н), 10-ты ў Валковічах (Навагрудскі р-н). Вучыўся на факультэце англійскай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў (1975-80). Служыў у войску (1980-82). Выкладаў на кафедры замежных моваў Гродзенскага медінстытута ў 1982-91 (завочна скончыў аспірантуру Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі ў 1987). Працаваў перакладчыкам у СП "Беларусьбудканструкцыі" ў 1991-95. З 1995 — дацэнт кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства (адначасова ў 1997-98 — загадчык аддзялення беларускай філалогіі) Гродзенскага універсітэта. Даследуе праблемы фанетыкі гаворак Гродзеншчыны, методыкі выкладання замежных моваў у ВНУ. Друкуецца як мовазнавец з 1984. Выдаў навучальны дапаможнік для студэнтаў "Сустрэчы з англамоўным светам" (Гродна, 1998).

**Бусько Мікола** (Мікалай Восіпавіч, 27.09.1940, в. Пагарэлка Карэліцкага р-на), беларускі паэт, мастак, краязнавец. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1989). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Турэц (Карэліцкі р-н) у 1958. Служыў у войску (1959-62). Вучыўся ў Баранавіцкім тэхнікуме лёгкай прамысловасці (1962), у Маскоўскім завочным народным універсітэце мастацтваў (1962-67). Працаваў у Баранавічах рабочым леса-гандлёвай базы (1963-66), мастаком-афармляльнікам Дома афіцэраў (1965-67), мясакамбіната (1967-76), аўтапарку (1976-92). З 1992 выконвае інтэр'еры на заводзе буддэталяў у Баранавічах. Друкуецца як паэт з 1978 (у Карэліцкай і Баранавіцкай раённых газетах — з 1970). Выдаў кніжкі лірыкі "У Нёмна на плячах" (1986), "Сузор'е Шаляў" (1995), зборнікі вершаў для дзяцей "Ад галінкі да сучка — тэлефон у павучка" (1993), "Шасцікрылец Хмарагон" (1996). Выстаўляўся як мастак (пейзаж, партрэт)

з 1986. Аўтар (з 1990) краязнаўчых артыкулаў і нарысаў з жыцця Карэліччыны, ваколіц Баранавіч.

**Бушчык Мікола** (Мікалай Уладзіміравіч, 1.05.1948, в. Дзераўная Слонімскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1980). З сям'і рабочага, якая шмат пераязджала. Вучыўся ў 1-3 кл.у Алупцы (Крым), у 4-ым у Краснадары, у 5-ым у роднай вёсцы, у 7-8-ых у Вярэцці (Варонежская вобл.), 9-ым у Краснадары. Жывапіс засвойваў у мастацкай школе Краснадара (1963-64) і Краснадарскай мастацкай вучэльні (1964-69), у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1969-75). Выкладаў рысунак і жывапіс у Беларускім палітэхнічным інстытуце (1976-81). Адзін з заснавальнікаў групы мастакоў "Няміга-17". Працуе ў жанрах сюжэтна-тэматычнай карціны, пейзажа, партрэта, нацюрморта, беспрадметнай кампазіцыі. Выстаўляўся (з 1976) у Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, Італіі, Францыі, Іспаніі, Югаславіі, Эстоніі, Латвіі, Літве. Сярод твораў 70-х: "Які прыгожы гэты свет", "Дзед Купрыян", "Вечар у вёсцы", "Зазёрскія дзяўчынкі", "Кансіліум", "Дыялог", "Міндаль цвіце", "Сны Гурзуфа", "Сон", "І. І. Стаброўскі". У 1980-90-я напісаў творы "Флора Дуднік", "Летнія ліўні", "Вясковыя спевакі", "Бацькаўшчына", "Вуліца ў Паставах", "Ранак на возеры", "У Жыровічах", "На зямлі і ў небе", "У мажоры", "Прастора-19", "Прастотра — 20", "Пяшчотны ранак", "Гродна. Уражанні", "Пунсовы вечар", "Трывожная птушка", "Вуліца Шагала", "Сімвалічныя праявы", "Мроі прысутнасці", "Збіральніцы зёлак", "Музыка", "Вечаровы матыў", "Дзень у Раготне", "Блакітная поўнач", "Яднаны свет". Творы захоўваюцца ў музеях і прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Германіі, Францыі, Італіі.

**Быліна Янка** (сапр. Семашкевіч Ян, 1883, в. Лакцяны Астравецкага р-на — 1955), беларускі пісьменнік (паэт, драматург), каталіцкі духоўнік. З беднай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю ў 1907 і тады ж высвечаны на святара. Служыў у касцёле ў мяст. Ілля на Вілейшчыне, у Цудзенішках (Ашмянскі р-н), у Медніках (Ашмянскі р-н), у Лаварышках ля Вільні. З 1926 — у Дукштах Трокскага павета. Выкарыстоўваў беларускую мову ў касцельнай службе, пашыраў яе ў зносінах з парафіянамі. Праследаваўся за гэта касцельнымі ўладамі. З 1937 служыў у Ялоўцы і Бомблях на Беласточчыне, дзе перажыў вайну. Адыйшоў ад літаратурнай і ўвогуле беларускай нацыянальнай дзейнасці. Пісаў гумарыстычныя вершы, вершаваныя апавяданні, байкі, санеты, трыялеты. Друкаваўся (з 1917) у газетах "Гоман", "Крыніца", часопісах

"Маланка", "Калоссе", "Шлях моладзі", "Хрысціянская думка", "Снапок", "Пралескі". Выдаў у Вільні зборнікі вершаў "На прызбе" (1918, 2-е выд. 1924), "На покуці" (1934), камедыю "Выбары старшыні" (1926, 2-е выд. 1938), "Ружанец найсвяцейшае Дзевы Марыі" (1928), вершаваныя інтэрпрэтацыі евангельскіх сюжэтаў "Песні жальбы" (1929), "Дарога крыжа" (1930).

**Быхавец Юзаф** (1778, в. Хмяльніца Слонімскага р-на — 1845), польскі асветнік, перакладчык. Скончыў Галоўную школу ВКП (1794). Служыў у войску. Слухаў лекцыі ў універсітэтах Германіі (у Франкфурце-на-Одэры, Гётынгене, Кёнігсбергу). У 1806-09 служыў у французскім войску. Працаваў у Варшаве ў Міністэрстве справядлівасці (1810-12). Удзельнік вайны Францыі з Расіяй на баку Напалеона. Затым асеў у Вільні і займаўся навуковай, перакладчыцкай дзейнасцю. З 1796 выходзяць у Варшаве, Кёнігсбергу яго пераклады прац Канта. Пазней у Вільні, Варшаве вылаюцца пераклады з В. Ірвінга, І. Вашынгтона, Лафантэна, Бергера. Выдаў таксама "Погляд на Расію з пазіцый гістарычна-статыстычных, палітычных, маральных, навуковых і эстэтычных" (Варшава, 1817), "Слоўка пра філасофію" (Варшава, 1818), "Ліст да кс. Прадта, арцыбіскупа Мяхлінскага з нагоды рукапісу з вострава св. Алены" (Варшава, 1818).

**Бялькевіч Іван Кандратавіч** (6.03.1883, в.Варонічы Слонімскага р-на — 18.10.1960), беларускі мовазнавец, педагог. З беднай сялянскай сям'і. Скончыў у роднай вёсцы царкоўнапрыходскую школу і вучыў мясцовых дзяцей, займаўся самаадукацыяй. У 1909 скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю. Быў загадчыкам 4-класнай школы ў в. Бракава (Слонімскі р-н). У 1915-19 — у бежанстве на Саратаўшчыне. У 1919 вучыўся ў Вільні на беларускіх настаўніцкіх курсах. Працаваў затым загадчыкам беларускай школы ў Варонічах, інспектарам беларускіх школ Слонімскага павета. З 1920 — загадчык беларускага аддзела Наркамата асветы БССР, адначасова настаўнік 36-ай школы і загадчык вячэрняй школы №2 г. Мінска. Застаючыся на гэтых пасадах, вучыўся ў 1921-25 на этнолага-лінгвістычным аддзяленні педфака БДУ. У 1925-27 — дырэктар Мсціслаўскага педтэхнікума. Удзельнік Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу (1926). З 1927 — сакратар Аддзела гуманітарных навук, спецыяліст Слоўнікавай камісіі Інбелкульта, затым Інстытута мовазнаўства Беларускай Акадэміі навук. У 1930 рэпрэсаваны і высланы ў Марыйскую АССР, у Йошкар-Але працаваў тэхнікам-нарміроўшчыкам на лесазаводзе. З 1934 — у Азова-

Чарнаморскім краі, дзе выкладаў рускую мову і літаратуру. У 1948-55 — загадчык навучальнай часткі навучальнага пункта "Азоўсталь". У 1955-58 — інжынер-метадыст Марыупальскай філіі Данецкага вячэрняга будаўнічага тэхнікума. Друкаваўся як мовазнавец з 1927. Яго шматгадовыя зборы рэгіянальнай лексікі склалі "Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны" (1970).

**Бялячыц Рычард Станіслававіч** (16.09.1953, в. Стаўбуры Астравецкага р-на), беларускі паэт, педагог. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1997). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Варнянах (Астравецкі р-н), літаратурна-музычнае аддзяленне Мінскага педінстытута (1974). Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара Цудзенішскай школы Ашмянскага р-на (1974-77), настаўнічаў у Варнянскай СШ (1977-81). Быў інспектарам аддзела народнай адукацыі ў Астраўцы (1981-83). У 1983-85 працаваў у рэдакцыі "Астравецкай праўды". У 1985-87 — намеснікам дырэктара Варнянскай СШ. З 1987 — намеснік дырэктара, затым дырэктар школы ў в. Дудкі Шчучынскага р-на. Друкуецца як паэт з 1979. Сааўтар калектыўнага зборніка вершаў "Лагодны промень раніцы" (1988). Выдаў кнігу лірыкі "Прасветлінка" (1995).

**Бярдзяеў Валяр'ян Валяр'янавіч** (7.03.1885, г. Гродна — 28.09.1956), рускі і польскі дырыжор аркестра, музычны педагог. Прафесар (1926). Скончыў палітэхнічны інстытут у Кіеве, затым кансерваторыю ў Лейпцыгу. Дэбютаваў як дырыжор у Мінску ў оперы П. Чайкоўскага "Яўгені Анегін" (1906). Быў дырыжорам сімфанічных і оперных аркестраў у Расіі, Украіне (Пецярбург, Адэса, Харкаў, Кіеў, Масква). З 1921 — дырыжор сімфанічнага аркестра ў Варшаве. У 1925-27 — у СССР. Працаваў у філармоніі ў Ленінградзе, выкладаў у кансерваторыі ў Кіеве, дырыжыраваў у Кіеве, Харкаве, Адэсе, Свярдлоўску. З 1927 — у Польшчы. Быў дырыжорам Варшаўскай філармоніі, адначасова — у Вялікім тэатры ў Варшаве (у 1930-39 працуе тут стала). У яго рэпертуары тут — "Пікавая дама" і "Яўгеш Анегін" П. Чайкоўскага, "Аіда" Дж. Вэрдзі, "Кармэн" Ж. Бізэ, "Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага, "Лаенгрын" Р. Вагнера, "Мадам Батэрфляй" Д. Пучыні, "Гугеноты" Г. Меербера, "Севільскі цырульнік" Дж. Расіні. З 1930 вёў таксама клас дырыжыравання ў Варшаўскай кансерваторыі.У 1945-49 — дырыжор у Кракаўскай філармоніі. У 1949-54 — дырэктар Пазнанскай оперы, з 1954 — Варшаўскай оперы. Выступаў як дырыжор у Швецыі, Германіі, Румыніі, Балгарыі, Венгрыі.

**Бяспамятных Мікалай Нічыпаравіч** (26.06.1953, г. Гродна), беларускі філосаф, культуролаг, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1980). Дацэнт (1986). З сям'і педагогаў вышэйшай школы. Скончыў Гродзенскую СШ №14. У 1970-75 вучыўся на гістарычна-педагагічным факультэце Гродзенскага педінстытута. У 1975-78 — аспірант кафедры філасофіі Мінскага педінстытута. З 1978 выкладае на кафедры філасофіі Гродзенскага універсітэта, з 1991 — на кафедры тэорыі і гісторыі сусветнай культуры (культуралогіі) гэтага універсітэта. Адначасова (з 1991) выкладае ў Гродзенскай школе-гімназіі №30. Друкуецца з 1975. Навуковыя інтарэсы — этналогія і этнічныя працэсы ў Заходняй Беларусі, акмеялагічныя аспекты гуманітарнай адукацыі ў гімназіях і універсітэтах. Выдаў "Міфалогію" Ч. 1-2 (Мазыр, 1998). Сааўтар "Кароткага тлумачальнага слоўніка філасофскіх, сацыяльных і культуралагічных тэрмінаў" (Гродна, 1992), падручнікаў для студэнтаў "Асновы філасофіі: Курс лекцый" (Гродна, 1994), "Гісторыя філасофіі: Навучальны дапаможнік для ВНУ" (Гродна, 1997). Стажыраваўся ў ЗША (1998).

**Валадось Аркадзь Лявонавіч** (1.03.1943, в. Какошчычы Слонімскага р-на), беларускі і французскі спявак (барытон). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Беларускай кансерваторыі (1965-69). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1970). З 1969 — саліст Ленінградскага тэатра оперы і балета, з 1980 — у Парыжы. Выступаў у Італіі, Германіі, ЗША, Нарвегіі, Швецыі, Расіі (у 1992, 1994 — у Беларусі). Ролі на сцэне: Анегін ("Яўгеш Анегін" П. Чайкоўскага), Ялецкі ("Пікавая дама" П. Чайкоўскага), Томскі ("Пікавая дама" П.Чайкоўскага), Гразноў ("Царская нявеста" М. Рымскага-Корсакава), Шаклавіты ("Хаваншчына" М. Мусаргскага), Рыгалета ("Рыгалета" Дж. Вэрдзі), Аманасра ("Аіда" Дж. Вэрдзі), Эскамільё ("Кармэн" Ж. Бізэ), Скарпія ("Тоска" Дж. Пучыні), Напалеон ("Вайна і мір" С. Пракоф'ева).

**Валан Андрэй** (1530, маёнт. Біюцішкі Ашмянскага р-на — 6.01.1610), беларускі грамадскі дзеяч, філосаф, правазнавец, пісьменнік. Вучыўся ў універсітэтах у Франкфурце-на-Одэры і Кёнігсбергу. Выбіраўся паслом ад шляхты Ашмянскага павета ў сейм Рэчы Паспалітай. Быў сакратаром М. Радзівіла Рудога, Жыгімонта II Аўгуста, Стэфана Баторыя, Жыгімонта III Вазы, выконваў іх дыпламатычныя даручэнні. Пазней жыў у Біюцішках, дзе і памёр. Пісаў (на лаціне) палемічна-тэалагічныя творы, палітычна-прававыя і этычныя трактаты, прамовы, вершы. Ідэолаг рэфармацыйнага руху ў Беларусі і Літве. Бараніў ідэі гуманізму, маральнага вырашэння

грамадскіх супярэчнасцяў, свецкія каштоўнасці. Выйшлі яго працы: "Пра палітычную або грамадзянскую волю" (Кракаў, 1572), "Прамова да сената..." (Кракаў, 1572), "Пра шчаслівае жыццё, або найвышэйшае чалавечае дабро" (Вільня, 1596), "Пра гаспадара і ўласцівыя яму дабрачыннасці" (Гданьск, 1608).

**Валодзька Станіслаў Віктаравіч** (11.11.1956, в. Падольны Астравецкага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1997). Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы, СШ у в. Жукойні Астравецкага р-на ў 1974. Служыў у войску (1975-77). Працаваў шафёрам у саўгасе "Падольскі" (1977-79), машыністам на Прыбалтыйскай чыгунцы (у Вільні, Даўгапілсе) у 1979-92. Завочна скончыў філфак БДУ (1987). З 1992 — намеснік дырэктара школы па гаспадарчай рабоце ў Даўгапілсе. З 1995 узначальвае ў гэтым горадзе беларускае культурна-асветнае таварыства "Уздым". Друкуецца як паэт з 1978. Сааўтар калектыўнага зборніка паэзіі "Сцяжынка" (1983). Выдаў у сааўтарстве ў перакладзе на рускую мову кнігу вершаў для дзяцей "Пацеркі" (Даўгапілс, 1995). Выйшаў зборнік лірыкі "У вачах Айчыны" (1996). У 1998 у Даўгапілсе выйшла кніга яго паэзіі ў перакладзе на рускую мову "Зварот да сэрца".

**Валчок Уладзімір Іванавіч** (2. 04.1939, в. Красляны Шчучынскага р-на), беларускі спартыўны педагог. Майстар спорту СССР па вольнай барацьбе (1964). Заслужаны трэнер Беларусі (1993). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Дуброва Шчучынскага р-на (1954), вучэльню механізацыі сельскай гаспадаркі №15 у в. Мураванка Гродзенскага р-на (1956). Працаваў па спецыяльнасці на цалінных землях Казахстана (1957-58). Вучыўся ў Беларускім інстытуце фізічнай культуры (1963-67). З 1967 працуе ў Лідзе трэнерам па вольнай барацьбе (у спартыўных таварыствах "Спартак", "Чырвоны сцяг", з 1985 у дзіцячай спартыўнай школе). Суддзя рэспубліканскай катэгорыі па вольнай барацьбе (1973). Падрыхтаваў 42 майстры спорту СССР па вольнай барацьбе.

**Валчэцкая Алена Уладзіміраўна** (у першым замужжы Цюнянкова, 4.12.1943, г. Гродна), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны майстар спорту СССР па спартыўнай гімнастыцы (1964). Чэмпіёнка (у камандным заліку) XVIII Алімпійскіх гульняў (Токіо, 1964). Заслужаны трэнер Беларусі (1993). Дацэнт (1997). З сям'і рабочага. Скончыла СШ №8 г. Гродна, факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання Гродзенскага педінстытута (1965). З 1968

працавала выкладчыкам гімнастыкі Гродзенскага тэхнікума фізічнай культуры. З 1991 выкладала на кафедры тэорыі і методыкі фізкультуры і спорту Гродзенскага універсітэта. У 1998-99 працавала спартыўным педагогам у ЗША.

**Валынчык Антон Міхайлавіч** (23.07.1896, в. Мяльканавічы Слонімскага р-на — 13.11.1985), беларускі хормайстар, музычны педагог, кампазітар. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1964). З сям'і царкоўнага рэгента. Скончыў Жыровіцкую духоўную семінарыю (1914). Служыў у войску (1914-18). Працаваў выкладчыкам музыкі і спеваў у рэальнай вучэльні (гімназіі) у Лунінцы (1919-24), у Клецкай беларускай гімназіі (1924-29), у Навагрудскай беларускай (1929-34) і польскай (1934-39) гімназіях, у СІЛ і беларускай настаўніцкай семінарыі ў Слоніме (1939-47). Усюды ствараў і ўзначальваў хоры навучэнцаў. Завочна скончыў Вышэйшыя музычныя курсы Варшаўскай кансерваторыі пры Крамянецкім музычным ліцэі (1937). Быў мастацкім кіраўніком Беларускага міжабласнога ансамбля песні і танца ў Ашмянах (1947-49). Працяглы час не меў дзяржаўнай службы, быў незапатрабаваны як спецыяліст. Супрацоўнічаў з харамі ў праваслаўных храмах. Кіраваў царкоўнымі харамі ў Клецку, Навагрудку, Слоніме, Жыровічах, Мінску (1925-62). У 1956-57 узначальваў хор Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках (Магілёўская вобл.), адначасова настаўнічаў у Пухавіцкай, Талькаўскай СШ (Мінская вобл.). У 1957-61 — кіраўнік Маладзечанскага абласнога ансамбля песні і танца. З 1961 стала жыве ў Гродне. Быў загадчыкамі кафедры музыкі і спеваў Гродзенскага педінстытута (1961-76), адначасова працаваў хормайстрам Гродзенскага народнага ансамбля песні і танца "Нёман" (1961-65), мастацкім кіраўніком Гродзенскай народнай харавой капэлы настаўнікаў (1965-71). Кансультаваў як хормайстар шматлікія харавыя калектывы Гродзеншчыны. Увасабляў у канцэртных праграмах творы І. Баха, Л. Бетховена, П. Чайкоўскага, Ф. Шуберта, С. Манюшкі, К. Вебера. Апрацоўваў беларускія народныя песні. Пісаў і рыхтаваў для выканання свае песні і хоры на сл. Я. Купалы, Я. Коласа, А. Русака, П. Броўкі. Практыкаваў у харах выкананне ў стылі "а капэла".

**Варава Уладзімір Аляксеевіч** (26.07.1896, в. Вялікія Жухавічы Карэліцкага р-на — 4.05.1929), беларускі пісьменнік, журналіст. З сялянскай сям'і. У 1920 прадаваў у Жухавіцкім валасным рэўкоме, пасля ў Наркамземе БССР. Адначасова вучыўся ў Мінскім палітэхнікуме. З 1921 — на радзіме. Удзельнічаў тут у вызваленчым

руху, друкаваўся ў заходнебеларускай перыёдыцы. Арыштоўваўся ўладамі Польшчы. У 1925 рэдагаваў газету Грамады "Жыццё беларуса". Неўзабаве перайшоў у БССР. Працаваў намеснікам рэдактара слуцкай акруговай газеты "Вясковы будаўнік". З 1926 — у Мінскім акруговым зямельным аддзеле. Уваходзіў у аб'яднанне "Літаратурна-мастацкая камуна", удзельнічаў у выданні яе часопіса "Росквіт" (1927-28). Друкаваў апавяданні, артыкулы, фельетоны.

**Варашыльскі Віктар** (8.06.1927, г. Гродна — 13.09.1996), польскі пісьменнік (паэт, празаік, эсэіст, перакладчык), журналіст. Кандыдат філалагічных навук (1956). З сям'і лекара. Скончыў у Гродне 6 кл. у 1939. Пры саветах вучыўся ў СШ №1. Падчас вайны ў школу амаль не хадзіў. Быў вучнем краўца, пастухом на вёсцы. Вясной 1945 пераехалі ў Польшчу. У Лодзі здаў экзамен за СШ. Вучыўся ў універсітэтах у Лодзі і Варшаве (спачатку на медыцынскім факультэце, пасля на паланістыцы). Адначасова працаваў як рэпарцёр у газетах "Głos Ludu" (1945), "Poprostu" (1947-48). У 1949-50 — у Шчэціне (у газеце "Głos Szczeciński"). З 1950 — у Варшаве (у газеце "Sztandar Młodych", тыднёвіку "Nowa kultura"). Вучыўся ў Маскве, у Літаратурным інстытуце і аспірантуры пры інстытуце (1952-56). Быў галоўным рэдактарам "Nowej kultury" (1957-58). З 1972 — супрацоўнік часопіса "Więź". У часы ваеннага становішча ў Польшчы быў інтэрнаваны (1981-82). Жыў у Варшаве. Дэбютаваў як паэт у 1945 у газэце "Głos Ludu". Выдаў кнігі ў Варшаве: "Смерці няма. Паэзія" (1949), "Адпачынак містэра Сміта. Сатыра і гумар" (1949), "Ноч камунара. Паэма" (1949), "Паэзія" (1950), "Школа двухсот мільёнаў. Рэпартажы з СССР" (1950), "Закаваны мазур. Аповесць пра Людвіка Варынскага" (1951), "Праваднікі вялікай раніцы. Дзесяць лістоў да сябра пра польска-савецкія адносіны" (1952), "Сябры з-за Одэра. Нататкі з падарожжа ў ГДР" (1952), "Тры паэмы" (1952), "Для пакалення герояў. Гутаркі, размовы, лісты" (1953), "Айчына. Паэзія" (1953), "Выбраныя вершы і паэмы" (1955), "Пра Тадэвуша Бароўскага, яго жыццё і творчасць. Нарыс" (1955), "З размоваў 1955. Паэзія" (1956), "Бязлітасная зорка. Апавяданні" (1958), "Гады блуканняў. Паэзія 1953-1959" (1960), "І ты застанешся індзейцам. Аповесць для моладзі" (1960), "Фэлек і навокал. Кніжка для дзяцей" (1960), "Многа смеху, крыху смутку, або гісторыя пра маленькага маманта. Вершы для дзяцей" (1961), "Кірыл, дзе ты? Кароткая, але аповесць" (1962, 2-е выд. 1965), "Твой штодзённы забойца. Паэма для аднаго голасу" (1962), "Сны пад снегам. Аповесць пра жыццё Міхаіла Салтыкова-Шчадрына" (1963), "Нязгода на прывітанне. Паэзія" (1964), "Павеў

маляванага ветру. Аповесць для моладзі" (1965), "Жыццё Маякоўскага" (1966), "Прыгоды ў Вавілоне. Паэзія" (1969), "Знішчэнне гатункаў. Паэзія" (1970), "Сяргей Ясенін" (1973), "Па знішчэнні" (1974), "Гісторыі" (1987) і інш.

**Васіленя Алег Леанідавіч** (2.02.1960, в. Вялікія Ёдкавічы Бераставіцкага р-на), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1997). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1989). Жыве ў Мінску. Працуе ў галіне графічнага дызайна. Сярод асноўных работ — распрацоўкі фірмовых стыляў і рэкламных канцэпцый для каталогаў "Турызм", "Гандаль-96", "Будаўніцтва", "Медзіяна", стылі фірмаў "Юратэ", "Мегатэкс", "Калор Экспрэс", "Белпрайс", "Космас.ТВ", "Еўра Пак", філіяў АА "Дайнова", лагатып, серыя этыкетак для напояў "Шэпта" (усё ў сааўтарстве).

**Васілёк Міхась** (сапр. Касцевіч Міхаіл Восіпавіч, 14.11.1905, в. Баброўня Гродзенскага р-на — 3.09.1960), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1945). З сям'і лесніка. У час 1-ай сусветнай вайны — у бежанстве на Паволжы.У г. Казлоў атрымаў сярэднюю адукацыю. Вярнуліся на радзіму ў 1922. Працаваў на бядняцкай гаспадарцы і дзейнічаў у беларускім руху. Быў актывістам Грамады, ТБШ. Неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі і трапляў у турму. У 1926-28 служыў у войску ў Гродне. Працаваў у час. "Маланка" (1928). У 1939 мабілізаваны, удзельнічаў у нямецка-польскай вайне, трапіў у нямецкі палон, дзе вёў патрыятычную работу сярод беларусаў. У жніўні 1941 уцёк дадому, тут працаваў у антыфашысцкім падполлі, у 1944 быў у партызанах. Затым працаваў у Скідзельскай райгазеце "Чырвоны сцяг" (1944-46). З 1950 жыў у Гродне, працаваў у абласной газеце "Гродзенская праўда", друкаваўся з 1926 (у газ. "Народная справа", "Наш голас", "Народны звон", "Наша воля", "Беларускі дзень", "Наша праўда", "Беларуская газета", часопісах "Маланка", "Калоссе", "Нёман", "Снапок"). Выдаў у Вільні зборнікі вершаў "Шум баравы" (1929), "З сялянскіх ніў" (1937). Рукапіс адной кніжкі паэзіі знішчаны паліцыяй у 1934. Друкаваў апавяданні. Пасля вайны ў Мінску выйшлі "Выбраныя вершы" (1950), "Выбраныя творы" (1955), "Зоры над Нёманам" (1963), "Вершы" (1973).

**Васілючак Міхаіл Вікенцевіч** (23.09.1933, в. Малыя Князікоўцы Іўеўскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1969). Дацэнт (1975). З сялянскай сям'і. Скончыў сямігодку ў роднай вёсцы, СШ у в. Бердаўка Лідскага р-на (1953). У 1953-55

служыў у войску. У 1955-56 настаўнічаў у 7-годцы ў в. Карпавічы Іўеўскага р-на. Вучыўся на гістарычна-геаграфічным факультэце Мінскага педінстытута (1957-62). Працаваў дырэктарам СШ у в. Голдава Лідскага р-на (1962-67). У 1967-69 — аспірант кафедры гісторыі КПСС Мінскага педінстытута. У 1969-70 выкладаў на кафедры гісторыі КПСС Гомельскага універсітэта, у 1970-78 — на кафедры гісторыі КПСС Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. Быў прарэктарам па завочным навучанні Гродзенскага універсітэта (1978-93). З 1994 выкладае на кафедры гісторыі Беларусі гэтага універсітэта. Даследуе гісторыю Заходняй Беларусі перадваенных гадоў, гісторыю гарадоў і вёсак Гродзеншчыны. Выдаў кнігу "У сям'і адзінай" (1977, на рус. мове). Сааўтар даследаванняў: "Ліда. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1967, 2-е выд., 1980, на рус. мове), "Іўе. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1991), "Нарысы гісторыі Гродзенскай абласной партыйнай арганізацыі" (1990, на рус. мове), "Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941-1944 гг." (Гродна, 1995, 2-е выд.1996).

**Васько Уладзімір Гаўрылавіч** (2.01.1937, в.Лішчанка Шчучынскага р-на), беларускі паэт, журналіст. Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1973). З сялянскай сям'і. Пачатковую школу скончыў у роднай вёсцы, СШ у Орлі (Шчучынскі р-н). Служыў у войску (1956-59). Працаваў у канторы сувязі ў Жалудку (Шчучынскі р-н), у Шчучынскай райгазеце "Чырвоны сцяг". У 1960-65 вучыўся на аддзяленні рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута. Настаўнічаў у 8-годцы ў в. Хвіневічы (Дзятлаўскі р-н), быў тут дырэктарам СШ рабочай моладзі. З 1967 — намеснік дырэктара па навучальнай частцы Мяляхавіцкай СШ Дзятлаўскага р-на. У тым жа годзе запрошаны на працу ў Дзятлаўскую райгазету "Перамога" (быў тут загадчыкам аддзела лістоў, адказным сакратаром). З 1972 — у рэдакцыі Лідскай аб'яднанай газеты "Уперад" ("Лідская газета"). Працаваў тут загадчыкам аддзела лістоў, з 1988 — намеснікам рэдактара. Друкуецца як паэт з 1956. Выдаў зборнікі лірыкі "Прасветленасць" (1981), "На схілах берагоў" (Ліда, 1997). Друкуе апавяданні.

**Васюк Генадзь Уладзіміравіч** (13.07.1961, в.Старыя Гернікі Шчучынскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1994). З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў в. Баяры Шчучынскага р-на (1976), Ваўкавыскую педагагічную вучэльню (1980). Быў настаўнікам пачатковых класаў у Мар'інай Горцы (Пухавіцкі р-н) у 1980-81. Служыў у войску (1981-83). У 1983-

88 — студэнт гістфака Гродзенскага універсітэта. Настаўнічаў у СШ №2 г. Шчучына (1988-89). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ (1989-92). З 1992 выкладае (з 1995 — на пасадзе дацэнта) на кафедры ўсеагульнай гісторыі Гродзенскага універсітэта. Друкуецца як гісторык з 1988. Вывучае Вялікае княства Літоўскае ў эпоху сярэднявечча, гісторыю канфесій у ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

**Ватыль Віктар Мікалаевіч** (1.06.1954, г. Гродна), беларускі палітолаг, правазнавец. Кандыдат філасофскіх навук (1984). Дацэнт (1989). З сям'і службоўцаў. Скончыў у Гродне СШ № 5 (1971). Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута (1971-76). У 1977-79 працаваў на кафедры ўсеагульнай гісторыі гэтага інстытута (універсітэта). У 1979-82 — аспірант БДУ. З 1982 выкладае на кафедры навуковага камунізму (сацыяльна-палітычных вучэнняў і паліталогіі) Гродзенскага універсітэта. З 1990 — дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права гэтага універсітэта. Даследуе пытанні гісторыі еўрапейскай і расійскай палітычнай думкі, тэорыі палітыкі. Аўтар шматлікіх навуковых работ, у тым ліку кнігі "Сацыяльна-палітычная і прававая думка Расіі XIX — пач. XX стагоддзя. Нарысы гісторыі і тэорыі". Т. 1-2 (Гродна, 1997-98, на рус. мове).

**Вашкевіч Аляксандр Яўгенавіч** (9.09. 1960, г. Ліда), беларускі правазнавец, педагог. Кандыдат юрыдычных навук (1987). Дацэнт (1993). З сям'і службоўцаў. Вучыўся у СШ №8 г. Ліды. У сувязі з пераездам бацькоў у Мінск, працягваў вучобу (у 6-10 кл.) у СШ №103. Затым працаваў слесарам у НДІ сродкаў аўтаматызацыі (1977-78). Вучыўся на юрыдычным факультэце БДУ (1978-83), у аспірантуры на кафедры канстытуцыйнага права БДУ (1983-86). Выкладаў на гэтай кафедры, адначасова быў сябрам навукова-кансультацыйнай рады пры Камісіі па заканадаўстве Вярхоўнага Савета Беларусі (1990-95). У 1996 абраны суддзёй Канстытуцыйнага суда РБ. Неўзабаве вымушаны пайсці ў адстаўку. Працуе загадчыкам кафедры агульнаправавых дысцыплін недзяржаўнага міжнароднага Інстытута працоўных і сацыяльных праблем (Мінск). Вывучае пытанні аховы правоў чалавека, дзейнасць органаў канстытуцыйнай юстыцыі за мяжой. Друкаваўся ў Беларусі, Польшчы, ЗША, Германіі. Выступаў з лекцыямі перад студэнтамі, з дакладамі на міжнародных навуковых канферэнцыях у Польшчы, Венгрыі, Фінляндыі, Германіі, ЗША.

**Вашко Лявон** (Леанід Уладзіміравіч, 12.04.1963, г. Гродна), беларускі пісьменнік (празаік, драматург), журналіст. З сям'і службоўцаў. У 3-гадовым узросце пераехаў з бацькамі ў Вялікую Бераставіцу, дзе вучыўся у 1-5 кл., затым — у Масты, дзе скончыў СШ №5 (1980). У 1980-85 — студэнт журфака БДУ. Працаваў карэспандэнтам сельгасаддзела ў Мастоўскай райгазеце "Зара над Нёманам" (1985-87), намеснікам рэдактара Карэліцкай райгазеты "Полымя" (1987-89), уласным карэспандэнтам аблгазеты "Гродненская правда" (1989-90), адказным сакратаром, загадчыкам аддзела штотыднёвіка "Наша слова" (1990-91), рэдактарам аддзела культуры часопіса "Беларуская мова і літаратура ў школе" (1991), рэдактарам аддзела ў часопісе "Вожык" (1992-93), рэдактарам аддзела ў часопісе "Родная прырода" (1993-94). У 1994-97 — аспірант кафедры беларускай літаратуры XX ст. БДУ. Адначасова з 1996 — рэдактар аддзела ў часопісе "Першацвет". Як празаік друкуецца з 1987. Выдаў зборнікі апавяданняў "Еўрапейскія гісторыі" (1995), "Паэты-цары" (1997). Аўтар трагікамедыі "Секс па перапісцы" (паст. у 1999).

**Верабей Анатоль** Леанідавіч (10.08.1950, в. Вайнілавічы Мастоўскага р-на), беларускі крытык і літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1978). Дацэнт (1991). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1989). З сям'і настаўнікаў. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу, 8-годку — у Мілевічах (Мастоўскі р-н), СШ — у Курылавічах (Мастоўскі р-н) у 1967. Вучыўся на філфаку БДУ (1967-72). Працаваў у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (1972-74). У 1974-77 — аспірант Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. Затым — навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. З 1990 выкладае на кафедры беларускай літаратуры (з 1991 на кафедры беларускай літаратуры XX ст.) БДУ. Друкуецца як літаратурны крытык з 1976. Выдаў кнігі: "Максім Танк і польская літаратура" (1984), "Жывая повязь часоў: Нарыс творчасці Уладзіміра Караткевіча" (1985), "Беларуска-рускі паэтычны ўзаемаператклад 20-30-х гадоў" (1990), "Абуджаная памяць. Нарыс жыцця і творчасці У.Караткевіча" (1997), брашуру "Паэзія Максіма Танка" (1983). Сааўтар даследавання "Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20-30 гадоў" (1985). Аўтар сцэнарыя дакументальнага фільма пра У.Караткевіча "Рыцар і слуга Беларусі" (1991). Складальнік, каментатар асобных тамоў збору твораў П. Пестрак, У. Караткевіча, зборніка твораў У. Хадыкі.

**Вераціла Міхась** (Міхаіл Уладзіміравіч, 11.01.1937, в. Навасёлкі Ваўкавыскага р-на), беларускі калекцыянер, краязнавец, мастак, археолаг, паэт. З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Рось (Ваўкавыскі р-н). З 1955 працуе ў вытворчым аб'яднанні "Ваўкавыскцэментнашыфер" (электрыкам, слесарам, маляром, мастаком). У 1956-59 служыў на вайсковым флоце. Збірае (з 1947) прадметы матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі (грашовыя знакі, беларускія паштовыя маркі, друкі, кафлю, рэцэпты народнай медыцыны). Аўтар папулярных і навуковых артыкулаў па нумізматыцы, археалогіі, этнаграфіі. Выявіў і вывучаў старажытныя помнікі на Ваўкавышчыне: могільнік культуры шарападобных амфар, крэмнездабыўныя шахты каля мяст. Краснасельскае, старажытнаславянскае паселішча ля Навасёлак, раннехрысціянскія могільнікі, уніяцкую драўляную царкву на могільніку ў в. Калантаі. Як мастак па інтэр'ерах афармляў аб'екты культуры на Гродзеншчыне: зона адпачынку ВА "Ваўкавыскцэментнашыфер", Гудзевіцкі літаратурна-этнаграфічны музей, кактэйль-бар у санаторыі-прафілакторыі "Пралеска", класы "беларускі" і "англійскі" ў Краснасельскай СШ, дзе кіраваў клубам дзіцячай творчасці "Умелыя рукі" (1974-86). Выканаў многія помнікі і мемарыяльныя дошкі ў Ваўкавыскім, Мастоўскім, Бераставіцкім раёнах, адрэстаўраваў шматлікія археалагічныя экспанаты для музеяў Мінска, Гродна, Гудзевічаў, Ваўкавыска. Як разбяр па дрэве ўдзельнічае ў выставах з 1974. Друкуе вершы, апавяданні (з 1963). Выдаў зборнік лірыкі "Спакуса" (Ваўкавыск, 1993).

**Вербава Хрысціна Уладзіміраўна** (дзявоч. Мацко, 15.11.1943, в. Радагошча Навагрудскага р-на), беларускі педагог, псіхолаг. Кандыдат педагагічных навук (1972). Дацэнт (1977). З сялянскай сям'і. Скончыла Валеўскую СШ Навагрудскага р-на (1960). У 1960-65 — студэнтка рускага аддзялення гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута. Працавала затым у Гродзенскім райкаме камсамола (1965-66), асістэнтам кафедры рускай мовы Гродзенскага педінстытута (1966-68). У 1968-71 вучылася ў аспірантуры НДІ агульных праблем выхавання Акадэміі педагагічных навук СССР (Масква). Выкладала на кафедры педагогікі і псіхалогіі Гродзенскага педінстытута (з 1973 на пасадзе дацэнта, у 1977-82 — загадчыца кафедры). З 1982 — дацэнт кафедры псіхалогіі, з 1998 — дацэнт кафедры агульнай і сацыяльнай псіхалогіі Гродзенскага універсітэта. Выконвала абавязкі сакратара Вучонай Рады універсітэта ў 1989-95.

Аўтар шматлікіх публікацый (друкуецца з 1970) па псіхалогіі педагагічнай дзейнасці.

**Вількіцкі Генадзь Станіслававіч** (10.05.1938, г. Слонім), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1968). З сям'і рабочага. Скончыў СШ №2 г. Слоніма. Вучыўся ў Беларускім інстытуце фізічнай культуры (1956-60). Быў трэнерам-выкладчыкам па лёгкай атлетыцы ў дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе №1 г. Слоніма (1960-78), дырэктарам дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы №3 г. Слоніма (1978-82). З 1982 — загадчык аддзела па фізічнай культуры, спорту і турызме Слонімскага гарвыканкама. Падрыхтаваў удзельнікаў Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнаў Еўропы па лёгкай атлетыцы.

**Вільчко Яўген Альфонсавіч** (23.12.1928, г. Гродна — 1993), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1978). Скончыў Уральскі палітэхнічны інстытут (1958). Працаваў у Цюменьпраекце (1958-60). Затым жыў і працаваў у Гродне — у Аблпраекце, мясцовай філіі Белкалгаспраекта, кіраўніком групы архітэктараў у Гроднаграмадзянпраекце (1960-83). З 1983 — у сістэме гандлёвай рэкламы ў Гродне. Сярод работ: жылы дом па вул. Горкага з убудаванымі памяшканнямі абслугоўвання, інтэр'еры гасцініцы "Беларусь", крамы садавіны па вул. Кастрычніцкай, дзіцячы сад-яслі ў мікрараёне "Румлёва", школа, жылы комплекс на 6000 жыхароў з наближаным абслугоўваннем у Гродне, прафілакторый у мяст. Парэчча Гродзенскага р-на.

**Войцік Віктар Антонавіч** (3.09.1947, г. Гродна), беларускі кампазітар, музычны педагог. Дацэнт (1997). Сябра Беларускага Саюза кампазітараў (1974). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1995). З сям'і чыгуначніка. У Гродзенскай СШ №2 скончыў 8 кл. (адначасова вучыўся ў музычнай школе). У 1962-66 — у Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні (клас баяна). Год вучыўся на падрыхтоўчым аддзяленні Беларускай кансерваторыі. Затым быў прыняты ў кансерваторыю па класе кампазіцыі (праф. А. Багатырова), скончыў у 1972. Скончыў асістэнтуру-стажыроўку ў Маскоўскай кансерваторыі (1975). У 1976-78 — адказны сакратар управы Саюза кампазітараў БССР. Быў загадчыкам музычнай часткі Рускага тэатра (Мінск) у 1981-88. З 1988 — старшыня Беларускага аддзялення музычнага фонду СССР (Беларускага аўтарскага фонду кампазітараў). З 1990 стала выкладае ў Беларускай акадэміі музыкі. З

1998 — сакратар управы Беларускага Саюза кампазітараў. Сярод твораў: дзіцячая опера "Вясновая песня" (паст. 1993), сімфанічная паэма "Апошняя восень паэта" для барытона, сапрана і інструментальнага ансамбля, сімфанічная паэма-казка "Іван — сялянскі сын" (1985), сімфонія № 1 "Каложа" (1972), сімфонія №2 (1975), сюіта "Забавы" (1976), канцэрт для цымбалаў і аркестра (1988), араторыі "Памяць Хатыні" (сл. Г. Бураўкіна, Р. Тармолы-Мірскага, 1973), "Дзень Радзімы" (сл. У. Карызны, 1977), кантаты "Як камар хадзіў у сваты" (сл. М. Багдановіча, 1972), "Казацкія песні" (сл. народныя, 1974). Напісаў патрыятычны кант (гімн Аб'яднання беларусаў свету "Бацькаўшчына", сл. уласныя, 1991). Для камернага аркестра створана "Сюіта ў старадаўнім стылі" (1972), сюіта "Парафраза" (1975), для аркестра народных інструментаў — п'еса "Ціхая мара" (1975), уверцюра "Хвала ўраджаю" (1976), "Паэма" (1978). Аўтар камерных твораў для цымбалаў, для фартэпіяна, для цымбалаў і фартэпіяна, для віяланчэлі і фартэпіяна, для скрыпкі і фартэпіяна, для гітары і струннага аркестра, для квартэта дудак, для ансамбля народных інструментаў. Напісаў хоры, у тым ліку дзіцячыя, рамансы (на сл. М. Багдановіча, Цёткі), песні (на сл. Я. Купалы, У. Карызны, У. Някляева, М. Ясеня, С. Панізніка). Стварыў вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі. Напісаў музыку (у 80-я) для шматлікіх драматычных спектакляў.

**Волкава Ганна** (у замужжы Станюковіч, 26.08.1808, г. Гродна — 24.06. 1845), польская оперная спявачка. Скончыла Варшаўскую кансерваторыю. Была вядучай спявачкай Варшаўскага нацыянальнага тэатра (1830-37). Выйшаўшы замуж, пакінула сцэну. Выступала ў операх Дж. Расіні, В. Моцарта, Д. Абера, саліравала ў араторыі І. Гайдна "Стварэнне свету".

**Врублеўскі Пётр** (21.04.1920, в. Нача Воранаўскага р-на — 13.08.1990), польскі мастак. Вучыўся у агульнаадукацыйным ліцэі піяраў у Любашове. У 1939 мабілізаваны ў войска. У выніку ваенных дзеянняў трапіў у савецкі палон, быў зняволены ў лагеры. У 1941-44 — у Вільні, дзе тайна вучыўся ў універсітэце (на аддзяленнях філасофіі і жывапісу). Удзельнічаў у польскім руху супраціўлення, тройчы арыштоўваўся гітлераўцамі. У 1944-45 вывучаў філасофію ў каталіцкім універсітэце ў Любліне. У 1945 вучыўся ў мастацкай акадэміі ў Рыме. З 1946 — у Мадрыдзе, дзе скончыў Вышэйшую мастацкую школу (клас манументальнага мастацтва) у 1953. Адначасова вывучаў філасофію ў універсітэце ў Севільі. З 1959 — у Польшчы. Працаваў як манументаліст. Выканаў у 1954 дэкаратыўнае

пано для фабрыкі паравых катлоў у Разэндзе (Іспанія). У 1966-73 ствараў інтэр'еры ў касцёле св. Марыі ў Хайнове і ў парафіяльным касцёле ў Луковай ля Хоціна. У 70-я супрацоўнічаў з Радаю навукі і культуры таварыства "Пакс".

**Габрусевіч Сяргей Аляксандравіч** (9.09.1936, в. Верхаўляны Бераставіцкага р-на), беларускі філосаф, культуролаг, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1970). Прафесар (1990). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Гольні (Бераставіцкі р-н). Скончыў Малабераставіцкую СШ (1954). Быў загадчыкам хаты-чытальні ў Гольнях (1954-55). Служыў у войску (1955-57). Працаваў у калгасе (1957-60). У 1960-65 — студэнт гістарычна-філалагічнага факультэта (рускае аддзяленне) Гродзенскага педінстытута. У 1965-66 — асістэнт кафедры філасофіі і палітэканоміі гэтага інстытута. Вучыўся затым у аспірантуры БДУ (1966-69). З 1969 зноў выкладае на кафедры філасофіі і палітэканоміі Гродзенскага педінстытута (з 1972 — дацэнт кафедры). Працуе пазней загадчыкам кафедры методыкі камуністычнага выхавання (1973-74), загадчыкам кафедры палітэканоміі і навуковага камунізму (1974-76), прарэктарам па навуковай рабоце (1976-86), па навучальнай рабоце (1986-92) Гродзенскага педінстытута (універсітэта). З 1992 — прафесар кафедры беларускай культуры гэтага універсітэта. Старшыня ўправы Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры (1987). Выдаваў у Гродне і рэдагаваў гістарычна-культуралагічны часопіс "Сьвіцязь" (1994-95). Друкаваў вершы. Як даследчык друкуецца з 1965. Вывучае філасофскую думку Беларусі, гісторыю беларускай культуры, праблемы арганізацыі навукі і навуковай работы ў універсітэце. Выдаў (у сааўтарстве, на рус. мове) кнігі: "Гродна. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1988), "Ад дзелавой ігры да прафесійнай творчасці. Навучальна-метадычны дапаможнік" (1989).

**Гавін Тадэвуш Феліксавіч** (3.07.1951. в. Ласосна Гродзенскага р-на), польскі грамадска-культурны дзеяч у Беларусі. З сям'і рабочага. Скончыў СШ у Ласосне (1968). Затым скончыў Арлоўскую Вышэйшую ваенную камандную вучэльню сувязі (1972), ваенную Акадэмію сувязі ў Ленінградзе (1982). У 1972-91 служыў афіцэрам сувязі на камандных і штабных пасадах у памежным войску Забайкальскай, Ціхаакіянскай, Заходняй памежных акругаў (у 1987-91 — начальнік сувязі памежнага атрада ў Гродне). У 1988-90 — старшыня Польскага культурна-асветнага таварыства імя А. Міцкевіча ў Гродне. З 1990 — старшыня Саюза палякаў у Беларусі (у 1991 звольніўся з вайсковай

службы ў званні падпалкоўніка). Аўтар многіх артыкулаў у перыёдыцы на тэмы польскага нацыянальна-культурнага адраджэння. Выдаў (на польскай мове) кнігу "Бацькаўшчына. Дзённікі 1987-1993. Адраджэнне польскасці на Беларусі" (Гродна-Люблін, 1993).

**Гадлеўскі Вінцэнт Янавіч** (16.11.1888, в. Шурыны Свіслацкага р-на — снежань 1942), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, каталіцкі духоўнік. З сям'і сталяра. Скончыў пачатковую вучэльню ў Поразаве Свіслацкага р-на (1899). Вучыўся ў Варшаўскай гімназіі. У 1906 у Гродне экстэрнам здаў экзамен за курс гімназіі. Вучыў вясковых дзяцей. У 1908-11 вучыўся ў Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі, у 1912-16 — у Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі. Тут актыўна ўключыўся ў беларускі рух, працаваў у беларускім гуртку, выступаў з рэфератамі. Служыў у Мінскай курыі (1916-18). У сакавіку 1917 удзельнічае ў з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый, выбраны тут у Беларускі нацыянальны камітэт. Адзін з арганізатараў з'езда беларускага каталіцкага духавенства (май 1917). Адзін з заснавальнікаў беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (1917). Удзельнік Усебеларускага кангрэсу (снежань 1917). Сябра Рады БНР (1918). Стварае беларускія школы, кааператывы. Вядзе на Міншчыне шырокую нацыянальна-патрыятычную работу сярод насельніцтва, гаворыць касцельныя казанні па-беларуску. У 1918 пераведзены ў Нясвіж, дзе быў вікарам, школьным інспектарам, сябрам гарадской рады. У 1921-27 — пробашч у Жодзішках (Смаргонскі р-н). Сістэматычна праследаваўся ўладамі за беларускую мову ў касцёле. У 1925 (двойчы) і 1926 сядзеў у турме ў Вільні, у 1927-28 зняволены ў Варшаве. З 1929 жыў у Вільні, быў прэфектам школы пры Бернардынскім манастыры. З 1933 — старшыня цэнтральнай управы Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры. Выдавец і рэдактар газеты "Беларускі фронт" (1936-39). Шмат друкаваўся на палітычныя і культурныя тэмы ( у "Крыніцы", "Беларускім фронце"). У верасні 1939 пераехаў у Коўна, у 1940 — у Варшаву. Тут гуртуе беларускія палітычныя сілы дзеля нацыянальнай незалежніцкай дзейнасці. Удзельнік нарады беларускіх арганізацый у Берліне (чэрвень 1941), сябра створанага на гэтай нарадзе Беларускага нацыянальнага Цэнтра. Падчас нямецкай акупацыі служыў у Мінску ксяндзом, галоўным школьным інспектарам пры Генеральным камісарыяце Беларусі (з верасня 1941). Быў сябрам галоўнай рады Беларускай народнай самапомачы. Арыштаваны гітлераўцамі за беларускую дзейнасць і замучаны ў Рызе. Выйшлі ў Вільні яго аўтарскія інтэрпрэтацыі Бібліі: "Гісторыя святая або

біблійная Старога Закону" (1930), "Гісторыя святая біблійная Новага Закону" (1933), пераклад "Евангеллі і Апостальскія Дзеі" (1939).

**Гайба Мікалай Паўлавіч** (11.01.1963, в. Вялікія Вераб'евічы Навагрудскага р-на), беларускі краязнавец, гісторык, музеязнавец. З сялянскай сям'і. Скончыў Вераб'евіцкую СШ (1980) і працаваў ст. піянерважатым у Лозкаўскай 8-годцы Навагрудскага р-на. У 1981-83 служыў у войску. Вучыўся на гістфаку БДУ (1983-88). Выкладаў гісторыю і грамадазнаўства ў Дамавіцкай СШ Чэрвеньскага р-на (1988-91). З 1991 — навуковы супрацоўнік Навагрудскага гістарычна-краязнаўчага музея. У 1996 скончыў 2-гадовую вочна-завочную школу музеязнаўства пры Беларускім інстытуце праблем культуры. У 1997 завочна скончыў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук. З 1999 — дырэктар музея А.Міцкевіча ў Навагрудку. Даследуе гісторыю і культуру Навагрудчыны. Аўтар публікацый у перыёдыцы і навуковых выданнях (друкуецца з 1985). Вядзе ў Навагрудскай райгазеце "Новае жыццё" тэматычны раздзел "Спадчына" (з 1991). Выдаў кніжкі: "Навагрудак: Гістарычны нарыс" (Навагрудак, 1992), "Навагрудак: гады і падзеі" (Навагрудак, 1995).

**Гайдуліс Алена Андрэеўна** (у замужжы Луцэнка-Гайдуліс, 27.07.1943, в. Складанцы Воранаўскага р-на), руская і беларуская артыстка тэатра. Заслужаная артыстка Беларусі (1988). З сялянскай сям'і. У 1945 пераязджаюць на радзіму маці (бацькі не стала), у г. Калугу. Тут скончыла СШ і два гады працавала мантажніцай на заводзе, дзе арганізавала калектыў мастацкай самадзейнасці, удзельнічала ў канцэртах. Вучылася ў тэатральнай студыі пры Калужскім драмтэатры. У 1963-70 — актрыса гэтага тэатра. Скончыла завочна дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва ў Маскве (1968, педагогі Н. Пажыткаў, Н. Міхоэлс). Затым — на сцэне драмтэатраў у Новакузнецку (1970-73), Гродне (1973-75), Табольску (1975-78), Магілёве (1978-83). З 1983 працуе ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры. Ролі пераважна гераінь, характарныя. Сярод акцёрскіх работ: Папялушка ("Папялушка" Т. Габбе), Вольга Васількова ("Свеціць, ды не грэе" А. Астроўскага), Дуняша ("Вішнёвы сад" А. Чэхава), Лукер'я ("Дзеці сонца" М. Горкага), Мелі ("Эзоп" Г. Фігейрэда), Адэла ("Дом Бернарды Альбы" Ф.-Г. Лоркі), Ізабела Дрозд ("Амністыя" М. Матукоўскага), Юзе ("Дом на скале" Х. Вуойлíокі), Тацяна ("Разлом" Б. Лаўранёва), Настася Піліпаўна ("Ідыёт" паводле Ф. Дастаеўскага), Мірандаліна ("Карчмарка" К. Гальдоні), Марыя Сцюарт ("Марыя Сцюарт" Ф. Шылера), Вольга ("Тры сястры" А. Чэхава), Дама ("Тутэйшыя"

Я. Купалы), Марта ("Хто баіцца Вірджыніі Вульф" Э.Олбі), Соф'я Маркаўна ("Старыя" М. Горкага), Шарлота ("Лаліта" паводле У. Набокава), Жыўка ("Пані міністэрша" Б. Нушыча), Аркадзій ("Чайка" А. Чэхава), Васа Жалязнова ("Чалавечая жанчына" паводле М. Горкага).

**Галіна Вольга** (сапр. Александроўская, дзявоч. Грудзінская Вольга Уладзіміраўна, 11.03.1899, мяст. Жалудок Шчучынскага р-на — 4.12.1980), беларуская тэатральная артыстка. Народная артыстка Беларусі (1946). З сям'і настаўніка. Вучылася у гімназіях Вільні, Тулы (1909-17). Наведвала ў Туле тэатральную студыю. Пазней жыла ў г. Ахтырка, дзе працавала два гады ў мясцовым тэатры. Затым — у трупе палітаддзела 45-ай дывізіі Чырвонай Арміі. У 1923-62 — у Беларускім тэатры (Нацыянальным) імя Я. Купалы. Выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстутуце (1948-55, 1960-63). З 1947 рэгулярна дапамагала самадзейным калектывам. Выступала ў ролях гераінь, характарных. Стварыла вобразы Ганны ("Машэка" Е. Міровіча), Стамбоўскай ("Кастусь Каліноўскі" Е Міровіча), Альдоны ("Вір" Я. Рамановіча), Забелы ("Салавей" паводле З. Бядулі), Дарымены ("Мешчанін у дваранстве" Мальера), Эльгі ("Эльга" Г. Гаўптмана), Ендрыхоўскі! ("Партызаны" К. Крапівы), Ніны Пятроўны ("Палешукі" Я. Рамановіча), Ганны Андрэеўны ("Таварыш Андрэй" Я. Рамановіча), Марозавай ("Пяюць жаваранкі" К. Крапівы), Марыі Тарасаўны ("Платон Крэчат" А. Карнейчука), Барабашовай ("Праўда добра, а шчасце лепш" А. Астроўскага), Кашавой ("Маладая гвардыя" паводле А. Фадзеева), Соф'і ("Апошнія" М. Горкага), Марыі Мікалаеўны ("Рускія людзі" К. Сіманава), Дэндальскай ("Дамы і гусары" А. Фрэдрык Прымаковіч ("Людзі і д'яблы" К. Крапівы), Аркадзінай ("Чайка" А.Чэхава), Ранеўскай ("Вішнёвы сад" А.Чэхава), Паляжаевай ("Неспакойная старасць" Л. Рахманава), Ізабэлы ("Вясковы суддзя" П. Кальдэрона), Купавінай ("Ваўкі і авечкі" А. Астроўскага), Тэадоры ("Дурная для іншых, разумная для сябе" Лопэ дэ Вэгі), Карэтнай ("Жывы труп" Л.Талстога ).

**Ганчарова-Грабоўская Святлана Якаўлеўна** (дзявоч. Ганчарова, 17.09.1950, в.Асаўляны Мастоўскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1982). Дацэнт (1989). З сям'і сталяра і настаўніцы. Пайшла ў школу ў роднай вёсцы, але ў сувязі з пераездам бацькоў у Масты працягвала вучобу там. Скончыла СШ №1 і працавала ў клубе Мастоўскай мэблевай фабрыкі (1968-69). Вучылася на аддзяленні рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута (1969-73). Працавала асістэнтам

на кафедры рускай і замежнай літаратуры гэтага інстытута (1973-76). У 1976-79 — аспірантка кафедры рускай савецкай літаратуры БДУ. Выкладала на кафедры украінскай і рускай літаратуры Адэскага пед-інстытута (1979-82). Па сямейных абставінах пераехала ў ГДР, выкладала ў школе ў Патсдаме (1982-86). У 1986-87 — у Гродзенскім універсітэце. З 1987 — дацэнт кафедры рускай літаратуры БДУ (з 1996 — намеснік дэкана філфака, з 1998 — загадчык кафедры). Друкуецца з 1976. Вывучае жанрава-стылёвыя праблемы драматургіі XX ст. Аўтар шматлікіх артыкулаў, навуковых дакладаў (у Беларусі, Расіі, Украіне, Польшчы, Славакіі, Германіі, Індыі). Выдала на рус. мове навучальныя дапаможнікі: "Сатырычная камедыяграфія 80-х гадоў" (1989), "Сучасная драматургія. Другая палова 80-х — 90-я гады" (1994, у сааўт.), даследаванне "Камедыя-памфлет у жанравай сістэме драматургіі XX стагоддзя" (1994).

**Ганчарук Ігар Генадзевіч** (20.11.1959, г. Гродна), беларускі гісторык, музеязнавец. З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў СШ №12, скончыў СШ №19 г. Гродна (1977). Працаваў лабарантам у 10-й, 24-й, 7-й школах Гродна, на абутковай фабрыцы, заводзе "Радыёпрыбор" у Гродне (1977-86). Завочна скончыў гістфак Гродзенскага універсітэта (1985). З 1986 — навуковы супрацоўнік музея гісторыі рэлігіі ў Гродне (у 1989-95 — загадчык аддзела каталіцызму). У 1997 завочна скончыў аспірантуру ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Друкуецца з 1987. Аўтар многіх навуковых публікацый на тэмы каталіцкай царквы Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.

**Гардзееў Юры Юр'евіч** (2.07.1967, г. Гродна), беларускі і польскі гісторык, культуролаг. Скончыў СШ №12 у Гродне. Працаваў прэпаратарам на кафедры біялогіі Гродзенскага медінстытута (1984-85). У 1985-86 — студэнт філфака, у 1986-88 гістфака (з 1988 на завочным аддзяленні) Гродзенскага універсітэта (скончыў у 1991). Працаваў мастацтвазнаўцам у інстытуце "Белпраектрэстаўрацыя" (1989-90), у інстытуце "Гродна-праектрэстаўрацыя" (1990-92). У 1992-93 — навуковы супрацоўнік Гродзенскага абласнога гістарычна-археалагічнага музея. У 1993-95 — выкладчык кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта. У 1995-98 — аспірант Вышэйшай педагагічнай школы ў Кракаве. З 1998 працуе ў гэтай педагагічнай школе. Друкуецца (з 1991) на тэмы архітэктурнага мінулага гарадоў Беларусі. Выдаў (у сааўт.) кнігу "Фарныя могілкі ў Гродне. 1792-1939" (Кракаў, 1999).

**Гаркавы Аляксандр** (3.05.1863, г.Наварудак — 2.11.1939), яўрэйскі мовазнавец, пісьменнік. Атрымаў на радзіме традыцыйнае рэлігійнае выхаванне. У 1882 выехаў у ЗША. Набыў тут адукацыю. Выкладаў гісторыю Амерыкі ў школах Н'ю-Йорка, літаратуру і граматыку ідзіш у Н'ю-Йоркскай яўрэйскай настаўніцкай семінарыі. Напісаў шэраг папулярных кніг па гісторыі і культуры ЗША. Перакладаў на ідзіш творы еўрапейскіх класікаў. Рыхтаваў агульнадаступныя падручнікі англійскай мовы для яўрэйскага насельніцтва. І-ы — "Англійскі настаўнік" (1891). Ствараў слоўнікі англа-ідзіш і ідзіш-англійскі (па 40 тыс. слоў), якія мелі 22 выданні. Яго слоўнік ідзіш-англа-іўрыцкі выйшаў у 1925 у ЗША (4-е выд. 1957).

**Гаркавы Аўрам Якаўлевіч** (15.11.1835, г. Навагрудак — 15.03.1919), яўрэйскі і рускі ўсходазнавец, семітолаг. Доктар гістарычных навук (1872). З сям'і заможнага гандляра. Вучыўся ў ешыботах у Беларусі. Скончыў рабінскую вучэльню ў Вільні (1863), факультэт усходніх моваў Пецярбургскага універсітэта (1868). Працягваў вучобу ў універсітэтах Берліна і Парыжа, спецыялізаваўся тут у галіне егіпталогіі і асіралогіі. Некаторы час выкладаў у Пецярбургскім універсітэце. З 1872 да канца жыцця загадваў аддзелам яўрэйскай літаратуры і ўсходніх рукапісаў Публічнай бібліятэкі ў Пецярбургу. Навуковыя інтарэсы датычаць гістарычнай геаграфіі поўдня Расійскай імперыі, гісторыі Усходу, яўрэйскай этнаграфіі, палеаграфіі, філалогіі. Публікаваў (з 1879) серыю помнікаў сярэдневяковай яўрэйскай пісьменнасці. Выдаў у Пецярбургу (на рускай мове, у перакладах на іўрыт) работы: "Аб мове яўрэяў, што жылі ў старажытныя часы на Русі, і пра славянскія словы, якія сустракаюцца ў яўрэйскіх пісьменнікаў" (1865), "Казанні мусульманскіх пісьменнікаў пра Славянаў і рускіх. З паловы VII ст. да канца X ст." (1870), "Пра першапачатковае месцазнаходжанне семітаў, індаеўрапейцаў і хамітаў" (1872), "Казанні яўрэйскіх пісьменнікаў пра хазараў і хазарскае царства" (1874), "Апісанне рукапісаў самарыцянскага Пяцікніжжа, якія захоўваюцца ў Імператарскай публічнай бібліятэцы". Вып. 1-2 (1874), "Апісанне пергаментных рукапісаў самарыцянскага Пяцікніжжа і яго перакладаў" (1875), "Нарысы гісторыі караімства". Вып. 1-2 (1897-1902). Быў рэдактарам перакладаў многіх прац па гісторыі яўрэяў. Быў сябрам навуковых таварыстваў многіх краін, сябрам Таварыства па распаўсюджанні асветы сярод яўрэяў у Расіі.

**Гарошка Леў Юр'евіч** (11.13.1911, в. Трашчычы Карэліцкага р-на — 28.07.1977), беларускі асветнік, рэлігійны дзеяч, гісторык, выдавец, пісьменнік. З сям'і фельчара. Вучыўся ў школе ў Трашчычах, Ярэмічах (Карэліцкі р-н), Міры (Карэліцкі р-н), дзе скончыў 7-годку. Скончыў Навагрудскую беларускую гімназію (1931), Львоўскую грэка-каталіцкую акадэмію (1936). Вучыўся ў Інсбруку (1936-37). Першую літургію на радзіме правёў у Дзяляцічах (Карэліцкі р-н). Служыў святаром у розных парафіях (Столін, Гродна, Жыровічы, Стоўбцы). За беларускую дзейнасць праследаваўся ўладамі Польшчы. З 1940 — наместнік грэка-каталіцкага экзарха Беларусі. У час вайны выкладаў беларускую мову ў гандлёвай школе, беларускую і лацінскую мовы ў медычнай вучэльні ў Баранавічах. Рэдагаваў "Баранавіцкую газэту". У 1944 арыштоўваўся гітлераўцамі за перашкоду ў вывазе вучняў у Германію. Дэлегат 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). Неўзабаве выехаў у Берлін, затым у Мюнхен, дзе арганізаваў беларускую касцельную службу. Вядзе шырокую культурна-асветную працу сярод беларусаў-эмігрантаў. Удзельнічае ў выданні газеты "Беларускія Навіны" (Парыж). У 1947-57 — выдавец і рэдактар часопіса "Божым шляхам" (Парыж), дзе шмат друкуецца. У 1959 уступае ў ордэн Марыянаў. З 1960 — рэктар беларускай каталіцкай місіі ў Вялікабрытаніі. У 1962-69 — ігумен-законнік Дому Марыянаў у Лондане. З 1965 — архімандрыт. У 1970-77 — кіраўнік беларускай секцыі радыё Ватыкана, рэктар беларускай каталіцкай місіі ў Францыі. Аўтар шматлікіх артыкулаў на тэмы гісторыі царквы ў Беларусі. Выдаў (на бел. мове) кнігі тэалагічнай, гістарычнай, прыродазнаўчай, філалагічнай праблематыкі. Сярод іх: "Божым шляхам. Малітоўнік для беларусаў" (Рым, 1946), "Беларусь у датах і ліках" (Парыж, 1947), "Душа" (Парыж, 1948), "Св. Еўфрасіння-Прадслава Полацкая. Патронка Беларусі" (Парыж, 1950), "Своеасаблівасці беларускае мовы" (Парыж, 1951), "Зборнік беларускіх народных прыказкаў і прымаўкаў" (Лондан, 1963), "Слуцкі фронт. Кароткі гістарычны нарыс Слуцкага ўздыму 1917-1921 гг." (Лондан, 1967), "Пракімэны 8-мі гласаў. Апосталы і Евангеллі ў беларускім перакладзе для літургічнага ўжытку ў нядзелі і святы" (Лондан, 1967), "Трыццацігоддзе беларускага душпастырства ў Францыі. 1946-1976 гг." (Парыж, 1976), "Навука і рэлігія" (Рым, 1977). Выдаў зборнік сваіх празаічных твораў (пад псеўданімам Антон Жменя) "Кветкі і церні жыцця" (Парыж, 1967). Склаў грэка — лацінскі — царкоўнаславянскі — беларускі слоўнік. Сабраў вялікую бібліятэку, якая стала асновай Лонданскай беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарынкі.

**Гаруновіч Лізавета Браніславаўна** (дзявоч. Саевіч, 7.11.1942, в. Залессе Смаргонскага р-па), беларускі педагог-метадыст. Кандыдат педагагічных навук (1986). Дацэнт (1989). З сям'і службоўца на чыгунцы. Скончыла ў Залессі СШ (1959). Была ст. піянерважатай у Жодзішскай СШ Смаргонскага р-на (1959-60). Вучылася на аддзяленні дашкольнага выхавання факультэта методыкі пачатковага навучання Мінскага педінстытута (1960-64). Працавала ў Мінску ў дзіцячым садзе №80 выхавальніцай (1964-67), у дзіцячым садзе №258 педагогам-метадыстам (1967-71), загадчыцай (1971-74), метадыстам Фрунзенскага РайАНА г. Мінска (1975). З 1975 выкладае ў Мінскім педінстытуце (Беларускім педагагічным універсітэце). Скончыла тут аспірантуру. З 1986 — загадчыца кафедры методыкі дашкольнага выхавання. Даследуе праблемы развіцця дзіцяці ў розных відах мастацкай дзейнасці.

**Гасціловіч Антон Восіпавіч** (7.11.1902, маёнт. Пянькоўшчына Ашмянскага р-на — 23.11.1975), беларускі вучоны ў галіне ваеннай справы. Доктар ваенных навук (1957). Прафесар (1959). Служыў у Чырвонай Арміі з 1919. Ваяваў у Туркменіі, удзельнічаў у падаўленні антысавецкіх паўстанняў у Уфімскай, Арэнбургскай губернях. Служыў у Украінскай ваеннай акрузе. Скончыў Ленінградскую пяхотную школу (1924), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1931), Акадэмію Генштаба (1937), дзе выкладаў у 1938. У 1939 — начальнік штаба 1-ай арміі групы савецкіх войск у Манголіі. Падчас вайны — начальнік штаба, камандуючы 17-ай арміяй Забайкальскага фронту. З 1943 — камандзір корпуса, камандуючы арміяй на 1-ым і 4-ым Украінскіх франтах. У 1945-65 — камандуючы арміяй, памочнік камандуючага ваеннай акругай, начальнік кафедры, намеснік начальніка Ваеннай акадэміі Генштаба, кансультант акадэміі. Генерал-палкоўнік (1959). Адзначаны баявымі ўзнагародамі.

**Гаўрош Ніна Васілеўна** (дзявоч. Калоша, 18.08.1936, в. Лукі Карэліцкага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1969). Дацэнт (1975). З сялянскай сям'і. Скончыла 7-годку ў роднай вёсцы. Вучылася ў педагагічнай вучэльні ў Навагрудку (1951-55). Працавала ст. піянерважатай Налібоцкай НСШ Навагрудскага р-на (1955-56), настаўніцай пачатковых класаў НСШ у в. Мольнічы Навагрудскага р-на (1956-57). У 1957-62 — студэнтка філфака Мінскага педінстытута. Затым — настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ №124 г. Мінска (1962-65), аспірантка кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута (1965-68). З 1968

выкладае на гэтай кафедры на пасадах асістэнта, ст. выкладчыка (1969), дацэнта (1971), прафесара (1994). Друкуецца як мовазнавец з 1960, даследуе сучасную беларускую літаратурную мову, мову мастацкага твора, методыку выкладання беларускай мовы. Асноўныя працы: "Намінатыўныя сказы ў сучаснай беларускай мове" (1975), "Вобразнае азначэнне ў беларускіх мастацкіх тэкстах". Вып. I. (1981), Вып. 2 (1986), "Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. Дапаможнік для вучняў" (1991), "Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы" (1998). У сааўтарстве выкананы працы: "Фразеалагічны слоўнік для сярэдняй школы" (1973), "Беларуская мова. Дапаможнік для абітурыентаў" (1992, 3-е выд. 1998), "Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія". (1998). Навуковы рэдактар зборнікаў мовазнаўчых прац.

**Геніюш Ларыса Антонаўна** (дзявоч. Міклашэвіч, 9.08.1910, маёнт. Жлобаўцы, Ваўкавыскага р-на — 7.04.1993), беларуская паэтка. З заможнай сялянскай сям'і. У 1915-19 знаходзіліся ў бежанстве. Вучылася ў пачатковай школе ў Гудзевічах (Мастоўскі р-н), у Ваўкавыскай гімназіі (1921-28). Жыла ў доме бацькоў. З 1935 — у Зэльве. У 1937 па сямейных абставінах выехала ў Прагу, дзе ўдзельнічала ў беларускім грамадскім і культурным руху. Узначальвала Пражскі аддзел Беларускага камітэта самапомачы. Была генеральным сакратаром Рады БНР (з 1943). Дэлегат 2-га Усебеларускага кангрэсу (1944). У 1948 рэпрэсавана, вывезена ў СССР і асуджана на 25 гадоў. Няволю адбывала ў канцлагерах у Комі АССР, Мардоўскай АССР. У 1956 вызвалена, жыла ў Зэльве, займалася літаратурнай творчасцю. Друкавалася з 1939. Выдала кнігі паэзіі "Ад родных ніў" (Прага, 1942), "Невадам з Нёмана" (1967), "На пабары настоена" (1982), зборнікі вершаў для дзяцей: "Казкі для Міхаські" (1972), "Добрай раніцы, Алесь" (1976). Выйшаў том яе выбранай паэзіі "Белы сон" (1990), зборнік вершаў (сумесна з Ю. Геніюшам) "Маці і сын" (Беласток, 1992), кніга ўспамінаў "Споведзь" (1993).

**Геніюш Юрка** (Юры Іванавіч, 21.10.1935, мяст. Зэльва — 20.11.1985), беларускі пісьменнік (празаік, драматург, публіцыст). Сын Л.Геніюш. У 1937 выехалі ў Прагу па месцы працы бацькі. Тут вучыўся ў пачатковай школе пры рускай гімназіі (1942-46), затым у чэшскай гімназіі. З 1948, калі рэпрэсавалі бацькоў, жыў у Польшчы пры сваяках. Вучыўся ў вячэрняй школе і працаваў (у Вроцлаве, Гліўіцах). З 1957 — на Беласточчыне. Вучыўся ў медычнай акадэміі ў Беластоку (1958-65). Працаваў лекарам у Гарадку, з 1981 у Беластоку. Нярэдка прыязджаў у Зэльву, дзе з 1956 жылі бацькі. Дэбютаваў як

празаік у 1963 на старонках "Нівы". Выдаў (з С. Яновічам) кніжку п'ес "Зборнік сцэнічных твораў" (Беласток, 1976). У 1981 беластоцкі клуб Саюза польскіх пісьменнікаў выпусціў (на беларускай і польскай мовах) кніжку яго апавяданняў-замалёвак "На пачатку было толькі слова". Пасмяротныя выданні прозы — "Маці і сын" (з Л.Геніюш, Беласток, 1992), "З маёй званіцы" (Беласток, 1993).

**Герус Сямён Пятровіч** (21.11.1925, в. Кунічна Навагрудскага р-на — 23.02.1998), беларускі мастак-графік. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1956). З беднай сялянскай сям'і. У пачатковай школе вучыўся ў в. Гарадзечна (Навагрудскі р-н). Працягваў вучобу ў Навагрудку. У 1945 скончыў Навагрудскую педагагічную вучэльню. Паступаў у Ленінградскую акадэмію мастацтваў, але не быў прыняты з-за пражывання на акупаванай тэрыторыі. Год вучыўся на факультэце замежных моваў Гродзенскага педінстытута (1945-46). Затым — студэнт графічнага факультэта Мастацкага інстытута Літоўскай ССР (1946-52). Нядоўга тут выкладаў. Быў запрошаны ў Мінск, дзе выкладаў графіку ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1953-67). Працаваў рэдактарам мастацка-экспертнай калегіі Міністэрства культуры БССР (1967-70). Мастацкая творчасць — у жанрах сюжэтна-тэматычнай кампазіцыі, пейзажа, партрэта (тэхнікі літаграфіі, лінагравюры, афорта, малюнку). Удзельнік выставаў (з 1953) у Беларусі, Расіі, Літве, Англіі, ЗША, Канадзе, Балгарыі. Выканаў партрэты: "Балерына Л. Ражанава" (1960), "Калгасны пастух С. Карабовіч" (1962), "Паэт П. Макаль" (1963), "І. Буйніцкі" (1963), "Вера Харужая" (1965), "Кампазітар Р. Пукст" (1967), "Паэт П. Броўка" (1967), "Паэт А. Русак" (1971), "Кампазітар А. Туранкоў" (1973), "Скульптар З. Азгур" (1973), "Паэт А. Бачыла" (1973), "Хірург М. Мішэнін" (1975), "Паэт А. Міцкевіч" (1977), "Партызан В. Корж" (1977), "Герой Працы П. Тур" (1980), "Пісьменнік А. Кулакоўскі" (1983), "Скульптар А. Бембель" (1983), "Акадэмік М. Саўчанка" (1985), "Кастусь Каліноўскі" (1985), "Паэт Г. Бураўкін" (1986). Аўтар пейзажаў: "Навагрудскі замак" (1955), "Восень"(1955), "Поле" (1957), "У родных мясцінах" (1963), "Вечар на Свіслачы" (1964), "Навагодні пейзаж" (1965), "Рака Нёман" (1965), "Ветраны дзень" (1966), "Разбураны Мінск"(1972), "Вуліца Няміга" (1978), "Цэнтральная плошча" (1972), "Жыта красуе" (1980). Аўтар кампазіцый: "Перад спускам у шахту" (1960), "Вызваленне Заходняй Беларусі 17 верасня 1939 г." (1967), "Лаўсан" (1970), "У аддзеле тэхнічнага кантролю" (1976), "Мы — беларусы" (1980), "9 мая. Плошча Перамогі" (1984). У канцы 80-х — 90-я выканаў серыю эстампаў "Стары Мінск", партрэты гістарычных асоб

Беларусі (Міндоўг, Гедымін, Вітаўт, Сапега), пісьменнікаў (Л.Геніюш, Н. Арсеннева, С. Грахоўскі). Творы захоўваюцца ў Беларусі, у розных краінах Еўропы, Азіі, Амерыкі.

**Гільдзюк Юры Мікалаевіч** (15.05.1948, г. Гродна), беларускі культурны дзеяч, музуыкант (фартэпіяна), музычны педагог. Дацэнт (1991). Заслужаны артыст Беларусі (1992). З сям'і музычнага педагога. Скончыў 7 кл. Гродзенскай СШ №10 (адначасова — дзіцячую музычную школу №1) у 1962. Вучыўся ў сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай кансерваторыі (1962-66). Скончыў Беларускую кансерваторыю (клас І. Цвятаевай) у 1971, аспірантуру пры Маскоўскай кансерваторыі ў 1973. Працаваў затым у сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай кансерваторыі (у 1973-74 служыў у войску). Адначасова (з 1977) загадчык кафедры канцэртмайстарскага майстэрства і выкладчык (з 1996 прафесар) кафедры фартэпіяна Беларускай кансерваторыі (акадэміі музыкі). Адначасова (з 1983) мастацкі кіраўнік Беларускай філармоніі. Адзін з заснавальнікаў і арганізатараў міжнародных музычных фестываляў ("Беларуская музычная восень", "Мінская вясна"), конкурсаў музычных выканаўцаў. Як піяніст выступае ў канцэртах сола, а таксама ў ансамблі з інструментальнымі калектывамі, з опернымі і камернымі спевакамі (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Балгарыі, Германіі, Францыі, Італіі, Нідэрландах, Югаславіі, Славеніі, Украіне, Грузіі). Адзначаны міжнароднымі дыпломамі.

**Гінцбург Ілля Якаўлевіч** (27.05.1859, г. Гродна — 3.01.1939), рускі скульптар. Акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1911). Быў вучнем М. Антакольскага ў Пецярбургу (з 1871). Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1878-86). Удасканальваўся як мастак у Парыжы і Рыме. Працаваў у Пецярбургу. Заснаваў там яўрэйскае таварыства заахвочання мастацтваў (1919). Раннія скульптуры прысвечаны дзецям: "Хлопчык, што збіраецца купацца" (1886), "Малады музыкант" (1890), "У кутку" (1901). У жанры малой формы выканаў партрэты Л.'Талстога, А. Рубінштэйна, В. Верашчагіна, Л. Пастарнака, Г. Гінзбурга. Стварыў помнікі Г. Пляханаву (1925) і Д. Мендзялееву (1929) у Ленінградзе, І. Айвазоўскаму (1930) у Феадосіі, М. Гогалю (1911) у в. В. Сарочынцы Палтаўскай вобл. Напісаў мемуары "З майго жыцця" (СПб, 1908).

**Гіргас Уладзімір Фёдаравіч** (13.12.1835, г. Гродна — 1887), рускі мовазнавец-арабіст, педагог. Доктар мовазнаўства (1873).

Прафесар (1873). Скончыў 4-ю гімназію ў Пецярбургу, факультэт усходніх моваў Пецярбургскага універсітэта (1858). Два гады вывучаў арабскую і турэцкую мовы ў Парыжы. У 1861-64 вывучаў арабскую мову і культуру ў Сірыі і Егіпце. У 1865-86 выкладаў на кафедры арабскай славеснасці Пецярбургскага універсітэта. Апошнія гады жыцця прайшлі ў Кіеве. Выдаў у Пецярбургу "Нарыс граматычнай сістэмы арабаў" (1873), "Арабскую хрэстаматыю". Вып. 1-2 (1875-76, у сааўт.), "Слоўнік да "Арабскай хрэстаматыі" і "Карана" (1881). Падрыхтаваў да выдання гістарычныя працы Абуханіфы ад Дынаверы (выйшлі ў 1888).

**Гіруць-Русакевіч Валянціна Францаўна** (дзявоч. Пруць, 18.10.1953, в. Міхайлоўшчына Ашмянскага р-на), беларуская паэтка, журналістка. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1998). З сям'і бухгалтара калгаса. У роднай вёсцы скончыла СШ (1970). Вучылася на філфаку БДУ (1970-75). Затым працуе ў рэдакцыі Валожынскай раённай газеты "Працоўная слава" (з 1998 загадчыца аддзела сельскай гаспадаркі, затым інфармацыі). Вершы друкуе з 1969 (спачатку ў Ашмянскай раённай газеце). Выдала зборнік паэзіі "Я адкрываю вам душу" (1996).

**Гіршорн Самуіл** (1876, г. Слонім — 28.05.1942), польскі і яўрэйскі пісьменнік (паэт, перакладчык, публіцыст), выдавец. З дробнай мяшчанскай сям'і. Перабраўся ў Варшаву, дзе скончыў гандлёвую школу. Пісаў па-польску. У 1906-07 супрацоўнічаў у "Głosie Żydowskim". У 20-я стварыў і рэдагаваў газеты "Nasz kurjer", "Nasz dzieńńik", у 30-я (да 1939) рэдагаваў "Nasz Przegląd". Тут друкаваў свае вершы, публіцыстыку. Заснавальнік яўрэйскай народніцкай партыі (фалькісты). Ад гэтай партыі быў дэпутатам сейма Польшчы. Перакладаў на польскую мову (з ідзіш і іўрыту) яўрэйскіх паэтаў. Аўтар польскамоўнай "Анталогіі яўрэйскай паэзіі" (Варшава, 1921). Выдаў нарыс "Справы яўрэяў у Польшчы ад чатырохгадовага сейма да сусветнай вайны. 1788-1914" (Варшава, 1923).

**Глебаў Іван Аляксандравіч** (21.06.1864, г. Гродна — ?), рускі педагог, гісторык. З сям'і чыноўніка. Вучыўся ў Гродзенскай (1873-77) і Віленскай (1877-62) гімназіях. Скончыў Пецярбургскі гістарычна-філалагічны інстытут (1886). Працаваў настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў Магілёўскай рэальнай вучэльні (1886-90), у Слуцкай гімназіі (1890-1902). У 1902-06 выкладаў у Віленскім настаўніцкім інстытуце. У гэты ж час працаваў у Віленскай археаграфічнай камісіі.

У 1906 ён — дырэктар Шавельскай (Шаўляй) гімназіі, з 1907 — Гродзенскай мужчынскай гімназіі. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта, педагагічнага таварыства. Сябра Рускага геаграфічнага таварыства. Выдаў нарысы: "Князь Грыгорый Аляксандр Пацёмкін-Таўрычаскі..." (Слуцк, 1893), "Імператар Мікалай І..."(Слуцк, 1897), "Імператрыца Екацярына II Вялікая..." (Слуцк, 1898), "Гістарычная нататка пра Слуцкую гімназію з 1617-1630-1905 гг." (Вільня, 1904), "Адміністрацыйная дзейнасць імператрыцы Екацярыны II" (Вільня, 1904), "Віленскі замак: верхні і ніжні. Гістарычны нарыс" (Вільня, 1904).

**Глінская Тэафілія** (сапр. Букатая, 1762, в. Вялікія Косічы Навагрудскага р-на — 23.10.1799), польская паэтка. Пэўны час жыла ў Шчорсах (Навагрудскі р-н). Аўтар паэмы "Шчорсы" (Вільня, 1784), віншавальных вершаў, перакладаў. Выклала вершам фрагмент рамана Ж. Мармантэля "Інкі, або знішчэнне Перу" ("Перуанскія гімны смерці", 1785).

**Глінскі Антон** (1797, маёнт. Шчорсы Навагрудскага р-на — 30.06.1866), польскі і беларускі пісьменнік, фальклярыст. З сям'і селяніна. У Шчорсах скончыў школу. Набываў веды шляхам самаадукацыі, працуючы ў бібліятэцы Храптовічаў у Шчорсах. З 1844 жыў у Вільні, дзе атрымаў пасаду губернскага чыноўніка. Рэдагаваў газету "Виленские губернские ведомости". З 1863 працаваў перакладчыкам у газеце "Виленский вестник" ("Kurjer Wileński"). Удзельнічаў у рабоце віленскага гуртка А. Кіркора. Збіраў беларускі фальклор (казкі, легенды, былі, анекдоты). Літаратурна апрацоўваў гэтыя творы, сабраныя пераважна ў Шчорсах, Нягневічах (Навагрудскі р-н), а таксама некаторыя папулярныя літаратурна-мастацкія сюжэты. У выніку выдаў збор (на польскай мове) "Польскі казачнік". Т. I-IV (Вільня, 1853). Кніга перакладалася на чэшскую, французскую (1864), англійскую (1874), нямецкую (1878) мовы., 11 разоў перавыдавалася на польскай мове. Пераклаў на польскую мову байкі І. Крылова, выдадзеныя ў 1860 і 1863.

**Глябовіч Антон** (14.07.1801, г. Гродна — 29.05.1847), польскі педагог, журналіст, выдавец. Скончыў дамініканскую школу ў Гродне, літаратурна-мастацкі факультэт Віленскага універсітэта (1820). Супрацоўнічаў у "Dzienniku Wileńskim", часопісе "Dzieje Dobroczynności". З 1823 — у Пецярбургу. Працаваў у дэпартаменце камунікацый, быў сакратаром М. Румянцава, супрацоўнікам міністэрства вайсковых

спраў. З 1829 — у Варшаве. У час паўстання 1830-31 працаваў у канцылярыі інтэнданта расійскага войска, затым перакладчыкам у Вышэйшым крымінальным судзе, які выносіў прысуды паўстанцам. Быў абраны ў склад камітэта па арганізацыі школ у Польскім Каралеўстве. Затым — сакратар Рады Публічнага выхавання (1833). З 1834 — генеральны інспектар школ. З 1839 — сябра Рады Публічнай апекі пры Варшаўскай навучальнай акрузе. Тады ж увайшоў у кіраўніцтва Варшаўскай духоўнай акадэміі, выдаваў "Pamiętnik Religijno-Moralny" (1841-47), што быў органам акадэміі. Выпусціў "Кароткі нарыс жыцця Вітаўта, князя Літоўскага" (Вільня, 1821). Склаў "Польска-рускі размоўнік" (Варшава, 1836). Пераклаў на польскую мову "Пачатковыя правілы рускай граматыкі" (Варшава, 1834, 4-е выд. 1847).

**Глябовіч Генрых** (1.07.1904, г. Гродна — 9.11.1941), польскі і беларускі культурны дзеяч, педагог, каталіцкі духоўнік. Доктар філасофіі (1928). Доктар тэалогіі (1932). З сям'і банкаўскага службоўца. У Гродне вучыўся ў пачатковай школе. Скончыў гімназію ў Арэнбургу, куды ў 1913 пераведзены бацька. У 1921 сям'я вярнулася ў Гродна. Вучыўся ў каталіцкай духоўнай семінарыі ў Вільні. Затым — на тэалагічным факультэце каталіцкага універсітэта ў Любліне (1924-27). Адначасова — на філасофскім факультэце ў універсітэце Ангелікум у Рыме (скончыў у 1929). У 1930-36 узначальваў кафедру тэарэтычнай тэалогіі ў Віленскім універсітэце. Апекаваўся мужчынскім інтэрнатам універсітэта, прытулкам для сірот з сем'яў рабочых, хворымі ў бальніцах, дзецьмі беспрацоўных. Адзін з заснавальнікаў студэнцкага каталіцкага згуртавання, што выдавала месячнік "Pax". Супрацоўнічаў з віленскім радыё. З 1935 — пробашч у Троках, дзе працягваў шырокую дабрачынна-асветніцкую дзейнасць. У 1937 — грамадскі абаронца на судовым працэсе ў Вільні, скіраваным супраць рэдакцыі перыёдыкаў "Poprostu" і "Karta". У 1938 — прэфект гімназіі св. Тэрэзы ў Рабках на Віленшчыне. Рыхтаваў да друку падручнік па рэлігіі для І-га класа ліцэяў. У 1940-41 служыў ксяндзом у Вільні і вёў тайныя ўрокі рэлігіі для школьнікаў. Некаторы час рэдагаваў нелегальны часопіс "Jutro Polski". З верасня 1941 вёў душпастырскую працу на Міншчыне. Расстраляны гітлераўцамі ля Барысава па падазрэнні ў нелаяльнасці. Выдаў на польскай мове кніжку "Адзінства хрысціянскага касцёла паводле св. Яна Хрызастома" (Вільня, 1932).

**Глякоўскі Станіслаў** (1896, мяст. Поразава Свіслацкага р-на — 1948), беларускі грамадска-культурны дзеяч, публіцыст, каталіцкі

духоўнік. Доктар тэалогіі (1936). Скончыў каталіцкую духоўную семінарыю ў Вільні, Грыгарыянскі універсітэт у Рыме. Служыў вікарам у Ваўкавыску. З 1928 — пробашчам у в. Трычоўка на Беласточчыне. З 1929 — прэфектам у Вільні. У 30-я выкладае ў Віленскай беларускай гімназіі. Быў старшынёй "Лігі маральнага адраджэння". Выхоўваў беларускую нацыянальную свядомасць прыхаджанаў, заахвочваў да беларускай перыёдыкі, уводзіў у касцёл беларускую мову. Быў сябрам Беларускага навуковага таварыства, Беларускага каталіцкага выдавецтва ў Вільні. Выдаваў дзіцячы часопіс "Пралескі" (1934-38). Артыкулы па гісторыі, грамадскай думцы Беларусі публікаваў у часопісе "25 сакавіка", газеце "Беларуская крыніца". У Вільні ў 1937 надрукаваная (на лаціне) яго доктарская дысертацыя, прысвечаная працы І. Кранштадскага "Маё жыццё ў Хрысце". У 1939-41 быў вікарам у віленскім касцёле св. Яна. З 1941 — у Мінску на душпастыарскай ніве. Арыштаваны гітлераўцамі за нелаяльнасць. Загінуў у Бухенвальдзе.

**Гойлік Эдуард** (13.09.1914, в. Верабейкі Свіслацкага р-на — 4.03.1977), польскі і беларускі музычны педагог, хормайстар, кампазітар. З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў Ваўкавыску. Вучыўся (з 1932) у Свіслацкай настаўніцкай семінарыі, быў тут дырыжорам духавога аркестра (1933-35). Працягваў адукацыю ў настаўніцкай семінарыі ў Аўгустове (1935-36). Затым вучыўся ў Варшаўскай кансерваторыі. Вучобу абарвала вайна, якая закінула ў Кіргізію. Тут выкладаў у школе музыку і спевы. Уступіў у польскае войска Андэрса, у складзе якога прайшоў Блізкі Усход, Італію. Быў ранены пад Монтэ-Касіна. У 1944-45 — дырыжор аркестра польскага салдацкага тэатра ў Італіі. Неўзабаве пераехаў з тэатрам у Англію. З 1947 — у Польшчы. Жыў ў Гнезне, затым у Ольштыне, дзе выкладаў музыку ў педагагічным ліцэі, кіраваў харавой капэлай пры ваяводскім Доме культуры. З 1958 жыў у Беластоку. Працаваў тут у Інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, затым у настаўніцкай завочнай студыі, у Вышэйшай педагагічнай школе ў Беластоку. У 60-я быў музычным кіраўніком беларускага эстраднага ансамбля "Лявоніха". Скончыў Вышэйшую музычную школу. Пісаў творы для сімфанічнага аркестра, для скрыпкі, габоя, фартэпіяна. Аўтар хораў, песень (у тым ліку на сл. А. Барскага, В. Шведа). Апрацоўваў беларускія народныя песні.

**Голуб Юрка** (Юры Уладзіміравіч, 20.10.1947, в. Горна Зэльвенскага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1971). З сям'і селяніна, які займаўся кравецтвам. У Горне скончыў

пачатковую школу, у Зэльве — СШ (1965). Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1965-70), удзельнічаў у рабоце студэнцкага літаб'яднання "Узлёт". У 1970-77 і 1979-96 — на Гродзенскай студыі тэлебачання (у рэдакцыі літаратурна-музычных перадач, з 1979 — загадчыкам аддзела мастацкага вяшчання). Вёў з 1972 штомесячную перадачу "Гродзеншчына літаратурная". У 1978 і з 1996 працуе ў рэдакцыі абласной газеты "Гродзенская праўда". З карэспандэнцыямі на мясцовыя тэмы выступаў у раённым друку з 1961. Вершы друкуе з 1963. Выдаў зборнікі лірыкі "Гром на зялёнае голле" (1969), "Дрэва навальніцы" (1973), "Векапомнае поле" (1976), "Помню пра цябе" (1983), "Сын небасхілу" (1989), кніжку вершаў для дзяцей "У бары грыбы бяры" (1986). Займаецца перакладамі, друкуе апавяданні-замалёўкі, эсэ.

**Гольдберг Бен Цыён** (1895, мяст. Гальшаны Ашмянскага р-на — 1972), яўрэйскі журналіст, псіхолаг. Доктар псіхалогіі (1921). Пісаў на ідзіш і англійскай мовах. Вучыўся ў ешыботах Ліды і Валожына. Браў прыватныя ўрокі. У 1907 выехаў з бацькамі ў ЗША. У 1920 скончыў аддзяленне псіхалогіі Калумбійскага універсітэта. З 1922 — супрацоўнік, у 1924-40 — рэдактар газеты "Дэр тог". Адзін з стваральнікаў таварыства "Аб'яднанне культур з мовай ідзіш" (1937). Яго прасавецкія рэпартажы аб наведанні СССР (1934) выклікалі палеміку ў яўрэйскай прэсе ЗША. У час вайны — сябра Амерыканскага камітэта яўрэйскіх пісьменнікаў, мастакоў і вучоных і яўрэйскага Савета па дапамозе СССР у вайне. Узначальваў нацыянальны яўрэйскі Камітэт амерыкана-савецкай дружбы. Пасля вайны жыў у Ізраілі. Выдаў кнігі "Яўрэйская праблема ў СССР" (1961), "Падарожжа па СССР" (1966).

**Гордан Шмуль** (1865, г.Ліда — 1933), яўрэйскі пісьменнік (паэт, перакладчык), бібліязнавец. Атрымаў традыцыйную яўрэйскую адукацыю. Папаўняў веды самастойна. У 1898 выехаў у Палестыну, дзе выкладаў у яўрэйскай мужчынскай школе. З 1901 — у Варшаве, тут стварыў школу з выкладаннем на іўрыце. Рэдагаваў часопісы для дзяцей і юнацтва "Одам катан" (1901-05), "Ха-неўрым" (1904-05), настаўніцкі штомесячнік "Ха — педагог" (1903-04). У 1904 вярнуўся ў Палестыну. Выпусціў кніжкі вершаў "Арфа Ізраіля". Т. 1-3 (1891-93), "Тэорыя літаратуры" Т. 1-2 (1900). Выдаў шматтомны каментар да Бібліі, які з'яўляецца асноўным навучальным дапаможнікам у свецкіх школах Ізраіля.

**Горская Святлана Альбертаўна** (2.05.1962, г. Гродна), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1990). Дацэнт (1999). З сям'і службоўцаў (бацька — вайсковец, маці — педагог вышэйшай школы). Скончыла СШ №11 г. Гродна (1980). Вучылася на аддзяленні рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1980-85). Выкладала рускую мову і літаратуру ў СШ №9 г. Гродна, рускую мову ў Гродзенскай педагагічнай вучэльні (1986-87). У 1987-90 — аспірантка БДУ. З 1991 працуе на кафедры рускай мовы Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1989. Займаецца даследаваннем руска-беларускіх моўных сувязяў, фаналогіяй, семіётыкай, катэгорыяй прасторы ў мове. Сааўтар падручніка для школ з паглыбленым вывучэннем рускай мовы — "Руская мова. Фанетыка. Словаўтварэнне" (1998, на рус. мове).

**Горскі Канстанцін Канстанцінавіч** (13.06.1859, г. Ліда — 31.05.1924), польскі, беларускі і рускі музыкант (скрыпка), кампазітар. З сям'і музыканта. Вучыўся ў музычным інстытуце ў Варшаве. Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1881). Пазней удасканальваў ігру на скрыпцы і выкладаў музыку ў Пензе, Саратаве, Харкаве. У Тыфлісе быў дырэктарам музычнай школы, узначальваў оперную трупу. З 1919 — у Варшаве, дзе іграў у кінатэатрах. З 1922 — у Познані, быў канцэртмайстрам у оперным тэатры. Аўтар танцавальнай музыкі (паланезы, мазуркі), твораў для скрыпкі, фартэпіяна, песень (на сл. У. Сыракомля М. Канапніцкай), выдадзеных у 1914, фантазіі для аргана, месаў, сімфанічных паэм "На Алімпе", "Зачараванае кола", опер "Па хлеб", "Маргер" (клавір выдадзены ў Пецярбургу ў 1905, паст. у 1927 у Познані).

**Граблеўскі Іван Станіслававіч** (11.10.1936, в. Сакольнікі Астравецкага р-на — 19.12.1994), беларускі журналіст, публіцыст, краязнавец. Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1967). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Варнянах (Астравецкі р-н) у 1955. Служыў у войску (1955-58). З 1958 — у раённай газеце ў Астраўцы (карэктарам, літсупрацоўнікам). Завочна скончыў журфак БДУ (1965). Працаваў у раённых газетах у Смаргоні, Шчучыне, Вялікай Бераставіцы. З 1970 — галоўны рэдактар Гродзенскага абласнога тэлебачання. У 1979-82 быў загадчыкам сектара друку, радыё і тэлебачання Гродзенскага абкама КПБ. У 1982-94 — старшыня камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні Гродзенскага аблвыканкама. Друкаваў краязнаўчыя нарысы. Выдаў кнігі (на рус. мове): "Гродзенская вобласць" (1975, у сааўт., 2-е выд. 1988, без сааўт.), "Юныя героі

Гродзеншчыны" (1981), "Нёман — рака дружбы" (1982), даведнік "Гродна і ваколіцы" (1987).

**Граніт Пятрусь** (сапр. Івашэвіч Іван Пятровіч, 24.01.1909, в. Зачэпічы Дзятлаўскага р-на — 24.01.1980), беларускі паэт, педагог. З сялянскай сям'і. Вучыўся пераважна самастойна, у школе — урыўкамі. У Зачэпічах скончыў 5 кл. З сярэдзіны 20-х удзельнічаў у руху Грамады,ТБШ. Не раз арыштоўваўся паліцыяй. У 1927-39 працаваў брукаром, зімою ўдзельнічаў у беларускіх спектаклях. У 1939-41 — сакратар валвыканкама, затым старшыня сельсавета ў Белічы (Лідскі р-н), дзе скончыў 7 кл. вячэрняй школы. Падчас вайны працаваў на гаспадарцы, быў партызанскім сувязным. У 1945-71 — загадчык пачатковай школы, затым настаўнік у Зачэпічах (у 1950 скончыў завочна Навагрудскую педагагічную вучэльню). Друкаваў вершы (з 1933) у газетах "Наша воля", "Беларуская газета", "Poprostu", часопісах "Асва", "Беларускі летапіс", "Шлях моладзі". Удзельнік нелегальнага з'езду заходнебеларускіх пісьменнікаў (Вільня, 1933). Падрыхтаваны да друку зборнік паэзіі "Над хваламі Нёмана" не выйшаў у сувязі з вайной. Выдаў кніжку вершаў для дзяцей "Сцяжынка" (1978).

**Гродзенскі Хаім** (1863, мяст. Іўе — 1940), яўрэйскі рэлігійна-грамадскі дзеяч, галахіст. У 1887 прызначаны Даянам у Вільні. Адзін з ініцыятараў склікання віленскай канферэнцыі (1909), якая заснавала артадаксальную арганізацыю "Кнесет Ізраіль", што змагалася супраць свецкай адукацыі, за рэлігійнае выхаванне на торы і талмудзе. Распрацоўваў талмудычнае права і рытуалы, выдаўшы кнігу "Ахізер" Т. 1-3 (Вільня, 1925, 1939). Быў духоўным лідэрам артадаксальнага яўрэйства ў "Літве". Вялікая рукапісная спадчына загінула падчас II сусветнай вайны.

**Грос Віктар Іванавіч** (11.11.1934, в. Дзяляцічы Навагрудскага р-на -31.03.1980), беларускі скульптар. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1964). З сялян. Скончыў Мастацкі інстытут Літоўскай ССР (Вільнюс) у 1958. Працаваў у галіне станковай і манументальнай скульптуры, ствараў партрэты, кампазіцыі. Удзельнічаў у выставах з 1956. Сярод твораў: "Рыбак" (1958, 1968), "Працаўнікі мора"(1958), "Электразваршчык" (1960), "А. Марэсьеў" (1960), "Муляр" (1961), "Каменяцёс" (1962), "З школы на будоўлю" (1932), "Паграні́чнік" (1964), "Нескароны" (1964), "Рабочы" (1966), "Трактарыст" (1973), "А. Рымар" (1973), "Васіль Цёркін" (1975). Таксама — "Мантажнік", "Сплаўшчык

лесу", "Механізатар", "Воін", "Тынкоўшчыца" "К. Цішук", "Дзяўчынка", "М. Горкі". Стварыў помнік салдатам, партызанам, мірным жыхарам, што загінулі падчас вайны, у в. Дзяляцічы (1969), г. Любань (1956, у сааўт.), в. Пухавічы на Міншчыне (1969).

**Грыб Мечыслаў Іванавіч** (28.09.1938, в. Савічы Дзятлаўскага р-на), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. Заслужаны юрыст Беларусі (1994). Генерал-лейтэнант міліцыі (1992). З сялянскай сям'і. Скончыў у Дзятлаве рускую СНІ, у Львове — пажарна-тэхнічную вучэльню (1959). Працаваў інспектарам міліцыі Пліскага райвыканкама Віцебскай вобл. У 1962-81 — у органах унутраных спраў Віцебска і Віцебскай вобл, (скончыў завочна юрфак БДУ ў 1967). З 1981 — начальнік управы ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. З 1990 — дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (сябра Прэзідыуму Вярхоўнага Савета, старшыня пастаяннай камісіі па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю). У 1994-96 — старшыня Вярхоўнага Савета РБ. Пазней нядоўга працаваў адвакатам. Аўтар кніг "Беларусь на шляхах незалежнасці" (1994), "На гістарычных скрыжаваннях" (1996).

**Грыб Тамаш Тамашавіч** (19.03.1895, в. Паляны Астравецкага р-на — 25.01.1938), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. Доктар філасофіі (1928). З беднай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Пецярбургскім псіханеўралагічным інстытуце, дзе зблізіўся з беларускім рухам. З 1914 — у войску, удзельнік І-ай сусветнай вайны. Дэлегат Усебеларускага кангрэса (снежань 1917), на якім быў арыштаваны савецкімі ўладамі. Адзін з аўтараў Устаўных грамат БНР, Сябра Рады БНР і яе Выканкама (1918), займаў пасады міністра земляробства і міністра ўнутраных спраў. Уваходзіў у Цэнтральную Беларускую вайсковую раду. Адзін з лідэраў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Удзельнік 3-га Усерасійскага з'езду Саветаў (1918). У 1918 чытаў лекцыі на курсах беларусазнаўства ў Мінску. У пач. 1919 выдае ў Вільні газету "Грамадзянін". З красавіка 1919 — у Гродне, дзе супрацоўнічае ў газеце "Родны край", затым — у Мінску. Двойчы ў 1919 зняволены польскімі ўладамі за беларускую незалежніцкую дзейнасць. У канцы 1920 выязджае ў Коўна, удзельнічае тут у выданні газеты "Сялянская доля". Удзельнік Усебеларускай палітычнай канферэнцыі (Прага,1921). З 1922 — у Чэхіі. Скончыў філасофскі факультэт Карлава універсітэта (1928). Стварыў у Празе Беларускае культурнае таварыства імя Ф. Скарыны. Актыўна працаваў у суполцы Беларускага студэнцкага Саюза. Удзельнічаў у рабоце Беларускай

Рады ў Празе. З 1930 працаваў тут у славянскай бібліятэцы. У 1934-38 — загадчык беларускага замежнага архіву ў Празе. Артыкулы на тэмы гісторыі, грамадскай думкі, нацыянальна-палітычнага жыцця Беларусі друкаваў у часопісах "Студэнцкая думка", "Золак", "Iskry Skaryny". Перакладаў публіцыстыку з рускай і чэшскай моваў. Складаў бібліяграфію беларусазнаўства.

**Грываў Георгі Міхайлавіч** (1.08.1947, в. Пятровічы Іўеўскага р-на), беларускі філосаф, сацыёлаг, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1985). Дацэнт (1990). З сям'і настаўніка. СШ скончыў у Іўі (1965). У 1965-70 настаўнічаў у Карпавіцкай і Лукашынскай 8-годках Іўеўскага р-на. Завочна вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута (1966-67), на гістфаку Маскоўскага універсітэта (1967-69). У 1970-75 — студэнт (стацыянара) аддзялення філасофіі БДУ. З 1975 выкладае філасофію ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым (палітэхнічным) інстытуце. З 1993 — загадчык кафедры філасофіі і культуралогіі гэтага інстытута. Друкуецца з 1977, вывучае праблемы свядомасці сучаснай моладзі, дынаміку яе сацыяльна-палітычных, маральных арыентацый.

**Грыгор'еў Георгі Аляксеевіч** (12.02.1950, г. Гродна), беларускі гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1984). З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў СШ №14 г. Гродна. У 1964 сям'я пераехала ў Мінск. Тут скончыў СШ №64 (1967). Вучыўся на гістфаку БДУ (1968-73). Затым працуе ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук (ст. лабарантам у 1973-76, малодшым навуковым супрацоўнікам у 1976-86, навуковым супрацоўнікам у 1986-89 і з 1989 — ст. навуковым супрацоўнікам). Вывучае пераважна гісторыю сялянства Беларусі. Выдаў кнігі (на рус. мове): "Ступені спеласці. З гісторыі камсамольскай арганізацыі АН БССР" (1990, у сааўт.), "Сялянскае таварыства ўзаемадапамогі БССР: 1921-1930 гг." (1993). Адзін з аўтараў дакументальных хронік "Памяць" Круглянскага, Крупскага, Салігорскага раёнаў.

**Грыневіч Сяргей Аркадзевіч** (25.02.1960, в. Краснае Сяло Ваўкавыскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1987). Вучыўся ў Краснасельскай школе (1967-71), у Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве (1971-78). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці "манументальна-дэкаратыўнае мастацтва" ў 1983. Служыў у войску (1983-85). Затым жыве ў Гродне, працуе ў мастацкіх

майстэрнях (1983-94). Асноўныя жанры — роспіс, вітраж. З 1983 удзельнічае ў выставах (у Беларусі, Польшчы, Літве, Расіі, Іспаніі, ЗША, Францыі). Сярод твораў: манументальныя роспісы ў Казлоўшчынскай СПТВ Дзятлаўскага р-на (1985), у Скідзельскай СПТВ Гродзенскага р-на (1986), вітражы ў фае Навагрудскага завода газавай апаратуры (1986), цыкл роспісаў у Гродзенскай СПТВ № 120 (1987), вітражы ў гандлёвым цэнтры на бульв. Ленінскага камсамола ў Гродне (1988), у ЗАГСе Кастрычніцкага р-на г. Гродна (1989), роспісы ў бальніцы № 4 г. Гродна (1989), вітражы ў гандлёвым доме "Нёман" у Гродне (1992). Выканаў для Гродзенскага музея М. Багдановіча серыю партрэтаў пісьменнікаў Гродзеншчыны. Напісаў цыклы работ "Дзіцячыя гульні", "Пірамiды", "Ветракі", "Рыбкі", "Па жніве", "Архітэктурныя матывы". Аўтар многіх ўмоўных кампазіцый.

**Грынь Мікалай Міхайлавіч** (14.07.1940, в.Змяёва Гродзенскага р-на), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1990). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Капліца (Гродзенскі р-н). Скончыў 7-годку ў Путрышках (Гродзенскі р-н) у 1956. Падчас вучобы працаваў у калгасе. Скончыў Бераставіцкую вучэльню механізацыі сельскай гаспадаркі (1957) і працаваў камбайнерам-трактарыстам у калгасе "Расія" (Гродзенскі р-н), на цалінных землях Казахстана. Служыў у войску (1960-63). У 1963-66 вучыўся ў Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры. Быў інструктарам-метадыстам па фізвыхаванні ў Гродзенскім АблАНА (1966-67), настаўнікам фізкультуры ў Гродзенскай школе-інтэрнаце (1967-69), дырэктарам дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы №1 г. Гродна ў 1969-80 (у 1974 завочна скончыў гістфак Гродзенскага педінстытута). З 1980 працуе трэнерам-выкладчыкам па валейболе Гродзенскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву. Суддзя рэспубліканскай катэгорыі па валейболе (1996).

**Гулецкая Рэгіна Эдуардаўна** (дзявоч. Дашкевіч, 5.03.1949, в. Пашкевічы Воранаўскага р-на), беларускі педагог, хормайстар. З сялянскай сям'і. Вучылася ў 1-2 кл. у роднай вёсцы. У 3-8 кл. — у чыгуначнай СШ №52 г. Ліды. Скончыла аддзяленне харавога дырыжыравання Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні (1968). Выкладала тут харавыя дысцыпліны і кіравала хорам навучэнцаў у 1968-79 (завочна скончыла Беларускую кансерваторыю па класе харавога дырыжыравання ў 1974). Працавала намеснікам дырэктара па культурна-эстэтычным выхаванні СШ №3 г. Гродна ў 1979-90 (адначасова з 1984 — кіраўнік узорнага хору дзяўчат "Світанак"). У

1990-96 — намеснік дырэктара па культурна-этычным выхаванні школы-гімназіі №30 г. Гродна. З 1996 — дырэктар СШ № 36 (з польскай мовай навучання). Адначасова з 1980 — хормайстар народнай харавой капэлы настаўнікаў г. Гродна (з 1983 — мастацкі кіраўнік капэлы).

**Гумянюк Юры Ігаравіч** (24.09.1969, г. Гродна), беларускі пісьменнік (паэт, празаік). Сябра Таварыства вольных літаратараў (1993). З сям'і службоўцаў. Скончыў у Гродне СШ №16. Працаваў на гродзенскай швейнай фабрыцы (1987-89). Вучыўся на аддзяленні паланістыкі філфака Гродзенскага універсітэта (1989-94). Паступіў у аспірантуру на кафедру польскай філалогіі гэтага універсітэта, але праз год пакінуў вучобу. Працаваў журналістам у газеце "Пагоня" (1995-97). З 1997 — загадчык літаратурнай часткі Гродзенскага абласнога тэатра лялек. Адначасова, у 1994-95, быў рэдактарам аддзела нарыса і публіцыстыкі гродзенскага часопіса "Сьвіцязь", з 1995 — тэхнічны рэдактар літаратурнага альманаха-штогодніка "Калосьсе". Друкуецца з 1990. Аўтар вершаў, эсэ, апавяданяў, літаратурна-крытычных артыкулаў. Выдаў кнігі паэзіі "Водар цела: псіхадэлічнае мастацтва" (Полацк, 1992), "Твар Тутанхамона" (Полацк, 1994), "Рытуал" (Полацк — Гародня, 1999).

**Гурын Міхаіл Фёдаравіч** (8.11.1941, в. Радунь Карэліцкага р-на), беларускі археолаг, гісторык. Доктар гістарычных навук (1991). Скончыў у роднай вёсцы 7-годку (1955) і працаваў у мяст. Мір, у арцелі "Новае жыццё" (Карэліцкі райпрамкамбінат) у 1955-61. У Міры скончыў СШ рабочай моладзі. Служыў у войску (1961-64). Працаваў фрэзероўшчыкам на Мінскім аўтазаводзе (1964-66), майстрам-узрыўніком у Беларускім палітэхнічным інстытуце (1966-76). Даследаваў тут пытанні апрацоўкі металаў і металічных парашкоў з выкарыстаннем выбуховых рэчываў (у 1971 скончыў вячэрняе аддзяленне гістфака БДУ). З 1976 — у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі, вывучае гісторыю вырабаў з жалеза і яго апрацоўкі ў Беларусі. Праводзіў археалагічныя раскопкі гарадзішчаў і селішчаў у Слуцкім, Капыльскім, Лоеўскім, Жыткавіцкім раёнах, на Мінскім замчышчы. Сябра Міжнароднага камітэта па вывучэнні старажытнай металургіі. Выдаў даследаванні (на рус. мове): "Старажытнае жалеза Беларускага Падняпроўя. І тысячагоддзе н. э." (1982), "Мір. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1965), "Кавальскае рамяство Полацкай зямлі IX — XIII сгст." (1987).

**Гядройць Міхал** (2501.1929, маёнт. Лобзава Зэльвенскага р-на), беларускі і англійскі эканаміст, гісторык, публіцыст. З сям'і землеўласніка, юрыста. Увосень 1939 сям'я рэпрэсавана савецкімі ўладамі (бацька расстраляны). Маці з дзецьмі выслана ў Сібір. У жніўні 1942 з войскам Андэрса выехалі ў Іран. Вучыўся ў школе кадэтаў (1944-47). У 1947-51 — студэнт Лонданскага універсітэта, дзе атрымаў спецыяльнасць авіяцыйнага інжынера. У 1951-65 канструяваў і эксплуатаваў самалёты ў Вялікабрытаніі і на Далёкім Усходзе. У 1966-77 — кансультант у галіне прамысловага планавання, менеджменту. Займаўся метадалогіяй пераносу перадавых тэхналогіяў у краіны, якія сталі на шлях развіцця, роляй малых прадпрыемстваў у эканоміцы. З 1978 працуе ў Оксфардскім універсітэце, з 1983 — дарадчык па фінансавых і адміністрацыйных справах гэтага універсітэта. Сябра навуковых і прамыслова-эканамічных таварыстваў Вялікабрытаніі. Чытаў лекцыі, друкаваўся па праблемах менеджменту. Даследуе гісторыю ВКЛ, хрысціянізацыю беларускіх земляў. У навучальных установах Вялікабрытаніі, Італіі чытаў лекцыі па гісторыі. Друкаваўся як гісторык у Вялікабрытаніі, ЗША, Канадзе, Ватыкане, Польшчы. Быў у Беларусі ў 1994. Перадаў у Нацыянальны навукова-асветны цэнтр у Мінску ўспаміны, матэрыялы па генеалогіі роду.

**Дабрыян Аляксандр Аляксандравіч** (30.07.1958, г. Слонім), беларускі гісторык, археолаг. З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ у Воранаве (1975). Служыў у войску (1976-78). У 1978-79 — слухач падрыхтоўчага аддзялення Гродзенскага універсітэта, у 1979-84 — студэнт гістфака гэтага універсітэта. Працаваў настаўнікам СШ №3 г. Гродна (1984-90). З 1990 — ст. выкладчык кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў Гродзенскага універсітэта. Навуковыя інтарэсы найбольш звязаны з археалагічным вывучэннем Гродзеншчыны. Раскопваў (з 1989) гарадзішчы Збочна (Слонімскі р-н), Галынка (Шчучынскі р-н), курганныя могільнікі каля веёсак Рыбакі і Дубраўка (Мастоўскі р-н). Сааўтар кніг "Гісторыя Расіі. Са старажытных часоў да 1917 года" (Гродна, 1993), "Горадзен. Аповяды з гісторыі горада. X ст. — сярэдзіна XVI ст." (Гродна, 1996).

**Давідовіч Вацлаў** (23.02.1909, в. Касы Двор Навагрудскага р-на — 12.06.1997), польскі правазнавец, педагог, перакладчык. Доктар права габілітаваны (1959). Прафесар (1974). З сялянскай сям'і . Скончыў польскую гімназію ў Навагрудку (1929), факультэт права і грамадскіх навук Віленскага універсітэта (1933). Працаваў у ваяводскай адміністрацыі Вільні (1933-39). Пасля вайны выехалі ў

Польшчу. Працаваў у Міністэрстве гандлю і харчовага забеспячэння, у Міністэрстве прамысловасці і гандлю, у Міністэрстве ўнутранага гандлю (1946-51). Затым — ад'юнкт кафедры адміністрацыйнага права Варшаўскага універсітэта (1951-54), навуковы супрацоўнік Інстытута юрыдычных навук Польскай Акадэміі навук (1954-60). Выкладаў на кафедры права і адміністрацыі Торуньскага універсітэта ў 1960-70 (быў адначасова дэканам юрыдычнага факультэта ў 1960-64, прарэктарам у 1966-67). У 1971-79 — прафесар Інстытута адміністрацыі і кіравання Гданьскага універсітэта. Пазней жыў у Сопаце. Выйшлі ў Варшаве, Торуні, Гданьску яго даследаванні і падручнікі: "Агульнае адміністрацыйнае развіццё. Нарыс сістэмы" (1962), "Уступ да праўна-адміністрацыйнай навукі" (1974), "Польскае адміністрацыйнае права" (1978), "Адміністрацыйнае развіццё. Лекцыйны курс" (1983), "Адміністрацыйнае права" (1987), "Слоўнік усеагульнага адміністрацыйнага права" (1996). Выдаў ва ўласным перакладзе на польскую мову "Адысею" Гамера (Сопат, 1997).

**Давідовіч Лілія Міхайлаўна** (у замужжы Дылеўская, 25. 12.1936, г. Гродна), беларуская артыстка тэатра і кіно. Народная артыстка Беларусі (1975). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966). З сям'і рабочага. Скончала 8 кл. і вучылася ў Гродзенскай культасветвучэлый (1952-55). Працавала інструктарам клуба Аблпрамсавета ў Гродне. Актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці. У 1956-60 — студэнтка Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (курс К. Саннікава). З 3-га курса была залічана ў тэатр імя Я. Купалы, дзе і працуе. Ролі — шырокага творчага дыяпазону. Сярод іх: Ганна Чарнушка ("Людзі на балоце" паводле І. Мележа), Рая ("Пагарэльцы" А. Макаёнка), Соня ("Лявоніха на арбіце" А. Макаёнка), Юлія Тугіна ("Апошняя ахвяра" А. Астроўскага), Насця ("На дне" М. Горкага), Тамара ("Начное дзяжурства" А. Дзялендзіка), Наталя Фадзееўна ("І змоўклі птушкі" І. Шамякіна), Кацярына ("Твой светлы шлях" А. Маўзона), Дзіяна ("Канец — справе вянец" У.Шэкспіра), Мэры ("Я, бабуля, Іліко і Іларыён" Н. Думбадзе і Р. Лордкіпанідзе), Ганна ("Плач перапёлкі" паводле І. Чыгрынава), Мар'я Сяргееўна ("Залатая карэта" Л. Лявонава), Люба Туркоўская ("Успаміны" А. Арбузава), Інэс ("Дуэнья" Р. Шэрыдана), Вера ("Радавыя" А. Дударава), Шафак ("У ноч зацьмення месяца" М. Карыма), Кэт ("Ноч памылак" А. Голдсміта), Агата ("Паўлінка" Я. Купалы), Маскалёва ("Дзядзечкаў сон" паводле Ф. Дастаеўскага), Эліда ("Жанчына з мора" Г. Ібсена), Надзея ("Дзеці сонца" М. Горкага), Папсуева ("Мудрамер" М. Матукоўскага), Дарына ("Тарцюф" Ж. Мальера), Зайчыха ("Страсці па

Аўдзею" У. Бутрамеева), Аманда ("Блакітная ружа" У. Уільямса), Рагнеда ("Звон не малітва" І. Чыгрынава), Уршуля ("Ідылія" В. Дуніна-Марцінкевіча), Філіпа ("Умовы дыктуе жанчына" Э. Эліса і Р. Рыза), Аркадзіна ("Чайка" А. Чэхава), маці ("Піраміда Хеопса" М. Ломаўцава). Знялася ў кінафільмах "Іван Макаравіч", "Руіны страляюць...", "Вазьму твой боль", "Людзі на балоце", "Подых навальніцы", "Чужая бацькаўшчына", у тэлеспектаклях. Выступае ў радыёспектаклях. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1980-84.

**Далгіх Уладзімір Віталевіч** (26.02.1969, г. Гродна), беларускі артыст балета. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996). Скончыў Беларускую харэаграфічную вучэльню (1987). З 1989 — на сцэне Нацыянальнага тэатра балета ў сольных партыях. Сярод роляў: Яраполк ("Жарсці" А. Мдывані), Прынц ("Шчаўкунчык" П. Чайкоўскага), Зігфрыд ("Лебядзінае возера" П. Чайкоўскага), Альберт ("Жызель" А. Адана), Палемон ("Ундзіна" Г. Генцэ), Джэймс ("Сільфіда" Х. Левенскольда), Паэт ("Карміна Бурана" на муз. К. Орфа), Рамэа ("Рамэа і Джульета" С. Пракоф'ева), Адам ("Стварэнне свету" А. Пятрова), Спартак ("Спартак" А. Хачатурана).

**Дамейка Ігнат Іпалітавіч** (31.07.1802, в. Мядзведка Карэліцкага р-на — 23.01.1889), беларускі і чылійскі асветнік, геолаг, мінеролаг, этнограф, педагог. Прафесар (1838). З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў школе піяраў у Шчучыне (1812-16), на фізічна-матэматычным факультэце Віленскага універсітэтуа (1816-22). Актыўна ўдзельнічаў у рабоце таварыства філаматаў, за што ў 1823 арыштаваны, затым высланы пад нагляд паліцыі на радзіму. Жыў у сваім маёнтку Заполле (Лідскі р-н) і ў Жыбартоўшчыне (Дзятлаўскі р-н), наведваў тады Сачыўку і Нагародавічы (Дзятлаўскі р-н), Бальценікі і Жырмуны (Воранаўскі р-н), Шчучын, Гродна. Удзельнічаў у паўстанні 1830-31. У 1832 эмітаваў у Францыю. Скончыў Вышэйшую школу горнай справы Сарбонскага універсітэта (1837). З 1838 выкладаў мінералогію ў Горнай школе ў г. Какімба (Чылі). У 1846-83 выкладаў у Чылійскім універсітэце (у 1867-83 — рэктарам) у г. Сант-Яга. У 1884-88 быў на радзіме (Мядзведка, Жыбартоўшчына, Мір, Навагрудак) і ў Еўропе. Займаўся рознабаковай навуковай і асветніцкай дзейнасцю. Склаў геалагічную, гідраграфічную і гаспадарчую карты (1837), а таксама геаграфічны атлас (1850) Рэчы Паспалітай. Арганізаваў шырокае вывучэнне геалогіі і мінералогіі Чылі. Стварыў тут этнаграфічны і мінералагічны музеі, праект рэфармавання універсітэцкай і школьнай адукацыі, падручнікі па

мінералогіі, фізіцы, хіміі, увёў метрычную сістэму вымярэння. Адкрыў у краінах Паўднёвай Амерыкі новыя мінералы, расліны, лекавыя крыніцы. Выпусціў кнігу пра карэнных жыхароў поўдня Чылі "Аўраканія і яе жыхары" (Вільня, 1861), выдадзеную на многіх мовах свету. Напісаў мемуары. У 1913 у Чылі яго навуковыя працы выдадзены ў 5-ці тамах.

**Даніловіч Мікола** (Мікалай Аляксандравіч, 21.10.1955, в. Бабіна Гродзенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1984). Дацэнт (1990). З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў в.Новая Руда Гродзенскага р-на, СШ у мяст. Парэчча Гродзенскага р-на. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута (1973-77). Працаваў настаўнікам СШ у в. Цыдовічы Гродзенскага р-на (1977-79). Затым вучыўся ў аспірантуры на кафедры беларускай мовы Гродзенскага універсітэта (у 1980-81 служыў у войску). Скончыўшы аспірантуру, выкладаў на гэтай кафедры (1984-91). З 1991 працуе на кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага універсітэта. З 1998 — намеснік дэкана філфака. Вывучае праблемы лексікі і фразеалогіі беларускай мовы, яе выкладання ў школе. Выдаў кнігі: "Граматычная характарыстыка фразеалагізмаў" (1991), "Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы" (1991), "Беларуская дыялекталогія: Практыкум" (Гродна, 1995). Выйшаў шэраг яго метадычных дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў.

**Данілюк Фёдар Васілевіч** (12.08.1877, в. Сурынка Слонімскага р-на -29.07.1960), беларускі рэлігійны і вайсковы дзеяч. Скончыў Жыровіцкую духоўную семінарыю. Быў настаўнікам, псаломшчыкам. З 1914 — у войску, скончыў Гатчынскую ваенную школу (1917). Летам 1917 удзельнічаў у з'ездзе беларусаў-вайскоўцаў у Маскве. Пазней — камісар беларускага вайсковага корпуса на Румынскім фронце. З восені 1918 — у Беларусі, абраны старшынёй валаснай Рады ў Ваўкавыску. З пач.1919 — малодшы афіцэр Беларускага Гродзенскага палка. Неўзабаве арыштаваны польскімі ўладамі, уцёк з турмы ў Беластоку. Накіраваны ўладамі БНР у Літву, у распараджэнне Міністэрства беларускіх спраў. Пасля — у беларускім конным эскадроне ў г. Аліта (Алітус). Удзелчьнічаў у Слуцкім паўстанні, кіраваў тут ваеннай школай. У 1921 высвечаны на праваслаўнага святара, служыў у 20-30-я у розных прыходах на Слонімшчыне і Навагрудчыне. Арыштоўваўся польскімі ўладамі за процідзеянне паланізацыі (1936). У 1942 удзельнічаў ад Навагрудскай

епархіі ў з'ездзе беларускага духавенства (Мінск), на якім была абвешчана Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква (БАПЦ). Летам 1944 выехаў у Германію. Адзін з ініцыятараў аднаўлення БАПЦ на эміграцыі. З 1950 — у ЗША. Стваральнік і настаяцель парафіі БАПЦ у Брукліне (Н'ю-Йорк) у 1957. Парафія стала цэнтрам беларускага грамадскага жыцця ў рэгіёне, пры царкве была адкрыта беларуская нядзельная школа. На ўстаноўчым з'ездзе БАПЦ у ЗША і Канадзе (1960) абраны сябрам управы епархіі, кіраўніком яе царкоўна-судовага аддзела. Аўтар успамінаў пра ўдзел у беларускім руху ў 1917-21.

**Данскіх Сяргей Уладзіміравіч** (1.08.1971, г. Шчучын), беларускі культуролаг, педагог. Кандыдат культуралагічных навук (1999). З сям'і вайскоўца. Скончыў Шчучынскую СШ №1 (1988). Працаваў нарміроўшчыкам кабельных вырабаў на заводзе "Аўтапровад" у Шчучыне (1986-90). Скончыў гістфак Гродзенскага універсітэта (1994). У 1994-97 — аспірант кафедры тэорыі і гісторыі культуры (культуралогіі) гэтага універсітэта. Затым тут выкладае. Друкуецца з 1993. Вывучае рускую філасофскую і культуралагічную думку 2-ой паловы XIX ст., метадалогію гуманітарных навук. Займаецца краязнаўствам Шчучыншчыны.

**Дарашкевіч Віктар Іванавіч** (9.06.1949, в. Цёмнае Балота Шчучынскага р-на), беларускі літаратуразнавец, культуролаг. Кандыдат філалагічных навук (1977). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994). З сялянскай сям'і. Сярэднюю школу скончыў у мяст. Астрына Шчучынскага р-на. Вучыўся на філфаку БДУ (1966-71). Нядоўгі час настаўнічаў. У 1971-74 — аспірант Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. Затым працаваў у гэтым інстытуце (1974-78, 1982-90), у 1978-82 — вучоны сакратар Савета па каардынацыі навуковай дзейнасці пры Прэзідыуме Акадэміі навук Беларусі. Са школьных гадоў друкаваў апавяданні. Літаратуразнаўчы дэбют — у 1975. Даследуе старажытную беларускую літаратуру і культуру. Выпусціў манаграфію "Навалацінская паэзія Беларусі і Літвы. Першая палова XVI ст." (1979, на рус. мове). Складальнік і навуковы каментатар літаратурна-мастацкіх і крыніцазнаўчых выданняў.

**Дарожны Сяргей** (сапр. Серада Сяргей Міхайлавіч, 25.02.1909, г. Слонім — 19.07.1943), беларускі пісьменнік (паэт, перакладчык). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1934). З сям'і афіцэра. У час І-ай сусветнай вайны — у бежанстве ў Варонежы (1915-19). Бацька

пайшоў на фронт і прапаў у віхуры ваенна-палітычных падзей. Маці з дзецьмі, вярнуўшыся, спынілася ў в. Лясковічы на Мазыршчыне. З 1921 выхоўваўся ў Мазырскім дзетдоме. У 1924 скончыў тут 7-годку і паступіў у Белпедтэхнікум, удзельнічаў у рабоце літаратурнай студыі пры ім. З 3-га курса перавёўся на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ (скончыў у 1930). Быў сябрам літаратурнай арганізацыі "Маладняк" (1926), затым — "Узвышша" (1928). Працаваў у рэдакцыях газет і часопісаў у Мінску. У 1933 па палітычных матывах звольнены з працы ў радыёкамітэце. У 1936 (працаваў стыль-рэдактарам у часопісе "Работніца і калгасніца Беларусі") рэпрэсаваны, адпраўлены на Далёкі Усход, дзе загінуў у канцлагеры Ніжне-Амурскі. Друкаваўся з 1925. Выдаў зборнікі вершаў "Звон вясны" (1926, у сааўт.) "Васільковы россып" (1929), "Пракосы на памяць" (1932). Пераклаў на беларускую мову творы У. Караленкі, М. Кальцова, А. Новікава-Прыбоя, Г. Караваевай і інш. У 1966 выйшаў зборнік яго твораў "Выбраныя вершы".

**Дарохін Уладзімір Васілевіч** (1.01.1948, г. Слонім), беларускі кампазітар, музычны педагог. Дацэнт (1991). Сябра Беларускага Саюза кампазітараў (1977). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1988). З сям'і вайскоўца. У раннім дзяцінстве выехаў з бацькамі з Слоніма. Жылі па месцы службы бацькі ў розных мясцінах Беларусі. 8 кл. скончыў у пас. Уручча ля Мінска. Вучыўся ў сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай кансерваторыі (скончыў у 1968). У 1973 скончыў Ленінградскую кансерваторыю (клас кампазіцыі праф. У. Успенскага). Нядоўга працаваў у музычным ліцэі пры Беларускай кансерваторыі. Служыў у войску (1973-74). Зноў выкладаў у музычным ліцэі. Працаваў у Міністэрстве культуры (музычным рэдактарам). Быў адказным сакратаром (1978-86), намеснікам старшыні ўправы (1986-90) Беларускага Саюза кампазітараў. У 1984 скончыў асістэнтуру-стажыроўку пры Беларускай кансерваторыі. З 1986 выкладае ў гэтай кансерваторыі (Акадэміі музыкі), з 1996 — загадчык кафедры кампазіцыі. Сярод твораў: балет "Апалон і Марсій" (1972). кантата "Песні лета" (вершы У. Карызны, 1980), араторыя "Зямля Беларусі" (вершы П. Броўкі, 1981), вакальна-сімфанічная паэма "Размова з таварышам Леніным" (вершы У. Маякоўскага, 1986), фантазія "Веру" для барытона, фартэпіяна і сімфанічнага аркестра (вершы Н. Гілевіча, 1987), сімфоніі №1 (1976), №2 (1979), "Францішак Скарына: жыццё і бессмяротнасць" (1990), паэмы "Прынашэнне свяшчэннага агню" (1985), "Максім і Магдалена" (1991), "Уяўленні і плач аб пакінутай вёсцы" (1992); для фартэпіяна: "Варыяцыі" (1966),

дзве п'есы ў чатыры рукі (1974), II п'ес (1985), дзве паліфанічныя п'есы (1988), 10 лёгкіх п'ес на беларускія народныя тэмы для 2-х фартэпіяна (1986); для флейты: Медытацыя, Інтэрмецца, Сарабанда, Кадрыля (1992), 9 п'ес для скрыпкі і фартэпіяна (1960), тры п'есы для струннага квартэта (1967), саната для флейты і фартэпіяна (1970), "Элегія" для віяланчэлі і фартэпіяна (1979), канцэртная фантазія для цымбалаў і фартэпіяна (1973), "Чакона" для цымбалаў (1991), дзіцячыя п'есы для дзвюх балалаек і баяна (1992), рамансы на сл.А. Блока, І. Буніна, Ж. Гіёма, Д. Шайнерта, З. Бядулі (70-я), два хоры а капэла на вершы Ф. Г. Лоркі (1979), песні на сл. М. Алтухова, Б. Бруснікава, Г. Бураўкіна, З. Глікінай, У. Карызны, А. Грачанікава, А. Куляшова, У. Някляева, М. Трафімчука, П. Харкова. Напісаў музыку да лялечных спектакляў, дакументальных фільмаў.

**Дасюкевіч Адам Іванавіч** (5.06.1911, в. Копцевічы Смаргонскага р-на — кастр. 1943), беларускі грамадска-культурны дзеяч. З беднай сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, дзе далучыўся да беларускага руху. Працягваў вучобу на агранамічным аддзяленні Віленскага універсітэта (скончыў у 1939). Быў сябрам Віленскага беларускага нацыянальнага камітэта, Беларускага студэнцкага саюза (яго старшынёй у 2-ой пал. 30-х). Арганізоўваў у Вільні канцэрты М. Забэйды-Суміцкага. У 1936-37 — рэдактар газеты "Беларуская крыніца". Актыўна ўдзельнічаў у рабоце беларускай друкарні імя Ф. Скарынкі ў Вільні. У 1940-41 працаваў у гаспадарцы В. Сікоры на Шаркаўшчыне. Затым настаўнічаў. З пач.1942 — старшыня Беларускай народнай самапомачы ў Пастаўскім павеце. Жыў у Паставах. Расстраляны гітлераўцамі.

**Даўгалёў Дзмітры Мікалаевіч** (28.12.1962, г. Гродна), беларускі кампазітар. Сябра Беларускага Саюза кампазітараў (1993). З сям'і музычных педагогаў. У 1970 пераехалі ў Міёры Віцебскай вобл. Тут скончыў 5 кл. Затым вучыўся ў сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай кансерваторыі (1975-81). Скончыў Беларускую кансерваторыю (клас кампазіцыі праф. Я. Глебава) у 1987. Служыў у войску (1987-89). З таго часу працуе рэдактарам музычных перадач на Беларускім радыё. Сярод твораў: опера "Агонь Праметэя", кантата "Запаветныя сцяжынкі" (сл. М. Чарняўская, 1987), араторыя "Зорка-палын" (сл. У. Пецюкевіча), сімфанічная паэма (1986), сімфонія для аркестра і аргана (1991), канцэртная сюіта для ўдарных, раяля і аркестра (1984), канцэрт для кантрабаса і камернага аркестра (1987),

камерныя творы для фартэпіяна, для фагота і фартэпіяна, для флейты і фартэпіяна, для інструментальнага ансамбля, для скрыпкі і фартэпіяна, для кантрабаса і фартэпіяна, для віяланчэлі і фартэпіяна; хоры (на сл. Я. Коласа, Э. Агняцвет, В. Віткі, С. Грахоўскага, М. Рубцова, П. Броўкі), рамансы (на сл. Я. Коласа, Р. Гамзатава, У. Пецюкевіча), песні (на сл. У. Пецюкевіча, У. Карызны, В. Журава, К. Цыбульнага, Р. Гамзатава, А. Вавілава, І. Шуцько, А. Бачыны, М. Палякова, П. Пранузы, А. Туравай). Піша музыку да радыёспектакляў.

**Дваранін Арсень Міхайлавіч** (13.03.1949, в. Малыя Краглі Дзятлаўскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1989). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы, 5-6 кл. наведваў у 8-годцы ў в. Страла (Дзятлаўскі р-н), 8 кл. скончыў у в. Жукоўшчына Дзятлаўскага р-на. Затым вучыўся ў Мінскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме (1964-68). Працаваў у Брэсцкай філіі інстытута "Белдзяржпраект" (1968-73). У 1973-78 — студэнт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Працаваў у сістэме Міністэрства сувязі. У 1981 пераехаў з сям'ёй у Гомель і працуе на камбінаце "Мастацтва" (у 1996-97 — у Гомельскім абласным краязнаўчым музеі). Асноўны жанр творчасці (сумесна з жонкаю Данілавай І. М.) — габелен. Выканалі дыпціх "Мой горад", "Маё Палессе" для аэрапорта ў Гомелі (1989-91), "Музыка" для Гомельскай музычнай школы (1991), трыпціх "Ранак", "Дзень", "Вечар" для ВПТВ №17 Гомеля (1992), "Лясная казка" для гомельскага рэстарана "Чабарок" (1993), "Песня" для Гомельскага каледжа мастацтваў (1994), "Песня пра зубра" для Гомельскага аблдрамтэатра (1994), "Музыка і тэатр" для Гомельскай школы мастацтваў №5 (1995), "Вечнае святло" для Гомельскага аблдрамтэатра (1996), "Святочны" для бара ў Гомелі (1997), "Палеская рапсодыя" для Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі (1998). Удзельнік выставаў (з 1982) у Беларусі, Польшчы, Францыі. Творы зберагаюцца ў музеях і прыватных калекцыях Францыі, Бельгіі, Расіі, Германіі, ЗША, Галандыі, Польшчы.

**Дварчанін Ігнат Сямёнавіч** (8.06.1895, в.Погіры Дзятлаўскага р-на — 8.12.1937), беларускі грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнавец, паэт, педагог. Доктар філасофіі (1925). З сялянскай сям'і. У 1909-12 вучыўся ў "настаўніцкай школе" ў Дзятлаве. Быў настаўнікам пачатковай школы (1912-15) у в. Хмяльніца (Слонімскі р-н). З 1915 — у войску, скончыў школу прапаршчыкаў (1915). Удзельнік з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (сакавік 1917). Сябра Выканкама Вялікай беларускай Рады (кастр.-снеж. 1917). Дэлегат

Усебеларускага кангрэса (снежань 1917), арыштаваны тут савецкімі ўладамі. У пач. 1918 працаваў у газеце "Вольная Беларусь" (Мінск). Неўзабаве — у Маскве ў Белнацкаме (сакратаром культурна-асветнага аддзела). Удзельнік маскоўскай нарады настаўнікаў школ Беларусі (ліпепь 1918). Неўзабаве выехаў на радзіму. Тут вёў нацыянальна-асветніцкую работу. Адкрыў беларускую пачатковую школу ў в. Пецюкі (Дзятлаўскі р-н), у Дзятлаве стварыў беларускі тэатральны гурток. Быў арыштаваны польскімі ўладамі і адпраўлены ў спецлагер у Беластоку (1919), адкуль змог вырвацца. У 1920 — у Мінску, дзе займаўся выдавецкай працай. Хутка перабраўся ў Вільню, урыўкамі настаўнічаў. Здаў экзамен за курс СШ (1921), выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах у Дзвінску. У 1921-25 вучыўся на гістарычна-філалагічным факультэце Карлава універсітэта ў Празе. Удзельнік Усебеларускай палітычнай канферэнцыі (Прага,1921). Быў адным з арганізатараў "Аб'яднання беларускіх прагрэсіўных студэнтаў", удзельнічаў у выданні часопіса "Перавясла". Рэдагаваў "Бюлетэнь аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый". Вярнуўся у Вільню ў 1926, актыўна ўдзельнічаў у нацыянальна-культурнай рабоце. Быў сакратаром Беларускага выдавецкага таварыства, сябрам Галоўнай управы ТБШ (1926-30), сябрам Галоўнай управы Беларускага навуковага таварыства. Выкладаў беларускую літаратуру ў Віленскай беларускай гімназіі. Уваходзіў у рэдкалегію часопіса "Маланка". У 1928-30 — дэпутат сейма Польшчы, намеснік старшыні беларускай дэпутацкай арганізацыі "Змаганне". У 1930 зняволены польскімі ўладамі ў турме. У выніку абмену палітвязнямі з 1932 — у Мінску. Працаваў у Беларускай Акадэміі навук (у камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, у Інстытуце мовазнаўства). У 1933 рэпрэсаваны і заключаны ў канцлагер на Салаўках, пазней расстраляны. Друкаваўся з 1917, вершы — у газетах "Вольная Беларусь", "Наша думка", часопісах "Наш шлях", "Маладое жыццё", "Прамень", "Студэнцкая думка", артыкулы — у газетах "Дзянніца", "Народны звон", часопісе "Родныя гоні". Склаў "Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 года). Для старэйшых класаў беларускіх сярэдніх школ". Выпушчана 5-цю асобнымі чясткамі і адзіным выданнем у Вільні ў 1927. Доктарская дысертацыя "Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве" выдадзена ў 1991.

**Дзвілянскі Аркадзь Якаўлевіч** (2.09.1950, г. Ліда), рускі, беларускі, яўрэйскі музычны педагог, этнамузыколаг, кампазітар, паэт. Кандыдат мастацтвазнаўства (1989). Дацэнт (1995). Вучыўся ў СШ №1 у Лідзе, у мясцовай музычнай школе. Затым — у Свярдлоўску,

дзе скончыў музычную вучэльню, гістарычна-тэарэтычны факультэт Уральскай кансерваторыі (клас З. Візеля) у 1978. У гэтай кансерваторыі засвоіў і курс кампазіцыі. Служыў у войску (1978-80). Працаваў на кафедры тэорыі музыкі ў Кіргізскім інстытуце мастацтваў (1980-93). Завочна скончыў аспірантуру ў Ленінградскім інстытуце тэатра, музыкі і кінематаграфіі (1984). З 1995 працаваў у акадэміі музыкі ў Магілёве. У 1997 выехаў з сям'ёй у ЗША. Выдаў (на рус. мове) даследаванні і дапаможнікі: "Кіргізская народна-песенная мелодыя як аспект пераінтанавання" (Л., 1989), "Нататкі пра ролю каларыту у мастацтве" (Бішкек, 1992), "Каларыстычнае ўспрыманне ў музычным тэатры і кіно" (Бішкек, 1992), "Комплексны гарманічны аналіз" (Бішкек, 1996), "Музычны яўрэйскі фальклор Беларусі" (Магілёў, 1996). Аўтар шматлікіх песень (у тым ліку і на беларускія тэксты), 2-х санат для фартэпіяна, рапсодыі для фартэпіяна (ёсць і пералажэнне для аркестра беларускіх народных інструментаў), 10-ці прэлюдый для фартэпіяна, 4-х камерна-вакальных цыклаў, сюіты на тэмы яўрэйскіх песень, танцавальнай сюіты на сучасныя ізраільскія тэмы. Выдаў зборнік песень для дзяцей "Як прыгожая наша зямля" (Бішкек, 1992), зборнік выбраных камерна-інструментальных і камерна-вакальных твораў (Бішкек, 1993). Выйшлі яго аповесць у прозе і вершах "Крысбейл..." і кніжка паэзіі "Сімфарыфмы" (Бішкек, 1991).

**Дзелянкоўскі Мікалай Іванавіч** (2.02.1932, мяст. Скідзель Гродзенскага р-на), беларускі пісьменнік, журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1960). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Скідзелі. Вучыўся на аддзяленні журналістыкі філфака БДУ (1952-57). Працаваў у рэдакцыі Лідскай газеты "Уперад" (загадчыкам аддзела, адказным сакратаром, намеснікам рэдактара) у 1957-62, кіраваў тут раённым літаратурным аб'яднаннем. Быў уласным карэспандэнтам абласной газеты "Мінская праўда" (па Нясвіжскім, Стаўбцоўскім, Клецкім раёнах), жыў у Нясвіжы (1962-73). Быў карэспандэнтам БелТА (1973-77). Затым — адказным сакратаром рэдакцыі часопіса "Родная прырода" (1977-83), адказным сакратаром у часопісе "Беларуская мінуўшчына" (1993-94), намеснікам рэдактара газеты "Рэклама плюс" (1994-95), намеснікам рэдактара "Беларускай лясной газеты" (1995-97). Друкаваў (з 1949) кэрэспандэнцыі, артыкулы, нарысы, вершы, апавяданні, рэцэнзіі, пераклады (з рускай мовы і на рускую мову), эцюды пра пісьменнікаў, успаміны. Аўтар сцэнарыяў тэлефільмаў. Піша п'есы. Выдаў кнігі: "Стваральнікі" (1957), "Нясвіж" (1979), "Стоўбцы" (1981, у сааўт.), "Родная краса"(1981), "Прыгажосць —

побач" (1984, на рус. мове, 2-е выд. 1989), "Бацькоўскі парог" (1985), "Скідзель" (1987), "Сяброўствы. Знаёмствы. Сустрэчы". (1992).

**Дзерман Тамара Апанасаўна** (дзявоч. Барсукова, 1.10.1945, мяст. Воранава), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1985). Дацэнт (1992). З сям'і вайскоўца, якая неўзабаве пераехала ў г. Баранавічы. Тут скончыла СШ №15. Вучылася на факультэце англійскай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў (1962-66). Затым выкладае на кафедры граматыкі англійскай мовы гэтага інстытута (лінгвістычнага універсітэта). У 1983 скончыла тут, на кафедры эксперыментальнай фанетыкі, аспірантуру. Друкуецца з 1975. Даследуе праблемы фанетыкі англійскай мовы, методыкі выкладання замежных моваў, пытанні перакладу.

**Дзіско Уладзімір Антонавіч** (6.09.1936, в. Брольнікі Навагрудскага р-на), беларускі педагог. З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў роднай вёсцы (1952), Навагрудскую педагагічную вучэльню (1956), гістарычна-філалагічны факультэт Мінскага педінстытута (1961). Працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Аршанскім індустрыяльна-педагагічным тэхнікуме (1961-80), метадыстам па беларускай мове і літаратуры Рэспубліканскага метадычнага кабінета Міністэрства адукацыі Беларусі (навукова-метадычнага цэнтра навучальнай кнігі і сродкаў навучання) у 1980-97. Затым выкладае беларускую мову і літаратуру ў Мінскім педагагічным каледжы. Сябра рэдкалегіі часопіса "Роднае слова" ў 1990-97. З 1981 — адказны сакратар Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па беларускай мове. Аўтар шматлікіх публікацыяў па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры (друкуецца з 1981). Выдаў "Дыдактычны матэрыял па беларускай мове для 4 класа" (1990, у сааўт.), 8 выпускаў зборнікаў экзаменацыйных матэрыялаў па беларускай мове (у сааўт.). Складальнік шэрагу хрэстаматый і тэматычных зборнікаў беларускай літаратуры для школы. Друкуе вершы, апавяданні, гумарэскі.

**Дзітка Багдан** (13.02.1941, г. Гродна), польскі пісьменнік, журналіст. Заслужаны дзеяч культуры. З сям'і інтэлігентаў. Пасля вайны пераехалі ў Польшчу. Тут скончыў школу. Быў акцёрам лялечных тэатраў у Шчэціне (1959-60), Ольштыне (1960-62). Вучыўся на юрыдычным факультэце Торуньскага універсітэта (1962-67). Быў літаратурным кіраўніком тэатра імя С. Ярача ў Ольштыне (1967-70), намеснікам дырэктара ольштынскага выдавецтва "Прэса" (1970-72). З 1972 — у складзе рэдакцыі "Warmii i Mazur" (у 1974-83 — намеснік

галоўнага рэдактара). Літаратурны дэбют — у 1959. Выдаў аповесць "Ускраіны памяці" (Ольштын, 1967), зборнік апавяданняў "Сезон Бенедыкт" (Ольштын, 1975), аповесці "Тутэйшыя" (Ольштын, 1981), "Два першыя дні года і раніца трэцяга дня" (Ольштын, 1982), дзіцячую кнігу "Каты, коцікі, кацяняты" (Ольштын, 1983), аповесці "Сынок" (Варшава, 1983), "Кароль сезону-60" (Варшава, 1985), зборнік апавяданняў "У Шампаніі пад Эпернаў" (Ольштын, 1985), аповесці "Гульня, або меладрама мяшчанкі" (Ольштын, 1987), "Шок" (Варшава, 1987), зборнік апавяданняў "Тое святло, тая цемра" (Кракаў, 1987), апавяданне "Лямус" (Ольштын, 1988). П'есы для дзяцей пастаўлены ў лялечным тэатры ў Ольштыне — "Выпадкі малой Агаткі" (у 1980), "Катанія, або каціны свет" (у 1987).

**Дзіўніч Уладзімір Аляксеевіч** (14.07.1946, ст. Гудагай Астравецкага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1993). З сям'і настаўніка. У 1946 бацька пераведзены ў Эйшышкі (Літоўская ССР), тут вучыўся у школе. У 1958 пераехалі на радзіму маці — у Баравуху-1 Полацкага р-на, дзе скончыў СШ (1963) і стала жыве. Служыў у войску (1963-65). Вучыўся ў Наваполацкай тэхнічнай вучэльні №28 (1965-68). Працаваў у групе прамысловай эстэтыкі вытворчага аб'яднання "Палімір" у Наваполацку (1968-72). З 1972 — у наваполацкай філіі Віцебскіх мастацка-вытворчых майстэрняў, пазней у Віцебскім камбінаце "Мастацтва". Выконвае манументальна-дэкаратыўныя работы (роспіс, вітражы, чаканка, разьба па гіпсе), у галіне жывапісу — пераважна пейзажы, нацюрморты. У выставах удзельнічае з 1972. Аўтар пейзажаў "Блакітная вясна" (1975), "Дом мае маці" (1977), "Пейзаж ля возера" (1986), "Вясновая цішыня" (1987), "Раніца на Дзвіне" (1987), "Сляпы дожджык" (1989), "Храм святой Сафіі" (1990), "Восеньскі пейзаж" (1990), "Рамонкі" (1998), "Прабуджэнне" (1998), "На возеры Лутава" (1998), "Спаса-Еўфрасіньеўская царква" (1998), "Бэз" (1999), "Валошкі" (1999), нацюрмортаў "Палявыя кветкі" (1979), "Бэз" (1987), "Чырвоны нацюрморт" (1990). Творы захоўваюцца ў музеях Беларусі, у прыватных калекцыях Англіі, Польшчы, Германіі, Расіі, Турцыі, Ізраіля, Йемена.

**Дзямкоўскі Ігар Аляксеевіч** (2.06.1953, мяст. Скідзель Гродзенскага р-на), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1987). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1980). Жыве ў Мінску. У 1993-95 быў галоўным мастаком выдавецтва "Полымя". Працуе ў галіне графічнага дызайна. Удзельнік выставаў (з 1978) у Беларусі, Расіі, Літве, Польшчы, Германіі. Аформіў серыі

падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па замежных мовах, кніг і падручнікаў па архітэктуры, гісторыі Беларусі, дзіцячай літаратуры.

**Дзяркач Анатоль** (сапр. Зіміёнка Анатоль Рыгоравіч, 18.04. 1887, мяст. Турэц Карэліцкага р-на — 5.09.1937), беларускі паэт, перакладчык. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1934). З сям'і фельчара. Рана страціў бацькоў. Жыў у сястры ў Турцы, дзе вучыўся ў пачатковай школе. Скончыў Навагрудскую гарадскую вучэльню (1904) і пераехаў у Мінск, дзе зняволены за рэвалюцыйную дзейнасць (1904-06). Затым працаваў сакратаром у адваката, у гарадской управе, у ваенна-прамысловым камітэце земскай управы, у ЦСУ. У 20-я — у газеце "Беларуская вёска", рэдактарам часопіса "Дубинка". У 1929-37 — у газеце "Піянер Беларусі". Быў рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і загінуў. Друкаваўся з 1904 у мінскіх рускіх альманахах. У 20-я выходзіць да чытача з вершамі для дзяцей, сатырычнымі замалёўкамі, фельетонамі. Выдаў зборнікі "Пра папоў, пра дзякоў, пра сялян-мужыкоў" (1925), "Міколава гаспадарка" (1927), "Нашы прыяцелі" (1928), "Працавітая дзяўчына" (1928), "Першы дзень у дзіцячым садзе" (1928), "Звяры нашых лясоў" (1929), "Усім патроху" (1930), "Качаргой па абразох" (1930), "Бог удвох" (1930). Выдаў нарыс "Інтэрвенцыя і акупацыя ў Беларусі" (М., 1932). У яго перакладах на беларускую мову выйшлі кнігі Ул. Маякоўскага, Дз. Беднага, К. Чукоўскага, С. Маршака, А. Чумачэнкі, А. Ферсмана і інш.

**Дзяшкевіч Мікола** (Мікалай Аляксандравіч, 11.05.1947, в. Пагор'е Карэліцкага р-на — 1.08.1971), беларускі крытык і літаратуразнавец. З сялянскай сям'і. Скончыў Астухоўскую СШ Карэліцкага р-на (1965). Вучыўся на бібліятэчным факультэце Мінскага педінстытута (1965-69). З 1968 — навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Я. Купалы. Адначасова працаваў у тэатральнай студыі ў Мінску. Друкаваўся як літаратуразнавец з 1969. Пісаў літаратурныя рэцэнзіі, артыкулы, нарысы, партрэты артыстаў, даследаваў творчасць Я. Купалы, удзельнічаў у складанні бібліяграфіі яго твораў. Вывучаў гісторыю бібліятэчнай справы ў Беларусі. Зборнік ято літаратурна-крытычных артыкулаў "Ад вытокаў радаводных..." выдадзены ў 1991.

**Дзяшко Іван Фёдаравіч** (2.01.1931, в. Плюскаўшы Бераставіцкага р-на — 28.06.1998), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1972). Дацэнт (1984). З беднай сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Вялікай Бераставіцы. Быў ст. піянерважатым 7-годкі ў

Ёдзічах Бераставіцкага р-на (1951-52), загадчыкам аддзела ўліку і статыстыкі Бераставіцкага райкама камсамола (1952). У 1952-57 — студэнт гістфака БДУ. Настаўнічаў у Лішкаўскай 7-годцы Бераставіцкага р-на (1957-58). Затым — ст. навуковы супрацоўнік Гродзенскага абласнога гістарычна-археалагічнага музея (1958-61), рэферэнт абласной арганізацыі таварыства "Веды" (1961-65), загадчык кабінета гісторыі КПСС і палітэканоміі Гродзенскага медінстытута (1965-68). З 1968 — выкладае на кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму Гродзенскага педінстытута (у 1971 завочна скончыў аспірантуру на кафедры гісторыі КПСС БДУ). У 1973-97 выкладаў на кафедры ўсеагульнай гісторыі (у 1973-83 — загадчык кафедры) гэтага педінстытута (універсітэта). Стажыраваўся ў Маскоўскім універсітэце ў 1975, 1983. Друкаваўся з 1968. Вывучаў дзейнасць КПЗБ, рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі і Польшчы 20-30-х XX ст. Аўтар навукова-метадычных рэкамендацый па вывучэнні ўсеагульнай гісторыі.

**Дмахоўскі Вікенці Ігнатавіч** (1807, в. Нагародавічы Дзятлаўскага р-на — 22.02.1862), беларускі мастак, сцэнограф. З сям'і дробнапаместнага шляхціца. Вучыўся ў піярскай школе ў Шчучыне. Два гады пасля смерці бацькі жыў у сваякоў у Мінску. Вучыўся на літаратурна-мастацкім факультэце Віленскага універсітэта, адначасова (1826-29) займаўся жывапісам у Я. Рустама. Служыў у войску. Удзельнік паўстання 1830-31. Знаходзіўся ў эміграцыі пераважна ў Парыжы (1831-37). Затым — у Вільні. Адкрыў тут мастацкую школу-майстэрню (1840). У 1850-54 пісаў дэкарацыі для віленскай сцэны (спектаклі па творах С. Манюшкі, Г. Даніцэці, Дж. Расіні). Часта выязджаў у родныя мясціны. У 1855-58 арандаваў маёнтак Брацянка (Навагрудскі р-н), дзе жыў з сям'ёй. Аб'ездзіў мясціны А. Міцкевіча. Пісаў у асноўным пейзажы, таксама партрэты, сюжэтныя кампазіцыі, рэстаўраваў абразы. Выконваў прыватныя заказы Я. Тышкевіча, А. Кіркора (быў сябрам гуртка А. Кіркора). Сярод твораў: "Крыжаносцы пры аблозе крэпасці Пуня" (1837), "Радзіма. Двор у Нагародавічах" (1843), "Ля пераправы", "Возера Свіцязь", "Замак і вежа ў Троках", "Вуліца ў Вільні", "Пажар у лесе" (1850), "Дом Міцкевіча ў Навагрудку", "Маёнтак у Туганавічах", "Пушча", "Начлег" (1854), "Захад сонца", "Руіны замка ў Гальшанах", "Замак у Крэве", "Хата рыбака", "Партрэт жонкі", "Выгляд базыльянскага касцёла ў Навагрудку", "Капліца на ўзгорку", "Двор над ставам", "Яўрэйскае вяселле". Замалёўваў краявіды Вільні, Навагрудка, Ліды, Нясвіжа, Міра, Ашмянаў, Слоніма, Пінска. Ілюстраваў паэму А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш".

**Дрозд Сяргей Сцяпанавіч** (5.01.1927, в. Прэціма Шчучынскага р-на), беларускі педагог, краязнавец, літаратуразнавец. З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы. Скончыў Гродзенскую педагагічную вучэльню (1947), аддзяленне беларускай мовы і літаратуры літфака Гродзенскага педінстытута (1951). Адначасова працаваў у бухгалтарскай школе ў Гродне, у рэдакцыі "Гродзенскай праўды". Быў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Гродзенскай СШ №3 (1951-53), завучам СШ №4 (1953-55), дырэктарам пазменнай СШ №10 (1955-57), дырэктарам СШ №8 (1957-64), завучам СШ №15 (1964-79), дырэктарам СШ рабочай моладзі №9 (1979-82), завучам школы-інтэрната (1982-87). Затым настаўнічаў у вучэльні алімпійскага рэзерву. 13 гадоў узначальваў метадычную секцыю настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры г. Гродна. Скончыў завочна аспірантуру ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1976). Друкуецца з 1956. Аўтар шматлікіх артыкулаў у галіне гістарычнага і літаратурнага краязнаўства, навуковых дакладаў, даследаванняў пра беларуска-польскія літаратурныя сувязі, пра творчасць Я. Купалы ў кантэксце беларуска-польскага ўзаемадзеяння. У 1998 у Гродне выдаў манаграфію "Адам Міцкевіч і Янка Купала: духоўнае пабрацімства (беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі XIX — пачатку XX стагоддзяў)".

**Дунец Хацкель Майсеевіч** (1897, г. Слонім — 29.10.1937), яўрэйскі і беларускі пісьменнік (крытык, публіцыст). Сябра Саюза пісьменнікаў БССР (1934). З сям'і рамесніка. Скончыў хедэр у Слоніме (1909) і працаваў у хлебапякарні. Пазней працаваў у Віцебску загадчыкам сталовай (1918-19), адначасова вучыўся ў Віцебскім педтэхнікуме. Быў на партыйнай рабоце. З 1926 — у Мінску, выконваў абавязкі намесніка рэдактара яўрэйскай газеты "Октобэр". У 1932-35 — рэдактар газеты "Літаратура і мастацтва", адначасова ў 1933-35 — намеснік наркома асветы БССР. Затым працаваў культработнікам на адным з мінскіх заводаў. У 1936 рэпрэсаваны і зняволены ў Ухтпячорскіх лагерах, пазней расстраляны. Друкаваўся з 1927. Вывучаў развіццё яўрэйскай літаратуры, пісаў пра творчасць яўрэйскіх і беларускіх пісьменнікаў. Выдаў на ідзіш крытычныя і публіцыстычныя нарысы, зборнікі літаратуразнаўчых выступленняў: "Аб масавай рабоце на яўрэйскай мове" (1929, у сааўт.), "Дасягненні нацыянальнай палітыкі ў БССР" (1930), "Тэорыя паэзіі Літвакова" (1931), "У змаганні" (М., Харкаў, Мн., 1931), "За Магнітбуд літаратуры" (1932), "Супраць сацыял-фашысцкага "Бунда", супраць ідэалізацыі

бундызма" (1932), "У барацьбе на двух франтах" (1932), "Пра пісьменнікаў і творы" (1933), "На літаратурныя тэмы" (1934).

**Дучыц Мікалай Васілевіч** (2.10.1896, мяст. Любча Навагрудскага р-на -3.09.1980), беларускі мастак (жывапісец, графік). Сябра Саюза мастакоў БССР (1940). З сялянскай сям'і. Пачатковае навучанне прайшоў у Троках (Літва), дзе быў пад апекаю дзядзькі. У 1910-14 вучыўся ў павятовай вучэльні ў Навагрудку. Затым — у Пецярбургскай школе заахвочання мастацтваў (1914-15). Мабілізаваны ў войска, служыў у Прыбалтыцы, удзельнічаў у баях. Пасля як чырвонаармеец ваяваў на польскім фронце. З 1921 жыў у Мінску, прымаў удзел у выставах. Працаваў пераважна ў жанры пейзажа, пісаў графічныя краявіды, нацюрморты. Сярод твораў: "Пейзаж Навагрудчыны" (1913), "Краснае Сяло" (1916), "Беразняк" (1921), "Курган" (1923), "Прысады" (1925), "На Замкавай гары. Мінск" (1926), "Суражскі рынак" (1927), "Восень" (1929), "Поле" (1929), "Будаўніцтва універсітэцкага гарадка" (1929), "Сады цвітуць" (1930), "Асфальтшчыкі" (1932), "Уборка сена" (1934), "Жніво" (1935) , "Перад навальніцай" (1937), "Рака Сож" (1938), "Веснавы матыў" (1939), "Вялікі гідраторф" (1940) , серыя "На руінах Мінска" (1941-44), "Беларускі матыў" (1945), "Нёман"(1947), "У раёне аўтазавода" (1948), "Зіма ў пасёлку" (1949), "Копы" (1951), "Апошні снег" (1952), "Ля Нёмана" (1953), "Бераг возера Нарач" (1954), "Пейзаж у раёне Мазыра" (1956), "Старыя бярозы" (1957), "У красавіку" (1959), "Мост на вуліцы Янкі Купалы" (1963), "На беразе Свіслачы" (1965), "Лясная казка" (1969). Творы захоўваюцца ў музеях і калекцыях у Беларусі, Германіі, Японіі, ЗША, Нарвегіі, Польшчы, Расіі.

**Дэбіш Анатоль Восіпавіч** (22.07.1962, в. Шамятоўка Свіслацкага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). Брат В. Дэбіша. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Монтаўты (Свіслацкі р-н), у СШ у в. Палонка (Свіслацкі р-н). Затым сям'я пераехала ў в. Андрэевічы Ваўкавыскага р-на. Працягваў вучобу у Гнезнаўскай СШ, скончыў СШ у в. Мсцібава (Ваўкавыскі р-н) у 1979. Працаваў шаферам у саўгасе "Гнезна" (1979-80). Служыў у войску (1980-82). Скончыў Мінскі інстытут культуры (1987). Працуе ў Брэсце дырэктарам Дома культуры "Хімік". Друкуецца з 1983. Выдаў зборнікі паэзіі "Калядная вячэра" (1992), "Стодзівы" (1995). Друкуе апавяданні.

**Дэбіш Васіль Восіпавіч** (22.07.1962, в. Шамятоўка Свіслацкага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). Брат А. Дэбіша. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Монтаўты (Свіслацкі р-н), у СШ у в. Палонка (Свіслацкі р-н). Затым сям'я пераехала ў в. Андрэевічы Ваўкавыскага р-на. Працягваў вучобу у Гнезнаўскай СШ, скончыў 10-ты клас у в. Мсцібава (Ваўкавыскі р-н). Працаваў манцёрам на чыгунцы (1979-80). Служыў у войску (1980-82). Скончыў Мінскі інстытут культуры (1987). З 1987 працуе выхавальнікам у Вышэйшай прафесійнай вучэльні №229 г. Брэста. Друкуецца з 1987. Выдаў кнігі паэзіі "Белыя птахі" (1992), "Лісты да Марыі" (1996).

**Емяльянава Ніна Сяргееўна** (31.01.1948, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1990). З сям'і службоўцаў. Скончыла ў Гродне СШ №1. Вучылася на факультэце горадабудаўніцтва Маскоўскага архітэктурнага інстытута (1968-74). Затым працавала архітэктарам, ст. архітэктарам у тэрытарыяльнай майстэрні інстытута "Масграмадзянпраект" (г. Каломна Маскоўскай вобл.). З 1980 працуе кіраўніком групы архітэктараў у "Гроднаграмадзянпраекце". Найбольш значныя работы: музычная вучэльня з музычнай школай па прасп. Я. Купалы ў Гродне, плавальны басейн у Гродзенскай СШ №9, 12-14-павярховы жылы дом у мікрараёне "Румлёва", фірменная крама "Ніка" у мікрараёне "Вішнявец" у Гродне, адміністрацыйны будынак у Лідзе, праваслаўная царква ў Мастах, 60-кватэрны жылы дом па вул. Ф. Скарыны і 80-кватэрны жылы дом па вул. А. Міцкевіча ў Навагрудку.

**Еўтух Уладзімір Гаўрылавіч** (3.01.1932, в. Заполле Карэліцкага р-на), беларускі грамадска-культурны дзеяч, архітэктар. Кандыдат тэхнічных навук (1979). Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1980). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Карэлічах (1950). Быў курсантам Маскоўскай ваенна-інжынернай вучэльні (Калінінград) у 1950-53. Служыў у войску (1953-55). Працаваў майстрам, ст. майстрам завода №6 трэста №2 "Будіндустрыя" Мінпрамбуда Беларусі ў Мінску (1956-60), начальнікам лабараторыі, цэха, начальнікам вытворчасці, сакратаром парткама домабудаўнічага камбіната №1 Мінпрамбуда ў 1960-63 (у 1962 завочна скончыў будаўнічы факультэт Беларускага палітэхнічнага інстытута). Быў затым намеснікам загадчыка аддзела будаўніцтва і гарадской гаспадаркі Мінскага прамысловага абкама КПБ (1963-65), загадчыкам такога ж аддзела Мінскага гаркама КПБ (1965-66), кіраўніком будаўнічага трэста №4

Мінпрамбуда БССР (1966-69), намеснікам загадчыка аддзела, загадчыкам аддзела будаўніцтва і гарадской гаспадаркі ЦК КПБ (1969-75), загадчыкам сектара аддзела будаўніцтва ЦК КПСС (1975-79), старшынёй Дзяржбуда БССР (1979-86), першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР (1986-90), дарадцам Дзяржбуда Беларусі (1991-92). Кіраваў будаўніцтвам Палаца спорту, комплексу БДУ, павільёна ВДНГ Беларусі, жылых раёнаў па прасп. Пушкіна, Зялёны Луг у Мінску. Вывучаў арганізацыйныя асновы фармавання структур вытворча-будаўнічых аб'яднанняў, выкарыстанне новых метадаў планавання і эканамічнага стымулявання ў будаўніцтве. Выдаў на гэтыя тэмы чатыры даследаванні (два з іх у сааўт.). З 1992 — прэзідэнт ЗАА "Інвестсістэм", адначасова з 1996 — старшыня ўправы АКБ "Беларускі біржавы банк". Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1971-75).

**Жабінская Марыя Пятроўна** (22.05.1938, хутар Карані Смаргонскага р-на), беларускі мастацтвазнавец. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1988). З сялянскай сям'і. Вучылася ў пачатковай школе ў в. Карані. Скончыла 8 кл. Смаргонскай СШ, 9-10 — у Смаргонскай школе рабочай моладзі. У 1958-61 вучылася ў Мінскай мастацкай вучэльні. Працавала мастаком на Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў (1962-63), метадыстам па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ў Рэспубліканскім Доме народнай творчасці (1967-72). У 1969 скончыла вячэрняе аддзяленне Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (па спецыяльнасці "дэкаратыўна-прыкладное мастацтва"). Вучылася па гэтай спецыяльнасці ў аспірантуры Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1972-75). Затым — праца ў праектна-тэхналагічным інстытуце "Белмясцпрампраект" (1976-79), у Рэспубліканскім метадычным цэнтры народнай творчасці і культасветработы (1979-91). З 1991 — у Рэспубліканскім цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей. Друкуецца з 1967. Аўтар шматлікіх публікацый па пытаннях народнай мастацкай творчасці, фальклору. Удзельнік этнаграфічных экспедыцый па ўсіх абласцях краіны. Аўтар-складальнік альбомаў, каталогаў, метадычных дапаможнікаў: "Мастацтва сяла Неглюбка" (1976), "Арнамент беларускіх народных тканін" (1983), "Адраджэнне забытага рамяства" (1935, у сааўт"), "Свет вачыма дзяцей" (1992). Выдала кнігі "Складзі ўзор сам: Народны арнамент у побыце" (1992), "Выцінанка" (1996).

**Жаброўскі Тамаш** (25.11.1714, маёнт. Дзятлава Дзятлаўскага р-на — 18.08.1758), беларускі асветнік, архітэктар, астраном,

матэматык. Прафесар (1752). З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Навагрудку. Вывучаў філасофію і тэалогію ў Віленскай езуіцкай акадэміі (1735-38, 1740-44), архітэктуру, астраномію і матэматыку — у Вене і Празе (1750-52). Выкладаў у калегіумах у Коўне, Бабруйску, Кражаі, Ілкусце (1738-40, 1744-48), у Віленскай акадэміі (1752-58). Заснаваў у Вільні абсерваторыю (1755). Выдаў падручнікі па арыфметыцы і геаметрыі, астранамічную працу "Аб сапраўднай вышыні полюса горада Вільні". Стварыў пабудовы: езуіцкі касцёл у Бабруйску (1745-46), касцёл св. Ігната і калегіум (1748-50), абсерваторыю езуіцкага калегіума (1752-53) у Вільні. Яму належыць перабудова касцёла св.Яна (1756-58) у Вільні, інтэр'еры кальвінскага збору ў Жодзішках Смаргонскага р-на (1757-68). Праектаваў касцёл бенедыкцінак у Кражаі (Літва), палац Агінскага ў Ганупе (Вілейскі р-н).

**Жарабцова Ганна Рыгораўна** (у замужжы Яўрэінава, у другім Андрэева, 25.09.1868, г. Гродна — пасля 1922), руская спявачка (меца-сапрана), музычны педагог. Прафесар (1913). З сям'і вайскоўца. Вучылася ў Екацярынінскім інстытуце, у 1887-92 — у Пецярбургскай кансерваторыі (клас Н. Урэцкай). Дэбютавала як спявачка ў 1891. У 1892 запрошана ў Прагу, дзе выступіла ў оперным рэпертуары. Пасля выконвала ў асноўным камерныя творы. Гастралявала ў Берліне, Кёнігсбергу, Дрэздэне, Лейпцыгу, Гамбургу, пазней у Амстэрдаме, Гаазе, Ротэрдаме, Парыжы, Лондане, дзе дае сольныя канцэрты, удзельнічае ў вечарах сімфанічнай музыкі. Актыўную канцэртную дзейнасць вяла ў Расіі, на Украіне (Пецярбург, Масква, Кіеў, Харкаў, Адэса, Ніжні Ноўгарад). Выконвала рамансы С. Рахманінава, А. Глазунова, А. Арэнскага, І. Стравінскага, С. Пракоф'ева, вакальныя творы К. Дэбюсі, М. Равэля, Э. Шасона, Р. Штраўса. У 1907-22 выкладала сольныя спевы ў Пецярбургскай кансерваторыі. У 1922 выехала з СССР. Жыла ў Рызе, давала прыватныя ўрокі спеваў.

**Жарскі Міхаіл Васілевіч** (5.05.1930, в. Паплавы Навагрудскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1870). Прафесар (1986). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Нягневічы Навагрудскага р-на (1948). Служыў у войску. Вучыўся на гістфаку БДУ (1950-55). Працаваў настаўнікам, завучам СШ №1 г. Ваўкавыска (1955-60), дырэктарам СШ №4 г. Ваўкавыска (1960-62), загадчыкам Ваўкавыскага РайАНА (1962-63), намеснікам загадчыка Гродзенскага АблАНА (1963-67). З 1967 выкладае на кафедры гісторыі КПСС Гродзенскага педінстытута (у 1970 скончыў завочна аспірантуру ў БДУ). У 1973-80 — дэкан гістфака, у 1980-90 — загадчык

кафедры гісторыі КПСС (палітычнай гісторыі) Гродзенскага універсітэта. З 1991 — прафесар кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў гэтага універсітэта. Друкуецца з 1968. Даследуе развіццё народнай адукацыі, гісторыю Беларусі і кампартыі Беларусі, палітычную гісторыю Расіі, навукова-метадычныя асновы выкладання гісторыі. Выдаў "Табліцы па гісторыі Беларусі для сярэдніх і васьмігадовых школ" (1968, 3-е выд. Ч. I. 1985, ч. 2, 1986). Аўтар работ (на рус. мове): "У.І.Ленін аб трох рэвалюцыях у Расіі" (1980), "Паступальны рух" (1984), "Гімн працы, міру і шчасця народаў" (1987). Сааўтар даследаванняў (на рус. мове): "Беларусь у гады сацыялістычнага будаўніцтва" (1969), "Гродна. Гістарычна-эканаміны нарыс" (1988), "50 гадоў уз'яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР" (1989), "Нарысы гісторыі Гродзенскай абласной партыйнай арганізацыі" (1990). Рэдактар зборнікаў навуковых прац. Выдаў метадычныя рэкамендацыі для студэнтаў па гістарычных курсах.

**Жук Анатоль Аляксандравіч** (20.05.1949, в. Ярэмічы Карэліцкага р-на), беларускі артыст тэатра і кіно, пісьменнік. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). Заслужаны артыст Беларусі (1997). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у роднай вёсцы (1966). Вучыўся на акцёрскім факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1966-70). Працаваў акцёрам Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі (Бабруйск) у 1970-75. З 1975 — на сцэне Беларускага тэатра юнага гледача. Ролі — шырокага дыяпазону, пераважна гераічныя. Сярод акцёрскіх работ: Несцерка ("Несцерка" В. Вольскага), Раміз ("Падобны да льва" Р. Ібрагімбекава), Селязнёў ("Чатыры кроплі" В. Розава), Епанчын ("Ідыёт" паводле Ф. Дастаеўскага), Бурмін ("Хлопец з нашага горада" К. Сіманава), Андрон Русу ("Птушкі нашай маладосці" І. Друцэ), Дасужаў ("Даходнае месца" А. Астроўскага), Бранябойны ("Злыдзень" А. Петрашкевіча), Рабінін ("Юнацтва бацькоў" Б. Гарбатава), Міхель Галандзец ("Петэр Мунк і яго каменнае сэрца" С. Мініна), Хорыя ("Імем зямлі і сонца" І. Друцэ), Трыгорын ("Чайка" А. Чэхава), Міканор ("Подых навальніцы" паводле І. Мележа). Леанард Брэйзія ("Дыскжакей" С. Палякова), Лаэнгрэн ("Пунсовыя ветразі" А. Грына), Жухрай ("Як гартавалася сталь" паводле М. Астроўскага), Заслонаў ("Паядынак" М. Матукоўскага), Важак ("Бэмбі" паводле Ф. Зальтана), Ратнік ("Песня пра зубра" паводле М. Гусоўскага), Бальшоў ("Банкрут" А. Астроўскага), Дарынкур ("Маленькі лорд Фаўнтлярай" Ф. Бернет). Выканаў ролі ў кінафільмах: "Маці ўрагану", "Пушча", "Сівая легенда", "Новая зямля", "Душа мая, Марыя", тэлеспектаклях: "Адвечная песня", "Вочы ў вочы", "Зямля яшчэ баліць", "Кнiганошы",

"Варшаўскі шлях", "Адна ноч генерала Скарнякова", радыёспектаклях па творах Я. Купалы, Я. Коласа, І. Мележа, В. Быкава. Як празаік друкаваў апавяданні, аповесці (дэбют у 1985). Выдаў зборнікі твораў "Помста матылькоў" (1991), "Пагаварыць трэба" (1993). Аўтар сцэнарыя мастацкага фільма "Зязюльчыны слёзы".

**Жук Вадзім Дзмітрыевіч** (30.05.1952, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларускі спартыўны дзеяч. Суддзя міжнароднай катэгорыі па футболе (1988). Віцэ-прэзідэнт Беларускай фэдэрацыі футбола (1994). Скончыў БДУ (1980), Беларускі інстытут фізічнай культуры (1985). Судзіў першы чэмпіянат свету па футболе сярод жанчын (1991, Кітай), фінальныя гульні чэмпіянатаў Еўропы па футболе (1992, Швецыя, 1996, Англія), шматлікія міжнародныя і нацыянальныя спаборніцтвы па футболе.

**Жук Іван Аляксандравіч** (15.07.1927, в. Жукі Карэліцкага р-на), беларускі педагог, паэт. З беднай сялянскай сям'і. Пачатковую школу скончыў у в. Астухова (Карэліцкі р-н), 7-годку — у в. Заполле (Карэліцкі р-н) у 1941. У час вайны працаваў дома на гаспадарцы. У 1944-45 быў пісарам у ваенкамаце. Затым служыў у войску (1945-52). Вярнуўшыся дамоў, працаваў у калгасе і вучыўся ў вячэрняй школе ў Карэлічах, дзе атрымаў сярэднюю адукацыю (1954). У 1954-91 працаваў настаўнікам 8-годкі ў Заполлі. Актыўна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці (у 1960 завочна скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ). Друкуе вершы з 1954. Выдаў зборнік паэзіі "Бацькоўскі кут" (Навагрудак, 1997).

**Жукоўскі Станіслаў Юльянавіч** (13.05.1875, маёнт. Ендрыхоўцы Ваўкавыскага р-на — жнівень 1944), беларускі і польскі мастак. Акадэмік жывапісу (1907). З збяднелай шляхецкай сям'і. Неўзабаве пераехалі ў маёнтак Старая Воля Пружанскага павета, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва. Вучыўся ў Варшаве ў прыватнай гімназіі, у Беластоцкай рэальнай вучэльні. Скончыў Маскоўскую вучэльню жывапісу, скульптуры і дойлідства (1901). Удзельнічаў у выставах з 1895. Сябра Таварыства перасоўных выставаў (з 1903). Жыў у Маскве, часта прыязджаў на радзіму, тут пісаў. З 1917 — у Польшчы. Працаваў як мастак у Варшаве. Адкрыў тут прыватную школу жывапісу (1920). У 1944 зняволены гітлераўцамі ў канцлагеры Пруткова, дзе загінуў. Пісаў пейзажы, нацюрморты. Сярод твораў: "Нёман" (1895), "Лес. Папаратнік. Захад" (1895), "Веснавая вада" (1898), "Лясная дарога" (1898), "Пачатак восені" (1899), "Бабіна лета"

(1899), "Месячная ноч" (1899), "Восеньскі вечар" (1905), "Белы дом" (1906), "Парк агаляецца" (1906), "Раніца. Восень у маёнтку" (1906), "Апусцелая дача" (1907), "Кветкі апошнія" (1908), "Плаціна" (1909), "Звялыя астры" (1910), "Парк восенню" (1911), "Восень. Веранда" (1911), "Лясное возера. Залатая восень" (1912), "Радасны май" (1912), "У старой алеі" (1913), "Інтэр'ер" (1916), "Зімовая ноч" (1919), "Рэчка па Палессі" (1926), "Крыгаход на Нёмане" (1931), "Рака Вілейка" (1932).

**Жывалеўскі Валеры Серафімовіч** (11.01.1961, г. Гродна), беларускі музыкант (класічная гітара), музычны педагог. З сям'і службоўцаў. Скончыў 8 кл. у СШ №15 г. Гродна (1976). Паступіў у Гродзенскую культасветную вучэльню, праз год перавёўся у Гродзенскую музычна-педагагічную вучэльню, якую скончуў у 1980. Вучыўся ў Беларускай кансерваторыі (клас класічнай гітары) у 1980-85. У 1985-89 — у асістэнтуры-стажыроўцы Маскоўскага музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных (у 1986-88 служыў у войску). З 1989 выкладае ў Беларускай кансерваторыі (з 1991 — ст. выкладчык, з 1997 — дацэнт). З 1983 выступае ў канцэртах (у Беларусі, Расіі, Літве, Польшчы), робіць запісы на Беларускім радыё і тэлебачанні. У рэпертуары — старажытная гітарная і лютневая музыка Беларусі, творы класікі, у тым ліку ва ўласных транскрыпцыях, творы Л. Гарэлавай, Я. Паплаўскага, В. Войціка. Аўтар артыкулаў пра гітару і лютню ў Беларусі. Аўтар і складальнік нотных зборнікаў "Альбом юнага гітарыста" (1994), "Беларуская гітарная музыка" (1995), адзін з складальнікаў зборніка "Гітара ў ансамблі" (1997).

**Жыткевіч Сямён Мікалаевіч** (1893, в. Вялікая Кракотка Слонімскага р-на — 1.10.1940), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. З сялянскай сям'і. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1914) і настаўнічаў на Дзятлаўшчыне. У 1915 прызваны ў войска. Скончыў Аляксандраўскую ваенную вучэльню ў Маскве (1916) і адпраўлены на фронт. У 1918 выехаў да бацькоў-бежанцаў у Омскую губерню. Тут мабілізаваны ў войска Калчака. Неўзабаве трапіў у палон да чырвоных. Служыў у Чырвонай Арміі (1919-20), у баях з войскамі Врангеля паранены. У 1921 сям'я вярнулася на радзіму. Працаваў у Вялікай Кракотцы настаўнікам, займаўся гаспадаркаю. Арганізоўваў на вёсцы культурна-масавую работу (беларускія спектаклі, літаратурныя вечарыны, хор). У 1925-26 вучыўся ў Кракаве на настаўніцкіх курсах. Прызначаны настаўнікам у Познань, не паехаў. Дома ўключыўся ў рух Грамады, ТБШ. У 1926 працаваў у Вільні ў Галоўнай управе ТБШ. У 1927-29 — старшыня Слонімскай акруговай управы

ТБШ. Праводзіў шырокую культурна-нацыянальную работу з моладдзю, у 1927 адкрыў у Вялікай Кракотцы беларускую бібліятэку. У 1929 — сакратар клуба "Змаганне" па Слонімскім павеце. Зняволены ўладамі Польшчы ў турме за нацыянальную дзейнасць (1930-31). Затым працягваў культурна-асветную работу на вёсцы. З верасня 1939 настаўнічаў у школе ў Вялікай Кракотцы. У кастрычніку 1939 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі (сям'я выслана ў Казахстан). Загінуў у канцлагеры ў Комі АССР.

**Жыткевіч Антон** (1806, г. Гродна — 1856), польскі асветнік, педагог, журналіст. Скончыў Віленскі універсітэт (1827), выкладаў гісторыю і фізіку у Няміраве. З 1829 настаўнічаў у Гродне. Пазней працаваў у Варшаве, уваходзіў у рэдакцыю перыёдыкаў "Gazeta Poranna", "Magazyn Powszechny", "Magazyn dla dzieci". З 1841 быў галоўным рэдактарам "Pamiętnika religijno-moralnego". У "Gazecie Warszawskiej" рэгулярна публікаваў папулярныя "навуковыя гутаркі" (1854-56). Асобнымі выданнямі выйшлі яго "Успаміны пра св. п. Антона Глябовіча" (Варшава, 1848) і "Свет, дастасаваны да разумення моладзі" (Варшава, 1850, 2-е выд. 1852).

**Жылінскі Мікола** (Мікалай Міхайлавіч, 5.02.1942, в. Камяніца Ваўкавыскага р-на), беларускі журналіст, гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1980). Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1970). З сялянскай сям'і. Скончыў Малалапеніцкую СШ Ваўкавыскага р-на (1959). Працаваў карэктарам у Поразаўскай райгазеце "Ленінскі шлях", загадчыкам Лапеніцкай сельскай бібліятэкі (1959-60), літсупрацоўнікам Бераставіцкай райгазеты "Знамя Советов" (1960-62), інструктарам Бераставіцкага райкама ЛКСМБ (1962-63), загадчыкам кабінета палітасветы саўгаса "Поразаўскі" Свіслацкага р-на (1963-65), у апараце Свіслацкага райкама КПБ (1965-68). У 1967 завочна скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута. Быў памочнікам сакратара Гродзенскага абкама КПБ (1968-73), намеснікам рэдактара і загадчыкам аддзела партыйнага жыцця газеты "Гродненская правда" (1973-75). Вучыўся ў Вышэйшай партшколе пры ЦК КПСС (1975-77). Працаваў інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі, загадчыкам сектара друку гэтага аддзела ЦК КПБ (1977-82). У 1982-91 — загадчык сектара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Затым быў загадчыкам аддзела часопіса "Гаспадыня" (1992-94). З 1994 — галоўны рэдактар ТК "Міласэрнасць-90". Вывучаў праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР. Выдаў кнігі: "Сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы"

(1982), "Развіццё прадукцыйных сіл вёскі" (1984), брашуры. Складальнік і навуковы рэдактар зборнікаў работ па гісторыі і паліталогіі. Аўтар нарысаў, апавяданняў, гумарэсак, дакументальнай аповесці. Выдаў зборнік нарысаў "Жывыя крыніцы" (1985).

**Жэймо Яніна Баляславаўна** (29.05.1909, г. Ваўкавыск — 29.12.1987), руская артыстка кіно, тэатра, эстрады, цырка. З сям'і артыста цырка. З дзяцінства выступала ў цырку, на эстрадзе. У 1924-29 вучылася ў кінамайстэрні "ФЭКС" (фабрыка эксцэнтрычнага мастацтва), затым у Інстытуце экраннага мастацтва ў Ленінградзе. Здымалася (з 1925) у эксцэнтрычных эпізадычных ролях (фільмы "Мішка супраць Юдзеніча", "Дарога ў свет", "Чужы піджак", "Чортава кола", "Новы Вавілон"). З 1934 — буйныя ролі ў кіно ("Песня пра шчасце", "Гарачыя дзянёчкі", "Сяброўкі", "Ворагі", "Ішоў салдат з фронту", "Доктар Калюжны", "Прыгоды Карзінкінай"). Падчас вайны была ў Ленінградзе, у 1943 вывезена ў тыл. Жыла ў Ташкенце, Алма-Аце. Здымалася ў кіно ("Беларускі кіназборнік", "Два байцы", "Мы з Урала"). З 1949 — у Маскве, стварыла экранныя вобразы ў фільмах "Папялушка", "Два сябры". У 1949-56 працавала ў тэатры-студыі кінаакцёра (спектакль "Беднасць не загана" А. Астроўскага і інш.), удзельнічала ў дубляванні фільмаў замежнай вытворчасці. У 1957 пераехала ў Варшаву.

**Забэйда-Суміцкі Міхась** (Міхаіл Іванавіч, 14.06.1900, в. Несцяровічы Свіслацкага р-на — 21.12.1981), беларускі спявак (лірычны тэнар), музычны педагог. З беднай сялянскай сям'і. Скончыў Галоўчыцкую пачатковую школу. У 1914-18 вучыўся ў Маладзечненскай настаўніцкай семінарыі. У 1918 прыехаў да маці-бежанкі ў Барнаульскі павет, дзе настаўнічаў у в. Усць-Калманская. З 1919 — у Манчжурыі, настаўнічаў у Харбіне. З 1922 прыватна вучыўся спевам у Харбіне. Скончыў эканамічнае аддзяленне юрыдычнага факультэта Харбінскага універсітэта (1929). Неўзабаве быў прыняты ў трупу Харбінскага опернага тэатра. Выконваў вядучыя партыі ў операх "Яўгені Анегін" П. Чайкоўскага, "Дэман" А. Рубінштэйна, "Фаўст" Ш. Гуно, "Рыгалета" Дж. Вэрдзі, "Севільскі цырульнік" Дж. Расіні, "Мадам Батэрфляй" і "Багема" Дж. Пучыні. У 1932-34 стажыраваўся ў Міланскім оперным тэатры "Ла Скала" (Італія), шмат выступаў у канцэртах з вельмі шырокім рэпертуарам. У 1935 прыехаў на радзіму. Працаваў у Пазнанскім оперным тэатры (партыі ў операх "Выкраданне з Сераля" В. Моцарта, "Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага, "Юлі Цэзар" Г. Гендэля). З 1937 — саліст Варшаўскага радыё. У канцэртах побач з оперным

рэпертуарам выконваў народныя песні, пераважна беларускія. Неаднаразова выступаў у Вільні, у 1938 — у Ваўкавыску, Слоніме, Навагрудку. З 1940 працуе ў Нацыянальным тэатры ў Празе, адначасова займаўся педагагічнай, канцэртнай дзейнасцю. Побач з класікай выконваў творы М. Чуркіна, М. Аладава, Р. Пуксты, А. Багатырова. У 1943 выступаў з канцэртам у Ваўкавыску. У 1945 арыштоўваўся гітлераўцамі, быў зняволены ў турме. Пасля вайны працягваў напружаную творчую дзейнасць у Празе. У 1963 прыязджаў у Беларусь, выступаў з шырокай песеннай праграмай у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі, Баранавічах, Гродне, Ваўкавыску, Слоніме, Лідзе. У 1965 даваў канцэрты на Беласточчыне.

**Завіша Крыштоф** (20.04.1666, в. Горка Слонімскага р-на — 15.08.1721), польскі пісьменнік. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Віленскай і Кракаўскай акадэміях. У 80-я — чачэрскі, затым мінскі староста. Удзельнік мірных перамоваў Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай (1686). З 1720 — мінскі ваявода. Аўтар прамоваў на соймах, сабраных яго дачкой Б. Радзівіл у кнізе "Водгук прыемных мелодый" (Варшава, 1728). Напісаў вялікія "Успаміны" (Варшава, 1862), у якіх паказаны штодзённы лад жыцця беларускай шляхты, грамадскія падзеі канца XVII — пач. XVIII стст. Ажыццявіў пераробку італьянскага рамана "Любасць без пераменаў" (1688).

**Загідулін Мікалай Мінгалеевіч** (8.03.1948, в. Вайцехаўшчына Бераставіцкага р-на), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1987). З сям'і службоўца. Скончыў пачатковую школу ў Эйсмантах Бераставіцкага р-на. У сувязі з пераездам бацькоў у Гродна вучыўся у СШ №9, дзе скончыў 8 кл. (1963). Вучыўся ў Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (1963-66). У 1966-67 — настаўнік фізкультуры ў Гудзевіцкай СШ Мастоўскага р-на. Затым працаваў завучам Гродзенскай абласной спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву ў 1967-93 (у 1971 завочна скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры, у 1971-72 служыў у войску). З 1993 — дырэктар гэтай школы. Адначасова ў школе — трэнер-выкладчык па валейболе. Суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі па валейболе (1994). Падрыхтаваў майстроў спорту міжнароднага класа, прызёраў чэмпіянатаў Еўропы па валейболе. Сябра трэнерскай рады Беларускай федэрацыі валейбола. Старшыня Гродзенскай гарадской федэрацыі валейбола.

**Загідуліна Марына Аляксееўна** (дзявоч. Пяткевіч, 19.02.1955, г. Навагрудак), беларускі мастацтвазнавец. З сям'і інтэлігенцыі, якая неўзабаве пераехала ў Гродна. Тут вучылася ў СШ №14, скончыла СШ №2. Вучылася на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1972-77). Была навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела праваслаўя ў Рэспубліканскім музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне (1977-82). З 1982 — мастацтвазнавец управы культуры Гродзенскага аблвыканкама, адначасова з 1994 выкладае мастацтвазнаўчыя дысцыпліны ў Гродзенскім універсітэце. У 1993 скончыла завочна мастацтвазнаўчае аддзяленне Беларускай акадэміі мастацтваў, затым — аспірантуру на кафедры тэорыі і гісторыі мастацтва гэтай акадэміі (1997). Друкуецца з 1983. Аўтар шматлікіх публікацый у навуковых і перыядычных выданнях па гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва, пра мастацкае жыццё Гродзеншчыны.

**Загорскі Браніслаў Іпалітавіч** (29.03.1935, мяст. Жупраны Ашмянскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1971). Дацэнт (1984). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ ў Жупранах (1955). Вучыўся на гістфаку БДУ (1955-60). Выкладаў у Гарадзішчанскай вучэльні механізацыі сельскай гаспадаркі на Брэстчыне (1960-61), у Казлоўшчыскага СПТВ №15 Дзятлаўскага р-на (1961-64). У 1965-68 — аспірант кафедры новай і найноўшай гісторыі замежных краін БДУ. Працаваў затым у сектары замежнай гістарыяграфіі (аддзел навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках) Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1968-75). Адзін з стваральнікаў у гэты час фонду беларускай эміграцкай літаратуры ў Фундаментальнай бібліятэцы Акадэміі навук Беларусі. З 1975 выкладае ў Мінскім інстытуце замежных моваў (лінгвістычным універсітэце). З 1993 — на кафедры міжнародных адносін гэтага універсітэта. Вывучае гісторыю міжнародных адносін, дзейнасць беларускай эміграцыі ў паваенныя часы.

**Залоска Юрась** (Юры Іванавіч, 20.02.1968, в. Навасады Свіслацкага р-на), беларускі пісьменнік, журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1997). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў 8-годцы ў роднай вёсцы, СШ скончыў у мяст. Поразава Свіслацкага р-на (1985). У 1985-89 — курсант Вільнюскай вышэйшай каманднай вучэльні радыёэлектронікі (у 1989 звольніўся з вайсковай службы). Працаваў загадчыкам аддзела Бераставіцкай райгазеты "За камунізм" (1989-90), спецкорам і аглядальнікам тыднёвіка "Літаратура і мастацтва" (1991-95). У 1994 завочна скончыў журфак БДУ. У 1995-96 — галоўны рэдактар

незалежнай выдавецкай кампаніі "Тэхналогія", адначасова з 1994 — сурэдактар часопіса "Крыніца". З 1996 вучыцца на філасофскім факультэце Люблінскага каталіцкага універсітэта (Польшча). Друкуецца як пісьменнік з 1990. Выдаў зборнікі твораў "Дыялогі з Васілём Быкавым" (1995), "Версіі" (1995).

**Замыслоўскі Ягор Ягоравіч** (18.06.1811, г. Гродна — 21.05. 1896), рускі гісторык, педагог. Доктар гістарычных навук (1884). Прафесар (1871). Член-карэспандэнт Расійскай Акадэміі навук (1888). З сям'і чыноўніка. Страціўшы маці ў 5-цігадовым узросце, пераехаў да сваякоў у Пецярбург. Вучыўся тут у прыватным пансіёне, у гімназіі №2. Скончыў гістарычна-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1862). Працаваў настаўнікам каля Саратава (1862-63), у Германіі (1864), у "Доме выхавання бедных дзяцей" пры імператарскім "Чалавекалюбівым таварыстве" ў Пецярбургу (1863-66). З 1866 — выкладчык гісторыі ў Паўлаўскім жаночым інстытуце, з 1867 — у Аляксандраўскім ліцэі, з 1869 — у Пецярбургскім гістарычна-філалагічным інстытуце. У 1884-90 выкладаў гісторыю Расіі XVII ст., помнікі старажытнарускага права, гістарыяграфію і гістарычную геаграфію ў Пецярбургскім універсітэце. Навуковыя інтарэсы датычылі пераважна крыніцазнаўства гісторыі Расіі, часткова Беларусі XVI-XVII ст. Выдаў у Пецярбургу даследаванні: "Цараванне Фёдара Аляксеевіча" Ч. І. (1871), "Казанне Масы і Геркмана пра смутны час у Расіі" (1874), "Герберштэйн і яго гістарычна-геаграфічныя звесткі пра Расію" (1884), "Зносіны Расіі з Польшчаю ў цараванне Фёдара Аляксеевіча" (1887). Пад яго рэдакцыяй складзены навучальны атлас па гісторыі Расіі (1865, 3-е выд. 1887).

**Запруднік Янка** (сапр. Вільчыцкі Сяргей Мікалаевіч, 9.08.1926, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларускі грамадска-культурны дзеяч, гісторык, палітолаг, паэт, публіцыст. Доктар гістарычных навук (1969). З сям'і настаўнікаў, якія працавалі тады на гаспадарцы. Скончыў у Міры пачатковую школу, у Баранавічах — беларускую прагімназію (1943) і 3-ці курс 4-гадовай гандлёвай школы (1944). Выехаў летам 1944 у Германію. Там скончыў беларускую гімназію ў Міхельсдорфе (1947). У 1948-50 працаваў шахцёрам у Англіі, дзе ўдзельнічаў у выданні часопіса "Наперад", у працы "Згуртаванння беларусаў Вялікабрытаніі". У 1950-54 вучыўся на гістарычным факультэце каталіцкага універсітэта ў Лювене (Бельгія). У 1954-91 быў журналістам на радыё "Вызваленне" ("Свабода"). З 1957 жыве з сям'ёй у Н'ю-Йорку. Скончыў 3-гадовыя вячэрнія курсы пры Н'ю-Йоркскім

універсітэце (1969). Выкладаў гісторыю Расіі, СССР у Квінскім каледжы Н'ю-Йоркскага гарадскога універсітэта (1970-75), таксама гісторыю і палітыку Беларусі ў Калумбійскім універсітэце і інстытуце імя Гарымана. Рэдагаваў бюлетэнь "Навіны з Беларусі" (1964-69), выдаваў англамоўны бюлетэнь "Факты пра Беларусь" (1972-75). Быў рэдактарам газеты "Беларус" (1980-91), сябрам управы Беларуска-амерыканскага задзіночання, Беларускага інстытута навукі і мастацтва, Рады БНР, Фундацыі імя П. Крачэўскага, Амерыканскай асацыяцыі славістаў. Друкуецца з 1948 (вершы, рэпартажы, нарысы, навуковыя і публіцыстычныя артыкулы) у перыёдыках "Наперад", "Бацькаўшчына", "Беларускі зборнік", "Беларуская моладзь", “Запісы Беларускага Інстытута навукі і мастацтва" і інш. Выдаў даследаванні: "Спадчына бацькоў: Агледзіны. Да 100-годдзя ад нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа" (Н'ю-Йорк, 1982), "Беларусь на гістарычных скрыжаваннях" (Каларада, 1993, на англ. мове, Мн., 1996), "Гістарычны слоўнік Беларусі" (Бостан, 1998, на англ. мове). Сааўтар даследаванняў: "Нацыяналізм у СССР і Усходняй Еўропе і час Брэжнева і Касыгіна" (Дэтройт, 1977), "Паўстанне на Беларусі 1863 году: "Мужыцкая праўда" й лісты "з-пад шыбеніцы" (Н'ю-Йорк, 1980). Вершы — у калектыўным зборніку "Туга па радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі" (1992).

**Захараў Уладзімір Іванавіч** (18.10.1961, г. Гродна), беларускі музычны педагог, музыкант (класічная гітара), кампазітар. З сям'і вайскоўца. Скончыў у Гродне 9 кл. (падчас вучобы праходзіў курс ігры на гітары ў музычнай студыі Палаца культуры хімікаў) і ў 1977 паступіў у Гродзенскую музычную вучэльню (у 1978 — I месца на конкурсе юных кампазітараў вучэльні). У 1979 перавёўся ў Мінскую музычную вучэльню, але неўзабаве вярнуўся ў Гродна, дзе скончыў музычную вучэльню (1981). Служыў у войску (1981-83). З 1983 выкладае ў класе гітары Гродзенскай музычнай вучэльні. Адначасова з 1990 — саліст-інструменталіст Гродзенскай абласной філармоніі. Завочна скончыў выканаўчае аддзяленне па класу гітары (Я. Грыдзюка) Беларускай кансерваторыі (1991). Скончыў асістэнтуру-стажыроўку пры Беларускай акадэміі музыкі (1998). З 1980 — канцэртная дзейнасць як гітарыста-выканаўцы. Выступаў на фэстывалях і ў канцэртах у Беларусі, Польшчы, Расіі, Італіі, Іспаніі. Лаўрэат міжнародных конкурсаў гітарыстаў. Выконвае класічны рэпертуар і ўласныя творы. Выдаў зборнікі сваіх твораў для гітары: "Настальгія па Вялікім княстве" (Гродна, 1996), "Дзіцячы альбом" (Анкона, Італія, 1997).

**Захлеўны Леанід Канстанцінавіч** (16.01.1947, г. Гродна), беларускі кампазітар. Сябра Беларускага Саюза кампазітараў (1974). Народны артыст Беларусі (1998). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1985), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994). З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў СШ №2 г. Гродна (адначасова ў музычнай школе па класе баяна), у Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні. Тут быў адным з стваральнікаў ансамбля электрабалалаек, з якім выступалі па вобласці. У 1966 прыняты на падрыхтоўчае аддзяленне Беларускай кансерваторыі, праз год — студэнт кампазітарскага аддзялення (клас А. Багатырова) гэтай кансерваторыі (скончыў у 1972). Нядоўга працаваў у Мазырскай музычнай вучэльні. Служыў у войску (1972-73). Прайшоў асістэнтуру-стажыроўку ў Беларускай кансерваторыі (1976). Быў рэдактарам аддзела беларускай музыкі Галоўнай рэдакцыі музычных перадач Беларускага радыё (1976-77). Выкладаў музычна-тэарэтычныя дысцыпліны ў Мінскай музычнай вучэльні (1977-78). У 1978-89 — музычны рэдактар кінастудыі "Беларусьфільм". З 1991 — кіраўнік ансамбля народнай музыкі "Бяседа" Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі. Сярод твораў: кантаты "Вянок" (сл. народныя, 1972), "Муха-цакатуха" (сл. К. Чукоўскага, 1976), для сімфанічнага аркестра варыяцыі "З беларускага эпасу" (1970), сімфоніі № I, (1971), №2 (1975), варыяцыі і тры п'есы для фартэпіяна (1971), саната для габоя і фартэпіяна (1971), чатыры п'есы для дуэта цымбалаў (1992), для хору а капэла — творы на сл. народныя, сл. У. Карызны, для голасу з суправаджэннем — вакальныя цыклы на вершы М. Багдановіча, У. Карызны, народныя, рамансы на сл. К. Буйлы, песні на сл. В. Вярбы, А. Бадака, Н. Гілевіча, Л. Дранько-Майсюка, А. Вольскага, Р. Гамзатава, С. Давідовіча, А. Жукава, У. Карызны, У. Мазго, А. Кажэры, У. Някляева, М. Нікіцінай, М. Палякова, А. Ставера, Т. Сучковай, А. Харчыкава, Л. Пранчака, В. Шымука, М. Ясеня, І. Скурко, П. Харкова, А. Грачанікава, І. Уткіна, В. Гіна. Аўтар музыкі да кінафільмаў "Загадай сабе", "Астравы на далёкіх азёрах", "Канец бабінага лета", "Дзяржаўная граніца", да дакументальнага фільма "Дзядзька Якуб", да мультфільмаў, драматычных спектакляў.

**Заяц Юры Апанасавіч** (12.01.1951, г. Ліда), беларускі археолаг, гісторык. Кандадат гістарычных навук (1989). З сям'і вайскоўца. Скончыў Лідскую СШ №5 (1968). З 1969 — у Мінску. Служыў у войску (1969-71). Вучыўся на падрыхтоўчым аддзяленні Мінскага педінстытута (1971-72). У 1972-77 — студэнт гістфака Мінскага педінстытута.

Працаваў у Дзяржаўным музеі БССР (1977-78), у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (сектар старажытнабеларускай культуры) у 1978-79. З 1979 — у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі), быў ст. лабарантам (1979-80), мал. навуковым супрацоўнікам (1980-88), навуковым супрацоўнікам (1988-91), ст. навуковым супрацоўнікам (з 1991). У 1983 скончыў завочна аспірантуру ў гэтым інстытуце. Асноўныя навуковыя інтарэсы — сярэдневечныя гарады Беларусі, вясковыя паселішчы X-XIII ст. Мінскай зямлі, гісторыя і крыніцазнаўства Беларусі IX-XIII стст. Удзельнічаў у археалагічных раскопках з 1973, з 1977 самастойна. Вывучаў помнікі на тэрыторыі Мінска і Заслаўя, Асіповіцкага, Дзяржынскага, Барысаўскага, Мінскага раёнаў. Друкуецца з 1978. Выдаў манаграфіі: "Заслаўе X-XIII стст. Гістарычна-археалагічны нарыс" (1987, на рус. мове), "Заслаўская кафля" (1990), "Заслаўе ў эпоху феадалізму" (1995, на рус. мове), "Абарончыя збудаванні Менска XI-XIII стог." (1996, на рус. мове).

**Здановіч Іван Юльянавіч** (4.07.1926, в. Доўгае Шчучынскага р-на), беларускі педагог, краязнавец. З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў в. Доўгае. У 1939-41 вучыўся ў 5 кл. Баяра-Жалудоцкай школы (Шчучынскі р-н) і 6 кл. Вялікасельскай школы (Шчучынскі р-н). Падчас вайны скончыў 7 кл. у мяст. Жалудок (Шчучынскі р-н) і 2 курсы Шчучынскай настаўніцкай семінарыі. З 1944 працаваў загадчыкам Баяра-Жалудоцкай пачатковай школы, затым настаўнічаў у 7-годцы ў роднай вёсцы. У 1946 завочна скончыў Лідскую педагагічную вучэльню. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута (1947-51). Працаваў у Малецкай СШ на Пружаншчыне, у Пружанскай СШ №1. У 1955-57 — у Каменскай СШ Гродзенскага р-на, інспектарам Гродзенскага РайАНА. Быў дырэктарам СШ ў в. Капцёўка Гродзенскага р-на (1957-64). У 1964 вярнуўся з сям'ёй на Пружаншчыну, працаваў у сельскіх школах (1964-66), дырэктарам школы рабочай моладзі ў Пружанах (1966-74), дырэктарам Пружанскай школы-інтэрната (1974-78), Пружанскай СШ №4 (1978-86). Друкуе краязнаўчыя артыкулы на гістарычныя, літаратурна-мастацкія тэмы, рэцэнзіі на літаратурныя творы. Выдаў для школьнікаў 5-6 кл. "Зборнік практыкаванняў па беларускай мове" (1965, 2-е выд. 1969, 3-е выд. для 4-6 кл. — 1979). Быў старшынёй Пружанскага грамадска-культурнага аб'яднання "Спадчына" (1987-89). З 1989 — старшыня рады Пружанскай раённай арганізацыі ТБШ.

**Здановіч Ніна Іванаўна** (1.01.1959, г. Слонім), беларускі археолаг, культуролаг. З сялянскай сям'і. Скончыла ў Слоніме СШ №7 (1976). Вучылася на гістфаку БДУ (1976-81), у аспірантуры Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1981-84). Працавала ў сектары археалогіі гэтага інстытута (1984-88), у аддзеле археалогіі інстытута "Белспецпраектрэстаўрацыя" (1988-94). З 1994 выкладае на кафедры тэорыі і гісторыі культуры Беларускага педагагічнага універсітэта. У 1977-87 у складзе археалагічных экспедыцый даследавала замкі ў Лідзе, Міры, Гродне, гарады Мазыр, Мсціслаў, Магілёў, Віцебск, Чачэрск, Мінск, у канцы 80-х — пач. 90-х — Слонім, Віцебск, Полацк. Друкуецца з 1983. Аўтар шматлікіх публікацый на тэмы керамічнай вытворчасці ў Беларусі, пра гісторыю культуры Беларусі. Сааўтар даследаванняў: "Беларуская паліваная кераміка XI-XVIII стст." (1993), "Стары замак у Гродне XI-XIII стст. Гісторыка-археалагічны нарыс" (1993), "Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка" (1994).

**Зімніцкая Рэгіна Эдуардаўна** (дзявоч. Бартош, 12.06.1967, в. Паляжын Зэльвенскага р-на), беларускі спартыўны педагог. Кандыдат педагагічных навук (1993). З сям'і рабочага ПМК. Скончыла 8-годку ў в. Угрынь Зэльвенскага р-на (1982), СШ — у мяст. Дзярэчын Зэльвенскага р-на (1984). Вучылася на педагагічным факультэце Беларускага інстытута фізічнай культуры (1984-88). У 1993 скончыла аспірантуру ў Беларускай акадэміі фізічнага выхавання і спорту. Працуе выкладчыкам тэорыі і методыкі спартыўных трэніровак у Плешчаніцкай філіі Мінскай вучэльні алімпійскага рэзерву №2. Друкуецца як спартыўны педагог з 1990. Даследуе развіццё фізічных якасцяў чалавека, сістэму падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву краіны.

**Зязюля Андрэй** (сапр. Астрамовіч Аляксандр Сцяпанавіч, 7.12.1878, в. Навасады Ашмянскага р-на — 17.01.1921), беларускі паэт, каталіцкі святар. Скончыў павятовую школу ў Ашмянах. Служыў у войску. У 1905-10 вучыўся ў каталіцкай духоўнай семінарыі ў Пецярбургу, дзе ўсвядоміўся як беларус. Служыў ксяндзом у мястэчках Трабы Іўеўскага р-на (тут пачаў гаварыць касцельныя казанні па-беларуску), Ракаў, Новы Свержан, Ганнопаль, Смілавічы, Сенна. Праследаваўся касцельнымі ўладамі за прыхільнасць да роднага слова, два гады быў без парафіі. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці Беларусі. Удзельнік з'езду беларускага каталіцкага духавенства ў Мінску (1917). Друкаваў вершы з 1909 (у газетах "Наша ніва", "Biełarus", "Крыніца" "Вольная Беларусь", "Светач", "Беларуская Рада", "Беларускае жыццё"). Выдаў зборнік паэзіі "З роднага загону"

(Вільня, 1913, 2-е дапоўн. выд. 1931), паэму "Слова праўды аб мове і долі беларуса" (Прага, 1917). Выйшла яго вершаванае апавяданне "Алёнчына вяселле" (Вільня, 1923). Збіраў народныя песні, якія разам з запісамі А. Грыневіча склалі зборнік "Беларускія песні з нотамі". Т. 2. (Пб., 1912).

**Зялёнка Вольга Георгіеўна** (дзявоч. Хіневіч, 29.04.1956, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1989). Дацэнт (1996). З сям'і інтэлігентаў. У сувязі з яе пераездам вучылася ў І кл. СШ у Іўі, працягвала вучобу ў мяст. Дзятлава, дзе скончыла СШ №1 (1973). Вучылася на філфаку БДУ (1973-78). Працавала (малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам) у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (1979-92). Завочна скончыла аспірантуру ў гэтым інстытуце (1989). З 1992 — дацэнт кафедры беларускай мовы і методыкі яе выкладання Беларускага педагагічнага універсітэта. Чытае курсы "Уводзіны ў мовазнаўства", "Беларуская мова". Друкуецца як мовазнавец з 1983. Даследуе семантыка-сінтаксічныя пытанні, сінтаксічную варыянтнасць і сінанімію, граматычную спалучанасць слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Сааўтар навучальна-метадычных прац: "Беларуская мова. Вучэбны дапаможнік для ВНУ" (1996), "Беларуская мова. Зборнік дыктантаў" (1996). Адзін з укладальнікаў слоўнікавых выданняў.

**Зянкевіч Тадэвуш** (3.12.1929, г. Ваўкавыск), польскі літаратуразнавец, педагог. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1993). З сям'і чыгуначніка. Вучыўся ў 7-годцы ў Ваўкавыску. У чэрвені 1941 — на адпачынку ў Азёрах (Гродзенскі р-н), вывезены з дзецьмі ў Куйбышаўскую вобл., дзе быў у дзіцячым доме. Затым працаваў на фабрыках у Куйбышаве. Вярнуўся дамоў у 1945, тады ж з бацькамі пераехаў у Польшчу. Жылі ў г. Аструда, дзе скончыў гімназію і агульнаадукацыйны ліцэй. У 1950-53 вучыўся на факультэце польскай філалогіі ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Гданьску. Затым настаўнічаў у Ольштынскім ваяводстве. Завочна вучыўся ў дактарантуры ў універсітэце ў Лодзі (1969-72). З 1972 выкладае гісторыю польскай літаратуры і методыку польскай мовы і літаратуры ў Вышэйшай настаўніцкай школе (Вышэйшай педагагічнай школе) у Ольштыне. Пазней — у Інстытуце польскай філалогіі гэтай школы. З 1992 — на кафедры ўсходнеславянскай філалогіі, выкладае гісторыю польскай літаратуры і польска-беларускія, польска-украінскія літаратурныя сувязі (з 1994 — на пасадзе прафесара). Друкуецца з 1969. Даследуе польскае літаратурнае жыццё ў рэгіёнах Усходняй Прусіі,

Расіі, Беларусі, Украіны, Літвы. Выдаў манаграфіі: "Прэса на Мазурах (1842-1939) у літаратурным кантэксце" (Ольштын, 1977), "Рэгіянальныя асаблівасці жыцця Варміі і Мазураў у лекцыйным курсе польскай мовы" (Ольштын, 1985), "Польскае літаратурнае жыццё ў Кіеве ў 1905-18 гадах" (Ольштын, 1992), "Польскае літаратурнае жыццё ў Мінску XIX і на пачатку XX стагоддзя. Да 1921 года" (Ольштын, 1997).

**Іваноў Усевалад Міканоравіч** (19.09.1888, г. Ваўкавыск — 9.12.1971), рускі пісьменнік (празаік). Скончыў гістарычна-філасофскі факультэт Пецярбургскага універсітэта (1912). У 1922-45 жыў у Кітаі, займаўся журналістыкай, супрацоўнічаў з ТАСС. Друкаваўся з 1909 як паэт. Пазней пісаў апавяданні, аповесці, раманы. У Маскве, Паўднёва-Сахалінску, Хабараўску выходзілі яго кнігі прозы "Тайфун над Янцзы" (1952), "Шлях да алмазнай гары" (1956), "На ніжняй Дзебры" (1958), "Веснавая аповесць пра скрынку на акне" (1960), "Валька" (1961), "Чорныя людзі" (1963).

**Іваноўскі Антон Дамінікавіч** (1823, г. Гродна — 1873), рускі і беларускі гісторык, педагог. Прафесар (1861). Скочыў Харкаўскі універсітэт (1848). З 1850 працаваў перакладчыкам дэпартамента замежных веравызнанняў Расіі, з 1864 — ст. сталаначальнік дэпартамента. Адначасова (з 1857) — у Публічнай бібліятэцы ў Пецярбургу, дзе ўзначальваў аддзел польскай літаратуры. З 1861 выкладаў гісторыю Расіі і ўсеагульную гісторыю ў Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі. Уваходзіў у нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю, быў знаёмы з братамі В. і К. Каліноўскім!. Займаўся гістарыяграфіяй Расіі, Беларусі, Літвы. Супрацоўнічаў з Віленскай археалагічнай камісіяй. Выдаў даследаванні: "Дзяржаўны канцлер граф Мікалай Пятровіч Румянцаў: Біяграфічны нарыс" (СПб, 1871), "Мітрапаліт кіеўскі і Галіцкі Яўгеній (Балахвіцінаў)" (Спб, 1872).

**Іваноўскі Вацлаў Леанардавіч** (7.06.1880, маёнт. Лябёдка Шчучынскага р-на — 7.12.1943), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, выдавец, педагог. Доктар тэхналагічных навук (1909). Прафесар (1922). З заможнай шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію ў Варшаве (1899), хімічны факультэт Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута (1904). Працаваў у навуковай лабараторыі, пазней — выкладчык гэтага інстытута, таксама Вышэйшых жаночых палітэхнічных курсаў у Пецярбургу. Адзін з заснавальнікаў Беларускай рэвалюцыйнай партыі (1902), пасля — БСГ. Удзельнічаў у выданні беларускай агітацыйнай літаратуры (з 1902), часопіса "Свабода" (1902). Узначаліў

"Круг беларускай народнай прасветы і культуры" (1903). Арганізоўваў выданне беларускіх кніг (Пецярбург, Кракаў). Удзельнічаў у падрыхтоўцы беларускага "Лемантара..." (1906). Адзін з заснавальнікаў пецярбургскага беларускага выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца" (1906). Гуртаваў беларускую моладзь у Пецярбургу дзеля спраў нацыянальнага адраджэння. У 1913-16 - у Вільні, дзе кіраваў сельскагаспадарчым таварыствам і Беларускім выдавецкім таварыствам. З 1916 — у Пецярбургу, узначаліў тут Беларускае таварыства пацярпелых ад вайны. Удзельнік з'езду беларускіх нацыянальных арганізацыяў у Мінску (сакавік, 1917), дзе выбраны ў Беларускі нацыянальны камітэт. Дэлегат Усебеларускага кангрэса (снежань 1917). Міністр асветы ва ўрадзе БНР (1918). У 1919 арыштоўваўся савецкімі ўладамі. Працаваў загадчыкам літаратурна-выдавецкага аддзела Мінскага губернскага камісарыята асветы, выкладаў у Мінскім педінстытуце, адкрываў беларускія школы на Міншчыне. У 1920 — ва ўрадзе Сярэдняй Літвы. У 1922-39 выкладаў у Варшаўскім палітэхнічным інстытуце (быў загадчыкам кафедры, дэканам хімічнага факультэта). Адзін з заснавальнікаў Беларускага асветнага таварыства ў Варшаве (1937). З восені 1939 — настаўнік прамысловага ліцэя ў Вільні. У 1940-41 — на кафедры хімічнай тэхналогіі Віленскага універсітэта. З ліпеня 1941 — старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта. З 1942 — бургамістр Мінска, сябра прэзідыуму, затым прэзідэнт Беларускага навуковага таварыства. Друкаваўся як публіцыст, дарадчык па харчовай вытворчасці, агранаміі з 1906 (у газетах "Наша доля", "Наша ніва", часопісе "Саха"). Аўтар кніг, шматлікіх навуковых публікацый (з 1914) пра тэхналогію вытворчасці харчовых прадуктаў.

**Івашкевіч Клімент** (1804, г. Гродна — 10.07.1848), польскі і беларускі мастак. Вучыўся жывапісу ў Вільні (у Я. Рустэма), у Любліне. Жыў пераважна ў Варшаве. Летам выязджаў пісаць на радзіму (у 1824 — у Гродне, у 1827 — пад Вільняй). Працаваў у асноўным у жанры партрэта. Выстаўляў партрэты пяраў С. Канарскага, А. Карчынскага, І. Макавельскага.

**Іверс Анатоль** (сапр. Міско Іван Дарафеевіч, 15.05.1912, в. Чамяры Слонімскага р-на — 26.10.1999), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1940). З сялянскай сям'і. У 1914-18 былі ў бежанстве (Казанская губ., Кіеў). У Чамярах скончыў 3 класы 7-годкі і паступіў у Віленскую беларускую гімназію (1926). У 1928 выключаны за ўдзел у рэвалюцыйным руху. Вучыўся ў Клецкай (1928-29) і Навагрудскай (1929-30) беларускіх гімназіях, але звальнялі і адсюль.

Працаваў дома на гаспадарцы, удзельнічаў у культурна-асветных справах моладзі. Некалькі разоў улады арыштоўвалі і судзілі за беларускую дзейнасць. У 1934-35 служыў у войску. З верасня 1939 — літсупрацоўнік Слонімскай раённай газеты "Вольная праца". Падчас гітлераўскай акупацыі — у Слонімскай гарадской управе (памочнікам бухгалтара, справаводам). З восені 1942 — кіраўнік Слонімскай падпольнай антыфашысцкай арганізацыі. З восені 1943 — у партызанах. Быў намеснікам камандзіра атрада па разведцы. Удзельнічаў у выданні партызанскіх лістовак, падпольных газет "Вольная праца", "Барацьба". У 1944-47 — адказны сакратар Слонімскай райгазеты "Вольная праца", затым — сакратар Слонімскага гарвыканкама (1947-49), адкуль быў звольнены па палітычных матывах. Працаваў у лесахімічнай прамысловасці — тэхнаруком Слонімскага вытворчага ўчастка, тэхнолагам лесахімзавода, майстрам смолзавода (1949-66). Зноў быў супрацоўнікам Слонімскай райгазеты (1966-75). У гэты ж час кіраваў раённым літаб'яднаннем. У 1976-84 — адказны сакратар раённага аддзялення Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Друкуецца як паэт з 1934 (у часопісах "Літаратурная старонка", "Асва", "Беларускі летапіс", "Калоссе", "Шлях моладзі"). У 1939 у Вільні выйшаў зборнік вершаў "Песні на загонах". Выдаў кнігі паэзіі "З пройдзеных дарог" (1970), "Жыву ў бацькоўскім краі" (1982), "Я пайшоў бы ўслед за летам" (1987), "Прыдарожныя сосны" (Слонім, 1995), "Травень" (Слонім, 1997).

**Ільіна-Загнетава Вікторыя Арнольдаўна** (дзявоч. Загнетава, 18.12.1960, г. Гродна), беларуская мастачка. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1991). З сям'і інтэлігенцыі, дачка Д. Бічэль. Вучылася ў Гродзенскай СШ №12. Затым у Мінскай мастацкай вучэльні (1977-81). Скончыла аддзяленне станковага жывапісу Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1988). З 1988 працуе ў дзіцячай мастацкай школе ў Гродне. Піша пераважна пейзажы-краявіды, інтэр'еры (алей) у стылі "суб'ектыўнага рэалізму". У выставах (з 1989) удзельнічала ў Беларусі, Літве, Польшчы, Германіі, Францыі, Іспаніі. Сярод твораў: "Ля Калежы" (1989), "Жырандоль" (1990), "Лета ў вёсцы" (1990), "Вандроўка пад дажджом" (1991), "Заснежаны горад" (1991), цыкл "Вандроўкі па горадзе" (1990-98), цыкл "Майстэрні знаёмых мастакоў", у тым ліку: "Майстэрня Асапрылкаў" (1994), "У майстэрні скульптара" (1994), "Мая майстэрня" (1995), "Майстэрня жывапісца" (1995), цыкл "Старыя будынкі", у тым ліку: "Мастацкая школа вечарам" (1996), "Жыццё старога дома" (1996), "Старая сінагога" (1996), "Дом Асапрылкаў" (1997), цыкл "За акном майстэрні" (1996-98). Творы

зберагаюцца ў галерэях і прыватных зборах Беларусі, Польшчы, Літвы, Германіі, Іспаніі, Францыі, Канады, Японіі.

**Ільінскі Аляксандр Канстанцінавіч** (11.11.1903, мяст. Мір Карэліцкага р-на — 18.03.1967), беларускі артыст тэатра. Народны артыст Беларусі (1938). Народны артыст СССР (1953). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946). З сям'і праваслаўнага святара, брат М. Ільінскага. Вучыўся ў Мінску (сюды пераехала сям'я) у духоўнай вучэльні. Перайшоў неўзабаве ў палітэхнічную вучэльню, з 2-га курса пакінуў яе дзеля сцэны. У 1919-20 выступаў у спектаклях драматычнай секцыі Таварыства працаўнікоў беларускага мастацтва, створанага Беларускай вучнёўскай грамадой у Мінску. Затым — на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра (1920-21). Вучыўся ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве (1922-26). З 1926 — акцёр 2-га Беларускага тэатра (Беларускага драмтэатра імя Я. Коласа ў Віцебску). У 1941-46 — мастацкі кіраўнік гэтага тэатра. Выступаў як пастаноўшчык шэрагу спектакляў. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Сярод роляў: Талаш ("У пушчах Палесся" Я. Коласа), Дзяменя ("Вайна вайне" Я. Коласа), Кручкоў ("Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцінкевіча), Шчасліўцаў ("Лес" А. Астроўскага), Расплюеў ("Вяселле Крачынскага" А. Сухава-Кабыліна), Сысой ("Каля тэрасы" М. Грамыкі), Харкевіч ("Пагібель воўка" Э. Самуйлёнка), Несцерка ("Несцерка" В. Вольскага), Хлестакоў ("Рэвізор" М. Гогаля), Барон ("На дне" М. Горкага), Прохар ("Васа Жалязнова" М. Горкага), Блазан ("Кароль Лір" У. Шэкспіра), Палоній ("Гамлет" У. Шэкспіра), Корж ("Песня нашых сэрцаў" В. Палескага), Пытляваны ("Пяюць жаваранкі" К. Крапівы), Швандзя ("Любоў Яравая" К. Транёва), Цімчук ("Святло з Усходу" П. Глебкі), Філіберт ("Забаўны выпадак" К. Гальдоні), Гжэгаж ("Дамы і гусары" А. Фрэдры), дзяк Баяноўскі ("Навальніца будзе" паводле Я. Коласа), Тэўе ("Тэўемалочнік" паводле Шолам-Алейхема), Моцкін ("Выбачайце, калі ласка" А. Макаёнка), Хрысанцій ("Праўда і крыўда" паводле М. Стэльмаха), Сганарэль ("Лекар мімаволі" Ж. Мальера).

**Ільінскі Мікола** (Мікалай Канстанцінавіч, 21.03.1899, мяст. Мір Карэліцкага р-на — 1943), беларускі пісьменнік (драматург, празаік, перакладчык), артыст тэатра. З сям'і праваслаўнага святара, брат А. Ільінскага. Скончыў гімназію ў Навагрудку. Вучыўся ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, у БДУ, Маскоўскім тэхнікуме кінематаграфіі. Працаваў акцёрам у Беларускім дзяржаўным тэатры ў Мінску. З 1925 — сакратар тэатральнай падсекцыі Інбелкульту. Загадваў літаратурнай часткай 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатра.

Быў сябрам літаратурнай арганізацыі "Маладняк". У час вайны служыў у Мінскай гарадской управе, дзе займаўся справамі мастацтва. Загінуў у засценках СД. Выдаў у Мінску п'есы "Лес цёмны" (1930), "На суд грамадскі. Аратары за ліквідацыю прарываў" (1930), "Рунь вясновая" (1930), "Як Мікіта і Тарас працаваць ішлі ў калгас" (1930), "Кавалі жыцця" (1931), "На прадвесні" (1932), драматычныя эцюды "Любоў да бліжняга" (1930), "Пустазелле" (1931), "Месія" (1940). П'есы ішлі на сцэне. Друкаваў апавяданні, нарысы, пераклады п'ес рускіх і ўкраінскіх драматургаў.

**Ількевіч Мікалай Мікалаевіч** (1.08.1958, в.Бершты Шчучынскага р-на), рускі і беларускі пісьменнік, гісторык, краязнавец. Сябра Саюза расійскіх пісьменнікаў (1996). З сям'і будаўніка. Скончыў СШ №3 г. Гродна, Кіеўскую вышэйшую агульнавайсковую камандную вучэльню (факультэт вайсковай разведкі) у 1979. Служыў у Туркестанскай ваеннай акрузе. У 1982 скончыў Вышэйшыя курсы ваеннай контрразведкі КДБ СССР. Працаваў па спецыяльнасці ў Узбекістане, з 1984 — у Афганістане, з 1986 — у Ташкенце, з 1987 — у Баку, з 1992 — у Смаленску (завочна скончыў у 1993 Акадэмію Міністэрства бяспекі Расійскай федэрацыі). Быў начальнікам Цэнтра грамадскай сувязі управы генеральнай службы бяспекі Расійскай Федэрацыі па Смаленскай вобл. (1992-99). Звольнены з вайсковай службы. Падпалкоўнік. Адзначаны баявымі ўзнагародамі Расіі, Манголіі, Афганістана. З 1998 — галоўны рэдактар смаленскага часопісаштоквартальніка "Годы". Друкуецца з 1992. Вывучае справы рэпрэсаваных. Выдаў у Смаленску кнігі: "Справа Македонава. З гісторыі рэпрэсій супраць Смаленскай пісьменніцкай арганізацыі. 1937-1938" (1996), "Эпохі Твардоўскага. Смаленскі Сакрат. Справа Македонава" (1996, у сааўт.), "Душа дваілася. Аповесць, народжаная ў Смаленску" (1997), "Аляксандр Ульянаў і версія НКУС пра антысавецкае падполле ў БССР. Фальсіфікацыя органамі НКУС крымінальных спраў у 1937-38 гг." (1997, у сааўт.), "Акадэмік Гаўрыіл Гарэцкі: першае сутыкненне з ГПУ. Да гісторыі высылкі за мяжу айчыннай інтэлігенцыі ў 1922 годзе" (1998), "Адам Бабарэка: арышт — лагер — смерць. Расправа з ссыльнымі беларусамі ў Кіраве ў 1937-1938 гг. Дакументальны нарыс" (1999). Складальнік, аўтар уступнага артыкула, каментатар зборніка вершаў У. Мураўёва "Пасынак лёсу", выдадзенага ў Маскве ў 1996.

**Ільюшчыц Кастусь** (Канстанцін Мікалаевіч, 2.01.1947, мяст, Наваельня Дзятлаўскага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх

пісьменнікаў (1991). З сям'і службоўца, якая пераехала на яго радзіму. Тут, на Старобіншчыне, у в. Скаўшын, скончыў СШ. Затым скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут (1968) і служыў у войску (1968-92). У 1971 скончыў Усурыйскую Вышэйшую ваенную аўтамабільную камандную вучэльню. З 1992 — на радзіме. Друкуецца як паэт з 1965. Выдаў зборнікі вершаў "Армейскія будні" (1977), "Таежны гарнізон" (1982).

**Інькоў Міхаіл Нічыпаравіч** (21.03.1954, мяст. Зэльва), беларускі скульптар, архітэктар. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1995). З сям'і службоўцаў. У 1961 пераехалі ў Мінск. Тут скончыў СШ у 1971 і паступіў на вячэрняе аддзяленне Беларускага палітэхнічнага інстытута (спецыяльнасць "архітэктура"). Адначасова працаваў чарцёжнікам у праектным інстытуце "Белмясцпрампраект". У 1972 перавёўся на дзённае аддзяленне інстытута (скончыў у 1977). Працаваў мастаком-канструктарам у НДІ тэхнічнай эстэтыкі (1977-78), начальнікам аддзела ў Рабочай групе па стварэнні Беларускага музея народнага дойлідства і побыту (1978-82), архітэктарам у навукова-рэстаўрацыйных майстэрнях Міністэрства культуры Беларусі (1982-84). З 1984 кіраваў гуртком "Юны скульптар" у Доме піянераў Фрунзенскага РайАНА Мінска. У 1994 скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў (скульптурнае аддзяленне). Працуе ў жанрах манументальнай і станковай скульптуры, дробнай пластыкі (кераміка). У выставах — з 1989. Сярод манументальных твораў — помнік-бюст Л. Геніюш для Зэльвы (1991), помнік К. Тураўскаму ў Тураве (1993), помнік лётчыку А. Гараўцу ў Віцебску (1995, у сааўт.), памятны знак кн. К. Астрожскаму ў Тураве (1-998), помнік княгіні Слуцкай для г. Слуцка (1999), мемарыяльная дошка М. Танку на вул. М. Танка ў Мінску (1999). З станковых твораў — рэльефы К. Тураўскага, Е. Полацкай, трыпціх "Адраджэнне" і інш.

**Іоська Міхаіл Іванавіч** (5.03.1929, в. Бародзічы Зэльвенскага р-на -20.02.1986), беларускі філосаф, культуролаг, педагог, журналіст. Кандыдат філасофскіх навук (1966). Дацэнт (1970). Сябра Саюза журналістаў СССР (1960). З беднай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Бародзіцкай пачатковай, Зэльвенскай СШ. Скончыў філасофскае аддзяленне гістфака БДУ (1954). Працаваў у Мінскім абкаме, Грэскім райкаме ЛКСМБ, Зэльвенскім райкаме КПБ (1954-57). У 1957-63 — у Самаркандзе, у абласной газеце "Ленинский путь" (літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ (1963-66). На гэтай

кафедры выкладаў гісторыю замежнай філасофіі (1966-84), аднача-сова (у 1966-71) рэдагаваў універсітэцкую шматтыражовую газету "Беларускі універсітэт". У 1984-86 працаваў на кафедры навуковага камунізму Мінскага інстытута культуры. Друкаваў вершы, нарысы, дакументальныя аповесці. Аўтар шматлікіх артыкулаў на тэмы гісторыі, грамадскай думкі, культуры Беларусі. Выдаў даследаванні (на рус. мове): "Беларусь і Узбекістан. З гісторыі развіцця міжнародных адносін беларускага і узбекскага народаў" (1970), "Мікалай Судзілоўскі-Русель. Жыццё, рэвалюцыйная дзейнасць і светапогляд" (1976), "К. Маркс, Ф. Энгельс і рэвалюцыйная Беларусь" (1977, 2-е выд. 1985).

**Іпатава Вольга Міхайлаўна** (1.01.1945, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларуская пісьменніца (паэтка, празаік, драматург, літаратурны крытык, публіцыст). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1970). З сям'і службоўцаў. З 1949 жылі у Навагрудку, дзе памерла маці. Тут вучылася ў 1 кл. СШ №1. З 1951 жыла ў бабулі ў в. Забелле на Віцебшчыне, тут скончыла 3-ці кл. Затым — зноў у Навагрудку, вучылася ў 4 кл. (1954-55). Пасля жыла ў в. Хрольчыцы (Дзятлаўскі р-н), дзе працаваў бацька, у Таркачоўскай СШ Дзятлаўскага р-на скончыла 5 кл. У 1956-61 выхоўвалася ў дзіцячым доме ў Гродне, тут скончыла СШ №7. У 1961 паступіла на аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака БДУ. У 1963 перавялася на завочнае (скончыла ў 1967). Працавала на Віцебшчыне настаўніцай, таваразнаўцам у аблкнігагандлі. У 1965-68 — у Гродзенскім гаркаме, затым абкаме камсамола. У 1968-72 — рэдактар на Гродзенскай абласной студыі тэлебачання. Затым у Мінску. Была літсупрацоўнікам у тыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (1972-74). Вучылася ў аспірантуры Літаратурнага інстытута ў Маскве (1975-78). Працавала (з перапынкамі) літкансультантам газеты "Чырвоная змена". З 1985 — галоўны рэдактар літаратурна-драматычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання. Вяла тут перадачы "Спадчына", "Ліра". У 1989-91 была загадчыкам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Спадчына". Затым — галоўны рэдактар тыднёвіка "Культура". З 1997 — першы намеснік старшыні управы Саюза беларускіх пісьменнікаў. Літаратурную працу пачынала з вершаў (1956). Выдала зборнікі лірыкі "Раніца" (1969), "Ліпеньскія навальніцы" (1973), "Парасткі" (1976), вершы для дзяцей — "Снягурка" (1974), "Казка пра Паўліна" (1983). Друкавала апавяданні, аповесці, раманы, у тым ліку гістарычныя. Выйшлі кнігі прозы "Вецер над стромай" (1977), "Дваццаць хвілін з Немезідай" (1981), "Перакат" (1984), "За морам Хвалынскім" (1989). Аўтар беларусазнаўчай кнігі "Паміж Масквой і Варшавай" (1996, на бел. і

нямец. мовах), тэлеп'есы "Давыд Гарадзенскі" (паст. 1988), лібрэта оперы "Князь Наваградскі" (паст. 1992), тэлерэпартажаў пра жыццё беларускай эміграцыі ў ЗША. У Маскве ў перакладзе на рускую мову выйшаў яе зборнік паэзіі (у 1976), выдадзены кнігі прозы (у 1980, 1986). Літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы друкаваліся ў беларускіх, маскоўскіх выданнях. Складальніца тэматычных зборнікаў паэзіі. Перакладае рускіх, украінскіх, узбекскіх, казахскіх пісьменнікаў.

**Кабак Ахарон** (1883, мяст. Смаргонь — 1944), яўрэйскі пісьменнік (празаік, перакладчык), педагог. Доктар філасофіі (1920). Пісаў на іўрыце. Вучыўся ў хедэры і ешыбоце, затым быў вандроўным настаўнікам. У 1906 — удзельнік яўрэйскай самаабароны ў Гродне. Пасля выехаў у Канстанцінопаль, адкуль пісаў артыкулы для яўрэйскай прэсы. З 1911 — у Тэль-Авіве, выкладаў у гімназіі. Пасля вучыўся ў Берліне, Жэневе, Лазане. У 1921 выехаў у Іерасулім, дзе выкладаў літаратуру. Друкаваўся з 1901. Выдаў раманы "Адна" (1905), "Паміж морам і пустыняй" (1933), "Па вузкай сцяжыне" (1937). Выйшла яго гістарычная трылогія "Шломо молхо" (1928-29), цыкл раманаў "Гісторыя адной сям'і". Пісаў драмы, перакладаў на іўрыт творы Стэндаля, П. Лоці, Л. Васермана, Д. Меражкоўскага, М. Лермантава, Э. Ажэшкі.

**Кавалеўскі Восіп Міхайлавіч** (9.01.1801, мяст. Вялікая Бераставіца — 7.11.1878), беларускі, рускі і польскі лінгвіст-манголазнавец, гісторык, педагог. Акадэмік Пецярбургскай акадэміі навук (1847). З сям'і ўніяцкага святара. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі (1809-17), на літаратурна-мастацкім факультэце (спецыяльнасць — старажытныя мовы і класічная літаратура) Віленскага універсітэта (1817-21). Выкладаў у Віленскай гімназіі. У 1825 па справе філаматаў сасланы ў Казань, дзе ў універсітэце вывучаў усходнія мовы (татарскую, арабскую, персідскую). У 1829-33 удзельнічаў у навуковым падарожжы па Бурацыі, Манголіі, Кітаі, вывучаў мову і культуру манголаў, народаў Сібіры і Кітая. У 1833-55 выкладае мангольскую мову і літаратуру на кафедры (шмат гадоў яе ўзначальваў) мангольскай філалогіі Казанскага універсітэта. Адначасова — дэкан філалагічнага факультэта універсітэта ў 1837-58. Быў сакратаром рэдкалегіі навуковага часопіса універсітэта "Ученые записки..." (1834-55). Працаваў рэктарам Казанскага універсітэта ў 1855-60. З 1862 — загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Варшаўскай галоўнай школы (універсітэта), адначасова — дэкан гістарычна-

філалагічнага факультэта ў 1869-78. Друкаваўся з 1819 (пераклады з Лонгіна, Авідзія, Плутарха). Выдаў "Кароткую граматыку мангольскай кніжнай мовы" (Казань, 1835), "Мангольскую хрэстаматыю" Т. 1-2. (Казань, 1836-37), "Будзійскую касмалогію" (Казань, 1837), "Мангольска-рускі-французскі слоўнік". Т. 1-3 (Казань, 1844-49). У рукапісе засталася "Гісторыя манголаў" у 2-х тамах.

**Кавалеўскі Павел Аляксандравіч** (11.06.1958, г.Гродна), беларускі псіхолаг, педагог. Кандыдат псіхалагічных навук (1995). З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў СШ №6 г. Гродна, адначасова ў Гродзенскай музычнай вучэльні, якую скончыў у 1977 і быў накіраваны выкладаць у Шчучынскую дзіцячую музычную школу. Служыў у войску (1977-80). Вучыўся на гістфаку Гродзенскага універсітэта (1980-85). Быў старшынёй прафкама студэнтаў універсітэта (1985-89). У 1989-92 — аспірант кафедры псіхалогіі Гродзенскага універсітэта. Затым працуе на кафедры псіхалогіі (узроставай і педагагічнай псіхалогіі) гэтага універсітэта. Друкуецца як псіхолаг з 1992. Даследуе праблемы сацыяльна-перцэптыўнай творчасці настаўніка.

**Кавалюк Аўгіння** (Яўгенія Трафімаўна, дзявоч. Сідаровіч, 13.03.1934, в. Стральцы Гродзенскага р-на), беларуская паэтка. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). З заможнай сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыла 2 кл. пачатковай школы, год вучылася ў в. Раўкі (Мастоўскі р-н), калі жыла ў цёткі. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Гродне (беларуская СШ №9), куды пераехала сям'я. Скончыла беларускае аддзяленне гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута ў 1959 і ў тым жа годзе па сямейных абставінах пераехала ў Рыгу. Тут настаўнічала ў школе (1959-78). Затым працавала загадчыцай метадычнага кабінета на кафедры марксізму-ленінізму ў Міжгаліновым інстытуце павышэння кваліфікацыі спецыялістаў народнай гаспадаркі Латвійскай ССР (1978-82), загадчыцай метадычнага кабінета на кафедры гісторыі КПСС Рыжскай Вышэйшай ваенна-палітычнай вучэльні (1982-87). З 1987 жыве з сям'ёй у С.-Пецярбургу, выкладае рускую мову і літаратуру ў СШ №101. Вершы друкавала з 1952 у раённай газеце. У рэспубліканскай перыёдыцы — з 1961. Выдала зборнікі лірыкі "Маўклівыя скарбы" (1966), "Кропля бурштыну" (1974), зборнік вершаў і паэм "Імгненняў след" (1987). Выйшла кніжка паэзіі для дзяцей "Белае дзіва" (1964). Перакладае паэтаў Латвіі.

**Кабац Эўгеніюш** (11.01.1930, г. Ваўкавыск), польскі пісьменнік (празаік, эсэіст, перакладчык). З сям'і чыгуначніка, якая ў 1946 пераехала ў Польшчу. У Ваўкавыску скончыў 8 кл. Скончыў Галоўную школу планавання і статыстыкі ў Варшаве (1952). Працаваў у фінансавых установах (1948-57). Быў сябрам рэдакцыі двухтыднёвіка "Współczesność" (1960-68), дарадцам па справах культуры пасольства Польшчы ў Італіі (1968-72). У 1973-93 — намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Literatura na świecie". Сакратар польскай філіі Таварыства еўрапейскай культуры (1990). Сябра галоўнай управы Таварыства "Полынча-Беларусь" (1994). Друкуецца з 1954. Выдаў у Варшаве зборнікі апавяданняў "П'яны анёл" (1957), "Горкі пляж" (1960), "Аўтастрада сонца" (1979), цыкл рэпартажаў на італьянскія тэмы "Ворка мора" (1965), аповесці "За шмат сонца" (1959), "Раманс" (1960), "Нейтральная зона" (1960, у сааўт.), "Прыгоды з Агнешкай" (1962, 3-е выд. 1969), "Адзінаццаты запавет" (Лодзь, 1965, 3-е выд. 1978), "Чарапахі" (1966), "Адпачынак у высокай траве" (1968), "Філіп і Джульета" (1968), "Выкраданне Джульеты" (1973), "Патрыцыя або пра каханне і мастацтва сярод ночы" (1975), "Малгажата або рэквіем для ваяўнічай" (1980), "Смерць рабочага ў гатэлі Савой" (1985). Перакладае з беларускай (асобнымі выданнямі ў яго перакладах выйшлі кнігі В. Быкава, І. Мележа), рускай, італьянскай моваў.

**Казакевіч Мікалай** (24.12.1923, пас. Альбярцін ля Слоніма), польскі сацыёлаг, публіцыст. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1972). Прафесар (1989). Пасля вайны сям'я пераехала ў Польшчу. Скончыў філасофскі факультэт Варшаўскага універсітэта (1950). Працаваў намеснікам галоўнага рэдактара газеты "Glos nauczycielski" (1951-55). Быў на творчай працы (1956-67). У 1967-70 — ад'юнкт аддзела даследавання прамысловых раёнаў Польскай Акадэміі навук у Варшаве. З 1971 — ад'юнкт, дацэнт, прафесар аддзела сацыялогіі Інстытута развіцця вёскі і сельскай гаспадаркі Польскай Акадэміі навук. Сябра Выканкама Міжнароднай федэрацыі планавання сям'і (1970-80). Выдаў пераважна ў Варшаве кнігі: "Светапогляд 1000 настаўнікаў" (1961), "Новая моладзь — міфы і рэальнасць" (1965, па-чэшску — 1968), "Амаль дасканалы шлюб" (1967, па-славацку — 1979), "Ля асноў сексуальнага выхавання" (1969), "Кар'еры плоцкія — школьніцтва і індустрыялізацыя" (1971), "Кар'еры авансам праз адукацыю" (1973), "Агляд стану сексуальнай адукацыі ў еўрапейскіх краінах" (Лондан, 1975), "Сучаснасць польскіх настаўнікаў" (1976), "З людзьмі пра чалавека. Гутаркі" (1980), "Сексуальная адукацыя і

юнацтва ў Еўропе" (Лондан, 1981). Аўтар навукова-папулярных кніг для моладзі і пра моладзь, выдадзеных у Варшаве, Жэневе, Рыме.

**Казлоўскі Ігнат Ігнатавіч** (1846, г. Гродна — 19.11.1889), беларускі і рускі мовазнавец-славіст. Скончыў гістарычна-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Вывучаў праблемы параўнальна-гістарычнага славянскага і ўсходнеславянскага мовазнаўства. Аўтар шматлікіх артыкулаў у навуковых выданнях, кнігі "Лёс народнай мовы ў Літве і на Жмудзі" (Вільна, 1870).

**Казуля Сяргей Віктаравіч** (2.02.1962, г. Гродна), беларускі гісторык. З сям'і службоўцаў. Скончыў Гродзенскую СШ №14. Працаваў на гарбарным заводзе ў Гродне (1979-80). Вучыўся на гістфаку Гродзенскага універсітэта (1981-86). Настаўнічаў у СШ ў в. Луцкаўляны (Гродзенскі р-н) у 1986-87. З 1987 — ст. навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі (г. Гродна). У 1995 скончыў завочна аспірантуру ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук. Вывучае гісторыю уніяцкай царквы ў Беларусі, дзейнасць ордэна базыльянаў. Аўтар многіх навуковых публікацый (з 1987) у зборніках дакладаў, энцыклапедычных выданнях.

**Казыра Леанід Аляксеевіч** (12.11.1949, в. Негрымава Навагрудскага р-на), беларускі перакладчык, літаратуразнавец. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1986). З сялянскай сям'і. Скончыў у Навагрудку СШ № 1 (1966). Працаваў слесарам у Навагрудскім раённым аб'яднанні "Сельгастэхніка" (1966-67). У 1967-72 — студэнт перакладчыцкага факультэта Мінскага педінстытута замежных моваў. Быў рэферэнтам-перакладчыкам у навуковых установах Мінска (1972-73) і Масквы (1973-76). Служыў у войску (1976-77). Быў перакладчыкам у бюро "Замежтэхдапамога" пры Мінскім электрамеханічным заводзе (1977-78). З 1978 — навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. З 1998 — дацэнт Беларускага лінгвістычнага універсітэта (выкладае на кафедры беларускай мовы і літаратуры і на кафедры тэорыі і практыкі перакладу). Друкуе пераклады з французскай, англійскай, польскай, рускай моваў (творы Ф. Марыяка, А. Маруа, Ф. Саган, М. Друона, М.Эмэ, М. Вюрмсера, Р. Бёрнса, Д. Пендлтона, Б. Клавэля, В. Кандрацьева). Як літаратуразнавец вывучае сувязі беларускай літаратуры з замежнымі, праблемы мастацкага перакладу, рэцэнзуе творы перакладчыкаў. Сааўтар даследавання "Беларуская савецкая літаратура за мяжой" (1988).

**Каладзінскі Міхаіл Аляксандравіч** (19.11.1937, в. Дубіны Ваўкавыскага р-на — 17.04.1997), беларускі артыст тэатра лялек, тэатразнавец, тэатральны педагог. Кандыдат мастацтвазнаўства (1972). Скончыў завочна Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1967). Быў акцёрам Беларускага тэатра лялек (1956-72), працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (1972-85). З 1985 выкладаў у Беларускай акадэміі мастацтваў. Выконваў сцэнічныя ролі Пана, Папа ("Дзед і жораў" В. Вольскага), Васіля-царэвіча ("Іван-царэвіч і шэры воўк" Л. Бычкова), Вярнідуба ("Каваль-Вярнідуб" паводле А. Якімовіча), Караля ("Сярэбраная табакерка" паводае З. Бядулі), Айбаліта ("Доктар Айбаліт" паводле К. Чукоўскага), Люцыўса ("Чортаў млын" паводле Я. Дрды), Пігмаліёна ("Цудоўная Галатэя" Б. Гадара і С. Дарваша), Ката ("Блакітнае шчаня" У. Гюлы), цара ("Янка-цымбаліст і алавянае царства" Э. Брука і Б. Луцэнкі). Вывучаў гісторыю беларускага народнага тэатра, тэатра лялек. Выдаў даследаванне "Тэатр лялек Савецкай Беларусі" (1976). Сааўтар "Гісторыі беларускага тэатра". Т. I (1983).

**Калацэй Марына Яцэкаўна** (дзявоч. Саваняка, 2.09.1967, г. Гродна), беларускі гісторык, педагог. Кадыдат гістарычных навук (1993). Дацэнт (1995). З сям'і рабочага. Вучылася ў СШ №14 і №23 г. Гродна (скончыла ў 1984). У 1984-89 — студэнтка гістфака Гродзенскага універсітэта. У 1990-93 — у аспірантуры на кафедры гісторыі СССР найноўшага часу БДУ. З 1993 выкладае на кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў Гродзенскага універсітэта. Навуковыя публікацыі — з 1988. Даследуе праблемы генацыду яўрэйскага народу ў гады 2-ой сусветнай вайны, нацыянальнай адукацыі этнічных меншасцяў Беларусі.

**Калеснік Уладзімір Андрэевіч** (17.09.1922, в. Сіняўская Слабада Карэліцкага р-на — 15.02.1994), беларускі пісьменнік (крытык і літаратуразнавец, празаік, эсэіст, мемуарыст), педагог. Кандыдат філалагічных навук (1958). Прафесар (1983). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1960). Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1980). З сям'і селяніна-адыходніка, які быў вазаком, плытагонам, млынаром. Скончыў 7-годку ў роднай вёсцы. Вучыўся ў Навагрудскай гімназіі (1936-39), Навагрудскай педагагічнай вучэльні (1939-41). З пачатку вайны настаўнічаў у в.Некрашэвічы (Карэліцкі р-н), вёў падпольную антыфашысцкую работу. З 1942 — у партызанах (быў кулямётчыкам, падрыўніком, камандзірам узвода, начальнікам штаба

атрада), меў раненні. Адзначаны баявымі ўзнагародамі. У 1944 працуе ў ваенкамаце ў Міры (Карэліцкі р-н). У 1944-45 — настаўнік 7-годкі ў в. Лукі (Карэліцкі р-н), інспектар Мірскага РайАНА. Вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педінстытута (1945-49), у аспірантуры на кафедры беларускай літаратуры гэтага інстытута (1949-52). Працаваў загадчыкам кафедры літаратуры Бабруйскага настаўніцкага інстытута (1952-54). Затым — на кафедры беларускай літаратуры Брэсцкага педінстытута (у 1956-88 — загадчыкам кафедры). Друкаваўся з 1949. Вывучаў літаратурнае жыццё Заходняй Беларусі, творчасць Ф. Скарыны, літаратурную Брэстчыну. Выдаў літаратуразнаўчыя манаграфіі і зборнікі: "Паэзія змагання: Максім Танк і заходнебеларуская літаратура" (1959), "Час і песні: Літаратурныя нарысы і партрэты" (1962), "Зорны спеў: Літаратурныя партрэты, нарысы, эцюды" (1975), "Ветразі Адысея: У. Жылка і рамантычная традыцыя ў беларускай паэзіі" (1977), "Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці" (1981), "Лёсам пазнанае: Выбраныя літаратурныя партрэты і нарысы" (1982), "Тварэнне легенды: Літаратурныя партрэты і нарысы" (1987), "Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці" (1990), "Усё чалавечае: Літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы" (1993). Выпусціў дапаможнік для настаўнікаў "Вусная мова і выразнае чытанне" (1962, у сааўт.). Сааўтар даследаванняў "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры" (1964), "Гісторыя савецкай многанацыянальнай літаратуры" (М., 1971), "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры" (1977, на рус. мове), падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ: "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917-1940" (1983), "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1941-1980" (1983), "Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд" (1985, 2-е выд. 1998). Аўтар дакументальных твораў: "Аповесць пра Таўлая" ("Полымя", 1964-65), "Пасланец Праметэя" (1984), "Я з вогненнай вёскі..." (1975, у сааўт., 2-е выд. 1983). Склаў зборнікі паэзіі Заходняй Беларусі: "Сцягі і паходні" (1965), "Ростані волі" (1990). Падрыхтаваў фотаальбомы: "Брэст" (1967), "Між тых палёў... Пра зямлю, што натхняла Міцкевіча" (1968, у сааўт.).У 1997 у "Полымі" надрукавана яго аўтабіяграфічная аповесць "Доўг памяці".

**Каліноўскі Уладзімір Сямёнавіч** (18.06.1889, г. Ваўкавыск — 1940), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, юрыст. З сям'і фельчара. Скончыў у Гродне гімназію (1910), юрыдычны факультэт Пецярбургскага унівесітэта (1914). Пазней — Археалагічны інстытут і Усходнюю акадэмію (грузінскае аддзяленне) у Пецярбургу. Працаваў пры пецярбургскім судовым ведамстве. Быў сябрам Беларускага

камітэта дапамогі ахвярам вайны. З 1917 — загадчык арганізацыйна-інструктарскага аддзела Народнага камісарыята харчавання. У 1921 вярнуўся на радзіму. Працаваў адвакатам у Ваўкавыску. У 1922 абраны дэпутатам сейма Польшчы. У 1923 польскім судом пазбаўлены дэпутацкага мандата, арыштаваны і высланы з Польшчы. У Мінску ў 1924-25 — кіраўнік справамі, юрысконсульт у Беларускім інстытуце сельскай гаспадаркі. У 1925-27 працаваў у ЦВК БССР. У 1927-29 — дацэнт кафедры гісторыі польскай культуры БДУ. У 1930-я рэпрэсаваны, пазней расстраляны. Друкаваўся (часопісы "Полымя", "Савецкае будаўніцтва", газеты "Звязда", "Савецкая Беларусь") па пытаннях эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, Польшчы.

**Калітоўская Клаўдзія Фёдараўна** (12.08.1911, мяст. Уселюб Навагрудскага р-на), беларуская артыстка балета, харэаграфічны педагог. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1967). Скончыла харэаграфічнае аддзяленне беларускага музычнага тэхнікума (1930), Беларускую студыю оперы і балета (1933). Танцавала на сцэне Беларускага тэатра оперы і балета ў 1933-37, 1945-51. У 1951-75 была дырэктарам Беларускай харэаграфічнай вучэльні (Мінск).

**Калюга Віктар Веніямінавіч** (24.09.1961, г. Гродна), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1993). З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ №4 г. Гродна (1978). Працаваў токарам на гродзенскім заводзе "Радыёпрыбор" (1978-79). Служыў у войску у 1979-81 (скончыў Серпухоўскую Вышэйшую ваенна-інжынерную вучэльню ракетных войск стратэгічнага прызначэння). Вучыўся на падрыхтоўчым аддзяленні Гродзенскага універсітэта (1981-82). У 1982-87 — студэнт гістфака гэтага універсітэта. У 1989-92 — аспірант кафедры гісторыі Беларусі Мінскага педінстытута. З 1993 выкладае (з 1997 на пасадзе дацэнта) на кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1991. Вывучае праблемы гісторыі грамадска-палітычнага жыцця, дзейнасці палітычных партый Беларусі і Расіі.

**Каляда Андрэй Андрэевіч** (3.06.1940, в. Панямонь Навагрудскага р-на), беларускі тэатральны педагог. Кандыдат педагагічных навук (1975). Прафесар (1993). З сялянскай сям'і. У 1943 гітлераўцы спалілі вёску, і сям'я пераехала ў Навагрудак. Тут скончыў СШ №1 (1957). Працаваў токарам на машынабудаўнічым заводзе ў г. Горлаўка Данецкай вобл. У 1958-62 вучыўся на акцёрскім факультэце

Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (кіраўнік курса К. Саннікаў). Кіраваў у 1960-62 дзіцячым драматычным калектывам вытворчага аб'яднання "Прамень" (Мінск). Працаваў акцёрам Беларускага тэатра імя Я. Купалы (1962-66). Адначасова з 1963 выкладаў выразнае чытанне на філфаку Мінскага педінстытута. У 1966-89 працуе на кафедры беларускага мовазнаўства гэтага інстытута як выкладчык выразнага чытання. З 1971 вёў на рэспубліканскім тэлебачанні навучальную перадачу "Беларуская літаратура". З 1989 працуе прарэктарам па навучальнай рабоце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (акадэміі мастацтваў), вядзе з 1990 курс "Акцёр драматычнага тэатра, кіно, чытальнік". Выкладае (з 1992) і ў Беларускім гуманітарным ліцэі. Быў у 1966-95 мастацкім кіраўніком тэатра чытальнікаў "Жывое слова" (з 1977 званне "народнага"). Друкуецца з 1967. Аўтар шматлікіх публікацый на тэмы тэорыі і методыкі вуснага чытання. Аўтар падручнікаў і навучальных дапаможнікаў: "Выразнае чытанне" (1970, 3-е выд. 1989), "Выразнае чытанне сатырычных вершаў, баек і драматычных твораў" (1973), "Тэхніка мовы лектара" (1976), "Расказванне і чытанне ў дзіцячым садзе" (1978), "Выразнае чытанне. IV-VII класы" (1982), "Сцэнічная мова" (1993, у сааўт.), "Слоўнік акцёра і рэжысёра" (1995). Складальнік метадычных дапаможнікаў. Перакладае літаратурныя творы з рускай мовы.

**Камінская Эстэр Рахіль** (дзявоч. Гальперн, 7.03.1868, мяст. Поразава Свіслацкага р-на — 27.12.1925), яўрэйская артыстка тэатра і кіно. Заснавальніца яўрэйскага нацыянальнага тэатра. З сям'і кантара. У 80-я працавала на фабрыцы стужак у Варшаве. З 1889 выступае на тэатральнай сцэне. З 1893 — у "Нямецкім тэатры оперы, драмы і камедыі" А. Камінскага, яе мужа (у 1905 афіцыйна прызнаны як яўрэйскі). З 1898 гастралявалі ў Польшчы. З 1903 выязджалі з спектаклямі ў Расію. У 1908-09 — у Пецярбургу, у 1910, 1913 у ЗША. У 1913 у Англіі, Францыі. Вайна 1914 застала ў Адэсе (выступалі ў 1914-15 на рускай мове). У 1917-18 — турнэ па Беларусі, Расіі, Украіне. З 1921 тэатр стала працуе ў Варшаве. Ранні рэпертуар — п'есы кіраўніка тэатра А. Камінскага, яго пераклады М. Горкага, Ф.Шылера, Ж. Мальера. Выконвала галоўныя ролі ў спектаклях па п'есах І. Пераца, Я. Гордзіна, Л. Пінскага, І. Кацнельсон. Асаблівы поспех — драматычныя ролі ў спектаклях "Сірата Хася", "Мірэле Эфрос", "Бяздомная" Я. Гордзіна, "Крэйцарава саната" паводле Л. Талстога, "Дама з камеліямі" паводле А. Дзюма, "Нора", "Здані" Г. Ібсена, "Тэрэза Ракэн" паводле Э.Заля. З 1914 здымалася ў кіно ("Мірэле Эфрос", "Змова" і інш.).

**Камінскі Антон** (3.09.1797, маёнт. Рачуны-Чахоўцы Смаргонскага р-на — 12.11.1885), польскі педагог. З шляхецкай сям'і. Скончыў базыльянскую школу ў Барунах (Ашмянскі р-н), фізічна-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта (1820). Настаўнічаў у жаночым пансіёне ў Вільні. Зняволены па справах філаматаў і высланы ў Камянец Падольскі. Тут выкладаў у павятовай школе. З 1832 служыў у казначэйскай палаце. Затым рэдагаваў мясцовыя "Губернские ведомости". У 1843 вярнуўся ў Рачуны, займаўся гаспадаркаю. У 1856 атрымаў дазвол жыць у Вільні, быў настаўнікам у жаночых навучальных установах. Аўтар польскіх падручнікаў для школы (перакладаў з іншых моваў, перапрацоўваў, пісаў новыя) па геаграфіі, гісторыі Польшчы, польскай літаратуры, алгебры, заалогіі, прыродазнаўстве. Выдаў (з 1826) больш за 20 падручнікаў. Публікаваў артыкулы па этнаграфіі і гісторыі Падолу.

**Камінскі Людвіг** (1786, мяст. Бастуны Воранаўскага р-на — 7.08.1867), польскі паэт-перакладчык. З сям'і генерала. Атрымаў прыватную адукацыю і выхаванне ў Варшаве, затым, у 1800-06 — у Парыжы і Лондане. Вярнуўшыся на радзіму, уступіў у польскае войска, ваяваў на баку Напалеона. У 1815 набыў маёнтак Божыя Горкі на Падляшшы, дзе гаспадарыў і займаўся літаратурнай творчасцю. Удзельнічаў у паўстанні 1830-31. Эміграваў у Прусію. Вярнуўшыся ў 1834, быў арыштаваны і высланы ў Вятку. З 1839 — у сваім маёнтку. Апошнія гады жыцця — у Варшаве. Перакладаў на польскую мову Ламарціна, Т. Таса, О. Голдсміта, А. Попа, Дантэ, Ф.Шылера, Д. Байрана. Пераклады выходзілі асобнымі выданнямі ў 20-40-я. Друкаваў уласныя вершы, рэцэнзіі.

**Кананові́ч Рамуальд** (1.05.1907, в. Устрынь Навагрудскага р-на — 20.07.1957), польскі мастак (жывапісец, графік), мастацкі педагог. У 1919-21, падчас бежанства, вучыўся жывапісу і рысунку ў Разані. З пачатку 30-х браў урокі ў Варшаве. Скончыў настаўніцкую семінарыю ў Вільні (1935), інстытут "рысункаў і ручных прац" у Варшаве (1938). З 1937 — сябра Саюза польскіх мастакоў. У 1937-38 — у Італіі і Францыі. З пачатку вайны — у СССР. З 1942 — у войску Андэрса, быў у Палесціне, Егіпце, ваяваў пад Монтэ-Касіна. Пасля вайны жыў у Англіі. У 1947 пераехаў у Польшчу. Настаўнічаў у Познані, у 1948-51 — у Шчэціне, з 1953 — у Налэнчаве. Пісаў у жанры пейзажа, таксама нацюрморта, партрэта. У 1948 у Шчэціне паказаў работы "З Ізмаіла", "Суэцкі канал", "Канал у Егіпце", "Пейзаж з

поўдня Англіі", "Партрэт маці", "Зіма". Пасля вайны выстаўляўся ў многіх гарадах у Польшчы, у ЗША.

**Канарскі Міхал** (25.09.1784, г. Слонім — 26.04.1861), польскі журналіст, педагог. З збяднелай шляхецкай сям'і. Скончыў школу базыльянаў у Жыровічах (Слонімскі р-н), літаратурна-мастацкі факультэт Віленскага універсітэта (1808). Жыў у Вільні, ствараў інсцэніроўкі для мясцовых труп, перарабляў вядомыя п'есы (выходзілі асобнымі выданнямі ў 1809-18), друкаваўся ў "Dzieńńiku Wileńskim". Быў хатнім настаўнікам. З 1812 — настаўнік пры двары Патоцкіх на Падоле. З 1824 — у Пецярбургу, дзе зблізіўся з групай былых сяброў таварыства шубраўцаў і выдаваў для іх газету "Bałamut" (1831). У 1834 — асеў на Падоле ў маёнтку Вышкавец. Апошнія гады жыў у Адэсе, гандляваў збожжам. Займаўся дабрачыннай дзейнасцю. Вялікія сродкі аддаваў на касцёлы, бальніцы, школы. Дзве трэці свайго маёнтка завяшчаў на культурна-асветныя справы.

**Кандрусевіч Уладзімір Пятровіч** (29.09.1949, г. Гродна), беларускі кампазітар. Сябра Беларускага Саюза кампазітараў (1979). З сям'і краўца і настаўніцы. Скончыў 8 кл. у СШ №10. Вучыўся ў Гродзенскай музычнай школе (1956-64), у Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні (на музычным аддзяленні па класе раяля) у 1964-68. Скончыў Беларускую кансерваторыю па класе фартэпіяна (праф. Л. Юшкевіч) у 1973, па класе кампазіцыі (праф. Я. Глебаў) у 1979, асістэнтуру-стажыроўку ў гэтай кансерваторыі ў 1981. Служыў у войску (1973-74). Працаваў канцэртмайстрам у Беларускім тэатры оперы і балету (1974-75). Творы выконваюцца з 1976. Напісаў балеты "Бураціна" (1979), "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (1981), "Крылы памяці" (паст. 1986), мюзіклы "Нявеста для Марціна" (1988), "Джулія" (паст. 1990), "Залёты" (паст. 1992), "Шклянка вады" (паст. 1995), араторыю "Паданне" (сл. Я. Купалы, 1978), кантаты "Спявачка" (сл. Л. Рашкоўскага, 1977), "Аблачынка з Чарнобыля" (сл. Г. Бураўкіна і А. Разанава, 1989). У галіне аркестравай музыкі — сімфонія "Плач перапёлкі" для хору і аркестра (1992), сімфанічныя паэмы "Трубят трубы городеньскін" (1978), "Hypothesis" (1980), "Гімн сонцу" (1982), канцэрт для фартэпіяна з аркестрам (1980), варыяцыі для габоя і аркестра (1976), Сюіта (1982), Ронда (1977), варыяцыі на народную тэму (1980), дывертысмент для струнных і клавішных інструментаў (1981). Стварыў камерныя творы — для фартэпіяна, для гітары, для флейты і фартэпіяна, для трамбона і фартэпіяна, для валторны і фартэпіяна, для альта і фартэпіяна, для трубы і фартэпіяна. Аўтар

харэаграфічных кампазіцый, хораў (на сл. Я. Купалы, М. Танка, П. Марціновіча, Л. Хельсінга, М.Яснова), рамансаў (на сл. А. Хаяма, У. Шэкспіра, Б. Пастэрнака), песень (на сл. В. Бокава, Л. Пранчака, Г. Пашкова). Напісаў музыку да шматлікіх драматычных, лялечных спектакляў, радыёспектакляў, тэлеспектакляў, мультфільмаў, тэлефільмаў, кінафільмаў ("Яго водпуск", 1981; "Палігон", 1982; "Даруй нам, першае каханне", 1984; "Асабістыя інтарэсы", 1986).

**Канюшкевіч Марыя Восіпаўна** (дзявоч. Дзядовіч, 7.11.1943, в. Погіры Дзятлаўскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Доктар філалагічных навук (1990). Прафесар (1991). З сялянскай сям'і. Скончыла Дзятлаўскую СШ №1. Затым — факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання (1964) і аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака (завочна, 1975) Гродзенскага педінстытута. Выкладала рускую і беларускую мову і літаратуру, нямецкую мову ў Наваельненскай школе рабочай моладзі Дзятлаўскага р-на (1964-70). Была адказным сакратаром камісіі па справах непаўналетніх пры Лідскім гарвыканкаме (1970-72), настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў 8-годцы №5 г. Ліды (1972-75). З 1975 выкладае на кафедры рускай мовы Гродзенскага педінстытута (у 1975 скончыла завочна аспірантуру на кафедры рускай мовы БДУ). З 1980 — загадчыца кафедры рускай мовы Гродзенскага універсітэта (адначасова ў 1992-93 — дэкан філфака Гродзенскага універсітэта). Вывучае граматычныя катэгорыі рускай і беларускай моваў у іх супастаўляльных адносінах. Друкуецца з 1976. Выдала (на рус. мове) кнігі: "Сінтаксіс блізкароднасных моваў: тоеснасць, падобнасць, адрозненні" (1989), "Я рускай вучуся..." (1990, у сааўт.), "Сінтаксіс рускай і беларускай моваў: падобнасць і адрозненне" (1994, у сааўт.), "Руская мова. Сінтаксіс". Ч. І. (1996, у сааўт.).

**Капытка Аляксандр Іванавіч** (29.03.1939, в, Несутычы Навагрудскага р-на), беларускі філосаф, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1982). Дацэнт (1991). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы, у 7-годцы ў в. Куравічы (Навагрудскі р-н). Затым — у Навагрудскай педагагічнай вучэльні (1953-57), на гістарычна-геаграфічным факультэце Мінскага педінстытута (1957-62). Настаўнічаў у школах Пінскага і Кобрынскага раёнаў на Брэстчыне (1962-70). У 1970-73 — аспірант кафедры філасофіі Мінскага педінстытута. З 1973 працуе ў Гродзенскім педінстытуце (універсітэце) — ст. выкладчыкам кафедры філасофіі ў 1973-83 (адначасова ў 1975-81 — дэкан факультэта педагогікі і методыкі

пачатковага навучання), загадчыкам кафедры навуковага камунізму (1983-86), сакратаром парткама універсітэта (1986-89). З 1989 — дацэнт кафедры філасофіі Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1971. Даследуе пытанні гісторыі філасофіі, навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, навуковага светапогляду. Сааўтар навучальных дапаможнікаў для студэнтаў: "Асновы філасофіі: Курс лекцый" (Гродна, 1994), "Гісторыя філасофіі. Навучальны дапаможнік для ВНУ" (Гродна, 1997).

**Каравайчык Павел Гіляравіч** (15.06.1896, мяст. Любча Навагрудскага р-на — 21.11.1937), беларускі культурны дзеяч, пісьменнік (крытык, публіцыст, паэт). З сялянскай сям'і. Скончыў у Навагрудку прыватную рэальную школу. З 1911 вучыўся ў Мінскай гімназіі (скончыў у 1916 у Маскве ў сувязі з эвакуацыяй). Паступіў у Ваенна-медычную акадэмію ў Петраградзе. Удзельнік з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый (сакавік 1917) у Мінску. Працаваў тут у газеце "Вольная Беларусь" (1917). У 1918-19 — сакратар, пазней загадчык выдавецкага аддзела Белнацкама (Петраград), супрацоўнік газеты "Чырвоны шлях". Рэдагаваў тут газету "Дзянніца" (1919). У 1919-21 — у Чырвонай Арміі. Вярнуўшыся ў Беларусь, чытаў лекцыі па беларусазнаўстве на настаўніцкіх курсах ў Бабруйску і Мінску (1921-23). Працаваў у газеце "Савецкая Беларусь" (1922-26). Адначасова вучыўся на медфаку БДУ (скончыў у 1925). У сярэдзіне 20-х распрацоўваў па заданні Інбелкульту беларускую медычную тэрміналогію. Працаваў у клініцы нервовых хваробаў на медфаку БДУ (1926-30). У 1931 рэпрэсаваны і высланы ў Чувашыю, дзе працаваў лекарам. Пазней расстраляны. Друкаваўся з 1917. Пісаў артыкулы на тэмы беларускага нацыянальнага адраджэння, літаратурна-выдавецкай справы, асветы, рэцэнзаваў новыя творы літаратуры і тэатра, выступаў з вершамі.

**Карака Віктар Іванавіч** (29.07.1948, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1975). Скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут (1972). Працаваў кіраўніком майстэрні ў Белдзяржпраекце (1972-75), у БелНДІП горадабудаўніцтва (1975-85). З 1985 — галоўны архітэктар праектаў у Белдзяржпраекце. Адначасова з 1989 — кіраўнік творчай майстэрні пры Беларускім Саюзе архітэктараў. Сярод работ: домік на гоначным кальцы "Баравая" ў Мінску, рэканструкцыя Мінскай СШ №4 (у сааўт.), моладзевы цэнтр "Мінск", комплекс міжкалгаснага піянерлагера на воз. Шавіно Віцебскай вобл., гандлёва-грамадскі цэнтр у мікрараёне № 6 Наваполацка, гасцініца моладзевага турызму ў Брэсце, кінатэатр

з кафэ і танцзалаю ў Наваполацку (у сааўт.), гараж і адміністрацыйны будынак Управы ўнутраных спраў Мінгарвыканкама на вул. Апанскага ў Мінску.

**Каранеўскі Аляксандр Рыгоравіч** (5.07.1939, в. Мілушава Навагрудскага р-на), беларускі краязнавец, музеязнавец, журналіст. Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1981). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Нягневічы (Навагрудскі р-н) у 1957. У 1957-60 — курсант Рыжскай і Ліепайскай мараходных вучэльняў. Працаваў матарыстам на рыбалоўных траўлерах (1960). Служыў на флоце (1960-63). У 1963 паступіў на гістфак БДУ, у 1964 перавёўся на завочнае аддзяленне (скончыў у 1969). Працаваў рулявым-матарыстам на Нёманскім эксплуатацыйным участку (Гродна), інструктарам ДСТ "Ураджай" Гродзенскага р-на (1964-66), настаўнікам гісторыі і геаграфіі Даргуньскай 8-годкі Гродзенскага р-на (1966-67), дырэктарам Ашмянскага раённага краязнаўчага музея (1967-80). З 1980 — у рэдакцыі Ашмянскай раённай газеты "Красное знамя" ("Ашмянскі веснік") — адказным сакратаром, намеснікам рэдактара, загадчыкам аддзела. Друкуецца як краязнавец з 1968. Аўтар многіх часопісных, энцыклапедычных, газетных артыкулаў пра гісторыю Ашмяншчыны, яе мясціны і людзей.

**Каратынскі Вінцэсь Аляксандравіч** (15.06.1831, в. Селішча Карэліцкага р-на — 7.02.1891), беларускі і польскі паэт, публіцыст, краязнавец. З сялянскай сям'і. Адукацыю набываў самастойна. Працаваў хатнім настаўнікам у в. Валоўка на Навагрудчыне. Пазнаёміўшыся з У. Сыракомлем, пераехаў у 1850 у арандаваны ім маёнтак Залучча на Стаўбцоўшчыне, быў памочнікам-сакратаром У. Сыракомля З 1853 — у Барэйкаўшчыне ля Вільні. З 1857 — у Вільні. Удзельнік віленскага гуртка А. Кіркора. Уваходзіў у склад Віленскай археалагічнай камісіі, Статыстычнага камітэта ў Вільні. Друкаваўся з 1856. Супрацоўнічаў у часопісе "Teka Wileńska", быў карэспандэнтам "Gazety Warszawskiej". Падчас паўстання праследаваўся расійскімі ўладамі. З 1866 — у Варшаве, дзе займаўся журналістыкай і беларускім краязнаўствам. Супрацоўнічаў у "Gazecie Warszawskiej", "Encyklopedii Powszechnej". Рэдагаваў "Kalendarz JaworowsKiego" (1869-77). Быў сябрам рэдкалегіі часопісаў "Wieniec" (1878), "Tygodnik Powszechny" (1878-85),"Tygodnik Ilustrowany" (1886-91). Вершы друкаваў з 1856. Выдаў у Вільні (на польскай мове) зборнік вершаў "Чым хата багата, тым рада" (1857), паэму "Таміла" (1858), вершаваны памфлет "Выпіў Куба да Якуба" (1859). Беларускія вершы не змог

апублікаваць. Друкаваў краязнаўчыя нарысы, успаміны, літаратуразнаўчыя артыкулы, пераклады з французскай, рускай, нямецкай, чэшскай моваў.

**Карловіч Мечыслаў** (11.12.1876, маёнт. Вішнева Смаргонскага р-на — 8.02.1909), польскі кампазітар, дырыжор. З шляхецкай сям'і (бацька — мовазнавец, этнограф, музыказнавец). У 1882 выехалі ў Гейдэльберг (Германія), дзе з 1883 наведваў школу, вучыўся ігры на скрыпцы. У 1885-86 вучыўся ў Празе і Дрэздэне. У 1887 сям'я пераехала ў Варшаву, тут працягваў вучобу (засвойваў ігру на фартэпіяна, гармонію). З 1893 — вольны слухач прыродазнаўчага факультэта Варшаўскага універсітэта. Адначасова з 1894 браў урокі кампазіцыі. У 1895-1903 вучыўся кампазіцыі ў Берліне, наведваў лекцыі па музыкалогіі і філасофіі ў Берлінскім універсітэце (кожнае амаль лета ў 1895-1903 жыў у Вішневе). З 1901 — у Варшаве, дзе ў 1902 стварыў сімфанічны аркестр, з якім выступаў як дырыжор у Варшаве, Берліне, Львове і інш. Першыя спробы кампазіцыі -у 1891 (творы для скрыпкі, фартэпіяна)^ ранняй творчасці — лірычныя песні для сольнага выканання. Пазней — пераважна музыка для інструментаў, аркестра. Аўтар сімфанічных паэм, канцэрта для скрыпкі з аркестрам, менуэта для струннага квартэта, п'ес для фартэпіяна, серэнады для віяланчэлі і фартэпіяна, фугаў і санат для фартэпіяна, серэнады для струннага аркестра, пахавальнага Марша для духавога аркестра, рамансаў, вакальных дуэтаў. У сімфанічным трыпціху "Адвечныя песні" (1904-06) і "Літоўскай рапсодыі" выкарыстаў беларускія народныя песні, запісаныя ім на радзіме.

**Карнасевіч Рамуальд Марцінавіч** (18.09.1884, г. Гродна — пасля 1940), рускі пісьменнік (паэт, празаік). З сям'і дырыжора аркестра, музычнага педагога. Скончыў у Гродне гарадскую вучэльню (1897). Затым жыў у Пецярбургу, быў вучнем у інструментальнай майстэрні, працаваў на механічным заводзе, бадзяжнічаў. Этапаваны паліцыяй у Гродна. Быў памочнікам машыніста на параходзе. З 1905 — у войску. Арыштоўваўся за ўдзел у падпольнай дзейнасці эсэраў. Зноў жыў у Гродне. У 1912 пераехаў у ЗША. Жыў у Н'ю-Йорку, Элізабет-порце. Працаваў грузчыкам, матросам, рабочым на заводах. Друкаваўся з 1920 у перыёдыках "Новое русское слово", "Русский голос", "Русский вестник". Выдаў у Н'ю-Йорку зборнікі вершаў, апавяданняў: "Зорныя лейцы" (1924), "Кандальны перазвон" (1925), "Вечны кліч" (1927). У творах моцныя матывы роднай зямлі, прыроды.

**Карнілава Людміла Аляксандраўна** (4.12.1954, г. Гродна), беларускі гісторык, музеязнавец. З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №1 г. Гродна (1972), гістарычна-педагагічны факультэт Гродзенскага педінстытута (1977). З 1977 працуе ў Беларускім музеі гісторыі рэлігіі і атэізму (гісторыі рэлігіі) ст.навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела каталіцызму, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, з 1993 — дырэктарам. Стваральнік першых экспазіцый музея. Стажыравалася як музеязнавец у Расіі, Польшчы, Украіне, Літве. Вывучае гісторыю каталіцкіх ордэнаў, цудатворных абразоў на Беларусі. Аўтар многіх публікацый у навуковых выданнях, энцыклапедыях.

**Кароткі Уладзімір Георгіевіч** (2.01.1956, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларускі літаратуразнавец, культуролаг, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1984). Дацэнт (1987). З сям'і інтэлігенцыі. Дзяцінства і юнацтва прайшло ў Слоніме, тут скончыў СШ (1973). У 1978 скончыў аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Затым працаваў настаўнікам ваеннай падрыхтоўкі і фізкультуры ў Глоўсевіцкай СШ Слонімскага р-на (завочна вучыўся ў аспірантуры ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі). З 1982 — навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры. З 1987 выкладае на кафедры беларускай літаратуры БДУ. У 1991-96 — намеснік дэкана філфака БДУ. Адначасова з 1993 загадчык кафедры тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры, з 1994 — загадчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры. Друкуецпа з 1980 (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіне, Літве). Вывучае старажытную беларускую літаратуру і культуру. Выдаў даследаванне "Творчы шлях Мялеція Сматрыцкага" (1987, на рус. мове), сааўтар падручніка для ВНУ "Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд" (1985, 2-е выд. 1998). Складальнік зборніка матэрыялаў пра паслядоўнікаў Ф. Скарыны. Перакладчык на беларускую мову старажытных літаратурных крыніц.

**Карпінскі Віктар Вайцехавіч** (12.10.1948, г. Гродна), беларускі філосаф, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1989). Дацэнт (1994). З сям'і службоўцаў. Скончыў у Гродне СШ №10. Скончыў філасофскае аддзяленне гістфака БДУ (1975). Працаваў загадчыкам кабінета філасофіі ў Гродзенскім медінстытуце (1975-80). У 1980 скончыў завочна аспірантуру на кафедры гісторыі філасофіі БДУ. У 1980-91 выкладаў на кафедры філасофіі Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута (быў выкладчыкам, ст. выкладчыкам, дацэнтам). У 1991-96 — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Гродзенскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў. З 1996 — дацэнт кафедры філасофіі

Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1981. Даследуе светапогляд Э. Ажэшкі, праблемы гісторыі філасофіі, філасофскай антрапалогіі.

**Карповіч Аляксандр Вікенцевіч** (8.03.1901, в. Трэшчыны Карэліцкага р-на — 10.05.1986), беларускі выдавец. З беднай сялянскай сям'і. На радзіме вучыўся ў школе. У 1923 перабраўся ў Чэхаславакію, вучыўся на лясным факультэце Пражскага універсітэта (скончыў у 1931). Вярнуўшыся дамоў, служыў у польскім войску (1931-32). З вясны 1933 — у Вільні, дзе працуе рэдактарам-выдаўцом "Беларускай газеты" (1933-34), што была органам КПЗБ. Арыштаваны польскімі ўладам і зняволены ў турме (1934-37). Пазней жыў у Вільні, быў беспрацоўным. Пры Саветах займаў пасаду інжынера ў Навагрудскім лясгасе. З 1942 узначальваў лясніцтва ў Шчучыне. Рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і зняволены ў канцлагеры (1945-52). Затым працаваў майстрам на лесанарыхтоўках у Комі АССР. У 1954 выехаў у Польшчу да сям'і. Жыў і працаваў у Варшаве.

**Карповіч Марыюш** (20.01.1934, маёнт. Чамброва Навагрудскага р-на), польскі мастацтвазнавец, мастацкі педагог. Доктар мастацтвазнаўства габілітаваны (1966). Прафесар (1979). З сям'і памешчыка. Скончыў Варшаўскі універсітэт (спецыяльнасць "гісторыя выяўленчага мастацтва") у 1955. Працуе ў Інстытуце гісторыі мастацтваў Варшаўскага універсітэта, выкладае гісторыю польскага выяўленчага мастацтва новага часу. Даследуе праблемы развіцця мастацтва барока, польска-італьянскія, польска-швейцарскія мастацкія сувязі. Чытаў лекцыі і друкаваўся як мастацтвазнавец у Італіі, Швейцарыі, Францыі, Германіі, Аўстрыі, Канадзе. Аўтар шматлікіх даследаванняў, сярод якіх — "Творчая дзейнасць Мікельанжала Палоні ў Польшчы" (Варшава, 1967), "Мастацтва асветніцкага сарматызму. Антыкізацыя і класікізацыя ў варшаўскім асяродку часоў Яна III" (Варшава, 1970, 2-е выд. 1986), "Мастацтва Варшавы другой паловы XVII ст" (Варшава, 1975), "Польскае мастацтва XVII ст." (Варшава, 1983), "Польскае мастацтва XVIII ст" (Варшава, 1985), "Каралеўскі замак Вазаў у Варшаве. Мастацкія вартасці" (Варшава, 1987), "Барока ў Польшчы" (Варшава, 1988), "Дзіўныя шляхі польскага мастацтва" (Быдгашч, 1994). Сябра шэрагу замежных акадэмій. Эксперт у галіне выяўленчага мастацтва Рады Еўропы (Страсбург).

**Карповіч Фелікс** (26.05.1898, в. Вайдацішкі Астравецкага р-на — 23.12.1964), польскі артыст тэатра. У канцы 20-х і ў 30-я служыў у Інтэндантуры ў Гродне і выступаў тут у гарнізонным тэатры. У 1939

інтэрнаваны Саветамі. Пазней — у войску Андэрса ў СССР. Быў намеснікам кіраўніка тэатра 5-ай дывізіі. З 1942 — на Блізкім Усходзе. Выступаў у тэатры 2-га польскага корпуса ў Палесціне, Егіпце, Італіі (характарныя, камедыйныя ролі ў п'есах Ж. Мальера, А. Фрэдры і інш.). З 1947 у польскім тэатры ў Лондане. У 1958 пераехаў у Польшчу, выступаў на сцэне тэатра ў Беластоку (польская класіка, п'есы А. Чэхава і інш.). У 1963 пакінуў тэатр.

**Карскі Іван Ануфрыевіч** (1837, в. Лаша Гродзенскага р-на - ?), беларускі этнограф, фалькларыст. З сям'і псаломшчыка. Скончыў у Латы пачатковую школу, у Жыровічах (Слонімскі р-н) — духоўную вучэльню (1853) і паступіў у Жыровіцкую духоўную семінарыю. Але ў 1855 спыніў заняткі з-за стану здароўя. Служыў псаломшчыкам у в. Капцёўка (Гродзенскага р-на) у 1855-61, у Шаўлях, Расіенах, Драўлянах Ковенскай губ. Затым — у в.Сабакінцы (Шчучынскі р-н) у 1898, мястэчку Вялікая Бераставіца (1899-1908) З 2-ой паловы 80-х дасылаў фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы (запісы абрадавых песень, казак, легендаў, апісанне беларускага народнага жылля, адзення, страў, звычаяў) П. Шэйну, уключаныя ў яго кнігу "Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-заходняга краю". Т. 1-3 (СПб, 1887-1902).

**Карскі Яфім Фёдаравіч** (1.01.1861, в. Лаша Гродзенскага р-на — 29.04.1931), беларускі філолаг-славіст, мовазнавец, літаратуразнавец, фалькларыст і этнограф, палеограф, археограф, бібліёграф, педагог. Заснавальнік навуковага беларусазнаўства. Доктар філалагічных навук (1896). Прафесар (1894). Акадэмік Пецярбургскай Акадэміі навук (1916). Акадэмік Чэшскай Акадэміі навук (1929). З сям'і настаўніка пачатковай школы. У 1868 пераехалі ў в. Ятра (Навагрудскі р-н), дзе вучыўся ў пачатковай школе. Затым — у Мінскай духоўнай вучэльні і Мінскай духоўнай семінарыі. У 1881-85 — студэнт Нежынскага гістарычна-філалагічнага інстытута. Выкладаў рускую мову і літаратуру, стараславянскую мову ў 2-ой Віленскай гімназіі (1885-93). У 1893-1916 — выкладчык лінгвістычных дысцыплінаў у Варшаўскім універсітэце (у 1905-10 — рэктар універсітэта). Рэгулярна ездзіў па Беларусі (у 1886-1905) для вывучэння мовы, побыту, этнічных межаў краю. Дапамагаў пісьмовымі парадамі Беларускаму навукова-літаратурнаму гуртку студэнтаў Пецярбургскага універсітэта. Падтрымліваў тэатральную дзейнасць І. Буйніцкага. У 1905-17 рэдагаваў часопіс "Русский филологический вестник". У 1916 выехаў у Пецярбург, але неўзабаве — у Мінск. Быў дэлегатам

Усебеларускага кангрэса (снежань 1917). У 1918 чытаў лекцыі ў Беларускім педагагічным інстытуце. Распрацоўваў праект стварэння БДУ, пазней Інбелкульта. З 1920 — у Петраградзе, дзе быў сябрам Управы і Прэзідыуму Акадэміі навук, дырэктарам Музея антрапалогіі і этнаграфіі, прафесарам філфака Петраградскага (Ленінградскага) універсітэта, рэдактарам часопіса "Известия Отделения русского языка и словесности Российской Академии наук". У 1924 — удзельнік І-га з'езда славянскіх географаў і этнографаў у Празе. Тады ж пабываў у роднай вёсцы, у Гродне. Наведаў Прагу ў 1926, быў у Югаславіі, Польшчы. Друкаваўся з 1883. Выдаў даследаванні і навучальныя дапаможнікі: "Агляд гукаў і формаў беларускай мовы" (М., 1885), "Народныя беларускія вяселлі ў Ашмянскім павеце Віленскай губерні..." (Вільня, 1888), "Граматыка старажытнай царкоўнаславянскай мовы параўнальна з рускай" (Вільня, 1888, 19-е выд. Сергіеў-Пасад, 1917), "Да пытання пра распрацоўку старой заходнерускай гаворкі" (Вільня, 1893), "Да гісторыі гукаў і формаў беларускай мовы" (Варшава, 1893), "Пра мову гэтак званых літоўскіх летапісаў" (Варшава, 1894), "Асаблівасці пісьма і мовы Мсціслававага Евангелля" (Варшава, 1895), "Заходнерускія пераклады псалтыра ў XV-XVII ст." (Варшава, 1896), "Праграма для збірання асаблівасцяў беларускай гаворкі" (СПб, 1896, 2-е выд. 1916), "З лекцый па славянскай кірылаўскай палеаграфіі" (Варшава, 1897), "Матэрыялы для вывучэння паўночнамаларускіх гаворак, а таксама пераходных ад беларускіх да маларусах". Вып. 1-2. (СПб, 1898-1903), "Узоры славянскага кірылаўскага пісьма з X па XVII ст." (Варшава, 1901, 2-е выд. 1902), "Беларусы". Т. 1-3. (Варшава, М., Петраград, 1903-22), "Да пытання пра этнаграфічную карту беларускага племя" (СПб, 1903), "Разбор гістарычна-этнаграфічных прац Е. Р. Раманава па Паўночна-заходнім краі..." (СПб, 1904), "Справаздача пра паездку ў Беларусь у 1903 г." (СПб, 1905), "Этнаграфічная карта беларускага племя" (Пг., 1917), "Беларуская гаворка: нарысы народнай мовы з гістарычным асвятленнем" (Пг., 1918), "Беларускі народ і яго мова" (1920), "Што патрэбна будзе зрабіць па беларускай мове і літаратуры?" (1921), "Руская дыялекталогія" (Л., 1924), "Нарыс навуковай распрацоўкі рускай мовы ў межах СССР" (Л., 1926), "Пра некаторыя асаблівасці беларускай мовы" (Кракаў, 1927), "Славянская кірылаўская палеаграфія" (Л., 1928), "Назіранні ў галіне сінтаксісу Лаўрэнцеўскага спісу летапісу" (Л., 1929), "Руская праўда" па найстаражытным спісе" (Л., 1930). Апублікаваў больш за 1000 работ, у тым ліку 96 асобных выданняў.

**Карчэўскі Уладзімір Максімавіч** (16.07.1943, в. Клепачы Свіслацкага р-на), беларускі спартыўны педагог. Дацэнт (1987). Заслужаны трэнер Беларусі (1992). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў СШ (1960). Вучыўся на спартыўным факультэце Беларускага інстытута фізічнай культуры (1960-64). Працаваў выкладчыкам у Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (1964-67), выкладчыкам кафедры фізвыхавання Гродзенскага медінстытута (1967-70), загадчыкам кафедры фізвыхавання Гродзенскага педінстытута (універсітэта) у 1970-83. У 1983-87 выкладаў у Інстытуце навукі і тэхналогіі спорту ў Алжыры. Быў дырэктарам Гродзенскага тэхнікума фізкультуры (1987-89), загадчыкам кафедры спартыўных гульняў Гродзенскага універсітэта (1989-94). У 1994-99 — дэкан факультэта фізічнай культуры гэтага універсітэта. Аўтар многіх навуковых публікацый у галіне методыкі трэніровачнага працэсу па валейболе (друкуецца з 1980). Суддзя ўсесаюзнай (вышэйшай нацыянальнай) катэгорыі па валейболе (1978).

**Карчэўскі Юльян Восіпавіч** (снежань 1806, мяст. Ашмяны — студзень 1833), беларускі мастак. З сям'і адваката. Скончыў гімназію ў Вільні. Вучыўся на юрыдычным факультэце Віленскага універсітэта, дзе адначасова браў урокі жывапісу ў Я. Рустама. У 1824-26 працягваў вучобу на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта. З 1826 — за мяжой, удасканальваўся ў жывапісе ў Дрэздэне, Амстэрдаме, Парыжы, Лондане, Рыме. Пісаў пераважна жанравыя кампазіцыі. Выстаўляўся з 1830. Сярод твораў: "Руская хуткая пошта", "Яўрэйскае пахаванне", "Яўрэйская карчма", "Яўрэі ў дарозе", "Пастой", "Маці Божая", "Ян III пад Венай", "Турак на кані".

**Карыцкі Кароль** (3.11.1702, в. Дзітрыкі Лідскага р-на — 10.12.1789), беларускі грамадска-рэлігійны дзеяч, педагог, пісьменнік. Доктар філасофіі (1736). Брат М. Карыцкага. З шляхецкай сям'і. Вывучаў рыторыку ў Вільні, педагогіку ў Слуцку (1719-20), філасофію ў Полацку (1720-23). Выкладаў граматыку і паэтыку ў Вільні і Варшаве. У 1726-30 вывучаў тэалогію ў Варшаўскім калегіуме, дзе пазней (1730-32) быў настаўнікам тэалогіі. У 1733-36 выкладаў у настаўніцкай семінарыі ў Слуцку, у 1736-39 — у Віленскай акадэміі, дзе ўзначальваў кафедру філасофіі. Быў прапаведнікам, выкладчыкам тэалогіі ў Варшаве (1738-46). З 1746 — у Рыме, быў І-ым сакратаром польскай асістэнцыі езуітаў. У 1763-65 — рэктар Нясвіжскага калегіума. Пасля скасавання ордэна езуітаў зняволены ў Рыме (1773-76). Выступаў ў падтрымку ордэна езуітаў у Беларусі,

патрабаваў яго самастойнасці тут. Друкаваў (на лацінскай мове) казанні, панегірыкі.

**Карыцкі Міхал** (7.09.1714, в. Дзітрыкі Лідскага р-на — 10.03.1781), беларускі асветнік, паэт, педагог. Доктар філасофіі (1745). Брат К. Карыцкага. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў калегіумах у Бабруйску, Слуцку, Вільні, у Віленскай духоўнай акадэміі (1736-38), у Варшаве (1739-41). Служыў ксяндзом. У 1744-46 — выкладчык калегіумаў у Мінску, Вільні, у 1746-48 — у Слуцкай настаўніцкай семінарыі. Быў езуіцкім прапаведнікам у Мінску, Вільні, Варшаве, Драгічыне, Пінску, Бабруйску. У 1750-ыя — прафесар Віленскай акадэміі, яе сакратар, кіраўнік яе бібліятэкі. У 1770-ыя — рэктар школ Мінскага ваяводства. Пісаў на лацінскай мове. Аўтар сатырычнай паэмы "Птушыны сойм", у якой паказаў норавы буйнай шляхты Рэчы Паспалітай. Выйшаў яго зборнік "Песні" (Полацк, 1817). Пісаў оды, вершы, казкі, элегіі, пасланні, пародыі.

**Карэнда Іван Арсеневіч** (17.09.1950, в. Крывічы Іўеўскага р-на), беларускі паэт, грамадска-культурны дзеяч. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1996). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 7-годку, СШ — у в. Морына Іўеўскага р-на. У 1967-71 вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута. Настаўнічаў у СШ у в. Ракавіны Шчучынскага р-на (1971-72). Быў інструктарам, 2-ім сакратаром Шчучынскага райкама камсамола (1972-74). Вучыўся на аддзяленні журналістыкі Вышэйшай камсамольскай школы пры ЦК ВЛКСМ у Маскве (1974-76). Працаваў загадчыкам аддзела ў рэдакцыі газеты "Чырвоная змена" (1976-77). Затым у партыйных органах — у Маскоўскім райкаме КПБ Мінска, у Мінскім гаркаме КПБ, у ЦК КПБ (1977-91). Пасля — у Дзяржаўным камітэце па друку (1991-92), намеснікам міністра інфармацыі (1992-94), намеснікам міністра культуры і друку (1994-96). З 1996 - начальнік Галоўнай сацыяльнай управы Выканкама Саюза Беларусі і Расіі. Першыя вершы — у Шчучынскай раённай газеце "Савецкая вёска" (1971), з 1975 друкаваўся ў рэспубліканскіх выданнях. Выпусціў зборнік лірыкі "Белы наліў" (1995). Друкаваў апавяданні, эсэ.

**Каспяровіч Галіна Іванаўна** (дзявоч. Санюк, 5.12.1947, в. Кастровічы Слонімскага р-на), беларускі філосаф, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1981). Дацэнт (1985). З сям'і службоўцаў. Скончыла Слонімскую СШ №1 (1966), філасофскае аддзяленне

гістфака БДУ (1971). З 1971 выкладае на кафедры філасофіі (філасофіі і метадалогіі навукі) БДУ. Чытае курсы філасофіі, культуралогіі. У 1974-77 вучылася ў аспірантуры на гэтай кафедры. Друкуецца з 1975. Даследуе праблемы гнасеалогіі, філасофіі культуры, чалавека і свядомасці.

**Касцюк Міхаіл Паўлавіч** (26.03.1940, в. Масцішча Навагрудскага р-на), беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук (1980). Прафесар (1987). Акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1996). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Масцішчанскай пачатковай школе, скончыў Рацімлянскую 7-годку (Навагрудскі р-н), Навагрудскую педагагічную вучэльню. Вучыўся на беларускім аддзяленні гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута (1959-63). Працаваў дырэктарам Касадворскай 8-годкі Навагрудскага р-на (1963-64). Служыў у войску (1964-65). Быў сакратаром камітэта камсамола Гродзенскага педінстытута (1965-66). Скончыў аспірантуру ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1969) і працаваў тут у 1969-75 (з 1970 — вучоным сакратаром інстытута). У 1975-81 — вучоны сакратар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Затым зноў — у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук (намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, у 1989-99 — дырэктарам, адначасова з 1995 — загадчыкам аддзела). Друкуецца з 1963. Даследуе сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя праблемы гісторыі Беларусі XX пераважна стагоддзя. Выдаў даследаванні (на рус. мове): "Ідэйна-палітычнае выхаванне сялянства. 1926-1937" (1979), "Працоўны ўклад сялянства ў перамогу і ўмацаванне сацыялізму. На матэрыялах БССР" (1986), "Сацыялістычныя каштоўнасці працаўнікоў вёскі: гісторыя, сучаснасць, перспектывы" (1989). Сааўтар даследаванняў: "Гісторыя Беларускай ССР". Т. 4. (1975), "Перамога калгаснага ладу ў БССР" (1981, на рус.мове), "Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР". Т. 4 (1985), “Нарысы гісторыі Беларусі" Ч. 1-2 (1994-95). Галоўны рэдактар кнігі "Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага р-на" (1996).

**Касцялкоўская-Зындарм Вільгельміна** (1844, г. Гродна — 27.04.1926), польская пісьменніца (празаік, літаратуразнавец, перакладчыца, публіцыст). З сям'і службоўца, літаратара. Атрымала добрую хатнюю адукацыю. Скончыла ў Вільні дзяржаўны пансіянат для дзяўчат шляхецкага паходжання. Жыла ў Гродне. Займалася літаратурнай творчасцю. Пісьменніцкі дэбют — апавяданне "Залатая графінька" (1877), напісанае сумесна з Э. Ажэшкай. Выйшлі ў

Варшаве зборнікі яе апавяданняў "У паўцені" (1885). "Адна з многіх" (1903), "Абразкі" (1904), "Архаічныя казкі і навелы" (1906). Перакладала на польскую мову творы з англійскай, амерыканскай, французскай, італьянскай, чэшскай літаратур. Пераклады суправаджала літаратуразнаўчымі прадмовамі. Найбольш грунтоўная — пра Ч. Дзікенса — уступ да перакладу "Давіда Каперфільда" (1889). Пісала пра творчасць Ю. Славацкага, У. Сыракомля А. Свентахоўскага, К. Норвіда, М. Канапніцкай, Э. Ажэшкі, І. Ходзькі, пра развіццё польскай, нямецкай, іспанскай літаратур. Апублікавала даследаванне "Шляхта на Літве". Змяшчала рэпартажы з жыцця Гродна ў польскай прэсе (у пецярбургскім часопісе "Kraj" вяла рубрыку "Лісты з-над Нёмана").

**Касцялкоўскі Станіслаў** (24.10.1881, г. Гродна — 2.09.1960), польскі і беларускі гісторык, педагог. Доктар філасофіі (1905). Прафесар (1927). З сям'і лекара, паўстанца 1863. Скончыў у Гродне гімназію. Вучыўся (з 1900) на гістарычна-філалагічным факультэце Варшаўскага універсітэта, праз год перавёўся на філасофскі факультэт Кракаўскага універсітэта (скончыў у 1905). Выкладаў гісторыю і польскую мову ў І-ай і 2-ой гімназіях, у рэальнай вучэльні ў Вільні. З 1915 арганізоўвае на Віленшчыне і Гродзеншчыне польскія школы. У 1921-39 працаваў на кафедры гісторыі Польшчы Віленскага універсітэта. Кіраваў тут у 1933-39 краязнаўчым гуртком, які аб'ядноўваў студэнтаў з Гродзеншчыны. Быў адным з арганізатараў (1906), кіраўніком (1938) Таварыства сяброў навук у Вільні. У 1939-41 даваў у Вільні прыватныя ўрокі. У чэрвені 1941 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і зняволены ў канцлагеры на паўночным Урале. У 1942 вызвалены. Выехаў у Іран, дзе да сакавіка 1945 выкладаў на польскіх настаўніцкіх курсах, у польска-іранскім народным універсітэце. У 1945-50 жыў у Бейруце (Індыя), стварыў тут польскі навуковы інстытут і пры ім 2-гадовыя курсы паланістыка З 1950 — у Англіі, выкладаў у гімназіі ў Пітсфардзе. Друкаваўся (з 1901) у Вільні, Бейруце, Каіры, Тэгеране, Лондане, Парыжы. Выдаў "Успаміны Якуба Гейштара з 1857-1865 гг." (Вільня, 1913), "З даследаванняў гісторыі каралеўскіх эканомій у Літве" (Вільня, 1914), "Тысяча гадоў гісторыі Польшчы" (Тэгеран, 1944), "Выбраныя праблемы з гісторыі Польшчы..." Ч. 1-4, (Тэгеран, 1944-45), "Гісторыя земляў Вялікага княства Літоўскага". Т. 1-4, (Лондан, 1950-58). Яго падручнік па метадалогіі гісторыі выдадзены ў Бейруце ў 1948 і ў Лондане ў 1954. У 1970-71 у Лондане выпушчана ў 2-х кнігах яго праца "Антоні Тызенгаўз, надворны літоўскі падскарбі".

**Каханоўскі Антон** (сапр. Каган, 12.01.1887, г. Навагрудак — 14.05.1943), польскі дырыжор. Брат Ф. Каханскага. Вучыўся ў музычнай школе ў Кіеве. У 1905 пачаў працу дырыжора ў Мінску ("Галька" С. Манюшкі і інш.). Да 1915 быў дырыжорам у вандроўных польскіх трупах Я. Мышкоўскага, Б. Баляслаўскага, Ф. Фялінскага. У 1915-17 — у польскай трупе аперэты ў Маскве. Пазней кіраваў вайсковымі аркестрамі. У 1920-21 — у аперэце ў Познані, затым у аперэце і рэвю ў Варшаве (у "Новым" тэатры, у "Аперэце-Вадэвілі", у "Навінах", "Знічы"). У 1931 перабраўся ў Вільню, дзе быў музычным кіраўніком і дырыжорам у тэатры "Лютня" да 2-ой сусветнай вайны. Загінуў ад рук гітлераўцаў.

**Каханскі Фелікс** (18.05.1889, г. Навагрудак — 1943), польскі дырыжор. Брат А. Каханоўскага. Скончыў у 1911 Варшаўскі музычны інстытут. Быў дырыжорам у вандроўных трупах у Познані, Варшаве. З 1932 — у Вільні, у тэатры "Лютня". У 1939-41 кіраваў аркестрам у Друскеніках (Літва). Загінуў ад рук гітлераўцаў.

**Кац Менке** (1906, мяст. Міхалішкі Астравецкага р-на — 1991), яўрэйскі паэт. Жыў тут у дзяцінстве. Скончыў мясцовы хедэр. Рана пачаў зарабляць на жыццё. У 1920 выехаў у ЗША. З пачатку 20-х друкаваўся ў яўрэйскіх газетах у ЗША. Тут выходзілі яго шматлікія кнігі паэзіі. Першы зборнік — "Тры сястры" (1932). Затым былі кнігі вершаў "Мястэчка палае" (1938), "Адказ маёй бабулі Баданы" (1939) і інш. Пісаў на ідзіш і англійскай мовах.

**Кайко Сяргей Іванавіч** (1.01.1967, в. Радзявічы Мастоўскага р-на), беларускі правазнавец, педагог. Кандыдат юрыдычных навук (1995). З сям'і інтэлігенцыі. Скончыў СШ у в.Гудзевічы Мастоўскага р-на (1983). Вучыўся на юрыдычным факультэце Гродзенскага універсітэта ў 1983-90 (у 1985-87 служыў у войску). З 1990 выкладае (з 1995 на пасадзе дацэнта) на кафедры дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права гэтага універсітэта. Завочна скончыў тут аспірантуру. Друкуецца з 1991. Даследуе праблемы пенсійнага забеспячэння, прававога рэгулявання банкаўскай дзейнасці.

**Кацнельсон Іцхок** (11.05.1886, мяст. Карэлічы — 3.05.1944), яўрэйскі пісьменнік (паэт, перакладчык, драматург), педагог. З сям'і пісьменніка. Пісаў на іўрыце і ідзіш. У 1894-96 вучыўся ў хедэры у мяст. Згеж (ля Лодзі), займаўся самаадукацыяй. Працаваў на ткацкай фабрыцы ў Лодзі. У 1911-39 кіраваў яўрэйскім дзіцячым садам і

сярэдняй школай (з выкладаннем на іўрыце), заснаванымі ім у Лодзі. Складаў для іх чытанкі, падручнікі, пераказы Біблii. Арганізаваў (у 1912) тэатральную трупу і ставіў свае камедыі, біблейскія драмы (п'есы ішлі і ў Вільні, Варшаве). Пісаў лібрэта опер. У 1924 і 1935 выязджаў у Ізраіль, дзе напісаў шэраг папулярных пазней песень. Перакладаў на іўрыт Г. Гейнэ, Г. Ібсена. З верасня 1939 — у Варшаве, дзе восенню 1942 ізаляваны ў гета. Тут займаўся асветніцкай дзейнасцю — выкладаў у нелегальнай гімназіі, арганізаваў тэатр, для якога пісаў п'есы, песні. Быў адным з кіраўнікоў падпольнага выдавецтва "Дрор" ("Свабода'[1]) і аднайменнага часопіса. У 1943 атрымаў візу ў Гандурас і быў перавезены ў спецлагер у г. Бітэль (Францыя). У красавіку 1944 дэпартаваны ў Асвенцім, дзе загінуў. Першы верш апублікаваў у дзіцячым часопісе "Олам катан" у 1903. Першы зборнік паэзіі "Змярканне" выйшаў у 1910. У час вайны вёў дзённік, які ўвайшоў у зборнік "Апошнія творы. 1940-1944" (Тэль-Авіў, 1956). У 1944 завяршыў паэму "Песня забітага яўрэйскага народу" (апубл. у 1945).

**Качан Кастусь** (Канстанцін Іванавіч, 4.03.1950, в. Лаўрышава Навагрудскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1987). У роднай вёсцы скончыў 8-годку. У 9-10 кл. вучыўся ў Шчорсах (Навагрудскі р-н). У 1968-70 служыў у войску. Вучыўся на фізічным факультэце БДУ (1970-75). Працаваў настаўнікам фізікі ў школе ў Мінску (1975-76), мастаком у мінскім кінатэатры "Кастрычнік" (1977-80), у сістэме гандлёвай рэкламы ў Мінску (1980-87). Піша пераважна краявіды родных ваколіц, пейзаж спалучае з тэматычнай кампазіцыяй, стварае кампазіцыйныя партрэты. Удзельнічаў у выставах (з 1980) у Беларусі, Германіі, Францыі, Італіі, Чэхаславакіі, Югаславіі, В'етнаме, Фінляндыі, Расіі. Сярод твораў: "Зімовы вечар" (1982), "Стрыгалі" (1982), "Прыцемкі" (1984), "Летнія клопаты" (1984), "Удавец" (1984), "Апошні шлях хрысціяніна" (1984), "Зямля мая, зямля маіх продкаў" (1984), "Бабіна лета" (1984), "Нядзеля" (1984), "Раніца на хутары" (1985), "Перад навальніцай" (1985), "Краявід з мёртвым дрэвам" (1988), "Нядзеля ў Нягневічах" (1988), "Дзяды" (1989). "Правінцыя" (1989), "Лета ў Вуглах" (1990), "На зыходзе дня" (1990), "Хрэсны ход ва Уселюбе" (1990), "Навагрудак" (1990), "Базарны дзень у Навагрудка" (1990), "Пад абразом" (1990), "Сляпы" (1990), "Мястэчка Мір" (1991), "Вечар у Слабодцы" (1991), "Дарога на хутар" (1991), "Зіма ў Навагрудку" (1991). Творы захоўваюцца ў музеях і прыватных калекцыях у Беларусі, Расіі, у калекцыях у Германіі,

Францыі, Бельгіі, Літве, Вялікабрытаніі, Югаславіі, Ізраілі, Польшчы, Паўднёвай Карэі.

**Качан Уладзімір Уладзіміравіч** (14.11.1958, г. Гродна), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1988). З сям'і службоўцаў. Скончыў у Гродне СШ №2. Быў мастаком-афармляльнікам. Затым скончыў аддзяленне манументальнага жывапісу Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1987). Працуе ў Гродне ў мастацкіх майстэрнях. У выставах — з 1980 (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі). Піша станковыя і манументальныя творы. Сярод станковых (сюжэтна-тэматычныя, умоўныя кампазіцыі, партрэты): "Прысвячэнне мацярынству" (1986), "Абсцыненцыя XX стагоддзя" (1989), "Экалагічная інспірацыя" (1989), "Ахвярная чара — XX стагоддзе" (1990), "Вяртанне з містэрый" (1991), "Сады Эдема II" (1993), "Экуменістычнае тварэнне" (1993), "З пажаданнямі росквіту" (1994), "Мая Галгофа, мой Іерусалім" (1994), "Сашэсце Св. Духа на Апосталаў" (1994), "Пераламленне хлеба па дарозе Эмаўс" (1994), "Давыд-Гарадоцкая мадона" (1995), "Абняслаўленне Залатога Цяльца" (1995), "Тыя, каго вядзе прарок" (1995). "Аўтапартрэт з інфантаю" (1996), цыкл з 14-ці гістарычных палотнаў "Вялікі Гродзенскі Збор II-га тысячагоддзя" (1997). У манументальным жывапісе (тэмпера, свінец; у вітражах — шкло, свінец): роспіс у палітэхнічным інстытуце ў Ноўгарадзе (1985), вітражы ў міжнародным студэнцкім кафэ "Гаўдэамус" у Мінску (1987), роспіс у СШ №81 г. Мінска (1987), вітражы ў холах і сталоўцы Гродзенскай тытунёвай фабрыкі (1989), вітражы ў гродзенскім аддзяленні Нацыянальнага банка РБ (1990), роспіс у рэстаране "Эмка" ў Беластоку (1992), мазаіка фасада і вітражы ў прафілакторыі Гродзенскага ВА "Хімвалакно" (1993-94), вітражы ў фае і роспіс у аперацыйнай зале Аграпрамбанка ў Гродне (1995). Работы зберагаюцца ў калекцыях у Італіі, ЗША, Грэцыі, Ізраілі, Германіі, Польшчы, Галандыі.

**Кашуцкая Людвіка** (псеўд. Лясота, дзявоч. Ягалкоўская, 1869, в. Поплава Шчучынскага р-на — 27.10.1928), польская грамадска-культурная дзяячка, пісьменніца (празаік, публіцыст), педагог. Скончыла гімназію ў Варшаве. У 1891-94 настаўнічала, арганізоўвала асветныя гурткі сярод рабочых, рух па эмансіпацыі жанчын ў Польшчы. У 1895 стварыла курсы для выхавальніц прадшкольных установаў і кіравала імі. У Парыжы ўвайшла ў студэнцкую арганізацыю сацыялістычнай арыентацыі. У 1899 адкрыла Бюро пасрэдніцтва працы для настаўніц і выхавальніц, якім кіравала. Стварыла і ўзначаліла польскае аб'яднанне "Раўнапраўе жанчын" (1907).

Удзельнічала ў арганізацыі з'езду жанчын Польшчы (1917), на якім прачытала даклад "Уплыў вайны на справы жанчын". У 1919 увайшла ў гарадскую раду Варшавы і ўдзельнічала ў працы яе асветнай камісіі (1919-27). Пісала аповесці, апавяданні, творы для дзяцей. Друкавалася з 1893. Прызнанне прынесла аповесць "З далечыні" (1911). Удзельнічала ў выданні польскага "Дзіцячага садзіка" — дадаткі да часопіса "Przegląd Pedagogiczny". Па смерці выйшаў зборнік яе артыкулаў і прамоваў "Пра жанчыну сучаснасці і жанчыну будучыні" (Варшава, 1929).

**Каяла Уладзімір Іванавіч** (2.01.1949, мяст.Скідзель Гродзенскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1997). З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ у Скідзелі. У 1967-71 вучыўся на філфаку (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) Гродзенскага педінстытута, служыў у войску (1972-73). Працаваў дырэктарам 8-гадовай школы ў в.Старая Дубавая Гродзенскага р-на (1973-75), сакратаром Гродзенскага райкама камсамола (1975-77), дырэктарам СШ у в. Каменка Гродзенскага р-на (1977-90), выкладчыкам кафедры рускай і замежнай літаратуры Гродзенскага універсітэта (1990-93). З 1993 выкладае на кафедры беларускай літаратуры гэтага універсітэта (з 1998 — на пасадзе дацэнта). Друкуецца як літаратуразнавец з 1992. Навуковыя інтарэсы звязаны з праблемамі старажытнай беларускай, літаратуры, развіццём жанру беларускай байкі.

**Кебіч Людміла Антонаўна** (дзявоч. Вайтулевіч, 17.07.1951, в. Краснае Сяло Ваўкавыскага р-на), беларускі музычны педагог, паэтка. З сям'і настаўнікаў. Вучылася ў Краснасельскай СНІ, адначасова ў мясцовай музычнай школе (клас фартэпіяна). У 1967-71 — у Маладзечненскай музычнай вучэльні, на аддзяленні "тэорыя музыкі". У 1971-72 працавала ў Ваўкавыскай дзіцячай музычнай школе. З 1972 выкладае музычныя дысцыпліны ў Гродзенскай культурна-асветнай вучэльні (вучэльні мастацтваў). У 1981 завочна скончыла аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта. З 1996 — намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Гродзенскай вучэльні мастацтваў. Вершы друкуе з 1961 (у часопісах "Маладосць", "Беларусь", "Работніца і сялянка", газеце "Чырвоная змена" і інш.). Выдала зборнік лірыкі "Па музычных законах" (Ваўкавыск, 1996). Актыўна супрацоўнічае з беларускімі кампазітарамі. На яе словы напісалі песні В. Войцік, А. Елісеенкаў, Д. Даўгалёў, Я. Паплаўскі, гродзенскія кампазітары (Г. Кебіч выдаў у Гродне зборнік

песень на яе словы "Чароўны лістапад", 1998). Выступае на канцэртнай сцэне як выканаўца песень.

**Кец Яўген Аркадзевіч** (22.04.1947, в. Талочкі Гродзенскага р-на), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1994). З сям'і рабочых. У 1950 пераехалі ў Гродна, дзе скончыў СШ №5 (1965). Служыў у войску (1966-68), уваходзіў у баскетбольную каманду СКА Мінска. Працаваў электрыкам на заводзе гандлёвага машынабудавання ў Гродне (1968-70). Вучыўся ў Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце (1970-75). Быў трэнерам-выкладчыкам па баскетболе ў дзіцяча-юнацкай спартшколе №7 г. Гродна (1975-94). У 1994-98 — галоўны трэнер спортклуба "Гродна-93". Падрыхтаваў спартсменаў, якія сталі прызёрамі еўрапейскіх, усесаюзных, нацыянальных чэмпіянатаў па баскетболе.

**Кікель Павел Васілевіч** (20.05.1944, в. Браносава Карэліцкага р-на), беларускі філосаф, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1976). Дацэнт (1979). З сялянскай сям'і. Скончыў Турэцкую СШ Карэліцкага р-на. Вучыўся на фізічна-матэматычным факультэце Мінскага педінстытута ў 1962-69 (у 1964-67 служыў у войску). Працаваў асістэнтам кафедры матэматычнага аналізу гэтага інстытута (1969-72). Затым — аспірант кафедры філасофіі Мінскага педінстытута (1972-75). Выкладаў на гэтай кафедры ў 1975-83 (адначасова намеснік дэкана матэматычнага факультэта ў 1979-83). У 1983-85 быў дарадцам рэктара Камагуэйскага універсітэта (Куба). У 1985 вярнуўся на кафедру філасофіі ў Мінскі педінстытут, працуе дацэнтам (у 1986-94 быў намеснікам дэкана дэфекталагічнага факультэта). Даследуе філасофскія праблемы матэматыкі, яе месца ў форме навуковага пазнання. Выдаў у г. Камагуэй на іспанскай мове працы: "Асаблівасці навуковага кіравання грамадствам Кубы" (1984), "Філасофскія праблемы сучаснай матэматыкі" (1984), "Філасофскія праблемы прыродазнаўства" (1985), "Як вывучаць творы класікаў марксізму-ленінізму" (1985), "Дыялектычны матэрыялізм — метадалагічная аснова сучаснага прыродазнаўства" (1986). У Мінску выйшлі (на рус. мове) даследаванні: "Матэматызацыя навуковых ведаў" (1989), "Матэматыка і сацыяльны прагрэс" (1990), "Матэматычнае пазнанне рэчаіснасці" (1995). Аўтар метадычных дапаможнікаў па філасофіі для студэнтаў.

**Кірвель Іван Восіпавіч** (8.01.1950, в. Арцішы Шчучынскага р-на), беларускі географ, педагог. Кандыдат геаграфічных навук (1983).

Дацэнт (1988). З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў роднай вёсцы (1963), СШ у Васілішках Шчучынскага р-на (1966). Працаваў рабочым на Гродзенскім мясакамбінаце (1966-67). Вучыўся на геаграфічным факультэце БДУ (1967-72). Настаўнічаў у Забалацкай СШ Воранаўскага р-на (1972-73). Быў інжынерам-гідролагам у Беларускім праектным Інстытуце меліярацыі ў Мінску (1973-76). У 1976-79 — аспірант Цэнтральнага Інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў Мінводгаса СССР. Працаваў затым у Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі (1979-84). З 1984 — дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі Беларускага педагагічнага універсітэта. Вывучае праблемы аховы і рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў Беларусі. Выдаў манаграфіі (на рус. мове): "Сажалкі Беларусі" (1987), "Добраўпарадкаванне малых вадазбораў штучнымі вадаёмамі" (1989), "Вадасховішчы Беларусі" (1991), навучальныя дапаможнікі: "Палявыя практыкі па геаграфічных дысцыплінах і геалогіі" (1989), "Фізічная геаграфія Беларусі" (1995).

**Кірвель Часлаў Станіслававіч** (9.03.1945, в. Мякішы Шчучынскага р-на), беларускі філосаф, педагог. Доктар філасофскіх навук (1990). Прафесар (1992). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў 8-годцы ў в. Барэйшышкі (Шчучынскі р-н), у СШ у в. Васілішкі (Шчучынскі р-н). Закончыў сярэднюю адукацыю ў школе рабочай моладзі №6 Калінінграда, дзе працаваў газазваршчыкам на суднарамонтным заводзе (1963-64). Вучыўся на філасофскім факультэце Ленінградскага універсітэта ў 1964-72 (у 1964-67 служыў у войску), у аспірантуры на гэтым факультэце ў 1972-76 (адначасова працаваў у Дзяржаўным музеі гісторыі Ленінграда рабочым, дворнікам, пажарнікам). З 1977 выкладаў на кафедры марксізму-ленінізму палітэхнічнага інстытута ў Камсамольску-на-Амуры. З 1980 — на кафедры філасофіі Гродзенскага універсітэта (з 1981 — загадчык кафедры). Друкуецца з 1975. Вывучае праблемы ўтапічнай свядомасці і сацыяльнай філасофіі. Выдаў даследаванні і навучальныя дапаможнікі: "Утапічная свядомасць: сутнасць, сацыяльна-палітычныя функцыі" (1989, на рус. мове), "Вобразы будучыні: утопія і антыўтопія ў сучасным свеце. Навучальны дапаможнік" Ч. 1-2 (Гродна, 1994, на рус. мове), "Асновы філасофіі: Курс лекцый" (Гродна, 1994, у сааўт.), "Нарысы філасофіі сацыяльнага дзеяння. Навучальна-метадычны дапаможнік для студэнтаў і аспірантаў" (1994, у сааўт., на рус. мове), "Гуманізм і сацыяльныя дзеянні людзей. Навучальны дапаможнік для студэнтаў і аспірантаў" (1996, у сааўт., на рус. мове), "Гісторыя філасофіі. Навучальны дапаможнік для ВНУ" (Гродна, 1997, у сааўт.).

**Кірэенка Кацярына Рыгораўна** (дзявоч. Лішык, 8.09.1940, мяст. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-на), беларускі географ, эканаміст, педагог. Кандыдат эканамічных навук (1981). Дацэнт (1991). У Казлоўшчыне скончыла СШ (1957). У Оршы вучылася ў школе ФЗВ (1957-58) пры мясцовым ільнокамбінаце, дзе затым працавала прадзільшчыцай. Скончыла геаграфічны факультэт БДУ (1964). Настаўнічала ў Капыльскім р-не (1964-66). Была навуковым супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага музея (1966-70). У 1970-87 працавала малодшым, затым ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларусі (у 1980 завочна скончыла тут аспірантуру). З 1987 — дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі Беларускага педагагічнага універсітэта. Друкуецца з 1977 (у Беларусі, Расіі, Літве, Латвіі, Эстоніі). Даследуе праблемы эфектыўнасці развіцця і размяшчэння вытворчых сіл, рацыянальнага прыродакарыстання. Выдала манаграфію "Водныя рэсурсы — фактар размяшчэння прамысловасці" (1981, на рус. мове). Сааўтар даследаванняў (на рус. мове): “Сацыяльная інфраструктура — вынік і фактар эфектыўнасці вытворчасці" (1982), "Сацыяльная інфраструктура і сацыялістычны лад жыцця" (1983), "Рэгіянальныя праблемы развіцця вытворчай інфраструктуры і міжгаліновых вытворчасцяў" (1985), "Сацыяльная інфраструктура рэгіёну" (1986), "Спалучэнне галіновага і тэрытарыяльнага кіравання эканомікай саюзнай рэспублікі" (1991), навучальных дапаможнікаў: "Эканамічная і сацыяльная геаграфія Рэспублікі Беларусь" Ч. I-II (1993), "Сацыяльна-эканамічная геаграфія Рэспублікі Беларусь" (1997).

**Кіслы Уладзімір Нікадзімавіч** (2.01.1957, в. Дубна Мастоўскага р-на), беларускі мастак-рэстаўратар, жывапісец. "Заслужаны для польскай культуры" (1991). Скончыў СШ у Дубне. Вучыўся на геаграфічным факультэце БДУ ў 1974-79 (адначасова вучыўся ў мастацкай студыі пры БДУ). З 1979 працуе ў Рэспубліканскім музеі гісторыі рэлігіі (Гродна), спачатку навуковым супрацоўнікам, з 1984 — мастаком-рэстаўратарам. Стажыраваўся ў Львове, Варшаве, Мінску, Пецярбургу. Выканаў жывапісныя працы, муляжы, макеты, рэканструкцыі для музеяў Гродна, Каўнаса, Брэста, Смаргоні, Навагрудка. Рэстаўраваў мэблю, кнігі, прадметы археалогіі, ліццё, алейны жывапіс (абразы для храмаў Гродна, Шчучына, мяст. Лунна Мастоўскага р-на, в. Адамавічы Гродзенскага р-на). Выканаў рэканструкцыі-ілюстрацыі для гістарычных выданняў М. Ткачова, У. Арлова, В. Чаропкі, А. Краўцэвіча, А. Трусава, для перыёдыкі. Як жывапісец працуе ў жанры партрэта, пейзажа, тэматычнай кам-

пазіцыі. Удзельнічае ў выставах з 1980 (у Беларусі, Польшчы, Расіі, Германіі). Творы захоўваюцца ў прыватных калекцыях у Польшчы, Германіі, Італіі, Расіі, Японіі, Ізраілі, ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Ватыкане, Францыі, Швейцарыі.

**Кічко Станіслаў Баляслававіч** (21.07.1945, в. Свірыды Шчучынскага р-на), беларускі мастак-графік. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1987). З сялянскай сям'і. Скончыў 7 кл. Касцянеўшай школы (Шчучынскі р-н), СШ № I г. Шчучына. Служыў у войску (1962-65). Вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педінстытута (1965-70). Выкладаў маляванне і чарчэнне ў СШ № 18 г. Гродна (1970-71). З 1971 працуе ў мастацка-вытворчых майстэрнях Гродна. Удзельнічае ў выставах з 1971 (у Гродне, Мінску, Віцебску, Варшаве, Вроцлаве, Шчэціне, Беластоку, Кракаве). Практыкуе пераважна змешаныя тэхнікі. Сярод работ: "Дзяўчына ў чырвоным" (1978), "Мураванка" (1980), "Сон" (1980), "Раніца" (1980), "Чаканне" (1985), "Сімфонія маіх палёў" (1986), "Лета" (1987), "Лён" (1987), "Дзіцячы садок" (1987), "Месячная ноч" (1988), "Кастусь Каліноўскі" (1988), "Эліза Ажэшка" (1988), "Зыгмунт Серакоўскі" (1988), "Фрэдэрык Шапэн" (1988), "Вуліца Замкавая" (1988), "Касцёл Базыльянак" (1988), "Францішканскі касцёл" (1988), "Батароўка" (1988), "Лідскі замак" (1989), "Валеры Урублеўскі" (1989), "Рамуальд Траўгут" (1989), "Людвік Нарбут" (1990), "Антоні Тызенгаўз" (1990), "Кафедральная базіліка ў Гродне" (1991), "Св. Максімільян Кольбэ" (1995), "Малы Ісус" (1994), "Сімфонія гродзенскіх касцёлаў" (1994), "Родны кут" (1995), "Памяць" (1996), "Навагрудак" (1997), "Дзевятоўка" (1997), "Стары і новы Гродна" (1997). Творы захоўваюцца ў калекцыях у Беларусі, Польшчы, Германіі, Галандыі, Бельгіі, Італіі, Францыі, Аўстрыі, Англіі, ЗША. З'яўляецца старшынёй таварыства мастакоў пры Саюзе палякаў у Беларусі.

**Кліменка Іван Дзямідавіч** (3.12.1951, мяст. Юрацішкі Іўеўскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1985). З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў Юрацішскай СШ (1958-67), у Мінскай мастацкай вучэльні (1967-71), на мастацкім факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1972-77). З 1977 працаваў у Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. З 1997 выкладае ў Беларускай акадэміі мастацтваў. Працуе ў галіне станковага і манументальнага жывапісу. Жанры станковага жывапісу (алей) — сюжэтна-тэматычная, умоўная кампазіцыі, партрэт, пейзаж. Удзельнік выстаў з 1977 (у Беларусі, Літве, Чэхіі, Расіі, Германіі,

Даніі, Швецыі, Аўстрыі, ЗША). Сярод твораў: "Бераг" (1989), "З начэй маіх" (1990), "Чалавек і лялька" (1991), "Сіні гук" (1991), "Май у Інсбруку" (1991), "У кавярні" (1992), "Пранікненне белага і чырвонага" (1992), "Хрыстос і Пётра" (1993), "Лёгкі сум" (1993), "Таямнічасць восеньскага дня" (1993), "Жнівень" (1994), "Саламон і царыца Саўская" (1995), манументальны роспіс (энкаўстыка) выконваўся ў бібліятэцы Інстытута народнай гаспадаркі ў Мінску (1977-78), Доме культуры мяст. Турэц Карэліцкага р-на (1987), у Доме Саветаў у Шчучыне (1989). Работы захоўваюцца ў музейных зборах і калекцыях у Беларусі, Расіі, Літве, Чэхіі, Германіі, Італіі, Аўстрыі, Францыі, Даніі, ЗША, Ізраілі.

**Клімовіч Адольф** (1900, в. Клюшчаны Астравецкага р-на — 24.11.1970), беларускі грамадскі дзеяч, журналіст, выдавец. З сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую беларускую гімназію, Карлаў універсітэт у Празе (1928), актыўна дзейнічаў тут у Аб'яднанні беларускіх студэнтаў. Настаўнічаў у беларускай гімназіі і беларускай настаўніцкай семінарыі ў Вільні (1928-31). Прымаў удзел у рабоце Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Рэдагаваў часопіс "Самапомач" (1932-39), супрацоўнічаў з часопісам "Калоссе". У 1938 высылаўся ўладамі Польшчы з Вільні. Удзельнічаў у выданні газеты "Крыніца" (1939-40). Падчас вайны — у Беларускай народнай самапомачы ў Лідзе. Рэпрэсаваны савецкімі ўладамі ў 1952, вызвалены з канцлагера ў 1956. Жыў у Вільні. Былі выдадзены ў Вільні ў 1932 яго рэферат, прачытаны на з'ездзе БХД ("І культура, і палітыка"), "папулярны нарыс кааператыўнай самапомачы" — "Лекі на здзекі", зборнік гаспадарчых рэкамендацый "Земляробская чытанка. 1-я частка".

**Клімовіч Уладзімір Аркадзевіч** (9.08.1967, в. Ігнатаўны Лідскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, драматург, паэт), бард. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). Скончыў Голдаўскую СШ Лідскага р-на (1984), Беларускую акадэмію мастацтваў (1990). Займаецца прадпрымальніцкай, фундуе маладых літаратараў. Друкуецца з 1989. Выдаў зборнікі апавяданняў "Выратаванне безданню" (1992), "Лаліта і кактус" (1997). У кнігу "Той, хто будуе горад" (1997) увайшлі апавяданні, п'еса.

**Клімуць Яраслаў Іванавіч** (10.02.1940, в. Вострава Мастоўскага р-на), беларускі крытык і літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1979). Дацэнт (1982). Сябра Саюза

беларускіх пісьменнікаў (1996). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Востраўскай пачатковай школе, у Гудзевіцкай СШ Мастоўскага р-на. У 1958-59 працаваў у калгасе, у сельскай краме. У 1959-62 — у войску. Скончыў філфак БДУ (1967). У 1967-68 — настаўнік 8-годкі ў в. Дубаўцы (Ваўкавыскі р-н), у 1968-69 — у рэдакцыі уздзенскай райгазеты "Чырвоная зорка". У 1969-75 выкладаў беларускую мову і літаратуру у Ліцвянскай СШ на Уздзеншчыне. З 1975 працуе на кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага педінстытута (універсітэта). Завочна скончыў аспірантуру ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі. У1986-99 — дэкан філфака Магілёўскага педінстытута (універсітэта). Першы літаратурна-крытычны выступ — у раённым друку ў 1967, у рэспубліканскім публікуецца з 1974. Аўтар літаратуразнаўчых дакладаў, артыкулаў, аглядаў, рэцэнзій. Выдаў кнігу "Жыццёвасць традыцый: Якуб Колас і руская савецкая паэзія" (1985).

**Клюня Уладзімір Леанідавіч** (24.05.1953, в. Вялікія Екняты Астравецкага р-на), беларускі эканаміст, педагог. Кандыдат эканамічных навук (1981). Дацэнт (1986). З сям'і службоўца. Скончыў СШ у Астраўцы. Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута (1970-75), у аспірантуры на кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў БДУ — у 1975-79 (у 1976-77 служыў у войску). З 1979 выкладае на кафедры эканамічнай тэорыі БДУ, з 1991 — загадчык гэтай кафедры. Чытае лекцыі ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі (з 1983). Друкуецца з 1979. Вывучае аграрныя адносіны, структурны рух беларускай эканомікі на сучасным этапе, яе дзяржаўнае рэгуляванне ва ўмовах пераходу да рынку. Выдаў у Маскве манаграфію "Уплыў навукова-тэхнічнага прагрэсу на пераўтварэнне матэрыяльнай асновы сельскагаспадарчай вытворчасці" (1984). Выпусціў навучальныя дапаможнікі для ВНУ: "Эканамічная тэорыя як навука" (1993), "Асновы эканамічнай тэорыі" (1995). Выйшлі брашуры: "Удасканаленне эканамічнага механізму гаспадарання ў аграпрамысловым комплексе" (1982), "Удасканаленне матэрыяльна-эканамічнай базы сельскай гаспадаркі ва ўмовах аграпрамысловай інтэграцыі" (1985).

**Кобрынец Пётр Мікалаевіч** (25.08.1946, в. Дубна Мастоўскага р-на — 3.11.1994), беларускі гісторык, педагог. Доктар гістарычных навук (1988). Прафесар (1989). З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ у Дубне (1964). Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута (1964-68). Нядоўга настаўнічаў у в. Глядавічы Мастоўскага р-на. Вучыўся ў аспірантуры ў БДУ ў 1968-72 (у 1968-69 служыў у войску). Працаваў

выкладчыкам Мінскага педінстытута замежных моваў (1972-73). Затым — на кафедры гісторыі СССР і БССР Гродзенскага педінстытута (у 1974-77 — намеснік дэкана гістарычна-педагагічнага факультэта), з 1981 быў загадчыкам кафедры гісторыі СССР і БССР. У 2-ой пал. 80-х -дактарант Інстытута гісторыі Акадэміі навук СССР. З 1992 — загадчык кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў Гродзенскага універсітэта. Друкаваўся з 1968. Вывучаў савецкую ідэалогію на матэрыяле дзейнасці школ Беларусі падчас вайны 1941-45. Выдаў на рускай мове работы: "Патрыятызм настаўнікаў і школьнікаў Беларусі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў" (1980, у сааўт.), "Магутны фактар мужнасці і гераізму: Інтэрнацыянальна-патрыятычнае выхаванне працоўных Беларусі ў тыле ворага. 1941-1944" (1985), "Пра нацыянальныя адносіны у Савецкай Беларусі" (Гродна, 1992, у сааўт.). Аўтар брашуры "Піянеры лясных школ Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (1973).

**Коган Пётр Сямёнавіч** (1.06.1872, г. Ліда — 2.05.1932), рускі літаратуразнавец і крытык, тэатразнавец, педагог. Прафесар (1918). З сям'і лекара. Скончыў гімназію ў Магілёве (1890), гістарычна-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта (1896). З пач. XX ст. — дырэктар Вышэйшых адукацыйных курсаў П. Лесгафта ў Пецярбургу. З 1910 — прыват-дацэнт кафедры германа-раманскай філалогіі Пецярбургскага універсітэта. З 1917 — выкладчык заходнееўрапейскай, рускай літаратур у І-ым, 2-ім Маскоўскіх універсітэтах, іншых ВНУ. Прэзідэнт Акадэміі мастацкіх навук (1921-29). Адначасова працаваў у Наркамасветы РСФСР. Друкаваўся з 1895 (у часопісах: "Русская мысль", "Современный мир", "Образование" і інш.). Выдаў "Нарысы па гісторыі заходне-еўрапейскіх літаратур". Т. 1-3 (СПб, 1903-10, 12-е выд. Т. 1-2. М., 1941-43), "Нарысы па гісторыі старажытных літаратур. Т. І. Грэчаская літаратура" (СПб, 1907, 7-е выд. М., 1937), "Нарысы па гісторыі найноўшай рускай літаратуры". Т. 1-3 (СПб., 1908-12), "Бялінскі і яго час" (М., 1923), "Рамантызм і рэалізм у еўрапейскай літаратуры XIX ст." (М., 1923, 2-е выд. 1923), "А. М. Горкі"(М.-Л„ 1928), "А. С. Грыбаедаў" (М.-Л., 1928), "А. П. Чэхаў" (М.-Л., 1929), "Вільям Шэкспір" (М.-Л., 1931).

**Койта Казімір Канстанцінавіч** (4.03.1942, в. Макараўны Бераставіцкага р-на), беларускі філосаф, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1980). Дацэнт (1988). З сям'і селяніна, краўца. Скончыў Макараўскую 7-годку, Старасекскую СШ Бераставіцкага р-на. У 1959 паступіў на факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання

Гродзенскага педінстытута, у 1961 выключаны за рэлігійныя перакананні. Працаваў у Гродне рабочым на заводзе "Аўтазапчастка" (1961-62), на абутковай фабрыцы "Нёман" (1962-72). Завочна вучыўся на філасофскім аддзяленні гістфака БДУ (1966-72). З 1972 выкладае на кафедры філасофіі і навуковага камунізму (кафедры гуманітарных навук з 1993) Гродзенскага медінстытута. Друкуецца з 1976. Вывучае праблемы рэлігіі і вольнадумства ў Беларусі. Выйшлі яго кнігі: "З гісторыі вольнадумства і атэізму ў Беларусі" (1978, у сааўт., на рус. мове), "У пошуках ісціны" (1982, на рус. мове), "Размова ў адкрытую пра каталіцызм" (1985, на рус. мове), "Каталіцызм у Беларусі: традыцыяналізм і прыстасаванне" (1987, у сааўт., на рус. мове), "Асноўныя хрысціянскія плыні і фармаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў" (Гродна, 1993, у сааўт. ).

**Конан Уладзімір Міхайлавіч** (23.04.1934, в. Вераскава Навагрудскага р-на), беларускі філосаф, крытык і літаратуразнавец, культуролаг. Доктар філасофскіх навук (1982). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1982). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984). З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў в. Плянта (Навагрудскі р-н), СШ — у Вераскаве (1952). Быў у школе камсоргам (1952-53), працаваў у мясцовым калгасе (1953-54). Вучыўся на гістфаку БДУ (1954-59). Затым — настаўнік, дырэктар 8-годкі на Вілейшчыне. Скончыў аспірантуру ў Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі (1964). Працаваў у гэтым інстытуце ( у 1984-86 — загадчык сектара эстэтыкі і сацыяльнай псіхалогіі). З 1991 працуе загадчыкам аддзела тэорыі і гісторыі культуры Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра (Мінск). Друкуецца з 1963. Вывучае праблемы развіцця грамадскай і філасофскай думкі, эстэтыкі, літаратуразнаўства, рэлігіі, перыядычнага друку, асветы Беларусі. Выдаў даследаванні: "Развіццё эстэтычнай думкі Беларусі. 1917-1934" (1968), "Дэмакратычная эстэтыка Беларусі. 1905-1917" (1971, на рус. мове), "Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі" (М., 1972, у сааўт.), "Адам Бабарэка. Крытыка-біяграфічны нарыс" (1976), "Ад Рэнесансу да класіцызму: Станаўленне эстэтычнай думкі Беларусі ў XVI-XVIII стст." (1978, на рус. мове), "Эстэтычная думка Савецкай Беларусі: Асноўныя этапы станаўлення і развіцця" (1978, на рус. мове). "Асвета і педагагічная думка ў Беларусі" (1985, у сааўт.), "Праблемы мастацтва і эстэтыкі ў грамадскай думцы Беларусі пачатку XX ст." (1985, на рус. мове), "Беларуская эстэтыка і мастацкая культура: Гістарычныя традыцыі і сучаснасць" (1986), "Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору" (1989), "Святло для людзей" (1989),

"Боская і людская мудрасць. Францыск Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд" (1990), "Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка М. Багдановіча" (1991). Аўтар шматлікіх навуковых дакладаў, часопісных і энцыклапедычных артыкулаў, рэцэнзій, палемічных выступаў на тэмы літаратуры, грамадскай думкі, мастацтва, культуры. Рэдактар і складальнік навуковых і літаратурных выданняў.

**Конюх Пётр Васілевіч** (8.03.1910, мяст. Турэц Карэліцкага р-на — 14.07.1994), беларускі спявак (бас). З беднай сялянскай сям'і. У Турцы скончыў 7-гадовую школу (1925). У 1928 паступіў у сельскагаспадарчую школу ў в. Кашалёва (Навагрудскі р-н), дзе правучыўся 2 гады. Працаваў дома на гаспадарцы. Актыўна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці (спяваў у хоры, іграў на музычных інструментах, выступаў у спектаклях). За нацыянальна-культурную дзейнасць праследаваўся паліцыяй. У 1932-34 служыў у войску. Зноў займаўся гаспадаркаю. У 1938 скончыў у Вільні сельскагаспадарчыя курсы і працаваў экспертам па закупцы лёну. У 1940 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, высланы ў Сібір. У 1942 уступіў у войска Андэрса. Прайшоў з ім шлях праз Іран, Егіпет, Палестыну, Італію, удзельнічаў у баях пад Монтэ-Касіна. У 1945-50 вучыўся опернаму вакалу ў акадэміі мастацтваў у Рыме. У 1950-56 жыў у Бельгіі. Выступаў з канцэртамі ў Італіі, Бельгіі, Галандыі, Англіі. У рэпертуары — арыі з опер ("Фаўст" Ш. Гуно, "Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага, "Дон-Карлас" Дж. Вэрдзі і інш. ), беларускія народныя песні. У 1956 пераехаў у ЗША, даваў сольныя канцэрты ў ЗША, Канадзе. У 1958-85 спяваў у хоры Данскіх казакоў. Выступалі ў Італіі, Германіі, Швецыі, Нарвегіі, Даніі, Бельгіі, Галандыі, Францыі, Англіі, Іспаніі, Швейцарыі, ЗША, Канадзе, Японіі, Аўстраліі, Філіпінах, Новай Зеландыі. Ажыццяўляў і сольныя праграмы. Стварыў свае музычныя школы ў Н'ю-Йорку і Гамбургу, дзе даваў урокі спеваў. У 1975 наведаў Беларусь. З 1987 жыў у Канадзе. Удзельнічаў у музычных фестывалях, спяваў у царкоўным хоры.

**Корсак Раймонд** (31.08.1768, в. Жукоўшчына Дзятлаўскага р-на — 9.11.1817), польскі паэт. Вучыўся ў піяраў у Варшаве. Вывучаў права ў Кракаўскім універсітэце. Служыў у войску. Працаваў у Літоўскай скарбнай камісіі. З пач. 90-х жыў у Гродне. Удзельнічаў у паўстанні 1794. Быў арыштаваны расійскімі ўладамі, зняволены ў Гродне і Вільні. З 1797 — на Падоле, дзе быў абвінавачаны ў антыдзяржаўнай дзейнасці і зняволены ў Камянцы Падольскім (1810). З 1790-х друкаваў у варшаўскіх і віленскіх перыёдыках трагедыі,

пасланні, паэмы, оды, байкі, пародыі, эпітафіі. Перакладаў на польскую мову Лафантэна і інш.

**Корсак Юльян** (13.02.1806, г. Слонім — 30.08.1855), польскі паэт, перакладчык. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў школе піяраў у Шчучыне, у Віленскім універсітэце (1823-26). У 1827-28 жыў у маёнтку Страла (Дзятлаўскі р-н), у 1929-30 — у Пецярбургу і Варшаве. З 1830 — зноў на вёсцы. Займаўся гаспадарчымі і літаратурнымі справамі, вывучаў мовы. Быў выбраны старшынёй Слонімскага павятовага гранічнага суда. Друкаваўся з 1823. Выдаў "Вершы" (Пецярбург, 1830, 2-е выд. 1836), "Новыя вершы". Т. 1-2 (Вільня, 1840), дзе змешчана арыгінальная лірыка і пераклады на польскую мову Д. Байрана, І. Гётэ, Гарацыя, Ф. Шылера. Выйшлі дзве яго кнігі перакладаў Д. Байрана. Апошнія 10 гадоў жыцця аддаў перакладу "Боскай камедыі" Дантэ, якая выйшла асобным выданнем у 1860. Увасабляў у творах матывы і вобразы родных мясцін.

**Котвіч Уладзіслаў Людвігавіч** (1.04.1872, в. Восава Лідскага р-на — 3.10.1944), рускі і польскі філолаг-усходазнавец. Акадэмік Польскай Акадэміі навук (1927). Скончыў 2-ю Віленскую гімназію (1890), факультэт усходніх моваў Пецярбургскага універсітэта (1895). Пакінуты ў універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. З 1898 працаваў як усходазнавец у агульнай канцылярыі міністра фінансаў. З 1900 — прыват-дацэнт Пецярбургскага універсітэта, дзе выкладае мангольскую і маньчжурскую мовы. Адначасова — супрацоўнік Азіяцкага музея Расійскай Акадэміі навук. Адзін з арганізатараў Петраградскага інстытута жывых усходніх моваў, быў яго першым рэктарам (1920-22). У 1923 пераехаў у Польшчу. Працаваў прафесарам кафедры філалогіі старажытнага Усходу Львоўскага універсітэта (1923-40). Рэдагаваў з 1927 польскі "Усходні штогоднік". Быў старшынёй польскага ўсходазнаўчага таварыства (1923-36). У 30-я актыўна ўдзельнічаў у працы ўсходазнаўчых навуковых канферэнцый (Львоў, Кракаў, Вільня, Варшава). Аўтар "Лекцый па граматыцы мангольскай мовы" (СПб, 1902). Выдаў "Калмыцкія загадкі і прыказкі" (СПб, 1905). Выйшаў яго нарыс "Юзаф Кавалеўскі — арыенталіст" (Варшава, 1948), "Даследаванні па алтайскіх мовах" (М., 1962).

**Коўкель Іван Іванавіч** (31.10.1942, в. Вялікае Сяло Лідскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1979). Дацэнт (1981). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Сарокі (Лідскі р-н), у 7-годцы ў в. Гервянікі (Лідскі р-н). Скончыў

Жырмунскую СШ Воранаўскага р-на. Вучыўся на гістарычна-філалагічным факультэце (беларускае аддзяленне) Гродзенскага педінстытута (1960-64). Працаваў настаўнікам Жырмунскай СШ у 1964, 1965-66 (у 1964-65 служыў у войску). Быў дырэктарам Магунскай 8-годкі Воранаўскага р-на (1966-69). У 1969-72 — аспірант кафедры гісторыі БССР БДУ. У 1972-86 выкладае на кафедры гісторыі СССР і БССР Гродзенскага педінстытута (універсітэта). Быў загадчыкам кафедры грамадскіх навук Гродзенскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў (1986-91). Затым зноў выкладае ў Гродзенскім універсітэце, на кафедры гісторыі Беларусі. Навуковыя інтарэсы — беларускі нацыянальны рух 20-х гадоў XX ст., гісторыя грамадскіх арганізацый і палітычных партый Беларусі, дзейнасць Арміі Краёвай падчас 2-ой сусветнай вайны, методыка выкладання гісторыі Беларусі. Друкуецца з 1961. Выдаў у сааўтарстве (на рус. мове) даследаванні: "Чаму не адбылася БНР? З гісторыі палітычнага банкруцтва нацыяналістычнай контррэвалюцыі ў Беларусі. 1918-1925 гг." (1980), "Чаму не адбылася БНР" (1984, на англ. мове), "Смаргонь. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1984), "Масты. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1986), "Гродна" (1987, на рус. і франц. мовах), "Гродна. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1988), "Актуальныя праблемы гісторыі БССР" (Гродна, 1990), "Нарысы гісторыі Гродзенскай абласной партыйнай арганізацыі" (1990). На беларускай мове выйшаў навучальны дапаможнік "Гісторыя Беларусі. Ч. І. Са старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст." (Гродна, 1993, у сааўт.). У 1998 у Гродне выйшаў на рускай мове навучальны дапаможнік "Гісторыя Беларусі" (ч. 1-3, у сааўт.). Аўтар метадычных рэкамендацый па вывучэнні гісторыі Беларусі ў ВНУ.

**Коўш Аляксандр** (1890, в. Рыдзялі Гродзенскага р-на — 1943), беларускі грамадска-культурны дзеяч, праваслаўны святар. З сялянскай сям'і. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю, настаўнічаў на Століншчыне. Затым скончыў бухгалтарскія курсы і працаваў у Любліне ў банку. У 1914-21 — у бежанстве ў Расіі. Пасля вяртання высвечаны на святара ў Гродне. Служыў у царкве пад Вільняй, выкладаў закон Божы ў Віленскай беларускай гімназіі. Працаваў у Беларускім кааператыўным банку. Друкаваўся ў віленскай перыёдыцы на тэмы нацыянальнага адраджэння Беларусі, выкарыстання беларускай мовы ў царкве. У 1927-28 зняволены ўладамі Польшчы за нацыянальную беларускую дзейнасць. Быў рэдактарам-выдаўцом часопіса "Беларуская зарніца" (1928-29), спраўляў абавязкі святара ў Вільні. У 1941 пачаў працаваць у выдавецкай камісіі пры мінскім

архірэі. Быў протаіерэем. Расстраляны гітлераўцамі за нелаяльнасць да рэжыму.

**Кох Аляксандр Мікалаевіч** (6.05.1909, г. Гродна — 30.06.1972), беларускі мастак. Сябра Саюза беларускіх мастакоў (1945). З сям'і рабочага. Вучыўся ў Гродне ў школе, у рамеснай вучэльні. Не скончыўшы, выехаў у Варшаву. Вучыўся тут у мастацкай школе Герсана (1928-30), у мастацкай акадэміі (1930-34). Працаваў у Варшаве як мастак, быў прыняты ў Саюз польскіх мастакоў. У жніўні 1939 вярнуўся ў Гродна. Працаваў мастаком у Доме Чырвонай Арміі (1939-40), у кінатрэсце (1940-41). Падчас вайны — у прыватнай мастацкай майстэрні ў Гродне. У 1945-48 быў загадчыкам мастацкай майстэрні гродзенскай філіі Саюза савецкіх мастакоў БССР. У 1948 рэпрэсаваны, зняволены ў канцлагеры Угліч (Мардоўская АССР). У канцы 1955 выйшаў на волю. Зноў працаваў у Гродне ў мастацкіх майстэрнях. Асноўныя жанры творчасці — пейзаж, партрэт, нацюрморт. Удзельнічаў у выставах з 1935. У даваенны час выстаўляліся творы: "Варшава. Стары горад" (1937), "На старым рынку" (1937), "Ружы"(1937), "Галава жанчыны" (1939), "Партрэт пані Р." (1939). Сярод пейзажных твораў пасляваенных гадоў — "Позняя восень" (1946), "Ранняя вясна" (1957), "Старое Гродна" (1961), "Ветраны дзень" (1961), "Ускраіна горада" (1965), "Вясна" (1965), таксама — "Восеньская дарога", "Восень Калежы", "Азотнатукавы завод у Гродне", "Залатая восень", "Распрацоўка торфу", замалёўкі разбураных у вайну мясцін г. Гродна. Выканаў партрэты майстра мастацкага ткацтва Б. Любовіч (1959), лекара С. Дулаева (1966), даярак Е. Панасюк (1966), А. Паўловіч (1966), хормайстра Р. Шырмы. Сярод нацюрмортаў: "Рыба", "Дарункі прыроды", "Нацюрморт з рыбаю" і інш.

**Кошур Святлана Андрэеўна** (дзявоч. Пыско, 2.01.1958, в. Валеўка Навагрудскага р-на), беларускі краязнавец, музеязнавец. З сям'і службоўцаў. У сувязі з яе пераездам у в. Ліпнішкі Іўеўскага р-на вучылася тут у І кл. Працягвала вучобу ў Карэліцкай СШ (скончыла ў 1974). У 1974-79 — студэнтка аддзялення рускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Настаўнічала ў 8-годцы ў в. Беражка Карэліцкага р-на (1979-83). Затым была выхавальніцай, з 1985 выкладчыцай у Карэліцкай СПТВ №125. З 1989 — навуковы супрацоўнік Карэліцкага раённага краязнаўчага музея "Зямля і людзі". Друкуе вершы (з 1984). Краязнаўчыя артыкулы і нарысы пра жыццё карэліцкага рэгіёну з'яўляюцца ў перыёдыцы з 1989. Выдала зборнікі краязнаўчых матэрыялаў "Родам з Карэліччыны" (Навагрудак, 1996), "Карэліччына.

Старонкі гісторыі" (Навагрудак, 1997), "На зямлі Карэліцкай" (Гродна, 1999).

**Крамарэнка Віктар Уладзіміравіч** (11.06.1945, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1971). З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ №2 у Гродне, Беларускі палітэхнічны інстытут (1968). Працаваў у Белдзяржпраекцe (1968-76). З 1976 — у інстытуце "Мінскпраект" (галоўным архітэктарам інстытута, намеснікам дырэктара, начальнікам архітэктурна-канструктарскай майстэрні). Адначасова, у 1988-92 — дацэнт кафедры жылых і грамадскіх будынкаў Беларускага палітэхнічнага інстытута. З 1990 — кіраўнік персанальнай творчай майстэрні Беларускага Саюза архітэктараў. З 1998 — дырэктар праектнага прадпрыемства "Творчая майстэрня В. У. Крамарэнкі". Асноўныя работы: тэатр драмы і камедыі ў Бабруйску; у аўт. калектыве — лячэбны корпус санаторыя "Беларусь" у Друскеніках (Літва), Дом сувязі ў зоне адпачынку на воз. Нарач, археалагічны музей "Старажытнае Бярэсце" (Брэст), кінатэатр "Масква", навучальны корпус Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі па прасп. Скарыны, архітэктурна-скульптурны комплекс "Мінск — горад-герой" на прасп. Машэрава, Палац культуры Рэспублікі на Кастрычніцкай плошчы, станцыя метрапалітэна "Трактарны завод", чыгуначны вакзал, Нацыянальная бібліятэка, тэлевежа вышынёй 421 м у Мінску.

**Крамко Іван Ігнатавіч** (4.01.1931, в. Бeражна Карэліцкага р-на), беларускі мовазнавец. Кандыдат філалагічных навук (1961). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Мір Карэліцкага р-на (1950). Вучыўся на філфаку (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры) БДУ (1950-55). Працягваў вучобу ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (1955-58). Затым працуе ў гэтым інстытуце (з 1965 — ст. навуковым супрацоўнікам). Даследуе пытанні гістарычнага сінтаксісу, гістарычнай лексікі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, культуры беларускай мовы. Друкуецца з 1959. Сааўтар даследаванняў: "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы". Т. 2 (1968), "Гістарычная лексікалогія беларускай мовы" (1970), "Характар узаемаадносін беларускай літаратурнай мовы з іншымі славянскімі мовамі ў пачатковы перыяд" (1972), "Гістарычная марфалогія беларускай мовы" (1979), "Мова помнікаў беларускай пісьменнасці" (1988). Прымаў удзел у падрыхтоўцы "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы" (1973-92), "Руска-беларускага слоўніка" Т. 1-2 (1982, 1991).

**Крамко Яўген Ігнатавіч** (17.09.1920, в. Беражна Карэліцкага р-на — 9.08.1999), беларускі пісьменнік (празаік, публіцыст), журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1998). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 7-годку (1934), у в. Кашалёва (Навагрудскі р-н) сельскагаспадарчую школу (1939). Працаваў загадчыкам клуба ў Беражне (1939-40). З верасня 1940 вучыўся ў Гродзенскім тэхнікуме фізкультуры і спорту. Падчас вайны стварыў у роднай вёсцы падпольную арганізацыю моладзі. З 1942 — у партызанах, быў камандзірам роты, намеснікам камандзіра брыгады па разведцы. Адзначаны баявымі ўзнагародамі. Скончыў школу прапагандыстаў пры ЦК КПБ (1946) і працаваў рэдактарам райгазеты "Ивенецкая правда" (1946-48), карэліцкай райгазеты "Красное знамя"(1948). У 1950 скончыў аддзяленне журналістыкі Рэспубліканскай партшколы і завочна — гістфак БДУ. Быў навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Я. Купалы (1950-51). У 1951-70 служыў у войску (у 1962 — экстэрнам скончыў І-ю Ленінградскую артылерыйскую вучэльню). Пісаў апавяданні-замалёўкі, казкі, нарысы, публіцыстыку, мемуары. Друкаваўся з 1950. Выдаў зборнікі прозы "Звяры таксама плачуць" (1985), "Нёманскія замалёўкі" (1989), "Разам з дзядулем" (1997), дакументальную аповесць пра ваенныя гады "Атрад "Камсамольскі" (1987).

**Крамнік Аляксандр Мікалаевіч** (5.08.1933, в.Лаўрынавічы Зэльвенскага р-на), беларускі правазнавец, педагог. Кандыдат юрыдычных навук (1968). Дацэнт (1970). З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы, затым Мяжырыцкую 7-годку (Зэльвенскі р-н) і СШ у Зэльве. У 1953-58 вучыўся на юрыдычным факультэце БДУ. Працаваў у органах МУС. Скончыў аспірантуру ў БДУ. З 1968 — на кафедры канстытуцыйнага права БДУ, з 1990 адначасова — намеснік дэкана юрфака. З 1992 — загадчык кафедры канстытуцыйнага права БДУ. Выдаў даследаванні (на рус. мове): "Адміністрацыйныя паўнамоцтвы сельскіх Саветаў дэпутатаў працоўных" (1974), "Адміністрацыйная адказнасць непаўналетніх" (1974), "Юрыдычны даведнік для насельніцтва" (1978, у сааўт.), "Уніфікаваны класіфікатар адміністрацыйных правапарушэнняў" (1978, у сааўт.), "Новае заканадаўства СССР аб адміністрацыйных парушэннях" (1981), навучальныя дапаможнікі "Савецкае будаўніцтва" (1979, у сааўт.), "Органы народнага кантролю" (1982, у сааўт.), "Дзелавыя гульні. Па курсе "Савецкае адміністрацыйнае права" (1988).

**Кранц Якаў** (1741, мяст. Дзятлава — 1804), яўрэйскі прапаведнік. Вучыўся ў ешыбоце ў Мяжырычах (Ровенская вобл.), дзе здабыў славу красамоўца. У 1761 заняў тут пасаду даршана (прапаведніка). Аб'ездзіў яўрэйскія абшчыны ў ваколіцах Львова, Любліна, Каліша, Замосця. 18 гадоў прапаведаваў у Дубне (Украіна). У пропаведзях выкарыстоўваў фальклор, этычныя, галахічныя, кабалістычныя творы, інтэрпрэтуючы іх па-свойму. Кнігі яго арацый, прытчаў (на іўрыце) выходзілі пасмяротна на Украіне, у Польшчы.

**Краскоўскі Іван Ігнатавіч** (24.06.1880, в. Дубічы Ваўкавыскага р-на — 23.08.1955), беларускі грамадска-культурны дзеяч, педагог. З сям'і праваслаўнага святара. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Вільні. Вучыўся на гістарычна-філалагічным факультэце Варшаўскага універсітэта (1903-05), адкуль выключаны за ўдзел у студэнцкім руху. Скончыў гістарычна-эканамічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1907). Выкладаў гісторыю ў прыватных гімназіях у Вільні (1907-14). Выехаў з сям'ёй у бежанства. Працаваў у Кіеве ў "Саюзе гарадоў Паўднёва-Заходняга фронту". Удзельнік з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (сакавік 1917) ад "кіеўскіх беларусаў". Тут выбраны ў Беларускі нацыянальны камітэт. Удзельнічаў у стварэнні Украінскай Народнай Рэспублікі, быў паслом УНР у Грузіі (1919-20). Выкладаў гісторыю ў Віленскай беларускай гімназіі (1921-22). Уваходзіў у кіраўніцтва Беларускага нацыянальнага камітэта, у "Беларускае брацтва". Арыштоўваўся польскімі ўладамі за беларускую дзейнасць. У 1922-25 — у Дзвінску (Латвія), дзе арганізаваў беларускую гімназію і працаваў яе дырэктарам. Узначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Латвіі. Быў сябрам управы мясцовага культурна-асветнага таварыства "Бацькаўшчына". У 1924 латышскія ўлады судзілі за беларускія справы. У 1925 пераехаў у Мінск. Працаваў у Дзяржплане БССР і ў Інбелкульце. З 1928 — у Беларускай акадэміі навук, адначасова быў дацэнтам БДУ, выкладаў гісторыю. З 1930 — у Дзяржплане СССР (Масква), тады ж быў рэпрэсаваны і высланы ў Самару, дзе працаваў эканамістам. У 1937-40 зняволены ў турме. Затым працаваў настаўнікам у школах Мелякескага р-на Ульянаўскай вобл. (1941-45), у г. Мелякес (1946-48), у Шыраеве Куйбышаўскай вобл. (1948-49). У 1953 пераехаў у Чэхаславакію, дзе жыла дачка.

**Красоцкая Ірына Валяр'янаўна** (20.09.1962, г. Шчучын), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1998). Скончыла Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці

(1985). Жыве ў Віцебску. Працуе над дызайнам тэкстыльных тканін, мадэлюе адзенне. Удзельніца выставаў (з 1987) у Беларусі, Расіі, Германіі. Сярод работ — творчыя тэмы "Стары горад", "Рок-н-рол", "Круіз", "Белая Русь", "Імправізацыя", "Белыя росы", "Страказа", "No smoking", "Pop Com", прамысловыя калекцыі адзення для ААА "KIM".

**Краўцоў Макар** (сапр. Касцевіч Макар Мацвеевіч, 18.08.1891, в. Баброўня Гродзенскага р-на — 1939), беларускі пісьменнік (паэт, перакладчык, публіцыст). З заможнай сялянскай сям'і. Скончыў царкоўнапрыходскую школу ў в. Галавачы (Гродзенскі р-н), Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1910). Працаваў у школе. З 1915 — у войску, пасля ваеннай вучэльні — на Паўночна-заходнім фронце. Дэлегат Усебеларускага кангрэса (снежань 1917). Настаўнічаў у Мінску (1917-18). Выкладаў на курсах беларусазнаўства пры Мінскай гарадской думе (1918). Удзельнічаў у рабоце Рады БНР у Мінску і Гродне (1918-19). Удзельнік Слуцкага антысавецкага паўстання (1920), займаўся тут справамі друку. Працаваў у Радашковіцкай беларускай гімназіі (1922-23). Жыў у Вільні. Рэдагаваў часопіс "Саха" (1923). З 1927 актыўна ўдзельнічаў у рабоце Беларускага навуковага таварыства. Друкаваўся (з 1916) у перыёдыках "Гоман", "Звон", "Беларускае жыццё", "Беларускія ведамасці", "Беларусь", "Наша думка", "Маланка", "Сялянская ніва", "Беларуская культура", "Беларускі дзень". Арганізоўваў у родных мясцінах беларускія канцэрты, спектаклі. Арыштоўваўся ўладамі Польшчы за нацыянальную дзейнасць. У 30-я адыйшоў ад літаратурнай творчасці. Быў беспрацоўным. Сябра Галоўнай управы ТБШ у 1936-37. У кастр. 1939 працаваў у рэдакцыі газеты "Віленская праўда". Неўзабаве рэпрэсаваны, загінуў у зняволенні. Выдаў у Вільні працу пра гісторыю БНР "Рада Беларускай Народнай Рэспублікі" (1921), свае пераклады на беларускую мову кніг: "Алеся" А. Купрына (1923), "Мцыры" М. Лермантава (1924), "Расказы аб вялікіх падзеях розных часоў і народаў" М. Рубакіна (1924), "Дэман" М. Лермантава (1926), "Бартэк-пераможнік" Г. Сянкевіча (1926), "Сляпы музыка" У. Караленкі (1928), "Прынц і жабрак" М. Твэна (1928), "Для дзяцей" Л. Талстога (1928), "Тарас Бульба" М. Гогаля (1929).

**Краўцэвіч Аляксандр Канстанцінавіч** (13.09.1958, в. Лупачы Мастоўскага р-на), беларускі гісторык, археолаг. Доктар гістарычных навук (1999). З сям'і селяніна і настаўніцы. У роднай вёсцы скончыў 8-годку (1973). Затым — Гродзенскі тэхнікум фізічнай культуры (1976), гістфак БДУ (1981). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута

археалогіі Акадэміі навук СССР (1981-84). Працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1985-87), загадчыкам аддзела археалогіі Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута (1989-93). У 1994-95 — першы прарэктар Гродзенскага універсітэта. З 1995- у дактарантуры на кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ (у 1996-97 стажыраваўся ў Кракаўскім універсітэце). Друкуецца з 1982. Асноўныя напрамкі навуковых інтарэсаў — матэрыяльная культура гарадоў, мястэчак, замкаў Беларускага Панямоння ў XIV-XVII стст., ранняя гісторыя ВКЛ. Выдаў кнігі: "Майстар — наш продак" (1989), "Гарады і замкі Беларускага Панямоння: Планіроўка, культурны слой" (1991), "Гродзенскі замак" (1993), "Тэўтонскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда" (1993), "Стары Мір" (1993, у сааўт.), "іматэрыяльная культура Міра і Мірскага замка" (1994, у сааўт.), "Вялікі князь Вітаўт" (1998), "Стварэнне Вялікага княства Літоўскага" (1998).

**Крукаў Мікалай Мікалаевіч** (5.08.1959, мяст. Рось Ваўкавыскага р-на), беларускі мастак. Скончыў рэспубліканскую школу па музыцы і выяўленчым мастацтве (1977), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва) у 1982. Працуе ў Гродзенскім камбінаце "Мастацтва". Удзельнік выставаў з 1985. Сярод работ: роспісы ў Доме культуры г. п. Красна-сельскі Ваўкавыскага р-на, сграфіта ў Скідзельскай СПТВ №190 Гродзенскага р-на, маркетры на станцыі юных натуралістаў у Гродне, вітражы ў прафілакторыі ВА "Азот", роспісы і вітражы ў СПТВ №120 у Малой Бераставіцы Бераставіцкага р-на, у стаматалагічным аддзяленні медычнай вучэльні ў Гродне, роспіс і суперграфіка ў Азёрскай школе-інтэрнаце Гродзенскага р-на, літы вітраж у школе-інтэрнаце ў мяст. Парэчча Гродзенскага р-на (у сааўт.), люстры ў музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне, у санаторыі "Свяцк" Гродзенскага р-на.

**Крупа Анатоль Леанідавіч** (2.03.1955, в. Мастаўляны Лідскага р-на), беларускі педагог, краязнавец, музеязнавец. З сям'і настаўнікаў. Скончыў СІЛ у в. Парэчча Лідскага р-на (1972). Працаваў слесарам на заводзе Лідсельмаш (1972-73). Служыў на флоце (1973-76). У 1976-77 — слухач падрыхтоўчага аддзялення Гомельскага універсітэта, затым студэнт гістарычна-філалагічнага факультэта гэтага універсітэта (скончыў у 1982). Быў дырэктарам Сямашкаўскай 8-годкі Лідскага р-на (1982-84). З 1984 — дырэктар Бердаўскай СШ Лідскага р-на (выкладае гісторыю). Стваральнік (1989) і кіраўнік гістарычна-краязнаўчага музея пры Бердаўскай СШ, які з'яўляецца

цэнтрам культурна-асветнага жыцця ў рэгіёне. Друкуецца як краязнавец. Старшыня Лідскай аб'яднанай арганізацыі ТБШ (1999).

**Круповіч Маўрыкі Антонавіч** (13.09.1823, г. Гродна — 24.01.1891), беларускі гісторык, археограф. У Гродне атрымаў сярэднюю адукацыю. Вучыўся на юрыдычным, скончыў філасофскі факультэт Дэрпцкага універсітэта (1846). У Гродне атрымаў пасаду перакладчыка Рэвізійнай камісіі Архіву старажытных актавых кніг. З 1851, у сувязі з пераводам Архіву ў Вільню, працаваў там перакладчыкам і архіварыусам. З 1856 — навуковы сакратар Віленскай археалагічнай камісіі. Падрыхтаваў тут "Збор дзяржаўных і прыватных актаў, якія датычаць гісторыі Літвы і злучаных з ёю ўладанняў. 1387-1710", выдадзены ў Вільні археалагічнай камісіяй у 1858. Быў рэдактарам і выдаўцом "Скарбца дыпламатаў..." І. Даніловіча (т. 1-2, Вільня, 1860-1862). У 1860-63 супрацоўнічаў у газеце "Kurjer Wileński". У 1865 зволены з працы ў Архіве за дачыненні да паўстання 1863. Пераехаў у Варшаву і працаваў бібліёграфам у бібліятэцы універсітэта (1866-67). Звольнены, знайшоў працу сакратара і бібліятэкара ў фельдмаршала Баратынскага (1867-79). Па яго смерці быў перакладчыкам у гарадскім цэнзурным камітэце.

**Кручкоўскі Тадэвуш Тадэвушавіч** (5.01.1961, в. Яскулды Бераставіцкага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1993). Скончыў 8-годку ў в. Дварчаны Свіслацкага р-на (1976). Вучыўся ў Ваўкавыскай педагагічнай вучэльні (1976-80). Настаўнічаў на Мінршчыне. У 1982-83 быў слухачом падрыхтоўчага аддзялення Гродзенскага універсітэта, у 1983-88 — студэнт гістфака гэтага універсітэта. Затым выкладае тут на пасадах асістэнта, ст. выкладчыка, дацэнта на кафедры ўсеагульнай гісторыі (у 1989-92 вучыўся ў аспірантуры Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай акадэміі навук). Друкуецца з 1988. Вывучае гісторыю Польшчы, Вялікага княства Літоўскага ў ацэнцы рускай гістарыяграфіі XIX — пач. XX ст. Выдаў манаграфію "Польская праблематыка ў рускай гістарыяграфіі 2-й паловы XIX ст." (1994, на рус. мове). Сааўтар навучальнага дапаможніка "Найстаражытныя цывілізацыі Лацінскай Амерыкі" (Гродна, 1998, на рус. мове). Старшыня Гродзенскага аддзялення Польскага навуковага таварыства ў Беларусі.

**Крывенка Аляксандр Сяргеевіч** (26.12.1957, г. Ваўкавыск), беларускі дызайнер. Сябра беларускага Саюза дызайнераў (1996). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1983). Жыве ў

Мінску. Працуе ў галіне індустрыяльнага дызайна, дызайна абсталявання, графічнага дызайна. У выставах — з 1985. Сярод асноўных работ — дызайн-праекты банкаўскага абсталявання, санітарна-гігіенічнага комплекса (у сааўт.), асартыменту нажніцаў.

**Крывец Сяргей Міхайлавіч** (1909, в. Сухінічы Мастоўскага р-на — 28.04.1945), беларускі паэт. З сялянскай сям'і. У 1915-21 былі ў бежанстве ў Саратаўскай губ., дзе 2 гады вучыўся ў школе. На радзіме быў пастухом, парабкам, цесляром. Настойліва займаўся самаадукацыяй. Удзельнічаў у грамадска-культурным руху. Выбіраўся сакратаром гуртка ТБШ (1925). Праследаваўся польскімі ўладамі, некалькі разоў арыштоўваўся (упершыню ў 1925). У 1930-33 працаваў цесляром у Гродне, затым у Беластоку. У 1940-41 вучыўся ў Беластоцкім педінстытуце. У 1944 прызваны ў савецкае войска, загінуў на фронце. Друкаваўся з 1928. Пісаў вершы, апавяданні, эпіграмы, публіцыстыку, перакладаў Ф. Шылера. У 1972 выйшла кніга яго паэзіі "Дубок".

**Крынчык Павел Сцяпанавіч** (15.09.1898, в. Едначы Слонімскага р-на — 22.09.1975), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. З сялянскай сям'і. У 1910 перабраліся на хутар ля в. Вострава (Зэльвенскі р-н). У 1910-12 вучыўся ў народнай вучэльні ў в. Клімавічы (Зэльвенскі р-н), у 1912-15 — у Слонімскай вышэйшай пачатковай вучэльні. Затым сям'я выехала ў бежанства. У г. Екацерынаслаў працягваў вучобу ў вышэйшай пачатковай вучэльні (1915-17). З 1917 вучыўся на будаўнічым аддзяленні Екацерынаслаўскага палітэхнікума шляхоў зносін (скончыў у 1921). Неўзабаве сям'я вярнулася на радзіму, дзе працуе на гаспадарцы. У сярэдзіне 20-х уключыўся ў беларускі грамадска-культурны рух. З 1927 — намеснік старшыні акруговай управы ТБШ, з 1929 — сябра Галоўнай управы ТБШ. У 1929-30 — дэпутат сейма Польшчы, сябра Галоўнага сакратарыята дэпутацкага клуба "Змаганне". Уваходзіў у заходнебеларускі камітэт па падрыхтоўцы еўрапейскага сялянскага кангрэсу ў Берліне. У 1930 арыштаваны польскімі ўладамі і асуджаны да турэмнага зняволення. У выніку абмену палітвязнямі з верасня 1932 — у СССР. У Мінску працаваў лектарам ЦК МАДР. У 1935 рэпрэсаваны, у 1937 зняволены ў канцлагеры Эльгене (Магаданская вобл. ). У 1945 вярнуўся на радзіму, працаваў на гаспадарцы. У 1951 сям'я пераехала ў Слонім, працаваў вартаўніком. Надрукаваў успаміны пра падрыхтоўку еўрапейскага сялянскага кангрэсу.

**Кузікевіч Іван Мікітавіч** (8.01.1948, в. Сухая Даліна Гродзенскага р-на), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1991). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Верхнесвіслацкай школе, у Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (1964-67). Нядоўга працаваў у Жыровіцкім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі. Служыў у войску (1967-69). У 1969 завочна скончыў факультэт фізічнай культуры Брэсцкага педінстытута. Выкладаў у дзіцячай спартыўнай школе ў Вялікай Бераставіцы (1969-70). Быў лабарантам кафедры фізвыхавання Гродзенскага педінстытута (1970-71), настаўнікам фізвыхавання ў СШ №6 г. Гродна (1971-79). З 1979 — завуч, з 1982 — дырэктар дзіцячай спартыўнай школы №5 г. Гродна. Суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі па плаванні (1991).

**Кукссвіч Здзіслаў** (11.03.1930. г. Гродна), польскі філосаф, педагог. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1967). Прафесар (1973). З сям'і суддзі акруговага суда. Да вайны скончыў 3 класы школы ў Гродне. У 1939 пераехалі ў Вільню, дзе скончыў польскую 7-годку (1942). Вучыўся тут у нелегальнай польскай гімназіі. У 1945 пераехалі ў Лодзь, тут скончыў ліцэй (1948). Вучыўся на гуманітарным факультэце Люблінскага каталіцкага універсітэта (1949-53). З 1955 працуе ў Інстытуце філасофіі і сацыялогіі Польскай акадэміі навук (у 1968-81 — намеснік дырэктара па навуковай рабоце, у 1969-89 — узначальваў аддзел гісторыі сярэднявечнай філасофіі). Адначасова вёў курс старажытнай і сярэднявечнай філасофіі ў Інстытуце філасофіі універсітэта ў Лодзі (1973-90). Даследуе гісторыю старажытнай філасофіі, рукапісныя тэксты прац старажытных філосафаў. Друкуецца з 1956. Выдаў многія філасофскія трактаты старажытнасці. Аўтар кніг: "Паланістыка ў сярэднявечных рукапісах мюнхенскіх бібліятэк" (Вроцлаў-Варшава-Кракаў, 1969, у сааўт.), "Лацінскі авераізм трынаццатага стагоддзя. Неканфармісцкі вобраз свету і чалавека ў сярэднявеччы" (Варшава, 1971), "Філасофія сярэднявечча як ідэалогія" (Варшава, 1973), "Альбертызм і тамізм у XV ст. у Кракаве і Кёльне. Псіхалагічная дактрына" (Вроцлаў-Варшава-Кракаў-Гданьск, 1973), "Агляд сярэднявечнай філасофіі" (Варшава, 1973, 3-е выд. 1986), "Філасофія чалавека. Тэорыя душы. Стан сярэднявечнай філасофіі ў Польшчы" (Вроцлаў-Варшава-Кракаў-Гданьск, 1975).

**Кулакоўская Любоў Міхайлаўна** (дзявоч. Хацяновіч, 13.09. 1943, мяст. Дзяляцічы Навагрудскага р-на), беларускі хормайстар, музычны педагог. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980). З сялянскай сям'і. Скончыла ў Дзяляцічах 7-годку, у Вераскаве

(Навагрудскі р-н) — СШ. Вучаніцай 7-10 кл. спявала ў Дзяляціцкай народнай харавой капэле. У 1963 скончыла дырыжорска-харавое аддзяленне Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні. Настаўнічала ў Ваўкавыскай дзіцячай музычнай школе (жыла з сям'ёй у г. п. Краснасельскі). З 1977 — дырэктар Краснасельскай дзіцячай музычнай школы (у 1977 скончыла завочна музычна-тэарэтычнае аддзяленне Гродзенскай педагагічнай вучэльні). У 1964-89 адначасова — кіраўнік хору ВА "Ваўкавыскцэментнашыфер" (званне народнага з 1970).

**Кулакоўскі Ігнат Рыгоравіч** (1800, маёнт. Янаўшчына Свіслацкага р-на — 1870), беларускі асветнік, педагог, краязнавец, паэт. З небагатай шляхецкай сям'і. Скончыў Свіслацкую гімназію. Вучыўся на аддзяленні "законаў і адміністрацыі" Варшаўскага універсітэта (1816-21). Абіраўся 5 разоў суддзёй Пружанскага межавага суда (1821 — 2-я пал. 30-х). У 1827-30 — засядацель Гродзенскага галоўнага суда, з 1830 — крымінальнай палаты ў Гродне. У 1829-37 працаваў наглядальнікам вучэльняў Гродзенскага павета (з 1830 быў папячыцелем Гродзенскай публічнай бібліятэкі). У 1837-40 — наглядальнік вучэльняў Драгічынскага павета. З 1840 — папячыцель Беластоцкай гімназіі, з 1844 — дырэктар Беластоцкай гімназіі (у 1841 прызначаны сябрам Рады інстытута шляхетных дзяўчат у Беластоку). Жыў пазней у маёнтку Крыштафорава на Беласточчыне. Грамадскі рэзананс атрымала яго "Запіска..." (1834), адрасаваная міністру народнай асветы, у якой патрабаваў перагледзець праграмы школ Беларусі з улікам уключэння ў іх гісторыі Беларусі, беларускай мовы, літаратуры. Разам з тым прапаноўваў разгорнуты праект рэарганізацыі жаночай адукацыі ў Беларусі. У 1855 ездзіў у Пецярбург дзеля паўторнага прадстаўлення сваіх ідэй. Склаў у 1833-37 "Кароткае гістарычнае апісанне г. Гродна", у 1837 — "Статыстычнае апісанне гарадоў Гродзенскай губерні". Быў сябрам-карэспандэнтам Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта, сябрам Віленскай археалагічнай камісіі. Вывучаў мінулае Беларусі. Збіраў прадметы нацыянальнай даўніны. Частку калекцыі перадаў Віленскаму музею старажытнасцяў. Быў сябрам навуковых таварыстваў Вільні, Варшавы, Пецярбурга, Даніі. Друкаваў (на польскай мове) вершы. Выдаў 2 зборнікі вершаў і перакладаў (з нямецкай, французскай, англійскай, санскрыту) — "Забаўкі вершам" (Вільня, 1824) і зборнік 1827 (не выяўлены).

**Кульбак Машэ** (Майсей Саламонавіч, 20.03.1896, мяст. Смаргонь — 29.10.1937), яўрэйскі пісьменнік (паэт, празаік, дра-

матург, перакладчык). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1934). Пісаў на ідзіш. З сям'і дробнага службоўца. Вучыўся ў Смаргоні ў дзяржаўнай школе, а вечарамі — у хедэры. Затым з 1909 — у ешыботах у Свянцянах, Валожыне, Міры. Здаў экстэрнам экзамен на званне настаўніка і выкладаў у яўрэйскім доме для сірот у Коўне, у школах Смаргоні, Мінска (1918), Вільні (1919-20). У 1920-23 жыў у Берліне, у 1923-28-у Вільні, дзе працаваў у яўрэйскіх гімназіях і настаўніцкай семінарыі. Быў выбраны старшынёй сусветнага яўрэйскага ПЭН-клуба (1927). З 1928 жыў у Мінску. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет, навуковым супрацоўнікам яўрэйскага сектара Беларускай Акадэміі навук. Восенню 1937 рэпрэсаваны, неўзабаве расстраляны. Дэбютаваў як паэт у 1916 у віленскім часопісе "Літэратурышэ кефці". Пісаў лірычныя вершы, паэмы, аповесці, раманы, драмы. Выдаў кнігі: "Вершы" (Вільня, 1920, Берлін, 1922), "Новыя вершы" (Вільня, 1922, Варшава, 1922), раманы "Месія сына Эфраіма" (Вільня, 1924, Берлін, 1924), "Панядзелак" (Вільня, 1924, Варшава, 1926), "Якаў Франк" (Варшава, 1929). "Вершы і паэмы" (1929). Апавяданне-казка "Вецер, які быў злосны" выдадзена ў Вільні ў 1931, 1-я кніга рамана "Зельманцы" выйшла ў Мінску, Харкаве, Маскве ў 1931, 2-я кніга — у Мінску ў 1935. Паэма "Чайльд Гарольд з мястэчка Дзісна" — у Мінску ў 1933. У 1934 выйшлі таксама "Выбраныя вершы". 3-томнае выданне яго твораў убачыла свет у Варшаве ў 1929. Драматычная паэма "Разбойнік Бойтрэ" пастаўлена ў 1936 яўрэйскім тэатрам у Мінску, Маскве. Перакладаў на ідзіш творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гогаля, М. Астроўскага. Адзін з складальнікаў "Кніжкі для чытання" (1934) для падрыхтоўчага класа яўрэйскай школы. У пасляваенны час творы яго выдаваліся ў перакладах на беларускую, рускую, польскую, нямецкую мовы.

**Кульчынскі Ігнат** (1707, г. Гродна — 9.01.1747), беларускі царкоўны дзеяч, гісторык, краязнавец. Доктар багаслоўя. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў базыльянскіх школах. Жыў у Рыме (1727-35), быў генеральным пракуратарам базыльянскай кангрэгацыі. З 1735 — у Гродне, архімандрыт Барысаглебскага (Каложскага) манастыра (1736-47). Склаў — "Інвентар Гродзенскага Каложскага базыльянскага манастыра" і "Хроніку ігуменаў, архімандрытаў, царкоўных старастаў і заступнікаў Гродзенскага Каложскага манастыра". Вывучаў помнікі беларускай даўніны. Працы (на лацінскай і польскай мовах) выдаваліся ў Рыме, Вільні, Супраслі, Пачаеве.

**Куніцкі Іван Адольфавіч** (4.05.1949, в. Баранава Гродзенскага р-на), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1979). З сялянскай сям'і. Скончыў у роднай вёсцы 8-годку, сярэднюю адукацыю атрымаў у в. Капцёўка Гродзенскага р-на. У 1967-68 працаваў у школе лабарантам хімічнага кабінета. Вучыўся на архітэктурным факультэце Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута (1968-72). Працаваў у Гроднаграмадзянпраекце (1972-77). З 1977 — кіраўнік групы архітэктараў, з 1983 — галоўны архітэктар гродзенскай філіі Усесаюзнага інстытута азотнай прамысловасці. З 1989 — галоўны архітэктар інстытута праектнага будаўніцтва (Гродна). Асноўныя работы: спортзала музычна-педагагічнай вучэльні ў Гродне, затым у сааўт. — група жылых дамоў па вул. Горкага з крамай "Дзіцячы свет", адміністрацыйны корпус трэста "Гроднапрамбуд", ІВЦ аб'яднання "Азот", рэканструкцыя шматлікіх аб'ектаў даўняй забудовы ў Гродне, завод запчастак у г. Краменная і навучальна-курсавы камбінат у Адэсе (Украіна).

**Кунцэвіч Фелікс Піліпавіч** (27.10.1900, г. Гродна — 31.03.1938), беларускі крытык і літаратуразнавец. Вучыўся ў Слоніме ў вышэйшай пачатковай вучэльні. У час І-ай сусветнай вайны — у бежанстве ў Калузе і Петраградзе. З 1918 — у Гродне, дзе працаваў на фабрыцы, на чыгунцы. У 1920 з Чырвонай Арміяй адыйшоў на ўсход. Быў камісарам на чыгунцы, у камісіі па барацьбе з працоўным дэзерцірствам. У 1924 — у статыстычным аддзеле ЦК КП(б)Б. У 1925 — сакратар Крычаўскага райкама КП(б)Б. З 1926 быў гандлёвым прадстаўніком у Латвіі. Вярнуўшыся, быў намеснікам рэдактара "Звязды". З 1929 вучыўся на літаратурным аддзяленні Інстытута чырвонай прафесуры ў Маскве. У 1930 рэпрэсаваны, неўзабаве вызвалены, працаваў у Маскве на заводзе, быў эканамістам у Дзяржаўным выдавецтве РСФСР. У 1933 зноў рэпрэсаваны, зняволены ў канцлагеры, пазней расстраляны. Друкаваўся як літаратуразнавец з 1928. Пісаў пра творчасць Ц. Гартнага, К. Чорнага, М. Зарэцкага, А. Дудара, пра ролю літаратурнай крытыкі. Друкаваў апавяданні.

**Курчэўскі Ян** (1854, мяст. Данюшава Смаргонскага р-на — 30.07.1917), польскі гісторык, педагог, каталіцкі духоўнік. З 1874 вучыўся ў Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі, затым у каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу (1879-81). Па сканчэнні высвечаны на святара. Працаваў у Вільні настаўнікам рэлігіі ў гімназіі, касцельнага права і гісторыі касцёла ў каталіцкай духоўнай семінарыі (1881-86). Служыў пробашчам у Кемелішках (Астравецкі р-

н), у Вільні. У 1901-11 зноў выкладаў у Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі. Быў старшынёй таварыства сяброў навук у Вільні (з 1907). Выдаў у Вільні "Святочныя казанні" (1897), "Выпадковыя казанні". Т. 1-2 (1899-1901), "Гаспадар і слуга паводле боскага права" (1901), "Каталіцкі касцёл у Смаргоні" (1907), "Касцёл у замку або віленская кафедра ў яе гістарычным, літургічным, архітэктурным і эканамічным развіцці". Ч. 1-3 (1908-16), "Віленскае біскупства ад яго заснавання да сучасных дзён"(1912).

**Кур'янка Мікалай Іванавіч** (1.08.1930, мяст. Турэц Карэліцкага р-на), беларускі педагог, псіхолаг. Кандыдат псіхалагічных навук (1974). З сялян. Скончыў СШ у Турцы. Вучыўся на факультэце нямецкай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў (1950-54). Працаваў лабарантам кафедры нямецкай мовы (1954-56), выкладчыкам нямецкай мовы (1956-70) гэтага інстытута (стажыраваўся ў Лейпцыгскім універсітэце ў 1963-64). У 1972 скончыў завочна аспірантуру на кафедры псіхалогіі інстытута замежных моваў. З 1970 выкладае на гэтай кафедры (з 1976 — дацэнт кафедры). Друкуецца з 1970. Вывучае псіхалагічныя асаблівасці засваення роднай і замежных моваў, беларуска-нямецкую і руска-нямецкую лексіку. Сааўтар перакладных слоўнікаў.

**Кусявіцкі Машэ** (1899, мяст. Смаргонь — 1966), яўрэйскі Хазан, спявак (тэнар). З 1924 служыў у Вялікай сінагозе ў Вільні. З 1927 — обер-кантар сінагогі ў Варшаве. У пачатку 2-ой сусветнай вайны ездзіў у СССР, дзе выступаў з канцэртамі. У 1947 выехаў у ЗША, даваў тут канцэрты, таксама ў Паўднёвай Афрыцы, Ізраілі. У 1952 атрымаў пасаду хазана сінагогі "Бет Эль" у Брукліне (ЗША). Выконваў арыі з опер польскіх, рускіх кампазітараў, яўрэйскія песні (на ідзіш). Шырока выпускаліся грамзапісы твораў у яго выкананні.

**Кучынскі Ігнат** (1774, г. Гродна — 1829), польскі артыст тэатра (камедыйныя і трагедыйныя ролі). Вучыўся ў Гродне і Вільні. У 1801 выступаў у трупе М. Мараўскай у Вільні. У 1805 уваходзіў у трупу М. Кажынскай, якая дзейнічала ў Мінску, удзельнічаў у гастролях трупы ў Маскве і Пецярбургу. У тым жа годзе разам з трупаю — у Вільні, дзе стала працаваў у тэатры. У 1816 увайшоў у акцыянернае таварыства, якое кіравала тэатрам. У 1829 — намеснік дырэктара Віленскага тэатра. Іграў у антычных і польскіх музычных драмах.

**Кучынскі Эдуард** (20.10.1905, в. Варонча Карэліцкага р-на — 23.08.1958), беларускі і польскі мастак-графік, мастацкі педагог. Дацэнт (1957). З беднай сялянскай сям'і. Бацька выехаў на заробкі ў ЗША, маці з дзецьмі — у Навагрудак. Тут вучыўся ў пачатковай школе (1913-14). Вярнуліся на вёску, працаваў парабкам, лесарубам. З 1917 — зноў у Навагрудку, дзе працаваў на электрастанцыі (возчыкам, памочнікам манцёра, манцёрам). З 1921 вучыўся ў Навагрудскай гімназіі (здаў экзамен за курс гімназіі ў 1927). У 1934 скончыў мастацкі факультэт Віленскага універсітэта (вучыўся ў Ф. Рушчыца і Л. Слядзінскага). Выкладаў малюнак у віленскай школе мастацкіх рамёстваў. У 1942 вывезены на прымусовыя работы ў Германію. З 1946 жыў у Польшчы. Выкладаў на кафедры графікі Торуньскага універсітэта. Ілюстраваў кнігі (А. Міцкевіча, С. Лагерлёф, М. Метэрлінка, Р. Ралана, М. Радзевіч), ствараў экслібрысы, гравюры, пісаў пейзажы, плакаты. У выставах удзельнічаў з 1937 (у Вільні, Н'ю-Йорку, Парыжы, Варшаве, Быдгашчы, Торуні).

**Кушнер Павел Іванавіч** (26.01.1889, г. Гродна — 14.03.1968), рускі грамадскі дзеяч, этнограф. Доктар гістарычных навук (1947). Прафесар (1959). З сям'і суддзі. Рана страціў бацьку. У 1899, паступіўшы ў Гродзенскую гімназію, стаў зарабляць на жыццё (быў рэпетытарам, перапісчыкам). У 1905 далучаецца да бальшавікоў і вядзе нелегальную палітычную работу ў горадзе, за што выключаны з гімназіі (1907). Пераязджае ў Рыгу, дзе жыла маці, працягвае тут рэвалюцыйную прапаганду. З 1915 — у Маскве, працуе ў мясцовым камітэце РСДРП(б). У Маскве скончыў Народны універсітэт імя Шаняўскага (1917). Удзельнік лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый 1917. Быў сакратаром маскоўскага Ваенрэўкома. З 1918 — у Наркамаце працы. З 1919 -прапагандыст у Чырвонай Ар мі, з 1920 — начальнік палітуправы Туркестанскага фронту. З 1921 — загадчык кафедры гісторыі развіцця грамадскіх форм Камуністычнага універсітэта ў Маскве. У 1929-31 быў рэдактарам газеты "Красная Татария", сябрам рэдкалегій "Рабочей газеты", "Рабочей Москвы". У 1931-35 працуе ў Наркамзнешгандлі (гандлёвым прадстаўніком у Літве, Нарвегіі). У 1935-38 — намеснік старшыні Камітэта навучальных установ ЦВК СССР, намеснік дырэктара Музея народаў СССР. У 1939-44 — рэдактар гістарычнай рэдакцыі Дзяржпалітвыдата. У 1944-59 працаваў загадчыкам сектара этнічнай картаграфіі і статыстыкі, затым Усходнеславянскага сектара Інстытута этнаграфіі Акадэміі навук СССР. Займаўся праблемамі агульнай этнаграфіі, этнічнай геаграфіі, этнаграфіі славян. Распрацаваў прынцыпы карта-

графавання з'яў матэрыяльнай культуры ў іх гістарычным развіцці. Аўтар публікацый у этнаграфічных выданнях (друкаваўся з 1922). Выдаў навучальны дапаможнік для вышэйшай школы "Нарыс развіцця грамадскіх форм" (М., 1924, 7-е выд. 1929), хрэстаматыю для вышэйшай школы "Першабытнае і родавае грамадства" (М., 1925), даследаванні "Горная Кіргізія" (М., 1929), "Феадалізм" (М., 1931), "Карту народаў СССР" для сярэдняй школы (М., 1951, 2-е выд. 1955), працу "Этнічныя тэрыторыі і этнічныя межы" (М., 1951).

**Лагода Барыс Барысавіч** (31.10.1964, мяст. Вялікая Бераставіца), беларускі тэатральны рэжысёр, артыст тэатра і кіно, пісьменнік. Скончыў СШ у Вялікай Бераставіцы (1981). Працаваў у гэтай школе лабарантам кабінета фізікі (1981-82). Вучыўся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (педагогі З. Браварская, А. Бутакоў, Ю. Сідараў, І. Курган) у 1982-88 (у 1983-85 служыў у войску). Працаваў акцёрам у Гродзенскім аблдрамтэатры (1988-89). Ставіў спектаклі, здымаўся ў кіно. У 1991 паступіў на завочнае аддзяленне інстытута тэатральнага мастацтва (Масква) па спецыяльнасці "рэжысёр музычнага тэатра". У 1991-92 працаваў рэжысёрам, галоўным рэжысёрам у Крыварожскім тэатры драмы і музыкі. У 1993-97 — галоўны рэжысёр Новасібірскага тэатра музычнай камедыі. З 1997 — галоўны рэжысёр і мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра музычнай камедыі. Паставіў спектаклі ў музычных тэатрах (у Гродне, Крывым Рогу, Новасібірску, Магадане, Омску, Мінску): "31 сярэбранік" Б. Лагоды, "Часціца чорта ў нас" І. Шыцікавай, "Жаніхі" І. Дунаеўскага, "Фантазія пра каханне і смерць Дон Жуана" (балет на музыку П. Чайкоўскага), "Біндзюжнік і кароль" А. Журбіна, "Мая прыўкрасная ледзі" Ф. Лоў, "Віват, артыст" І. Шыцікавай, "Цыганскі барон" І. Штраўса, "Цалуй мяне, Кэт" К. Портэра, "Паўлінка" Я. Купалы. На драматычнай сцэне выканаў ролі: Федэрыка ("Дэкамерон" паводле Дж. Баканы), Вернага ("Звалка" А. Дударава), Войшалка ("Князь Наваградскі" Л. Пракопчыка), Грышкі ("Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцінкевіча), Казака ("Бунт бабаў" Я. Пцічкіна). Ролі ў музычным тэатры: Сабковіч ("31 сярэбранік" Б. Лагоды), Жудрыкаў ("Жаніхі" І. Дунаеўскага), Ар'е Лейб ("Біндзюжнік і кароль" А. Журбіна), стары цыган ("Цыганскі барон" І. Штраўса), Біл ("Цалуй мяне, Кэт" К. Портэра). Зняўся ў кінафільмах "Мяне клічуць Арлекіна", "Пад небам блакітным", "Маці ўрагану". Аўтар лібрэта, апавяданняў, аповесцяў, вершаў (друкуецца з 1984). Выдаў кніжку прозы "Сабака без ашыйніка" (1995).

**Лагонда Расціслаў Анатолевіч** (22.02.1935, в. Ляткі Мастоўскага р-на), беларускі музыкант (трамбон), музычны педагог. Прафесар (1996). З сялянскай сям'і. Скончыў 7 кл. у в. Гудзевічы Мастоўскага р-на, 8-ы ў Лунне Мастоўскага р-на. У 1951-55 вучыўся ў Мінскай музычнай вучэльні. У 1955-59 — у Беларускай кансерваторыі (клас Я. Рубанчыка). Аднačасова з 1956 — артыст аркестра Беларускага тэатра юнага гледача, з 1959 іграе ў канцэртна-эстрадным аркестры Беларускага радыё і тэлебачання. У 1961-65 — у сімфанічным аркестры Беларускай філармоніі. Вучыўся ў аспірантуры Маскоўскай кансерваторыі ў 1960-67, аднačасова іграў у сімфанічным аркестры Усесаюзнага радыё і тэлебачання. З 1967 выкладае ў класе трамбона Беларускай кансерваторыі (у 1969-72 — загадчык кафедры духавых і ўдарных інструментаў). У 1972-75 — прафесар Каірскай кансерваторыі. З 1975 зноў выкладае ў Беларускай кансерваторыі (акадэміі музыкі), у 1975-81 быў загадчыкам кафедры духавых і ударных інструментаў. Выступаў як трамбаніст з сольнымі нумарамі на беларускім радыё і тэлебачанні, на канцэртных пляцоўках Беларусі, Расіі. Аўтар многіх навуковых і навукова-метадычных прац, прысвечаных ігры на трамбоне.

**Лазараў Мікалай Аляксандравіч** (25.08.1905, мяст. Смаргонь — 16.01.1980), беларускі спявак (драматычны тэнар). Заслужаны артыст Беларусі (1954). У 1921-37 працаваў на чыгунцы ў Жлобіне, дзе спяваў на аматарскай сцэне. У 1937-41, 1944-61 — саліст Беларускага тэатра оперы і балета. Выканаў партыі Міхася ("Міхась Падгорны" Я. Цікоцкага), Сяргея ("Алеся" Я. Цікоцкага), Мечыслава ("Кастусь Каліноўскі" Д. Лукаса), Нупрэя ("Яснае світанне" А. Туранкова), Вакулы ("Чаравічкі" П. Чайкоўскага), Германа ("Пікавая дама" П. Чайкоўскага), князя ("Русалка" А. Дарагамыжскага), Еніка ("Прададзеная нявеста" Б. Сметаны), Андрэя ("Запарожац за Дунаем" С. Гулак-Арцямоўскага), Стэфана ("Страшны двор" С. Манюшкі), Сабініна ("Іван Сусанін" М. Глінкі), Хазэ ("Кармэн" Ж. Бізэ), Пінкертона ("Чыо-Чыо-сан" Дж. Пучыні).

**Лазінскі Зыгмунт** (5.06.1870, в. Барацін Карэліцкага р-на — 26.03.1932), польскі і беларускі грамадска-культурны дзеяч, каталіцкі духоўнік. Скончыў каталіцкую духоўную семінарыю (1889) і каталіцкую духоўную акадэмію (1893) у Пецярбургу. У 1895 высвечаны на святара. Выкладаў у акадэміі (аднačасова з 1908 у семінарыі). У 1915-16 — капелан у лагеры для інтэрнаваных грамадзянаў Германіі і Аўстра-Венгрыі. З лістапада 1917 — біскуп

Мінскай дыяцэзіі, дзе садзейнічаў замацаванню беларускай мовы ў касцёле. У 1921 арыштоўваўся савецкімі ўладамі. Неўзабаве выехаў разам з Мінскай духоўнай семінарыяй у Навагрудак, пасля ў Пінск. З 1925 біскуп Пінскай дыяцэзіі. Аўтар брашур, артыкулаў (на польс. мове) на рэлігійныя тэмы.

**Лазоўскі Рычард Гжэгажавіч** (11.02.1938, г. Гродна), беларускі спартыўны педагог. Дацэнт (1989). Заслужаны трэнер Беларусі (1987). З сям'і рабочага. Скончыў СШ №6 г. Гродна (1955). Вучыўся ў Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (1955-57), у Беларускім інстытуце фізічнай культуры (1957-61). Працаваў трэнерам па баскетболе ў дзіцячай спартыўнай школе №2 г. Гродна (1961-64). З 1964 — ст. выкладчык, з 1966 — загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Гродзенскага медінстытута (на кафедры падрыхтаваны 42 майстры спорту СССР). У 1969-82 адначасова — трэнер зборнай жаночай каманды Гродзенскай вобл, па баскетболе (была шматразовым прызёрам Спартакіяд БССР, уладальніцай у 1978 кубка БССР). Друкуецца з 1975. Вывучае пытанні аптымізацыі навучальнага працэсу па фізічным выхаванні студэнтаў. Сааўтар "Праграмы па фізічным выхаванні" студэнтаў медыцынскіх ВНУ Беларусі (1997). Суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі па баскетболе (1994). Старшыня (з 1975) Гродзенскай абласной федэрацыі баскетбола. Выбіраўся дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета (1971-79, 1991-95).

**Лазоўскі Уладзімір Міхайлавіч** (14.01.1934, в. Нянькава Навагрудскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1966). Прафесар (1993). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Любча (Навагрудскі р-н). Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1951-56). Працаваў настаўнікам, пасля дырэктарам школы ў в. Слабодка Шаркаўшчынскага р-на (1956-58). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры беларускай мовы БДУ (1958-61). Затым выкладае на гэтай кафедры (у 1966-96 быў намеснікам дэкана філфака). У 1981-85 выкладаў беларускую мову ў Берлінскім універсітэце імя В. Гумбальта. Вывучае лексіку беларускай літаратурнай мовы і народных гаворак. Аўтар падручнікаў і дапаможнікаў для студэнтаў: "Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фразеалогія" (1984), "Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі" (1989). Выдаў даследаванне "Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання" (1994)..

**Лакотка Аляксандр Іванавіч** (25.01.1955, в. Кузьмічы Дзятлаўскага р-на), беларускі этнограф, мастацтвазнавец. Доктар гістарычных навук (1993). З сям'і настаўнікаў. Службовыя перамяшчэнні вымушалі бацькоў пераязджаць. 8-годку скончыў у в. Ісерна на Случчыне, СШ у в. Падарэссе Старадарожскага р-на. У 1972-77 вучыўся на архітэктурным факультэце Беларускага палітэхнічнага інстытута. Працаваў архітэктарам у інстытуце "Праектсельбуд" (1977-78), у рабочай групе па стварэнні Беларускага музея народнага дойлідства і побыту (1978-81), кіраўніком архітэктурнай майстэрні Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута (1982-89). У 1985 скончыў завочна аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі. Быў намеснікам дырэктара Беларускага музея народнага дойлідства і побыту (1989-95). З 1995 — у Інстытуце МЭФ Нацыянальнай Акадэміі навук (загадчыкам аддзела дойлідства, з 1997 — намеснікам дырэктара па навуковай рабоце). Вывучае народныя архітэктурныя традыцыі Беларусі, даўнюю архітэктуру беларускіх гарадоў. Распрацоўвае праекты рэстаўрацыі помнікаў культуры. Выдаў кнігі: "Сцежкамі дзядоў" (1986, у сааўт.), "Беларускае народнае дойлідства: сярэдзіна XIX-XX ст." (1991, на рус. мове), "Сілуэты старога Мінска. Нарысы драўлянай архітэктуры" (1991), "Бераг вандраванняў, ці адкуль у Беларусі мячэці" (1994, у сааўт.), "Пад стрэхамі прашчураў" (1995), "Беларусы. Т. 2. Дойлідства" (1997), "Нацыянальныя асаблівасці архітэктуры Беларусі" (1999).

**Ламан Пётр Аляксандравіч** (11.07.1949, в. Маласельцы Карэліцкага р-на), беларускі пісьменнік (паэт, празаік), артыст тэатра. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1983). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у в. Ярэмічы Карэліцкага р-на. Працаваў трактарыстам. Вучыўся на акцёрскім факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1967-71). З 1971 — акцёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа (Віцебск). Першы верш надрукаваў у 1970. Сааўтар калектыўнага зборніка паэзіі "Нашчадкі" (1979). Выдаў зборнікі паэтычных твораў "Зерне імгненняў" (1983), "Стары млын" (1988). Выйшаў зборнік аповесцяў "Астравы" (1989). Аўтар тэлеп'есы "Мая душа, як ястраб дзікі" (паст. 1990). У тэатры стварыў ролі Міхася ("Трывога" А. Петрашкевіча), Тэймураза ("Не трывожся, мама" Н. Думбадзе), Марцыяна Ропата ("Званы Віцебска" У. Караткевіча), Васіля ("Таблетку пад язык" А. Макаёнка), Сталкаса ("Клеменс" К. Саі), Траньё ("Утаймаванне наравістай" У. Шэкспіра), Жана ("Фрэкен Юлія" Ю. Срындберга) і інш.

**Ланец Станіслаў** (28.02.1934, в. Кукуці Ваўкавыскага р-на), польскі гісторык, педагог. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1991). З сям'і каваля. Скончыў 7-годку ў в. Масевічы (Ваўкавыскі р-н) у 1950. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Крамяніцкай СШ Зэльвенскага р-на ў 1953. Працаваў на будаўніцтве дарогі Пескі-Ваўкавыск. У 1954-56 вучыўся на гістарычным факультэце польскага настаўніцкага інстытута ў Новай Вілейцы. Працаваў інспектарам РайАНА ў Эйшышках (Літва) у 1956-57. З 1957 жыве ў Польшчы. Нядоўга настаўнічаў у пачатковай школе ў Бартошыцах Ольштынскага ваяводства. Вучыўся на гуманітарным факультэце Вышэйшай педагагічнай школы ў Гданьску (1957-60). Настаўнічаў у Гандлёвым і Чыгуначным тэхнікумах у Ольштыне. У 1968-85 працаваў у Сельскагаспадарча-тэхнічнай акадэміі ў Ольштыне (ст. асістэнтам, ад'юнктам). Адначасова ў 1975-80 выкладаў у Вышэйшай педагагічнай школе ў Ольштыне. З 1985 стала тут працуе (з 1988 дацэнтам, з 1992 прафесарам). Кіраваў кафедрай гісторыі ўсходняй Еўропы, узначальваў кафедру гісторыі і культуры ўсходніх славян. Друкуецца з 1966. Даследуе гісторыю польскага і беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Выдаў кнігі: "Партызаны на чыгунцы 1863 года. Чыгуначнікі і чыгунка ў студзеньскім паўстанні" (Варшава, 1974), "Канспірацыя і баявыя дзеянні чыгуначнікаў у студзеньскім паўстанні" (Ольштын, 1976), "Браніслаў Шварц. Рамантык эпохі паўстання" (Ольштын, 1988), "Дзейнасць Францішка Стэрнета ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907" (Ольштын, 1989), "Лідзбарк Вармінскі ў 1945-1988 гадах" (Ольштын, 1992, у сааўт.), "Жыццё вёскі ў ваколіцах Лідзбарка Вармінскага. XIII стагоддзе — 1985 год" (Ольштын, 1992, у сааўт.), "Беларусь у перыяд грамадска-палітычнага крызісу. 1900-1914" (Ольштын, 1993), "Чыгуначнікі Польскага Каралеўства і Беласточчыны ў 1865-1914 гадах" (Ольштын, 1995), "Партызаны паўночна-ўсходніх ускраін у студзеньскім паўстанні. Беларускія землі" (Торунь, 1996).

**Лаўскі Вячаслаў Якубавіч** (27.11.1900, в. Слачва Навагрудскага р-на — 25.09.1951), беларускі грамадска-культурны дзеяч, педагог. З сялянскай сям'і. У 1919-20 арганізоўваў беларускія школы, культурна-асветныя гурткі. Адзін з заснавальнікаў Беларускай школьнай рады (1921). Вучыўся ў Навагрудскай беларускай гімназіі (1920-22), дзе вёў нацыянальную культурна-асветную работу. Затым вучыўся ў Пражскім палітэхнічным інстытуце (1924-29), тут актыўна дзейнічаў у беларускім грамадска-культурным руху студэнтаў. Адзін з заснавальнікаў Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый (1924).

Удзельнік 8-га кангрэса Міжнароднай студэнцкай канферэнцыі ў Празе (1926). Выкладаў у Навагрудскай беларускай гімназіі матэматыку (1930-34). У 1939-41 служыў начальнікам Лідскага дарожнага аддзела. У 1942-44 быў сябрам Лідскай філіі Беларускага нацыянальнага камітэта. Рэпрэсаваны ў 1945, загінуў у канцлагеры ў Комі АССР.

**Лебядзевіч Дзмітры Мікалаевіч** (6.10.1958, в. Замасцяны Шчучынскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1997). З сялянскай сям'і. З ранняга дзяцінства выхоўваўся ў сям'і дзеда. Скончыў СШ у в. Першамайская Шчучынскага р-на (1977). Вучыўся ў Гродзенскай медычнай вучэльні ў 1977-81 (у 1978-80 служыў у войску). Працаваў фельчарам у Гродзенскім доме-інтэрнаце (1981-83). Выкладаў рускую мову і літаратуру ў Навасёлкаўскай СШ Гродзенскага р-на (1983-86), беларускую мову і літаратуру ў Каменскай СШ Гродзенскага р-на (1986-89, з 1987 — намеснік дырэктара школы). У 1988 завочна скончыў аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта. З 1989 выкладае на кафедры рускай і замежнай літаратуры гэтага універсітэта (у 1991-92 — намеснік дэкана філфака). З 1993 — на кафедры беларускай літаратуры універсітэта (з 1998 — на пасадзе дацэнта). З 1998 — загадчык аддзялення беларускай філалогіі філфака Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1990. Вывучае традыцыі антычнасці ў беларускай літаратуры.

**Левін Максім Рыгоравіч** (29.10.1904, г. Слонім — 18.04.1963), рускі антраполаг, этнограф, археолаг. Доктар гістарычных навук (1958). Прафесар (1960). З сям'і лекара. Дзяцінства прайшло ў Слоніме, тут вучыўся ў школе. У 1920-25 вучыўся на прыродазнаўчым аддзяленні фізічна-матэматычнага факультэта Маскоўскага універсітэта, затым у аспірантуры Інстытута антрапалогіі пры гэтым універсітэце. Аначасова працаваў у Музеі народазнаўства (Масква). З 1926 вёў палявыя даследаванні ў Туве, Паўночным Прыбайкаллі, на ўзбярэжжы Ахоцкага мора, на Алтаі. У 1930-33 жыў на Ахоцкім узбярэжжы, вывучаў матэрыяльную культуру, антрапалагічныя асаблівасці мясцовых народаў. Вярнуўшыся ў Маскву, працаваў загадчыкам аддзела Сібіры, вучоным сакратаром Музея народазнаўства. З 1939 — вучоны сакратар Інстытута антрапалогіі пры Маскоўскім універсітэце, адказны сакратар рэдакцыі "Антропологического журнала" (у 1940 завочна скончыў 2-гі Маскоўскі медінстытут). Адначасова выкладае на кафедры антрапалогіі Маскоўскага універсітэта (вядзе курсы этнаграфіі народаў СССР, агульнай этнаграфіі, анатоміі чалавека,

анатоміі мозга). Пасля вайны вёў раскопкі на Амуры, Сахаліне, Чукотцы. Быў намеснікам дырэктара Інстытута этнаграфіі Акадэміі навук СССР (1944-63). Даследаваў пытанні антрапалогіі і этнаграфіі народаў Сібіры, Сярэдняй Азіі, Японіі, агульныя праблемы расазнаўства, параўнальнай анатоміі. Распрацоўваў вучэнне пра гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны і гаспадарча-культурныя тыпы. Друкаваўся з 2-й пал. 20-х. Выдаў даследаванні: "Асновы антрапалогіі" (М., 1955), "Расы, мовы, народы. Нарысы агульнай этнаграфіі. Амерыка. Аўстралія" (М., 1957, у сааўт.), "Народы Сібіры. Нарысы агульнай этнаграфіі. Азіяцкая частка СССР" (М., 1960, у сааўт.), "Нарысы па гісторыі антрапалогіі ў Расіі" (М., 1960).

**Левін Шмар'яху** (1867, мяст. Свіслач — 1935), яўрэйскі пісьменнік, сіяніецкі дзеяч. Доктар філасофіі (1896). У дзяцінстве атрымаў традыцыйную рэлігійную адукацыю. Скончыў у Мінску рэальную вучэльню. У Германіі скончыў Вышэйшую яўрэйскую школу, атрымаўшы званне рабіна. Вучыўся ў Берлінскім і Кенігсбергскім універсітэтах. Вярнуўшыся на радзіму, быў рабінам у Гродне (1896-97), у Екацярынаславе (1898-1904), прапаведнікам у Вільні (1904-06). Удзельнік 5-га і 6-га сіяніецкіх кангрэсаў (1901, 1903). Адзін з арганізатараў "Саюза для дасягнення паўнапраўя яўрэйскага народу ў Расіі" (1905). У 1906 абраны ад Вільні дэпутатам І-ай Дзяржаўнай Думы. У 1908-14 жыў у Берліне, адкуль часта ездзіў з асветніцкімі лекцыямі ў ЗША. У 1914-24 — у ЗША, працягваў тут лекцыйную і публіцыстычную дзейнасць, рэдагаваў штотыднёвік "Хатарэн". Пазней стала жыў у Ізраілі, збіраючы сродкі на карысць сіяніецкіх арганізацый. Кнігі яго выходзілі ў ЗША, Германіі, Ізраілі. Выдаў паэтычны зборнік "Дзесяць паэм" (Вільня, 1899). Частка яго велізарнай публіцыстычнай спадчыны выйшла на англійскай мове ў 1919. У Еўропе на англійскай мове выдадзены ўспаміны: "Дзяцінства ў выгнанні" (1929), "Юнацтва і рэвалюцыя" (1930), "Арэна" (1932).

**Легатовіч Ігнат Сямёнавіч** (10.08.1796, в. Малая Капліца Гродзенскага р-на — 10.10.1867), беларускі і польскі паэт, педагог. З небагатай шляхецкай сям'і. Скончыў дамініканскую школу ў Гродне, факультэт літаратуры і мастацтва Віленскага універсітэта (1817). У 1817-39 — выкладчык лацінскай мовы і літаратуры ў Мінскай гімназіі. У 1839-46 быў інспектарам павятовых школ у Лепелі, Полацку, Вількаміры. Страціўшы зрок, пакінуў службу і вярнуўся ў Мінск, дзе займаўся рэпетытарствам, збіраннем бібліяграфічных рэдкасцяў. Друкаваўся з 1817. Пісаў пераважна павучальныя

двухрадкоўі, эпіграмы. Выдаваў (на польскай мове) маральна-дыдактычныя кнігі для дзяцей і моладзі. Выйшаў яго "Верш з нагоды святкавання імянін я. в. Вінцэнта Гяцэвіча з Гячанаў, губернатара Мінскага..." (1822). Выйшлі ў Вільні "Эпіграмы" (1848, 1854), "Ісціны, правілы жыцця, максімы, погляды, прыказкі і разнастайныя думкі..." (1848), "Гасцінец для дзетак, або ісціны і маральныя погляды для спажытку навучэнцаў абодвух полаў" (1849), "Дараднік для моладзі, або ісціны і маральныя погляды для спажытку навучэнцаў абодвух полаў" (1851), "Правілы шчырага жыцця, або розныя думкі розных аўтараў, прыстасаваныя для маральнай навукі" (1852), "Права, або маральная навука для дзяцей" (1853), "Апафегматы" (1854), "Думкі" (1857), "Даўняя прыстойнасць нашых продкаў, або нормы прыстойнасці, далікатнасці і выхаванасці" (1858), "Гасцінец для дзетак, або ісціны і маральныя погляды, выдадзеныя дзеля спажытку навучэнцаў абодвух полаў" (1859). Вершы на беларускай мове кніжкай не выйшлі, хаця ў друк траплялі. Перакладаў з рускай і французскай моваў.

**Лейка Кандрат Фёдаравіч** (5.09.1860, в. Збочна Слонімскага р-на — 19.09.1921), беларускі пісьменнік (празаік, драматург, паэт), педагог. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай вучэльні ў Азярніцы (Слонімскі р-н). Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1879). Працаваў настаўнікам у Косаве на Брэстчыне. У 1884 з-за стану здароўя вымушаны перабрацца ў Харкаўскую губерню, дзе настаўнічаў у Аснавянскай народнай вучэльні. З 1886 — інспектар Харкаўскай павятовай вучэльні для сляпых дзяцей. Наведваў як вольны слухач лекцыі ў Харкаўскім універсітэце. Друкаваў артыкулы на педагагічныя тэмы ў пецярбургскіх выданнях ("Слепец", "Школа и жизнь"), харкаўскіх ("Южный край", "Харьковские губернские ведомости"). З 1911 працаваў загадчыкам навучальнага аддзела ў павятовым земстве г. Валкі (Харкаўская губ.). У 1918 цяжка захварэў і пераехаў у г. Здалбудаў (Ровенская губ.), дзе прыкаваны да ложка не траціў надзеі вярнуцца на радзіму. З 1911 друкаваўся ў "Нашай ніве". Выдаў п'есу для лялечнага тэатра "Снатворны мак" (Вільня, 1912). Выйшла яго "Руская азбука. Падручнік роднай граматы для класнага і хатняга ўжытку" (Харкаў, 1893). Падрыхтаваў да друку зборнік твораў "Засеўкі", які не выйшаў у сувязі з І-ай сусветнай вайной.

**Ленскі Хаім** (1905, г. Слонім — 1943), яўрэйскі пісьменнік (паэт, празаік). Пісаў пераважна на іўрыце. Традыцыйную яўрэйскую адукацыю атрымаў у доме дзеда ў Слоніме. З 1921 — у Вільні, дзе вучыўся ў яўрэйскай настаўніцкай семінарыі таварыства "Тарбут".

Восенню 1923 адгукнуўся на запрашэнне бацькі, які працаваў горным інжынерам у Баку, і перайшоў у СССР. На мяжы быў затрыманы. З 1924 — у Баку, зарабляў тут на жыццё выкладаннем іўрыту і публікацыяй твораў на ідзіш. У 1925-34 жыў у Ленінградзе, працаваў рабочым-металістам у арцелі "Амал". Перасылаў вершы ў Ізраіль, дзе яны друкаваліся ў літаратурных альманахах у 1929-39. У 1934 рэпрэсаваны і зняволены ў канцлагеры ў Горнай Шорыі. Вызвалены ў 1939, жыў у Малой Вішары ля Ленінграда. У 1941 зноў рэпрэсаваны, загінуў у лагеры. Пісаў вершы, балады, паэмы, апавяданні. Пераклаў на іўрыт "Мцыры" М. Лермантава. Творы яго выдаваліся ў Ізраілі пасмяротна.

**Летка Іван Антонавіч** (14.06.1935, маёнт. Масаляны Бераставіцкага р-на — 23.08.1999), беларускі паэт. Сябра Саюза пісьменнікаў Расіі (1978). З сям'і парабкаў. Рана страціў бацькоў і жыў са старэйшымі братамі і сёстрамі. Вучыўся ў Масалянскай СШ (1944-54). У 1954 нядоўга працаваў у лялечным тэатры ў Мінску. У тым жа годзе пераехаў да брата ў Маскву, дзе паступіў у медычную вучэльню. Служыў у войску (1954-55). Вярнуўшыся ў Маскву, працаваў грузчыкам на заводзе буддэталяў №5 (1956-58), дэкаратарам у Цэнтральным тэатры Савецкай Арміі (1958-60). Затым — на заводзе імя Ліхачова ў 1960-85 (награвальшчыкам у кавальскім цэху, кавалём, майстрам, начальнікам участка, намеснікам начальніка кавальскага цэха па вытворчасці, інжынерам управы кадраў). Супрацоўнічаў у заводскай шматтыражцы. Завочна скончыў Літаратурны інстытут у Маскве (1967). Друкаваўся як паэт з 1957. Выдаў кнігі паэзіі "Тры крокі ад сонца" (1967), "Тры верасні" (1970), "Грамы на зімоўцы" (1974), "Агні ў пралётах" (1991).

**Леўчык Галыш** (сапр. Ляўковіч Ілья Міхайлавіч, 7.08.1880, г. Слонім — верасень 1944), беларускі паэт. З сям'і каваля. Скончыў у Слоніме павятовую вучэльню. Служыў пісарам (у канцылярыях міравых суддзяў, у каморніка, судовага следчага). З 1904 — у Варшаве, дзе знайшоў працу чарцёжніка, быў сябрам варшаўскага беларускага гуртка (1912-14). У пач. 20-х спрабаваў перабрацца ў Вільню, але не знайшоў працы. Зведваў беспрацоўе ў Варшаве. Стварыў тут беларускае зямляцтва, вёў культурна-асветную работу. Кожнае лета прыязджаў у Слонім. Восенню 1939 сустрэў тут савецкія войскі. Неўзабаве вярнуўся ў Варшаву. Друкаваўся з 1908 у "Нашай ніве", у 20-30-я — у часопісах "Студэнцкая думка", "Маланка", "Нёман", "Хрысціянская думка", "Заранка". Выдаў зборнік лірыкі "Чы-

жык беларускі" (Вільня, 1912). Пісаў паэмы, празаічныя замалёўкі, беларусазнаўчыя артыкулы, вершаваныя апрацоўкі фальклору, перакладаў польскіх і рускіх паэтаў. Займаўся жывапісам, складаў музыку. Калекцыянаваў кніжныя, мастацкія, этнаграфічныя каштоўнасці. Падрыхтаваў зборнікі лірычных вершаў, трыялетаў, памфлетаў, пераклад паэмы А. Міцкевіча "Дзяды", якія не выйшлі з друку. Выпушчаны зборнік яго выбраных твораў "Доля і хлеб" (1980).

**Лецка Раман Сцяпанавіч** (22.10.1909, в. Вярбіцы Навагрудскага р-на — 4.11.1993), беларускі краязнавец, калекцыянер. З сялянскай сям'і. Скончыўшы 7-годку (1926), вучыўся ў Навагрудскай беларускай гімназіі. У 1931 паступіў на мастацкі факультэт Віленскага універсітэта. Праз год перавёўся ў Варшаўскую акадэмію мастацтваў. У 1934 пакінуў вучобу з-за недахопу сродкаў. Скончыў дарожныя курсы і працаваў тэхнікам-чарцёжнікам у Навагрудскай павятовай, пазней гарадской управе. У 1939-41 — загадчык гаркамгаспа, пасля — рамбудканторы пры гаркамгаспе ў Навагрудку. У 1941-44 быў бухгалтарам у гандлёвым таварыстве "Усход" у Навагрудку. Летам 1944 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і высланы ў канцлагер. Вызвалены ў 1949. Працаваў тэхнікам-нарміроўшчыкам у Навагрудскай ДЭУ-10. Збіраў матэрыялы пра Навагрудчыну — рэдкія кнігі, паштоўкі, дакументы, гравюры, успаміны, археалагічныя, этнаграфічныя рэчы (значная частка іх — у Навагрудскім гістарычна-краязнаўчым музеі). Працаваў як жывапісец, графік (алей, аловак), пісаў партрэты, пейзажы. Аўтар многіх краязнаўчых артыкулаў на тэмы Навагрудчыны.

**Лецка Яўген Рыгоравіч** (20.04.1944, в. Пабрэззе Навагрудскага р-на), беларускі пісьменнік (крытык і літаратуразнавец, празаік). Кандыдат філалагічных навук (1980). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1977). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў Касым Двары, 10 кл. у Нягневічах (Навагрудскі р-н). Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1962-67). Падчас вучобы працаваў электракаршчыкам на падшыпнікавым заводзе ў Мінску, настаўнічаў у Бярэзінскім р-не. Скончыўшы універсітэт, быў інструктарам райкама камсамола, карэспандэнтам-арганізатарам раённага радыё ў Карэлічах. У 1968-71 вучыўся ў аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. Працаваў у гэтым інстытуце ў 1971-86. У 1986-97 — у выдавецтве "Мастацкая літаратура" (з 1987-загадчыкам аддзела крытыкі). З 1998 — у рэдакцыі газеты "Голас Радзімы". Кіраваў школай юнага літаратара пры Саюзе пісьменнікаў

Беларусі (1984-86). Быў старшынёй Рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" (1990-93). З 1994 — кіраўнік выдавецкага фонду "Бацькаўшчына". Друкуецца як літаратуразнавец з 1972. Выдаў брашуры "Беларуская літаратура за гады савецкай улады" (1973), "Вялікая Айчынная вайна ў беларускай прозе" (1979), даследаванні "Выхаваўчая роля літаратуры" (1980), "Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка" (1985). Выйшлі яго аповесці "Па цаліку" (1977), "Дарога ў два канцы"(1981, у перакладзе на рускую мову — у Маскве ў 1984). Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў пра Я. Купалу, Б. Тарашкевіча. Друкуе публіцыстыку, нарысы, пераклады з рускай, украінскай, польскай літаратур. Складальнік літаратуразнаўчых і літаратурна-мастацкіх зборнікаў.

**Ліберман Ахарон** (1845, мяст. Лунна Мастоўскага р-на — 1880), яўрэйскі публіцыст, выдавец. З сям'і журналіста. Атрымаў традыцыйнае рэлігійнае выхаванне. Вучыўся ў яўрэйскай духоўнай вучэльні ў Вільні (1861-67). Настаўнічаў у Сувалках (Польшча). У 1869 стаў вольным слухачом Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Зблізіўся з рэвалюцыйным гуртком прыхільнікаў П. Лаўрова. Апублікаваў у 1873 у часопісе "Вперёд" серыю карэспандэнцый пра становішча рабочых-яўрэяў у Беларусі. Вярнуўшыся ў Вільню, стварыў яўрэйскі сацыялістычны гурток, займаўся сацыялістычнай прапагандай. У 1875 уцёк ад арышту ў Лондан, дзе супрацоўнічаў у часопісе "Вперёд", заснаваў "Саюз яўрэяў-сацыялістаў". З 1876 — у Вене, тут выдаваў сацыялістычны часопіс "Ха-эмет". У 1878 зняволены ў турме ў Берліне. У 1880 выехаў у ЗША. Зборнікі яго артыкулаў выдаваліся ў Ізраілі ў 30-40-я гг. XX ст.

**Ліневіч Яраслаў Львовіч** (16.01.1932, мяст. Беліца Лідскага р-на), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1961). Заслужаны архітэктар Беларусі (1982). Скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут (1958). Працаваў у Віцебскай абласной філіі інстытута "Белдзяржпраект" (1958-62), у інстытуце "Белдзяржпраект" (1962-71), у Мінскпраекце (1971-74). У 1974-85 — намеснік начальніка Галоўнай архітэктурна-планіровачнай управы Мінскага гарвыканкама. Быў галоўным архітэктарам БелНДІПгорадабудаўніцтва (1985-88), начальнікам аддзела горадабудаўніцтва Дзяржбуда Беларусі. З 1989 — начальнік Галоўмінскархітэктуры, галоўны архітэктар г. Мінска. У 1975-77 — старшыня ўправы Саюза архітэктараў Беларусі. Асноўныя работы (у сааўт.): генплан Брэста, праекты планіроўкі і забудовы мікрараёнаў у Гродне, Віцебску, Магілёве,

Барысаве, Новаполацку, Салігорску, беларускага квартала раёна Чыланзар у Ташкенце, праекты планіроўкі і забудовы цэнтра воднa-зялёнага дыяметра Мінска, генплана і прыгараднай зоны Мінска да 2000 г. Сааўтар помніка Ф. Скарыну для Мінска.

**Ліпінскі Цімафей** (24.01.1797, мяст. Дзярэчын Зэльвенскага р-на -7.09.1856), беларускі і польскі гісторык, географ, філолаг, калекцыянер, краязнавец. Брат К. Лявоцкай. З сям'і памешчыка. Рана страціў бацькоў. Пачатковую адукацыю атрымаў у родных мясцінах. Пад апекаю дзядзькі вучыўся ў ліцэі ў Варшаве (з 1811). У 1825 скончыў мастацкі факультэт Варшаўскага універсітэта. Быў ад'юнктам у палітэхнічным інстытуце ў Варшаве. Удзельнік паўстання 1830-31, вёў падрабязны дзённік паўстання (выдадзены ў Кракаве ў 1881 як "Нататкі з 1825-1831 гг."). Выкладаў гісторыю і геаграфію ў акруговай, затым павятовай рэальнай школе ў Варшаве (1833-51). Быў сталым супрацоўнікам "Biblioteki Warszawskiej" у 1842-54. Шмат падарожнічаў па Беларусі і Польшчы як краязнавец, даследчык даўніны. Збіраў рукапісы, манеты, дакументы, медалі, творы фальклору, тапонімы. Навуковую працу вёў з часоў студэнцтва. З М. Валійскім выдаў даследаванне "Старажытная Польшча з гістарычнага, геаграфічнага, статыстычнага пунктаў гледжання". Т. 1-3 (Варшава, 1843, 1846, 1850). Пазней Ф. Марціноўскі падрыхтаваў 2-е, дапоўненае выданне (Т. 1-4, Варшава, 1885-86). У "Bibliotece Warszawskiej" друкавалася яго гісторыя газет у Польшчы, "Гістарычныя драбніцы з XVIII ст.", а таксама "Слоўнік прыказак, прытчаў, афарызмаў і спосабаў выказвання". Падрыхтаваў адзін з найбольш значных для таго часу прыватных нумізматычных збораў. Склаў збор біяграфій вядомых людзей Рэчы Паспалітай XVIII ст. Быў сябрам навуковага таварыства ў Кракаве, геаграфічнага таварыства ў Пецярбургу, таварыства сяброў навук у Варшаве.

**Ліс Арсень Сяргеевіч** (4.02.1934, в. Вётхава Смаргонскага р-на ), беларускі фалькларыст, літаратуразнавец, культуролаг. Доктар філалагічных навук (1996). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1967). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў Залессі (Смаргонскі р-н), СШ — у Смаргоні. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1951-56). Настаўнічаў, загадваў педкабінетам РайАНА ў Шаркаўшчыне (1956-57), працаваў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР (1957-59). Быў аспірантам сектара фальклору ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (1959-62).

Затым працуе ў гэтым інстытуце. Друкуецца з 1955. Аўтар шматлкіх арыкулаў, нарысаў, эсэ, рэцэнзій на тэмы беларускай народнай творчасці, літаратуры, жывапісу, музыкі, друку, культурнага жыцця Заходняй Беларусі 20-30-х. Выдаў манаграфіі "Браніслаў Тарашкевіч" (1966), "Мікола Шчакаціхін: Хараство непазнанай зямлі" (1968), "Пётра Сергіевіч" (1970), "Купальскія песні" (1974), "Пякучай маланкі след: Эцюд да партрэта мастака Горыда" (1981), "Вечны вандроўнік" (1984), "Валачобныя песні" (1989), "Жніўныя песні" (1993), "Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў" (1998), зборнік артыкулаў "Песню — у спадчыну" (1989), артыкулаў і эсэ "Цяжкая дарога свабоды" (1994). Сааўтар даследавання "Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць" (1967), навучальных дапаможнікаў для ВНУ "Беларуская народнапаэтычная творчасць" (1979), "Беларуская вусна-паэтычная творчасць" (1988). Адзін з укладальнікаў (каментатар, аўтар уступнага артыкула) акадэмічных тамоў фальклору "Жніўныя песні" (1974), "Восеньскія і талочныя песні" (1981), "Купальскія і пятроўскія песні" (1985), адзін з укладальнікаў зборніка "Максім Гарэцкі. Успаміны, артыкулы, дакументы" (1984). Склаў зборнікі "Беларускія песні" (1970), "Браніслаў Тарашкевіч. Выбраная крытыка, публіцыстыка, пераклады" (1991), "Паэзія беларускага земляробчага календара" (1992) і інш. Стварыў сцэнарыі дакументальных фільмаў пра людзей беларускай культуры "Песня на ўсё жыццё" (1984, у сааўт.), "Прысады жыцця" (1985, у сааўт.), "Зямля Тарашкевіча" (1991, у сааўт.), "Аркадзь Смоліч" (1992), "Дзядзька Уласаў" (1992), "Адвечныя званы" (1993). Друкаваў вершы.

**Лісоўскі Адам Восіпавіч** (18.01.1884, в. Карэнды Смаргонскага р-на — 9.10.1929), беларускі грамадска-культурны дзеяч, каталіцкі святар. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1902), Пецярбургскую каталіцкую духоўную акадэмію (1906). Актыўна ўдзельнічаў у беларускім руху ў Пецярбургу. Працягваў хрысціянскае навучанне ў Інсбруку (1908-09) і Мюнхене (1909-10). Служыў вікарам, прэфектам, пробашчам у розных мясцінах Беларусі. У касцельных казаннях, гутарках з насельніцтвам будзіў беларускую свядомасць людзей. У 1917-22 служыў на Міншчыне, арыштоўваўся савецкімі ўладамі за абарону касцельнай маёмасці. Быў зняволены ў турмах Мінска і Масквы (1922-25). У выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчаю і СССР прыбыў у Заходнюю Беларусь. Быў капеланам Пінскай капітулы, пробашчам у розных парафіях. Мацаваў аўтарытэт роднага слова сярод насельніцтва. Пераклаў на беларускую мову "Новы Запавет".

**Лобур Тамара Рыгораўна** (дзявоч. Мейсак, 1.01.1938, мяст. Смаргонь), беларускі педагог. Заслужаная настаўніца Беларусі (1976). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ ў Смаргоні. Па спецыяльнасці "нямецкая і англійская мовы" скончыла Мінскі педінстытут замежных моваў (1959). Працавала настаўніцай Войстамскай СШ Смаргонскага р-на (1959-60), Смаргонскай СШ №1 (1960-67), Смаргонскай СШ №3 (1967-78). Затым з сям'ёй пераехала ў Гродна, дзе настаўнічала ў СШ №7 (1978-80), была метадыстам Гродзенскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў (Гродзенскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў адукацыі) у 1980-97.

**Лойка Алег Антонавіч** (1.05.1931, г. Слонім), беларускі пісьменнік (паэт, празаік, крытык і літаратуразнавец, перакладчык), педагог. Доктар філалагічных навук (1969). Прафесар (1971). Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1989). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1960). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990). З сям'і фельчара. Скончыў СШ у Слоніме. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1948-53), у аспірантуры на кафедры беларускай літаратуры БДУ (1953-56). З 1956 выкладае на гэтай кафедры, з 1985 — загадчык кафедры, з 1991 — загадчык кафедры беларускай літаратуры ХХ ст. У 1990-96 — дэкан філфака БДУ. Кіраваў літаратурным аб'яднаннем БДУ "Узлёт" (1964-89). Друкуе вершы з 1943. Выдаў кнігі паэзіі "На юначым шляху" (1959), "Задуменныя пералескі" (1961), "Дарогі і летуценні" (1963), "Блакітнае азерца" (1965), "Каб не плакалі кані" (1967), "Дзівасіл" (1969), "Шчырасць" (1973), "Пачуцці" (1976), "Лінія жыцця" (1978), "Няроўныя даты" (1983), "Грайна" (1986), "Балады вайны і міру" (1988), "Талая вясна" (1990), "Трэці золак" (1993), "Посах душы" (1997). Выйшлі зборнікі вершаў для дзяцей "Як Тоня рэха шукала" (1962), "Карагод дзівосных прыгод" (1966), "Каля млына" (1972), "Дзе хто начуе?" (1977), "Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй" (1984), "Кніжка Надзейкі" (1987), кнігі выбранай паэзіі "Калі ў дарозе ты" (1971), "Скрыжалі" (1981), "Пралескі ў акопах" (1987), "Выбраныя творы ў двух тамах" (1992). Як празаік выпусціў раманы-эсэ "Як агонь, як вада..." (1984), "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае" (1990), аповесць "Скарына на Градчанах" (1990). Выдаў літаратуразнаўчыя даследаванні "Адам Міцкевіч і беларуская літаратура" (1959), "Новая зямля" Якуба Коласа: Вытокі, веліч, хараство" (1961), "Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі" (1963, у сааўт.), "Максім

Багдановіч" (1966), "Беларуская паэзія пачатку XX ст.: Некаторыя заканамернасці і асаблівасці" (1972), "Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд" (1982, у сааўт.), "Кастрычнік і беларуская літаратура" (1987), зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў "Сустрэчы з днём сённяшнім" (1968), "Паэзія і час" (1981), навучальны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў "Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд". Ч. 1-2 (1977, 1980, 2-е выд. 1989). Аўтар навучальных праграм па беларускай літаратуры для ВНУ. У перакладах на рускую мову ў Маскве выйшлі зборнікі яго паэзіі (у 1971, 1976, 1981), раманы-эсэ серыі ЖЗЛ (у 1982, 1989). Зборнік вершаў для дзяцей у перакладзе на польскую мову выйшаў у Мінску (у 1981). Перакладае паэзію з розных моваў. У яго перакладах выйшлі кніжкі паэзіі П. Верлена "У месяцавым ззянні" (1974), Ё. -В. Гётэ "Спатканне і ростань" (1981), Ф. Шылера "Улада песняспеву" (1997). Аўтар шматлікіх часопісных і энцыклапедычных артыкулаў, рэцэнзій, аглядаў, культуралагічных публікацый. Аўтар песень на ўласныя словы. Складальнік і рэдактар зборнікаў мастацкай літаратуры. Сябра Беларускага камітэта славістаў.

**Лойка Генадзь Станіслававіч** (9.03.1962, в. Мікелеўшчына Мастоўскага р-на), беларускі скульптар. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1993). У роднай вёсцы скончыў 4 кл. (1973) і паступіў у Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве (скончыў у 1980). Вучыўся на аддзяленні скульптуры Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1981-86). Служыў у войску (1986-88). Працаваў у Беларускім музеі народнага дойлідства і побыту (1988-89), гістарычна-культурным запаведніку "Заслаўе" (1989-91), у творчых майстэрнях З. Азгура (1991-93). Адначасова з 1992 выкладае ў Беларускім каледжы мастацтваў. Працуе пераважна ў галіне станковай скульптуры (партрэт, кампазіцыя), дробнай пластыкі. У выставах — з 1987. Сярод твораў: "Музыкі" (1983), "Браніслаў Тарашкевіч" (1984), "Францішак Скарына" (1986), "Да зброі!" (1988), "Страшны суд" (1990), "Рэха турынага рыку" (1990), "Загадка знака Скарыны" (1990), "Вянок маладым тутэйшым паэтам" (1991), "Час зніча" (1992), рэльефны трыпціх "Шлях апосталаў" (1993). З канца 80-х стварае керамічныя медалі (нізкі "Гербы беларускіх гарадоў", "Маладая паэтыцкая Беларусь"). Керамічная плакетка "Зянон Пазняк" пачынае серыю "Рыцары нацыі". Аўтар надмагілляў пісьменнікам М. Стральцову, М. Дубянецкаму.

**Лойка Марыя Восіпаўна** (11.05.1954, г. Гродна), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1990). Дацэнт (1993). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №6 г. Гродна (1971). Працавала настаўніцай англійскай мовы Луцкаўлянскай СШ Гродзенскага р-на, адначасова з 1973 — лабаранткай кафедры замежных моваў Гродзенскага педінстытута. У 1975-79 вучылася на факультэце англійскай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў. З 1980 выкладае на кафедры замежных моваў Гродзенскага універсітэта (у 1986-89 — аспірантка кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства гэтага універсітэта). Друкуецца з 1987. Напрамкі навуковых інтарэсаў — кантрастыўная лінгвістыка, функцыянальна-семантычныя праблемы, методыка выкладання замежных моваў. Сааўтар навучальнага дапаможніка "Руска-беларуска-англійскі слоўнік для юрыдычных інстытутаў і факультэтаў" (Гродна, 1997 на рус. мове), метадычнага дапаможніка "Заданні для чытання на англійскай мове тэкстаў па спецыяльнасці правазнаўства" (Гродна, 1996, на рус. мове).

**Лойка Міхаіл Фёдаравіч** (14.11.1892, мяст. Ярэмічы Карэліцкага р-на — 28.09.1937), беларускі эканаміст, географ, матэматык. З сялянскай сям'і. Скончыў агульнаадукацыйныя курсы А. Чарняева ў Пецярбургу (1912). З 1921 — у Маскве, быў загадчыкам Бюро беларускіх секцый Наркамасветы РСФСР, прадстаўніком Наркамасветы БССР пры Наркамасвеце РСФСР. У 1924 выкладаў геаграфію ў беларускім сектары Камуністычнага універсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду. У 2-ой пал. 20-х вучыўся ў Маскоўскім інстытуце народнай гаспадаркі. Актыўна ўдзельнічаў у беларускім студэнцкім руху ў Маскве. У 1931-33 працаваў вучоным сакратаром, намеснікам дырэктара Інстытута эканомікі Беларускай акадэміі навук. Пасля — загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі Мінскага педінстытута. У 1936 рэпрэсаваны, пазней расстраляны. Выдаў кнігі "Фізічная геаграфія" (1932, у сааўт.), "Геаграфія. Фізічная і палітычная карта свету". Вып. 1-2 (1932-33, у сааўт.). У 20-я — пач. 30-х выпусціў некалькі навучальных дапаможнікаў па матэматыцы.

**Лойка Павел Алегавіч** (12.07.1958, г. Слонім), беларускі гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1984). Сын А. Лойкі. З дзяцінства жыў з бацькамі ў Мінску, дзе скончыў СШ №60. Скончыў гістфак БДУ (1983). Працаваў у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Адначасова з 1994 — загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ. З 1998 — дактарант БДУ.

Даследуе праблемы дзяржаўна-палітычнага жыцця ВКЛ, аграрнай гісторыі Беларусі. Друкуецца з 1982 у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі. Выдаў даследаванне "Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI-XVIII стст." (1991), падручнік для 7 кл. "Гісторыя Беларусі" (1993, 4-е выд. 1998). У сааўтарстве выйшлі працы "Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчыны" (1988), "І ўзняўся люд просты" (1992), "Нарысы гісторыі Беларусі". Ч. I (1994), "Беларусазнаўства" (1997), падручнік для 10 кл. "Гісторыя Беларусі" (1997). Адзін з рэдактараў і складальнікаў навуковых зборнікаў і манаграфій па гісторыі.

**Лугачова Тацяна Аляксееўна** (дзявоч. Аўчыннікава, 16.12.1955, г. Гродна), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1981). Дацэнт (1988). Скончыла ў Гродне СШ № I (1972), гістарычна-педагагічны факультэт Гродзенскага педінстытута (1977). Працавала лабарантам кафедры палітэканоміі і навуковага камунізму гэтага інстытута (1977-78). У 1978-81 — аспірантка кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў БДУ. Затым выкладае на кафедры гісторыі КПСС (1981-89), на кафедры палітычнай гісторыі (1989-91), на кафедры гісторыі Беларусі (з 1991) Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1981. Вывучае гісторыю Заходняй Беларусі 20-30-х, пытанні методыкі выкладання гісторыі ў ВНУ.

**Лур'е Наях Гершалевіч** (24.12.1886, мяст. Блошна Слонімскага р-на — 18.05.1960), яўрэйскі пісьменнік. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1934). З сям'і смалакура. Вучыўся ў хедэры, у ешыботах Слоніма, Слабодкі (Астравецкі р-н). Працаваў грузчыкам, будаўніком, настаўнікам. Пераязджаў у пошуках заробку. Жыў у Літве, Польшчы, на Украіне. У 1907-08 быў зняволены царскімі ўладамі за рэвалюцыйную дзейнасць. З сакавіка 1917 у расійскім войску. З 1920 — у Чырвонай Арміі. У 1921 узначаліў яўрэйскія педагагічныя курсы ў Кіеве, дзе выкладаў літаратуру і педагогіку. Пісаць пачаў на іўрыце, затым перайшоў на ідзіш. Друкаваў пераважна апавяданні, таксама п'есы для дзяцей, перакладаў творы класікаў дзіцячай літаратуры (Г. Х. Андэрсан, К. Гаўх і інш.). Літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы змяшчаў у газетах Бунда, яўрэйскіх часопісах Варшавы, Мінска, Адэсы, Кіева. Выдаў зборнікі апавяданняў "Вольная зямля" (Варшава, 1911), "Сябра" (Варшава, 1911), "Масты гарацъ" (Харкаў, 1929), "Старэйшы на адну ноч" (Харкаў-Кіеў, 1934), "Звычайнае жыццё" (М., 1935), "Эле Ёрш" (Кіеў, 1938), "Выбраныя

апавяданні" (Кіеў, 1940), "Ля адкрытай ямы" (М., 1943), аповесць "Лясная цішыня" (М., 1957 у рускім перакладзе аўтара).

**Лябецкая Алена Канстанцінаўна** (15.07.1903, хутар Лагуцева Дзятлаўскага р-на — 28.01.1982), беларуская грамадска-культурная дзяячка. З сялянскай сям'і. У 1910 бацькі пераехалі ў Гродна. Тут вучылася ў падрыхтоўчым класе жаночай гімназіі. З 1914 — у бежанстве. У г. Калуга вучылася ў жаночай гімназіі (1914-18), эвакуяванай з Лодзі. Вярнуліся дамоў у 1920. З сярэдзіны 20-х уключылася ў грамадска-вызваленчы і культурны рух. Стварала гурткі ТБШ. Арганізатар і ўдзельніца беларускіх спектакляў, канцэртаў на Дзятлаўшчыне, Слонімшчыне, Зэльваншчыне. З лістапада 1927 — сакратар Слонімскай акруговай управы ТБШ. На І-ым з'ездзе ТБШ (1927) абрана старшынёй рэвізійнай камісіі, на 2-ім з'ездзе (1929) — старшынёй кантрольнай рады ТБШ. Зняволена ў турме ўладамі Польшчы (1928, 1930-33). З 1929 жыла ў Вільні, працавала ў Галоўнай управе ТБШ, загадвала беларускай бібліятэкай-чытальняй. Дэлегат І-га антыфашысцкага кангрэса (1929, Берлін). Сябра заходнебеларускага камітэта па падрыхтоўцы Еўрапейскага сялянскага кангрэса, яго дэлегат. У выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР, апынулася ў 1933 у Мінску. Вучылася на геолага-геаграфічным факультэце БДУ (1934-38), удзельнічала ў рабоце МАДРа. У 1938 рэпрэсавана, зняволена ў канцлагеры ў Усходняй Сібіры. Выйшла на волю ў 1947. Жыла ў Слоніме. Працавала на службе тэхнічнага ўліку ў Белшахтлесе, затым (1951-58) — бухгалтарам сектара кінафікацыі ў аддзеле культуры Слонімскага райвыканкама. Надрукавала ўспаміны пра жыццё 20-х- пач. 30-х.

**Лявінскі Элханан Лейб** (1858, мяст. Падбярозы Смаргонскага р-на — 1910), яўрэйскі журналіст, пісьменнік, сіяніскі дзеяч. Пісаў пераважна на іўрыце. Да 10-гадовага ўзросту вучыўся ў хедэры, затым вучыў бацька, знаўца талмуда. Тры гады наведваў гімназію ў Кіеве. У 1880-82 быў вольным слухачом Харкаўскага універсітэта. У 1889 уступіў у ордэн "Бней-Машэ". З 1895 стала жыў у Адэсе, працаваў агентам вінаробных прадпрыемстваў і актыўна займаўся сіяніскай дзейнасцю. Адзін з стваральнікаў выдавецтва "Морыя" (1901), таварыства па распаўсюджванні мовы іўрыт (1907). У 1910 адкрыў першую на ідзіш штотыднёвую газету ў Адэсе "Гутэн моргэн". Друкаваўся з 1873, пісаў карэспандэнцыі, артыкулы, фельетоны, нарысы. У 1892 апублікаваў у зборніку "Ха — пардэс" палясцінафі-

льскую утопію "Падарожжа ў Эрэц — Ізраэль у 2040 годзе". Збор яго твораў у 3-х тамах выйшаў у Адэсе ў 1911-13.

**Лявоцкая Кацярына** (дзявоч. Ліпінская, 2.10.1799, мяст. Зэльва — 23.02.1890), польская пісьменніца. Сястра Ц. Ліёнскага. З сям'і памешчыка. Рана страціла бацькоў і выхоўвалася ў доме дзядзькі ў Варшаве, атрымала добрую хатнюю адукацыю. Выйшаўшы замуж (1822), займалася грамадска-культурнай дзейнасцю ў Варшаве. Уваходзіла ў варшаўскае таварыства дабрачыннасці. Кіравала літаратурна-мастацкім салонам (1833-62). Друкавалася з 1829. Пісала маральна-дыдактычныя аповесці, драмы, адрасаваныя моладзі і "простаму люду", выступала з перакладамі. Супрацоўнічала з многімі польскімі перыёдыкамі. Асобнымі выданнямі выходзілі ў Польшчы яе драма "Каспар Аўчарэк" (1832), "Апавяданні для дзяцей з праўдзівых здарэнняў" (1837), аповесці "Бервяно ў запас і дом на багне" (1838), "Аповяд старога слугі для сваіх калег" (1840). Пакінула вялікія ўспаміны, фрагменты якіх друкаваліся ў 60-90-я.

**Ляжневіч Алесь** (Аляксандр Францавіч, 1890, в. Сенцяняты Смаргонскага р-на — 1937), беларускі культурны дзеяч, драматург. З сялян. На радзіме скончыў пачатковую школу. Займаўся самаадукацыяй. Актыўна дзейнічаў у Беларускім музычна-драматычным гуртку ў Вільні. У 1914-17 быў у войску, удзельнічаў у І-ай сусветнай вайне. З пач. 1917 — у Адэсе, дзе вядзе сярод бежанцаў-беларусаў культурна-асветную работу. Працаваў у мясцовым тэатры. Кіраваў тэатральным гуртком у Беларускім клубе (1918). У 1919 служыў у Чырвонай Арміі (ваяваў на польскім фронце, працаваў у армейскім палітаддзеле ў Магілёве). У 1920 — у Мінску, іграў на сцэне Белдзяржтэатра, у 1921 быў дырэктарам тэатра. У 1922-26 — дырэктар Беларускай студыі пры Інстытуце тэатральнага мастацтва ў Маскве. У 1927-30 працаваў на кінафабрыцы "Савецкая Беларусь" у Ленінградзе кансультантам, асістэнтам рэжысёра. У 1930 рэпрэсаваны і высланы ў Расію, пазней расстраляны. Друкаваў (з 1924) драмы, камедыі, апрацоўваў для сцэны п'есы рускіх аўтараў, рыхтаваў парады клубным драмгурткам, складаў "зборнікі-дэкламатары".

**Лялько Хрысціна Аляксееўна** (30.03.1956, в. Хадзюкі Лідскага р-на), беларуская пісьменніца (празаік). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1983). З сялянскай сям'і. Скончыла СШ у в. Тарнова Лідскага р-на. Працавала бухгалтарам сельсавета ў Радзівонішках (Лідскі р-н) у 1973-74. У 1974-79 — студэнтка аддзялення беларускай і

рускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Затым — навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Я. Купалы (1979-83), літсупрацоўнік аддзела крытыкі штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" (1983-84). З 1984 працуе рэдактарам аддзела літаратуры ў часопісе "Беларусь", адначасова з 1995 — рэдактар-выдавец часопіса "Наша вера". Творчасць пачыналася з вершаў (першы ў Лідскай райгазеце "Уперад" у 1971). Прозу друкуе з 1979. Выдала кніжкі прозы "Дарога пад гару" (1985), "Світанак над бярозамі" (1989). Аўтар сцэнарыя кароткаметражнага мастацкага фільма "Лёгкі хлеб" (1987). Выйшаў зборнік казак у яе апрацоўцы "Хітрэй свету не будзеш" (1988). У перакладах на рускую мову кніжкі выйшлі ў Маскве (у 1989) і Мінску (1993).

**Ляшчынская Вольга Аляксееўна** (дзявоч. Цыбульная, 30.04. 1946, мяст. Уселюб Навагрудскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1974). Дацэнт (1980). З сям'і рабочага саўгаса. Скончыла СШ ва Уселюбе (1963). Вучылася на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака Мінскага педінстытута (1963-68), у аспірантуры Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (1968-71). Выкладала на кафедры беларускай і рускай моваў, з 1975 — на кафедры беларускай мовы Гомельскага універсітэта. Друкуецца з 1971. Даследуе праблемы словаўтварэння, лексікалогіі, методыкі выкладання беларускай мовы ў сярэдняй і вышэйшай школе. Выйшла яе манаграфія "Марфемны склад і словаўтварэнне ў школе" (Гомель, 1982). Выдала ў сааўтарстве дапаможнікі: "Зборнік практыкаванняў па лексіцы і стылістыцы" (1974), "Педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў" (1983), "Асновы культуры маўлення і стылістыкі беларускай мовы" (1992).

**Мазалеўская Любоў Іванаўна** (12.01.1903, маёнт. Каўшы Мастоўскага р-на — 18.07.1964), беларускі тэатральны рэжысёр, педагог, артыстка тэатра і кіно. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1957). З заможнай сялянскай сям'і. Вучылася дома ў прыватнага настаўніка, у прыходскай школе ў Скідзелі (Гродзенскі р-н) у 1913-15. Затым сям'я выехала ў бежанства. У г. Новазыбкаў Чарнігаўскай губ. вучылася ў гімназіі. У 1917 вярнуліся дадому. Скончыла прыватную гімназію ў Гродне (1918). У 1920 з Чырвонай Арміяй накіравалася на ўсход. Удзельнічала ў вайсковай самадзейнасці, настаўнічала. Скончыла Беларускую тэатральную студыю ў Маскве (1926). Працавала актрысай і рэжысёрам у тэатры імя Я. Коласа (Віцебск) у 1926-30, 36-51, рэжысёрам у тэатры імя Я. Купалы ў 1952-55. У 1930-36 — на кінастудыі "Савецкая Беларусь". У

1953-59 выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Арганізатар і галоўны рэжысёр Беларускага тэатра юнага гледача, дзе працавала ў 1955-61, 1963-64. Паставіла спектаклі па п'есах "Каварства і каханне" Ф. Шылера (1946, у сааўт.), "Маё кафэ" Бернара (1945), "Тайная вайна" В. Міхайлава і Л. Самойлава (1947), "Аксамітны сезон" М. Пагодзіна (1948), "Я хачу дамоў" С. Міхалкова (1949), "Напярэдадні" паводле І. Тургенева (1950), "Яе сябры" В. Розава (1950), "Атэстат сталасці" Л. Гераскінай (1951), "Сям'я Алана" С. Мухтарава (1951), "Макар Дубрава" А. Карнейчука (1952), "Даходнае месца" А. Астроўскага (1953), "Чайка" А." Чэхава (1954), "У добры час" В. Розава (1955), "Твой шлях" В. Розава (1956), "Горад майстроў" Т. Габэ (1956), "Мінулася кату масленіца" А. Астроўскага (1956), "Каханне Ані Бярозкі" У. Пістоленкі (1956), "Папараць-кветка" І. Козела (1957), "За лясамі дрымучымі" А. Вольскага і П. Макаля (1958), "Не верце цішыні" І. Шамякіна" (1956, у сааўт.), "Учора ў Касаткін" А. Зака і І. Кузняцова (1959), "Рэвізор" М. Гогаля (1960, у сааўт.), "Дзяўчына з вяснушкамі" А. Успенскага (1961), "Над хвалямі Серабранкі" І. Козела (1961), "Ганарліўка" Т. Ян (1963), "Свае людзі — паладзім" А. Астроўскага (1964). Выканала ролі (пераважна характарныя): Агата ("Паўлінка"Я. Купалы), Паланея ("Прымакі" Я. Купалы), Сцепаніда ("Пагібель воўка" Э. Самуйлёнка), Караліна ("Вайна вайне" Я. Коласа), Любоў Яравая ("Любоў Яравая" К. Транёва), Дзямідаўна ("Нашэсце" Л. Лявонава), фраў Альбінг ("Здані" Г. Ібсена). Знялася ў фільмах на беларускай кінастудыі: "Жанчына", "Залатыя агні", "Адзінаццатае ліпеня", "Дзеці партызана".

**Мазго Уладзімір Мінавіч** (5.03.1959, мяст. Зэльва), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1984). З сям'і рабочага. У 1966-68 вучыўся ў чыгуначнай СШ №216 г. Тапкі Кемераўскай вобл., дзе бацька працаваў на лесанарыхтоўках. Затым сям'я зноў у Зэльве, тут вучыўся ў СШ (1968-76). З 1976 — студэнт філфака БДУ. З 3-га курса перавёўся на завочнае аддзяленне. Быў карэспандэнтам Хойніцкай райгазеты "Ленінскі сцяг". Служыў у войску (1979-81). Працаваў у Мінску карэспандэнтам шматтыражовай газеты "Інтэграл", выхавальнікам у рабочым інтэрнаце, супрацоўнікам рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач Беларускага тэлебачання (1981-84). З 1984 — рэдактар у выдвецтве "Юнацтва" (у 1985 скончыў БДУ). Друкуе вершы, балады, паэмы, рэцэнзіі, пераклады. Літаратурны дэбют — у Зэльвенскай раённай газеце "Праца" (1972). З 1973 друкуецца ў рэспубліканскіх выданнях. Выйшлі кнігі паэзіі "Пад спеў крыніц" (1982), "Вершаліна" (1987), "Марафон" (1992), зборнікі вершаў для дзяцей

"Калі спрачаюцца маланкі" (1989), "Суседзі па сусвеце" (1994), "Смехапад" (1998). Аўтар тэкстаў многіх папулярных эстрадных песень.

**Мазец Валянцін Генрыхавіч** (6.09.1965, в. Станелевічы Зэльвенскага р-на), беларускі гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1995). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы, у 8-годцы — у в. Дзеркачы (Зэльвенскі р-н), СШ скончыў у Крамяніцы (Зэльвенскі р-н) у 1982. Вучыўся на гістфаку БДУ у 1982-89 (у 1984-86 служыў у войску). Быў аспірантам Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1989-92). З 1992 працуе ў гэтым інстытуце, у аддзеле гісторыі нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі XX ст. Друкуецца з 1992. Аўтар шматлікіх навуковых і папулярных публікацый на тэмы беларускага нацыянальнага руху, беларускай дзяржаўнасці, культуры Беларусі.

**Макавельскі Аляксандр Восіпавіч** (22.07.1884, г. Гродна — 16.12.1969), рускі і азербайджанскі філосаф, педагог. Доктар філасофскіх навук (1921). Прафесар (1918). Акадэмік Акадэміі навук Азербайджана (1949). Заслужаны дзеяч навукі Азербайджана (1930). З сям'і дробнага чыноўніка. Скончыў гімназію ў Гродне (1902), гістарычна-філалагічны факультэт Казанскага універсітэта (1907). У 1907-20 працаваў на кафедры філасофіі гэтага універсітэта (у 1913-15 праходзіў навуковую стажыроўку ў Берліне, Мюнхене, Маскве, Пецярбургу). У 1920-30 — загадчык кафедры псіхалогіі Азербайджанскага універсітэта (Баку). Выкладаў гісторыю філасофіі, логіку, эстэтыку, дыялектычны матэрыялізм, гістарычны матэрыялізм, педагогіку, псіхалогію. Адначасова (у 1926-31) — вучоны сакратар Дзяржаўнай вучонай рады Азербайджана, старшыня яе педагагічнай секцыі. З 1930 працаваў у Азербайджанскай вышэйшай педагагічнай школе і завочнай вышэйшай педагагічнай школе (тут быў рэктарам у 1931-32). Адначасова — у аддзеле педагогікі Азербайджанскага навукова-даследчага інстытута (1931-40). Удзельнік вайны з Германіяй. У 1945-60 працаваў у Інстытуце філасофіі Акадэміі навук Азербайджана (у 1945-50 — дырэктарам). Даследаваў філасофскую спадчыну старажытнай Грэцыі і Рыма, народаў Блізкага Усходу, грамадска-філасофскую думку Азербайджана, праблемы псіхалогіі, педагогікі, логікі. Выдаў даследаванні і навучальныя дапаможнікі: "Уводзіны ў філасофію". Ч. 1-2 (Казань, 1912-16), "Мараль Эпікцэта" (Казань, 1912), "Уяўленне пра душу ў старажытнай Грэцыі" (Варшава, 1913), "Псіхалогія вюрцбургскай школы" (Варшава, 1913), "Дасакратыкі". Ч. 1-3 (Казань, 1914-19), "Дасакратаўская філасофія. Ч. I. Агляд крыніц" (Казань,

1918), "Сафісты". Вып. 1-2 (Баку, 1940-41), "Старажытнагрэчаскія атамісты" (Баку, 1946), "Авеста" (Баку, 1960), "Катэгорыя прычыннасці і законы прыроды і грамадства" (М., 1961). У яго перакладзе і з яго каментарам выдадзены працы старажытнагрэчаскіх філосафаў.

**Максімовіч Вячаслаў Аляксандравіч** (14.04.1944, в. Пяскі Шчучынскага р-на), беларускі спартыўны педагог. Майстар спорту СССР па класічнай барацьбе (1963). Кандыдат педагагічных навук (1991). Дацэнт (1989). Заслужаны трэнер Беларусі (1979). Заслужаны трэнер СССР (1990). Скончыў 7-годку ў в. Новы Двор Шчучынскага р-на (1959), СШ №10 г. Растова-на-Доне (1962). У 1963 паступіў у Беларускі інстытут фізічнай культуры. У 1964-67 служыў у войску. У 1967 перавёўся на завочнае аддзяленне інстытута, які скончыў у 1972. Працаваў намеснікам дырэктара па фізічным выхаванні Гродзенскага заатэхнікума (1967-70). У 1970-97 выкладаў на кафедры фізвыхавання Гродзенскага педінстытута (універсітэта), быў загадчыкам гэтай кафедры у 1990-97. У 1997-99 працаваў у школе вышэйшага спартыўнага майстэрства (Гродна). З 1999 — галоўны трэнер нацыянальнай каманды Беларусі па класічнай барацьбе. Суддзя ўсесаюзнай (вышэйшай нацыянальнай) катэгорыі па класічнай барацьбе (1981). Навуковыя інтарэсы звязаны з спецыяльнасцю трэнера-педагога (друкуецца з 1983). Аўтар падручніка для студэнтаў "Барацьба спартыўная" (Гродна, 1997), метадычных распрацовак па выкладанні класічнай барацьбы. Падрыхтаваў спартсменаў, якія сталі прызёрамі Алімпійскіх гульняў, міжнародных, еўрапейскіх, нацыянальных спаборніцтваў.

**Максімюк Ежы** (18.07.1936, г. Гродна), польскі дырыжор аркестра. Пасля вайны сям'я пераехала ў Польшчу. Скончыў у Варшаве Вышэйшую музычную школу (аддзяленне фартэпіяна, затым кампазіцыі, затым дырыжыравання). Пачынаў працу як піяніст, кампазітар. У 1972 заснаваў Польскі камерны аркестр (рэперутар — ад барока да сучаснай музыкі), з якім выступаў у гарадах Еўропы, ЗША. Адзначаны дыпломамі на міжнародных фестывалях. З 1983 кіраваў сімфанічным аркестрам у Францыі, гастраляваў з ім у Еўропе. З 1990 дырыжыруе аркестрам Англійскай Нацыянальнай оперы ("Дон Жуан" В. Моцарта, "Лятучая мыш" І. Штраўса і інш.). Ганаровы доктар універсітэта ў Глазга (1990).

**Малашкевіч Уладзімір Васілевіч** (1.08.1939, в. Грынкі Свіслацкага р-на), польскі, беларускі, рускі журналіст, выдавец,

пісьменнік. Сябра Саюза польскіх журналістаў (1992). Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1966). Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Задворанцы Ваўкавыскага р-на, у 7-годцы — у Навумавічах (Гродзенскі р-н). Праходзіў 4-гадовы курс лячэння ў дыспансеры Лабна (Гродзенскі р-н). СШ скончыў экстэрнам у 1962. Быў літсупрацоўнікам Свіслацкай райгазеты "Заветы Ильича" (1962-66), працаваў у раённай газеце ў Ашмянах, узначальваў Ашмянскі "Саюздрук", выконваў абавязкі спецкора газеты "Связист Белоруссии". У 1970-72 — загадчык аддзела ў вільнюскай трохмоўнай газеце "Дружба". У 1972-78 жыў з сям'ёй у Польшчы. Заснаваў у г. Забжа (на Шлёнску) газету "Głos górnika", вучыўся завочна на факультэце славянскіх моваў Варшаўскага універсітэта. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў выхавальнікам інтэрната ВА "Азот" у Гродне (1979-84). У 1985-90 — уласны карэспандэнт вільнюскай газеты "Czerwony sztandar". Працаваў на Гродзенскім абласным радыё (1990-91), дзе стварыў рэдакцыю польскіх перадач. Быў галоўным рэдактарам гродзенскай газеты "Głos z-nad Niemna". У 1993 заснаваў выдавецтва "Над Нёманам", выпусціў шэраг кніг. З 1994 выдае часопіс "Целитель". Друкуецца як празаік (з 1960) у Беларусі, Польшчы, ЗША. Выдаў у Гродне зборнік прозы "Каго любілі гэтым летам" (1995, на рускай мове), зборнік прозы і драматургіі "Лёс журналіста" (1996, на польскай мове).

**Малец Іван Васілевіч** (13.01.1908, в. Мольнічы Навагрудскага р-на), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, педагог. Заслужаны настаўнік Беларусі (1966). З сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у роднай вёсцы. Вучыўся ў Навагрудскай беларускай гімназіі (1923-28). Уваходзіў у падпольныя арганізацыі КПЗБ і КСМЗБ, за што быў выключаны з гімназіі. У 1928 перайшоў у СССР. Вучыўся на рабфаку пры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, у Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцяў Захаду (1928-32). Адасланы ў Заходнюю Беларусь для падпольнай работы. У 1932 — першы сакратар ЦК КСМЗБ. У 1933 — сакратар Беластоцкага, Віленскага акруговых камітэтаў КПЗБ. У 1933-36 зняволены польскімі ўладамі ў турме. Быў затым сакратаром Гродзенскага, Слонімскага, Беластоцкага акруговых камітэтаў КПЗБ (1936-38). Зноў зняволены ў турме (1938-39). Пры саветах (1939-41) працаваў дырэктарам мэблевай фабрыкі ў Навагрудку, затым старшынёй калгаса ў Мольнічах. Удзельнік вайны (1941-44). Быў дырэктарам Дома адпачынку ў Савейках Ляхавіцкага р-на (1944-49), загадчыкам Ляхавіцкага РайАНА (1949-52). У 1952-62 — дырэктар Пранчакоўскай

СШ Ляхавіцкага р-на. У 1962 пераехаў з сям'ёй у в. Вялікія Навасёлкі Дзяржынскага р-на, дзе працаваў дырэктарам СШ да 1973 (выкладаў гісторыю). Адначасова выконваў абавязкі парторга мясцовага калгаса "Перамога". Жыве ў Вялікіх Навасёлках.

**Маліноўская Тацяна Рыгораўна** (дзявоч. Петухова, 14.02.1953, г. Гродна), беларускі культуролаг. З сям'і вайскоўца. Скончыла СШ №2 г. Гродна. Вучылася на гістарычна-педагагічным факультэце Гродзенскага педінстытута (1970-75). Працавала ў Гродне метадыстам абласнога Палаца піянераў (1975-76), настаўніцай гісторыі, грамадазнаўства і беларускай літаратуры ў СШ №1 (1976-78), ст. навуковым супрацоўнікам, затым загадчыкам аддзела Гродзенскага абласнога гістарычна-археалагічнага музея (1978-88). У 1988 завочна скончыла аспірантуру на кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Была загадчыцай аддзела інстытута "Гроднапраектрэстаўрацыя". З 1990 — ст. выкладчык кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта. Друкуецца па пытаннях гісторыі культуры з 1978. Вывучае архітэктуру Гродзеншчыны, беларускае народнае мастацтва, выяўленчае мастацтва. Старшыня Гродзенскай філіі Фонду падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Сапегі ў 1996-99.

**Маліноўскі Міхась** (Міхаіл Міхайлавіч, 25.07.1945, в. Угрынь Зэльвенскага р-на), беларускі краязнавец, журналіст. Сябра Саюза журналістаў СССР (1976). Сябра Геаграфічнага таварыства СССР (1979). З сялянскай сям'і. Гадаваўся ў дзіцячым доме №2 у мяст. Парэчча Гродзенскага р-на (1953-62), у Парэчскай СШ скончыў 9 кл. Затым — у Ашмянскай школе-інтэрнаце (1962-64). Служыў у войску (1964-91) у Беларускай, Забайкальскай, Далёка-Усходняй, Прыволжскай, зноў Беларускай ваенных акругах. Падчас службы экстэрнам здаў экзамен за Кіеўскую вышэйшую агульнакамандную вучэльню (1971), завочна скончыў Свярдлоўскую вышэйшую ваенна-палітычную вучэльню (1978), Амурскую абласную культурна-асветную вучэльню (1984). Адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі. З 1991 жыве ў Баранавічах. Друкуецца з 1969. Аўтар шматлікіх карэспандэнцый, артыкулаў, нарысаў, даследаванняў у галіне культуры, гісторыі, расліннага і жывёльнага свету Беларусі. Краязнаўчыя інтарэсы найбольш звязаны з Баранавічамі і іх ваколіцамі.

**Малцужынскі Вітольд** (23.03.1832, мяст. Свіслач — 31.01. 1913), польскі і беларускі педагог, краязнавец. З сям'і настаўніка

гімназіі. Вучыўся ў школе ў Навагрудку, у гімназіі ў Свіслачы. Скончыў земляробчы інстытут у Горы-Горках. У 1857-60 выкладаў прыродазнаўства ў школе ў Саколцы, у 1860-64 — у гімназіі ў Свіслачы. Па закрыцці гімназіі пераехаў у Варшаву, дзе прадаваў у органах казначэйства і страхавання (1865-95). Займаўся гістарычна-краязнаўчымі даследаваннямі. Выдаў працу "Тэрытарыяльнае развіццё горада Варшавы" (Варшава, 1900). Шматлікія краязнаўчыя публікацыі — пра статыстыку, страхаванне, падатковыя справы на рэгіянальным матэрыяле змяшчаліся ў тагачасных спечыяльных выданнях. Падрыхтаваў успаміны банькі пра таварыства "прамяністых" і іншыя справы і падзеі "на Літве" ў 1832-65 (фрагменты — у "Kłosach" у 1879). У рукапісе засталася яго манаграфія пра Свіслач, успаміны пра студэнцкія гады.

**Малышава Вольга Леанідаўна** (дзявоч. Натарава, 22.10.1948, г. Гродна), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1981). Дацэнт (1984). З сям'і службоўцаў. Скончыла ў Гродне СШ №1. Вучылася на факультэце англійскай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў у 1966-73 (у 1971-72 — перакладчыца ў Індыі). З 1973 выкладала на кафедры замежных моваў Гродзенскага педінстытута. У 1976-79 — аспірантка Мінскага педінстытута замежных моваў. Затым працавала загадчыцай кафедры замежных моваў Гродзенскага універсітэта ў 1979-95 (у 1985-87 выкладала рускую мову ў Анголе). З 1995 — загадчыца кафедры англійскай мовы гэтага універсітэта. Стажыравалася ў ЗША (1983, 1996). Вывучае семіятычныя кірункі даследавання мовы, амерыканістыку і праблемы міжкультурных камунікацый, новыя тэхналогіі навучання замежным мовам. Друкуецца з 1979.

**Малышэвіч Павел Паўлавіч** (1821, в. Вагон Свіслацкага р-на — ?), беларускі пісьменнік, журналіст. Вучыўся ў Свіслацкай павятовай школе (1833-37). У пач. 50-х пераехаў у маёнт. Падгор'е на Міншчыне. Працаваў у Мінскай губернскай управе. З 1860 — рэдактар газеты "Минские губернские ведомости", адначасова быў начальнікам газетнага стала. З 1863 — міравы пасрэднік па Навагрудскім павеце. Быў звольнены з службы і, відаць, сасланы ў Сібір. Пісаў на польскай і рускай мовах. Аўтар паэмы "Спеў зорцы", артыкулаў і карэспандэнцый пра грамадска-культурнае жыццё Мінска. Рэцэнзаваў творы В. Дуніна-Марцінкевіча, заклікаў вывучаць родны край, бараніў у друку беларускую мову.

**Малышэўскі Іван Ігнатавіч** (25.07.1828, мяст. Нягневічы Навагрудскага р-на — 23.01.1897), рускі гісторык, педагог. Доктар багаслоўя (1873). Прафесар (1861). З сям'і праваслаўнага святара. Скончыў Жыровіцкую духоўную вучэльню (Слонімскі р-н), Мінскую духоўную семінарыю (1849), Кіеўскую духоўную акадэмію (1853). Да канца жыцця выкладаў у гэтай акадэміі на кафедры рускай царкоўнай гісторыі. Чытаў гісторыю Расіі, праваслаўнай царквы Расіі. Быў сябрам Маскоўскага археалагічнага таварыства, Рускага археалагічнага інстытута ў Канстанцінопалі, Кіеўскай археалагічнай камісіі. Аўтар даследаванняў па гісторыі царквы, народнай адукацыі, царкоўнага жыцця Расіі. Вывучаў гісторыю Беларусі ("Нарыс гісторыі Турава", 1880, "Праўда пра унію", 1894, "Заходняя Русь у барацьбе за сваю веру і народнасць", 1894). Выдаў кнігу "Святыя Кірыл і Мяфодзій, першыя настаўнікі славянскія" (Кіеў, 1886).

**Мальдзіс Адам Восіпавіч** (7.08.1932, в. Расолы Астравецкага р-на), беларускі культуролаг, літаратуразнавец, эсэіст, празаік. Доктар філалагічных навук (1987). Прафесар (1990). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1967). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980). "Заслужаны для польскай культуры" (1982). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў 7-годцы ў Гудагаі (Астравецкі р-н), у Астравецкай СШ. Скончыў аддзяленне журналістыкі філфака БДУ (1956). Працаваў адказным сакратаром раённай газеты ў Радашковічах (1956-59). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1959-62). Затым працаваў у гэтым інстытуце (у 1981-91 — загадчыкам аддзела беларускай дакастрычніцкай літаратуры). З 1991 — у Нацыянальным навукова-асветным цэнтры (у 1991-98 — дырэктарам, затым загадчыкам аддзела). Пачаў друкавацца ў школьныя гады, як літаратуразнавец — з 1954. Выдаў гістарычна-літаратуразнаўчыя і культуралагічныя даследаванні: "Творчае пабрацімства: Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст." (1966), "Падарожжа ў XIX ст. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры" (1969), "Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX ст." (1972), "Таямніцы старажытных сховішчаў" (1974), "На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду. 2-я палова XVII — XVIII ст." (1980), "Шляхі вялі праз Беларусь" (1980, у сааўт.), "Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў" (1982), "З літаратуразнаўчых вандраванняў: Нарысы, эсэ, дзённікі" (1987), "Перазовы сяброўскіх галасоў: Беларуска-літоўскае літаратурнае ўзаемадзеянне ад старажытнасці да нашага часу" (1988, у сааўт.), "Францыск Скарына як

прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў" (1988), "І ажываюць спадчыны старонкі" (1994). Сааўтар "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры", Т. 2 (1969), "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры" (1977, на рус. мове), "Гісторыі беларускай літаратуры. XIX — пач. XX ст." (1981), "Гісторыі беларускай літаратуры" (1985), "Гісторыі беларускага тэатра". Т. І (1983). Выпусціў кнігу-нарыс "Астравеччына, край дарагі..." (1977), гістарычную аповесць "Восень пасярод вясны" (1984), успаміны "Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча. Партрэт пісьменніка і чалавека" (1990). Аўтар шматлікіх часопісных і энцыклапедычных артыкулаў, дакладаў, рэцэнзій, публікацый з гісторыі кнігі, музыкі, асветы, тэатра, музейных каштоўнасцяў Беларусі. Аўтар сцэнарыя тэлеспектакля "Лісты так доўга ідуць..." (1989). Навуковы рэдактар, складальнік даведачных, гістарычна-літаратуразнаўчых выданняў. Рэдактар інфармацыйна-аналітычнага і культуралагічнага бюлетэня "Кантакты і дыялогі" (з 1996). Старшыня грамадскай камісіі "Вяртанне" пры Беларускім фондзе культуры. Прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (1991). Калекцыянер кніг, паштовак.

**Маляноўскі Ян** (7.05.1932, г. Гродна), польскі сацыёлаг, педагог. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1967). Прафесар (1986). Пасля вайны сям'я пераехала ў Польшчу. Скончыў факультэт права (1953) і філасофскі факультэт (1955) Варшаўскага універсітэта. Працаваў у гэтым універсітэце асістэнтам на філасофскім факультэце (1953-62), ад'юнктам на кафедры сацыялогіі, затым на кафедры галіновай сацыялогіі (1962-68), дацэнтам (1968-74), прафесарам, пасля намеснікам дырэктара, дырэктарам Інстытута сацыялогіі. Адначасова — навуковым сакратаром камітэта сацыялагічных навук Польскай акадэміі навук. Выдаў у Варшаве кнігі: "Рабочыя варшаўскай фабрыкі матацыклаў" (1962), "Грамадскія змены ў падваршаўскім мястэчку ў 1938-60" (1964), "Класавыя адносіны і грамадскія адрозненні ў горадзе" (1967), "Сацыялогія горада" (1971), "Польскія рабочыя" (1981) і інш.

**Маляўка Пётр Іванавіч** (16.04.1956, в. Каменка Навагрудскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1984). Дацэнт (1988). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы. СШ скончыў у в. Кашалёва Навагрудскага р-на. Скончыў аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1979). Нядоўга выкладаў рускую мову і літаратуру ў Славаціцкай СШ Зэльвенскага р-на. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута

літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1979-82). З 1982 — выкладчык, затым дацэнт кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага універсітэта. Вывучае сучасную беларускую драматургію. Навуковыя публікацыі — з 1982. Выдаў метадычны дапаможнік для студэнтаў "Праблемы развіцця сучаснай беларускай драматургіі" (Гродна, 1988). Друкаваў вершы, апавяданні.

**Мараш Ілья Якаўлевіч** (14.08.1946, г. Гродна), беларускі гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1976). Дацэнт (1977). З сям'і педагогаў. Сын Я. Мараша. Скончыў Гродзенскую СШ № 7. Працаваў на Гродзенскай абутковай фабрыцы (1963-65). Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута (1965-69). Затым — загадчык аддзела Гродзенскага абласнога гістарычна-археалагічнага музея (1969-72), выхавальнік у Гродзенскім тэхінкуме фізкультуры (1972-73), настаўнік гісторыі і геаграфіі СШ №1 (1973-74). З 1974 працаваў на кафедры гісторыі СССР і БССР Гродзенскага педінстытута (універсітэта). У 1982-91 быў метадыстам кабінета гісторыі і грамадазнаўства Гродзенскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў. У 1991 выехаў у Ізраіль. Друкаваўся з 1966. Аўтар шэрагу публікацый пра распаўсюджанне работ і ідэй У. Леніна ў Заходняй Беларусі і Польшчы ў 20-30-я. Сааўтар кнігі "Смаргонь" (1984, на рус. мове).

**Марат Якаў Навумавіч** (7.01.1917, г. Гродна — 25.09.1990), беларускі гісторык, педагог. Доктар гістарычных навук (1973). Прафесар (1974). З сям'і службоўцаў. Скончыў прыватную гімназію ў Гродне (1936). Вучыўся на гістарычным факультэце Віленскага (1936-39) і Львоўскага (1939-40) універсітэтаў. Настаўнічаў у Валынскай вобл. (1940-41) і Саратаўскай вобл. (1941-45). Затым жыў і працаваў у Гродне. Быў настаўнікам, дырэктарам СШ№ 2, загадчыкам педкабінета ГарАНА (1945-46). З 1946 — у Гродзенскім педінстытуце (універсітэце). Выкладаў на кафедры ўсеагульнай гісторыі, на кафедры гісторыі СССР і БССР. Быў дэканам гістфака (1970-80), загадчыкам кафедры гісторыі СССР і БССР (1980-88). У 1953-90 кіраваў гістарычна-краязнаўчым навуковым студэнцкім гуртком. Друкаваўся з 1952. Навуковыя інтарэсы звязаны ў асноўным з дзейнасцю каталіцкай царквы ў Беларусі, методыкай выкладання гістарычных дысцыплін. Аўтар шматлікіх артыкулаў у навуковых зборніках, часопісах, энцыклапедыях, масавай перыёдыцы. Асобнымі выданнямі выйшлі (на рус. мове): "Пытанні атэістычнага выхавання на ўроках гісторыі СССР і БССР" (1961), "Атэістычнае выхаванне навучэнцаў у пазакласнай рабоце" (1967), "З гісторыі барацьбы народных мас Беларусі супраць

экспансіі каталіцкай царквы" (1969), "Ватыкан і каталіцкая царква ў Беларусі" (1971), "Нарысы гісторыі экспансіі каталіцкай царквы ў Беларусі ў XVIII стагоддзі" (1974), "Атэістычнае выхаванне навучэнцаў пры вывучэнні гісторыі БССР" (1982), "Палітыка Ватыкана і каталіцкай царквы ў Заходняй Беларусі. 1918-1939" (1983), "У духу непрымірэнства: Кніга для настаўніка" (1986), "Масты: Гістарычна-эканамічны нарыс" (1986, у сааўт.), "Студэнцкі навукова-даследчы гурток" (1976, 2-е выд. 1989), "Пісьмовыя работы па гісторыі СССР і БССР" (1990, у сааўт.). Сааўтар гістарычных нарысаў "Гродна" (1960, на рус. мове, 2-е выд. 1964), "Гродна" (1987, на рус. і франц. мовах). Навуковы рэдактар зборнікаў гістарычных прац.

**Марцён Мая Уладзіміраўна** (дзявоч Турайкевіч, 28.07.1953, в. Аканавічы Карэліцкага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1985). Дацэнт (1990). З сям'і настаўнікаў. У сувязі з службовымі перамяшчэннямі бацькі мяняла школы (Карэлічы, Навагрудак, Воранава). Скончыўшы Воранаўскую СШ, вучылася на гістарычна-педагагічным факультэце Гродзенскага педінстытута (1970-75). Працавала ў гэтым інстытуце лабарантам кафедры гісторыі СССР і БССР (1975-79). Тут без адрыву ад вытворчасці вучылася ў аспірантуры (1976-80). З 1979 выкладала на кафедры гісторыі КПСС (з 1989 — палітычнай гісторыі). З 1991 — на кафедры ўсеагульнай гісторыі. Намеснік дэкана факультэта гісторыі і культуры (з 1995). Навуковыя публікацы — з 1978. Даследуе сацыяльна-культурныя працэсы ў жыцці беларускай вёскі пасляваеннага часу. Сааўтар кнігі "Гродна. Гістарычна-эканамічны нарыс" (1988, на рус. мове). Аўтар навучальна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў.

**Марцінкевіч Анатоль Іванавіч** (1.06.1911, г. Гродна — 3.04.1973), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1961). З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў Гродзенскай гімназіі (1922-32). У 1933-39 быў рахунковым супрацоўнікам гарадскога фінаддзела. У 1939-41 працаваў рамонтным рабочым на чыгунцы, бухгалтарам гарраймелькамбіната ў Гродне. У 1941-44 — рахункавод Гродзенскага гарадскога фінаддзела. Па вайне быў бухгалтарам ва ўправе Гродзенскай чыгункі (1944-45), бухгалтарам і выкладчыкам баскетбола ў Гродзенскім тэхнікуме фізічнай культуры (1945-57), адначасова з 1945 — старшыня Гродзенскага гарадскога камітэта фізічнай культуры. У 1955 завочна скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры. Працаваў выкладчыкам кафедры фізвыхавання Гродзенскага педінстытута (1957-58), выкладчыкам Гродзенскай культасветвучэльні

(1958-60). З 1960 — завуч і трэнер-выкладчык Гродзенскай дзіцячай спартыўнай школы №2 (адначасова выкладаў і ў педінстытуце). З 1964 да 1973 стала працаваў на кафедры фізвыхавання Гродзенскага педінстытута. Падрыхтаваў чэмпіёна Алімпійскіх гульняў, прызёраў міжнародных і нацыянальных чэмпіянатаў па баскетболе.

**Марціноўскі Пётр Мікалаевіч** (28.06.1932, в. Катчыно Мастоўскага р-на), беларускі педагог, краязнавец, літаратуразнавец. З сялянскай сям'і. У 1939-41 вучыўся ў Катчынскай пачатковай школе, у 1944-50 — у Дзярэчынскай СШ Зэльвенскага р-на. У 1950 паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры літфака Гродзенскага педінстытута, але неўзабаве з-за матэрыяльных цяжкасцяў перавёўся на завочнае (скончыў у 1959). Працаваў настаўнікам пачатковых класаў у в. Лупачы Мастоўскага р-на. Служыў у войску (скончыў танкавую вучэльню) у 1951-54. З 1954 працаваў у Дзярэчынскай СШ, выкладаў беларускую мову і літаратуру, рускую мову і літаратуру (у 1969-94 — намеснік дырэктара школы па навучальна-выхаваўчай рабоце). З 1994 — метадыст па прафарыентацыі Дзярэчынскага навучальна-вытворчага камбіната (да 1999 вёў урокі ў школе). Кіраўнік (з 1977) літаратурнага аб'яднання пры Зэльвенскай раённай газеце "Праца". Друкуецца з 1955. Аўтар шматлікіх публіцыстычных, краязнаўчых артыкулаў, літаратуразнаўчых і моваязнаўчых артыкулаў і рэцэнзій. Выдаў брашуру аб рабоце Дзярэчынскай школы "У нагу з часам" (Слонім, 1986).

**Марцінчык Мікалай Міхайлавіч** (16.12.1901, в. Кубельнікі Бераставіцкага р-на — 23.05.1980), беларускі грамадска-культурны дзеяч. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў Масалянах (Бераставіцкі р-н). Падчас першай сусветнай вайны выязджалі ў бежанства. У г. Чыстаполе Казанскай губ. скончыў 5 кл. гімназіі. З 1919 — на радзіме. Скончыў Гродзенскую рускую гімназію ў 1921. Вучыўся на медычным факультэце Віленскага універсітэта (1921-27). Актыўна ўключыўся ў гэты час у беларускі культурна-вызваленчы рух. Быў сябрам Беларускага студэнцкага саюза, яго старшынёй, сябрам Галоўнай управы ТБШ (1925-36), намеснікам старшыні Беларускага таварыства пацярпелых ад вайны (з 1927). Адзін з арганізатараў Беларускай сялянска-рабочай грамады. Супрацоўнічаў у друку Грамады, вёў аддзел карэспандэнцый у газетах "Жыццё беларуса", "Беларуская ніва", "Наша справа". Пісаў пра неабходнасць стварэння на вёсцы беларускіх клубаў, бібліятэк, школ на роднай мове. Працаваў інспектарам, настаўнікам анатоміі і гігіены Віленскай беларускай

гімназіі (1927-30). Быў лекарам у Вільні (у 1931 высланы ўладамі з горада), у мяст. Нараўка на Беласточчыне. У 1927 і 1930 арыштоўваўся за нацыянальную дзейнасць. З 1944 — у Гродне, працаваў галоўным лекарам інфекцыйнай бальніцы. У 1948 рэпрэсаваны і зняволены ў канцлагеры ў Комі АССР. Вызвалены ў 1956. Жыў у Гродне.

**Марцінчык Эдуард Адамавіч** (2.01.1955, в. Грамкі Шчучынскага р-на), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1994). З сялянскай сям'і. Скончыў Гродзенскую школу-інтэрнат у 1972. Вучыўся на архітэктурным факультэце Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута (1972-77). Нядоўга працаваў архітэктарам у інстытуце "Гроднаграмадзянпраект". Служыў у войску (1977-79). Затым — на праектнай працы ў інстытуце "Гроднасельбудпраект" (архітэктарам, ст. архітэктарам, кіраўніком групы, галоўным архітэктарам праектаў) у 1979-93. З 1993 — кіраўнік групы, пасля кіраўнік праектнай майстэрні №1 у інстытуце "Гроднаграмадзянпраект". Найбольш значныя работы: гандлёвыя цэнтры ў в. Вавёрка Лідскага р-на і в. Малюшычы Карэліцкага р-на, Дом культуры на 500 месцаў з адміністрацыйным будынкам у пас. Пагранічны Бераставіцкага р-на (у сааўт.), пашырэнне школы ў мікрараёне Індустрыяльны ў г. Ліда, новая забудова ў в. Старая Рудня, Забалацце Гомельскай вобл., адміністрацыйны будынак АА "Факел" у Гродне, спальны корпус санаторыя "Парэчча" Гродзенскага р-на.

**Марцуль Генадзь Сямёнавіч** (2.01.1937, в. Лоўчыцы Навагрудскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1969). Прафесар (1997). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Ладзенікі (Навагрудскі р-н), Навагрудскую педагагічную вучэльню (1955). Працаваў загадчыкам Азерскай пачатковай школы Карэліцкага р-на (1955-56). Служыў на флоце (1956-59). Быў настаўнікам ваеннай падрыхтоўкі ў Навагрудскай СШ №1 (1959-60). Затым — студэнт гістарычна-геаграфічнага факультэта Мінскага педінстытута (1960-65), аспірант гэтага інстытута (1965-68). З 1968 выкладае ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце (Беларускім універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі), спачатку на кафедры гісторыі КПСС, з 1989 на кафедры гуманітарных дысцыплін. Друкуецца з 1966. Вывучае праблемы патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання моладзі, фармавання беларускага этнасу, гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Выдаў даследаванні "Перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі" (1975, на рус. мове), "Вопыт СССР у

вырашэнні нацыянальнага пытання і свет сацыялізму" (1982, на рус. мове), дапаможнік для студэнтаў "Уводзіны ў беларусазнаўства" (1996. 2-е выд. 1997, у сааўт.). Сааўтар дапаможніка для вучняў II кл. "Гісторыя Беларусі. Канец XVIII — 1917" (1997), дапаможніка для студэнтаў "Гісторыя Беларусі". Ч. 1-2 (1998). Навуковы рэдактар навуковых і навукова-метадычных прац па гісторыі Беларусі.

**Масальскі Ігнат** (30.07.1726, в. Алекшыцы Бераставіцкага р-на — 28.06.1794), польскі і беларускі асветнік, тэолаг, каталіцкі духоўнік. Доктар права (1752). У 1744 атрымаў пасаду пробашча ў Волпе (Ваўкавыскі р-н) і стаў сябрам віленскай капітулы. З 1745 вучыўся ў Варшаўскай духоўнай семінарыі, пазней — у Рыме. У 1754 стаў канонікам калегіі ў Варшаве, прэлатам віленскай капітулы. З 1762 — віленскі біскуп. Адзін з ініцыятараў стварэння Адукацыйнай камісіі, пазней увайшоў у яе склад, быў кіраўніком. Як дырэктар Дэпартамента справядлівасці складаў універсал 1794, які асуджаў паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Пакараны смерцю паўстанцамі. Друкаваўся з 1746. Аўтар пасланняў, прамоваў, "цыркуляраў" для духавенства, "прывілеяў" для кіраўнікоў адукацыйных установаў.

**Маскевіч Багуслаў** (1625, в. Сэрвач Карэліцкага р-на — 4.04.1683), беларускі і польскі грамадскі дзеяч, пісьменнік-мемуарыст. Сын С. Маскевіча. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Навагрудку. Служыў пры дварах Б. Радзівіла, Ф. Забрыдоўскага на Пружаншчыне (1644-46). У 1646-48 — у войску І. Вішнявецкага. Удзельнічаў у паходзе ў Запарожскую Сеч (1647), у вайне з войскамі Б. Хмяльніцкага (1648), служыў у гусарах Радзівіла. У 1650 пакінуў вайсковую службу, быў памешчыкам, выконваў абавязкі Ашмянскага маршалка, Навагрудскага пасла на сейм 1669. Аўтар 2-х "Дыярыушаў" (на польскай мове). У адным ахоплены падзеі 1643-49, апісаны ваенныя дзеянні І. Вішнявецкага, Я. Радзівіла, М. Патоцкага супраць Б. Хмяльніцкага на Украіне і Беларусі. У другім паказаны ваенны паход І. Хаванскага ў Беларусь (у 1660) і разгром яго войскаў.

**Маскевіч Самуіл Іванавіч** (1580, в. Сэрвач Карэліцкага р-на — 1642), беларускі і польскі грамадскі дзеяч, пісьменнік-мемуарыст. З шляхецкай сям'і. Адукацыю атрымаў у Навагрудку. Служыў у войску ў 1601-21, удзельнічаў у ваенных паходах, у тым ліку ў паходзе Ілжэ-Дзмітрыя на Маскву ў 1604-05. Пазней знаходзіўся ў Маскве (1610-12). Служыў пры дварах А. Вішнявецкага, Радзівілаў, Сапегаў. У 1617-18 — дэпутат трыбунальнага суда ад Навагрудскага павета,

потым — навагрудскі гарадскі пісар. Апісаў вайну Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай у "Дыярыушы" — успамінах, якія ахопліваюць падзеі 1594-1621.

**Мацкевіч Вячаслаў Канстанцінавіч** (1.01.1944, в. Утканы Воранаўскага р-на), беларускі музыкант (баян, гармонік), музычны педагог, дырыжор аркестра. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1990). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ ў Канвелішках (Воранаўскі р-н), музычна-педагагічную вучэльню ў Гродне (1965), інстытут культуры ў Ленінградзе. Выкладаў музыку і спевы ў Забалацкай СШ Воранаўскага р-на (1965-68). Затым працуе выкладчыкам Воранаўскай дзіцячай музычнай школы, з 1980 — дырэктарам школы. З пачатку педагагічнай працы стварае калектывы музычнай самадзейнасці (хоры, аркестры), збірае мясцовы музычны фальклор. У 1981 арганізуе і ўзначальвае фальклорны інструментальны ансамбль "Лявоны" (з 1985 — званне народнага), які выконвае музыку рэгіёну, творы розных народаў. Пад кіраўніцтвам В. Мацкевіча ансамбль стаў лаўрэатам міжнародных конкурсаў, выступаў у Беларусі, Германіі, Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Азербайджане, ЗША.

**Мацко Аляксандр Мікалаевіч** (15.10.1924, в. Пагарэлка Карэліцкага р-на), беларускі гісторык, педагог. Доктар гістарычных навук (1968). Прафесар (1970). Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1980). З беднай сялянскай сям'і. У роднай вёсцы вучыўся ў пачатковай школе, у 1939-41 — у 7-годцы. Падчас вайны 1941-44 удзельнічаў у рабоце падпольнай камсамольскай арганізацыі, затым быў партызанам, камандзірам аддзялення атрада "Камсамольскі" (адзначаны баявымі ўзнагародамі). У 1944-45 — у камісіі па эвакуацыі беларусаў з тэрыторыі Польшчы. Быў камсоргам ЦК ЛКСМБ у Ярэміцкай СШ Карэліцкага р-на (1945-46), слухачом Гродзенскай партшколы (1946-47), рэдактарам Гродзенскага абласнога радыёкамітэта (1947-48), слухачом Мінскай рэспубліканскай партшколы (1949-51). У 1951 завочна скончыў гістфак Мінскага педінстытута. У 1951-59 — інструктар аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КПБ. Вучыўся ў аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1959-62). Працаваў ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (1962-68), загадчыкам сектара Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1968-73), загадчыкам кафедры гісторыі КПСС Мінскага педінстытута (1973-89). З 1989 — прафесар кафедры гісторыі Беларусі Беларускага педагагічнага універсітэта. Вывучае нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі,

рэвалюцыйны рух у Польшчы ў 20-30-я, гісторыю Беларусі савецкага часу. Аўтар даследаванняў (на рус. мове): "Барацьба працоўных Польшчы і Заходняй Беларусі супраць фашызму. 1933-1939 гг." (1963), "Рэвалюцыйны шлях Кампартыі Заходняй Беларусі. 1921-1939 гг." (1966, у сааўт.), "Рэвалюцыйная барацьба працоўных Польшчы і Заходняй Беларусі супраць прыгнёту буржуазіі і памешчыкаў. 1918-1939" (1972), "Дарогаю барацьбы і тварэння. Да 40-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР" (1979, у сааўт.), "У саюзе непарушным" (1982, у сааўт.), "Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны" Т. 3 (1985, у сааўт.). Навуковы рэдактар даследаванняў па розных праблемах гісторыі Беларусі.

**Мацко Юрась** (Юры Віктаравіч, 17.04.1960), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1997). З сям'і інтэлігенцыі. Скончыў СШ №1 г. Гродна. Служыў у войску (1978-80). Скончыў архітэктурны факультэт Беларускага палітэхнічнага інстытута (1986). Працаваў архітэктарам-рэстаўратарам у Гроднапраектрэстаўрацыі (1986-90). Быў на творчай працы. З 1997 — галоўны мастак МП "Крыга". Працуе ў розных відах манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (у тэхніцы ручной коўкі). Удзельнічае ў выставах з 1983 (у Беларусі, Польшчы, Германіі, Літве). Сярод работ: рэканструкцыя крыжоў на купале царквы базыльянак у Гродне (1991), жырандоль на 8 лямпаў у Старым замку ў Гродне (1992), дэкаратыўныя краты галерэі "У майстра" (1992), аднаўленне балконаў, казыркоў, брамаў, парапетаў жылых будынкаў па вул. Замкавая, Вялікая Траецкая, Віленская, І-га Мая ў Гродне (1992-95), кампазіцыі "Беларусь" (1993), "Пяшчота" (1994), "Коні" (1994), "Папараць-кветка" (1995), аздабленне галерэі Тызенгаўза ў Гродне дэкаратыўнымі цяжамі (1995), інтэр'ер і экстэр'ер музея-аптэкі XVII ст. у Гродне (1995-96), ветраннік на шпілі Новага замка ў Гродне (1995), мемарыяльная дошка палеглым паўстанцам 1863 на будынку чыгуначнага вакзала ў Гродне (1995, у сааўт.), кампазіцыі "Паэт і нож" (1996), "Шлях вуніі" (1996), цыкл "Знакі задыяка" (1997), брама "мадэрн" па вул. А. Міцкевіча ў Гродне (1997), крыж "Каложскі" (1997), кампазіцыя "Дзяды" (1998).

**Мацюк Аляксандр Антонавіч** (23.09.1956, мяст. Масты), беларускі музыкант (баян), музычны педагог, кампазітар. З сям'і рабочых. Скончыў СШ №1 у Мастах (1971). Вучыўся ў Гродзенскай музычнай вучэльні (1971-75) па класу баяна. Служыў у войску (1975-77). З 1977 працуе выкладчыкам Воранаўскай дзіцячай музычнай

школы, кіруе тут (з пач. 80-х) аркестрам народных інструментаў. Іграе ў фальклорным інструментальным ансамблі "Лявоны" (з 1985 — званне народнага). Піша песні (на тэксты Я. Запрудніка, М. Кавыля і інш.), якія выконваюцца на канцэртнай сцэне з пач. 90-х. Выдаў зборнік сваіх песень "Музыка душы маёй" (Гродна, 1998).

**Мікіта Віктар Васілевіч** (25.04.1955, г. Гродна), беларускі мастак (графік, жывапісец). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1981). З сям'і настаўнікаў. Вучыўся ў Гродне ў СШ №6 і №14. У 1966-73 — у Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. Скончыў аддзяленне графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1979). Служыў у войску (1979-81). Працаваў на кафедры графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1981-86). Удзельнік выставаў з 1976. Творы — у галіне кніжнай і станковай графікі (літаграфія, лінагравюра, акварэль), жывапісу. Афармляе кнігі выдавецтваў "Мастацкая літаратура", "Юнацтва", "Народная асвета". Сярод іх — "Пахвала дурасці" Э. Ратэрдамскага, "Паэмы" Я. Купалы, "Санеты і трагедыі" В. Шэкспіра, французскія народныя казкі "Жывая вада", "Вясёлы дах", "Кароль-воран", "Чортаў скарб" У. Караткевіча, "Батлейка" В. Лукшы, "Жураўліны крык" В. Быкава, "Скарына на Градчанах" А. Лойкі, "Палескія легенды" А. Грачанікава. У галіне станковай графікі — серыі работ па матывах кнігі У. Караткевіча "Мая Іліяда", да 100-годдзя Цёткі, "Старажытны Гродна", "Гродзенскае ВА "Азот", "Дарога ў перспектыве", "Горад мой старажытны". У жывапісе (алей) — "Падзенне Ікара", "Мой горад Гродна", "Мы ўскормлены попелам вялікіх перамог". Выстаўляўся ў Беларусі, Расіі, Украіне, Грэцыі, Францыі, Польшчы, Эфіопіі, Балгарыі. Творы захоўваюцца ў калекцыях у Канадзе, Германіі, Фінляндыі, Польшчы. Адзначаны дыпломамі конкурсаў мастацкага афармлення кнігі ў Беларусі, СССР.

**Мікуліч Надзея Анатолеўна** (14.01.1953, мяст. Скідзель Гродзенскага р-на), беларуская спявачка, кампазітар. З сям'і рабочага. У 1955-62 жылі ў Данецку, дзе бацька працаваў шахцерам. Тут скончыла 2 кл. З 1962 — у Гродне. Вучылася ў СШ №12, адначасова — у музычнай школе па класе акардэона (1962-68). Скончыла музычна-педагагічную вучэльню (аддзяленне харавога дырыжыравання) у 1972. Падчас вучобы актыўна ўдзельнічала ў канцэртах як спявачка і музыкант (акардэон, гітара). Працавала ў Беларускай філармоніі (1972-93), выступала як сольная спявачка (пад акампанемент гітары) у самастойных канцэртах, таксама з рознымі калектывамі ("Верасы", "Сябры, "Сузор'е", "Купалінка"). Кіравала эстрадным калектывам, пра-

цавала з дзецьмі ў студыі эстраднай песні "Мульцік". Спявала на Беларускім радыё, на канцэртных пляцоўках Беларусі, краін СНД, Балгарыі, Германіі, Бельгіі, Чэхіі, Славакіі, Фінляндыі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Сірыі, Лаоса. Выконвае песні Я. Глебава, І. Лучанка, Л. Захлеўнага, В. Іванова, І. Паліводы, Д. Даўгалёва, Э. Ханка, В. Сярых, Э. Зарыцкага, свае песні на сл. Н. Гілевіча, А. Вярцінскага, В. Аколавай, Н. Тулупавай, Я. Бароўскага, беларускія народныя песні ва ўласнай апрацоўцы. Рыхтуе свае праграмы.

**Мілінкевіч Аляксандр Уладзіміравіч** (25.07.1947, г. Гродна), беларускі фізік, педагог, краязнавец. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1976). Дацэнт (1978). "Заслужаны для польскай культуры" (1991). З сям'і настаўнікаў. Сын У. Барана. Скончыў СШ №1 г. Гродна, фізічна-матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытута (1969). У 1969-72 вучыўся ў аспірантуры Інстытута фізікі Акадэміі навук Беларусі. Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам гэтага інстытута. З 1976 выкладае ў Гродзенскім педінстытуце (універсітэце). У 1980-84 — загадчык курса агульнай фізікі ў Сеціфскім універсітэце (Алжыр). З 1984 — дацэнт кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі Гродзенскага універсітэта. У 1990-96 быў намеснікам старшыні Гродзенскага гарвыканкама (па пытаннях культуры, адукацыі, спорту, рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, міжнародных адносін). З 1996 — старшыня Гродзенскага абласнога грамадскага аб'яднання "Ратуша"(адначасова працуе як сумяшчальнік у Гродзенскім універсітэце). У 1996 абраны старшынёй Рады Гродзенскага ТБШ. Аўтар навуковых прац па квантавай электроніцы, квантавай механіцы, ядзернай тэхніцы. З 1986 друкуе ў навуковых выданнях і масавай перыёдыцы краязнаўчыя артыкулы па пытаннях гісторыі, архітэктуры, культурнага жыцця Гродна. Вёў краязнаўчыя перадачы на гродзенскім тэлебачанні.

**Мілюць Алесь** (Аляксандр Макаравіч, 6.10.1908, в. Скорычы Карэліцкага р-на — 26.10.1944), беларускі паэт. З сялянскай сям'і. Скончыў 2 класы пачатковай школы. Працаваў на гаспадарцы. Настойліва займаўся самаадукацыяй. У 1939-41 працаваў рахункаводам у сельпо. У 1944 прызваны ў савецкае войска. Загінуў на фронце. Друкаваўся з 1928 у заходнебеларускай перыёдыцы (часопісы "Хрысціянская думка", "Пралеска", "Шлях моладзі"). Вершы засталіся пераважна ў рукапісах.

**Мінейка Зыгмунт Станіслававіч** (1840, в. Балванішкі Ашмянскага р-на — 27.12.1925), беларускі, польскі, грэчаскі грамадскі дзеяч, этнограф, калекцыянер, мемуарыст. З шляхецкай сям'і. Скончыў Віленскую гімназію. Вучыўся ў Пецярбургскай ваенна-інжынернай школе. Удзельнічаў у вызваленчым руху на Віленшчыне. Знаходзіўся ў эміграцыі, вучыўся ў Італіі ў ваеннай школе. З 1861 — на радзіме. Удзельнік паўстання 1863, быў ваенным начальнікам Ашмянскага павета, камандзірам атрада. У 1863 сасланы ў Сібір. У 1865 уцёк. Скончыў у Парыжы Акадэмію Генштаба. У Балгарыі, Турцыі, Грэцыі праектаваў чыгункі, масты, вёў археалагічныя даследаванні. Знайшоў старажытны храм у Дадоне (1876), надрукаваў першую этналагічную карту Эпіра (1880). Збіраў калекцыі старажытнасцяў. З 1891 жыў у Грэцыі, кіраваў дэпартаментам Міністэрства грамадскіх работ. Падчас вайны за вызваленне Крыта ўзначаліў тапаграфічны аддзел Генштаба. Пабываў на радзіме ў 1911, 1922, 1923, перадаў Віленскаму універсітэту калекцыю старажытных манет. Напісаў мемуары (больш за 40 тамоў), частка выдадзена ў Варшаве ў 1971.

**Мірачыцкі Леў Паўлавіч** (25.10.1925. в. Баяры Карэліцкага р-на), беларускі гісторык, культуролаг, публіцыст. Кандыдат гістарычных навук (1972). З сялянскай сям'і. Пачынаў вучыцца ў роднай вёсцы, скончыў СШ у Цырыне (Карэліцкі р-н) у 1951. Вучыўся на аддзяленні журналістыкі філфака БДУ (1951-56). Падчас вучобы працаваў журналістам у рэдакцыях газет "Калгасная праўда", "Чырвоная змена". Шмат друкаваўся ў беларускай перыёдыцы ў пазнейшыя гады. Быў навуковым супрацоўнікам Дома-музея А. Міцкевіча ў Навагрудку (1956-57), ст. навуковым супрацоўнікам, вучоным сакратаром Літаратурнага музея Я. Коласа ў Мінску (1956-62), ст. рэферэнтам Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі (1963-70). З 1970 працуе ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Як публіцыст друкуецца з 1951. З 1955 — навуковыя публікацыі ў галіне культурных сувязяў Беларусі. Выдаў кнігі "Сцежкамі вялікага паэта" (1957), "З незабыўных дарог" (1961), "Беларуска-чэхаславацкія культурныя і навуковыя сувязі" (1981, на рус. мове), "Беларуска-югаслаўскія культурныя і навуковыя сувязі" (1991), "Светлым ценем Адама Міцкевіча. Эміграцыя з Наваградчыны" (1994). Артыкулы пра славянскія ўзаемасувязі друкаваліся ў выданнях Беларусі, Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі.

**Місарэвіч Яўген Аляксандравіч** (26.06.1932, в. Погіры Дзятлаўскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1981). Дацэнт (1988). З сям'і селяніна. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу, у Нагародавічах (Дзятлаўскі р-н) — 7-годку. Працаваў ст. піянерважатым у Дзятлаўскай СШ і вучыўся тут у вячэрняй школе. У 1951 скончыў Ю кл. і 6-месячныя курсы ст. піянерважатых пры ЦК ЛКСМБ. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута (працаваў ст. піянерважатым у школах і піянерлагерах) у 1951-55. Быў намеснікам загадчыка аддзела па рабоце сярод школьнай і студэнцкай моладзі Гродзенскага абкама камсамола (1955-57), сакратаром Радунскага райкама камсамола (1957-61), сакратаром Гродзенскага абкама камсамола (1961-62), сакратаром Смаргонскага райкама КПБ (1962-68), слухачом Мінскай вышэйшай партшколы (1968-70), лектарам Гродзенскага абкама КПБ (1970). У 1970-82 узначальваў Камітэт па тэлебачанні і радыёвяшчанні Гродзенскага аблвыканкама (у 1971-75 завочна вучыўся ў аспірантуры на кафедры гісторыі КПСС Мінскага педінстытута). З 1982 выкладаў на кафедры гісторыі КПСС Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. З 1994 — вядучы спецыяліст па прафарыентацыі, адначасова выкладчык гісторыі Беларусі гэтага інстытута. Друкуецца з 1970. Даследуе нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі. Выйшла яго кніга "На вызваленай зямлі" (1989, на рус. мове). Сааўтар выданняў: "Нарысы гісторыі Гродзенскай абласной партыйнай арганізацыі" (1990, на рус. мове), "І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс" (Гродна, 1995).

**Міско Іван Якімавіч** (22.02.1932, в. Чамяры Слонімскага р-на), беларускі скульптар, графік. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1965). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1989). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1977), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1987). З сялянскай сям'і. У Чамярах вучыўся ў школе. Скончыў скульптурнае аддзяленне Мінскай мастацкай вучэльні (1957), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1966). Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры, графічнага партрэта, кампазіцыі. У выставах — з 1957. Аўтар скульптурных партрэтаў "Святлана" (1958), Героя сацыялістычнай працы Г. Куляша (1960), акадэміка Ф. Фёдарава (1968), дзеячаў культуры і мастацтва Ф. Мадорава (1967), Р. Шырмы (1968), А. Карэзянковай (1969), Я. Цікоцкага (1970), Г. Бураўкіна (1971), Я. Маўра (1972), В. Таўлая (1978), А. Дзялендзіка (1979), С. Станісты (1982), Р. Шырмы (1984), спартсменаў Л. Бядовай (1983), А. Мядзведзя (1984), касманаўтаў Ю. Гагарына (1968), П. Клімука (1978), У.

Кавалёнка (1980), Ю. Раманенкі (1983). Аўтар скульптурных кампазіцый "Юнацтва", "На сенажаці", "Летуценні", "Суровыя гады", "Касмічныя далячыні", "Інтэркосмас", "Да зорак", "2001 год", "У будучыню". Сярод манументальных работ — помнікі І. Кабушкіну ў Баранавічах (1973), маці-патрыётцы ў Жодзіне (1975), І. Буйніцкаму ў Празароках Глыбоцкага р-на (1976), М. Горкаму ў Мінску (1981, у сааўт.), бюсты П. Клімука ў Брэсце (1978), У. Ралько ў в. Аснежыцы Пінскага р-на (1981), У. Кавалёнка ў Крупках Мінскай вобл (1984), надмагілле І. Чыгрынаву (1998). Выпусціў альбом сваіх твораў "Скульптура" (1995).

**Міско Міхаіл Васілевіч** (1904, в. Чамяры Слонімскага р-на — 1972), рускі гісторык. Доктар гістарычных навук. З сялянскай сям'і. З 1914 — у бежанстве ў г. Сярдобск Пензенскай губ., дзе вучыўся ў школе. У 1920 вярнуліся на радзіму. У 1921 перайшоў у савецкую Расію. Скончыў гістфак Маскоўскага універсітэта (1929), аспірантуру Інстытута чырвонай прафесуры (1932). Працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук СССР (Масква). У час вайны быў ваенным карэспандэнтам. Па вайне працаваў у Інстытуце славяназнаўства Акадэміі навук СССР (1947-64). Даследаваў праблемы нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Польшчы і Беларусі 2-ой пал. XIX — І-ай чвэрці XX ст. Выдаў у Маскве манаграфіі "Кастрычніцкая рэвалюцыя і аднаўленне незалежнасці Польшчы" (1957), "Польскае паўстанне 1863 г." (1962). Сааўтар кнігі "Гісторыя паўднёвых і заходніх Славянаў" (М., 1957, 2-е выд. 1969).

**Міско Сцяпан Міхайлавіч** (18.01.1930, в. Чамяры Слонімскага р-на), беларускі мастацтвазнавец, культуролаг. Кандыдат мастацтвазнаўства (1962). З сялян. Вучыўся у пачатковай школе ў роднай вёсцы. З восені 1941 быў партызанскім сувязным (адзначаны баявымі ўзнагародамі). Скончыў беларускую СШ №1 г. Слоніма. Вучыўся ў Мінскім інстытуце замежных моваў (1948-52). Быў настаўнікам французскай, нямецкай, беларускай і рускай моваў у СШ пасёлка Альбярцін (ля Слоніма) у 1952-58. У 1958-61 вучыўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі. Затым працаваў у гэтым інстытуце (завочна вучыўся ў дактарантуры на кафедры тэатра народаў СССР у Маскоўскім інстытуце тэатральнага мастацтва ў 1970-73). У 1974 звольнены з працы па палітычных матывах. У 1975-90 займаў службовыя пасады ў Дзяржаўным музеі Беларускай ССР, у Кніжнай палаце БССР, у выдавецтве "Універсітэцкае". Друкаваўся з 1953. Даследаваў гісто-

рыю старажытнай тэатральнай творчасці Беларусі. Аўтар артыкулаў, рэцэнзій, нарысаў на тэмы беларускага тэатра, літаратуры, жывапісу, музыкі. Сааўтар "Гісторыі Беларускай ССР". Т. I (1972).

**Міско Якуб Герасімавіч** (1.06.1911, в. Чамяры Слонімскага р-на — 23.10.1981), беларускі пісьменнік (празаік, перакладчык, публіцыст), журналіст. Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1958). Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1967). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў бежанстве ў Расіі, адкуль сям'я вярнулася ў 1921. Затым — у Віленскай беларускай гімназіі (1925-28), быў выключаны за ўдзел у рэвалюцыйным руху. Працаваў у галоўным сакратарыяце дэпутацкага клуба "Змаганне". Узначальваў рэдакцыю "Беларускай газеты" (1933). Некалькі гадоў з перапынкамі прасядзеў у турмах Польшчы (у 1930-39). У лістападзе 1939 зняволены ў турме савецкімі ўладамі. Вызвалены ў пач. 1940. Працаваў у калгасе, у рэдакцыі Лідскай райгазеты (1940-41). У час вайны — на фронце, адзначаны баявымі ўзнагародамі. Скончыў завочна Баранавіцкі настаўніцкі інстытут (1949). Працаваў (ад карэспандэнта да намесніка рэдактара) у "Сельской газете" (1947-76), у часопісе "Коммунист Белоруссии" (1976-81). Друкаваўся з 1926. Аўтар артыкулаў, нарысаў, гумарэсак, рэцэнзій, дакументальна-біяграфічнай аповесці. Літаратурная спадчына сабрана ў кнізе "Маё маўклівае сэрца" (1983). У яго перакладах з польскай мовы выйшлі кнігі К. Брандыса, М. Жулаўскага, Е. Путрамента, М. Каўнацкай і інш.

**Міхальчанка Галіна Фёдараўна** (дзявоч. Лешна, 5.10.1956, г. Гродна), беларускі псіхолаг, педагог. Кандыдат псіхалагічных навук (1990). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №3 г. Гродна (1973). Вучылася на гістарычна-педагагічным факультэце Гродзенскага педінстытута (1973-78). Працавала ў Гродзенскім абласным палацы піянераў і школьнікаў (1978-81). У Гродзенскім універсітэце — ст. лабарантам, сакратаром-дыспетчарам навучальнага аддзела, лабарантам кафедры псіхалогіі (1982-84). У 1984-87 — аспірантка кафедры псіхалогіі Гродзенскага універсітэта, дзе затым працуе (з 1993 — дацэнт кафедры псіхалогіі пачатковай школы). Навуковыя інтарэсы звязаны з псіхадыягностыкай і рознымі відамі псіхалагічных трэнінгаў.

**Міхей Мікалай Дзмітрыевіч** (22.08.1938, в. Нянькава Навагрудскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1975). Дацэнт (1984). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Нянькаўскай пачатковай школе, у Асташынскай 7-годцы

(Навагрудскі р-н). Скончыў беларускую СШ у Навагрудку (1951). Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1951-56). У 1953-58 працаваў (сумяшчаў на пачатку працу з вучобай) у газеце "Калгасная праўда" — падчытчыкам, ст. карэктарам, літаратурным рэдактарам. Вучыўся ў аспірантуры на кафедры беларускай мовы БДУ (1958-61). З 1961 выкладае на гэтай кафедры. Друкуецца з 1968. Даследуе праблемы сінтаксісу беларускай мовы, методыку яе выкладання. Выдаў метадычныя дапаможнікі "Разбор сказа" (1987), "Сінтаксічная сувязь слоў у сказе" (1988) і інш.

**Міхнюк Уладзімір Мікалаевіч** (27.09.1947, в. Грушаны Свіслацкага р-на), беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук (1987). Прафесар (1991). З беднай сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Поразаве (Свіслацкі р-н) у 1965. Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута ў 1965-69 (у 1968-69 адначасова працаваў камендантам студэнцкага інтэрната). Нядоўга працаваў у Свіслацкай райгазеце "Заветы Ильича". Служыў у войску (1969-70). У 1970-73 — аспірант кафедры гісторыі СССР і БССР Гродзенскага педінстытута. У 1973-75 выкладае на гэтай кафедры (адначасова ў 1971-75 — сакратар камітэта камсамола інстытута). Быў пасля ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (1975-82), ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1982-87), ст. выкладчыкам, прафесарам кафедры гісторыі КПСС Мінскай вышэйшай партшколы (1987-92), дырэктарам Беларускага навукова-даследчага цэнтра дакументазнаўства і рэтраінфармацыі (навукова-даследчага Інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы) у 1992-97. У 1997-98 працаваў у Сакратарыяце Савета Рэспублікі Беларусь галоўным спецыялістам, затым загадчыкам аддзела Камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. З 1998 — прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу БДУ. Даследуе праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, археаграфіі і архівазнаўства, бібліяграфіі, гісторыі літаратуры Беларусі 20-30-х XX ст. Друкуецца з 1962, як гісторык — з 1972. Аўтар шматлікіх публікацый у навуковых зборніках, энцыклапедыях, часопісах. Выдаў кнігі: "Сялянства Беларусі на шляху да сацыялізму: Гістарыяграфічны нарыс" (1979, на рус. мове), "Сацыялістычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР: Гістарыяграфічны нарыс" (1979, на рус. мове), "Станаўленне і развіццё гістарычнай навукі Савецкай Беларусі. 1919-1941" (1985, на рус. мове), "Арыштаваць у высылцы: Дакументальны нарыс пра Алеся Дудара" (1996). Сааўтар даследаванняў "Гістарычная навука Беларускай ССР: 80-я гады" (1987, на рус. мове), "Гісторыя

славянскіх народаў у працах савецкіх даследчыкаў" (1988), "Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках БССР. 1944-1987. Бібліяграфічны паказальнік". (2-е выд., 1988, на рус. мове), "Нарысы гісторыі Беларусі". Ч. 2 (1995), "Споведзь у надзеі застацца жывым: Аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча" (1999). Адзін з складальнікаў зборнікаў гістарычных дакументаў і матэрыялаў.

**Міцкевіч Адам** (24.12.1798, хутар Завоссе Навагрудскага р-на — 26.11.1855), польскі паэт, беларускі і польскі асветнік. З сям'і дробнага шляхціца, адваката. Вучыўся ў Навагрудскай даміканскай школе (1807-15), на фізічна-матэматычным (1815-16), на літаратурна-мастацкім (1816-19) факультэтах Віленскага універсітэта. Быў сябрам таварыства філаматаў. У 1819-23 працаваў выкладчыкам лацінскай мовы ў Ковенскай гімназіі. Бываў у родных мясцінах — у вёсках і маёнтках Брацянка, Гарадзілоўка, Гарадзечна, Пярэсека, Рутка, Пуцэвічы, Лоўчыцы, Шчорсы (Навагрудскі р-н), Унехава, Райца (Карэліцкі р-н), Заполле (Лідскі р-н), Нагародавічы (Дзятлаўскі р-н), Бальценікі, Беняконі (Воранаўскі р-н). У 1821 апошні раз наведаў Навагрудак. Арыштаваны ў 1823 па справе філаматаў. Восенню 1824 сасланы ў Расію. Жыў у Пецярбургу, Адэсе, Маскве. У маі 1929 выязджае з Пецярбурга за межы Расійскай імперыі (знаходзіцца ў Германіі, Італіі, Францыі). З 1832 стала жыве ў Парыжы. У 1838-40 чытае лекцыі па рымскай літаратуры ў Лазанскім універсітэце. У 1840-44 — лекцыі па славянскіх літаратурах у парыжскім Калеж дэ Франс (высока ацэньвае народную творчасць і мову беларусаў). Выязджае ў Італію і стварае тут польскі легіён (1848). Рэдагуе ў Парыжы газету "Трыбуна народаў" (1849, на франц. мове). З 1852 працуе ў парыжскай бібліятэцы. У 1855 выязджае ў Канстанцінопаль, каб знайсці магчымасці садзейнічаць нацыянальнаму адраджэнню Рэчы Паспалітай. Пісаў лірычныя вершы, балады, паэмы, драмы, празаічныя прытчы, публіцыстычныя артыкулы, гістарычныя даследаванні, рабіў пераклады. Выйшлі яго зборнікі твораў: "Паэзія". Т. 1-2 (Вільня, 1822-23), "Санеты"(М„ 1826), "Конрад Валенрод" (Пт., 1828), "Пан Тадэвуш" (Парыж, 1834). Шмат разоў творы перавыдаваліся ў арыгінале і перакладах на мовы свету.

**Міцкевіч Жана Іванаўна** (дзявоч. Каско, 1.04.1947, г. Слонім), беларускі педагог. Кандыдат педагагічных навук (1988). З сям'і службоўцаў. У сувязі з яе пераездам вучылася ў пачатковай школе ў в. Круцілавічы (Дзятлаўскі р-н), СШ скончыла ў в. Данілавічы (Дзятлаўскі р-н). Вучылася на аддзяленні беларускай і рускай мовы і

літаратуры філфака Мінскага педінстытута (1963-68). Выкладала рускую мову і літаратуру ў Мікалаеўшчынай СШ Стаўбцоўскага р-на (1968-71). З 1971 жыве з сям'ёй у Мінску. Працуе ў СШ №95. У 1982-85 выкладае на кафедры педагогікі Мінскага педінстытута замежных моваў. У 1985-88 — аспірантка гэтай кафедры, затым працягвала тут працаваць выкладчыкам. З 1992 — дацэнт кафедры сацыяльнай педагогікі і прафесійнага майстэрства Мінскага педінстытута (Беларускага педагагічнага універсітэта). Друкуецца з 1982. Вывучае праблемы сацыяльнай педагогікі, педагогікі сям'і. Аўтар "Кніжкі настаўніка-стажора" (1988), "Зборніка метадычных матэрыялаў па псіхолага-педагагічнай разгрузцы вучняў" (1995).

**Можджар Рэгіна Іванаўна** (дзявоч. Танюкевіч, 5.11.1950, в. Стадаляны Шчучынскага р-на), беларускі педагог. Кандыдат педагагічных навук (1994). З сялянскай сям'і. Скончыла 8-годку у в. Амбілеўцы Шчучынскага р-на, СШ №5 у Гродне. Працавала ст. піянерважатай у мяст. Скідзень Гродзенскага р-на (1968-69). Вучылася на філфаку (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) Гродзенскага педінстытута (1969-74). Зноў была ст. піянерважатай (у Гродзенскіх СШ №10, №7), у 7-ай СШ настаўнічала. У 1979-86 — арганізатар пазакласнай і пазашкольнай работы Гродзенскай СШ №3. Затым — дырэктар СШ №13 г. Гродна (1986-89), дырэктар школы-гімназіі №30 г. Гродна (1989-96). З 1996 — у дактарантуры на кафедры педагогікі Гродзенскага універсітэта (з 1997 выкладае на гэтай кафедры). Друкуецца з 1989. Вывучае арганізацыйна-педагагічныя асновы школьнай адукацыі.

**Моўчан Міхаіл Аляксеевіч** (7.04.1925, в. Купіск Навагрудскага р-на), беларускі мастак (графік, жывапісец). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1967). З сялянскай сям'і, якая выязджала ў Аргенціну, дзе жылі ў 1939-56. Па звароце на радзіму вучыўся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (скончыў у 1962). Выкладаў у Мінскім педінстытуце (1962-74). Удзельнічае ў выставах з 1961. Працуе пераважна ў станковай графіцы (лінагравюра, літаграфія, пастэль, плакат), у розных жанрах. Сярод твораў: серыя "У пошуках лепшага жыцця" (1962), "Туманная раніца" (1964), "Днём і ноччу" (1964), "На далёкіх рубяжах" (1964), серыя "Трактаразаводцы" (1967), "Святлана" (1969), "Ленін-мысліцель" (1969), "Карл Маркс" (1970), "Партрэт жонкі" (1975), "Сярожа" (1975). У жывапісе — партрэты спявачкі Н. Гайды (1983), артыста В. Тарасава (1983), кампазітара С. Картэса (1983), артыста М. Яроменкі (1983), спевакоў — Т. Шымко

(1984), З. Бабія (1984). Аўтар дэкаратыўнага пано "Беларусь" для сусветнай выставы "Экспо-67" у Манрэалі (1967).

**Мурачкоўскі Мікалай Восіпавіч** (10.06.1932, в. Смольчычы Карэліцкага р-на), беларускі псіхолаг, педагог. Кандыдат псіхалагічных навук (1967). Дацэнт (1971). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў роднай вёсцы, 10-ты клас у Амневіцкай СШ Навагрудскага р-на (1950). Вучыўся на аддзяленні логікі, псіхалогіі і рускай мовы філфака БДУ (1950-55). Працаваў завучам, дырэктарам у школах Смаргонскага р-на (1955-62). У 1962-65 — аспірант кафедры псіхалогіі Мінскага педінстытута. Затым выкладаў на кафедры педагогікі і псіхалогіі Гродзенскага педінстытута (1965-77). З 1977 — дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Гомельскага універсітэта. Друкуецца з 1964. Навуковыя інтарэсы звязаны з педагагічнай псіхалогіяй, праблемамі дыферэнцыяванага падыходу да вучняў у працэсе навучання і выхавання. Выдаў кнігу "Як папярэдзіць непаспяховасць школьнікаў" (1977, на рус. мове). Сааўтар выдадзенага ў Маскве даследавання "Псіхалагічныя праблемы непаспяховасці школьнікаў" (1971).

**Мурзіч Люся Іванаўна** (дзявоч. Кокала, 23.07.1953, в. Зенявічы Навагрудскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. З сям'і службоўцаў. Скончыла Нягневіцкую СШ (Навагрудскі р-н), аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстатута (1974). Настаўнічала ў СШ №1 г. Гродна (1974-75). З 1975 — выкладчык кафедры рускай і замежнай літаратуры Гродзенскага педінстытута (універсітэта). У 1976-79 вучылася ў аспірантуры на кафедры рускай класічнай літаратуры БДУ. Аўтар многіх навуковых публікацый (друкуецца з 1976) у галіне гісторыі і тэорыі навукова-фантастычнай літаратуры, рускай паэзіі XIX ст.

**Мухлінскі Антон Восіпавіч** (1808, маёнт. Валеўка Навагрудскага р-на — 25.10.1877), рускі і беларускі ўсходазнавец, педагог. Прафесар (1839). Член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук (1838). З сям'і дробнага шляхціца. Вучыўся ў школе ў Маладзечне, у Віленскім універсітэце (1822-26), на факультэце ўсходніх моваў Пецярбургскага універсітэта (1828-32). Вывучаў усходазнаўства ў Турцыі і Егіпце (1832-35). Выкладаў арабскую (1835-39) і турэцкую (1853-63) мовы, гісторыю Турцыі (з 1855) на факультэце ўсходніх моваў Пецярбургскага універсітэта. Быў дэканам гэтага факультэта (1859-66). Аўтар шматлікіх прац у галіне цюркалогіі. Вывучаў пісьмовую

культуру беларускіх татараў, першы даследаваў "кітабы". Выдаў у Пецярбургу "Асманскую хрэстаматыю для універсітэцкага выкладання" (1858-59), "Слоўнік выказаў, якія прыйшлі... у нашу мову з моваў усходніх..." (1858). Пісаў на рускай і польскай мовах.

**Мышко Данута Рамуальдаўна** (дзявоч. Сцяцкевіч, 26.08.1963, г. Гродна), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1993). Дацэнт (1999). З сям'і рабочага. Вучылася ў Гродне ў СШ №4 і №14. Скончыла аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1985). Настаўнічала ў 8-годцы ў в. Нязбодзічы і ў Поразаўскай спецшколе-інтэрнаце Свіслацкага р-на (1985-87). У 1987-89 выкладала на кафедры рускай і замежнай літаратуры Гродзенскага універсітэта. З 1989 — на кафедры польскай філалогіі гэтага універсітэта. Скончыла завочна аспірантуру Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай Акадэміі навук у 1992. Друкуецца з 1989. Вывучае гісторыю і сучасны стан польскай паэзіі. Выдала навучальны дапаможнік для студэнтаў "Польская паэзія другой паловы XVIII стагоддзя" (Гродна, 1997). Аўтар навучальна-метадычных выданняў па гісторыі польскай літаратуры.

**Мяйштовіч Ян** (22.03.1910, в. Вялікая Рагозніца Мастоўскага р-на — 27.02.1997), польскі дыпламат, публіцыст, перакладчык. Скончыў юрыдычны факультэт Ягелонскага універсітэта ў Кракаве. У 1932-39 працаваў на дыпламатычнай рабоце ў Марселі, Будапешце, Жэневе. У час 2-ой сусветнай вайны належаў да арміі саюзнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. З 1946 — у Польшчы. Працаваў у выдавецтвах, рэдакцыях часопісаў, перакладаў з англійскай і французскай моваў. Аўтар кніг успамінаў "Сага Падгальскай брыгады", "Час мінулы завершаны", выдадзеных у 70-80-я.

**Мялешка Васіль Іванавіч** (15.03.1921, в. Мяльканавічы Слонімскага р-на, беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук (1972). Прафесар (1990). Член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі (1989). З сялянскай сям'і. Пачатковую школу скончыў у Мяльканавічах, 5-6 кл. — у Слонімскай 7-годцы, 7 кл. — у польскай гімназіі ў Слоніме (1939). За 10 кл. здаў у беларускай СШ №1 г. Слоніма. Вучыўся ў Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце, адкуль у 1940 накіраваны загадчыкам пачатковай школы ў в. Масты пад Баранавічамі. У 1941-45 — удзельнік вайны з Германіяй. Двойчы паранены. Адзначаны баявымі ўзнагародамі. У 1947-52 — студэнт гістфака БДУ. Настаўнічаў у Мінску. Завочна скончыў аспірантуру ў БДУ. З 1956

працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (малодшым, ст. навуковым супрацоўнікам, у 1980-91 — загадчыкам сектара гісторыі Беларусі перыяду феадалізму). У 1991-94 працаваў у Фондзе фундаментальных даследаванняў пры Савеце Міністраў РБ. Навуковыя інтарэсы звязаны пераважна з сацыяльна-эканамічнай гісторыяй Беларусі XVI-XVIII стст. Выдаў даследаванні "Магілёў" (1959, у сааўт., на рус. мове), "Слонім" (1962, на рус. мове), "Полацк. Гістарычны нарыс" (1962, у сааўт., на рус. мове), "Гісторыя Мінска" (1967, у сааўт., на рус. мове), "Гісторыя Беларускай ССР". Т. I (1972, у сааўт.), "Нарысы аграрнай гісторыі ўсходняй Беларусі. Другая палова XVII — XVIII стст." (1975, на рус. мове), "Класавая барацьба ў беларускай вёсцы ў другой палове XVII — XVIII ст." (1982, на рус. мове), "Магілёў у XVI — сярэдзіне XVII ст." (1988, на рус. мове), "Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы" (1988, у сааўт.), "Нарысы гісторыі Беларусі". Ч. I (1994, у сааўт.).

**Мярляк Кастусь** (Канстанцін Іванавіч, 25.12.1919, в. Дзетамля Навагрудскага р-на), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. З сям'і настаўніка, якая пасля І-ай сусветнай вайны займалася гаспадаркаю. Скончыў 2-гадовую сельскагаспадарчую школу ў Кашалёве Навагрудскага р-на (1937), аднагадовую "каапeратыўна-сельскагаспадарчую" ў Налэнчаве ля Любліна (1938). Працаваў бухгалтарам. З лістапада 1939 — у Навагрудскім банку. Вучыўся на курсах банкаўскіх інспектараў у Беластоку (1940). У 1942 вучыўся на афіцэрскіх курсах Беларускай самааховы. Служыў у войску Беларускай самааховы, Беларускай краёвай абароны (1942-44). У 1944 выехаў на Захад. Жыў у Італіі (1946-47), у Аргенціне (1948-54), дзе займаўся арганізацыяй рэлігійнага жыцця беларусаў, стварыў беларускія радыёперадачы, узначальваў сектар Рады БНР у 1949-54. З 1954 — у ЗША, дзе працягваў працу ў параходных кампаніях. Актыўна дзейнічаў у Радзе БНР, Беларуска-амерыканскім задзіночанні (у 1959-63 быў старшынёй галоўнай управы), у арганізацыях праваслаўнай царквы. Аўтар шматлікіх публікацый (друкаваўся з 1948) на тэмы палітычнага і культурнага жыцця беларускай эміграцыі ў беларускіх і іншамоўных газетах і часопісах. Выдаў кнігу мемуараў "Дзейнасць Кастуся Мерляка на эміграцыі" (Н'ю-Йорк, 1992).

**Навагродскі Тадэвуш Антонавіч** (6.11.1965, в. Арцюшы Шчучынскага р-на), беларускі этнограф. Кандыдат гістарычных навук (1995). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 8-годку, у Ваўкавыску — педагагічную вучэльню (1984). Паступіў на гістфак

БДУ, але неўзабаве давялося служыць у войску (1985-87). Працягваў вучобу ў 1987-91. Быў аспірантам у аддзеле этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1991-94), дзе затым працуе. Адначасова з 1997 — дацэнт кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін БДУ. Друкуецца з 1993. Вывучае матэрыяльную культуру Беларусі (у першую чаргу народную кулінарыю), міжэтнічныя адносіны, методыку палявых этнаграфічных даследаванняў.

**Навагрудскі Герцэль Самойлавіч** (3.09.1904, г. Ваўкавыск — 5.11.1973), рускі пісьменнік, журналіст. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1958). З сям'і дробнага службоўца. Вучыўся на эканамічным факультэце Бакінскага універсітэта (1921-23). Працаваў у газеце "Водный транспорт". У 1930-38 — карэспандэнт газеты "Правда". Удзельнік 2-ой сусветнай вайны, быў ваенным карэспандэнтам газеты "Красный флот". Пасля вайны супрацоўнічаў з часопісам "Новый мир". Друкаваўся з 1926. Выйшлі ў Маскве яго біяграфічныя нарысы "Герой Савецкага Саюза Д.М. Карбышаў" (1948), "Герой Савецкага Саюза М. В. Кантарыя" (1948), дакументальная аповесць "Таварышы кітайскія байцы" (1959, у сааўт.). Выдаў у Маскве кнігі для дзяцей: "На маленькім востраве"(1952, 2-е выд. 1958), "Дзік з 12-ай Ніжняй" (1956), "Лісты дзядзькі Ягора..." (1958), "Індзейскае зерне" (1960), "Маленькі Тыук едзе ў Маскву" (1962), "Па слядах Тау" (1962, у сааўт.), "Вялікая Жамчужына" (1964), "Пячора Бацікава" (1965).

**Навумовіч Уладзімір Аляксандравіч** (29.10.1943, в. Баўцючы Карэліцкага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, літаратуразнавец), педагог. Кандыдат філалагічных навук (1974). Дацэнт (1982). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1990). З сям'і рабочага-будаўніка і настаўніцы. Вучыўся ў 7-годцы ў в. Скорычы Карэліцкага р-на (1950-57). Скончыў СШ у в. Ярэмічы Карэліцкага р-на (1960). Працаваў настаўнікам 8-годкі ў в. Беражка (Карэліцкі р-н) у 1960-61. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1961-66). Працаваў на камсамольскай рабоце ў Мінску — загадчыкам аргаддзела Ленінскага райкама ЛКСМБ (1965-66), загадчыкам сектара культмасавай работы Мінскага абкама ЛКСМБ (1966-69), лектарам ЦК ЛКСМБ (1969-70). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры беларускай літаратуры БДУ (1970-73). З 1973 выкладае на гэтай кафедры. З 1989 — загадчык кафедры беларусазнаўства БДУ, адначасова ўзначальвае міжнародную летнюю школу беларусістаў пры БДУ. Літаратурны дэбют — апавяданне ў Навагрудскай

райгазеце "Новае жыццё" (1964). Аўтар літаратуразнаўчых і публіцыстычных артыкулаў, нарысаў, апавяданняў, аповесцяў. Выдаў даследаванне "Шляхамі арлянят: проза "Маладняка" (1984), аповесць "Такое бывае аднойчы" (1982). Сааўтар кніжкі для дзяцей "Ты жывеш у Беларусі" (1998), навучальнага дапаможніка для студэнтаў "Беларусазнаўства" (1997).

**Найдзюк Язэп Іванавіч** (15.05.1909, в. Бойдаты Ваўкавыскага р-на — 14.02.1984), беларускі гісторык, беларускі і польскі грамадска-культурны дзеяч. Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1973). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу, у Вярэйках Ваўкавыскага р-на — 7-годку. Вучыўся ў Ваўкавыскай настаўніцкай семінарыі (1923-25), якую пакінуў з-за матэрыяльных цяжкасцяў. У 1926-39 працаваў у Беларускай друкарні імя (Акарыны ў Вільні (у 1928-39 кіраўніком). Адначасова рэдагаваў часопіс "Шлях моладзі" ў 1930-39. У Вільні ўключыўся ў беларускі грамадска-культурны рух. Спяваў у хоры, удзельнічаў у спектаклях. Як вольны слухач наведваў лекцыі на гістарычным факультэце Віленскага універсітэта. Быў сябрам ЦК БНА. У жніўні 1939 зняволены польскімі ўладамі ў Картуз-Бярозе. Выйшаў на волю з прыходам Чырвонай Арміі. Неўзабаве арыштаваны савецкімі ўладамі. Працаваў пасля у друкарнях у Вільні. З ліпеня 1941 — сакратар Беларускага нацыянальнага камітэта. Увосень 1941 пераязджае ў Мінск, дзе працуе ў выдавецтве школьных падручнікаў Генеральнага школьнага камісарыята. Дэлегат 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). У чэрвені 1944 выехаў у Прагу, затым у Грайсвальд, дзе працаваў токарам на фабрыцы. У 1945 перабраўся ў Познань, затым у Інаўроцлаў, дзе працаваў у друкарні (жыў у Польшчы пад прозвішчам Александровіч). З 1955 — дырэктар Інаўроцлаўскага прадпрыемства мясцовай вытворчасці, адначасова — дырэктар друкарні (да 1971). Пасля быў кіраўніком інспекцыі па справах мясцовага друку. Актыўна працаваў у таварыстве сяброў горада Інаўроцлава (у 1972-79 — старшыня таварыства), у інаўроцлаўскім аддзеле Польскага гістарычнага таварыства (з 1975 — намеснік старшыні). Быў сябрам рэдкалегіі "Ziemi Kujawskiej". Займаўся мясцовым краязнаўствам, шмат друкаваўся ў навуковай і масавай перыёдыцы. Выдаў у Інаўроцлаве даведнікі: "Наведаем Інаўроцлаў" (1967, 2-е выд. 1973), "Інаўроцлаў і ваколіцы" (1969, 2-е выд. 1982), краязнаўчыя нарысы "Друкарні і друкары горада Інаўроцлава" (1962), "50 гадоў дзейнасці Польскага Чырвонага Крыжа ў Інаўроцлаве" (1969), "50 гадоў друкарні выдавецкага прадпрыемства ЦРС у Інаўроцлаве" (Варшава, 1969),

"Крушвіца, Гопла і ваколіцы" (1973). Аўтар кнігі "Беларусь учора і сёньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі" (Вільня. 1940, 2-е выд. Мінск, 1944).

**Найдус Лейб** (6.10.1890, г. Гродна — 23.12.1918), яўрэйскі паэт, перакладчык. З сям'і землеўласніка, якая жыла ў маёнтку Кусцін (Беласточчына, Польшча). Тут прайшло дзяцінства. Скончыў у Гродне пачатковую школу. З 1901 вучыўся ў камерцыйнай вучэльні ў г. Радам (Польшча), затым у рэальнай вучэльні ў Беластоку. У 1905 выключаны за ўдзел у вучнёўскіх хваляваннях. У 1907 выключаны на той жа падставе з Ковенскай вучэльні. Працягваў вучобу ў Віленскай рэальнай вучэльні, якую пакінуў у 1911 дзеля літаратурных спраў. Пісаў на ідзіш (зрэдку на рускай мове). Друкаваўся з 1907, 1-я публікацыя ў варшаўскай газеце "Роман цайтунг". Творы шырока публікаваліся ў яўрэйскай перыёдыцы Беларусі, Расіі, Польшчы. Перакладаў Ш. Бадлера, А. Мюсэ, П. Верлена, Э. По, Г. Гейнэ, І. Гётэ, А. Пушкіна, М. Лермантава. Выдаў кнігі вершаў "Лірыка" (Вільня, 1915), "Флейта Пана" (Гродна, 1918), пераклаў на ідзіш паэму А. Пушкіна "Казка пра мёртвую царэўну і сем асілкаў" (Вільня, 1917). Адрэдагаваў літаратурны зборнік на рускай мове "Неман" (Гродна, 1916). Зборнік вершаў "Інтымныя напевы" выйшаў у Гродне ў 1919. Збор твораў у 5-ці тамах выдадзены ў Варшаве ў 1927-28.

**Нарбут Казімір** (19.04.1738, маёнт. Крупава Лідскага р-на — 17.03.1807), беларускі асветнік, педагог, філосаф. Доктар права (1774). З шляхецкай сям'і Скончыў піярскую школу ў Шчучыне, дзе ўступіў у ордэн піяраў (1755). Працягваў вучобу на Украіне. У Вільні (з 1759) вывучаў філасофію і матэматыку ў піярскай калегіі. У Рыме ўдасканальваўся ў тэалогіі. Выкладаў у школах Беларусі рыторыку, логіку. Вывучаў прыродазнаўства і замежныя мовы ў Італіі. З 1762 — на радзіме. Выкладаў філасофію ў канвікце ў Вільні, кіраваў тут друкарняй піяраў. У 1770-я — навучэнец Кракаўскай акадэміі. Быў настаўнікам дзяцей А. Тызенгаўза. У 1784-86 — пробашч у Лідзе. Затым — сакратар М. Чартарыскага, супрацоўнік Адукацыйнай камісіі, "Таварыства па складанні элементарных кніг", інспектар школ беларуска-літоўскай піярскай правінцыі. З 1795 жыў у Радзівонішках, дзе і памёр. Аўтар падручніка "Логіка, або навука аб роздумах і развагах..." (Вільня, 1769, 4-е выд. 1791). Пісаў на лацінскай і польскай мовах. Друкаваў вершы, перакладаў з лацінскай і французскай моваў. Склаў у 1782 "Геаграфічны слоўнік антычнага свету" (застаўся ў рукапісе).

**Нарбут Тодар** (8.11.1784, маёнт. Шаўры Воранаўскага р-на — 26.11.1864), польскі і беларускі гісторык, археолаг, краязнавец. З шляхецкай сям'і. Скончыў фізічна-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта (1803). Вучыўся (з 1803) у Пецярбургскім корпусе кадэтаў. Удзельнік руска-пруска-французскай (1806-07) і руска-шведскай (1808-09) войнаў. Ваенны інжынер. Удзельнічаў у праектаванні Бабруйскай крэпасці. З 1812 жыў у Шаўрах. Арыштоўваўся падчас паўстання 1830-31. Займаўся эканомікай маёнтка. Выдаў у выніку працу "Пра апрацоўку лёну, каноплі і іншых Балотаўтваральных раслін..." (Вільня, 1834). Вывучаў гісторыю Вялікага княства Літоўскага. Вёў раскопкі (з 1810) у Прыдняпроўі, на радзіме. Першы ў Беларусі трактаваў курганы як месцы пахавання. Сабраў вялікую бібліятэку, калекцыі археаграфічных і археалагічных матэрыялаў. Даследаваў гісторыю Ліды, Навагрудка, Крэва (Смаргонскі р-н), Вільні, Гродна, Індуры (Гродзенскі р-н). Як краязнавец друкаваўся ў "Гродненских губернских ведомостях", "Undynie Druzgienickich źródeł", супрацоўнічаў з перыёдыкамі Варшавы, Вільні, Пецярбурга. Аўтар "Старажытнай гісторыі літоўскага народу" Т. 1-9 (Вільня, 1835-41), 10-ты том застаўся ў рукапісе. Выдаў кнігі "Помнікі да літоўскай гісторыі..." (Вільня, 1846), "Гісторыя літоўскага народу, сцісла выкладзеная" (Вільня, 1847), "Драбнейшыя пісьмовыя крыніцы, якія адносяцца пераважна да гісторыі Літвы" (Вільня, 1856). Пісаў на польскай і рускай мовах. Займаўся перакладамі з Гарацыя, Ж. Русо, М. Сервантэса. У 1863 за ўдзел у паўстанні быў высланы ў Вільню, дзе і памёр.

**Насовіч Ян** (24 06.1942, мяст. Радунь Воранаўскага р-на), польскі мовазнавец, педагог. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1989). Прафесар (1991). З сям'і службоўцаў. Па вайне пераехалі ў Польшчу. Скончыў у Влацлаўку агульнаадукацыйны ліцэй (1964), у Аструдзе — сярэднюю педагагічную вучэльню (1968). Вучыўся на гуманітарным факультэце Гданьскага універсітэта (1964-71). Працаваў на кафедры рускай філалогіі філіі Варшаўскага універсітэта ў Беластоку (асістэнтам, ад'юнктам, дацэнтам, прафесарам). У 1984-90 — кіраўнік кафедры рускай філалогіі, у 1990-96 — кіраўнік кафедры ўсходнеславянскай філалогіі, з 1996 — дырэктар Інстытута ўсходнеславянскай філалогіі філіі Варшаўскага універсітэта ў Беластоку (Беластоцкага універсітэта). Друкуецца з 1974. Навуковыя інтарэсы звязаны з праблемамі сучаснага сінхроннага мовазнаўства, найперш параўнальнай граматыкі польскай мовы і ўсходнеславянскіх моваў. Выдаў кнігі: "Асабовыя назоўнікі, тоесныя паводле структуры ў

рускай і польскай мовах" (Беласток, 1988), "Сінтаксіс рускай мовы" (Беласток, 1991). Сааўтар кніг: "Рускае слова. Дыдактычны слоўнік рускай мовы" (Беласток, 1981), "Рускае слова. Навукова-дыдактычны слоўнік" (Варшава, 1988), "Кішэнны польска-рускі камерцыйны слоўнік" (Беласток, 1992, на рус. мове), "Слоўнік лінгвістычнай тэрміналогіі: беларуска-рускапольскі і польска-руска-беларускі" (Беласток, 1994).

**Незабітоўскі Станіслаў** (24.09.1641, в. Ятра Навагрудскага р-на — 1717), беларускі мемуарыст. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў езуіцкай калегіі ў Навагрудку. Кіраваў адміністрацыяй Б. Радзівіла ў Слуцкім княстве. Выбіраўся дэпутатам ад навагрудскай шляхты на сесіі Трыбунала Вялікага княства Літоўскага. З 1770-х жыў у Слуцку. Удзельнічаў у кальвінскіх сінодах Навагрудскай акругі. Аўтар успамінаў (дзённіка) на польскай мове, у якіх паказаны падзеі і факты грамадска-палітычнага і прыватнага жыцця 1682-1700 гг. на Навагрудчыне і Случчыне.

**Неман Чэслаў** (сапр. Выдрыцкі, 16.02.1939, в. Старыя Васілішкі Шчучынскага р-на), польскі спявак, музыкант, кампазітар. З сям'і настройшчыка арганаў. У Васілішкаўскай школе скончыў 7 кл. (1953). Паступіў у Гродзенскую музычна-педагагічную вучэльню, дзе правучыўся год. Працягваў вучобу ў СШ у Васілішках. У 1957 сям'я пераехала ў Польшчу. У Гданьску скончыў сярэднюю музычную школу. Дэбютаваў як музыкант і спявак у студэнцкім клубе "Жак" (1958). Наступныя творчыя крокі — у студэнцкіх калектывах Гданьска і Сопата ў 1959-62. У 1962-66 выступае як саліст ансамбля "Блакітна-чорныя". Арганізатар і саліст ансамбляў "Акварэль" (1967), "Нёман-Энігматык" (1969), "Нёман-Аэраліт" (1974). З пач. 70-х — сольныя канцэрты за мяжой (у Францыі, ФРГ, ГДР, Чэхаславакіі, Венгрыі, Швейцарыі, Італіі, Швецыі, Югаславіі, Індыі, ЗША, Канадзе, Кубе, СССР). У лістападзе 1976 выступіў з канцэртамі ў Мінску, Гродне. Аўтар песень, музыкі да тэатральных спектакляў і кінафільмаў, кампазіцый на вершы паэтаў розных народаў, кампазіцый, у якіх сінтэзуюцца розныя жанры, распрацоўваецца музыка кампутарных сістэм. Лаўрэат польскіх і міжнародных конкурсаў. Запісы — з 1973.

**Нёманскі Янка** (сапр. Пятровіч Іван Андрэевіч, 12.04.1890, в. Шчорсы Навагрудскага р-на — 30.10.1937), беларускі пісьменнік (празаік, публіцыст), эканаміст. Акадэмік Беларускай Акадэміі навук

(1928). З беднай сялянскай сям'і. Першапачатковыя веды здабываў самастойна, змалку працуючы на гаспадарцы. У 1909 скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю і працаваў у школе ў в. Нястанавічы ля Плешчаніц, у Брагіне і Горвалі Рэчыцкага павета. Вучыўся на гістарычна-філалагічным факультэце Петраградскага універсітэта (1915-16, 1918-19). З 1916 — у войску. Скончыў ваенную вучэльню. Ваяваў на Карэльскім, Петраградскім франтах, служыў у Сібіры, на Далёкім Усходзе. У 1918 працаваў у Белнацкаме (у Петраградзе, Маскве) сакратаром культасветнага аддзела, загадчыкам выдавецкага аддзела. Удзельнічаў у выданні газеты "Дзянніца". Быў сакратаром Усерасійскага з'езду бежанцаў Беларусі. У 1918-19 — сябра Беларускага вольна-эканамічнага таварыства (Петраград). У 1919-22 — у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях з войскамі Юдзеніча, Польшчы (ля Ваўкавыска, Гродна, Ліды). Затым жыў у Мінску. Быў сябрам Інбелкульту. Уваходзіў ва ўправу літаратурнага аб'яднання "Полымя". Працаваў у планава-эканамічных органах рэспублікі. Быў вучоным сакратаром Інстытута эканомікі Беларускай Акадэміі навук, намеснікам старшыні Дзяржплана БССР, намеснікам кіраўніка справамі СНК БССР. У 1927-36 сябра ЦВК БССР. Загадваў кафедрай фінансавых дысцыплін Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (1933-36). Быў загадчыкам аддзела эканомікі навукова-даследчага інстытута прамысловасці. У 1937 рэпрэсаваны, неўзабаве расстраляны. З 1918 публікаваў артыкулы на тэмы гісторыі, эканомікі, культуры. З 1922 друкуецца як празаік. Выйшла яго кніга апавяданняў "На зломе" (1925, 2-е выд. 1928), у перакладзе на рускую мову — у Ленінградзе ў 1930. Раман "Драпежнікі" друкаваўся ў "Полымі" ў 1928-30. Кніга выбранай прозы "Творы" выдадзена ў 1984.

**Нікадон Мар'ян** (27.08.1936, в. Агароднікі Ашмянскага р-на), польскі паэт. З сялянскай сям'і, якая ў 1946 пераехала ў Польшчу. Жылі ў Кортах, пазней у Барчэве Ольштынскага ваяводства. У 1953 спыніў вучобу ў Ольштынскім педагагічным ліцэі з-за матэрыяльных цяжкасцяў. Працаваў у павятовай бібліятэцы ў Барчэве. У 1957-59 служыў у войску і супрацоўнічаў з тыднёвікам "Żołnież Polski". З 1959 працаваў у адміністрацыі турмы ў Барчэве. У 1963 завочна скончыў сярэднюю школу, пазней завочна тэхнікум у Варшаве. Дэбютаваў як паэт у 1953. Выдаў зборнік вершаў "Дзень наступны" (Ольштын, 1961).

**Нікалаеў Мікола** (Мікалай Віктаравіч, 21.02.1955, г. Шчучын), беларускі культуролаг, мастацтвазнавец. Доктар філалагічных навук

(1997). З сям'і службоўцаў. У дзяцінстве жыў у в. Нянькава Навагрудскага р-на (1958-62). Скончыў СШ №4 у Навагрудку (1972). Вучыўся на гістфаку БДУ (1972-77). Працаваў настаўнікам гісторыі на Пастаўшчыне (1977-78). З 1978 — супрацоўнік Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Пецярбургу, з 1988 — загадчык аддзела газет гэтай бібліятэкі (у 1987 завочна скончыў аспірантуру Ленінградскага інстытута культуры). Чытае з 1992 кнігазнаўчы курс на кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1975. Вывучае матэрыяльную культуру старажытнай Беларусі, гісторыю рукапіснай і друкаванай кнігі, афармленне даўняй кнігі Беларусі. Аўтар шматлікіх навуковых публікацый у Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіне. Выдаў даследаванне "Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X-XVIII стагоддзях" (1993).

**Нікіфарава Вольга Барысаўна** (30.12.1956, г. Гродна), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1998). З сям'і выкладчыка вышэйшай школы. Скончыла Гродзенскую СШ №9 (1974), аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута (1978). Працавала настаўніцай у Васілевіцкай 8-годцы Гродзенскага р-на (1978-82). У 1982-85 — аспірантка Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. Працавала ў Магілёўскім педінстытуце (1985-86). З 1986 — ст. выкладчык кафедры рускай і замежнай літаратуры Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1988. Вывучае творчасць Я. Брыля, жанрава-стылёвую прыроду яго прозы ў кантэксце сучаснай літаратуры.

**Нікольскі Уладзімір Мікалаевіч** (25.03.1952, мяст. Жалудок Шчучынскага р-на), беларускі мастак (графік, жывапісец). Скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве (1970), аддзяленне графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1978). Жыве і працуе ў Лідзе. У выставах — з 1978. Напісаў графічную серыю "Лекары" (1978), літаграфіі "Стары Мінск" (1980), "Сельскі матыў" (1980), жывапісныя творы (алей) "Партрэт дзяўчыны" (1986), "Жаночы партрэт" (1989), "Краявід з замкам Гедыміна" (1989), "Хрысціна" (1991), два "Краявіды Ліды" (1992), "Партрэт дачкі" (1993), графічныя аркушы "Родны край" (1989). Творы захоўваюцца ў Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі.

**Новік Вера Міхайлаўна** (дзявоч. Пузач, 16.01.1948, в. Малая Воля Дзятлаўскага р-на), беларускі і марыйскі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1985). Дацэнт (1988). З сялянскай сям'і.

Скончыла 7-годку ў роднай вёсцы, СШ — у мяст. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-на. Працавала тут настаўніцай і завочна вучылася на гістфаку БДУ (скончыла ў 1974). У 1969 па сямейных абставінах пераехала ў г. Йашкар-Алу (Марый Эл). Займалася тут краязнаўствам. З 1974 выкладае на кафедры ўсеагульнай гісторыі Марыйскага універсітэта. Завочна скончыла аспірантуру на кафедры сярэдніх вякоў Ленінградскага універсітэта (1978). Друкуецца з 1978. Навуковыя інтарэсы звязаны з гісторыяй грамадскай думкі Беларусі XVI ст., дзейнасцю Ф. Маджэўскага.

**Новік Яўген Канстанцінавіч** (17.08.1939, в. Рахавец Навагрудскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Доктар гістарычных навук (1988). Прафесар (1991). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Зенявічы (Навагрудскі р-н), Навагрудскую педагагічную вучэльню (1957), гістарычна-геаграфічны факультэт Мінскага педінстытута (1961). Служыў у войску (1962-64). Настаўнічаў у школе-інтэрнаце ў Гродне (1962, 1964-65), у Навагрудскім гандлёва-эканамічным тэхнікуме (1965-67). Вучыўся ў аспірантуры Мінскага педінстытута (1967-70). Працаваў тут асістэнтам, ст. выкладчыкам, дацэнтам (1970-75). У 1975-85 — дацэнт Мінскага інстытута культуры (у 1981-83 знаходзіўся ў дактарантуры). У 1986-89 працаваў дацэнтам, затым прафесарам у Рэспубліканскім інстытуце павышэння кваліфікацыі кіраўнічых кадраў і спецыялістаў народнай гаспадаркі. З 1989 — загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Мінскага радыётэхнічнага інстытута (Беларускага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі). Аўтар манаграфіі "Фармаванне кадраў народнай адукацыі Беларусі. 1917-1941 гг." (1981, на рус. мове). Сааўтар даследаванняў: "Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага. 1922-1972 гг." (1974, на рус. мове), "Удзел Ленінскага камсамола Беларусі ў барацьбе за ўздым народнай адукацыі. 1920-чэрвень 1941 г." (1979, на рус. мове), "Ленінскі камсамол Беларусі — агульнаадукацыйнай школе. 1941-1980 гг." (1982, на рус. мове), "Беларусь у перыяд правядзення рэформ. Сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця. 1985-1995 гг." (1995), "Гісторыя Беларусі". Ч. 1-2. (1998).

**Нюнька Хведар** (Фёдар Якубавіч, 6.04.1928, в. Алешавічы Мастоўскага р-на), беларускі грамадска-культурны дзеяч. З беднай сялянскай сям'і. У 1934 пераехалі ў Вільню, дзе ў 1948 скончыў рускую гімназію. Вучыўся на лясным факультэце Літоўскай сельскагаспадарчай акадэміі (скончыў у 1953). Працаваў па спецыяльнасці да 1959. У

1959-92 — у праектных інстытутах Вільнюса, таксама — спецыялістам па каштарысах. З 80-х вядзе актыўную грамадска-культурную працу па адраджэнні беларускасці ў Літве. З 1989 — старшыня Таварыства беларускай культуры Літвы. Сябра прэзідыума Рады БНР (1997).

**Нядзельская Альжбета** (дзявоч. Нясвіжская, 9.11.1805, г. Гродна — 23.11.1883), польская артыстка драматычнай і музычнай сцэны (каларатурнае сапрана). Дэбютавала ў Гродне ў 1820 у трупе К. Камінскага ў оперы Я. Эльснера "Султан Вампун". Неўзабаве пераехала з трупаю ў Вільню, дзе выступала да 1823 (з выездам ў Беласток, Камянец-Падольскі, Мінск, Бабруйск). У Кіеве запрошана ў трупу А. Лянкоўскага. Выступала як вядучая спявачка трупы ў Камянцы-Падольскім (1824-26). У 1826-28 — у Кракаўскім тэатры. Пазней — у Кіеве, адкуль выязджала з гастролямі ў Кракаў, Люблін, Замосце. З 1838 — у варшаўскіх тэатральных калектывах (у рэпертуары — оперы Дж. Расіні, В. Беліні, К. Вебера, драмы А.Фрэдры і інш.)

**Някляеў Уладзімір Пракопавіч** (9.07.1946, г. Смаргонь), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998). З сям'і службоўца. У Смаргоні скончыў 9 кл. і вучыўся ў Мінскім тэхнікуме сувязі (1962-66). Працаваў радыёмеханікам у тэлеатэлье ў Мінску (1966-71). Вучыўся ў 1971 у Літаратурным інстытуце ў Маскве. Завочна скончыў філфак Мінскага педінстытута (1973). У 1972-75 — літсупрацоўнік, літкансультант у газеце "Знамя юности", у 1975-78 — рэдактар бюлетэня "Тэатральны Мінск". З 1978 — ст. рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. У 1988-99 — галоўны рэдактар часопіса "Крыніца". Адначасова ў 1997-99 — галоўны рэдактар штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва". Старшыня ўправы Саюза беларускіх пісьменнікаў (1998). З 1999 жыве ў Варшаве. Вершы друкуе з 1970, піша на беларускай і рускай мовах. Выдаў кнігі паэзіі "Адкрыццё" (1976), "Вынаходцы вятроў" (1979), "Знак аховы" (1983), "Мясцовы час" (М., 1983, на рус. мове), "Наскрозь" (1985), "Дрэва болю" (М., 1986, на рус. мове), "Галубіная пошта" (1987), "Веда" (1989, на рус. мове). "Прошча" (1996). Кніга вершаў і паэм выйшла ў Маскве ў перакладзе на рускую мову ў 1991. Піша прозу, эсэ, літаратурна-крытычныя артыкулы. Аўтар тэкстаў шматлікіх папулярных песень.

**Орса Аляксандр** (24.07.1896, мяст. Нягневічы Навагрудскага р-на — 2.11.1959), беларускі педагог. Доктар прыродазнаўства (1928). З сялянскай сям'і. Скончыў у Навагрудку гарадскую вучэльню (1913) і 2-гадовыя настаўніцкія курсы. З 1915 у войску (скончыў ваенную вучэльню), на франтах І-ай сусветнай вайны. Вярнуўся на радзіму ў 1918, настаўнічаў у пачатковай школе ў в. Вераб'евічы (Слонімскі р-н). Удзельнічаў у беларускім грамадскім і культурным руху. Вучыўся на прыродазнаўчым факультэце Карлава універсітэта ў Празе (1923-28). Працаваў настаўнікам беларускай гімназіі ў Навагрудку. Пасля яе закрыцця (1934) настаўнічаў у польскай пачатковай школе ў Навагрудку. У 1938-39 — настаўнік у Келецкім ваяводстве (Польшча). У 1939-41 — на настаўніцкай працы ў Навагрудскай беларускай гімназіі (СПІ), педагагічнай вучэльні. У час вайны быў школьным інспектарам Навагрудскай акругі. У 1944 выехаў з сям'ёй у Германію. У Рэгенсбургу арганізаваў беларускую гімназію і працаваў яе дырэктарам (1945-49). З 1949 — у ЗША, жыў у Н'ю-Йорку, арганізаваў тут першыя беларускія школы. Адзін з заснавальнікаў "Беларуска-амерыканскага Задзіночання", першай у Н'ю-Иорку парафіі Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, Беларускага Інстытута навукі і мастацтва. Працаваў у камісіі па рэдагаванні падручнікаў для беларускіх школ у эміграцыі.

**Падчашынскі Кароль Янавіч** (7.11.1790, мяст. Жырмуны Воранаўскага р-на, — 7.04.1860), беларускі і польскі асветнік, архітэктар, даследчык архітэктуры, педагог. Прафесар (1818). З сям'і архітэктара. Рана страціў бацьку і жыў пад апекаю сваякоў. Вучыўся ў павятовай школе базыльянаў у Брэсце, у Крамянецкім ліцэі. З 1813 — студэнт фізічна-матэматычнага факультэта Віленскага універсітэта. У 1814-16 вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. У 1817-19 працягваў вучобу ў Францыі, Італіі. У 1819-31 узначальваў кафедру архітэктуры Віленскага універсітэта. У 1838-53 жыў на вёсцы пад Нясвіжам, дзе арандаваў маёнтак, займаўся навуковай работай. Пазней жыў у Вільні, Варшаве. Па яго праектах пабудаваны сядзібныя палацы ў в. Жыліны на Магілёўшчыне (1825), у в. Яшуны ў Літве (1824-28), касцёл евангелічных рэфарматаў у Вільні (1830-35), школы ў Бабруйску (1819), Мазыры (1820-я), гімназіі ў Свіслачы (1826-42), Слуцку (1829), калонная зала Віленскага універсітэта (1817) і інш. Выдаў кнігі "План выкладання навук" (1822), "Пра выхаванне жанчын" (1825), "Пачаткі архітэктуры для акадэмічнай моладзі" Т. 1-3. (1828-57), "Будаўнічыя справы" (1856).

**Пазняк Зянон Станіслававіч** (24.04.1944, мяст. Суботнікі Іўеўскага р-на), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, мастацтвазнавец, археолаг, публіцыст. Кандыдат мастацтвазнаўства (1981). З сям'і інтэлігентаў, якія працавалі на гаспадарцы. Скончыў СШ у Суботніках (1961). Працаваў загадчыкам Хлевіцкага сельскага клуба Іўеўскага р-на (1962-64), рабочым сцэны Беларускага тэатра оперы і балета, фатографам Беларускага гістарычна-краязнаўчага музея (1964-67). У 1967 скончыў завочна аддзяленне мастацтвазнаўства Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Быў фатографам-афармляльнікам Мінскага мастацка-вытворчага камбіната (1967-69). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (1969-72). Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам гэтага інстытута (1972-75). У 1975-76 — фатограф Літаратурнага музея Я. Купалы. З 1976 — малодшы, з 1983 — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Старшыня Сойму БНФ "Адраджэнне" (1989): Народны дэпутат Беларусі (1990-94). Падвяргаўся палітычным рэпрэсіям з боку савецкай улады (1964, 1967, 1975, 1989). Вымушаны эміграваць з Беларусі ў 1996. Займаецца беларускай палітычнай дзейнасцю ў ЗША, Заходняй Еўропе. Вывучаў беларускі тэатральны рух пач. XX ст., архітэктуру гарадоў і мястэчак Беларусі часоў сярэднявечча, праблемы ахов ы і аднаўлення культурна-гістарычнай спадчыны Мінска. Праводзіў археалагічныя раскопкі ў Мінску, Мядзелі, Лоску, Курапатах. Выдаў фотаальбом "Браслаўшчына" (1970), кнігу для вучняў пра Мінск "Рэха даўняга часу" (1985). Аўтар (з канца 80-х) шматлікіх артыкулаў на тэмы палітычнага жыцця Беларусі. Частка з іх, прамовы, вершы, склалі зборнік "Сапраўднае аблічча" (1992). Сааўтар кнігі "Курапаты" (1994, на бел. і англ. мовах).

**Пазняк Янка** (Ян Аляксандравіч, 1887, мяст. Суботнікі Іўеўскага р-на — восень 1939), беларускі грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст. Атрымаў музычную адукацыю. Рана далучыўся да беларускага руху. У 1909-12 удзельнічаў у рабоце беларускіх хрысціянска-асветных гурткоў. У 1913-15 прымаў удзел у выданні віленскай газеты "Biełarus". Служыў арганістам у Лаварышках ля Вільні, у касцёле св. Яна ў Вільні (1918-20). Актыўна ўдзельнічаў (з 1917) у хрысціянска-дэмакратычным руху. Быў з 1928 г. сакратаром Прэзідыуму ЦК БХД, з 1936 — старшынёй Прэзідыуму Беларускага народнага аб'яднання. Арганізоўваў на вёсцы беларускія мастацкія калектывы, рупіўся пра адкрыццё беларускіх школ. У 1928-36 рэдагаваў газету "Беларуская крыніца". З пач. 30-х — старшыня

Беларускага нацыянальнага камітэта. З 1939 — рэдактар часопіса "Хрысціянская думка". У кастрычніку 1939 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і неўзабаве расстраляны. Друкаваўся з 1920. Аўтар шматлікіх артыкулаў пра палітычнае, рэлігійнае, культурнае жыццё Заходняй Беларусі, пра падзеі ў свеце. Публікаваў вершы, апавяданні.

**Пакульнага Леанард Восіпавіч** (4.09.1953, в. Едаклані Астравецкага р-на), беларускі скульптар. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1989). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Астравецкай СШ (1960-70), у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце па спецыяльнасці "скульптура" (1970-76). У 1976-77 служыў у войску. Затым працаваў у Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. Жанры творчасці — манументальная і станковая скульптура. У выставах — з 1977. Сярод твораў: кампазіцыя "Зорка Венера", прысвечаная М. Багдановічу (1978), помнік салдатам і аднавяскоўцам (загінулі ў вайне 1941-45) у пас. Дрыбін Магілёўскай вобл. (1981), кампазіцыя "Мір" (1987), гарэльеф "Слава працы" (1989), мемарыяльная дошка салдатам, якія загінулі ў Афганістане (1991), дэкаратыўная скульптура "Бахус" на заводзе шампанскіх вінаў у Новым Свеце (Крым, 1993), мемарыяльная дошка З. Стому ў Мінску (1999), надмагільны помнік М. Багдановічу (1999).

**Палуян Уладзімір Аляксандравіч** (3.01.1928, в. Некрашэвічы Карэліцкага р-на), беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук (1980). Прафесар (1993). З сялянскай сям'і. Удзельнічаў у партызанскім руху (1944). У роднай вёсцы скончыў 7-годку і працаваў тут (і ў в. Хомічы) настаўнікам пачатковай школы (1944-46). Завочна вучыўся ў Нясвіжскай педагагічнай вучэльні. Перавёўшыся на стацыянар Навагрудскай педагагічнай вучэльні, скончыў яе ў 1947. Вучыўся на гістфаку Мінскага педінстытута (1947-51), у аспірантуры ў гэтым інстытуце (1951-54). З 1956 працуе ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі (Нацыянальнай Акадэміі навук), у 1981-93 быў загадчыкам аддзела гісторыі сацыялістычнага будаўніцтва гэтага інстытута. Вывучае сацыяльна-эканамічныя адносіны, рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі 20-30-х, сацыяльныя змены ў савецкім грамадстве. Друкуецца з 1958. Выдаў даследаванні: "Беларуская сялянска-рабочая грамада" (1967), "Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух у Заходняй Беларусі. 1927-1939 гг." (1978); сааўтар работ: "Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1920-1939 гг." (1962, на рус. мове), "Перамога калгаснага ладу ў БССР" (1981, на рус. мове), "Гісторыя Беларускай ССР". Т. 3-4 (1973-

75), "Гісторыя СССР". Т. 9 (М., 1971), "Гісторыя Беларускай ССР" (1977, на рус. мове), "Нарысы гісторыі Беларусі". Ч. 2. (1995).

**Памецька Ніна Казіміраўна** (29.02.1956, в. Косцевічы Астравецкага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1985). Дацэнт (1994). З сям'і селяніна і настаўніцы. У роднай вёсцы скончыла пачатковую школу. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Свірскай СШ Мядзельскага р-на. Вучылася на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1974-79). Нядоўга настаўнічала ў 8-годцы ў в. Трокенікі Астравецкага р-на. У 1979-82 — аспірантка Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. З 1982 працуе на кафедры беларускай мовы, з 1991 — на кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага універсітэта (асістэнтам, затым ст. выкладчыкам, дацэнтам). Друкуецца як мовазнавец з 1982. Аўтар многіх навуковых артыкулаў па праблемах лексікі старажытнай і сучаснай беларускай мовы, аўтар метадычных дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў.

**Паплаўскі Яўген Уладзіміравіч** (20.09.1959, мяст. Поразава Свіслацкага р-на), беларускі кампазітар. Сябра Беларускага саюза кампазітараў (1989). Вучыўся ў школе ў Поразаве, у музычных школах у Свіслачы і Поразаве. У 1974-78 — у Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні. Скончыў Беларускую кансерваторыю (клас кампазіцыі праф. Б. Смольскага) у 1986 і асістэнтуру-стажыроўку С.-Пецярбургскай кансерваторыі (1991). Працаваў дырэктарам Беларускай капэлы (1992-96). Быў мастацкім рэдактарам у Беларускім інстытуце праблем культуры (1996-97). Стажыраваўся ў акадэміі музыкі ў Гданьску ў 1997-99. З 1999 — стажыроўка ў акадэміі музыкі ў Кракаве. Сярод твораў вакальна-інструментальнай музыкі: кантаты "Бацькаўшчына" на сл. Л. Геніюш і Н. Гілевіча (1985), "Званы маёй Русі" на сл. А. Фета і М. Рубцова (1986), сярод твораў аркестравай музыкі для сімфанічнага аркестра — паэма "Qo vadis" (1985), сімфонія "Lux acterna" для тэнара, хору і аркестра на сл. Л. Эміліта (1989), сімфанічныя эскізы "Поразава" (1991), для камернага аркестра — музыка для альта і аркестра "Памяці Станіслава Глякоўскага" (1987), камерныя творы для альта і фартэпіяна, для гітары, струннага квартэта з керамічнымі званкамі, пластычныя сцэны "Людзі святла месяца" для танцавальнай групы, гітары, струннага квартэта і ўдарных (1993), рамансы на сл. А. Пушкіна, Ю. Кузняцова, М. Рубцова, А. Гаруна, камерныя творы для флейты, барытона і фартэпіяна (сл. М. Багдановіча, 1990), дыпціх для барытона і фартэпіяна (сл. Я. Купалы,

1988), канцэрт для хору а капэла "Мой ціхі дом" на сл. Я. Купалы, Я. Коласа, Л. Геніюш (1987). Выдаў санату для альта і фартэпіяна (Варшава, 1995), тры фартэпіянныя мініяцюры "Сцэнкі" (1996). Адзін з складальнікаў зборніка "Гітара ў ансамблі" (1997).

**Пачобут-Адляніцкі Марцін** (30.09.1728, в. Саламянка Гродзенскага р-на — 20.02.1810), беларусі і польскі асветнік, астраном, педагог. Прафесар (1764). З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў езуіцкай калегіі ў Гродне (1740-43). У 1745 уступіў у ордэн езуітаў і адбываў два гады навіцыят у Вільні. У Слуцкай педагагічнай семінарыі вывучаў грэчаскую мову. У Полацкай езуіцкай калегіі 4 гады вывучаў філасофію. У 1753-54 вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі. З 1754 — у Пражскім універсітэце, дзе вывучаў грэчаскую мову і матэматыку. У 1761-64 вывучаў астраномію і матэматыку ў Італіі, Германіі, Францыі. З 1764 — прафесар Віленскай акадэміі (Галоўнай Літоўскай школы), у 1780-1803 — яе рэктар. Узначальваў універсітэцкую друкарню. Быў дырэктарам Віленскай астранамічнай абсерваторыі (1765-1807). Сябра Адукацыйнай камісіі, актыўна садзейнічаў развіццю ідэй Асветніцтва ў Беларусі. Вызначыў геаграфічныя каардынаты Гродна, Вільні і інш. гарадоў. Пісаў вершы на лацінскай і рускай мовах. Быў сябрам Лонданскага каралеўскага таварыства (1770), сябрам нацыянальнага Інстытута Францыі (1803).

**Пашкевіч-Негарэльскі Аляксандр Рыгоравіч** (сапр. Пашкевіч, 1.06.1957, в. Катчыно Мастоўскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1991). Бацька працаваў трактарыстам, маці — аграномам. У 1958 пераехалі ў пасёлак Негарэлае Дзяржынскага р-на. Тут скончыў СШ (1974). Працаваў слесарам-інструментальшчыкам на Мінскім трактарным заводзе і займаўся ў студыі выяўленчага мастацтва Дома культуры МТЗ, адначасова — у майстэрні А. Цыркунова (1974-75). У 1975-77 служыў у войску. Затым быў мастаком-афармляльнікам на ст. Мінск-пасажырскі, займаўся ў майстэрні А. Цыркунова (1978-80). У 1980-81 — афармляльнік у кінатэатры "Кіеў" у Мінску. Вучыўся на аддзяленні станковага жывапісу Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1981-87). У 1987 пераехаў з сям'ёй у пас. Энергетыкаў Дзяржынскага раёна. Кіруе гуртком выяўленчага мастацтва ў раённым Цэнтры дзіцячай творчасці. Працуе ў жанры ўмоўнай кампазіцыі (асацыятыўна-псіхалагічна-канцэптуальны кірунак). У выставах — з 1983 (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Галандыі). Сярод твораў: "Тыя, што дачакаліся ранка" (1988), "Горад Каіна" (1989), "Дарога" (1989), "Адам і Ева"

(1989), "Маці раніцы — ноч" (1990), "Голас зязюлі" (1990), "Трыялет" (1991), "Кірыл і Ферапонт" (1991), "Азяблыя" (1991), "Настаўнік" (1991), "Падарожныя" (1993), "Авель і Каін" (1993), "Вяртанне ў мінулае" (1993), "Радаўніца" (1993), "Сны пра дзяцінства" (1994), "Дабравешчанне ад Іаана" (1994), "Дабравешчанне ад Матвея" (1994), "Мелодыя снежня" (1994), "Вясна" (1995), "Уваскрэсенне" (1995), "Рэквіем" (1995), "Просінь, якая знікае" (1996). Творы захоўваюцца ў прыватных калекцыях, музеях, касцёлах Беларусі, Польшчы.

**Пашкоўскі Юзаф** (19.03.1787, в. Стокі Свіслацкага р-на — 4.10.1858), польскі вайсковы педагог, пісьменнік. З сям'і аканома памешчыцкага маёнтка. Вучыўся ў базыльянскай школе ў Барунах (Ашмянскі р-н), у дамініканскай школе ў Гродне. Скончыў гімназію ў Свіслачы. У 1810 выехаў у Варшаву, дзе паступіў на вайсковую службу. У 1812 удзельнічаў у вайне супраць Расіі на баку французаў. З 1820 выкладаў артылерыю ў кадэцкім корпусе ў Каліты. У 1822-30 выкладаў у артылерыйска-інжынернай школе ў Варшаве. Удзельнік паўстання 1830-31. У 1833 атрымаў дазвол весці прыватную педагагічную працу. Быў інспектарам педагагічных курсаў у Варшаве (1837-42). Пазней даваў прыватныя ўрокі. Выдаў "Практычную навуку кананіра..." (Варшава, 1830), гістарычна-мемуарную працу "Вайна ў Польшчы ў 1831 г., апісаная польскім афіцэрам у 1832 г." (Львоў, 1861, 2-е выд. 1867). Друкаваў літаратурныя партрэты польскіх вайсковых чыноў, апавяданні, вершаваныя гутаркі, у якіх адлюстроўваў успаміны дзяцінства, перажытае на вайне.

**Петрашкевіч Ануфры** (1793, г. Шчучын — 7.12.1863), польскі паэт, архівіст. З незаможнай шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Шчучыне ў піярскай павятовай школе. Быў настаўнікам. Скончыў фізічна-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта (1816) і філасофскі факультэт Варшаўскага універсітэта (1821). Адзін з заснавальнікаў таварыства філаматаў. З часоў вучобы працаваў у архіве Радзівілаў (у 1821-22 настаўнічаў у Любліне). У 1824 па справе філаматаў сасланы ў Пецярбург, адтуль — у Маскву, дзе працаваў (з 1825) у бібліятэцы універсітэта. У 1828, 1830 наведваў радзіму. У 1831 арыштаваны за сувязь з паўстаннем і асуджаны да пакарання смерцю. У 1832 гэты прысуд заменены ссылкаю ў Сібір. У Табольску працаваў губернскім сакратаром. У 1860 вярнуўся ў Вільню, парадкаваў архівы філаматаў. Дэбютаваў як паэт у "Tygodniku Wileńskim". Апрацоўваў у творах беларускія народныя абрады, паданні, гістарычныя легенды. Вершы распаўсюджваліся пераважна ў рукапісах.

**Петрашэвіч Яўген Канстанцінавіч** (18.06.1930, в. Падбараны Мастоўскага р-на), беларускі музычны педагог, кампазітар. З сям'і паштовага чыноўніка (пры Польшчы працаваў цесляром, у 1950 з жонкаю рэпрэсаваныя). Пачатковую школу скончыў у Лунне (Мастоўскі р-н). У 1939 пераехалі ў Гродна. У 1949 скончыў 9 кл. СШ №8. Адначасова вучыўся тут у музычнай школе. У 1949-55 — у Мінскай музычнай вучэльні па класе баяна і кампазіцыі (у 1950-53 служыў у войску). Выкладаў у музычнай школе ў Гродне (1956-70), адначасова кіраваў тут аркестравай групай народнага ансамбля песні і танца "Нёман". У 1972-74 — кіраўнік хору Аблсаўпрофа ў Гродне. З 1975 кіруе аркестрам народных інструментаў абласнога палаца піянераў і школьнікаў (дзіцяча-юнацкай творчасці). У 1980 аркестр перарос у ўзорны фальклорны ансамбль "Дударыкі", які выступаў з канцэртамі ў Беларусі, Літве, Польшчы, Францыі. Аўтар вакальна-інструментальных і вакальна-харэаграфічных кампазіцый, песень (на сл. Д. Бічэль, Р. Барадуліна, М. Васілька, Л. Геніюш, Я. Чачота, У. Скарынкіна, Я. Насупы, Цёткі, Л. Кебіч, А. Дзеружынскага, М. Губернатарава, У. Шурпы, А. Кавалюк, А. Цыхуна, М. Мельніка, У. Васько), рамансаў, інструментальнай музыкі. Піша песні і кампазіцыі на ўласныя словы, апрацоўвае народныя песні. Займаецца скульптурай (камень, дрэва).

**Петрушкевіч Ала Мікалаеўна** (дзявоч. Барэйка, 27.02.1960, в. Шчонава Карэліцкага р-на), беларуская пісьменніца (крытык і літаратуразнавец, паэтка), педагог. Кандыдат філалагічных навук (1993). З сям'і селяніна і настаўніцы. Пачатковую школу скончыла ў роднай вёсцы. Затым сям'я пераехала ў в. Баранавічы Карэліцкага р-на. Вучылася ў 8-годцы ў в. Машэвічы (Карэліцкага р-на), СШ скончыла ў в. Райца (Карэліцкі р-н). Скончыла аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1981). Настаўнічала ў 8-годцы ў в. Амбілеўцы Шчучынскага р-на. Затым з 1982, калі жылі ў Карэлічах, працавала ў 8-годцы ў в. Вялікая Слабада. З 1985 жылі ў в. Райца Карэліцкага р-на, дзе настаўнічала ў СШ. Вучылася ў аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1989-92). З 1992 выкладае на кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1990. Вывучае сучасную беларускую паэзію, праблемы гісторыі беларускай літаратуры XX ст. Выдала зборнік літаратуразнаўчых артыкулаў і эсэ "Іду па слядах" (Гродна, 1997), кнігу лірыкі "Пярсцёнак" (Гродна, 1997).

**Петрыкевіч Мікалай Васілевіч** (20.05.1941, в. Пабрэззе Навагрудскага р-на — 3.07.1988), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1974). Дацэнт (1981). З сялянскай сям'і. Скончыў Касадворскую 7-годку (Навагрудскі р-н), Пінскую педагагічную вучэльню (1959). Працаваў настаўнікам музыкі і спеваў Васілішскай СШ Воранаўскага р-на (1959-60). Скончыў беларускае аддзяленне гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута (1965). Служыў у войску (1965-66). Выкладаў гісторыю і беларускую мову ў школе-інтэрнаце ў Гродне (1966-67). З 1967 працаваў на кафедры беларускай мовы (тут вучыўся ў аспірантуры ў 1970-73), затым на кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства Гродзенскага педінстытута (універсітэта). У 1985-87 выкладаў беларускую мову ў Гродзенскай педагагічнай вучэльні, у 1987-88 — зноў у універсітэце. Друкаваўся з 1972. Аўтар артыкулаў па пытаннях сінтаксісу беларускай мовы.

**Петрыкевіч Міхаіл Фёдаравіч** (31.07.1913, в. Падкасоўе Навагрудскага р-на — 6.03.1999), беларускі педагог, краязнавец, музеязнавец. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965). З сялянскай сям'і. Пасля пачатковай школы і 2-гадовай школы ў Адампалі (Навагрудскі р-н) паступіў у 1925 у Навагрудскую беларускую гімназію. У апошнім класе (1931) быў арыштаваны і асуджаны за прыналежнасць да камсамола Заходняй Беларусі. Выйшаўшы з турмы, быў рабочым у Налібоцкай пушчы (1935-37). Зімой 1938-39 вучыўся на прыватных вячэрніх курсах пры сярэдняй тэхнічнай школе ў Вільні. Працаваў на меліярацыйных работах у Шчучынскім павеце. У 1940-41 вучыўся на літаратурным факультэце Беластоцкага педінстытута. З пачатку вайны жыў на вёсцы, у 1942-44 працаваў рахункаводам дарожнага аддзела ў Любчы (Навагрудскі р-н). Служыў у савецкім войску (1944-45). У 1946-49 — студэнт літаратурнага факультэта Мінскага педінстытута. Быў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, працы ў Карэліцкай СІЛ (1949-51), завучам у Валеўскай СШ Навагрудскага р-на (1951-67). Прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі Валеўскага народнага краязнаўчага музея. У 1967-85 працаваў дырэктарам Дзятлаўскага раённага музея "народнай славы". Кіраваў таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры Дзятлаўскага р-на (1967-78). Друкаваўся як краязнавец з 1967. З 1985 жыў у Вільнюсе.

**Пігулеўскі Уладзімір Васілевіч** (10.03.1889, г. Гродна — 17.06.1958), беларускі і латышскі пісьменнік (перакладчык, празаік, драматург, крытык, публіцыст), педагог. Сябра Саюза беларускіх

пісьменнікаў (1957). З сям'і чыноўніка. Скончыў гімназію ў Мінску (1907), гістарычна-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1912). Служыў у войску. Прайшоў франты І-ай сусветнай вайны. Удзельнічаў у беларускім руху. Дэлегат І-ай беларускай палітычнай канферэнцыі ў Празе (верасень 1921). Зведаў беспрацоўе ў Літве. З 1922 жыў ў Латвіі, быў тут консулам БНР. Працаваў настаўнікам гісторыі Беларусі ў беларускай гімназіі ў Дзвінску, у 1924-25 — дырэктарам беларускай гімназіі ў Люцыне. Удзельнік акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу (Мінск, 1926). Працаваў загадчыкам Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы Латвіі (1926-34). Праследаваўся ўладамі за беларускую дзейнасць (у 1925 прыцягваўся да судовай адказнасці, у 1935 пасаджаны ў канцлагер). Займаўся журналістыкай. Калекцыянаваў творы беларускага народнага мастацтва. У 1940-41 — інспектар Міністэрства асветы Латвійскай ССР. У час вайны — на Паволжы, быў школьным інспектарам, выхавальнікам у дзетдоме. Пасля вайны выкладаў (да 1950) у мараходнай вучэльні, у педінстытуце ў Рызе. Друкаваўся з 1924. Пісаў п'есы, апавяданні, артыкулы пра беларускую літаратуру, тэатр, гісторыю Беларусі, перакладаў з латышскай і чэшскай моваў на беларускаю і з беларускай на латышскую мову. Падрыхтаваў чытанку для беларускіх школ Латвіі "Наш край" (Рыга, 1928).

**Пільнік Яніна Рыгораўна** (дзявоч. Можджар, 3.05.1961, в. Путрышкі Гродзенскга р-на), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1994). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыла СШ (1978). Вучылася на І-гадовых курсах пры аддзяленні Саюза мастакоў у Гродне (1978-79). Скончыла Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці (1984). Працавала мастакоммадэльерам у эксперыментальнай лабараторыі гродзенскага швейнага аб'яднання "Сілуэт" (1984-92), у трыкатажным аб'яднанні "Вясёлка" ў Гродне (1992-96). З 1996 — галоўны мастак-мадэльер ААА "Фанг". Займаецца мадэляваннем аддзеня. У выставах — з 1985. Пераможца 1-га рэспубліканскага конкурсу мастакоў-мадэльераў (1989). Сярод работ: серыя вышывак святочнага адзення для моладзі (1985), "Белая казка" — адзенне з льнянога палатна для выставы тэкстыльнай прадукцыі краін — сяброў СЭУ (1986), "Гуляць, дык гуляць" — калекцыя адзення для адпачынку з тканін беларускіх вытворцаў (1986), калекцыя штучных кветак, кампазіцый і іншых дадаткаў да касцюма (1987), "Строгая лінія" — серыя ўзораў верхняга жаночага і мужчынскага асартыменту для абласнога, затым Рэспубліканскага конкурсаў закройшчыкаў (1987), "Таямніца" — калекцыя галаўных

убораў, у тым ліку капелюшоў (1987), "Змяркание" — калекцыя вячэрняга адзення (1989), "Сустрэчы на Адрыятыцы" — калекцыя для конкурсу з уключэннем творчых прац: пано "Любая Гародня" і "Кола часу", серыя графічных лістоў "Мільыя цені" (1989), "Рытм ламбады" — калекцыя адзення для адпачынку (1990), серыя жакардавых вырабаў штодзённага асартыменту для жанчын (1993), серыя штодзённага жаночага адзення з выкарыстаннем розных тэхнік вышывання для індывідуальных заказаў (1993), серыя вырабаў святочнага асартыменту для моладзі, выкананых з трыкатажных палотнаў з выкарыстаннем розных спосабаў аздобы (1994), калекцыя ўзораў трыкатажных мадэляў для масавага выпуску (1996).

**Побаль Леанід Давыдавіч** (28.05.1924, в. Мікалаева Іўеўскага р-на), беларускі археолаг. Доктар гістарычных навук (1978). Прафесар (1990). З беднай сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў Мікалаеве (1931-37), у 7-годцы ў Дзяляцічах Навагрудскага р-на (1937-39), у СШ у Любчы Навагрудскага р-на (1939-41). Падчас вайны — сувязны, партызан атрадаў Дзяржынскай брыгады (1942-44), адзначаны баявымі ўзнагародамі. Працаваў настаўнікам пачатковай школы ў в. Зенявічы і Пліса Навагрудскага р-на (1944-45), загадчыкам пачатковай школы ў в. Вялікія Вераб'евічы Навагрудскага р-на (1945-46). Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры (1950), гістфак БДУ (1951). Працаваў у Баранавічах, у чыгуначнай СШ №1 (1950-51), загадчыкам РайАНА ў Любчы (адначасова выкладаў у Любчанскай СШ рабочай моладзі) у 1951-52. Быў дырэктарам СШ №1 у г. Стоўбцы (1952-55). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі (1955-58). Затым працаваў у гэтым інстытуце ў сектары археалогіі (у 1970-91 загадчыкам сектара) да 1996. Сябра Рады і Выканкама Міжнароднага саюза славянскай археалогіі (1965). Навуковыя інтарэсы — гісторыя старажытных славян у Еўропе, у тым ліку ў Беларусі. Вывучаў помнікі позняга этапу зарубінецкай культуры, абарончыя ўмацаванні гарадзішчаў, паўзямлянкавыя і наземныя жытлы гарадзішчаў і селішчаў. Узначальваў археалагічныя экспедыцыі па вывучэнні ранняга жалезнага веку Беларусі. Навуковыя публікацыі — з 1957 (у беларускім, украінскім, нямецкім, англійскім друку). Аўтар шматлікіх артыкулаў, даследаванняў, навуковых дакладаў, рэцэнзій. Выдаў (на рус. мове) манаграфіі "Старажытнасці Тураўшчыны" (1969), "Славянскія старажытнасці Беларусі". Т. 1-3. (1971-74), "Беларускія старажытнасці ў музеях Польшчы" (1979), "Археалагічныя помнікі Беларусі: Жалезны век" (1983).

**Праўдзін Віктар Аляксандравіч** (11.05.1955, г. Ліда), беларускі пісьменнік (празаік). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1996). З сям'і вайскоўца, якая незаўбаве пераехала на Віцебшчыну, дзе прайшло дзяцінства. СШ скончыў у мяст. Шаркаўшчына (1972). Працаваў рабочым на пілараме, вучыўся на трактарыста-экскаватаршчыка. У 1973-76 служыў у ваенна-марскім флоце. Калі дэмабілізваўся, быў міліцыянерам у Шаркаўшчынскім РАУС. У 1977-81 вучыўся ў Мінску ў Вышэйшай школе міліцыі. Працаваў у органах унутраных справаў у 1981-94. Затым — загадчык аддзела тэхнічнага забеспячэння часопіса "Нёман". Друкуецца з 1986. Выдаў кнігі прозы "Візіцёр з Поўначы" (1992), "Боль. Споведзь міліцыянера" (1996), "Эксгумацыя" (1997).

**Прэабражэнскі Уладзімір Барысавіч** (15.07.1950, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага саюза архітэктараў (1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988). З сям'і службоўцаў. Скончыў у Гродне СШ №14 (1967). У 1972 скончыў архітэктурны факультэт Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. Працаваў у інстытуце "Гроднаграмадзянпраект" (архітэктарам, кіраўніком групы архітэктараў, галоўным архітэктарам праектаў) у 1972-88, у фірме "Гроднажылбуд" (галоўным архітэктарам праектнай управы) у 1988-94. У 1994-97 быў начальнікам управы архітэктуры і горадабудаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама. Зноў працаваў у "Гроднаграмадзянпраекце" (кіраўніком архітэктурнага аддзела праектных работ па рэстаўрацыі) у 1997-98. Затым працуе на ранейшым месцы ў праектна-вытворчай фірме "Гроднажылбуд". Сярод работ у Гродне — адміністрацыйныя будынкі абласной управы МУС па вул. Акадэмічнай, Кастрычніцкага райвыканкама па вул. Савецкіх пагранічнікаў, аблвыканкама (у сааўт.), "Дома тэхнікі" па вул. Горкага, будаўнічых арганізацый па вул. Суворава, таксама групы жылых дамоў па вул. Горкага (на рагу з БЛК, у сааўт.), забудова мікрараёна "Пярэселка-3" (у сааўт.), жылы дом з блокам грамадскага абслугоўвання на плошчы Дзекабрыстаў, група жылых дамоў па вул. Савецкіх пагранічнікаў (у сааўт.), забудова мікрараёна "Дзевятоўка-2" (у сааўт.), жылы комплекс гарадка Рось Ваўкавыскага р-на, прафілакторый у в. Залессе Смаргонскага р-на і інш. Займаецца жывапісам, графікай.

**Пукач Тамара Мікалаеўна** (20.06.1949, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага саюза архітэктараў (1979). Скончыўшы СШ, працавала тэхнікам-архітэктарам у Белдзяржпраектхарчпраме. У 1972 скончыла Беларускі палітэхнічны інстытут і працягвала

працу ў Белпраектхарчпраме (кіраўніком групы архітэктараў, вядучым архітэктарам). Удзельнічала ў распрацоўцы праектаў комплексу харчовых прадпрыемстваў у пас. Дражня ў Мінску, хлебазавода ў Сяміпалацінску (Казахстан), піўзавода ў г. Уцена (Літва), маргарынавага завода ў Ужгарадзе (Украіна).

**Пукшліс Іван Іванавіч** (24.06.1956, в. Каргаўды Воранаўскага р-на), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1997). З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы, 8-годку — у в. Клайшы Воранаўскага р-на (1971). У 1971-75 вучыўся ў Мінскай мастацкай вучэльні. Служыў у войску (1975-77). Вучыўся на мастацка-прамысловым факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1978-82). Працаваў у мастацка-вытворчых майстэрнях у Гродне (1982-92). Выкладаў на кафедры выяўленчага мастацтва Гродзенскага універсітэта (1992-95). З 1995 — дырэктар МП "Белпраект". Старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага Саюза дызайнераў (1997). Праектуе інтэр'еры жылых і грамадскіх будынкаў, мэблю, абсталяванне, стварае аб'ёмна-прасторавыя кампазіцыі, выконвае іх у матэрыяле. Удзельнік выстаў з 1983. Сярод работ: генеральнае вырашэнне прывакзальнай плошчы г. Тайшэта Іркуцкай вобл. (1982), інтэр'еры адміністрацыйнага будынка управы чыгункі Тайшэта (1982), аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя з уключэннем крыніцы святла для Палаца культуры калгаса "Савецкая Беларусь" Смаргонскага р-на (1986), вітражы для аптэкі №147 г. Гродна (1987), для Палаца культуры торфабрыкетнага прадпрыемства ў пас. Першамайскі Лідскага р-на (1988), фірмовы стыль для прадпрыемстваў "Спортінтур" (1992), "Эфект" (1993), "Космас" (1998), "Світанак" (1998) у Гродне, мэбля для прадстаўніцтва фонду Сораса па Гродзенскай вобл. (1995), для салона прыгажосці "Эфект" г. Гродна (1996), эксклюзіўная мэбля для аператараў перагаворнага пункта па вул. К. Маркса ў Гродне (1997). Выкананы праекты вестыбюля вучэльні №127 г. Гродна (1997), рэкламы і стрэшкі для будынка страхавой кампаніі "Альвена" ў Гродне (1997), дызайн-праекты перагаворнага пункта АТС-2 г. Ліды (1998), перагаворнага пункта ў Дзятлаве (1998), памяшкання "Інтэрнет-клуба" па Тэлеграфным зав. у Гродне (1999), аддзялення сувязі ў пас. Паўднёвы г. Гродна (1999). Падрыхтаваны дызайн-праекты рэканструкцыі інтэр'ераў Палаца культуры хімікаў у Гродне (1985), адміністрацыйнага паверха будынка БМУ-6 Белсувязьбуда ў Гродне (1998), разліковага цэнтра "Белінфабанка" ў Гродне (1999).

**Пупко Мікалай Сямёнавіч** (23.05.1941, в. Нізяны Ваўкавыскага р-на), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1987). Скончыў Маскоўскую вышэйшую мастацка-прамысловую вучэльню (1961). Жыве і працуе ў Мінску. Праектуе мэблю. Удзельнічае ў выставах з 1974 (у Беларусі, Расіі). Сярод асноўных работ — гарнітуры мэблі для гасцінай, набор мэблі для адпачынку "Віцьба", "Бэз", "Жасмін", "Гартэнзія", "Лужнянка", "Муравачка", "Аер", "Трыо" і інш.

**Пуслоўскі Зыгмунд** (17.12.1848, Альбярцін ля Слоніма — 3.03.1913), польскі калекцыянер, мецэнат. З заможнай шляхецкай сям'і. Атрымаў у хатніх умовах еўрапейскую адукацыю і выхаванне. У сваіх палацах у Кракаве і Чаркове збіраў з канца 80-х вялікую калекцыю (рукапісныя кнігі, старадрукі, габелены, парча, мініяцюры, жывапіс, графіка). Творы скупляў і заказваў. Я. Матэйка выканаў для яго тры партрэты. Зборы часткова ўвайшлі ў музей Кракаўскага універсітэта.

**Пуслоўскі Францішак** (1806, мяст. Пескі Мастоўскага р-на — 9.01.1874), польскі калекцыянер, мецэнат. З заможнай шляхецкай сям'і. Скончыў калегію піяраў у Варшаве. Падарожнічаў па Германіі, Францыі, Італіі, Англіі. У Парыжы слухаў лекцыі па хіміі. Жыў у Варшаве. З 1849 збірае ў сваіх палацах у Варшаве і Кралікарні (пад Варшавай) бібліятэку ў некалькі тысяч рэдкіх тамоў, калекцыі габеленаў, вырабаў з бронзы, мармуру, гравюры, абразы. Пашыраў калекцыю, закупляючы каштоўныя прадметы ў Польшчы і за мяжою. Займаўся дабрачыннасцю. Адзін з кіраўнікоў Варшаўскага таварыства дабрачыннасці (у 50-60). Большасць калекцыі загінула ў пажары ў 1879.

**Пушкарэвіч Канстанцін Аляксеевіч** (3.11.1890, г. Слонім — 28.02.1942), беларускі і рускі славіст (літаратуразнавец, мовазнавец, гісторык, перакладчык), педагог. Доктар філалагічных навук (1940). Прафесар (1941). Скончыў Гродзенскую гімназію (1912), славянскае аддзяленне гістарычна-філалагічнага факультэта Петраградскага універсітэта (1917). Падчас вучобы ўдзельнічаў у рабоце Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, затым Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага універсітэта. У 1918-22 выкладаў у Томскім універсітэце. Пасля — навуковы супрацоўнік Петраградскага (Ленінградскага) навукова-даследчага інстытута параўнальнага вывучэння моваў і літаратур Захаду і Усходу. З 1925 выкладаў у Ленінградскім універсітэце (з 1941 — загадчык кафедры

славянскай філалогіі). Даследаваў беларускую, украінскую, рускую, чэшскую, польскую, балгарскую мовы і літаратуры, гісторыю балканскіх славян. Перакладаў на рускую мову творы беларускіх пісьменнікаў (З. Бядуля, Ц. Гартны). Выдаў працу: "Чэхі: Гістарычна-этнаграфічны нарыс" (М.-Л., 1942).

**Пякарскі Фларыян** (1868, г. Слонім — 20.02.1919), польскі мастак. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Вучыўся ў мастацкай школе В. Герсана ў Варшаве. Затым — у акадэміі мастацтваў у Кракаве (1899-1904). Жыў у Польшчы. Пісаў народныя строі, тыпы сялян, інтэр'еры хат, абрады, будынкі, краявіды. Творы рэпрадукаваліся ў форме паштовак. У 1905-19 удзельнічаў у многіх выставах Варшаўскага таварыства згуртавання мастакоў. Перад І-ай сусветнай вайной падарожнічаў па Еўропе, там выстаўляўся. У 1914 — яго выстава ў Вільні. Творы зберагаюцца ў музеях і галерэях Вільні, Львова, Варшавы. Сярод работ: "Крыж каля хаты", "Жанчына сядзіць", "Маленькі касцёл у Брэтані", "Над швейцарскім возерам", "Мадона з Клуны".

**Пякарскі Ян** (1816, г. Ліда — 22.05.1860), польскі артыст тэатра (камедыйныя ролі). У 1835 выступаў у Слоніме ў трупе В. Вярбіцкага. З 1838 — у трупе С. Маліноўскага ў Камянцы-Падольскім. У 1843-54 уваходзіў у трупу П. Зялінскай у Жытоміры. Затым стварыў уласную малую трупу, з якой выступаў. У 1856 арганізаваў свой тэатр у Камянцы-Падольскім, быў яго дырэктарам, іграў на яго сцэне (у 1859 выступаў у трупе П. Зялінскага).

**Пярловіч Самсон Георгіевіч** (13.08.1923, в. Католышы Навагрудскага р-на), беларускі паэт. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Байкі (Навагрудскі р-н), у 1937 скончыў у Навагрудку 7-годку. У 1939-41 працягваў вучобу ў СШ, у педагагічнай вучэльні ў Навагрудку. Настаўнічаў у 1941-43 у Байках. Быў вывезены гітлераўцамі на прымусовыя работы ў Лібаву, затым, пасля двух уцёкаў ~ у штрафныя лагеры ў Вену. Вярнуўся дамоў у 1945. Працаваў у Навагрудку ў рэдакцыі раённай газеты "Звязда". У 1947 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, зняволены ў канцлагерах у Комі АССР, Казахстане, Карагандзе. З 1956 — на радзіме. Працаваў (больш за 30 гадоў) заточнікам інструментаў на Навагрудскім заводзе газавай апаратуры. Друкаваў вершы з 1956. Выйшлі зборнікі яго паэзіі "Заяц на бярозе" (Навагрудак, 1994), "Бяссмертнік" (1994), "Чарадзейны агонь" (Навагрудак, 1997).

**Пяткевіч Андрэй Браніслававіч** (13.06.1966, мяст. Уселюб Навагрудскага р-на — 29.04.1995), беларускі паэт. З сялянскай сям'і. Скончыў Уселюбскую СШ (1983) і паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта. Вучыўся тут з перапынкамі да 1989. Працаваў у родных мясцінах рабочым-меліяратарам, у леспрамгасе, у калгасе. З 1993 — на пенсіі па інваліднасці. Прымаў актыўны ўдзел у літаратурным руху моладзі ў Гродне і Мінску. Друкаваўся ў раённай газеце з школьных гадоў, з 1989 — у рэспубліканскіх выданнях ("Першацвет", "Маладосць", "Дзень паэзіі", "Сьвіцязь", "Беларусь", "Літаратура і мастацтва", "Культура", "Чырвоная змена" і інш.). Сааўтар калектыўных зборнікаў паэзіі "Шлях" (Гродна, 1991), "Кола" (Гродна, 1993). Падрыхтаваў зборнік вершаў "Шчаслівым сканаць".

**Пятроў Міхаіл Уладзіміравіч** ( сапр. Замулевіч, 27.12.1937, Ваўкавыск), беларускі артыст тэатра і кіно. Народны артыст Беларусі (1991). З сям'і рабочага. Скончыў Ваўкавыскую СШ № I, акцёрскі факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (клас К.Саннікава) у 1960. З гэтага часу працуе ў Беларускім тэатры юнага гледача. Выступаў на сцэне іншых беларускіх тэатраў. Выканаў ролі М.Казея ("Марат Казей" В.Зуба), Вані ("Дзеці аднаго дома", І.Шамякіна), Груфальдзіна ("Зялёная птушка" К.Гоцы), Яўмена ("Мікітаў лапаць" М.Чарота), Соцкага ("Прымакі" Я.Купалы"), Сільвера ("Востраў скарбаў" паводле Р.Стывенсана), Фестэ ("Дванаццатая ноч" У.Шэкспіра), Астапа ("Міколка-паравоз" паводле М.Лынькова), Адася ("Папараць-кветка" І.Козела), Хобса ("Маленькі лорд Фаўнтлярай" Ф.Бернет), Драніцы ("Плач перапёлкі" паводле І.Чыгрынава), Уілкса ("Прастачкі" Б.Шоу), Міколы ("І трэці анёл пратрубіў"Д.Міхлеева). Здымаўся ў кіно з 1957, пераважна на студыі "Беларусьфільм" ("Нашы суседзі", "Чырвонае лісце", "Хлеб пахне порахам", "Полымя", "Зорны хлопчык", "Вянок санетаў", "Дзяржаўная граніца", "Прыгоды Бураціна", "Чырвоная шапачка", "Дуброўскі", "Прададзены смех", "Гарачая душа", "Эпілог", "Плач перапёлкі", "Белыя росы", "Сад", "Кола", "Купальская ноч", "Кветкі правінцыі", "Пастка для зубра", "Зала чакання"). Выступаў як рэжысер-пастаноўшчык асобных спектакляў у Беларускім тэатры юнага гледача.

**Пяшко Іван Рыгоравіч** (4.12.1941, в. Лішчыцы Гродзенскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, публіцыст), журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1998). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Скідзелі (Гродзенскі р-н). Вучыўся ў тэхнічнай вучэльні №7 г. Гродна

(1958-59). Працаваў электрыкам УНР-112 у Гродне (1959-60). Служыў у войску (1960-63). Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута (1963-67). Затым быў арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы ў Каменскай СШ Шчучынскага р-на (1967-68), дырэктарам Грамавіцкай 7-годкі Шчучынскага р-на (1968-73). У 1974-75 вучыўся на сцэнарным аддзяленні Вышэйшых курсаў сцэнарыстаў і рэжысёраў (Масква). Нядоўга настаўнічаў у Жалудку Шчучынскага р-на (1976). Быў лектарам Шчучынскага райкама КПБ (1976-77), сакратаром парткама саўгаса "Пратасаўшчына" Шчучынскага р-на (1977-83). Затым — на журналісцкай працы. У 1983-84 — загадчык сельгасаддзела ў Шчучынскай райгазеце "Савецкая вёска", з 1984 — намеснік рэдактара "Савецкай вёскі" ("Дзянніцы"). Друкаваўся як празаік у газеце "Савецкая вёска" з 1967, у рэспубліканскіх выданнях — з 1970. Выпусціў зборнікі празаічных твораў "Чырвоная клубніка" (1977), "Марго з Казарэзаў" (1992), аповесць "Сцэнарый сямідзесятых" (1997).

**Пятруль Людміла Іванаўна** (15.09.1947, в. Мацвееўцы Ваўкавыскага р-на), беларуская мастачка, паэтка. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1984). З сялянскай сям'і. Рана страціла маці, выхоўвалася ў бабулі ў в. Харужанцы (Ваўкавыскі р-н). Скончыла Ізабелінскую СШ Ваўкавыскага р-на (1966). У 1966-71 вучылася ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце па спецыяльнасці "мастак-афармляльнік тканін метадам ткацтва і друку". Працавала ў Баранавічах на баваўняным камбінаце мастаком-афармляльнікам тканін (1971-73), у Баранавіцкай мастацкай майстэрні (1973-76). Затым — у Мінску. Была мастаком-афармляльнікам Дома літаратара (1976-80), выкладчыкам дзіцячай мастацкай школы №2, Мінскай школы мастацтваў (1980-89). Затым выкладала на кафедры мадэлявання адзення і мастацкага ткацтва Беларускай акадэміі мастацтваў (1989-95). З 1995 зноў працуе выкладчыкам выяўленчага мастацтва Мінскай мастацкай школы. Удзельнічае ў выставах з 1972 (у Беларусі, Расіі, Літве, Латвіі, Украіне). Аўтар габеленаў, выкананых у тэхніцы гладкага ткацтва ці змешанай тэхніцы. Сярод твораў: "Скрыпачы" (1971), "Хлеб" (1973), "Хатынь" (1975), "Вятрак" (1975), "Лучынка" (1976), "Стану песняй у народзе" (1976), "Памяці дзядоў маіх" (1977), "Лета" (1980), "Верасовая цішыня" (1981), цыкл "У зачараваным царстве" (1981), "Сунічны лес" (1982), "На строме ліры" (1983), "Яблыня. 1941" (1985), "Сугучнасць" (1987), "Вярба" (1993), "Жыжа — бог агню" (1995), "Узнясенне коміна" (1995), "Пах бэзу" (1995), трыпціх "Лён" (1996), "Вартавыя муры" (1996). Займаецца

роспісам па тканіне, піша акварэллю, працуе як графік. Друкуе вершы з 1970. Сааўтар калектыўнага зборніка паэзіі "Сцяжына" (1983).

**Рабін Іосіф Ізраілевіч** (18.04.1900, г. Гродна — 9.01.1987), яўрэйскі пісьменнік. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1934). З сям'і дробнага службоўца. Вучыўся ў хедэры ў Гродне. Працаваў тут грузчыкам на чыгунцы, прадаўцом газет, кур'ерам, рахункаводам. З 1918 — у Вільні. Быў чорнарабочым, удзельнічаў у рэвалюцыйным руху. Узначальваў (з 1921) падпольны камітэт камсамола. Неўзабаве пераязджае ў Маскву, дзе працуе наборшчыкам у яўрэйскай друкарні (1922-25). У 1925-27 — адказны сакратар рэдакцыі часопіса "Піянер" (на яўр. мове). У 1927-33 — студэнт літаратурнага факультэта, затым аспірант 2-га Маскоўскага універсітэта (Маскоўскі педінстытут). У 1933-36 — загадчык літаратурнага аддзела газеты "Дэр Эмес". У 1936 накіраваны ў Бірабіджан, дзе ўзначаліў абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў. Быў сябрам рэдкалегіі часопісаў "Форпост", "Дальний Восток". У 1937 рэпрэсаваны, зняволены ў канцлагеры (Краснаярскі край). Адсюль трапіў на фронт (1943), ваяваў. Працаваў у антыфашысцкім камітэце ў Маскве (1944-48). Друкаваўся як паэт і празаік з 1922. Пазней піша толькі прозу. Быў сябрам РАППа, сакратаром яўрэйскай секцыі МАППа, дэлегатам І-га з'езду савецкіх пісьменнікаў (1934). Пісаў апавяданні, аповесці, раманы. Выдаў на ідзіш у Маскве кнігі прозы "Стрыечныя браты" (1930), "Момант прасвятлення" (1930), "Звілістыя дарогі" (1930), "З чым жывём" (Кіеў-Харкаў, 1931), "Бузі Дубін" (1932), "Шлях адкрыты" (1935), "Шымен Козер" (1936), "Мае родныя" (1947), "Жыццё працягваецца" (1948). На рускай мове ў Маскве выйшлі кнігі "Аповесці і апавяданні" (1956), "Ля Нёмана" (1961, 2-е выд. 1973), "Вуліца Шолам-Алейхема" (1965), "Я бачу цябе, Вільнюс" (1975), "У розныя гады" (1981), "Горад майго юнацтва" (1985), "Выбранае" (1985). Творы друкаваліся ў перакладах на розныя мовы свету.

**Рабіновіч Якаў** (1875, г. Ваўкавыск — 1948), яўрэйскі пісьменнік. З сям'і рабіна. Атрымаў традыцыйную яўрэйскую адукацыю. Настаўнічаў у Віцебску. Вучыўся ў Бернскім універсітэце (Швейцарыя) у 1900-04. Жыў у Расіі, у 1907-10 у Адэсе, займаўся сіянісцкай і літаратурнай дзейнасцю. З 1910 — у Ізраілі. Супрацоўнічаў з рабочай перыёдыкай. Адзін з заснавальнікаў літаратурнага часопіса "Хедым", які выходзіў у 1922-28. З сярэдзіны 20-х — сталы аўтар у перыёдыках "Давар", "Бустанай", "Ха-бокер".

Пісаў на іўрыце. Друкаваў (з 1901) апавяданні, аповесці, раманы, вершы, нарысы, эсэ, п'есы, літаратурна-крытычныя артыкулы, пераклады. Выдаў (пераважна ў Ізраілі) "Апавяданні і нарысы" (1905, 2-е выд. 1912), п'есу "Пераможца" (1908), апавяданне "Без карэння" (1914), зборнік вершаў "Восень" (1926), публіцыстычна-філасофскія рэфлексіі "Да тэорыі Вельхаўзена" (1928), аповесць "Блуканні ахоўніка Амасая" Т. 1-2. (1930), зборнік публіцыстыкі "Пярэчанні" (1935), гістарычную аповесць "Так зніклі народы" (1946). Выпусціў у перакладзе з рускай мовы раман Д. Мяражкоўскага "Юліян Адступнік" (1927). Выдадзены зборнік яго літаратурных эсэ "Шляхі літаратуры" (1971).

**Рагуля Аляксей Уладзіміравіч** (25.03.1935, в. Сенна Навагрудскага р-на), беларускі крытык і літаратуразнавец, культуролаг, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1975). Прафесар (1993). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1990). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу, СШ — у мяст. Любча (Навагрудскі р-н). Працаваў загадчыкам хаты-чытальні ў Сенне (1951-52). У 1957 скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Настаўнічаў у Халхоліцкай 7-годцы і Зачысцінскай СШ на Барысаўшчыне (1957-62). Быў выхавальнікам і настаўнікам у школе-інтэрнаце №7 г. Мінска (Рэспубліканскай школе-інтэрнаце са спартыўным ухілам) у 1962-70. З 1970 выкладае на кафедры беларускай літаратуры Мінскага педінстытута (у 1969-73 завочна вучыўся ў аспірантуры на гэтай кафедры). З 1991 — загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры гэтага інстытута (педагагічнага універсітэта). Друкуецца з 1968. Выдаў зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў "Імгненні..." (1990), "Пафас станаўлення" (1991). Сааўтар "Гісторыі беларускай савецкай літаратуры 1917-1940" (1981), "Гісторыі беларускай савецкай літаратуры 1941-1980" (1983). Даследуе методыку выкладання беларускай літаратуры ў школе. Выйшла яго кніга "Беларуская літаратура ў 4 класе. Метадычныя парады да падручніка" (1980). З'яўляецца сааўтарам "Методыкі выкладання беларускай літаратуры" (1986). Адзін з складальнікаў падручніка-хрэстаматыі для 8 кл., праграмы па беларускай літаратуры для СПІ. Удзельнічаў у складанні збору твораў К. Чорнага ў 6 тамах (1988-91). Аўтар культуралагічных дакладаў і публікацый.

**Рагуля Васіль Цімафеевіч** (16.07.1879, в. Ачукевічы Навагрудскага р-на — 16.06.1955), беларускі грамадска-культурны дзеяч, педагог. З сялянскай сям'і. Скончыў настаўніцкую семінарыю ў Маладзечне (1898) і вучыў дзяцей у пачатковай школе ў в. Налібокі

(Навагрудскі р-н). У 1903-06 вучыўся ў Вілейскім настаўніцкім інстытуце, па заканчэнні арыштоўваўся за рэвалюцыйную агітацыю. Працаваў настаўнікам вышэйшай пачатковай школы ў Смаргоні. З 1908 выкладаў у 3-яй вышэйшай пачатковай школе ў Мінску. З 1914 — у войску. Дэмабілізаваўшыся, настаўнічаў у 4-класнай чыгуначнай школе ў Мінску (1918-20). Быў узяты ў Чырвоную Армію, але неўзабаве вярнуўся дамоў. Працаваў на гаспадарцы. Пасол, пазней сенатар сейма Польшчы (1922-30). Уваходзіў у Беларускі пасольскі клуб, выбіраўся яго старшынёй у 1924-28. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускага сялянскага саюза (1925-29), Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (1926-36). Па сканчэнні паўнамоцтваў сенатара адбываў у віленскай турме зняволенне (1930-32) па палітычнай справе 1924. Працаваў на гаспадарцы. У 1939-41 — настаўнік СШ у мяст. Любча (Навагрудскі р-н). Перад вайной рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, на пачатку вайны ўцёк з-пад варты. Працаваў старшынёй гміннага камітэту ў Любчы, пасля бургамістрам Дзятлаўскага павета. Удзельнік (намеснік старшыні) Усебеларускага кангрэсу (1944). Выехаў у Германію. З 1950 жыў у Бельгіі, з 1954 — у ЗША. Удзельнічаў у культурным руху беларускай эміграцыі.

**Радзевіч Леанід Іванавіч** (8.10.1953, г. Гродна), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1996). З сям'і службоўцаў. У 1955 пераехалі ў Шчучын, пазней у Віцебск. Тут скончыў СШ №22 (1971). У 1976 скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Служыў у войску (1976-78). З 1978 працуе ў мастацка-вытворчых майстэрнях (камбінаце мастацтва) у Віцебску. Асноўныя напрамкі творчасці — станковы жывапіс (пейзаж, нацюрморт), графіка ў тэхніцы пастэлі, акварэлі. У выставах — з 1979. Сярод жывапісных работ: "Нацюрморт" (1981), "Рабіна" (1983), "Стары Віцебск" (1983), "Нацюрморт з рыбаю" (1986), "Нацюрморт з яблыкамі" (1986), "Дождж над возерам" (1986), "Возера Ласвіда" (1987), "Восеньскія кветкі" (1990), "На возеры" (1990), "Нацюрморт з лімонам" (1991), "Царква Параскевы Пятніцы" (1992), "Юр'еў манастыр"^1992), "Нацюрморт з антонаўкаю" (1999). У галіне графікі — серыі работ на тэмы Севастопаля (1990), старога Віцебска (1997).

**Радзевіч Марыя** (2.02.1864, в. Пянюга Зэльвенскага р-на — 6.11.1944), польская пісьменніца (празаік, перакладчыца). З сям'і памешчыка. За ўдзел у паўстанні 1863 бацькі высылаліся ў Сібір. Жыла ў сваякоў на Палессі. Па звароце бацькоў (1871) жылі ў Варшаве, з 1877 — у маёнтку Грушава (Брэстчына). Вучылася ў

прыватных пансіянатах. Вяла гаспадарку ў Грушаве, зрэдку выязджала ў Варшаву (тут жыла з 1940). Літаратурны дэбют — у 1882. Пісала раманы, аповесці, апавяданні. Выдала кнігі: "Страшны дзядуня" (Варшава, 1987), "Дэвайціс" (Варшава, 1989, аповесць выдавалась на розных мовах), "Пажары і руіны" (Львоў, 1888, Кракаў, 1893), "Кветка лотасу" (Варшава, 1889), "Шэры пыл" (Львоў, 1889), "Навелы" (Варшава, 1890), "Блакітныя" (Варшава, 1890), "Грыўда" (Варшава, 1890), "Яна" (Варшава, 1891), "Плюшч" (Варшава, 1891), "Animo villis" (Варшава, 1893), "Маці" (Варшава, 1903), "Верас" (Варшава, 1903), "Іаан VIII" (Варшава, 1906), "Лета лясных людзей" (Варшава, 1920), "Недабітоўскі з памежнага бастыёна" (Львоў, 1926), "Фларыян з Вялікай Глушы" (Варшава, 1929), "Дзве рады" (Познань, 1931), "Гняздо Белазора" (Варшава, 1931).

**Радзенскі Шмуль** (1905, мяст. Смаргонь -1989), яўрэйскі артыст тэатра. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Ізраіля (1984). Прыехаў у Ізраіль у 1924. Працаваў меліяратарам. З 1926 вучыўся ў тэатральнай студыі М. Гнесіна пры "Тэатры Эрэц — Ізраіля", тут пачаў выступаць на сцэне. У 1932-49 працаваў у тэатры сатыры "Мятла" (эстрадныя мініяцюры, песні, мастацкае чытанне). З 1949 да канца жыцця — на сцэне драмтэатра "Хабіма" (пераважна характарныя ролі). Быў майстрам эпізодаў. Сярод работ: Яга ("Атэла" В. Шэкспіра), Манго ("Авечая крыніца" Лопэ дэ Вэга), фельдфебель ("Матухна Кураж" Б. Брэхта), Джон Камала ("Плач, любімая краіна" М. Андэрсана), Ісаак Торан ("Зроблены чалавек" Э. Кішона), Іван Пятровіч ("Жывы труп" Л. Талстога), Кальман Іофе ("Бурная ноч" М. Шаміра), Шлома ("Мірэле Эфрос" Я. Гордзіна), Фірс ("Вішнёвы сад" А. Чэхава). Выступаў і ў іншых тэатрах, на ізраільскім радыё, у канцэртных праграмах (з праграмай "Маленькія людзі" ў складзе акцёрскага трыо аб'ездзіў свет).

**Радзько Ганна Станіславаўна** (у замужжы Халшчанкова, 21.01.1951, в. Банцавічы Лідскага р-на), беларуская спявачка (альт). Заслужаная артыстка Беларусі (1982). З сялянскай сям'і. Скончыла пачатковую школу ў в. Кульбакі (Лідскі р-н). Вучылася ў Лідзе ў СШ №2, скончыла СШ №10. Працавала мастаком-афармляльнікам у Лідскім будтрэсце №19 (1968-71). Спявала ў народным ансамблі песні і танца "Лядчанка". З 1971 — салістка Белтэлерадыё. Завочна скончыла Мінскую музычную вучэльню (1978), Мінскі універсітэт культуры (1990). Выступае пераважна з камерна-інструментальным ансамблем, сімфанічным аркестрам Белтэлерадыё. Выконвае беларускія народныя песні, песні беларускіх кампазітараў (Ю.

Семянякі, У. Будніка, Э. Зарыцкага, М. Літвіна, У. Прохарава, А. Чыркуна, Л. Смялкоўскага), Гастралюе па краіне і за мяжой.

**Ражко Вікенці Іванавіч** (28.02.1948, в. Гербялевічы Дзятлаўскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1991). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у мяст. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-на. Вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педінстытута (1966-71). Выкладаў маляванне ў СШ №1 Зэльвы (1971-75). У 1975 пераязджае ў Ваўкавыск, дзе працуе ў філіі гродзенскага камбіната "Мастацтва" (1975-92), у школе (1992-94). З 1994 выкладае ў Ваўкавыскай педагагічнай вучэльні. Удзельнік выставаў з 1968 ( у Беларусі, Расіі, Польшчы). Асноўны жанр творчасці — пейзаж (акварэль), піша партрэты, бытавыя кампазіцыі. Сярод твораў: "Партрэт сястры" (1978), "Пасля дажджу" (1980), "Плавіцца лета" (1981), "Дарога" (1982), "Халодная раніца" (1982), "Ваўкавыскі цэмзавод" (1982), "Апошні снег" (1983), "Легенда аб горадзе" (1985), "Сакавік" (1985), "Адліга" (1987), "Размова" (1987), "Куток старога Ваўкавыска" (1987), "Трывожная ноч" (1990), "Краявід з храмам" (1994), "Восеньскія сполахі" (1994), "Мокрае надвор'е" (1995), "Промні сонца" (1996), "Вясновая цяплынь" (1996), "Прыцішэла" (1996).

**Ракса Поля** (у замужжы Ракса-Кастэнка, 14.04.1941, г. Ліда), польская артыстка тэатра і кіно. Пасля вайны выехала з бацькамі ў Польшчу. Вучылася ў Вроцлаўскім універсітэце. Скончыла ў Лодзі Вышэйшую школу тэатра і кіно (1964). Працавала ў тэатры "Усеагульны" ў Лодзі (1964-68), затым у тэатры "Сучасны" ў Варшаве. Выконвала лірычна-драматычныя і камедыйныя ролі. Здымалася (з 1960) у мастацкіх кінафільмах "Сатана з 7 класа", "Рэчаіснасць", "Клуб кавалераў", "Іх звычайны дзень", "Чатыры танкісты і сабака" (серыял), "Попел", "Блакітны пакой", "Пагоня за Адамам", "Бэата", "Снегапад", "Накцюрн", "Зося", "Шрам", "Сымон Ступнік", "Арыя для атлета" і інш.

**Ракуць Васіль Уладзіміравіч** (30.06.1945, в. Яруцічы Слонімскага р-на), беларускі педагог-метадыст, гісторык. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Яруціцкай пачатковай, Сасноўскай 8-гадовай, Навадзевяткавіцкай СШ Слонімскага р-на. У 1963-64 працаваў памочнікам сталявара на Чусаўскім металургічным заводзе Пермскай вобл. Служыў у войску (1964-67). Быў старшынёй сельсавета ў в. Масілавічы Слонімскага р-на (1967-71). З 1971 — настаўнік гісторыі Навадзевяткавіцкай СШ, з 1978 працуе завучам гэтай школы (у 1975 завочна скончыў гістфак Гродзенскага педінстытута). Займаецца

эксперыментальнай і тэарэтычнай распрацоўкай нетрадыцыйных метадаў навучання гісторыі ў школе. Даследуе гісторыю Беларусі эпохі сярэднявечча. Аўтар шматлікіх публікацый па методыцы выкладання гісторыі (друкуецца з 1991). Выдаў у сааўтарстве падручнік для 6 кл. "Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі" (1996, 2-е выд. 1998). Выйшла яго праца "Методыка выкладання гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі. 6 кл." (Брэст, 1997), метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў гісторыі. Выкладае (з 1986) у абласных інстытутах удасканалення настаўнікаў у Гродне, Брэсце, Віцебску.

**Рамановіч Валянцін Сцяпанавіч** (20.10.1911, мяст. Карэлічы — 2.02.1945), беларускі мастак. З сям'і службоўца. Скончыў Навагрудскую польскую гімназію (1930), мастацкі факультэт Віленскага універсітэта (1934). Затым вучыўся на медычным факультэце гэтага універсітэта, адначасова — асістэнт на кафедры анатоміі. Захапляўся "мастацкай анатоміяй", рыхтаваў адпаведны альбом. Пісаў алейныя пейзажы. Раннія работы (з пач. 30-х) — "Сярэбраная рака", "Звозяць лёд", "Зіма", "Сосны", "Жоўтая рака". З сярэдзіны 30-х падарожнічаў па Польшчы, Заходняй Беларусі, пісаў архітэктурныя краявіды ("Вежа замка ў Троках", "Рыцарская зала", "Фрагмент нясвіжскіх пакояў", "Віленская сінагога"). Адначасова працаваў як графік ("Св. Ян Хрысціцель", "Касцёл св. Пятра і Паўла на Антокалі"). Стварыў графічныя цыклы "Трокі" (32 гравюры па медзі), "Дрэвы" (6 кампазіцый, гравіраваных на розных матэрыялах). Пазней выканаў графічныя работы "Руіны замка ў Троках" (1939), "Вежа Ковенскага замка" (1940), "Стэфан Баторы" (1942), "Пабернардынскія муры" (1942), "Казіміраўскі завулак пасля бамбардзіроўкі" (1944). Выстаўляўся з сярэдзіны 30-х у Вільні, Варшаве, Чыкага. У канцы 1944 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі. Неўзабаве загінуў у зняволенні.

**Рамановіч Георгі Георгіевіч** (3.01.1942, в. Валковічы Навагрудскага р-на), беларускі псіхолаг, педагог. Кандыдат псіхалагічных навук (1980). Дацэнт (1983). З сялянскай сям'і. Скончыў Навагрудскую СШ №2 (1959). Працаваў фрэзероўшчыкам на Навагрудскім заводзе металавырабаў. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ ў 1960-68 (у 1960-63 служыў у войску). Працаваў у Мінскім райкаме камсамола (1968-69), у праблемнай лабараторыі навуковай арганізацыі працы Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (1969-78), на кафедры псіхалогіі Мінскага седінстытута (1978-80). З 1982 выкладае на кафедры псіхалогіі Вышэйшай школы МУС БССР (акадэміі МУС Беларусі).

Друкуецца з 1972. Вывучае праблемы педагогікі і псіхалогіі вышэйшай школы, пытанні выхавання моладзі, псіхалагічныя аспекты працы міліцыі. Выдаў кнігі (на рус. мове): "Псіхалогія натоўпу" (Рыга, 1988), "Псіхалагічныя асаблівасці дзеянняў супрацоўнікаў органаў унутраных справаў у экстрэмальных умовах" (1988), "Псіхалагічныя асаблівасці паводзін работнікаў міліцыі ў канфліктных сітуацыях" (1988). Сааўтар навучальнага дапаможніка "Дзіцячая псіхалогія" (1988, на рус. мове). Выпусціў метадычныя распрацоўкі па вывучэнні педагогікі і псіхалогіі ў Акадэміі міліцыі.

**Рашэтнікаў Сяргей Васілевіч** (22.06.1949, г. Гродна), беларускі палітолаг, педагог. Доктар палітычных навук (1995). Прафесар (1997). З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ №2 г. Гродна (1966). Працаваў слесарам на заводзе "Гандальмаш" у Гродне (1966-68). У 1968-72 — студэнт гістфака Гродзенскага педінстытута. Нядоўгі час выкладаў гісторыю ў гродзенскай СШ №2. Служыў у войску (1972-73). Быў лабарантам кафедры гісторыі КПСС, загадчыкам кабінета філасофіі Гродзенскага педінстытута (1974-75). У 1975-78 вучыўся ў аспірантуры на кафедры навуковага камунізму БДУ. Затым працаваў на гэтай кафедры асістэнтам, выкладчыкам, дацэнтам (1978-90). З 1990 выкладае на кафедры паліталогіі БДУ. Быў прарэктарам па навучальнай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ (1994-95). З 1995 — загадчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. Віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі палітолагаў (1993-98). Старшыня спецыялізаванага Савета па абароне доктарскіх дысертацыяў па палітычных навуках БДУ (1996). Даследуе палітычныя інстытуты і працэсы, тэорыю прыняцця палітычных рашэнняў. Друкуецца з 1979. Аўтар манаграфій на рускай мове (рукапісы дэпаніраваныя): "Інтэрнацыяналізацыя: сацыялізм і класы" (1984), "Аналіз працэсу прыняцця палітычных рашэнняў у амерыканскай паліталогіі" (1994). Выдаў павучальныя дапаможнікі для студэнтаў: "Уводзіны ў паліталогію" (1990, на рус. мове), "Паліталогія" (1991, на рус. мове). Аўтар метадычных рэкамендацыяў па вывучэнні паліталогіі ў ВНУ, брашур для лектараў таварыства "Веды".

**Рольнік Іосіф** (1879, в. Вялікія Жухавічы Карэліцкага р-на — 1955), яўрэйскі паэт. З сям'і арандатара млына. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома, затым у ешыбоце ў мяст. Мір (Карэліцкі р-н). У 1895-98 жыў у Мінску. У 1899 пераехаў у ЗША, дзе пачаў друкавацца як паэт (на ідзіш) у газеце "Форвэрте". У 1905 вярнуўся у Мінск, але праз год назаўсёды выехаў у ЗША. Зведаў беспрацоўе.

Друкаваўся тут у многіх яўрэйскіх перыёдыках ( у газетах "Фрае арбэтэр", "Шцімэ", "Югнт", часопісах "Дос найе ланд", "Дос ідзішэ фолк", "Цукунфт"). З 1915 многія гады быў карэспандэнтам газеты "Тог", шмат друкаваўся. Вершы ўвайшлі ў анталогіі "500 гадоў паэзіі на ідзіш" (Н'ю-Йорк, 1917), "Яўрэйская паэзія ў Амерыцы да 1919" (Н'ю-Йорк, 1919). Адзін з першых паэтаў-імпрэсіяністаў у яўрэйскай амерыканскай паэзіі. Выдаў у ЗША кнігі "На пясчанай дарозе" (1911), "Вершы" (1915), "Вершы І. Рольніка" (1926), "Новыя вершы" (1935), "Акно на поўдзень" (1941), "Выбраныя вершы" (1948, 2-е выд. 1980) і інш. Выпусціў "Успаміны" (Н'ю-Йорк, 1954).

**Ромбра Якаў** (1858, мяст. Жупраны Ашмянскага р-на — 1922), яўрэйскі асветнік, пісьменнік, журналіст. З сям'і дробнага службоўца. Асновы яўрэйскай традыцыйнай адукацыі атрымаў дома. Вучыўся ў Жытоміры ў рабінскай вучэльні (1872), у школе ў Ашмянах. У 1879 скончыў Крамянчугскую рэальную вучэльню. Затым вучыўся ў тэханалагічным інстытуце ў Пецярбургу, дзе зблізіўся з рэвалюцыйнымі народнікамі. У 1881 вымушаны ўцячы ў Парыж, наведваў лекцыі ў Сарбоне. Друкавацца пачаў як публіцыст на рускай мове ў 1880 (перыёдыкі "Рассвет", "Киевская заря", "Русский еврей", "Восход"). Пазней пісаў на ідзіш. У 1883-90 жыў у Лондане, працаваў у міжнародных рабочых арганізацыях. Быў рэдактарам часопіса "Арбэтэр фрайнд", сумеснага органа сацыял-дэмакратаў і анархістаў. З 1890 — у Н'ю-Йорку, узначальваў тут рэдакцыю сацыялістычнай газеты "Арбэтэр цайтунг". У 1892-94, 1904-05 — галоўны рэдактар часопіса "Дзі цукунфт". У 1894-99 — рэдактар штодзённай газеты "Дос обэндблат". Супрацоўнічаў у іншых яўрэйскіх перыёдыках ЗША. З 1906 — у Варшаве, дзе рэдагаваў часопіс ППС "Дзі пралетарышэ вэлт", быў рускім карэспандэнтам яўрэйскіх газет у ЗША. Затым — зноў у ЗША, рэдагаваў часопіс "Дэр Фрайнд" (1914-18). Выдаў публіцыстычныя трактаты "Што такое нацыя, і ці з'яўляюцца нацыяй яўрэі" (Н'ю-Йорк, 1903), "Адкрытая размова з яўрэямі ўвогуле і з рабочымі ў прыватнасці" (Н'ю-Йорк, 1907). Аўтар навукова-папулярных кніг, якія выйшлі ў Н'ю-Йорку: "Біяграфіі знакамітых людзей" (1910), "Уся Амерыка" Т. 1-2. (1915, 2-е выд. 1929), "Гісторыя Вялікай французскай рэвалюцыі" (1903, 3-е выд. 1918), "Неба і зямля: Астраномія для народу" (1918, 13-е выд. 1929).

**Роўда Віктар Уладзіміравіч** (10.11.1921, мяст. Смаргонь), беларускі культурны дзеяч, хормайстар, музычны педагог. Кандыдат мастацтвазнаўства (1956). Прафесар (1975). Народны артыст Беларусі

(1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990). З сям'і праваслаўнага святара. Скончыў праваслаўную духоўную семінарыю ў Вільні (1939). Семінарыстам пачынаў спяваць у хоры Беларускага Саюза студэнтаў, у царкоўных хорах (пазней кіраваў царкоўнымі хорамі). У 1939-41 кіраваў хорамі Віленскай беларускай гімназіі і Віленскага універсітэта. У час вайны жыў у Вільні (наведваў тайныя заняткі ў Віленскім універсітэце) і Ашмянах. З 1944 — артыст хору і канцэртмайстар Беларускага ансамбля песні і танца (Гродна). У 1946-51 вучыўся на дырыжорска-харавым факультэце Літоўскай кансерваторыі (адначасова — у Віленскім медінстытуце), быў рэгентам хору Свята-Духава манастыра ў Вільні. З 1949 выкладаў у оперным класе кансерваторыі і ў музычнай вучэльні. З 1951 — аспірант Маскоўскай кансерваторыі, адначасова — педагог хору хлопчыкаў у кансерваторыі, хормайстар акадэмічнага хору СССР. З 1956 — на радзіме. Працаваў дырыжорам Беларускай харавой капэлы (1956-65). Адначасова выкладае на кафедры харавога дырыжыравання (з 1964 — загадчык кафедры) Беларускай кансерваторыі (Беларускай акадэміі музыкі). Адначасова з 1956 — галоўны дырыжор хору Белтэлерадыёкампаніі, кіруе таксама хорам Беларускай акадэміі музыкі. Шмат выступае з калектывамі ў Беларусі і за мяжой. Выконвае араторыі, хоры, песні, духоўную музыку мінулага і сённяшняга часу. Склаў "Хрэстаматыю па чытанні харавых партытур" Т. 1-2. (1971-74), "Хрэстаматыю па беларускай харавой опернай літаратуры" (1975), зборнікі "Харавы канцэрт" (1979), "Харавая паліфанія" (1981, у сааўт.), "Харавыя канцэрты" (1980, 1982, 1984), "Хоры беларускіх кампазітараў на вершы Я. Купалы і Я. Коласа" (1982), "Харавы вянок" (1985).

**Рубацкі Уладзімір Піліпавіч** (19.6.1914, мяст. Ашмяны — 27.05.1981), літоўскі і беларускі спявак (барытон). Заслужаны артыст Літвы (1959). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Ашмянскай гімназіі (1924-27, 1929-32) і ў віленскай дарожнай тэхнічнай вучэльні (1927-29). Служыў у войску (1932-33). У 1933-35 — студэнт юрыдычнага факультэта Віленскага універсітэта. Працаваў у канцылярыі Ашмянскага добраахвотнага пажарнага таварыства (1936), у павятовай дарожнай управе (1936-39). Быў дарожным тэхнікам, начальнікам дыстанцыі ў Ашмянскім дарожна-эксплуатацыйным участку №833 (1939-41), дзесятнікам у павятовай дарожнай управе (1942-44), зноў у ДЭУ №833 (1944). У 1944-47 — артыст хору Беларускага ансамбля песні і танца (Гродна). Звольнены з працы ў ансамблі, вучыўся ў Літоўскай кансерваторыі (1947-51, клас К. Пятроўскага), адначасова

працаваў у Літоўскай філармоніі (1948-53, 1963). Адначасова ў 1949-63 — саліст тэатра оперы і балета Літвы. Выконваў партыі Анегіна ("Яўгені Анегін" П. Чайкоўскага), Раберта ("Іяланта" П. Чайкоўскага), Рыгалета ("Рыгалета" Дж. Вэрдзі), Жэрмона ("Травіята" Дж. Вэрдзі), Яга ("Атэла" Дж. Вэрдзі), Дэмана ("Дэман" А. Рубінштэйн), Сільвіі ("Паяцы" Р. Леанкавала) і інш. Выступаў у канцэртах. Гастраляваў у многіх гарадах СССР.

**Русінка Вольга Іванаўна** (17.07.1959, в. Берштны Шчучынскага р-на), беларуская пісьменніца (паэтка, крытык і літаратуразнавец), педагог. Кандыдат філалагічных навук (1987). Дацэнт (1992). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1999). З сям'і інтэлігентаў. Скончыла СШ у Берштах (1976), філфак БДУ (1981), удзельнічала ў рабоце студэнцкага літаратурнага аб'яднання "Узлёт". Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры СШ №25 г. Віцебска (1981-84). У 1985 скончыла аспірантуру ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі. З 1984 выкладае ў Віцебскім пединстытуце, з 1992 — загадчык кафедры беларускай літаратуры гэтага інстытута (універсітэта). Вершы друкуе з 1974 (літаратурны дэбют — у Шчучынскай райгазеце "Савецкая вёска"). Сааўтар калектыўных зборнікаў "Вёсны" (1977), "Шчаслівы дзень" (1983), "Квадра" (1990), "Дзвіна. Віцебшчына літаратурная" (1992). Выдала зборнік лірыкі "Табе" (1995). Друкуе (з 1986) артыкулы па пытаннях сучаснага літаратурнага працэсу і методыкі выкладання беларускай літаратуры ў школе.

**Русілка Уладзімір Кузьміч** (28.07.1893, в. Берштны Шчучынскага р-на — 31.10.1976), беларускі хормайстар, педагог. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Берштаўскай 2-класнай вучэльні, у Свіслацкай настаўніцкай семінарыі (1909-13). Працаваў настаўнікам пачатковай школы ў Харашэвічах (Слонімскі р-н). З 1915 — у войску, на фронце І-ай сусветнай вайны. У 1919 вярнуўся дамоў. З 1921 — настаўнік пачатковай школы ў Берштах. У 1925 пераведзены на педагагічную працу ў глыбіню Польшчы. Змог вярнуцца на радзіму ў 1938, працаваў у пачатковай школе ў Адэльску (Гродзенскі р-н). У 1939-41 — дырэктар Берштаўскай 7-годкі. Падчас вайны працаваў на гаспадарцы. З 1944 — зноў дырэктар гэтай школы. У 1947-57 працаваў тут настаўнікам. Хормайстарскую дзейнасць пачаў у 1913 у Харашэвічах. Вярнуўся да яе ў 1939, стварыўшы Берштаўскую вакальную группу. Адрадзіў групу як жаночы вакальны ансамбль (з 1972 — званне народнага), якім кіраваў у 1946-76. Інтэрпрэтаваў у

ансамблі (а капэла) беларускія народныя песні, песні беларускіх кампазітараў. Рабіў апрацоўкі беларускіх народных песень.

**Руцкая Алена Віталеўна** (11.01.1950, в. Дзякаўцы Шчучынскага р-на), беларуская паэтка, педагог. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1985). Заслужанная настаўніца Беларусі (1987). З сям'і інтэлігентаў. Вучылася ў пачатковай школе ў роднай вёсцы, затым — у мяст. Ражанка (Шчучынскі р-н). Скончыла СШ №7 г. Слоніма (1966). У 1971 скончыла філфак БДУ, удзельнічала тут у рабоце літаратурнага аб'яднання "Узлёт". Настаўнічала ў 8-годцы ў в. Сценявічы (Слонімскі р-н) у 1971-72, у Студзілаўскай СШ на Магілёўшчыне (1972-73), у СШ №2 г. Слоніма (1977-93). З 1993 — ст. выкладчык кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага універсітэта. Рэцэнзіі, нарысы на маральна-педагагічныя тэмы, артыкулы пра выкладанне беларускай мовы і літаратуры ў школе друкуе з 1977. Вершы — з 1966. Сааўтар калектыўнага зборніка лірыкі "Сцяжынка" (1983). Выдала кнігі паэзіі "Надзея" (1983), "Роздум" (1988).

**Руцкі Восіп Вельямін** (1574, маёнт. Рута Карэліцкага р-на — 5.02.1637), беларускі асветнік, пісьменнік, царкоўны уніяцкі дзеяч. Доктар філасофіі (1594). Вучыўся ў сваім маёнтку, у пратэстанцкіх школах Навагрудка і Вільні. З 1590 слухаў лекцыі ў універсітэтах Прагі і Вюрцбурга. У 1599-1603 працягваў вучобу ў грэчаскай калегіі ў Рыме. Затым служыў рэктарам уніяцкай манаскай школы ў Вільні, падарожнічаў у Маскву. У 1607 уступіў у ордэн базыльянаў пры віленскім манастыры св. Троіцы. З 1609 — архімандрыт, з 1614 — уніяцкі мітрапаліт. У 1617 склікаў у Навагрудку з'езд ігуменаў уніяцкіх манастыроў, на якім быў арганізаваны ордэн базыльянаў у Беларусі. Распрацаваў статут ордэна. Быў абраны на з'ездзе протаархімандрытам ордэна базыльянаў у Беларусі. Інтэлектуальна ўмацоўваў уніяцкую царкву, ствараў пры ёй школы, служыў ёй літаратурным словам. Аўтар палемічных трактатаў, "абаронаў", "абвяржэнняў", пасланняў. Пісаў на лацінскай, царкоўнаславянскай, беларускай, польскай, італьянскай мовах.

**Рымашэўскі Сяргей Віктаравіч** (19.02.1964, г. Гродна), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1996). З сям'і рабочых. Скончыў СШ №12. Вучыўся ў Мінскай мастацкай вучэльні (1980-84). Служыў у войску (1984-86). Скончыў аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай мастацкай акадэміі (1991). З 1986 удзельнічае ў выставах (у Беларусі, Расіі, Германіі,

Нідэрландах). Працуе ў галіне станковага жывапісу, графікі (умоўная кампазіцыя, партрэт). Сярод работ: "Паляванне на крата" (1993), "Стол" (1994), "У краіне трох узгоркаў" (1996), "Верасовы вечар" (1996), "Канец гульні" (1996), "Страчаная краіна" (1996), "Востраў" (1997), "Куток S" (1997), "Уцёкі ад самога сябе" (1998), "Нявеста" (1998), "Летуценнік" (1998), "Чырвоны капялюшык" (1999), "Вяртанне" (1999), "Мой анёл" (1999), "Дзяўчынка з сабакам" (1999). Творы захоўваюцца ў прыватных зборах у Беларусі, Расіі, Германіі, Нідэрландах, ЗША.

**Савоська Павел Піліпавіч** (2.01.1941, в. Зарудзічы Смаргонскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). З сялянскай сям'і. Скончыў Залескую СШ Смаргонскага р-на (1957), Друйскую тэхнічную вучэльню (1960). Служыў у войску (1960-63). У 1970 скончыў Ленінградскі горны інстытут. Працаваў на Чукотцы геолагам, начальнікам участка арцелі "Мінерал", на Урале, у Сібіры, у Латвіі, у Смаргонскім сілікатным аб'яднанні, у Віцебскім вытворчым аб'яднанні "Кераміка". Жыве ў Мінску. Друкуецца як празаік з 1975. Сааўтар калектыўных зборнікаў літаратурнай творчасці. Выдаў кнігу "Нататкі халасцяка" (1988, 1994).

**Сазанавец Лілія Вацлаваўна** (дзявоч. Федаровіч, 10.06.1963, в. Лукашына Іўеўскага р-на), беларуская пісьменніца (празаік). Бацька працаваў трактарыстам, маці настаўніцай. Скончыла Лукашынскую 8-годку (1978), Лідскі індустрыяльны тэхнікум (1982). Працавала на Лідскім заводзе "Оптык" (1982-84). Вучылася ў Беларускім тэхналагічным інстытуце (1984-88). Нейкі час жыла з сям'ёй у Расіі (пас. Пінюг Кіраўскай вобл.). З 1989 — зноў у Лідзе, дзе працуе з 1990 на лакафарбавым заводзе (у праектна-канструктарскім бюро, у заводскім інтэрнаце №1). З 1998 завочна вучыцца на факультэце славістыкі Вільнюскага педагагічнага універсітэта. Друкуецца як празаік з 1996 (у "Маладосці", "Крыніцы", "Літаратуры і мастацтве"). Выдала кнігу "Нespланаванае забойства" (Ліда, 1996). Займаецца журналістыкай. Сябра рэдкалегіі газеты "Наша слова" (1998).

**Сазановіч Алена Іванаўна** (9.05.1964, г. Гродна), руская пісьменніца (празаік, паэтка, драматург). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №16 у Гродне, факультэт журналістыкі БДУ (1987). Працавала ў рэдакцыях газет "Вячэрні Мінск", "Чырвоная змена", "Знамя юности" (1987-89). У 1989-93 вучылася на сцэнарным факультэце Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі. Жыве ў Маскве. Літаратурны дэбют — у 1981. Друкавала вершы, апавяданні, эсэ,

аповесці, раманы (у часопісах "Родник", "Парус", "Юность", "Даугава", альманаху "Брызги шампанского"). Друкавалася ў перакладзе на англійскую мову. Сааўтар калектыўных зборнікаў твораў, якія выходзілі ў Мінску і Маскве. Выдала ў Маскве раман "Смяротны келіх" (1996), зборнікі аповесцяў "Вуліца вячэрніх насалод" (1998), "Перадапошні дзень смутку" (1998).

**Сакалоўскі Станіслаў Іванавіч** (30.09.1937, в. Старая Галынка Зэльвенскага р-на), беларускі педагог, Дацэнт (1991). З сям'і чыноўніка. Скончыў 7 кл. Галынкаўскай школы (1953). Вучыўся ў Ваўкавыскай, затым Навагрудскай педагагічнай вучэльні (скончыў у 1957). Працаваў настаўнікам, загадчыкам пачатковай школы у в. Барукі і Кабакі (Зэльвенскі р-н), Угрынскай 7-годцы (Зэльвенскі р-н) у 1957-59. У 1959-64 — студэнт гістарычна-геаграфічнага факультэта Мінскага педінстытута (у 1961-63 адначасова працаваў камендантам студэнцкага інтэрната). Быў настаўнікам гісторыі і геаграфіі СШ №5 г. Гродна (1964-68), метадыстам, затым загадчыкам кабінета геаграфіі Гродзенскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў (1968-75). З 1975 — дырэктар інстытута. У 1991-98 — рэктар Гродзенскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. З 1998 працуе метадыстам вышэйшай катэгорыі гэтага інстытута. Друкуецца з 1968. Аўтар многіх навуковых і навучальна-метадычных публікацыяў па праблеме павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў. Быў сябрам навучальна-метадычнага Савета ўправы кадраў Міністэрства асветы СССР (1985-90). Выбіраўся дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета (1990-96).

**Сакалоўскі Уладзімір Лявонавіч** (4.06,1930, в. Мяльканавічы Слонімскага р-на), беларускі літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1977). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў 7-годцы ў Мяльканавічах, у СШ — у Азярніцы (Слонімскі р-н). У 1949-53 — на факультэце замежных моваў Гродзенскага педінстытута. Працаваў настаўнікам нямецкай мовы ў Мастоўскай СШ (1953-57), дырэктарам 8-годкі ў Зэльве (1957-58), у Лупачах Мастоўскага р-на (1958-59), сярэдняй школы ў Азёрах Гродзенскага р-на (1959-61), школы-інтэрната ў Мастах (1961-62). У 1962-71 — перакладчык у ГДР. Выкладаў нямецкую мову ў Рыжскім інстытуце інжынераў грамадзянскай авіяцыі (1971-78), працаваў тут дацэнтам, загадчыкам кафедры рускай мовы па рабоце з замежнымі студэнтамі. З 1982 — ст. навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры

Акадэміі навук Беларусі. З 1991 — ст. навуковы супрацоўнік, затым кіраўнік аддзела Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны. Адначасова — вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы. Навуковыя публікацыі — з 1972. Даследуе гісторыю беларуска-заходнееўрапейскіх літаратурных сувязяў, праблемы літаратурнага перакладу. Выдаў кнігі "Пара станаўлення: Вопыт параўнальнага вывучэння беларускай і некаторых класічных зарубежных літаратур" (1986), "Беларуская літаратура ў ГДР" (1988), "Беларуская літаратура за мяжой" (1988, у сааўт.).

**Салагуб Алесь** (Аляксандр Феафілавіч, 18.10.1906, в. Зарудзічы Смаргонскага р-на — 17.05.1934), беларускі паэт, публіцыст. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі (1922-27), прымаў актыўны ўдзел у руху Грамады, ТБШ. Зняволены польскімі ўладамі ў турме (1924, 1927-28). У 1928 перайшоў у БССР. Скончыў БДУ (1931). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута літаратуры і мастацтва Беларускай акадэміі навук. На 3-ім годзе вучобы (1933) рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і неўзабаве расстраляны. Друкаваўся як публіцыст з 1920, вершы — з 1925. Выдаў зборнік паэзіі "Лукішкі" (1929). У Мінску выступаў з артыкуламі пра літаратурны рух у Заходняй Беларусі. Перажытае ў польскай турме адлюстраваў у "Лукішскім дзённіку" (урыўкі апублікаваныя ў "Полымі" ў 1961). Аўтар апавяданняў, п'есы "Вяселле" (у рукапісах).

**Саламевіч Янка** (Іван Уладзіміравіч, 29.10.1938, в. Малая Кракотка Слонімскага р-на), беларускі літаратуразнавец і крытык, фалькларыст, бібліёграф. Кандыдат філалагічных навук (1971). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1989). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у в. Вялікая Кракотка (Слонімскі р-н), вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1955-60). Працаваў у выдавецкім аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (1960-63), у выдавецтве Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР (1963-64). У 1967 скончыў аспірантуру на кафедры беларускай літаратуры БДУ (у 1965-66 стажыраваўся ў Варшаўскім універсітэце). З 1968 працуе ў выдавецтве "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" ("Беларуская Энцыклапедыя"), дзе займае пасады ст. навуковага рэдактара рэдакцыі літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі (1968-76), загадчыка навуковай рэдакцыі народнай асветы і беларускіх слоўнікаў (1976-92). З 1992 — вядучы рэдактар гэтай рэдакцыі, з

1994 — вядучы рэдактар рэдакцыі літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі (літаратуры і мастацтва). Першая публікацыя — у раённым друку ў 1955, у рэспубліканскім друкуецца з 1957. Выдаў даследаванні "Міхал Федароўскі" (1972), "Слоўнік беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў. XVI-XX ст." (1983). Складальнік, рэдактар, каментатар, рэцэнзент літаратурна-мастацкіх, фальклорных, бібліяграфічных выданняў. Аўтар шматлікіх літаратурна-краязнаўчых, энцыклапедычных артыкулаў. Публікатар твораў нацыянальнай спадчыны. Збіральнік фальклорных твораў. З 1988 вядзе ў часопісе "Беларуская мова і літаратура ў школе" ("Роднае слова") каляндар юбілейных датаў і памятных дзён. У 1979-88 — адзін з вядучых тэлечасопіса "Роднае слова" на рэспубліканскім тэлебачанні. Перакладае з рускай, украінскай, польскай моваў.

**Саматыя Ірына Мікалаеўна** (дзявоч. Супрун, 10.07.1954, в. Тушэвічы Слонімскага р-на), беларускі педагог-метадыст, мовазнавец. Кандыдат педагагічных навук (1992). Дацэнт (1996). З сям'і дырэктара саўгаса. Скончыла СШ №1 г. Слоніма. Вучылася на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1971-76). Выкладала беларускую мову і літаратуру ў Гарадзішчанскай СШ Мінскага р-на (1976-82). У 1982-88 настаўнічала ў Мінску, у СШ№ 132, 48, 136, 151. Адначасова — малодшы навуковы супрацоўнік аддзела методыкі беларускай мовы НДІ педагогікі Міністэрства асветы БССР. У 1988-91 — аспірантка кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута. Выкладала ў гэтым інстытуце на кафедры методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры (1991-97). З 1997 — дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання моваў і літаратур БДУ. Друкуецца з 1986. Даследуе методыку выкладання беларускай мовы ў школе. Сааўтар дапаможніка для настаўнікаў "Выкладанне беларускай мовы ў школе" (1994), падручніка "Беларуская мова. Сінтаксіс і пунктуацыя. Для 8 класа школ з беларускай мовай навучання" (1997).

**Сапір Якаў** (1822, мяст. Ашмяны — 1885), яўрэйскі пісьменнік, падарожнік. З сям'і шохета (разніка). У 1832 пераехалі ў Ізраіль. Па смерці бацькоў перабраўся ў 1836 у Ерусалім, дзе атрымаў рэлігійную адукацыю і шырокія свецкія веды. Настаўнічаў тут у рэлігійнай школе, затым быў пісцом абшчыны. З 1839 друкаваў вершы, публіцыстыку. У 1857-63 зрабіў падарожжа па краінах Усходу і Поўдня (Егіпет, Йемен, Індыя, Ява, Цэйлон, Аўстралія, Новая Зеландыя). Падарожжа апісаў у кнізе "Сапфір" Т. 1-2 (1866-74), дзе адлюстраваў

побыт, мясцовыя гаворкі яўрэяў з усходніх краін. У 1869 быў у Еўропе, у 1873 — у Расіі. Выдаў кнігу "Другое Йеменскае пасланне" (1873).

**Саўка Міхась** (19.07.1927, в. Загор'е Карэліцкага р-на — 10.09.1990), беларускі і бельгійскі мастак-рэстаўратар, мастацтвазнавец, археолаг. Доктар мастацтваў (1979). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы. Сярэднюю адукацыю атрымаў падчас вайны ў Баранавічах. Быў тут адным з кіраўнікоў СБМ. У 1944 выехаў у Германію. З 1947 — у Бельгіі. Працаваў вуглякопам. Вучыўся на вячэрніх курсах мастацкай акадэміі. У 1951-55 вучыўся на факультэце археалогіі і гісторыі мастацтваў універсітэта ў Лювене (Бельгія). Працаваў у Каралеўскім Інстытуце мастацкай спадчыны ў Брусэлі, быў мастаком-рэстаўратарам, з 1969 — адміністрацыйным сакратаром, у 1982-85 — кіраўніком працаў. Вучыў маляванню каралеву Бельгіі. Фармаваўся як спецыяліст па насценным роспісе. Распрацаваў тэарэтычныя асновы і практычныя рэкамендацыі па тэхніцы рэстаўрацыі. Шмат друкаваўся, у тым ліку і ў беларускай эміграцкай прэсе, на тэмы мастацкай культуры. Выдаў даследаванні ў галіне рэстаўрацыі. Праводзіў археалагічныя раскопкі ў Грэцыі, Турцыі, Алжыры.

**Саўко Уладзімір Паўлавіч** (17.04.1961, в. Брольнікі Навагрудскага р-на), беларускі педагог-метадыст, мовазнавец. Кандыдат педагагічных навук (1995). З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў роднай вёсцы, СШ №1 у Навагрудку (1978). Працаваў на Навагрудскім заводзе газавай апаратуры (1978-79). Вучыўся на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1979-84). Настаўнічаў у СШ №2 г. Мазыра (1984-87). Выкладаў беларускую мову ў Мазырскім педінстытуце (1987-89). З 1989 — на кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута (Беларускага педагагічнага універсітэта). Вывучае пытанні методыкі выкладання беларускай мовы ў сярэдняй і вышэйшай школе, пытанні развіцця маўлення вучняў (друкуецца з 1991).

**Саянкова Людміла Пятроўна** (7.08.1957, мяст. Юрацішкі Іўеўскага р-на), беларускі кіназнавец, літаратуразнавец, журналіст, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1990). Дацэнт (1991). Сябра Беларускага Саюза кінематаграфістаў (1991). Сябра Беларускага Саюза журналістаў (1989). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №2 у Скідзелі Гродзенскага р-на (1974). Вучылася на факультэце журналістыкі БДУ (1974-79). Працавала ў Рэспубліканскім Доме кіно (1979-81), была

карэспандэнтам газеты "Знамя юности" (1981-82). З 1982 выкладае на факультэце журналістыкі БДУ. У 1985 завочна скончыла кіназнаўчы факультэт Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі. З 1988 — загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі БДУ. Стажыравалася ў ЗША (1994), Англіі (1996). Друкуецца як журналіст з 1975. Навуковыя публікацыі — з 1982. Даследуе метадалагічныя праблемы крытыкі, экранныя формы культуры, вывучае журналістыку як від масавай культуры. Кіравала прэс-цэнтрам (Мінск) міжнародных кінафестываляў. Уваходзіла ў мастацкую раду кінастудыі "Беларусьфільм".

**Сваяк Казімір** (сапр. Стаповіч Канстанцін Мацвеевіч, 19.02.1890, в. Барані Астравецкага р-на — 6.05.1926), беларускі паэт, каталіцкі святар. Брат А. Стаповіча. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Барані, скончыў гарадскую вучэльню ў Свянцянах (1905). Рыхтаваўся да паступлення ў духоўную семінарыю і жыў у Вільні, дзе далучыўся да беларускага руху. У 1908-15 вучыўся (з перапынкамі па хваробе) у Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі. Служыў ксяндзом у Клюшчанах (Астравецкі р-н) у 1915-16, Карыціне на Беласточчыне ў 1916-18, у Засвіры і Буйвідах на Віленшчыне ў 20-я. Часта выязджаў для лячэння ў Закапанае. Вёў на вёсцы шырокую нацыянальна-культурную работу, карыстаўся беларускай мовай у касцельнай службе. Ствараў беларускія школы, хоры, ладзіў спектаклі. Арганізаваў гурток беларускай моладзі "Хаўрус сваякоў" (1916). Распаўсюджваў сярод насельніцтва кнігі на беларускай мове. Няспынна праследаваўся касцельнымі уладамі. Друкаваўся з 1913 у газетах "Biełarus", "Беларускі звон", "Наша думка", "Новае жыццё", "Сялянская ніва", "Беларуская крыніца". Выйшлі ў Вільні яго трактат "Алькаголь" (1913), п'еса "Янка Канцавы" (1920), зборнік вершаў "Мая ліра" (1924), вершаванае апавяданне "Чарку дай, браце" (1926), малітоўнік "Голас душы" (1926, 4-е выд. у Рыме ў 1949), драматычная паэма "Купалле" (1930), дзённік "Дзея маёй мыслі, сэрца і волі" (1932). Напісаў гістарычную працу пра царкоўную унію ў Беларусі.

**Семянчук Генадзь Мікалаевіч** (6.10.1963, г. Ваўкавыск), беларускі гісторык, археалаг, культуролаг. Кандыдат гістарычных навук (1993). Дацэнт (1998). З сям'і рабочых. Скончыў СШ №2 г. Ваўкавыска, гістфак Гродзенскага універсітэта (1985). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі ў 1985-90 (у 1986-87 служыў у войску). Працаваў у гэтым інстытуце (1990-91). У 1991-98 выкладаў на кафедры беларускай

культуры Гродзенскага універсітэта (ст. выкладчык, дацэнт). З 1998 — дактарант БДУ. Археалагічныя раскопкі самастойна — з 1988. Вывучаў гарадзішчы ў Браславе і Межаве (Расонскі р-н), курганныя могільнікі ў Гатовіне (Мінскі р-н), Дзмітраўшчыне, Мінтуровіне, Чарнаполіцы (Полацкі р-н), у Польшчы. Аўтар шматлікіх публікацый па гісторыі і культуры Беларусі сярэднявечнага перыяду (друкуецца з 1989) у Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіне. Сааўтар навучальнага дапаможніка для студэнтаў "Археалогія Беларусі" Ч. 1-2 (Гродна, 1996-97). Стажыраваўся ў Польшчы ў 1995, 1996.

**Сенюх Чэслаў** (9.07.1930, мяст. Любча Навагрудскага р-на), польскі пісьменнік (перакладчык), журналіст. З сялянскай сям'і (у 1940 бацька рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і неўзабаве загінуў). Вучыўся ў Любчанскай 7-годцы. У 1946 пераехалі ў Польшчу. У Беластоку скончыў агульнаадукацыйны ліцэй. Вучыўся на факультэце рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта (1950-53). Працаваў дыктарам на польскім радыё. У 1965-69 — у Маскве, у польскай рэдакцыі маскоўскага радыё. З 1969 — рэпарцёр польскага радыё ў Варшаве. У 1972-74 выдаваў рускамоўны дадатак да тыднёвіка "Przyjaźń". Працаваў на Польскай тэлестудыі дакументальных фільмаў. Быў галоўным рэдактарам квартальніка "Tłumacz". Перакладае з беларускай (з 1981) і рускай моваў. Друкаваў у перакладзе на польскую мову творы Я. Коласа, Я. Купалы, Я. Брыля, В. Быкава, У. Караткевіча, В. Лысагорскага, Зьніча, Н. Арсенневай, Я. Чыквіна, Н. Артымовіч, В. Шведа і інш. Асобнымі выданнямі ў яго перакладах выйшлі ў Польшчы зборнікі твораў Я. Брыля (1989), С. Законнікава (1996).

**Серада Людміла Міхайлаўна** (5.06.1950, г. Гродна), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1984). Дацэнт (1988). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №14 г. Гродна. Вучылася ў Мінскім педінстытуце замежных моваў (1967-72). Працавала на кафедры замежных моваў Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута ў 1972-79 (у 1975-77 — перакладчыца ў Алжыры). З 1979 працуе на кафедры замежных моваў Гродзенскага універсітэта, выкладае англійскую мову. Вучылася ў аспірантуры на кафедры структурнай і прыкладной лінгвістыкі Мінскага педінстытута замежных моваў (1979-83). З 1997 — загадчык аддзялення рамана-германскай філалогіі філфака Гродзенскага універсітэта. Стажыравался ў Англіі (1994, 1997), ЗША (1995). Даследуе лексічную структуру тэксту англійскай мовы ў супастаўленні з структурамі беларускай і рускай моваў, вывучае методыку выкладання замежных

моваў. Сааўтар навучальнага дапаможніка для студэнтаў "Міні-граматыка англійскай мовы (1995).

**Сідаровіч Васіль Лукашавіч** (1905, в. Сівіца Смаргонскага р-на — 1937), беларускі мастак (графік, жывапісец). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, дзе вёў падпольную рэвалюцыйную прапаганду. Наведваў тут майстэрню-студыю Я. Драздовіча (1926-27). Актыўна дзейнічаў у руху Грамады, ТБШ. Друкаваў графічныя малюнкі ў часопісах гімназіі (1925-27), у часопісе "Маланка" (1926-28). У пачатку 30-х перайшоў у БССР. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, неўзабаве загінуў. Пісаў пераважна сатырычныя малюнкі. Сярод іх: "Два пасты", "Праўдзівы пост", "Што Рыгор у свеце бачыў", "Беларусь, ты прабуджайся, ашукаць сябе не дайся", "Хоць гультаём мяне завуць, а з працы ўсе маёй жывуць", "І на зямлі, і пад зямлёй "апекуны" ўсё за табой". Ствараў пейзажы родных ваколіц.

**Сідаровіч Мікалай Лявонавіч** (2.03.1928, в. Пятралевічы Слонімскага р-на), беларускі педагог, краязнавец. З сям'і чыгуначніка. Скончыў беларускую СШ №1 г. Слоніма (1947), аддзяленне беларускай мовы і літаратуры літфака Гродзенскага педінстытута (1951). Настаўнічаў у Пінскай і Брэсцкай вобл. У 1964-89 — настаўнік Слонімскай СШ №7, дзе стварыў музей "Літаратурная Слонімшчына" (1984). Адшукаў новыя матэрыялы пра жыццё і творчасць К. Лейкі. Публікацыі ў галіне літаратурнага краязнаўства — з 1982. Жыве ў Слоніме.

**Сідарчук Ганна Серафімаўна** (4.11.1939, в. Коматава Гродзенскага р-на), беларускі педагог-метадыст. Кандыдат педагагічных навук (1975). Дацэнт (1979). З сям'і настаўніка. Скончыла 5 кл. у роднай вёсцы. У сувязі з пераводам бацькі на працу ў Гродна працягвала тут вучобу ў СШ №7, скончыла СШ №3 (1956). Вучылася на фізічна-матэматычным факультэце Гродзенскага педінстытута (1956-61). Працавала ў гэтым інстытуце лабарантам, ст. лабарантам, асістэнтам кафедры геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі (1961-71). У 1971-74 — аспірантка гэтай кафедры. Затым тут выкладала (была загадчыцай кафедры ў 1982-86). З 1986 працавала на кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання. З 1987 загадвае кафедрай матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі ў пачатковай школе Гродзенскага універсітэта. Даследуе гісторыю школьнай матэматычнай адукацыі ў Беларусі, творчую дзейнасць настаўнікаў у галіне методыкі выкладання матэматыкі ў пачатковай і

сярэдняй школе, праблемы падрыхтоўкі настаўнікаў матэматыкі. Аўтар шматлікіх публікацый (з 1971) на гэтыя тэмы ў навуковых выданнях Беларусі, Расіі, Літвы.

**Сідор Сяргей Іванавіч** (25.05.1937, в. Янаўшчына Зэльвенскага р-на — 17.07.1998), беларускі географ, педагог. Доктар педагагічных навук (1991). Прафесар (1994). З сялянскай сям'і. Скончыў Дзергілёўскую 7-годку (Зэльвенскі р-н), Лідскую педагагічную вучэльню (1955). Настаўнічаў у Рагозніцкай 7-годцы Мастоўскага р-на (1955-56). Служыў у войску (1956-59). Быў настаўнікам 8-годак у в. Катчыно і Зарудаўе Мастоўскага р-на, настаўнікам, загадчыкам навучальнай часткі Шылавіцкай СШ Ваўкавыскага р-на, дырэктарам Індурскай СШ рабочай моладзі Гродзенскага р-на (1959-67). Завочна скончыў геаграфічны факультэт БДУ (1964). У 1967-70 — аспірант кафедры геаграфіі Мінскага педінстытута. Працаваў навуковым супрацоўнікам НДІ педагогікі Міністэрства асветы БССР (1970-71), ст. выкладчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі Магілёўскага педінстытута (1971-74). З 1974 — дацэнт, з 1992 — прафесар кафедры эканамічнай геаграфіі БДУ. Жыў у г. Дзяржынску Мінскай вобл. Друкаваўся з 1969. Вывучаў сацыяльна-эканамічную геаграфію Беларусі, змест і методыку выкладання геаграфіі ў сярэдняй і вышэйшай школе. У 1992-95 узначальваў групу спецыялістаў, якая распрацоўвала канцэпцыю геаграфічнай адукацыі для школ Беларусі, новыя праграмы і падручнікі. Выдаў даследаванні і падручнікі: "Беларуская ССР у 10-ай пяцігодцы. Кніга для вучняў" (1977, на рус. мове), "Экзамен па геаграфіі. У дапамогу абітурыентам" (1979, 2-е выд. 1985, у сааўт., на рус. мове), "Беларуская ССР у 11-ай пяцігодцы" (1983, на рус. мове), "Беларускае Палессе: праблемы развіцця і размяшчэння вытворчых сіл" (1983, у сааўт., на рус. мове), "Геаграфічны слоўнік школьніка" (1986, у сааўт.), "Беларуская ССР у 12-й пяцігодцы" (1987, на рус. мове), "Дапаможнік па геаграфіі для асоб, што паступаюць у ВНУ" (1988, у сааўт., на рус. мове), "Геаграфія БССР. Падручнік для 9 кл." (1989, на рус. мове), "Сацыяльна-эканамічная геаграфія Беларусі: навука і навучальная дысцыпліна" (1989, на рус. мове), "Геаграфія Беларусі. Падручнік для 9 класа" (1993, 3-е выд. 1995), "Геаграфія Беларусі. Дадатак да падручніка. 9 клас" (1993), "Займальная геаграфія Беларусі" (1995, у сааўт.). Рэдактар і складальнік навуковых і навучальных выданняў па геаграфіі.

**Сільвановіч Аляксандр Мікалаевіч** (17.06.1965, г. Гродна), беларускі мастак, дызайнер. Сябра Беларускага Саюза мастакоў

(1996). З сям'і інтэлігенцыі. Скончыў у Гродне 4 кл. у СІЛ №16. Вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве (1975-83). Служыў у войску (1983-85). У 1987-92 — студэнт аддзялення манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (акадэміі мастацтваў). З 1992 — дызайнер Гродзенскага ВА "Гроднаэнерга". Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і станковага жывапісу. У выставах — з 1987 (у Беларусі, Расіі, Германіі, Францыі, Іспаніі). Сярод манументальных твораў: роспіс у Беларускім педагагічным універсітэце (1989), вітраж у гродзенскім гандлёвым доме "Ніка" (1993), не ўвасобленыя пакуль у інтэр'ерах роспіс "Міласэрнасць" (1992), графіта "Свята" (1994). У галіне жывапісу (умоўныя кампазіцыі) — "Цемра і святло" (1994), "Чарапаха" 1998), дыпціх "Брама" (1999), "Вежа" (1999), "Мост" (1999), "Рыба" (1999).

**Сіплевіч Раіса Паўлаўна** (24.05.1949, в. Пабрэззе Навагрудскага р-на), беларуская мастачка (жывапіс, графіка), мастацкі педагог. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1987). З сялянскай сям'і. У Касым Двары (Навагрудскі р-н) скончыла 8-годку. Вучылася ў Мінскай мастацкай вучэльні. Скончыла аддзяленне графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1976). Выкладала ў Мінскай мастацкай вучэльні (1977-87). З 1993 — у Мінскім мастацкім каледжы. Жанры тэматычнай карціны, пейзажа, кампазіцыйнага партрэта, нацюрморта распрацоўвае пераважна ў авангардысцкім стылі. Удзельнічала ў выставах (з 1975) у Беларусі, Германіі, Італіі, Канадзе, Аўстраліі. Сярод твораў жывапісу: "Нацюрморт з вішнямі" (1982), "Партрэт з птушкай I" (1989), "Партрэт з птушкай 2" (1990), "Сёмуха" (1990), "Адраджэнне" (1990), "Вялікдзень" (1990), "Кот скокнуў" (1991), "Аголеная на зялёным фоне" (1991), "Апошні снег" (1991), "Гаспадынька" (1992), "Туман над возерам" (1992), "Вербы" (1992), "Вячэрняя сустрэча" (1993), "Партрэт з яблыкам" (1993), "Кампазіцыя" (1994), "Вандроўны горад" (1994), "Сумная мелодыя" (1995). Аўтар графічных кампазіцый: "Вяртанне" (1986), "Сон" (1987), "Цень цішыні" (1993), "Залаты вецер" (1994), "Срэбны вецер" (1994), "Планета метамарфозаў" (1995), трыпціха "Варыяцыі адной тэмы" (1995). Творы захоўваюцца ў зборах Беларусі, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Італіі, Францыі, Канады, Англіі, Нідэрландаў, ЗША, Аўстраліі.

**Сіпліваня Жана Сямёнаўна** (23.02.1971, в. Верцялішкі Гродзенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1998). Скончыла Верцялішкаўскую СШ (1988), факультэт

беларускай філалогіі і культуры Гродзенскага універсітэта (1993). Вучылася ў аспірантуры на кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства гэтага універсітэта (1995-98). У 1993-95 і з 1998 выкладае на кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства. Друкуецца з 1996. Вывучае праблемы словаўтварэння ў сучаснай беларускай мове.

**Скалабан Віталь Уладзіміравіч** (5.08.1947, в. Шылавічы Слонімскага р-на), беларускі гісторык, культуролаг, архівіст. Кандыдат гістарычных навук (1987). З сям'і настаўнікаў. З 1951 жылі ў мяст. Ляхавічы (Брэсцкая вобл.), дзе скончыў СШ. У 1970 скончыў гістфак Ленінградскага універсітэта. У 1972-95 працаваў у выдавецтве "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" ("Беларуская энцыклапедыя"), з 1992 — загадчыкам рэдакцыі гісторыі Беларусі. З 1995 — намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага цэнтра (пазней інстытута) дакументазнаўства і архіўнай справы, з 1997 — дарадца гэтага інстытута. Друкуецца з 1968. Асноўныя кірункі навуковых інтарэсаў — гісторыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, беларуская літаратура і культура XIX — пач. XX ст. Аўтар шматлікіх публікацый у навуковых зборніках, энцыклапедыях, часопісах. Сааўтар дакументальна-мастацкіх кінафільмаў "Без эпітафіі" (1990), "Справа Ігнатоўскага" (1991), "Ніколі я не паміраў..." (1992), "Імша па Купалу" (1993), "БНР. Час звешвання" (1993).

**Скамарошчанка Анатоль Фёдаравіч** (18.03.1954, г. Гродна), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1997). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1981). Выконвае пераважна дызайн інтэр'ераў, займаецца жывапісам. Жыве і працуе ў Гродне. Сярод асноўных работ — праекты інтэр'ераў швейнага атэлье "Стыль", офіса крамы "Любава", афармлення вітрыны трыкатажнага аб'яднання "Вясёлка" і інш.

**Скачкоўская Зінаіда Канстанцінаўна** (7.11.1912, в. Граўжышкі Ашмянскага р-на — 1994), беларуская культурная дзеячка, артыстка тэатра. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1983). З сям'і лесніка. У 20-я жылі ў в. Самахвалавічы, тут скончыла ў 1927 7-годку. У 1927-29 вучылася ў Мінску на агульнаадукацыйных курсах, у 1930-32 — на драматычных курсах. У 1932-48 — актрыса Беларускага тэатра імя Я. Купалы. У 1948-93 — памочнік рэжысёра гэтага тэатра. Сыграла ролі (пераважна травесці) у спектаклях "Велікадушнасць" В. Галаўчынера, "Бацькаўшчына" К. Чорнага,

"Партызаны" К. Крапівы, "Машачка" А. Афінагенава, "Жакерыя" І. Мерыме, "Маладая гвардыя" паводле А. Фадзеева і інш.

**Скварніцкі Марак** (30.04.1930, г. Гродна), польскі пісьменнік (паэт, празаік, эсэіст), журналіст. З сям'і афіцэра. У 1936 бацьку перавялі па службе ў Астрогу, потым у Кутна. У Астрозе, Кутае, затым у Варшаве вучыўся ў школе. У 1944 высланы гітлераўцамі ў канцлагер у Аўстрыі. Вярнуўшыся, вучыўся ў СШ у Шчэціне. Скончыў факультэты польскай філалогіі (1952) і бібліятэказнаўства (1955) Варшаўскага універсітэта. Працаваў у бібліятэках у Варшаве (1952-57), у рэдакцыі "Tygodnika Powszechnego" ў Кракаве (1958-69), у рэдакцыі штомесячніка "Znak" (1969-75), часопіса "Pax Romana" (1975-79). Пасля зноў у "Tygodniky Powszechnym" (1979-92). Выдаў у Варшаве, Кракаве, Познані зборнікі паэзіі "Папяровы звон" (1961), "Іржа" (1967), "Цень" (1971), "Выбраныя вершы" (1974), "Змяркание" (1979), "Па-за часам" (1982), "Сярод кальварыйскіх таямніц" (1987), "Спаткаемся ў сонцы" (1989), "Інтэнсіўная тэрапія" (1993), "Песні" (1993), "Пачатак свету" (1997), кнігі прозы "Марцін" (1967), "Спатканне ў Лазане" (1977), зборнікі фельетонаў "Школа мудрацоў" (1972), "Што трымаецца, што мінае" (1995), рэпартажы "Вяселле ў Сіў-Сіці" (1974), "Аўстралійская вясна" (1988), "Падарожжа па касцёле" (1990), дзённік "Сёння цяжкая ноч" (1989), зборнік перакладаў "Псальмы" (1990).

**Склубоўскі Вінцэнт** (13.08.1911, в. Малышкаўшчына Ашмянскага р-на), беларускі грамадска-культурны дзеяч. З беднай сялянскай сям'і. Падчас І-ай сусветнай вайны выязджалі ў бежанства (Уфімская губ.), адкуль вярнуліся ў 1923. Вучыўся ў 4-класнай пачатковай школе ў в. Семернікі (Ашмянскі р-н), у 7-годцы ў Гальшанах (Ашмянскі р-н). У 1929-34 — у Віленскай польскай гімназіі. У 1934-39 вучыўся на юрыдычным факультэце Віленскага універсітэта. У студэнцкія гады далучыўся да нацыянальна-вызваленчага руху. У 1935 уступіў у ТБШ, быў сябрам Галоўнай управы ТБШ, узначаліў гурток ТБШ у Вільні (1936). Рэдагаваў газету КПЗБ "Наша воля" (1935-36). Друкаваў артыкулы на гістарычныя, педагагічна-асветныя тэмы ў часопісе "Беларускі летапіс", газеце "Poprostu", у "Беларускіх календарах". У 1939-41 працаваў сакратарам сельсавета ў Гальшанах, адвакатам у Іллі на Вілейшчыне. Падчас вайны жыў у Лідзе, Баранавічах, быў вывезены на прымусовыя работы ў Германію. Пасля вайны працаваў у судах Польшчы. З 1957 жыў у Беластоку, быў ваяводскім суддзёй (1957-77), выкладаў гісто-

рыю Беларусі на аддзяленні беларускай філалогіі завочнай настаўніцкай студыі. Прымаў актыўны ўдзел у беларускім грамадска-культурным руху ў Польшчы. Сябра Галоўнай управы Беларускага грамадска-культурнага таварыства (1959-79), старшыня управы (1967-70). У газеце "Ніва", "Беларускіх календарах", альманаху "Белавежа" друкаваў апавяданні, гістарычныя даследаванні, юрыдычныя кансультацыі.

**Скобла Міхась** (Міхаіл Уладзіміравіч, 23.11.1966, в. Паляжын Зэльвенскага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1991). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў 8-годцы ў в. Угрынь (Зэльвенскі р-н), СШ скончыў у мяст. Дзярэчын (Зэльвенскі р-н). Вучыўся затым на філфаку БДУ ў 1984-91 (служыў у войску ў 1985-87). Працаваў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Роднае слова" (1991-95), у Дзяржкамдруку (1995-97), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Бярозка" (1997-98). З 1998 — зноў у часопісе "Роднае слова". Друкуецца з 1984. Выдаў зборнікі лірыкі "Вечны Зніч" (1990), "Вочы Савы" (1994), кніжку вершаваных пародый "Розгі ў розніцу" (Слонім, 1994), кніжку твораў для дзяцей "Камень — перунок" (1998), кнігу краязнаўчых матэрыялаў, артыкулаў і эсэ "Дзярэчынскі Дыярыуш" (1999). Складальнік анталогіі сучаснай паэзіі "Пад сэрцам у Радзімы" (1997), зборніка з серыі "Беларускі кнігазбор" "Уладзімір Жылка" (1998).

**Скрамблевіч Баляслаў Антонавіч** (2.12.1945, мяст. Адэльск Гродзенскага р-на), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1987). Брат М. Скрамблевіча. З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Адэльску. Працаваў у Гродне. У 1969-74 вучыўся ў Мінскай мастацкай вучэльні, у 1974-79 — на факультэце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (аддзяленне мастацкага металу) Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. З 1979 працуе ў Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. Выконвае дэкаратыўныя кампазіцыі з металу з уключэннем шкла, каваныя брамы, краты, падсвечнікі, шрыфтавыя тэксты назваў станцый метро, установаў, інтэр'еры, дробную пластыку. Сярод твораў: інтэр'еры станцыі метро "Трактарны завод", гасцініцы "Беларусь", Рэспубліканскага Дому шлюбаў, рэзідэнцыі ўрада РБ, рытуальнай залы Дома афіцэраў у Мінску і інш. У выставах удзельнічае з 1978 (у Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Расіі). Выстаўляліся творы дэкаратыўнай пластыкі "Ландыш", "Ранак, поўдзень, вечар", "Хай заўсёды будзе сонца", "Вясновы промень",

"Нараджэнне новай формы", "Лік" і інш. Аўтар шматлікіх публікацый на тэмы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Скрамблевіч Мар'ян Антонавіч** (25.03.1939, мяст. Адэльск Гродзенскага р-на), беларускі музыкант (баян, гармонік), музычны педагог, майстар народных музычных інструментаў. Брат Б. Скрамблевіча. З сялянскай сям'і. Скончыў Адэльскую СШ і служыў у войску (1960-63). У 1963-70 — настаўнік музыкі і спеваў Адэльскай СШ. З 1970 — загадчык клуба аўтобуснага парку №1 г. Гродна. Завочна скончыў аддзяленне тэорыі музыкі Універсітэта імя Крупскай у Маскве (1965), курсы баяністаў пры Гродзенскім абласным Доме народнай творчасці. У 1972-77 вучыўся ў Вышэйшай прафсаюзнай школе культуры (Ленінград). Кіруе (з 1970) хорам аўтапарку №1 у Гродне. З 1992 вырабляе народныя музычныя інструменты (дудкі, ражкі, свісцёлкі, акарыны, гармонікі), якія дэманстраваў на рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях.

**Слёзка Міхаіл** (каля 1601, Навагрудак — красавік 1667), беларускі і украінскі кнігадрукар, асветнік. Вучыўся друкарскай справе ў Вільні, Кіеве. У 1633 прыняты ў сябры Львоўскага Успенскага Стаўрапічыйскага брацтва. Загадваў брацкай друкарняй у Львове (1633-37, 1643-51). З 1638 — уладальнік уласнай друкарні. Выдаў "Каноны Багародзіцы" (1634), "Евангелле" (1636), "Службоўнік" (1637), "Уступ да разумення лагічных і філасофскіх тэрмінаў" М. Кароны (1639), "Апостал" (1639), "Трыадзіён" (1642), "Трыёдзь каляровая" (1642), "Анфалагіён" (1651), "Ключ разумення" І. Галятоўскага (1663, 1665). Выпусціў каля 50 кніг на царкоўнаславянскай, украінскай, лацінскай, польскай мовах. Аўтар прадмовы да "Апостала" (1639). Пашыраў асветніцкія ідэі.

**Смалянчук Аляксандр Фёдаравіч** (23.05.1959, мяст. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1995). З сям'і службоўцаў. Дзяцінства прайшло ў Слоніме, тут скончыў СШ №1. Вучыўся на гістфаку Гродзенскага педінстытута (універсітэта) у 1976-81. Нейкі час настаўнічаў у Гродзенскай школе-інтэрнаце. Служыў у войску (1981-83). Працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ №21, 14 г. Гродна, навуковым супрацоўнікам у Рэспубліканскім музеі гісторыі рэлігіі. З 1993 — у Гродзенскім інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў адукацыі (у 1994 завочна скончыў аспірантуру ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі

навук Беларусі). Дацэнт кафедры гуманітарнай адукацыі, дэкан факультэта дашкольнага выхавання і пачатковай школы Гродзенскага інстытута павышэння кваліфікацыі. Даследуе праблемы гісторыі Беларусі XIX — пач. XX ст., польскі рух у Беларусі гэтага часу. Аўтар шматлікіх навуковых артыкулаў у спецыяльных зборніках, часопісах, энцыклапедыях. Выдаў брашуру "Польскі нацыянальны рух і беларускае Адраджэнне пач. XX ст." (Гродна, 1995).

**Смаршчок Яўген Трафімавіч** (25.09.1914, мяст. Зэльва — 4.10.1984), беларускі і бельгійскі педагог, праваслаўны духоўнік. Доктар педагогікі (1957). Прафесар (1977). З сям'і настаўніка парафіяльнай школы. Падчас І-ай сусветнай вайны былі ў бежанстве пад Масквою, вярнуліся ў 1921. Вучыўся ў настаўніцкай семінарыі ў Слоніме, скончыў вучобу ў Свіслачы (1934). Служыў у войску, настаўнічаў у Поразаве (Свіслацкі р-н). У 1939 зноў мабілізаваны ў польскае войска. Удзельнічаў у польска-германскай вайне, трапіў у нямецкі палон. З 1940 працаваў у Берліне на фабрыцы. У 1947-50 вучыўся на факультэце псіхалогіі Філіпс універсітэта (Марбург). Адначасова рыхтаваўся да душпастырскай працы ў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царкве. Рукапаложаны на святара ў 1950. З гэтага года — у Бельгіі. Скончыў педагагічны факультэт універсітэта ў Лювене (1957), Інстытут філалогіі і гісторыі ўсходніх славян універсітэта ў Бруселі (1966), дзе заняўся беларусазнаўствам. Адначасова праходзіў курс святарскага навучання ў Інстытуце св. Сергія ў Парыжы. Быў старшынёй Саюза беларусаў Бельгіі. У 1969-80 выкладаў рускую мову ў Вышэйшай фламандскай школе ў Антверпене. Затым жыў у Гэверы ля Антверпена, служыў святаром.

**Смольская Людміла Іванаўна** (дзявоч. Майдан, 20.11.1957, г. Гродна), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1989). Дацэнт (1994). З сям'і рабочых. Скончыла ў Гродне СШ №15 (1975). Працавала на Гродзенскай фабрыцы пальчаткавых вырабаў (1975-78). Вучылася на падрыхтоўчым аддзяленні Гродзенскага універсітэта. У 1984 скончыла філфак (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) гэтага універсітэта. У 1985-88 — аспірантка кафедры рускай мовы БДУ. Затым выкладае на кафедры рускай мовы Гродзенскага універсітэта. Першая навуковая публікацыя — у 1982. Навуковыя інтарэсы звязаны з супастаўляльным мовазнаўствам (на матэрыяле пераважна марфалагічных і сінтаксічных катэгорый рускай і беларускай моваў). Сааўтар навучальнага дапаможніка для школы "Руская мова. Сінтаксіс". Ч. І (1997, на рус. мове).

**Смольскі Рычард Баляслававіч** (3.04.1946, г. Ліда), беларускі тэатразнавец. Доктар мастацтвазнаўства (1991). З сям'і рабочага. Скончыў СШ №10 г. Ліды. Працаваў столярам у гарпрамкамбінаце (1964-65). Вучыўся на тэатральным факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1965-70). Быў асістэнтам рэжысёра, 2-ім рэжысёрам на студыі "Беларусьфільм" у 1970-76 (у 1972-73 служыў у войску). Вучыўся ў аспірантуры па спецыяльнасці "тэатральнае мастацтва" Інстытута мастацтвазнаўства, этнатрафіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (1976-79). Затым працаваў у гэтым інстытуце, з 1981 — вучоным сакратаром, з 1988 — загадчыкам аддзела тэатра. З 1985 выкладае з перапынкамі ў ВНУ г. Мінска. З 1997 — рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў. Старшыня Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў (1997). Друкуецца з 1965. Аўтар рэцэнзій, артыкулаў, нарысаў, даследаванняў на тэмы тэатральнага мастацтва. Выдаў кнігі: "На сцэне — бессмяротнасць подзвігу: Беларускі тэатр аб Вялікай Айчыннай вайне" (1982, на рус. мове), "Пазначана часам: Пошукі сучаснай беларускай рэжысуры" (1984), "Тым, што прыдуць, у спадчыну: Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім тэатры 80-х гадоў" (1986, на рус. мове), "Стварэнне лёсу: Гістарычная і рэвалюцыйная тэма ў тэатрах Беларусі 70-80-х гадоў" (1987, на рус. мове), "Тэатр і жыццё" (1989, у сааўт., на рус. мове), "На скрыжаванні: Тэатр у працэсах станаўлення і развіцця гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў" (1999), "Тэатр у прасторы часу" (1999). Напісаў (у сааўт.) п'есы "Разбег", "Выкупленне", "Не толькі пра каханне", пастаўленыя на сцэне, радыёп'есы, увасобленыя на радыё, сцэнарыі дакументальных фільмаў "Марыя" (1975), "Праз усё жыццё" (1978), "Уладзіслаў Галубок" (1982), "Жыццё кліча" (1984). Вёў на Беларускім тэлебачанні тэлеальманах "У святле рампы" (1978-86).

**Солтан Генадзь Мікалаевіч** (2.05.1951, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларускі педагог-метадыст. Кандыдат педагагічных навук (1983). Дацэнт (1985). З сялянскай сям'і. Дзяцінства прайшло ў в. Мядзведка (Карэліцкі р-н), дзе скончыў 8-годку. СШ скончыў у Міры (1968). Вучыўся на фізічна-матэматычным факультэце Мінскага педінстытута (1968-72). Затым настаўнічаў у Мінску. Служыў у войску (1973-74). З 1979 працуе выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі Мінскага педінстытута (Беларускага педагагічнага універсітэта). Друкуецца па пытаннях методыкі выкладання з 1979. Выдаў у 2-ой пал. 90-х

навучальныя дапаможнікі па матэматыцы для 7, 8, 9 класаў агульнаадукацыйнай школы.

**Сосна Уладзімір Аркадзевіч** (2.01.1952, в. Галяшонкі Смаргонскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1983). Дацэнт (1986). З сям'і настаўнікаў. Вучыўся ў пачатковай школе ў в. Загор'е (Смаргонскі р-н), у 8-годцы ў Лашанах (Смаргонскі р-н), у СШ у Палянах (Смаргонскі р-н). Скончыў гістфак БДУ (1973). Быў ст. лабарантам, адначасова выкладчыкам кафедры гісторыі БССР БДУ у 1974-83 (завочна скончыў аспірантуру на гэтай кафедры). Затым працаваў на кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. З 1988 — на кафедры гісторыі Беларусі БДУ. Даследуе сялянскае пытанне і палітыку царызму ў Беларусі ў 2-ой палове XIX ст. Аўтар шматлікіх навуковых і навукова-метадычных публікацый. Друкуецца з 1979. Сааўтар падручнікаў "Гісторыя Беларусі" (1997), "Гісторыя Беларусі" (1998), даследавання "З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі"(1997).

**Стаброўскі Восіп Восіпавіч** (2.11.1869, г. Слонім — 15.01.1968), беларускі археолаг, краязнавец, музеязнавец, калекцыянер. З сям'і вайскоўца. Скончыў Полацкі кадэцкі корпус, Маскоўскі археалагічны інстытут, Вышэйшыя археалагічныя курсы пры Самарскім універсітэце. Удзельнічаў у І-ай сусветнай вайне. Палкоўнік. З 1921 — на радзіме, жыў у сваім родавым маёнтку Раховічы (Слонімскі р-н). Даследаваў курганы і гарадзішчы на Гродзеншчыне. Папаўняў свае зборы матэрыяльнай і духоўнай культуры (старажытныя крамянёвыя і каменныя вырабы, дробная пластыка, зброя, дакументы, аўтографы, кнігі, творы жывапісу, манеты, прадметы побыту). У 1929 стварае на аснове ўласных калекцый Слонімскі гістарычна-краязнаўчы музей. Працаваў у гэтым музеі дырэктарам і хавальнікам фондаў. Зберагаў іх у часы вайны, аднаўляў у паваенныя гады. Аўтар многіх гістарычна-краязнаўчых артыкулаў (друкаваўся з 1899). Быў членам-карэспандэнтам Віленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага таварыства, членам Яраслаўскага археалагічнага таварыства.

**Стаброўскі Казімір Антонавіч** (21.11.1869, маёнт. Крупляны Навагрудскага р-на — 8.06.1929), беларускі і польскі мастак. З сям'і вайскоўца. Скончыў у Брэсце рэальную вучэльню, затым — Пецярбургскую акадэмію мастацтваў (1894). Вучыўся ў акадэміі Жуліяна ў Парыжы. Жыў і працаваў на радзіме. Пазней — у Варшаве,

дзе адкрыў мастацкую школу, у якой выкладаў (1904-09). З 1912 падарожнічаў па Італіі, Іспаніі, Швецыі, Канарскіх астравах, Егіпце, Турцыі, Грэцыі. У час І-ай сусветнай вайны прыехаў у Петраград. З пачатку 20-х жыў у Варшаве. Выстаўляўся ў Парыжы, Мюнхене, Венецыі, Варшаве, Пецярбургу, Маскве. Пісаў пераважна пейзажы. Сярод работ: "Цішыня ў вёсцы", "Магамет у пустыні", "Белая ноч у Петраградзе ля раз'езду", "Змярканне ў Лазенкаўскім парку ў Варшаве", "Белыя ночы", цыкл (ІІ твораў) "Шэсце навальніцы".

**Стагановіч Тамара Аляксандраўна** (у замужжы Стагановіч-Кольба, 15.11.1930, в. Несутычы Навагрудскага р-на), беларуская і амерыканская мастачка (жывапісец, графік, монументаліст). З сям'і грамадска-палітычнага дзеяча. Вучылася ў школе ў роднай вёсцы. У 1942-44 — у прагімназіі ў Навагрудку. У 1944 сям'я выехала ў Германію, дзе жылі ў лагеры для перамешчаных асоб (Мітэнвальд, Баварыя). Тут скончыла украінскую гімназію. З 1950 — у ЗША. Вучылася ў вестэрн-коледжы ў Оксфардзе (штат Агайё) у 1951-54, затым у Інстытуце мастацтва Калумбійскага універсітэта ў Н'ю-Йорку (1954-56). Працягвала заняткі мастацтвам у мастацкай студэнцкай лізе (Н'ю-Йорк). Удзельнічае ў выставах з 1955 у розных гарадах ЗША, выстаўлялася ў Беларусі (1993, 1996, 1997). Працуе найбольш у жанрах пейзажа, нацюрморта (алей, акрылік, тэмпера). Сярод твораў: "Ручэй зімою", трыпціх "Вера, Надзея, Любоў", "Чырвоны камень, штат Мэйн", "Зубры. Елаўстоўнскі нацыянальны парк, штат Ваёмінг", "Мае сосны", "Пякуць хлеб", "Таос: амерыканскія індыяне Пуэбло", "Вадапад", "Чорныя твары", "Абяцаючы дзень", "Таос Пуэбло — утульны куток", "Захад сонца над Нёманам", "Снежаньскі Захад", "Дух індзейскіх часоў", "Нацыянальны парк. Юта", "Каронкі каралевы Ганны", "Францішак Скарына". Выканала іканастас для беларускай праваслаўнай царквы ў Клíўлендзе (канец 50-х — пач. 60-х). Аўтар літаграфій, гравюр. Афармляла кнігі для дзяцей. Выйшла ў ЗША двума выданнямі яе кніга аб прыродзе "Чынары — рудая вавёрка".

**Станкевіч Адам Вінцэнтавіч** (5.01.1892, в. Арляняты Смаргонскага р-на — 4.12.1949), беларускі грамадска-культурны дзеяч, асветнік, гісторык, культуролаг, публіцыст, выдавец, каталіцкі духоўнік. З сялянскай сям'і. Вучыўся год у царкоўнапрыходскай школе ў Барунах (Ашмянскі р-н), у 1902-04 — у народнай вучэльні ў Гальшанах (Ашмянскі р-н), у 1905-09 — у гарадской вучэльні ў Ашмянах. Тут у 1908 пазнаёміўся з "Нашай нівай" і стаў яе карэспандэнтам. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную

семінарыю (1914), дзе актыўна дзейнічаў у нацыянальна-культурным руху. Вучыўся на маральна-прававым факультэце Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі (1914-18). Дзейна працаваў у Пецярбурскім таварыстве студэнтаў-беларусаў, быў яго сакратаром, у 1916-18 — старшынёй. Удзельнік з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый (сакавік 1917), I-га з'езду беларускага каталіцкага духавенства (май 1917), на якім выступіў з дакладам пра беларускі рух у адносінах да касцельнага жыцця. Адзін з заснавальнікаў Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (1917, яе кіраўнік у 1922-28). З 1917 пачаў касцельныя казанні на беларускай мове. У 1918 касцельныя ўлады выправілі яго з Вільні ў Драгічын, але неўзабаве змог вярнуцца. Выкладае закон божы ў Віленскай беларускай гімназіі (1919-22, 1928-33), працуе ў Беларускім навуковым таварыстве, у ТБШ, Беларускім нацыянальным камітэце, Камітэце дапамогі ахвярам вайны, слухае лекцыі на юрыдычным факультэце Віленскага універсітэта, выступае з публічнымі лекцыямі на тэмы гісторыі і культуры Беларусі. Служыць у касцёле св. Мікалая ў Вільні. У 1922 выбраны ў сейм Польшчы, увайшоў у Беларускі пасольскі клуб, абраны намеснікам яго старшыні. Адзін з арганізатараў Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры (1926), Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны (1926). Выдаваў і рэдагаваў газету "Крыніца" (з 1919), часопіс "Хрысціянская думка" (1928-39). Праследаваўся касцельнымі ўладамі за беларускую дзейнасць. У 1938 высланы з Вільні ў Слонім. Вярнуўся восенню 1939. У 1939-40 — старшыня Беларускага цэнтра ў Літве, дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, дзе выкладаў рэлігію і гісторыю. Падчас гітлераўскай акупацыі працягваў душпастырскую і педагагічную працу. Арыштоўваўся савецкімі ўладамі ў 1941 і 1944. У 1949 зноў арыштаваны і зняволены ў Азёрлагу, дзе неўзабаве памёр. Друкаваўся з 1909 у газетах "Наша ніва", "Дзянніца", "Крыніца", часопісах "Хрысціянская думка", "Калоссе", "Светач", "Шлях моладзі". Аўтар шматлікіх карэспандэнцый, артыкулаў, рэцэнзій, даследаванняў, прадмоў да кніг. Выдаў у Вільні свае працы на тэмы беларускай гісторыі, культуры, літаратуры, рэлігіі. Сярод іх: "Доктар Францішак Скарына, першы друкар беларускі" (1923), "Беларуская мова ў школах Беларусі XVI і XVII ст." (1928), "Родная мова ў святынях" (1929), "Францішак Багушэвіч: Яго жыццё і творчасць" (1930), "Вітаўт Вялікі і беларусы" (1930), "Казімір Сваяк, нарыс аб ягонай ідэалогіі" (1931, 2-е выд. 1936), "Кастусь Каліноўскі, "Мужыцкая праўда" і ідэя незалежнасці Беларусі" (1933), "Прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла: З яго жыцця і працы" (1935), "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення"

(1935), "Магнушэўскі, Паўлюк Багрым, Баброўскі: да вытокаў беларускага адраджэння" (1937), "Божае слова на нядзелі і святы" (1938), "Лекцыі і Эвангеліі на нядзелі і святы" (1938), "Міхал Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песня" (1938), "У чэсць 950-годцзя Хрышчэння Беларусі" (1938), "Беларускі хрысціянскі рух" (1939), "На свята маці" (1940), "Хрысціянства і беларускі народ" (1940), "Патрабнейшыя выняткі з рытуалу" (1943), "Вучыся і маліся. Малітоўнік вучня-каталіка Віленскай беларускай гімназіі і Віленскай вучыцельскай семінарыі" (1944). У рукапісах засталіся яго працы пра беларусізацыю касцёла, правы нацыянальных меншасцяў у дзяржаве. Рэдагаваў шматлікія кнігі рэлігійнага і літаратурна-мастацкага зместу заходнебеларускіх аўтараў. Працаваў пасля вайны над гісторыяй Беларусі. Перакладаў з лацінскай і літоўскай моваў.

**Станкевіч Аляксандра Аляксандраўна** (25.11.1946, в. Вялікія Тупалы Карэліцкага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Доктар філалагічных навук (1998). Дацэнт (1980). З сялянскай сям'і. З 1947 жылі ў Навагрудку. Скончыла тут СШ №3, гістарычна-філалагічны факультэт Томскага універсітэта (1968). Працавала выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры Мазырскага педінстытута (1968-69). З 1969 — выкладчык кафедры рускай і беларускай моваў Гомельскага універсітэта (у 1975 скончыла тут аспірантуру). З 1975 працуе на кафедры беларускай мовы Гомельскага універсітэта, з 1993 — загадчыкам кафедры. Была намеснікам дэкана факультэта завочнага навучання (1979-81), сакратаром Вучонай Рады Гомельскага універсітэта (1982-89). Выкладала лацінскую мову, агульнае мовазнаўства, стылістыку, культуру маўлення, рыторыку. Друкуецца з 1973. Вывучае праблемы гістарычнай і дыялектнай лексікалогіі, стылістыкі лацінскай мовы. Выдала "Зборнік практыкаванняў і тэкстаў па лацінскай мове" (1978, у сааўт., на рус. мове), "Практыкаванні па лексіцы і стылістыцы. Дапаможнік для настаўнікаў" (1984, у сааўт.), "Практыкаванні і тэксты па лацінскай мове для студэнтаў..." (Гомель, 1984, на рус. мове), "Навучальныя тэксты па лацінскай мове для студэнтаў..." (Гомель, 1986, у сааўт., на рус. мове), "Справаводства на беларускай мове" (Гомель, 1992, у сааўт.), "Лацінская мова. Вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў" (Гомель, 1993), "Лексічныя запазычанні ў беларускіх гаворках" (Гомель, 1993), "Lingua Latina" Даведнік для вучэбнага дапаможніка па лацінскай мове для студэнтаў..." (Гомель, 1993, у сааўт.), "Лексіка іншамоўнага паходжання ў беларускіх народных гаворках" (Гомель, 1996), "Слоўнік мовы Я. Купалы". Т. I (1996, у сааўт.). Сааўтар-складальнік зборніка

афарызмаў "Набожнае слова і антычная мудрасць крочаць побач" (Гомель, 1997). Выдала метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі для студэнтаў.

**Станкевіч Станіслаў Восіпавіч** (23.02.1907, в. Арляняты Смаргонскага р-на — 6.11.1980), беларускі грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнавец, педагог, публіцыст. Доктар філалогіі (1936). З заможнай сялянскай сям'і. З 1921 вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, год вучыўся ў польскай гімназіі ў Вілейцы. У 1933 скончыў гуманітарны факультэт Віленскага універсітэта. Выкладаў польскую мову і літаратуру ў СШ Заходняй Беларусі. Быў старшынёй літаратурна-мастацкай секцыі Беларускага навуковага таварыства. Рэдагаваў часопісы "Студэнцкая думка", "Нёман". У 1937-38 вывучаў славістыку ў Югаславіі і Балгарыі. У 1938-39 зноў настаўнічаў на радзіме. У 1939-41 — выкладчык беларускай літаратуры Навагрудскай педагагічнай вучэльні. У 1942-44 быў загадчыкам камісарыяту Барысаўскай акруговай рады Беларускай народнай самапомачы, працаваў школьным інспектарам. З студзеня 1944 — намеснік прэзідэнта БЦР па Баранавіцкай акрузе. Быў сябрам падпольнай Беларускай нацыяльнай партыі. Дэлегат 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). З лета 1944 — у Германіі. Рэдагаваў газету "Раніца" (1944-45). Выкладаў беларускую літаратуру ў беларускай гімназіі імя Я. Купалы (1945-47). У 1947-62 — рэдактар газеты "Бацькаўшчына". Адначасова ў Інстытуце вывучэння СССР (Мюнхен) працаваў навуковым сакратаром (1954-56), намеснікам старшыні (1956-58), старшынёй Навуковай Рады (1958-61), дырэктарам (1961-62). Супрацоўнічаў з радыёстанцыяй "Свабода". Арганізаваў нямецкую філію Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. З 1962 — у ЗША (Н'ю-Йорк). У 1963-65 — старшыня Беларуска-амерыканскага задзіночання. У 1963-80 рэдагаваў газету "Беларус", часопіс "Запісы...". Друкаваўся з канца 20-х. Аўтар шматлікіх артыкулаў, рэцэнзій, аглядаў, даследаванняў на тэмы беларускай літаратуры, мовы, палітыкі. Пад яго рэдакцыяй выйшлі ў эміграцыі кнігі твораў М. Багдановіча, Я. Купалы, А. Гаруна, А. Кулакоўскага, "Альманах твораў беларускіх эмігранцкіх пісьменнікаў" (1955). Аўтар даследаванняў "Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі" (Вільня, 1936, на польск. мове), "Беларуская падсавецкая літаратура другой паловы 60-х гадоў" (Н'ю-Йорк — Мюнхен, 1967), "Янка Купала. На 100-ыя ўгодкі ад нараджэння" (Н'ю-Йорк, 1982).

**Станкевіч Станіслаў Лявонавіч** (1886, в. Арляняты Смаргонскага р-на — 3.02.1964), беларускі паэт, выдавец. З сялянскай сям'і. З дзяцінства працаваў на гаспадарцы ў чужых людзей. З пач. 1900-х — у Пецярбургу, дзе быў пасыльным, экспедытарам у аптэцы, аптэкарам. Займаўся самаадукацыяй. У 1919 вярнуўся ў родную вёску. Неўзабаве перабраўся ў Вільню, дзе працаваў у кнігарні Беларускага выдавецкага таварыства. Актыўна дзейнічаў у заходнебеларускім руху. У 1926 адкрыў уласную беларускую кнігарню ў Вільні, якая дзейнічала да вайны. Удзельнічаў у выданні беларускага адрыўнога календара, беларускіх кніг. Восенню 1945 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і высланы ў канцлагер у Пермскую вобл. На радзіму вярнуўся ў 1954. Выйшлі зборнікі яго вершаў "Смех не грэх" (Вільня, 1926), "З майго ваконца" (Вільня, 1928).

**Станкевіч Янка** (Ян Антонавіч, 26.11.1891, в. Арляняты Смаргонскага р-на — 16.07.1976), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, мовазнавец, гісторык, перакладчык, выдавец, педагог, публіцыст. Доктар славянскага мовазнаўства і гісторыі (1926). З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў в. Чатыркі (Смаргонскі р-н), гарадскую вучэльню ў Ашмянах (1909). Быў карэспандэнтам "Нашай нівы", арганізоўваў беларускія школы. Год вучыўся ў Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі (выключаны за беларускія ідэі). Зблізіўся з віленскімі дзеячамі беларускага адраджэння. У 1914 працаваў у рэдакцыі "Нашай нівы", у тым жа годзе прызваны ў войска. Скончыў ваенную вучэльню. Удзельнічаў у баях. Вясной 1917 ля Казані (тут стаяла яго вайсковая часць) праводзіў шырокую культурна-асветніцкую работу сярод бежанцаў-беларусаў — ладзіў вечарыны, спектаклі, стварыў беларускі гурток "Пралеска". Неўзабаве скіраваны на Румынскі фронт, дзе трапіў у палон. Вызваліўшыся, уключыўся ў беларускі рух. Дэлегат Усебеларускага кангрэса (снежань 1917). Адзін з заснавальнікаў Беларускага навуковага таварыства (1918). Удзельнічаў у рабоце Рады БНР. Выбраны ў вайсковую камісію цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны (1919). Выдаваў у Вільні газету "Незалежная Беларусь" (1919). Скончыў у Слуцку настаўніцкія курсы (1920), Адкрываў у родных мясцінах беларускія школы. У 1921 скончыў Віленскую беларускую гімназію. Вучыўся на гістарычна-філалагічным факультэце Карлава універсітэта ў Празе (скончыў у 1926), стварыў тут першую беларускую студэнцкую арганізацыю — "Таварыства беларускіх студэнтаў". Выкладаў беларускую мову ў Віленскім (1927-38) і Варшаўскім (1928-32) універсітэтах, у Віленскай беларускай гімназіі, у праваслаўнай

духоўнай семінарыі ў Вільні. Пасол сейма Польшчы ад Лідскай акругі (1928-30). Выдаваў у Вільні часопіс "Родная мова" (1930-31). Стварыў культурна-асветніцкую арганізацыю "Беларускі гаспадарчы звяз" (1928-38). У 1939 зняволены польскімі ўладамі на Лукішках. У чэрвені 1940 перабраўся ў Варшаву, дзе працаваў у Беларускім нацыянальным камітэце. З восені 1941 — у Мінску. Займаўся навуковай, школьнай, выдавецкай дзейнасцю. Чытаў лекцыі па гісторыі Беларусі на афіцэрскіх курсах Беларускай самааховы (1942). Адзін з лідэраў падпольнай Беларускай нацыянальнай партыі. Удзельнік 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). Неўзабаве выехаў у Прагу, затым у Германію. У Рэгенсбургу выкладаў у беларускай гімназіі, у Мюнхене — у Украінскім вольным універсітэце. У 1949 выехаў у ЗША. Адзін з арганізатараў Беларуска-амерыканскага задзіночання (1949). Праводзіў у асяроддзі беларускай эміграцыі навукова-папулярныя чытанні. Выдаваў часопісы "Веда" (1951-54), "Незалежнік" (1965-66). Заснаваў на свае сродкі дзеля развіцця беларусазнаўства Фонд імя Л. Сапегі (1974). Выдаў навуковыя і навукова-папулярныя працы і падручнікі: "Беларускі правапіс" (Вільня, 1918, у сааўт.), "Новы лемантар для беларускіх дзетак" (Вільня, 1918, 3-е выд. 1931), "Просты спосаб стацца ў кароткім часе граматным" (Браслаў, 1918, у сааўт.), "Што было і што мае быць" (Вільня, 1919), "Беларуская правапісь з практыкаваннямі" (Вільня, 1921), "Правапіс чужых словаў" (Вільня, 1921), "Паўкулі па-беларуску" (Вільня, 1921), "Месца беларускага языка сярод іншых славянскіх языкоў і час яго ўзніку" (Вільня, 1930), "Нашто і як збіраць геаграфічныя і асабовыя назовы?" (Вільня, 1931), "Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом" (Вільня, 1933), "Змена практычнае граматыкі беларускага языка ў БССР" (Вільня, 1934), "Апытальнік да збірання дыялектных і некаторых агульных асаблівасцяў беларускага (крывіцкага) языка" (Вільня, 1935), "Змена граматыкі беларускага языка ў БССР" (Вільня, 1936), "Як правільна гаварыць і пісаць па-беларуску" (Вільня, 1937, у сааўт.), "Повесці і апавяданні крывіцкіх (беларускіх) летапісцаў" (Вільня, 1937), "Вонкашняя гісторыя крывіцкае мовы" (Вільня, 1938), "Гісторыя беларускага языка" (Вільня, 1939), "Лемантар пераходны з лацініцы на кірыліцу" (1941), "Крыўя-Беларусь у мінуласці" (1942), "Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацініцаю з укладаннямі" (1943), "Маленькі маскоўска-беларускі слоўнічак фразеалагічны" (1944, у сааўт., 3-е выд. Н'ю-Йорк, 1953), "Падручнік крывіцкае (беларускае) мовы. Граматыка, правапіс" (Рэгенсбург, 1946), "Некаторыя праўніцкія тэрміны беларускія" (Н'ю-йорк, 1953), "Этнаграфічныя і гістарычныя

тэрыторыі і граніцы Беларусі" (Н'ю-Йорк, 1953, на англ. мове 1953), "Доля мовы беларускае (яе вонкашняя гісторыя) у розныя перыяды гісторыі Беларусі" (Н'ю-Йорк, 1954), "Мова рукапісу Аль-Кітаб Крывіцкага музея Івана Луцкевіча" (Н'ю-Йорк, 1954), "Савецкае фальшаванне гісторыі Беларусі" (Мюнхен, 1956), "З гісторыі Беларусі" (Мюнхен, 1958), "З гісторыі русіфікацыі Вялікалітвы" (Н'ю-Йорк, 1967), "Ратуйма скарбы свайго народу" (Н'ю-Йорк, 1968), "Друкары Іван Хведаровіч Рагоза і Пётра Мсціславец" (Н'ю-Йорк, 1969), "З украінскіх дачыненняў да Вялікалітвы-Беларусі" (Н'ю-Йорк, 1970), "Аканне — балцкая рыса ў мове вялікалітоўскай" (Мюнхен, 1971), "Нарысы з гісторыі Вялікалітвы-Беларусі" (Н'ю-Джэрсі, 1978). Пераклаў у сааўтарстве поўны тэкст Бібліі на беларускую мову ("Святая Біблія", Н'ю-Йорк, 1973). Выйшаў яго "Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік" (Н'ю-Йорк, 1990).

**Стаповіч Альбін Мацвеевіч** (18.03.1894, в. Барані Астравецкага р-на — 18.12.1934), беларускі грамадска-культурны дзеяч, кампазітар, музычны педагог, публіцыст. З сялянскай сям'і. Брат К. Сваяка. Скончыў музычную школу ў Вільні. З 1913 — у Казані, дзе вучыўся на юрыдычным факультэце Казанскага універсітэта, працаваў арганістам у касцёле. З 1921 жыў у Вільні. Вучыўся на гуманітарным факультэце Віленскага універсітэта (1921-24). Адначасова працаваў настаўнікам спеваў і музыкі ў школах (у 1922-24 — у Віленскай беларускай гімназіі). Выступаў з дакладам на 1-ым з'ездзе педагогаў беларускіх СШ Заходняй Беларусі (1923). Цесна супрацоўнічаў з Віленскім музычна-драматычным гуртком. Скончыў кансерваторыю ў Вільні. Быў сябрам Беларускага студэнцкага саюза. Кіраваў беларускім хорам у Вільні, хорам у касцёле св. Мікалая. З 1926 рэдагаваў (з П. Карузам) газету "Беларуская крыніца". У 1926-28 — старшыня Віленскай суполкі Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры. З 1927 — намеснік старшыні ЦК Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі. У 1928-30 — пасол ад БХД сейма Польшчы, уваходзіў у Беларускі пасольскі клуб. Аўтар артыкулаў на нацыянальна-патрыятычныя, музычныя тэмы. Друкаваўся з 1912 у перыёдыках "Наша ніва", "Родныя гоні", "Беларуская крыніца", "Przegląd Wileński", "Нёман", "Новы шлях". Пісаў песні на сл. Я. Купалы, Я. Коласа, К. Сваяка, М. Машары. Выйшла яго песня "Дзе чутны мовы нашай гукі" (Вільня, 1926), зборнік песень "За Бацькаўшчыну. Песні працы і змагання" (Вільня, 1935), брашура "Беларусы і дзяржаўная незалежнасць" (Вільня, 1929).

**Стахоўскі Станіслаў** (21.10.1930, в. Азёры Гродзенскага р-на), польскі мовазнавец-славіст і арыенталіст. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1972). Прафесар (1992). Падчас вайны вучыўся ў 7-годцы ў Гродне. У 1945 сям'я пераехала ў Польшчу. Жылі ў Тамашове Мазавецкім, дзе вучыўся ў гімназіі, ліцэі. Затым вучыўся на філалагічным факультэце Кракаўскага універсітэта (1951-56). Працаваў у гэтым універсітэце на кафедры славянскай філалогіі (1956-74). З 1974 — на кафедры арыентальнай філалогіі. З 1990 — дырэктар Інстытута арыентальнай філалогіі Кракаўскага універсітэта. Даследаванні — у галіне славянскай, найбольш балканскай філалогіі, цюркалогіі. Працы друкаваліся ў Польшчы, Расіі, Венгрыі, Германіі. Выдаў кнігі: "Суфіксы замежнага паходжання ў сербска-харвацкай мове" (Кракаў, 1961), "Слоўнік да горналужыцкага Катэхізіса Варыха. 1597" (Вроцлаў, 1966), "Горналужыцкая мова ў "De originibus lingue Sorabicae" Абрагама Фрэнкля. 1693-1696" (Вроцлаў, 1967), "Назіранні над храналогіяй цюркізмаў у сербскахарвацкай мове" (Кракаў, 1967), "Сербска-харвацкія лексічныя асаблівасці ў "Theaurus polyglottus" Г. Мэгісера. 1603" (Вроцлаў, 1969), "Назіранні над храналогіяй цюркізмаў у балгарскай мове" (Кракаў, 1971), "Фанетыка аманска-турэцкіх запазычанняў у сербска-харвацкай мове" (Вроцлаў, 1973), "Горналужыцкі слоўнік Абрагама Фрэнкля. 1693-1696" (Вроцлаў, 1978), "Турэцкія запазычанні ў сербскіх дыялектах паводле Пірота" (Кракаў, 1992).

**Станкевіч Фелікс Іванавіч** (2.12.1879, г. Шчучын — 21.06.1967), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, педагог, выдавец. З сям'і землямера і настаўніцы. Скончыў гімназію ў Пецярбургу (1900), удзельнічаў у рабоце падпольнай арганізацыі гімназістаў. Вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта. У 1901 арыштаваны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях і высланы пад нагляд паліцыі на радзіму. У Шчучыне даваў прыватныя ўрокі. Пазней у Марыупалі працаваў у натарыяльнай канторы. З восені 1902 — у Пецярбургу. Адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады (1902). Выехаў дзеля заробкаў у раён Ладагі, дзе працаваў на каналах. З 1905 — у Вільні, вёў тут рэвалюцыйную работу. Затым — у Мінску, працаваў у падпольнай друкарні. З 1908 быў адвакатам у Ігумене на Міншчыне, тэхнікам у Цверы (1913-19), адначасова з 1917 — у прафсаюзах работнікаў воднага транспарту. У 1919-20 — супрацоўнік выдавецкага аддзела Наркамата асветы ЛітБел ССР. У 1920-23 дзейнічаў у беларускіх каапературах у Вільні. Быў дырэктарам Радашковіцкай беларускай гімназіі (1923-29). Актыўна

ўдзельнічаў у вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі. Займаўся выдавецкімі справамі (выдаваў зборнік М. Танка "Журавінавы цвет", 1937), адвакацкай практыкай. Быў старшынёй Галоўнай управы ТБШ (1929-37). Арыштоўваўся за беларускую дзейнасць, сядзеў у турме (1930-31, 1933). Адзін з заснавальнікаў і рэдактар часопіса "Беларускі летапіс", у якім працаваў у 1933, 1936-39, друкаваўся як літаратуразнавец. У 1939-41 настаўнічаў у Вілейцы і Клецкім р-не. Склаў "Эсперанта-беларускі слоўнік".

**Стома Вячаслаў Восіпавіч** (5.11.1949, в. Несутычы Навагрудскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, паэт, публіцыст), прыродазнавец. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у в. Куравічы Навагрудскага р-на (1967). Вучыўся на біяфаку БДУ ў 1967-72 (у 1971 стажыраваўся ў Марцін Лютэр — універсітэце ў ГДР). Нядоўга працаваў намеснікам дырэктара Тудараўскай 8-годкі Карэліцкага р-на (1972). Пераехаў у Мінск. Быў ст. іхтыёлагам Рэспубліканскага савета Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў (1972-76), ст. інжынерам праектна-тэхналагічнага бюро ўправы рыбнай гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР (1976-78), ст. навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага інстытута "Белрыбпраект" (1978), ст. інжынерам управы рыбнай гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР (1978), намеснікам начальніка Белрыбвода Міністэрства рыбнай гаспадаркі СССР (1978-83). Затым — ст. інжынер, загадчык аддзела навукова-вытворчага аб'яднання "Белрыбгас" Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларусі. Друкуецца з 1968. Аўтар зборнікаў навукова-папулярных нарысаў, апавяданняў, замалёвак, эсэ, публіцыстычных твораў, твораў для дзяцей на тэмы прыроды. Сярод іх: "Таямніцы жывёльнага свету" (1989, у сааўт., на рус. мове), "Шчодрасць блакітнага гектара" (1990, на рус. мове), "На воўчых сцежках" (1991), "У глыбінках адвечнага бору" (1991), "Гаспадар таямнічых віроў" (1992), "У зімовым парку" (1998). Шматлікія яго публікацыі — у перыёдыцы розных краін Еўропы.

**Стома Мікалай Андрэевіч** (25.05.1939, в. Вялікія Жухавічы Карэліцкага р-на — 22.11.1993), беларускі мастак-плакатыст. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1977). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў СШ. Вучыўся ў Мінскай мастацкай вучэльні (аддзяленне мастацкага роспісу) у 1961-66. Працаваў мастаком-афармляльнікам у інстытуце "Белпрампраект" (1966-91). Удзельнік мастацкіх выстаў з 1967 (у Беларусі, Расіі, Латвіі, Эстоніі, Польшчы,

Фінляндыі). Аўтар плакатаў "Беражыце санітараў лесу" (1973), "Беражыце прыгажуню зямлю!" (1973), "Купалінка" (1975), "Эпас-75" (1975), "Беражыце помнікі дойлідства!" (1975), "Ахоўваць прыроду — ахоўваць Радзіму" (1976), "Хатынь" (1978), "Навуку — на службу прыродзе" (1979), "І на Марсе будуць яблыні цвісці" (1979), "Мінск алімпійскі" (1980), "Свету — мір" (1983), "Зберажом!" (1984), "1944 — 1984" (1984), "Помні!" (1985). Шэраг работ прысвечаны юбілеям Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гусоўскага. З пач. 90-х працаваў у галіне жывапісу.

**Стрыха Ганна Іванаўна** (дзявоч. Таранка, 1.03.1937, в. Байдары Гродзенскага р-на), беларускі хормайстар, музычны педагог. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1982). З сям'і настаўніка. Скончыла 7-годку ў роднай вёсцы. Вучылася ў Гродзенскай музычна-педагагічнай вучэльні (1952-56). Выкладала спевы ў Пружанскай школе-інтэрнаце (1956-57). Вучылася на 3-4 курсах Брэсцкай музычнай вучэльні (1957-59). З 1959 выкладае ў Гродзенскай педагагічнай вучэльні. У 1966 завочна скончыла аддзяленне харавога дырыжыравання (клас В. Роўбы) Беларускай кансерваторыі. Працавала ў Гродзенскім народным ансамблі песні і танца "Нёман" (у 1961-64 — у танцавальнай групе, у 1964-86 — хормайстрам). З 1982 — мастацкі кіраўнік народнага камернага хору Гродзенскай педагагічнай вучэльні.

**Субач Ян Сямёнавіч** (1912, в. Субачы Ваўкавыскага р-на — 1937), беларускі пісьменнік. У 20-я з бацькам перайшоў у БССР. У Мінску скончыў школу. З 1930 працаваў грузчыкам на кандытарскай фабрыцы "Камунара". З вясны 1932 — у аршанскай міжраённай газеце. З восені 1932 — у Ленінградзе, дзе вучыўся на падрыхтоўчых курсах, пасля на філфаку Ленінградскага пedінстытута (скончыў у 1937). Быў рэпрэсаваны і загінуў. Друкаваўся з 1929. Быў сябрам Цэнтральнай літаратурнай студыі для маладых пісьменнікаў пры БелАППе (1932). Выдаў у сааўтарстве зборнік вершаў "Песні грузчыкаў" (1932). Друкаваў апавяданні.

**Супрун Васіль Рыгоравіч** (10.03.1926, в. Глоўсевічы Слонімскага р-на), беларускі паэт, археолаг, краязнавец. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). З сялянскай сям'і. Скончыў 3 курсы Слонімскай настаўніцкай семінарыі (1944). Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы на Слонімшчыне. У 1946 завочна скончыў Ганцавіцкую педагагічную вучэльню. У 1947 рэпрэсаваны. Зняволены ў турмах Баранавіч, Мінска, Гродна, Оршы, у канцлагерах Інты,

Варкуты. Выйшаў на волю ў 1956. З 1957 — на радзіме. Пазбаўлены магчымасці працаваць па спецыяльнасці, мяняў заняткі, прафесіі. У 1957-58 — на будаўніцтве ў вёсцы. У 1959-63 быў тэхнікам-будаўніком у СПТВ у Слоніме, на розных прадпрыемствах горада. У пошуках заробку выехаў у Крым, быў тут праекціроўшчыкам у падводным марскім клубе ДТСАФ СССР (1968). У 1969 завочна скончыў гістфак БДУ і працаваў ст. навуковым супрацоўнікам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. Неўзабаве вярнуўся ў Слонім і да 1973 — на будаўніцтве камбікормавага завода. У 1973-85 — у беларускай управе Маскоўскага трэста "Саюзэлеватар-мельрэмбуд". У 60-я актыўна займаўся археалагічнай разведкай і раскопкамі на Гродзеншчыне і Брэстчыне. Аўтар шматлікіх навуковых і папулярных артыкулаў пра генезіс беларусаў, пра помнікі культуры свайго рэгіёну (друкуецца з 1960). Вершы друкуе з 1943. Выйшлі кнігі паэзіі "Крык" (1993), "Рэха абуджаных дзён" (1994). Гіста-рычна-краязнаўчыя нарысы сабраны ў зборніку "За смугою часу" (1994). Выдаў зборнікі "Жыць для Беларусі" (Мн.- Слонім, 1998), "Незабыўныя "ксівы". Вершы з падпольнай канцлагернай перапіскі з Ларысай Геніюш" (Гродна, 1998).

**Сурмач Ганна Іванаўна** (4.07.1947, в. Пацэвічы Мастоўскага р-на), беларускі грамадска-культурны дзеяч, гісторык, архівіст. З сялянскай сям'і. Скончыла Самуйлавіцкую СШ (Мастоўскі р-н) у 1965. У 1965-70 вучылася на гістфаку БДУ. Працавала захавальнікам фондаў, ст. навуковым супрацоўнікам у Дзяржаўным архіве Мінскай вобл. (1970-73), інспектарам архіўнага аддзела Мінскага аблвыканкама (1973-77), загадчыкам аддзела Дзяржаўнага архіва Мінскай вобл. (1977-81), дырэктарам Цэнтральнага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (1982-93). У 1993-99 — старшыня Рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" (працавала ў Радзе з 1990). З 1999 — у Чэхіі, затым у ЗША. Вывучае гісторыю Беларусі (БНР, "Наша ніва", Слуцкае паўстанне, беларуская дыяспара), архіваў Беларусі. Друкуецца з 1984. Сааўтар кнігі "Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны" (1998).

**Сухадольскі Райнольд** (1804, г. Гродна — 1831), польскі паэт. Брат Я. Сухадольскага. З сям'і дробнай шляхты. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі (1818-24). Працаваў у Міністэрстве фінансаў у Варшаве. Служыў у войску. Друкаваў у польскіх перыёдыках вершы. Выдаў зборнік вайсковых песень "Любімыя песні" (Варшава, 1831). Удзельнік паўстання 1830-31, у якім загінуў.

**Сухадольскі Януар Янавіч** (19.09.1797, г. Гродна — 20.03.1875), беларускі мастак. Брат Р. Сухадольскага. З сям'і дробнага шляхціца. Выхоўваўся дома. З 1814 — на вайсковай службе. Браў урокі жывапісу ў Варшаве (з 1815). У 2-ой пал. 20-х удзельнічаў у расійска-іранскай і расійска-турэцкай войнах. Удзельнік паўстання 1830-31. Эміграваў на Захад. У Рыме вучыўся жывапісу (1832-37). Вярнуўшыся з-за мяжы, жыў у Гродне, Пецярбургу, Варшаве, на Станіслаўшчыне. Выстаўляўся з пач. 20-х. Пісаў батальныя кампазіцыі, пейзажы, сюжэтна-тэматычныя творы бытавога і рамантычнага зместу. З ранніх работ: "Смерць Варненчыка", "Бітва пад Рашынам" (1832). У канцы 30-х — пач. 40-х — "Узяцце крэпасці Карс", "Асада крэпасці Абасабад", "Штурм крэпасці Ахаяных", "Перамога пад Ялдавай", "Фельдмаршал Паскевіч прымае дэлегацыю жыхароў Эрзерума", "Сцэна з 1831 года". Пазней напісаны "Узяцце Ачакава" (1853), "Бітва пад Самасверай" (1860), "Пераход арміі Напалеона цераз Беразіну" (1866). Сярод твораў таксама — "Вяселле Ягайлы з Ядвігай", "Заключэнне Туркманчайскага міру", "Паляванне на аленя", "Дзед з унукам на паляванні", "Кавалерская язда".

**Сцяцко Павел Уладзіміравіч** (5.03.1930, в. Грабава Зэльвенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Доктар філалагічных навук (1980). Прафесар (1983). Брат У. Сцяцко. З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў мяст. Дзярэчын (Зэльвенскі р-н) у 1946, педагагічную вучэльню ў Ваўкавыску ў 1949. Паступіў на фізічна-матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытута, але неўзабаве перавёўся на факультэт мовы і літаратуры (беларускае аддзяленне) гэтага інстытута. Скончыў у 1953 і працаваў тут выкладчыкам беларускай мовы (1953-60). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (1960-62). Выкладаў на кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута (1962-81). Быў загадчыкам кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства Гомельскага універсітэта (1981-90), загадчыкам кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта (1990-91). З 1991 — загадчык кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага універсітэта. Стажыраваўся ў Карлавым універсітэце ў Празе (1983) і Варшаўскім універсітэце (1988). Даследуе лексікалогію, марфеміку і словаўтварэнне, сінтаксіс беларускай мовы, словаўтваральныя сувязі славянскіх моваў, тэрміналогію, культуру мовы. Друкуецца з 1957. Выдаў кнігі "Народная лексіка" (1970), "Дыялектны слоўнік. З гаворак Зэльвеншчыны" (1970), "Народная лексіка і словаўтварэнне" (1972),

"Беларускае народнае словаўтварэнне: Афіксальныя назоўнікі" (1977), "Пачатковы курс мовазнаўства" (Гродна, 1993), "Праблемы нормы, культуры мовы" (Гродна, 1998), "Праблемы лексічнага нармавання беларускай мовы" (Гродна, 1999). Сааўтар даследаванняў, навучальных дапаможнікаў: "Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы" (1969), "Беларуская мова" (1970), "Сучасная беларуская мова. Марфалогія" (1975), "Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія. Фразеаграфія. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка і арфаграфія" (1976), "Аналіз слова, словазлучэння, сказа" (1977), "Беларуская мова". Ч. I (1982), "Лінгвістычная тэрміналогія ў курсах ВНУ" (1984, на рус. мове), "Беларуская граматыка" Ч. I (1985), "Руска-беларускі слоўнік лінгвістычных тэрмінаў" (1988, на рус. мове), "Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў" (1990), "Слоўнік лінгвістычнай тэрміналогіі: беларуска-руска-польскі і польскаруска-беларускі" (Беласток, 1994, на польс. мове), "Руска-беларускі фізічны слоўнік" (Гродна, 1999), "Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны"(Гродна, 1999).

**Сцяцко Уладзімір Уладзіміравіч** (24.05.1924, в. Грабава Зэльвенскага р-на — 19.03.1994), беларускі географ, геолаг, педагог. Кандыдат геаграфічных навук (1971). Дацэнт (1973). Брат П. Сцяцко. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Дзярэчынскай 7-годцы (Зэльвенскі р-н). Скончыў польскую гімназію ў Слоніме (1939). Служыў у савецкім войску (1944-45), удзельнік вайны, адзначаны баявымі ўзнагародамі. Настаўнічаў у Дзярэчыне (1946). Скончыў Ваўкавыскую педагагічную вучэльню (1947), геаграфічны факультэт БДУ (1952). Вучыўся ў аспірантуры ў БДУ (1953-56). Працаваў асістэнтам на кафедры геалогіі БДУ (1956-58). Затым — у Інстытуце геалогіі Акадэміі навук Беларусі, у Мінскім педінстытуце (чытаў лекцыі на гістарычна-геаграфічным факультэце). У 1962-92 працаваў на кафедры глебазнаўства БДУ (у 1975-84 быў намеснікам дэкана геаграфічнага факультэта па завочным навучанні). Друкаваўся з 1954. Навуковыя інтарэсы звязаны былі з геаграфіяй, геалогіяй Беларусі, прыроднымі ўмовамі Палесся. Сябра геаграфічнага таварыства СССР (1957), таварыства глебазнаўцаў СССР (1957).

**Сядзельнік Валерыя Валяр'янаўна** (8.07.1958, в. Вярбілкі Шчучынскага р-на), беларускі правазнавец. Кандыдат юрыдычных навук (1991). Дацэнт (1995). З сялянскай сям'і. Скончыла ў роднай вёсцы 8-годку (1973). Вучылася ў Мінскім фінансава-эканамічным тэхнікуме (1973-76), на юрыдычным факультэце БДУ (1976-81). З 1981 — выкладчыца кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (з

1992 — на пасадзе дацэнта) Гродзенскага універсітэта. У 1997-99 — намеснік дэкана юрыдычнага факультэта гэтага універсітэта. Завочна скончыла аспірантуру Маскоўскага юрыдычнага інстытута (1987). Друкуецца як правазнавец з 1982. Даследуе праблемы станаўлення прававой дзяржавы, усталявання канстытуцыяналізму, абароны правоў чалавека, арганізацыі і функцыянавання судовай улады. Сааўтар навучальных дапаможнікаў для студэнтаў: "Асновы тэорыі дзяржавы" (1995), "Тэорыя дзяржавы" (Гродна, 1995).

**Сяльверстава Святлана Яўгенаўна** (Куль-Сяльверстава, дзяв. Куль, 20.09.1959, г. Гродна), беларускі гісторык, культуролаг. Кандыдат гістарычных навук (1989). Дацэнт (1994). З сям'і лекараў. Скончыла СШ №18 г. Гродна, гістфак Гродзенскага універсітэта (1980). Працавала ў Гродзенскай СШ №4. З 1983 — лабарант на гістфаку Гродзенскага універсітэта (скончыла тут аспірантуру на кафедры гісторыі Беларусі). З 1988 выкладае на кафедры гісторыі СССР і БССР, з 1989 — на кафедры гісторыі Беларусі. У 1996-99 — дактарант БДУ. Вывучае праблемы гісторыі і культуры Беларусі XIX ст. Друкуецца з 1982 (у Беларусі, Польшчы, Расіі, Балгарыі, ЗША). Аўтар шматлікіх артыкулаў, даследаванняў, аглядаў, рэцэнзій у навуковым і масавым друку. Выдала навучальны дапаможнік "Беларуская палеаграфія" (Гродна, 1996).

**Сямёнаў Уладзімір Сцяпанавіч** (11.03.1947, г. Гродна), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1998). Скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум (1967), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1978). Жыве і працуе ў г. Жодзіна (Мінская вобл.). Спецыялізуецца ў галіне індустрыяльнага дызайна. У выставах — з 1988 (у Беларусі, Расіі). Сярод асноўных распрацовак — дызайн-практы вялікагрузных самазвалаў, пагрузчыкаў, бульдозераў, цяжкавозаў (для Беларускага аўтазавода), грузапасажырскага аўтобуса, машыны хуткай дапамогі на базе аўтамабіля "Люблін", беларускага легкавога аўтамабіля.

**Сямінскі Пётр Яраслававіч** (29.05.1963, в. Каўбасіна Гродзенскага р-на), беларускі педагог, пісьменнік (паэт, празаік). З сям'і службоўцаў саўгаса. Вучыўся ў Каўбасінскай 7-годцы, у СШ №6 г. Гродна. Скончыў фізічны факультэт Гродзенскага універсітэта (1985), удзельнічаў у рабоце студэнцкага літаратурнага аб'яднання "Наднёманскія галасы". Працаваў настаўнікам фізікі і працоўнага навучання ў Макараўскай СШ Бераставіцкага р-на, у Падліпскай СШ

Гродзенскага р-на, затым — настаўнік працоўнага навучання СШ №24 г. Гродна. Друкуецца з 1983. Піша на беларускай і рускай мовах. Выдаў зборнікі фантастычнай прозы "Казкі далёкіх планет" (Гродна, 1995, на рус. мове), "Бачу сонца" (1996), кніжку вершаў для дзяцей "Непераможны заяц" (Гродна, 1997), кніжку вершаў і паэм "Зорная трэль" (Гродна, 1998, на рус. мове).

**Сяргейчык Іван Лук'янавіч** (17.08.1949, в. Пустаборы Зэльвенскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, паэт). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). З сям'і рабочага МТС. Пачатковую школу скончыў у Пустаборах, 8-годку ў Галынцы Зэльвенскага р-на (1964). У 1964-66 вучыўся ў Слонімскай СПТВ №5. Працаваў у Галынкаўскай БМУ №5 трактарыстам. Затым — у Таджыкістане, быў бульдазерыстам, скрэперыстам. Служыў у войску ў 1968-70, 1970-90 (удзельнік вайны ў Афганістане ў 1981-83, 1989-90). Скончыў у Слоніме СШ рабочай моладзі (1973). Працаваў пасля звальнення з войска наладчыкам паліграфічнага абсталявання ў Слонімскай друкарні, механікам насоснай станцыі ў водаканале, дырэктарам малога прадпрыемства. Літаратурны дэбют — у Слонімскай райгазеце "За перамогу камунізма" ў 1973. Друкаваў вершы, апавяданні, аповесці, пераклады з рускай мовы. Сааўтар калектыўных літаратурных зборнікаў "Карані" (1994), "Золак над Шчарай" (Слонім, 1994). Выдаў "афганскі дзённік" "Горкі пыл Гіндукуша" (1991).

**Сяргейчык Уладзімір Міхайлавіч** (10.01.1938, в. Трацякі Бераставіцкага р-на), беларускі музычны педагог. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1998). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 3 кл. мясцовай школы і пачаў вучыцца ў Гродзенскай СШ №8, пазней — у СШ №6. Адначасова — у музычнай школе па класе акардэона. Пасля 8 кл. паступіў у Гродзенскую музычна-педагагічную вучэльню (скончыў у 1956). Працаваў выкладчыкам музыкі ў мяст. Беразіно Мінскай вобл. (1956-57). Служыў у войску (1957-60). У 1960-61 выкладаў на кафедры музыкі Гродзенскага педінстытута. З 1961 працуе ў Гродзенскай культасветвучэльні (вучэльні мастацтваў) — выкладчыкам, з 1971 намеснікам дырэктара па навучальнай рабоце, з 1984 дырэктарам. У 1968 завочна скончыў Ленінградскі інстытут культуры. У 2-ой пал. 50-х — пач. -60-х кіраваў харавымі і інструментальнымі калектывамі. З 1975 ажыццяўляе рэжысуру масавых гарадскіх святаў, фестываляў, канцэртаў.

**Сяўко Баляслаў Іванавіч** (15.05.1940, в. Межырэчы Зэльвенскага р-на), беларускі артыст тэатра. Заслужаны артыст Беларусі (1976). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у роднай вёсцы (1961), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (педагог Д. Арлоў) у 1965. Працуе акцёрам Беларускага тэатра імя Я. Коласа (Віцебск). Выканаўца характарных і драматычных роляў. Сярод акцёрскіх работ: Сын ("Зацюканы апостал" А. Макаёнка), Валодзька ("Трыбунал" А. Макаёнка), Сільвіо ("Слуга двух гаспадароў" К. Гальдоні), Дзімка ("Апошняя інстанцыя" М. Матукоўскага), Алёша ("Прыніжаныя і зняважаныя" паводле Ф. Дастаеўскага), Базільскі ("Правінцыйныя анекдоты" А. Вайнілава), Гатыньш ("Ветрык, вей!" Я. Райніса), Ваўкалак ("Дарога з чорнага царства" А. Вербяца), Вурм ("Каварства і каханне" Ф. Шылера), Суддзя ("Несцерка" В. Вольскага), Дружок ("Святая прастата" А. Макаёнка), Стары блазан ("Цырк Шардам" В. Хармса), Юбэр ("Здурнелы Журдэн" М. Булгакава), Лецік ("Пунсовыя ветразі" паводле А. Грына), Каляпаты ("Сродак Макрапуласа" К. Гашака), Серабракоў ("Дзядзя Ваня" А. Чэхава), Абарус ("Час быка" К. Сая), Інквізітар ("Жана" Ж. Ануя), Шарф ("Пакахай мяне, салдацік" паводле В. Быкава), Дзядок Баравічок ("Жыла-была сыраежка" В. Зіміца), дзядзька Шура ("Таму, што люблю" А. Паповай), Чорт ("Варвара і яе блудны муж" Г. Марчука), Фрыц ("Пісьменныя" М. Гоке). Зняўся ў кінафільме "Малады дубок". Арганізатар (1969) і кіраўнік Віцебскага тэатра пантамімы "Мім" (з 1982 — званне народнага).

**Сяўрук Пётр Якаўлевіч** (1905, мяст. Скідзель Гродзенскага р-на — 4.10.1929), беларускі пісьменнік. З беднай сялянскай сям'і. У час І-ай сусветнай вайны выязджалі ў бежанства. У Ліпецку вучыўся у школе. Вярнуліся на радзіму ў 1921. Працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. Удзельнічаў у грамадска-культурным руху. Быў актывістам Грамады. Арганізаваў масавую бібліятэку, якая размяшчалася ў яго хаце. У 1927-28 — старшыня Гродзенскай акруговай управы ТБШ. Не раз арыштоўваўся і трапляў у засценкі паліцыі. Друкаваўся з пач. 20-х у віленскай перыёдыцы. Пісаў вершы, апавяданні, аповесці, артыкулы, нататкі, вёў дзённікі. Творы захоўваліся ў рукапісах.

**Таболіч Алена Уладзіміраўна** (15.04.1940, в. Горна Зэльвенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог, паэтка-перакладчыца. Кандыдат філалагічных навук (1983). Дацэнт (1986). З сялянскай сям'і. Скончыла СШ у Зэльве. Вучылася на факультэце англійскай мовы Мінскага інстытута замежных моваў (1958-63). Настаўнічала ў

Маладзечне, у СШ №6 (1963-68). З 1968 выкладае ў Мінскім інстытуце замежных моваў (лінгвістычным універсітэце), на кафедры тэорыі і практыкі англійскага маўлення. Стажыравалася ў Англіі (1976), ЗША (1984). Выкладала англійскую мову ў Беларускім ліцэі ў Байнаўцы (Польшча) у 1991-92. Друкуецца як мовазнавец з 1974. Навуковыя інтарэсы звязаны з параўнальнай фанетыкай, лексікаграфіяй, методыкай выкладання англійскай мовы. Выдала (у сааўт) кнігі "Англійская мова па тэлебачанні" (1974, на рус. мове), "Канкрэтнамоўнае і тыпалагічнае ў англійскай інтанацыі" (1979, на рус. мове), "Англа-беларуска-рускі слоўнік" (1989), "Кішэнны англа-беларуска-рускі слоўнік" (1995). Сааўтар метадычных дапаможнікаў па англійскай мове для студэнтаў. Друкуе пераклады англамоўных паэтаў на беларускую мову (Р. Бёрнс, П. Шэлі, У. Уордсвард, А. Тэнісан, А. Генры, Р. Брыджэс і інш). Выдала зборнік перакладаў "Срэбны дождж" (1999).

**Тайц Майсей** (ліпень 1882, мяст. Вартачы Астравецкага р-на — 24.10.1935), яўрэйскі пісьменнік (паэт, празаік). Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1934). З 1900 удзельнічаў у рабочым руху, праследаваўся царскімі ўладамі, трапляў у турмы. Пісаў на ідзіш. Жыў пераважна ў Маскве. Друкаваў (з 1902) вершы, паэмы, апавяданні, аповесці, раманы. Выйшлі ў Маскве паэма "Кніга хронік" (1922), зборнік вершаў "Далоні да сонца" (1923), аповесць "Двор на Даватарскай" (1926), раман "Смерць таварыша Вулі" (1929), зборнік апавяданняў "Кара Смаргоні" (1930), паэма "Беларусь" (1930), раман "Інфузорная зямля" (1931), аповесць "Дарога ў Данбас" (1932). Творы выдаваліся ў перакладах на рускую мову ў 1928, 1930.

**Тайц Якаў Маісеевіч** (12.04.1905, мяст. Смаргонь — 4.04.1957), рускі пісьменнік. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1939). Сын М. Тайца. Сям'я часта пераязджала ў пошуках лепшай долі. У 1917 апынуліся ў Харкаве, дзе вучыўся ў мастацкай вучэльні. З 1920 — у Маскве, тут скончыў Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут (1929). Працаваў у друкарні цынкографам. З 1930 — у войску. Пазней працаваў афармляльнікам кніг. Друкаваўся з 1930 (нарысы, апавяданні, аповесці для дзяцей і пра дзяцей). Выдаў у Маскве і Ленінградзе кнігі "Крыўдная каманда" (1931), "Аповед сігнальшчыка" (1931), "Сігнальшчык" (1933), "Два апавяданні" (1935), "Адкуль ты?" (1935), "Антон і Антонаўка" (1936), "Артэк" (1938), "Каўнерык" (1938), "Дом" (1939), "Кубік на кубік" (1939), "Апавяданні" (1939), "Залаты грошык" (1940), "Руды камень" (1941), "Манька" (Новасібірск, 1943), "Находка" (1948),

"Рабінка" (1948), "Пад гарою Гедыміна" (1949), "Сябра міру" (1952), "Крыніца" (1952), "Галінка" (1953), "У школьным завулку" (1954), "Апавяданні і аповесці" (1956), "Нязгаснае святло" (1958).

**Талочка Уладзіслаў** (1887, г. Гродна — 1942), беларускі грамадска-культурны дзеяч, публіцыст, каталіцкі духоўнік. З сям'і чыноўніка. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю. Вывучаў філасофію і тэалогію ў універсітэце ў Інсбруку (Аўстрыя). З 1911 — у Вільні. Падчас 1-ай сусветнай вайны працаваў тут у Таварыстве дапамогі ахвярам вайны. Ствараў беларускія школы. Беларусізаваў касцёл. Адзін з арганізатараў каталіцкай суполкі "Золак" (1917), якая вяла беларускую патрыятычную працу сярод дзяцей. Быў сябрам Рады БНР (1918). У 1938 высланы ўладамі Польшчы з Вільні. Вярнуўся восенню 1939. Аўтар апавяданняў, публіцыстычных артыкулаў, шматлікіх публікацый на тэмы беларускай літаратуры, гісторыі, рэлігіі, школы ў друку Беларусі ("Гоман", "Хрысціянская думка", "Крыніца", "Przlgląd Wileński", "Калоссе"), Польшчы, Украіны, Літвы, Германіі, Італіі.

**Таранцей Віктар Пятровіч** (6.03.1946, мяст. Ізабелін Ваўкавыскага р-на), беларускі педагог. Кандыдат педагагічных навук (1979). Прафесар (1991). З сям'і рабочага. Скончыў Ізабелінскую СШ (1963), аддзяленне фізікі фізічна-матэматычнага факультэта Гродзенскага педінстытута (1967). Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара Падароскай і Ізабелінскай СШ Ваўкавыскага р-на (1967-76). Вучыўся ў аспірантуры ў НДІ агульнай педагогікі Акадэміі педагагічных навук СССР (1976-79). З 1979 — у Гродзенскім універсітэце, на кафедры педагогікі (адначасова ў 1979-86 — сакратар парткама універсітэта). З 1982 — загадчык кафедры педагогікі, адначасова ў 1991-92 — прарэктар універсітэта па замежных сувязях і камерцыйнай рабоце, а з 1994 — дэкан факультэта псіхалогії і педагогікі, з 1999 — дэкан факультэта педагогікі. Вывучае праблемы бесперапыннай педагагічнай адукацыі настаўнікаў. Аўтар кніг "Тварам да моладзі" (1990), "Падрыхтоўка настаўніка ва ўмовах бесперапыннай адукацыі" (Гродна, 1993, на рус. мове) і інш. Навуковы рэдактар манаграфій і зборнікаў прац па педагогіцы.

**Тарас Ніна Міхайлаўна** (15.05.1916, в. Заполле Навагрудскага р-на), беларуская паэтка. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1940). З беднай сялянскай сям'і. У 1925 пайшла ў 2 кл. пачатковай школы ў роднай вёсцы, 3-ці кл. наведвала ў Стараельні (Дзятлаўскі р-н), 4-ты

— у Ятры (Навагрудскі р-н). Вучылася ў Навагрудскай беларускай гімназіі (1930-34) і Віленскай беларускай гімназіі (1934-36). Зведала беспрацоўе. Жыла ў Вільні, дзе былі часовыя заробкі, у роднай вёсцы. З 1938 — у Лідзе, працавала тут літработнікам раённай газеты "Уперад" (1939-41, 1944-45). У 1943-44 была партызанскай сувязной. З 1945 — у Мінску. Працавала стыльрэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР. З 1951 — літработнік у газеце "Піянер Беларусі". У 1953-54 — літкансультант у газеце "Звязда". Скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1957). Першыя вершы апублікавала ў 1936. Друкавалася ў 30-я ў газеце "Наша воля", часопісах "Шлях моладзі", "Беларускі летапіс", "Калоссе", "Снапок". Выдала зборнікі лірыкі "На ўсход ідучы..." (1940), "Суніцы" (1946), "Вершы" (1952), "У тапаліную замець" (1976). Вершы розных гадоў сабраныя ў кнігах "Кветка шчасця" (1958), "Пад белым яварам" (1966), "Праметэю прыйду пакланіцца" (1981), "Праз вятры-завеі" (1986). Выйшлі зборнікі паэзіі для дзяцей "Казкі пра абавязкі" (1955), "Наш бор" (1968). Перакладае польскіх, украінскіх, рускіх паэтаў. Кніжка яе вершаў у перакладзе на рускую мову выйшла ў Маскве ў 1960.

**Тарасевіч Георгі Рыгоравіч** (17.12.1922, в. Пілкі Мастоўскага р-на), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1974). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 3 кл., 4-ты — у в. Струга (Мастоўскі р-н), 5-ты — у в. Тоўсцікі (Мастоўскі р-н), 6-7 — у мяст. Лунна (Мастоўскі р-н, 1937). Працаваў на гаспадарцы. У лютым 1944 вывезены на прымусовыя работы ў Германію. У 1945-46 служыў у савецкім войску. Зноў працаваў на гаспадарцы. У 1951-52 вучыўся ў школе будаўнікоў-дзесятнікаў у Гродне. Працаваў затым у прамкамбінаце ў Скідзелі (Гродзенскі р-н), дзе скончыў СШ рабочай моладзі (1956). Вучыўся на будаўнічым факультэце (спецыяльнасць "архітэктура") Беларускага палітэхнічнага інстытута (1956-62). Працаваў у Гродзенскім Аблпраекце і ПКМ Белжылпраекта. У 1972-77 — у Магілёўскім ПКМ Белжылпраекта. У 1977-84 у Гроднаграмадзянпраекце (галоўны архітэктар праектаў, вядучы архітэктар тэхаддзела). Асноўныя работы: ПДП Гродзенскага гарадскога цэнтра, забудовы Паўночнага жылога раёна Гродна, мікрараёна Рослікі ў Лідзе (у сааўт.), рэканструкцыя жылых дамоў, адміністрацыйна-вытворчы будынак ПКМ Белжылпраекта ў Магілёве.

**Тарасевіч Янка** (Ян Міхайлавіч, 20.10.1892, в. Клешнякі Шчучынскага р-на — 11.04.1978), беларускі культурны дзеяч, выдавец, эсэіст, каталіцкі духоўнік. Доктар тэалогіі (1925). З сялянскай сям'і.

Пачатковую адукацыю атрымаў у Бакштах і Васілішках (Шчучынскі р-н). З 1911 жыў у ЗША. Працаваў на фабрыцы і займаўся самаадукацыяй. У 1912 уступіў у ордэн Салятынаў. Вучыўся ў Хартфордзе. Вышэйшую рэлігійную адукацыю набываў у Манрэалі (Канада) у 1917-18 і Фрыбургу (Швейцарыя) у 1919-25. Выкладаў у духоўнай семінарыі ў штаце Н'ю-Йорк. Вёў на беларускай мове касцельную службу, выступаў з публічнымі лекцыямі на беларусазнаўчыя тэмы. У 1927 у Н'ю-Йорку пачаў выпускаць газету "Праўда" (выйшаў адзін нумар). Выдаваў у 30-40-я англа-рускі часопіс "Голос церкви". У 1936 перайшоў у ордэн Бенедыктынаў. Адзін з заснавальнікаў "Беларуска-амерыканскай нацыянальнай рады" (1941). Разгортвае шырокую беларускую асветніцкую працу пасля вайны. Стварае ў Чыкага першую беларускую парафію. Выдае "Лісток к Беларусам" (1952-61). Наведваў радзіму ў 1921, 1924, 1935, 1967-68. Друкаваў вершы, апавяданні, эсэ, рэлігійна-асветніцкія артыкулы (часопісы "Хрысціянская думка", "Божым шляхам", "Голос церкви", "Сяўбіт"). Выдаў успаміны "На Бацькаўшчыну. Апісанне падарожжа з Амерыкі і назад" (Вільня, 1936). У Вільні выйшлі яго філасофска-тэалагічныя патрыятычныя трактаты "Зло і лякарства на яго" (1928), "Чалавек — шукальнік Бога" (1934), "Беларусы ў святле праўды" (1935).

**Тармола-Мірскі Раман Якубавіч** (сапр. Тармола, 5.04.1936, мяст. Мір Карэліцкага р-на), беларускі паэт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1964). З сям'і рамесніка. Скончыў у Міры СШ. Вучыўся на гістарычна-філалагічным факультэце Мінскага педінстытута (1955-60). Працаваў ст. рэдактарам, загадчыкам літаратурна-мастацкага аддзела, галоўным рэдактарам літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання (1960-77), сябрам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі мастацкіх фільмаў кінастудыі "Беларусьфільм" (1977-80). З 1980 — сябра сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі тэлефільмаў Беларускага тэлебачання. Друкуецца з 1957. Выдаў зборнікі паэзіі "Асколкі і росы" (1964), "Поўня" (1966), "Абнаўленне" (1968), "Міранка" (1971), "Побач" (1974), "Павага" (1976), "Вобразы вечара" (1982), "Толькі б дагаварыць..." (1986), "У прадчуванні святла..." (1992). Зборнікі выбраных твораў — "Зямное — зямному" (1979), "Спрадвечнасць" (1989), "Зярняты з каласоў" (1994). Выйшлі кніжкі вершаў для дзяцей "Каго баяцца ў лесе" (1973), "Казкі-падказкі" (1984). Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў "Людзям сябе пакажы" (1973), "Я не самотны... Максім Багдановіч" (1982), "Там, дзе сінее Нарач" (1995), дакументальна-мастацкага фільма "А мае міране добрыя людзі" (1993), тэлеспектакля "Зачараваны Валерка" (1976).

**Татарын Серафім Лук'янавіч** (13.02.1903, в. Вострава Зэльвенскага р-на — 27.07.1988), беларускі грамадска-культурны дзеяч, педагог. З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 3 кл. царкоўнапрыходскай школы. У 1914-15 вучыўся ў Жыровіцкай духоўнай вучэльні. Затым сям'я выехала ў бежанства. У Ніжнім Ноўгарадзе скончыў духоўную вучэльню, затым 2-класную школу 2-ой ступені. Працаваў у аддзеле сацыяльнага забеспячэння. Дамоў вярнуліся ў 1920. Нядоўгі час настаўнічаў у в. Лабзова Зэльвенскага р-на. Затым працаваў на гаспадарцы. З сярэдзіны 20-х пачынае дзейнічаць у руху ТБШ, Грамады. У роднай вёсцы арганізаваў беларускую школу, стварыў гурток ТБШ. Быў намеснікам старшыні Слонімскага павятовага камітэта Грамады, працаваў у Вільні ў сакратарыяце Грамады. У 1927 выконваў абавязкі рэдактара-выдаўца газеты "Наша праўда". У 1928 — намеснік старшыні Слонімскай акруговай управы ТБШ. У 1929 працаваў у Навагрудку сакратаром павятовага клуба "Змаганне". У 1929-36 сядзеў у турмах (у Навагрудку, Слоніме, Вільні, гарадах Польшчы) па абвінавачанні ў антыдзяржаўнай дзейнасці. Выйшаўшы на волю, працаваў у камуністычным падполлі. У 1936-37 зняволены ў Картуз-Бярозе. У кастрычніку 1939 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі. Выпушчаны з няволі ў жніўні 1941, быў на фронце да канца вайны (паранены, адзначаны баявымі ўзнагародамі). Па вайне скончыў завочна Ваўкавыскую педагагічную вучэльню і паступіў у Баранавіцкі настаўніцкі інстытут, які неўзабаве быў закрыты. У 1953-57 завочна вучыўся на гістфаку Мінскага педінстытута. Выкладаў гісторыю ў Востраўскай СШ, стварыў тут гістарычна-краязнаўчы музей. Шмат друкаваўся (карэспандэнцыі, артыкулы, успаміны) у Зэльвенскай раённай газеце "Праца".

**Таўлай Аляксей Уладзіміравіч** (14.04.1938, в. Ганькі Слонімскага р-на), беларускі філосаф, педагог. Кандыдат філасофскіх навук (1973). Дацэнт (1975). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Хадзявічы (Слонімскі р-н), Лідскую педагагічную вучэльню (1956). Працаваў настаўнікам пачатковай школы ў роднай вёсцы (1956-57). Служыў у войску (1957-60). Вучыўся на гістарычна-геаграфічным факультэце Мінскага педінстытута (1960-65). Быў інспектарам школ Міністэрства асветы БССР (1965-68). Затым — аспірант кафедры філасофіі Мінскага педінстытута (1968-71). З 1971 выкладае філасофію ў гэтым інстытуце (педагагічным універсітэце). З 1977 — дэкан факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

Даследуе экалагічныя праблемы сучаснасці, метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу ў вышэйшай школе. Выдаў манаграфію "Праблемы экалагічнага выхавання ў працэсе выкладання філасофіі" (1983). Сааўтар працы "Шматузроўневая сістэма падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў" (1993).

**Токць Сяргей Міхайлавіч** (12.04.1968, в. Берішты Шчучынскага р-на), беларускі гісторык, культуролаг, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1997). Бацька — селянін, маці — настаўніца. У роднай вёсцы скончыў СШ. Вучыўся на гістфаку Гродзенскага універсітэта ў 1985-92 (у 1986-88 служыў у войску). Нядоўга настаўнічаў у в. Славатычы Зэльвенскага р-на. З 1992 — аспірант Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Па заканчэнні аспірантуры (1995) — выкладчык, дацэнт (1997) кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта. Стажыраваўся ў Міжнароднай гуманістычнай школе Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (Варшава, 1998). Друкуецца з 1991. Даследуе гісторыю і культуру Беларусі XIX — пач. XX ст. (праблемы фармавання нацыянальнай свядомасці, узаемадзеянне этнічных і рэлігійных фактараў у працэсе развіцця культуры, асаблівасці ментальнасці насельніцтва). Аўтар шматлікіх навуковых публікацый на гэтую тэму ў Беларусі, Польшчы.

**Трацяк Янка** (Іван Іванавіч, 17.03.1956, в. Труханава Смаргонскага р-на), беларускі культуролаг, педагог. З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў в. Вярэбушкі Смаргонскага р-на (1971). Вучыўся ў Ашмянскай СПТВ (1971-74). Працаваў трактарыстам у калгасе, загадчыкам сельскага клуба ў в. Ардашы Смаргонскага р-на (1974-75). Быў вадзіцелем-выпрабавальнікам на Мінскім трактарным заводзе (1977-79). У 1980-85 — студэнт філфака (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры) Гродзенскага універсітэта. Выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Крэўскай СШ Смаргонскага р-на (1985-88). У 1988-89 — культарганізатар санаторыя ў Ашмянах. Зноў настаўнічаў — у Даўкшышскай 8-годцы Ашмянскага р-на (1989-90), у Каменкай СШ Гродзенскага р-на (1990-91). З 1991 — на кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта (навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі, з 1995 — выкладчыкам). У 1997 завочна скончыў аспірантуру на гэтай кафедры. Друкуецца з 1993. Аўтар шматлікіх публікацый (у Беларусі, Расіі, Польшчы) па праблемах рэлігійнага руху, культурна-асветнай дзейнасці каталіцкіх духоўнікаў у Беларусі 1-ай пал. XX ст.

**Трусаў Ігар Георгіевіч** (4.05.1956, г. Навагрудак), беларускі гісторык, краязнавец, культуролаг. З сям'і настаўніцы. Скончыў СШ №3 у Навагрудку (1973). Працаваў тут у раённай друкарні (1973-74). Вучыўся на гістарычна-педагагічным факультэце Гродзенскага педінстытута (універсітэта) у 1974-79. Служыў у войску (1979-81). У 1981-87 — у Рэспубліканскім музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне (музейным наглядальнікам, навуковым супрацоўнікам). Быў затым на пасадах гісторыка, дырэктара, загадчыка аддзела гістарычных даследаванняў у дзяржаўных рэстаўрацыйна-праектных установах у Гродне (1987-95). Працаваў дзяржінспектарам міжрайінспекцыі рыбаховы ў Гродне (1995-96). З 1996 — кансультант, вядучы мастацтвазнавец прыватнай праектна-рэстаўрацыйнай фірмы ў Гродне. Друкуецца з 1981 у выданнях Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі па пытаннях гісторыі Гродзеншчыны, рэлігійных канфесій у Беларусі, палеаграфіі, крыніцазнаўства, архітэктуры. Выдаў працу "Гістарычная забудова горада Гродна" (Гродна, 1999).

**Тумілевіч Чэслаў** (20.11.1942, г. Ліда), польскі мастак (жывапісец, графік). Па вайне сям'я пераехала ў Польшчу. Скончыў архітэктурны факультэт Гданьскага палітэхнічнага інстытута (1968), Вышэйшую мастацкую школу ў Познані (1978). Працаваў у Гданьску на будаўнічым прадпрыемстве, асістэнтам архітэктара ў гарадскім праектным бюро (1968-71). Затым — асістэнтам на факультэце прыкладной графікі (1971-75), кіраўніком майстэрні мастацкай графікі Вышэйшай мастацкай школы ў Гданьску. Выстаўляецца з 1973 у Польшчы, за мяжой. У жывапісе трымаецца геаметрычнага, абстрактна-сінтэтычнага кірунку. Як графік працуе ў жанрах літаграфіі, гравюры, афармляе кнігі.

**Тураеў Барыс Аляксандравіч** (5.08.1868, г. Навагрудак — 23.08.1920), рускі гісторык, усходазнавец, педагог. Доктар гістарычных навук (1902). Акадэмік Расійскай Акадэміі навук (1918). З сям'і чыноўніка, двараніна. Скончыў 1-ю Віленскую гімназію, гістарычна-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1891). Быў пакінуты ў універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Неўзабаве накіраваны за мяжу для вывучэння гісторыі і культуры народаў Блізкага Усходу. Вывучаў мовы, спецыяльныя крыніцы ў Германіі, Францыі, Італіі, Англіі. З 1896 выкладае гісторыю старажытнага Усходу ў Пецярбургскім універсітэце. Аўтар навуковых работ па егіпталогіі, асіралогіі, семіталогіі, урарталогіі. Абагульняльная праца — "Гісторыя старажытнага Усходу". Т. 1-2 (СПб, 1911).

Папулярызаваў гістарычныя веды, заснаваў выданне серыі "Культурна-гістарычныя помнікі старажытнага Усходу". Быў сябрам расійскіх і замежных навуковых таварыстваў і ўстановаў. Стварыў рускую школу гісторыкаў старажытнага Усходу.

**Турук Фёдар Фёдаравіч** (20.02.1889, в. Балотца Навагрудскага р-на — 20.07.1960), беларускі грамадска-культурны дзеяч, гісторык, педагог. Прафесар (1921). З сялянскай сям'і Скончыў гістарычна-філалагічны інстытут (1915) і археалагічны інстытут (1915) у Петраградзе. Тут далучыўся да беларускага руху. З мая 1917 быў сябрам ЦК Беларускай народнай грамады, з кастрычніка 1917 — сябра ЦК Беларускай сацыялістычнай грамады. У 1915-18 выкладаў у гімназіях Мінска і Масквы. З сакавіка 1918 — загадчык аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята, адзін з арганізатараў Беларускага народнага універсітэта і Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве. З 1919 — загадчык беларускага пададдзела аддзела асветы нацыянальных меншасцяў наркамата асветы РСФСР. Садзейнічаў выхаду кнігі Я. Купалы "Выбраныя вершы ў перакладах рускіх паэтаў" (М., 1919). Удзельнічаў у арганізацыі БДУ. З 1921 выкладае тут на кафедры беларускай гісторыі. З 1923 жыве ў Маскве, працуе выкладчыкам Камуністычнага універсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду. У 1932-55 — прафесар розных ВНУ Масквы. Выдаў кнігу "Беларускі рух: Нарыс гісторыі нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху беларусаў" (М., 1921). Аўтар прадмовы і складальнік курсаў лекцый, чытаных у Беларускім народным універсітэце — "Курс беларусазнаўства" (М., 1920).

**Улейчык Наталя Данілаўна** (дзявоч. Матусевіч, 24.08.1961, г. Гродна), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1989). Дацэнт (1998). З сям'і службоўцаў. Скончыла ў Гродне СШ №14 (1978). Вучылася на гістфаку БДУ (1978-81), перавялася на гістфак Гродзенскага універсітэта, які скончыла ў 1983. Настаўнічала ў Гродзенскай СШ №22, была выкладчыкам-стажорам, лабарантам на гістфаку Гродзенскага універсітэта (1983-86). У 1986-89 вучылася ў аспірантуры БДУ. З 1990 працуе на кафедры славянскіх дзяржаў Гродзенскага універсітэта (выкладчыкам, ст. выкладчыкам, дацэнтам). Вывучае пытанні гісторыі культуры ў заходнім рэгіёне Беларусі. Друкуецца з 1988.

**Урбановіч Вітольд** (12.05.1931, г. Ашмяны), польскі мастак. Па вайне сям'я пераехала ў Польшчу. Скончыў акадэмію мастацтваў у

Кракаве (1956). Сябра таварыства мастакоў "Кракаўская група" (1961). Выкладае ў каталіцкім універсітэце ў Любліне. Працуе ў галіне станковага і манументальнага жывапісу (мадэрнісцкага стылю), піша абразы. У выставах удзельнічае з 1956 (у Польшчы, Англіі, Францыі, Украіне, ЗША). Творы зберагаюцца ў музеях Варшавы, Кракава, Парыжа, Лондана, у калекцыях у ЗША, Галандыі, Швецыі.

**Урбановіч Міхаіл** (30.10.1890, мяст. Астрына Шчучынскага р-на — 4.08.1973), беларускі культурны дзеяч, педагог, каталіцкі духоўнік. Вучыўся (з 1910) у Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі, рукапалажаны ў святары ў 1915. Служыў ксяндзом. З 1922 — у ордэне Марыянаў. У 1924 выехаў у ЗША. Выкладаў у духоўнай семінарыі, у школах, каледжах. Актыўна ўдзельнічаў у культурным жыцці беларускай эміграцыі. Збіраў сродкі на беларускія ўстановы. Быў дабрадзеем Дому Марыянаў у Лондане. Друкаваўся на тэмы нацыянальнай культуры ў часопісах "Божым шляхам", "Хрысціянская думка", "Беларуская крыніца".

**Урбановіч Уладзімір Аляксандравіч** (1.08.1921, в. Пудзіна Навагрудскага р-на — 9.02.1999), беларускі педагог, краязнавец, культуролаг. З сялянскай сям'і. У 1932 скончыў 5 кл. і працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. У 1938 экстэрнам здаў экзамен за 7-годку і ў 1939 паступіў у польскую сельскагаспадарчую гімназію ў Жыровічах (Слонімскі р-н). Пры "саветах" зноў здаваў экзамен за 7 кл. (1941) і паступіў у Мінскі палітэхнікум. Пры "немцах" скончыў у Навагрудку настаўніцкія курсы (1942) і працаваў у пачатковых класах у Лідзе (1942-44), у в. Біскупцы Лідскага р-на ў 1944-46 (у 1946 завочна скончыў Лідскую педагагічную вучэльню), у мяст. Бярозаўка Лідскага р-на (1946-48), у в. Малая Калпеніца ля Баранавіч (1948-52). У 1952 завочна скончыў літаратурны факультэт Гродзенскага педінстытута. Настаўнічаў у СШ у в. Валеўка Навагрудскага р-на (1952-55), у в. Райца Карэліцкага р-на (1955-59). З 1959 стала працаваў у Валеўскай СШ, пераважна намеснікам дырэктара па навучальнай рабоце. Адзін з заснавальнікаў (1955) Валеўскага краязнаўчага музея (званне народнага з 1965). Друкуецца з 1938. Аўтар артыкулаў, нарысаў, даследаванняў у навуковых і папулярных выданнях пра мясціны і лёсы пісьменнікаў, выкладанне беларускай літаратуры ў школе, арганізацыю ў ёй навучальнага працэсу, пра друк Беларусі, беларускі фальклор, людзей культуры. З 1958 чытаў лекцыі па методыцы літаратурнага краязнаўства на абласных і рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі

настаўнікаў. Быў сябрам рэспубліканскага журы па ацэнцы школьных падручнікаў, рэцэнзаваў падручнікі па беларускай літаратуры. Выдаў навучальна-краязнаўчыя кнігі "Па дарагіх мясцінах" (1964), "Шляхамі паэтаў і герояў" (1970).

**Урублеўскі Павел Браніслававіч** (18.10.1956, в. Мінеўшчына Ваўкавыскага р-на), беларускі мастак (жывапісец, графік). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1990). У 1988-90 быў сябрам аб'яднання маладых мастакоў і мастацтвазнаўцаў СССР. З сям'і селяніна, арганіста. Пачатковую школу скончыў у в. Мачульна Ваўкавыскага р-на, 8 кл. — у Вярэйкаўскай школе-інтэрнаце (Ваўкавыскі р-н), 10 кл. у Свіслацкай школе-інтэрнаце (1974). Служыў у войску (1974-76). Затым жыў у Мінску, працаваў мастаком на трактарным, падшыпнікавым заводах, быў пажарнікам (1977-82). У гэты час займаўся ў мастацкіх студыях Ф. Сумарава, У. Ткачэнкі. Вучыўся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1982-88). Выкладаў на кафедры выяўленчага мастацтва Гродзенскага універсітэта (1995-97), адначасова ў дзіцячай мастацкай школе №1 г. Гродна. Працуе пераважна ў галіне алейнага жывапісу, акварэлі, графікі (афорт). Пашыраны жанр — кампазіцыя ўмоўнага стылю. У выставах — з 1980 (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Францыі). Сярод акварэляў: цыкл "Зімовыя краявіды" (1990-97), "Адвечнасць" (1993), "Жывыя камяні" (1995). Напісаў серыю афортаў: "Занова нарадзіцца" (1988), таксама "Партрэт жонкі" (1990), "Аўтапартрэт" (1990), "Восеньскі краявід" (1990). Аўтар жывапісных кампазіцый "Кліч Касандры" (1993), "Апакаліпсіс" (1993), "Адвечнасць" (1993), "Тыя, што нясуць жанчыну" (1994), "Сельская ідылія" (1994), "Прэлюдыя" (1994), "Бацькоўскія крылы" (1994), "Прысвечанае Высоцкаму" (1994), "Рэквіем на творы Ф. Ліста" (1994), "Закаханыя" (1995), "Анёл сярод людзей" (1995), "Грані адноснасці" (1995), "Пачатак" (1995), "Грэшніца, мудрэц і вар'ят" (1996), "Муза" (1996), "Тыя, што ідуць у нікуды" (1996), "Падзенне Ікара" (1996), "Бах, Моцарт, Бетховен" (1997), "Той, што падносіць чашу" (1997), "Той, што прымервае маску" (1997).

**Ус Антон Антонавіч** (25.06.1894, в. Мішуковічы Іўеўскага р-на — 11.01.1980), беларускі і рускі грамадска-культурны дзеяч, мастацтвазнавец, мастацкі педагог. Прафесар (1931). Сябра Саюза мастакоў Беларусі (1945). З беднай сялянскай сям'і. Рана асірацеўшы, батрачыў, працаваў на цагельні. Школьныя веды набываў самастойна. З 1914 удзельнічаў у 1-ай сусветнай вайне. З 1918 — у Чырвонай Арміі, ваяваў на ўсходнім фронце, быў паранены. У 1921-

24 вучыўся на рабфаку Сібірскай сельскагаспадарчай акадэміі (Омск). У 1925-29 — студэнт 2-га Маскоўскага універсітэта. Актыўна ўдзельнічаў у беларускім культурным руху ў Маскве. У 1929-32 — аспірант Інстытута чырвонай прафесуры (Масква). Адначасова ў 1930-32 загадваў кафедрай мастацтвазнаўства Маскоўскага універсітэта, кіраваў секцыяй масавай прадукцыі ў маскоўскім выдавецтве выяўленчага мастацтва. У 1932-34 — загадчык сектара літаратуры і мастацтва ЦК КП(б)Б. З пачатку 1934 загадваў сектарам выяўленчага мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства Акадэміі навук СССР, таксама аддзелам мастацтва 2-ой паловы XIX ст. у Рускім музеі (Ленінград). Восенню 1935 рэпрэсаваны, зняволены ў канцлагеры ў Комі АССР. У канцы 1940 вызвалены. Працаваў у Пермскай карцін-най галерэі. Удзельнічаў у вайне ў 1941-44. Быў выкладчыкам Мінскага педінстытута, ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук Беларусі (1944-48). У 1953-57 працаваў на кафедры рускай літаратуры Брэсцкага педінстытута. Друкаваўся з 1930. Аўтар многіх публікацый у маскоўскіх, ленінградскіх, мінскіх выданнях пра беларускіх і рускіх мастакоў, пра творы жывапісу і літаратуры, пра літаратурна-мастацкае жыццё. У рукапісе засталося яго даследаванне "Рэпін у Беларусі", успаміны.

**Усенка Лілія Уладзіміраўна** (дзявоч. Баламут, 17.03.1942, в. Кунцаўшчына Гродзенскага р-на), беларускі краязнавец, музеязнавец. З сялянскай сям'і. Скончыла СШ ў мяст. Індура Гродзенскага р-на (1960). Вучылася на факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання Гродзенскага педінстытута (1960-64). Працавала выхавальніцай дзіцячага сада №4 у Навагрудку (1964-70), дырэктарам Навагрудскага Дома піянераў (1970-80). У 1980-97 — дырэктар Дома-музея А. Міцкевіча ў Навагрудку, пазней навуковы супрацоўнік музея. Друкуецца з 1970 на педагагічна-метадычныя тэмы. Аўтар навуковых публікацый пра месца нараджэння А.Міцкевіча, пра сувязі яго жыцця і творчасці з Навагрудчынай. Друкавала вершы.

**Фёдараў Ігар Алегавіч** (16.06.1955, г. Гродна), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1985). Дацэнт (1990). Скончыў СШ №18 г Гродна. Вучыўся на гістфаку Гродзенскага універсітэта (1972-77). Затым нядоўга настаўнічаў у Гродне. Служыў у войску (1977-79). У 1979-81 працаваў завучам СШ №3 г. Гродна. Вучыўся ў аспірантуры на кафедры гісторыі СССР і БССР

Гродзенскага універсітэта (1980-83), адначасова працаваў тут (навуковым супрацоўнікам НІСа, выкладчыкам). З 1983 выкладае на гэтай кафедры, пазней кафедры гісторыі Беларусі. Намеснік дэкана факультэта гісторыі і культуры па выхаваўчай рабоце. Аўтар шматлікіх навуковых публікацый (друкуецца з 1983) па праблемах гісторыі рэлігіі і царквы ў Беларусі. Займаецца этнаграфіяй, краязнаўствам. Сааўтар падручнікаў для студэнтаў "Гісторыя Беларусі. Ч. І. Са старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст." (Гродна, 1993), "Гісторыя Беларусі". Ч. І (Гродна, 1998, на рус. мове).

**Філіповіч Януар** (1815, г. Навагрудак — 29.08.1869), польскі пісьменнік (паэт, празаік, літаратуразнавец), педагог. У Навагрудку атрымаў сярэднюю адукацыю. Скончыў Віленскі універсітэт. Працаваў настаўнікам у Вільні. У 1845 стварыў тут выдавецтва, у якім выйшаў 1-ы выпуск зборніка "Народ і час", прысвечанага пытанням літаратуры і маралі (тут змешчаны яго літаратуразнаўчыя і маральна-філасофскія эсэ). Прымаў удзел у падрыхтоўцы "Слоўніка польскай мовы" Аргельбрандта. Друкаваў вершы з 1842. Першую аповесць "Пан Ясноўскі", заснаваную на паданнях "Літвы", выдаў у Вільні ў 1843. Складаў падручнікі. Сааўтар перакладных "Лекцый па хіміі" (Вільня, 1855). Выдаў дапаможнік "Пра польскую хімічную тэрміналогію" (Вільня, 1856), "Польскі лемантар..." (Вільня, 1862).

**Фінькевіч Людміла Уладзіміраўна** (25.08.1957, в. Парфёнавічы Мастоўскага р-на), беларускі псіхолаг, педагог. Кандыдат псіхалагічных навук (1987). Дацэнт (1993). З сялянскай сям'і. Вучылася ў 8-годцы ў Парфёнавічах, у Ваўкавыскай педагагічнай вучэльні. Затым год працавала настаўніцай пачатковых класаў, ст. піянерважатай у Грэбенскай СШ Пухавіцкага р-на. У 1976-80 — студэнтка факультэта дашкольнага выхавання Мінскага педінстытута. Працавала пасля выхавальніцай у дзіцячым садзе, выкладала псіхалогію ў педагагічным класе. У 1983-87 вучылася ў аспірантуры на кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі Мінскага педінстытута. З 1987 працавала на гэтай кафедры (асістэнтам, ст. выкладчыкам, дацэнтам). З 1997 — загадчык кафедры агульнай і сацыяльнай псіхалогіі Беларускага педагагічнага універсітэта. Вывучае праблемы псіхадыягностыкі і псіхакарэкцыі развіцця асобы. Друкуецца з 1986. Сааўтар даследавання "Дыягностыка развіцця асобы і міжасабовых адносін у дашкольным узросце" (1993, на рус. мове).

**Фурса Леанід Пятровіч** (9.12.1934, мяст. Свіслач), беларускі спартыўны педагог. Майстар спорту СССР па вольнай барацьбе (1961). Заслужаны трэнер Беларусі (1969). З сям'і рабочага. Скончыў Свіслацкую СШ (1953), Беларускі інстытут фізічнай культуры (1957). З 1957 працуе ў Гродне, у спартыўнай школе моладзі (абласной школе вышэйшага спартыўнага майстэрства). У 1981-82 быў ст. выкладчыкам кафедры фізвыхавання Гродзенскага медінстытута, затым — зноў у школе вышэйшага спартыўнага майстэрства. Ст. трэнер зборнай каманды Гродзенскай вобл. па вольнай барацьбе. Суддзя міжнароднай катэгорыі па вольнай барацьбе (1980). Падрыхтаваў больш за 100 майстроў спорту па вольнай барацьбе, прызёраў нацыянальных, усесаюзных, еўрапейскіх, міжнародных спаборніцтваў.

**Фядзеня Валянцін Міхайлавіч** (8.04.1952, в. Старое Сяло Зэльвенскага р-на), беларускі географ, геолаг, эколаг. Кандыдат геолага-мінералагічных навук (1987). З сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 8-годку, СШ — у Зэльве. Працаваў на будоўлях у Зэльвенскім р-не. Служыў у войску (1971-73). У 1978 скончыў геаграфічны факультэт БДУ. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута геахіміі і геафізікі Акадэміі навук Беларусі (1978-81). Працаваў у гэтым інстытуце малодшым, ст. навуковым супрацоўнікам (1981-91). З 1992 — загадчык сектара, затым загадчык аддзела Беларускага навукова-даследчага Цэнтра "Экалогія" пры Дзяржкамітэце па экалогіі Беларусі. Друкуецца з 1980. Даследаванні — у галіне рэгіянальнай геалогіі Беларусі, выкарыстання прыродных рэсурсаў, экалагічнага стану зямельнага фонду. Сааўтар манаграфіі "Краёвыя ўтварэнні Беларускай грады" (1990, на рус. мове).

**Фядута Аляксандр Восіпавіч** (3.11.1964, г. Гродна), беларускі літаратуразнавец, палітолаг, публіцыст. Кандыдат філалагічных навук (1997). З сям'і рабочага. Скончыў аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1986). Настаўнічаў у Гродне ў СШ №26 (1986-90). Быў карэспандэнтам гродзенскай газеты "24 часа". Быў першым сакратаром ЦК ЛКСМБ (1991), першым сакратаром ЦК Саюза моладзі Беларусі (1991-94), начальнікам управы грамадска-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзідэнта РБ (1994-95). Затым працуе аглядальнікам "Белорусской деловой газеты", адначасова з 1997 — палітычны аглядальнік газеты "Московские новости". Як літаратуразнавец друкуецца з 1986. Вывучае творчасць А. Пушкіна, рускую культуру І-ай трэці XIX ст. З 90-х актыўна

выступае з публіцыстычнымі артыкуламі ў мінскіх, маскоўскіх перыёдыках, аналізуе працэсы і з'явы палітычнага жыцця Беларусі.

**Фясенка Іван Іванавіч** (15.04.1953, ст. Нёман Лідскага р-на), беларускі педагог, краязнавец, музеязнавец. З сям'і службоўцаў. Скончыў Нёманскую СШ (1970), геаграфічны факультэт БДУ (1975). Выкладаў геаграфію ў Забалацкай СШ Воранаўскага р-на (1975-76), быў выхавальнікам у Воранаўскай школе-інтэрнаце (1976-77), выкладаў гісторыю і геаграфію ў базавай школе ў в. Даўгялы Воранаўскага р-на (1977-80), геаграфію ў Радунскай СШ Воранаўскага р-на (1980-92). З 1995 настаўнічае ў базавай школе ў в. Клайшы Воранаўскава р-на. Арганізатар (1985) і кіраўнік гістарычна-краязнаўчага музея (з 1997 — званне народнага) Радунскай СПІ. Друкуецца як краязнавец з 1967. Даследуе гісторыю і культуру рэгіёну Воранаўшчыны.

**Халянкова Аліна Люцыянаўна** (дзявоч. Мацыевіч, 1.05.1940, в. Дубчаны Лідскага р-на — 11.07.1979), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1978). З сялянскай сям'і. Скончыла Белагрудскую 7-годку Лідскага р-на, Навагрудскую педагагічную вучэльню (1958). Вучылася на беларускім аддзяленні гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута (1958-63). Працавала ў Зэльвенскай школе-інтэрнаце настаўніцай беларускай мовы і літаратуры (1963-66), намеснікам дырэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце (1966-68). З 1968 — выкладчык кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага педінстытута. У 1972-76 вучылася (з перапынкамі па хваробе) у аспірантуры на кафедры беларускай літаратуры Мінскага педінстытута. Літаратуразнаўчы дэбют — у 1971. Аўтар артыкулаў, рэцэнзій, прысвечаных праблемам беларускай літаратуры 60-х — 70-х.

**Хамякова Вольга Рамуальдаўна** (дзявоч. Гушча, 10.05.1956, в. Цвербуты Лідскага р-на), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1986). З сям'і настаўнікаў. Пачатковую адукацыю атрымала ў Быстрыцкай 8-годцы Астравецкага р-на. Затым вучылася ў школах на Міншчыне (скончыла СШ у Лагойску). У 1973-77 — студэнтка аддзялення рускай мовы і літаратуры філфака Мінскага педінстытута. Настаўнічала ў Сёмкаўскай 8-годцы Лагойскага р-на (1977-81). У 1981-84 — аспірантка Мінскага педінстытута. З 1985 выкладае на кафедры рускай і замежнай літаратуры гэтага інстытута (Беларускага педагагічнага універсітэта) на пасадах асістэнта, затым ст. выкладчыка, дацэнта. Друкуецца з 1984.

Вывучае пытанні метадалогіі літаратуры, аналізу мастацкага тэксту, развіцця рускай літаратуры XIX ст. Аўтар літаратуразнаўчых артыкулаў, метадычных распрацовак для студэнтаў філфака.

**Хатэнка Антаніна Яўгенаўна** (у замужжы Емяльянава, 28.04.1956, в. Зенькаўцы Зэльвенскага р-на), беларуская паэтка, эсэіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1994). З сям'і настаўніка. У 1961 бацьку перавялі па працы ў Ліверполь на Пружаншчыне, тут прайшло дзяцінства. Скончыла Пружанскую школу-інтэрнат (1973), філфак БДУ (1978). Працавала настаўніцай у Задор'еўскай СШ Лагойскага р-на (1978-79), у кнігарні "Палітычная кніга" ў Мінску (1979-81), у выдавецтве "Народная асвета" (1982-85), у Мінскім абласным навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці (1985-87), у Беларускім фондзе культуры (1987-96). Затым працуе ў Літаратурным музеі Я. Купалы. Друкуецца з 1972. Аўтар вершаў, паэм, эсэ, нарысаў-рэфлексій, даследаванняў па народнай творчасці. Выдала кнігі "Здзічэлае рэха вясны" (Кліўленд, 1991), "Зніч Крыжовых дарог" (1992), "Чалавек на далоні Сусвету" (1994).

**Хвайніцкая Тацяна Іванаўна** (23.12.1964, г. Шчучын), беларуская мастачка. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1995). З сям'і службоўцаў. У Шчучыне скончыла 4 кл. СШ №1. Вучылася ў сярэдняй мастацкай школе пры Інстытуце імя І. Рэпіна Акадэміі мастацтваў СССР у Ленінградзе (1975-83). У 1983-86 была мастакомафармляльнікам у розных установах Ленінграда, працавала гардэробшчыцай, прыбіральшчыцай. Адначасова наведвала як вольны слухач заняткі ў Інстытуце імя І. Рэпіна. У 1993 скончыла аддзяленне жывапісу мастацкага факультэта Беларускай акадэміі мастацтваў. Працавала ў творчых майстэрнях М. Савіцкага (1994-95). З 1995 — у чарнобыльскім дабрачынным фондзе медыкаў, цэнтр якога ў Германіі. Працуе ў розных тэхніках (алей, тэмпера, туш, бацік, энкаўстыка), піша партрэты, сюжэтныя кампазіцыі, пейзажы, выконвае вітражы, велікодныя пісанкі. У выставах — з 1984 (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі). Сярод партрэтных твораў: "Валя" (1987), "Оля" (1987), "Аўтапартрэт" (1987, 1988), "Павел" (1989), "Юрась" (1989), "Дзядуля" (1990), "Сямейны партрэт" (1991). Сюжэтнатэматычныя творы: "Паляванне" (1983), "У тралейбусе" (1983), "Браслаўшчына" (1988), "Батлейка" (1990), "Мацярынства" (1992, 1993), "Вясна" (1994), "Дзяцінства" (1995), "Сон" (1995), дыпціх "Свіцязянка" (1998). Пейзажы: "Браслаў" (1989), "Ноч" (1990), "Шчучын, дождж" (1990), "Шчучын" (1991), серыя "Пейзажы Беларусі і

Германіі" (1998). Творы захоўваюцца ў калекцыях у Беларусі, Польшчы, Расіі, Германіі, Італіі, ЗША, Швейцарыі.

**Хілюта Уладзімір Андрэевіч** (26.04.1951, в. Старынцы Бераставіцкага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1982). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы, у 8-годцы ў в. Пархімаўцы (Бераставіцкі р-н). Скончыў СШ №1 у Вялікай Бераставіцы (1968). Працаваў экспедытарам аптова-гандлёвай базы Бераставіцкага РайПА (1968-69). Служыў у войску (1969-71). У 1976 скончыў гістарычна-педагагічны факультэт Гродзенскага педінстытута. Быў лабарантам на кафедры філасофіі (1976-77), выкладаў на кафедры гісторыі СССР і БССР (1977-79). У 1979-82 — аспірант БДУ. З 1982 — выкладчык (з 1984 — на пасадзе дацэнта) кафедры ўсеагульнай гісторыі Гродзенската універсітэта. Адначасова з 1983 — старшыня прафкама супрацоўнікаў гэтага універсітэта. Друкуецца з 1979. Вывучае аграрныя працэсы ў Беларусі сярэдзіны XIX ст.

**Хлябцэвіч Іван Андрэевіч** (1857, в. Сядзельнікі Ваўкавыскага р-на — 25.07.1919), беларускі краязнавец, публіцыст, праваслаўны духоўнік. З сям'і псаломшчыка. Скончыў у Вільні праваслаўную духоўную семінарыю і паступіў у Пецярбургскую праваслаўную духоўную акадэмію. На 2-ім курсе пакінуў вучобу з-за хваробы. Выкладаў старажытна-грэчаскую і лацінскую мовы, геаграфію ў Жыровіцкай духоўнай вучэльні (Слонімскі р-н). Адначасова загадваў бібліятэкай Жыровіцкага манастыра. Вывучаў мясцовую даўніну, помнікі тутэйшай гісторыі. Друкаваўся ў часопісах "Гродненские Епархиальные Ведомости", "Литовские Епархиальные Ведомости". З 1897 працаваў святаром у в. Клейнікі Бельскага павета (Беласточчына). Загадваў тут вясковай бібліятэкай-чытальняй імя Паўленкава. У 1915 эвакуяваўся з сям'ёй у г. Сызрань, супрацоўнічаў у газеце "Сызранский курьер". У 1917 працаваў у Сызранскай управе, пасля пераехаў у в. Абшчараўка Сызранскага павета. Друкаваўся на мясцовыя тэмы ў "Известиях Самарского Совета рабочих депутатов". Выдаў у Вільні брашуры "Кароткі гістарычны нарыс абраза Жыровіцкага манастыра", "Іясафат Жарскі, правінцыял Літоўскіх базыльянскіх манастыроў...", "Жыровіцкае брацтва Міласэрнасці Прасвятой Дзевы Марыі" (1900). У Сызрані ў 1917 асобным выданнем выйшаў яго "Вянок бацькі на магілу сына. Ахвяра вялікай рэвалюцыі. Кароткі біяграфічны нарыс студэнта У. І. Хлябцэвіча".

**Хлябцэвіч Яўген Іванавіч** (6.08.1884, мяст. Жыровічы Слонімскага р-на — 20.10.1953), беларускі і рускі бібліятэказнавец, літаратуразнавец, публіцыст, педагог. Кандыдат педагагічных навук (1947). З сям'і выкладчыка духоўнай вучэльні. Сын І. Хлябцэвіча. Скончыў Жыровіцкую духоўную вучэльню (1900), праваслаўную духоўную семінарыю ў Вільні (1906), фізічна-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1913). Адзін з арганізатараў Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, гуртка па вывучэнні Гродзенскай губерні. Удзельнік 2-га з'езду Беларускай сацыялістычнай грамады (1906). Актыўна ўдзельнічаў у працы выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца". Дэлегат Усерасійскага з'езду па бібліятэчнай справе (1911), на якім выступіў з дакладам "Развіццё бібліятэк у Беларусі". У 1914-17 служыў у войску, быў на фронце. У 1918 кіраваў дзейнасцю бежанскіх беларускіх арганізацый на Украіне. З 1919 — загадчык бібліятэчнага аддзела палітуправы Рэўваенсавета. З 1930 працуе ў Наркамаце асветы, у выдавецтвах РСФСР. У 1943-53 быў выкладчыкам, вучоным сакратаром Маскоўскага бібліятэчнага інстытута. Друкаваўся з 1906 у перыёдыках "Наша доля", "Наша ніва", "Русь", "Новая Русь", "Белорусское эхо", "Жизнь национальностей", "Варта", "Узвышша", "Полымя". Аўтар шматлікіх карэспандэнцый, бібліяграфічных і літаратуразнаўчых артыкулаў, успамінаў пра справы беларускай культуры. Выдаў кніжкі "Бібліятэкі і кааперацыя" (Коўна, 1912), "Народніцкая паэзія беларусаў" (Петраград, 1917), "Масавы чытач і антырэлігійная прапаганда" (М., Л., 1928), "Масавы чытач і работа з кнігаю" (М., 1936).

**Хмара Сяргей** (сапр. Сіняк, 25.05.1905, мяст. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-на — 4.09.1992), беларускі пісьменнік (паэт, празаік, публіцыст), журналіст, выдавец. Адукацыю набываў самастойна. З пач. 20-х удзельнічаў ва ўзброенай барацьбе супраць польскай улады ў Заходняй Беларусі. З сярэдзіны 20-х актыўна працуе ў руху Грамады, ТБШ. У 1927 арыштоўваўся, у 1928-29 зняволены ў турме. У 1930 — сакратар пасольскага клуба "Змаганне" ў Пінску. У 1931 — інструктар Галоўнай управы ТБШ у Вільні. У 1932 зноў зняволены ў турме. Неаднаразова спрабаваў выдаваць у Вільні літаратурны часопіс. Стварыў на Дзятлаўшчыне літаратурную арганізацыю "Баявая Ускалось". У пач. 1939 удзельнічаў у нелегальнай канферэнцыі прыхільнікаў Грамады ў Баранавічах. Летам 1939 зняволены ў Картуз-Бярозе. Вызвалены ў верасні 1939. Быў намеснікам начальнікага гарадскога атрада рабочай гвардыі Слоніма. Працаваў тут у райгазеце "Вольная праца". Неўзабаве рэпрэсаваны савецкімі ўладамі і

вывезены ў Мінск. Летам 1941 (ва ўмовах акупацыі) вярнуўся ў Слонім. Працаваў тут на мясцовым радыё, у газеце "Слонімскі кур'ер", займаўся прыватным кнігагандлем. Дэлегат 2-га Усебеларускага кангрэса (1944), выехаў у Германію. У 1945 у Берліне працаваў дырэктарам Беларускага інфармацыйнага бюро. Нядоўгі час рэдагаваў газету "Голас беларуса". Удзельнічаў у нелегальнай канферэнцыі Беларускай нацыянальнай партыі. У гэтым жа годзе выехаў у Канаду, стала жыў у Таронта. У 1948-52 узначальваў сектар Рады БНР у Канадзе. Выдаваў газету "Беларускі голас" (1949-92), часопіс "Баявая Ускалось" (1954-81). Вёў шырокую асветна-патрыятычную працу сярод беларускай эміграцыі ў Канадзе. Друкаваўся як паэт з 1928 у перыёдыках "Рунь веснаходу", "Калоссе", "Шлях моладзі". Выдаў зборнік вершаў "Жураўліным шляхам" (Вільня, 1939). У 1986 у Таронта выйшла яго кніга "Аб багох крывіцкіх сказы: Беларуская міфалогія" (літаграфічна была выпушчана ў Беластоку ў 1948).

**Хмурчык Міхаіл Лукашавіч** (21.12.1929, в. Палонка Свіслацкага р-на), беларускі спартыўны педагог. Заслужаны трэнер Беларусі (1979). У роднай вёсцы скончыў 7 кл. Вучыўся ў Ваўкавыскай педагагічнай вучэльні (1946-49). Быў загадчыкам пачатковай школы ў Шурычах (Свіслацкі р-н) у 1949-50. Служыў у войску (1950-53). Выкладаў фізкультуру і ваенную справу у Гродзенскай СШ №9 у 1953-54 і Свіслацкай СШ у 1954-63 (у 1961 завочна скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры). Працаваў інспектарам Свіслацкага РайАНА (1963-69), старшынёй Свіслацкага спорткамітэта (1969-70). У 1970-94 — намеснік старшыні спорткамітэта Гродзенскага аблвыканкама. Быў метадыстам у Гродзенскай вучэльні алімпійскага рэзерву. З 1997 — метадыст цэнтра фізвыхавання і спорту ўправы адукацыі Гродзенската аблвыканкама.

**Хмялеўскі Багдан** (18.09.1927, г. Гродна), польскі скульптар, мастацкі педагог. Пасля вайны сям'я пераехала ў Польшчу. Скончыў Акадэмію мастацтваў у Варшаве (1956). Працаваў у гэтай акадэміі асістэнтам (1955-61), ад'юнктам (1961-89), затым дацэнтам. Пераможца польскіх і міжнародных (Сафія, Парыж) конкурсаў. Выканаў помнікі Марыі Канапніцкай (Сувалкі, 1963), "Братэрства па зброі" (Новагард, 1972), Мікалаю Каперніку (Улан-Батор, 1974), героям Беластоцкай зямлі (Беласток, 1975), Першай Арміі Войска Польскага (Берлін, 1978), польскім салдату і матросу (Нарвік, 1979).

**Хмялеўскі Збігнеў** (1.12.1926, г. Слонім), польскі кінарэжысёр. З сям'і настаўнікаў. У 1930 бацьку перавялі працаваць у Вільню, тут жыла сям'я. У 1939 скончыў у Вільні 7-годку. Пазней, падчас змены ўладаў вучыўся тут урыўкамі ў гімназіі. У 1948 пераехалі ў Польшчу. Экзамен за сярэднюю школу здаў у ліцэі пры Вышэйшай сельскагаспадарчай школе у Лодзі (1950). У Лодзі скончыў Вышэйшую школу кіно (1956). Працаваў кінарэжысёрам на студыі "Згуртаванне вытворцаў фільмаў" (1957-77), на студыі тэлефільмаў "Палітэль" (1977-91). Паставіў мастацкія фільмы "Прыгожым было пахаванне, людзі плакалі" (1967), "Таблічка мараў" (1968), "Твар анёла" (1970), "Шлюбная аб'ява" (1972), "Прафесар на дарозе" (1973), тэлесерыялы "Дырэктары" (1975), "Далёка да шашы" (1976), "След на зямлі" (1978), "Аперацыя "Гімлер" (1979), "Блізка, штораз бліжэй" (1982). У 80-я паставіў 2-ю частку серыялу "Блізка, штораз бліжэй" (8 серый) і з 12-ці серый фільм "Сям'я Кандэраў".

**Целеш Вячка** (Вячаслаў Міхайлавіч, 25.09.1938, в. Краснае Сяло Ваўкавыскага р-на), беларускі культурны дзеяч, мастак, калекцыянер. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1995). З сям'і рабочага. Вучыўся ў Краснасельскай СШ. У 1956-58 і 1960 працаваў у вытворчым аб'яднанні "Ваўкавыскцэментнашыфер" (рабочым, вучнем слесара, мастаком-афармляльнікам). У 1959 у Рызе працаваў слесарам у аб'яднанні "Рыжскцэмрамонт", тут наведваў студыю выяўленчага мастацтва (1960-61). Служыў у войску (1961-64). Працаваў у Прамбудрамонце (Рыга) і наведваў падрыхтоўчыя курсы пры Латвійскай акадэміі мастацтваў (1964-70). У 1970-75 вучыўся на педагагічным аддзяленні гэтай акадэміі. Быў мастаком-афармляльнікам у будаўнічай фірме ў Рызе. Стваральнік і кіраўнік беларускай дзіцячай мастацкай студыі "Вясёлка". Арганізатар і старшыня аб'яднання беларускіх мастакоў Балтыі "Маю гонар" (1991). Актыўна працуе ў Таварыстве беларускай культуры ў Латвіі "Світанак" (з 1995 — намеснік старшыні). Арганізатар у Рызе беларускай нядзельнай школы. З 1994 — дырэктар Рыжскай дзяржаўнай беларускай школы. Калекцыянуе беларускія і латышскія паштоўкі, на іх матэрыяле — многія гістарычна-краязнаўчыя публікацыі (з 1977) у навуковым і масавым друку. Выдаў альбом "Мінск на старых паштоўках" (1984), камплект "Рыга на даўніх паштоўках" (Рыга, 1987, у сааўт., на рус. мове), альбомы "Рыга ў даўніх паштоўках" (Рыга, 1991, на латышскай, рускай, англійскай, нямецкай мовах), "Гарады Беларусі на старых паштоўках" (1998). Як жывапісец працуе ў жанрах партрэта, пейзажа, нацюрморта. Як графік стварае экслібрысы, партрэты, умоўныя

кампазіцыі. У выставах — з 1976 (у Беларусі, Латвіі, Літве, Эстоніі, ЗША, Канадзе, Даніі, Швецыі, Фінляндыі). Партрэты (пераважна кампазіцыйныя): "У лекарскіх навуках доктар Францішак Скрыта", "Першыя крокі ў свет. Францішак Скарына ў Рызе", "Маці наша — Дзвіна-Даўгава (Янка Купала і Райніс)", "Партрэт бацькі", "Партрэт паэта С. Панізніка", "Першаму беларускаму драматургу прысвячаецца. (В. Дунін-Марцінкевіч)", "Князь Вячка", "Першабытны шахцёр з Краснасельскіх шахтаў", партрэты З. Верас, К. Езавітава, А. Белакоза. Пейзажы і нацюрморты: "Зямное сонца", "Хата ў Спрыдышах", "Нацюрморт з ручніком". У графіцы — цыкл "Касмічныя шляхі", сатырычны цыкл "У ценю часу трыумфаў", экслібрысы У. Караткевіча, З. Верас, Л. Луцкевіча, А. Мальдзіса, У. Арлова. Творы зберагаюцца ў музейных і прыватных зборах Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Румыніі, Кітая, ЗША, Канады.

**Церабун Мікалай Васілевіч** (11.04.1946, в. Несцяняты Смаргонскага р-на), беларускі мастак (скульптар, графік, жывапісец). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1977). З сям'і рабочага лесазавода. Вучыўся ў I кл. у в. Лычнікі (Смаргонскі р-н), скончыў СШ №1 г. Смаргоні (падчас вучобы — цымбаліст у Смаргонскім ансамблі песні і танца). Працаваў інструктарам у раённым Доме піянераў у Смаргоні (1964-65). Служыў у войску (1965-68). Скончыў па спецыяльнасці "скульптура" Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1973). Працаваў у Гродзенскіх мастацка-вытворчых майстэрнях (1973-79). Быў старшынёй абласнога аддзялення Саюза мастакоў (1979-87). Затым — старшыня Гродзенскага фонду свабоднага сучаснага мастацтва (1991 — 95, з 1997). У выставах — з 1974 (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Эстоніі, Літве, Германіі, Англіі). Працуе пераважна як скульптар — у станковай, манументальнай скульптуры, дробнай пластыцы (матэрыял — гіпс, гліна, шамот, дрэва, шкло, бронза, мармур, алюмінь). Аўтар станковых кампазіцый "Расстраляная песня. Памяці В. Хары" (1976), "Дрэва жыцця" (1977), "Сымон-музыка" (1980), "Летапісец" (1981), "Адыйшоў у бессмяротнасць. Памяці М. Мароза" (1982), "Эха" (1986), "Жалейка" (1987), "Ясь і Яніна" (1987), "За хлеб" (1988), манументальных кампазіцый "Дальва" (1973), пано-рэльефа "Піянерыя" для Палаца піянераў г. Гродна (1976), кампазіцыі "Апошняе жніво", памяці жыхароў в. Алексічы Хойніцкага р-на (1981), скульптуры з мазаікай для басейна вытворчага аб'яднання "Азот", г. Гродна (1989), кампазіцыі са шкла і металу з крыніцай святла для дзіцячага дома у г. Ліда (1991), "Ветразя" каля гасцініцы "Турыст" у Гродне (1992), скульптуры апосталаў Пятра і Паўла для

Слонімскага касцёла св. Андрэя (1994), скульптуры Хрыста для Бернардынскага касцёла ў Гродне (1996), партрэтаў Ю. Гагарына (1977), А. Шыдлоўскага (1977), К. Цыялкоўскага (1978), К. Лышчынскага (1985), серыі керамічных работ (1993). Выканаў серыю рысункаў "Ракурс" (1985). У жывапісе (пейзаж) працуе з 1996. Творы захоўваюцца ў калекцыях у Германіі, Польшчы, Італіі, Англіі, Японіі, ЗША, Аўстраліі.

**Цётка** (Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна, у замужжы Кейрыс, 15.07.1876, маёнт. Пясчына Шчучынскага р-на — 18.02.1916), беларуская грамадска-культурная дзяячка, асветніца, пісьменніца, артыстка тэатра, педагог, выдавец. З заможнай сялянскай сям'і. Дзяцінства праходзіла ў маёнт. Тэрэсін (1879-85) і ў Старым Двары (Шчучынскі р-н), дзе вучылася ў хатняй настаўніцы. Скончыла ў Вільні прыватную 7-класную вучэльню (1901). Настаўнічала на вёсцы. Удзельнічала ў стварэнні Беларускай сацыялістычнай грамады (1902), выданні часопіса "Свабода" (1902). Здала экстэрнам экзамен за курс гімназіі і вучылася на Вышэйшых агульнаадукацыйных курсах П. Лесгафта ў Пецярбургу (1902-04). Працавала фельчарам у Новавілейскай псіхіятрычнай лякарні. Удзельнічала ў з'ездзе жанчын у Маскве (1905). Вяла агітацыю супраць самаўладдзя. Аддадзеная пад суд, эмігравала ў Галіцыю. Вучылася як вольная слухачка на філасофскім факультэце Львоўскага універсітэта (1906-08, 1910-11), на гуманітарным факультэце Кракаўскага універсітэта (1908-09). Прыязджала ў Вільню (удзельнічала ў выданні газеты "Наша доля"), у Пецярбург. Падарожнічала па Італіі (1908). Лячылася ў Закапаным. З 1911 — у Вільні, Мінску. Была артысткаю тэатра І. Буйніцкага (выступала ў спектаклях "Па рэвізіі" М. Крапіўніцкага, "У зімовы вечар" паводле Э. Ажэшкі). Арганізоўвала тайныя, з 1915 легальныя беларускія школы (ля Вільні, у Лідзе), вучыла дзяцей. Выдавала ў Мінску часопіс для дзяцей і моладзі "Лучынка" (1914). Падарожнічала па Скандынавіі. У 1915 — фельчар у тыфозным салдацкім бараку ў Вільні. У пач. 1916 прыехала ў родныя мясціны, дзе лячыла хворых на тыф. Друкавалася з 1902. Пісала вершы, апавяданні, публіцыстычныя і народазнаўчыя артыкулы, нарысы аб прыродзе, даследавала беларускі народны тэатр. Асобнымі лістоўкамі выдаваліся ў 1905 яе вершы "Мора", "Пад штандарам", "Хрэст на свабоду". Выдала ў Жоўкве ля Львова зборнікі вершаў "Хрэст на свабоду" (1906), "Скрыпка беларуская" (1906), зборнік перакладаў з украінскай мовы "Гасцінец для малых дзяцей" (1906). У Пецярбургу выйшла яе "Першае чытанне для дзетак беларусаў" (1906). Выпусціла "Праграму для

збірання матэрыялаў аб батлейках на Беларусі" (Вільня, 1910). У рукапісе застаўся яе "Малітоўнік для беларускіх дзетак".

**Ціхановіч Ян Станіслававіч** (2.07.1946, мяст. Варняны Астравецкага р-на), польскі грамадска-культурны дзеяч, філосаф, культуролаг, педагог, публіцыст. Кандыдат філасофскіх навук (1983). Дацэнт (1986). З сям'і кіраўніка мясцовай рыбнай гаспадаркі. Скончыў у Варнянах СШ (1964). Паступіў у Мінскі педінстытут замежных моваў (аддзяленне нямецкай мовы). Скончыў інстытут завочна (1971), пасля службы ў войску. Завочна вучыўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі. Працаваў перакладчыкам у гэтым інстытуце, у навуковай бібліятэцы Беларускага інстытута фізічнай культуры (1968-70). З 1970 жыве ў Вільнюсе. Настаўнічаў у Майшаголе (пад Вільнюсам). З 1974 — карэспандэнт газеты "Czerwony Sztandar". Адначасова з 1975 выкладаў як сумяшчальнік філасофію ў Вільнюскім універсітэце і Вільнюскім педінстытуце. З 1986 — дацэнт кафедры філасофіі гэтага педінстытута, адначасова з 1989 — намеснік дэкана аддзялення польскай мовы і літаратуры педінстытута. Актыўна дзейнічаў як абаронца правоў нацыянальных меншасцяў у Літве. У 1989-91 дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. У 1991-93 не меў працы ў Літве. У 1993-94 выкладаў замежныя мовы і філасофію ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Быдгашчы (Польшча). З 1994 — у педагагічным універсітэце ў Жэшуве (Польшча). Рэдагуе ў Вільнюсе (з 1994) навукова-літаратурны квартальнік "W kręgu kultury". Навуковыя інтарэсы — у галіне філасофіі, сацыяльнай псіхалогіі, гісторыі культуры, дзейнасці палякаў на ніве культуры народаў-суседзяў. Аўтар шматлікіх артыкулаў, нарысаў, эсэ ў перыёдыках Літвы, Польшчы, Беларусі, Расіі, ЗША, Канады, Германіі. Выдаў кнігу "Каталіцкая царква і барацьба за мір" (1985, на рус. мове). На польскай мове выйшлі: "У рэчышчы прагрэсіўных традыцый" (Каўнас, 1987), "На віленскай Росе" (Познань, 1990), "На ўсход ад Буга" (Чыкага, 1991), "Трынаста справядлівых" (Вільна, 1993), "Думка і справа" (Варшава, 1994), "Польскія старонкі рускай навукі і культуры" (Таронта, 1994).

**Цобкала Андрэй Анатолевіч** (14.02.1955, г. Навагрудак), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1984). Дацэнт (1991). З сям'і настаўнікаў. У 1958 пераехалі ў мяст. Мір Карэліцкага р-на, дзе скончыў СШ (1972). Вучыўся на гістфаку Мінскага педінстытута (1972-77). Служыў у войску (1977-79). Быў

сакратаром камітэта камсамола Мінскага тэхналагічнага тэхнікума (1979-81). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры гісторыі КПСС Мінскага педінстытута (1981-84). Выкладаў на гэтай кафедры (адначасова ў 1985-86 — сакратар камітэта камсамола педінстытута). Пасля — выкладчык кафедры палітычнай гісторыі. З 1991 — на кафедры гісторыі Беларусі, адначасова — намеснік дэкана гістфака педінстытута (Беларускага педагагічнага універсітэта). Вывучае сацыяльна-эканамічныя і этнічныя працэсы жыцця Беларусі 2-ой пал. XVIII — І-ай пал. XIX ст. (друкуецца з 1982).

**Цыхун Апанас Пятровіч** (5.05.1910, в. Кунцаўшчына Гродзенскага р-на), беларускі педагог, краязнавец, пісьменнік. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967). З сялянскай сям'і. Пачатковае навучанне — у в. Паша Гродзенскага р-на, 7-годку скончыў у мяст. Індура Гродзенскага р-на (1923). Вучыўся ў настаўніцкай семінарыі ў Гродне, з 4-га курса прызваны ў войска. Служыў у войску ў 1930-32. Займаўся гаспадаркай на вёсцы. У 1937 пераехаў з сям'ёй у Гродна. У ліпені 1939 зноў прызваны ў войска. Удзельнічаў у баях з войскам Германіі пад Варшавай, трапіў у палон. Неўзабаве вырваўся, вярнуўся дадому. Настаўнічаў у Лашанскай 7-годцы (1939-41). Узяты Саветамі на вайсковыя зборы, служыў на Беласточчыне, дзе ўдзельнічаў у баявых дзеяннях супраць нямецкіх войск у чэрвені 1941. У выніку адступлення Чырвонай Арміі вярнуўся ў родныя мясціны. Жыў пераважна на вёсцы (Агароднікі Гродзенскага р-на), працаваў на гаспадарцы, вечарамі вучыў дзяцей. У 1944-45 — завуч Лашанскай 7-годкі. Быў дырэктарам 7-годкі ў в. Капцёўка Гродзенскага р-на (1945-46), настаўнікам польскай СШ №2 г. Гродна (1946-48), загадчыкам пачатковай школы ў в. Каўбасіна Гродзенскага р-на (1948-49). У 1949-68 — інспектар Гродзенскага РайАНА. У 1950 завочна скончыў літфак Гродзенскага педінстытута, выкладаў беларускую мову і літаратуру. У 1968-70 быў дырэктарам Батароўскай 8-годкі (Гродзенскі р-н). Кіраваў Гродзенскім раённым літаб'яднаннем у 1950-70. Стваральнік у 1964 мемарыяльнага музея Я. Ф. Карскага ў в. Лаша (дзейнічаў да 1997). Як краязнавец вывучаў Гродзенскі р-н — збіраў народныя гаворкі, фальклор, этнаграфічныя матэрыялы, звесткі пра вядомых людзей рэгіёну, пра яго гістарычнае мінулае. Друкуе вершы, апавяданні, нарысы, краязнаўчыя артыкулы і даследаванні. Выдаў кнігі "Акадэмік з вёскі Лаша Я. Ф. Карскі" (Гродна, 1992), "Скарбы народнай мовы" (Гродна, 1993), "Легенды і былі Гродзеншчыны" (Гродна, 1995).

**Цыхун Генадзь Апанасавіч** (30.10.1936, в. Кутаўшчына, Гродзенскага р-на), беларускі мовазнавец-славіст. Доктар філалагічных навук (1982). З сям'і інтэлігента, які працаваў на гаспадарцы. Сын А. Цыхуна. У 1937 пераехалі ў Гродна. Скончыў Гродзенскую СШ №6. У 1958 скончыў аддзяленне славянскай філалогіі філфака Ленінградскага універсітэта. У 1958-59 працаваў у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. Вучыўся ў аспірантуры на кафедры славянскай філалогіі Ленінградскага універсітэта (1959-61). Працягваў вчобу як аспірант-стажор у Сафійскім універсітэце (Балгарыя) у 1961-63. З 1963 — зноў у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі (у 1975-76 — стажор-даследчык у Варшаўскім і Кракаўскім універсітэтах). З 1990 — загадчык аддзела славянскага і тэарэтычнага мовазнаўства Інстытута мовазнаўства. Даследуе тыпалогію славянскіх моваў і іх сувязі, гісторыю мовазнаўчай славістыкі, праблемы праславянскай мовы, беларускую этымалогію, беларускія дыялекты. Выдаў манаграфіі "Сінтаксіс займеннікавых клітык у паўднёваславянскіх мовах: Балканаславянская мадэль" (1968), "Тыпалогія сінтаксічных адрозненняў у балкана-славянскім арэале" (1978), "Тыпалагічныя праблемы балкана-славянскага моўнага арэала" (1981), "Славянскія мовы ў святле экалінгвістыкі" (1998). Аўтар даследаванняў, з якімі выступаў на кангрэсах славістаў: "Энкліза і пракліза ў структуры славянскага сказа" (1968), "Паўднёваславянска-ўсходнеславянскія моўныя сувязі: Да праблемы славянскага ўкладу ў балканскі моўны саюз" (1983), "Арэальная тыпалогія славянскіх моў: Прынцыпы і напрамкі даследавання" (1988), "Арэальныя аспекты фарміравання славянскіх літаратурных моў" (1993). Сааўтар "Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы". Т. 1-8 (1978-93), "Тураўскага слоўніка". Т. 1-5 (1982-87). Сябра Міжнароднага камітэта славістаў і міжнародных камісій гэтага камітэта (па бібліяграфіі мовазнаўчай славістыкі, па славянскай лексікаграфіі і этымалогіі, па балканскім мовазнаўстве). Вучоны скаратар Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (1991), віцэ-прэзідэнт гэтай асацыяцыі (1995). Старшыня тэрміналагічнай камісіі пры Міністэрстве адукацыі Беларусі (1995). Старшыня правапіснай камісіі Таварыства беларускай мовы (1990).

**Цяжкі Артур Восіпавіч** (23. 07.1943, в. Лылойці Смаргонскага р-на — 5.04.1984), беларускі пісьменнік, журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1981). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў 7-годцы ў Нястанішках (Смаргонскі р-н), скончыў Свірскую СШ на Мядзельшчыне (1963). Быў трактарыстам, супрацоўнікам райгазеты ў

Смаргоні "Светлы шлях". Служыў у войску (1963-66). Дэмабілізаваўшыся, вярнуўся ў газету "Светлы шлях". У 1969-70 — карэспандэнт газеты "Чырвоная змена". Затым жыў у Брэсце, працаваў карэспандэнтам "Чырвонай змены" па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, карэспандэнтам Брэсцкай абласной газеты "Заря" (1970-72). Працаваў паркетчыкам у будаўнічай управе №33 г. Брэста (1973-74). Затым — у раённай газеце "Астравецкая праўда" (1974-77). У 1978 нядоўга быў адказным сакратаром Гродзенскага абласнога таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. У гэтым жа годзе пераехаў у Мінск. Працаваў у газетах "Голас Радзімы", "Знамя юности". У 1978 завочна скончыў журфак БДУ. З 1981 — у Гродне, дзе быў метадыстам абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы. Як паэт друкаваўся з 1957, празаік — з 1966. Выдаў зборнікі апавяданняў "Сустрэча пасля вясны" (1980), "Пара блакітных дажджоў" (1982). Склаў буклет "Народныя майстры Гродзеншчыны" (Гродна, 1983). У 1986 выйшла яго кніга аповесцяў і апавяданняў "Дзе мой дом?".

**Цясевіч Платон Іванавіч** (7.12.1879, мяст. Нягневічы Навагрудскага р-на — 30.11.1958), рускі спявак (бас). Народны артыст РСФСР (1947). З сям'і цесляра. У 1890 пераехалі дзеля заробкаў у Кіеў. Працаваў з бацькам у сталярнай майстэрні. Спяваў у хоры Сафійскага сабора. Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе, 2 гады — у гарадской вучэльні. З 1897 — у Екацерынаславе, дзе працаваў мадэльшчыкам на металургічным заводзе, спяваў у царкоўным хоры, прыватна вучыўся вакалу. Затым працаваў на машынабудаўнічым заводзе ў Бранску. З 1901 — у трупе Н. Балсуноўскага, якая выступала на Украіне. З 1902 — у трупе Украінскай музычнай камедыі (партыі ў аперэтах М. Лысенкі, С. Гулак-Арцямоўскага). Гастралявалі на Украіне, у Беларусі, Польшчы. Пэўны час выступаў на эстрадзе ў Пецярбургу, браў тут урокі спеваў. З 1904 — саліст Харкаўскай оперы (гастролі ў Пецярбургу, Адэсе, Ніжнім Ноўгарадзе, Растове, Саратаве). З 1906 спявае ў Кіеўскім оперным тэатры (гастролі ў Маскве, Рызе, Баку, Берліне, Празе, Парыжы). З 1915 — у Вялікім тэатры ў Маскве. Выязджаў з канцэртамі ў Заходнюю Еўропу. У 1925-33 працаваў на опернай сцэне ў Італіі, Іспаніі, Англіі, Францыі, Румыніі. З 1933 — у СССР. Быў салістам Гастрольбюро. Выступаў у БССР. Падчас вайны — у оперных тэатрах Баку, Тбілісі. З 1944 быў спеваком Усесаюзнага канцэртнага аб'яднання. Закончыў сцэнічную дзейнасць у 1949. У рэпертуары — партыі Мефістофеля ("Фаўст" Ш. Гуно), Барыса Гадунова ("Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага), Млынара ("Русалка" А.

Дарагамыжскага), Рыгалета ("Рыгалета" Д. Вэрдзі), дон Базіліо ("Севільскі цырульнік" Д. Расіні), Канчака ("Князь Ігар" А. Барадзіна), Філіпа ("Дон Карлас" Д. Вэрдзі), Качубея ("Мазепа" П. Чайкоўскага), Сусаніна ("Іван Сусанін" М. Глінкі), Тараса Бульбы ("Тарас Бульба" М. Лысенкі), Дасіфея ("Хаваншчына" М. Мусаргскага), Анегіна, Грэміна ("Яўгені Анегін" П. Чайкоўскага), рамансы, рускія, беларускія, украінскія народныя песні.

**Чамярыцкі Вячаслаў Антонавіч** (22.07.1936, в. Рабкі Дзятлаўскага р-на), беларускі крытык і літаратуразнавец, культуролаг. Кандыдат філалагічных навук (1967). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1983). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994). З беднай сялянскай сям'і. З 1937 жылі ў Навагрудку, тут скончыў беларускую СШ (1953). Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1953-58). Настаўнічаў у 7-годцы ў в. Слабада на Вілейшчыне (1958-59), быў карэктарам Маладзечненскай абласной газеты "Чырвоны сцяг" (1959), інспектарам Маладзечненскага РайАНА (1959-62). Скончыў аспірантуру ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1965) і працуе ў гэтым інстытуце (з 1991 — загадчыкам аддзела старажытнай і новай беларускай літаратуры). Друкаваў вершы з 1952. З 1959 — артыкулы, рэцэнзіі. Выдаў даследаванні "Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў" (1969), "Беларускі тытан эпохі Адраджэння" (1990). Сааўтар "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры". Т. I (1968), "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры" (1977, на рус. мове), кніг "Францыск Скарына" (Парыж, 1979, на французскай мове, 1980, на англійскай мове), "Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры" (1982), "Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд" (1985, 2-е выд. 1998), "Сведкі беларускай мінуўшчыны" (1996). Аўтар шматлікіх публікацый у энцыклапедыях, навуковых зборніках. Рэдактар літаратуразнаўчых прац, зборнікаў матэрыялаў на тэмы старажытнай беларускай літаратуры і культуры.

**Чарвякоўскі Мікалай Андрэевіч** (1891, г. Гродна — канец 70-х), беларускі і рускі кнігазнавец, калекцыянер, публіцыст. З сям'і чыноўніка. Скончыў гімназію ў Гродне (1912). Вучыўся ў Юр'еўскім (Тартускім) універсітэце, праз год перавёўся на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1917. Жыў у Калузе, куды бацькі выехалі ў бежанства, меў працу ў дзяржаўных установах. Быў сябрам "Беларускай вучнёўскай грамады" (1918). Служыў у Чырвонай

Арміі пісарам. Дэмабілізаваны ў 1922, вярнуўся ў Гродна. Працаваў рабочым на лесазаводзе, карэктарам у друкарні, даваў прыватныя ўрокі. З 1926 — бібліятэкар у рускіх дабрачынных таварыствах Гродна. Друкаваўся ў рускіх перыёдыках Польшчы. У 1939-41 — у Гродзенскай гарадской бібліятэцы. У час вайны — на бібліятэчнай рабоце ў Гродне. З лета 1944 — ст. бібліятэкар гарадской бібліятэкі (у гэтым годзе арыштоўваўся савецкімі ўладамі). У 1952 рэпрэсаваны і зняволены ў канцлагеры. У 1956 вызвалены. Некаторы час працаваў у Дзяржаўным гістарычным архіве ў Гродне. Калекцыянаваў рэдкія кнігі, геаграфічныя карты, атласы, паштовыя маркі. Калекцыі не захаваліся.

**Чарнецкі Эдуард** (1774, мяст. Шчучын — 5.03.1831), польскі педагог. Вывучаў у Берліне педагогіку і філалогію. Выдаў працу "Прынцыпы адукацыі паводле Нямейера" (Варшава, 1808) з дадаткам "Пра якасці настаўніка і падрыхтоўцы да настаўніцкага стану". Удзельнічаў у арганізацыі школьніцтва ў Варшаўскім рэгіёне. З 1810 — сябра Таварыства кніг элементарных. З 1816 — сакратар Таварыства сяброў навук у Варшаве.

**Чарнышова Людміла Аляксандраўна** (12.02.1955, г. Гродна), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1987). Скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1979). Працуе ў галіне графічнага і індустрыяльнага дызайна. Жыве ў Мінску. Удзельнічае ў выставах з 1975 (у Беларусі, на Украіне). Сярод асноўных работ — фірмовыя стылі арганізацый "Лантрэ", "Эканомпрэс", "ФУАінформ", серыя буйнагабарытных цацак з пластмасы.

**Чарнякевіч Андрэй Мікалаевіч** (8.11.1974, г. Гродна), беларускі гісторык. З сям'і педагогаў. Скончыў Гродзенскую СШ №18. Вучыўся на гістфаку Гродзенскага універсітэта (1991-96), адначасова завочна вучыўся на юрыдычным факультэце гэтага універсітэта (скончыў у 1999). У 1996-99 — аспірант кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага універсітэта. Вывучае праблемы польска-савецкай вайны 1919-20 у кантэксце гісторыі Беларусі. Друкуецца з 1996. Выдаў кнігу "Гарадзенскія апосталы: Беларускі нацыянальны рух. Гародня. 1918-1920 гг." (Гродна, 1999).

**Чарняўскі Георгі Іванавіч** (29.04.1909, мяст. Іўе — 13.07.1985), беларускі мастак. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1960). Вучыўся

ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1930-33). Працаваў у беларускім таварыстве "Белмастак" (1933-41). Удзельнік вайны 1941-45, адзначаны баявымі ўзнагародамі. Мастацкая творчасць — у галіне інтэр'ераў, прыкладной графікі. Удзельнічаў у афармленні беларускага павільёна на УСГВ у Маскве (1939, 1952-54), тэатральнай выставы з нагоды Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве (1940), грамадскіх будынкаў у Мінску, у тым ліку крамы "Паўлінка" (1952), аўтавакзала (1962), Палаца культуры аўтазавода (1975). Прымаў удзел у святочным афармленні Мінска да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад гітлераўскай акупацыі (1964).

**Чарняўскі Францішак Янавіч** (15.11.1893, в. Чухны Смаргонскага р-на — 31.05.1979), беларускі выдавец, каталіцкі духоўнік. З сялянскай сям'і. Скончыў гарадскую вучэльню, Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1920). Служыў вікарам на Беласточчыне (Сухаволя, Саколка, Кузніца), дзе вёў беларускую патрыятычную працу сярод насельніцтва. Скончыў Усходні папскі інстытут у Рыме (1927). Быў вікарам у Вільні. У 1929-48 служыў на касцельнай ніве ў Францыі, арганізоўваў тут рабочых-беларусаў дзеля іх нацыянальнага самаўсведамлення. Затым служыў у Бельгіі, дзе таксама гуртаваў беларускіх эмігрантаў, нацыянальна выхоўваў іх. Выпускаў тут бюлетэнь-тыднёвік "Слова Божае" (1954-57). З 1957 жыў у ЗША, быў вікарам у розных гарадах. Выпускаў у 50-70-я альманах-двумесячнік "Сяўбіт". Выдаваў рэлігійныя і свецкія кнігі для беларускага чытача ў ЗША.

**Чартко Іван Восіпавіч** (5.02.1930, в. Ярошычы Навагрудскага р-на — 18.05.1975), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1968). Дацэнт (1971). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Валеўскай школе Навагрудскага р-на. У 1944-45 быў сакратаром сельсавета ў Валеўцы. Скончыў тут 7-годку (1946), заатэхнікум у Шчучыне (1949). У 1949-53 — студэнт факультэта замежных моваў Гродзенскага педінстытута. Працаваў у гэтым інстытуце выкладчыкам нямецкай мовы. У 1955 — сакратар Гродзенскага гаркама камсамола. З 1956 — зноў на кафедры замежных моваў Гродзенскага педінстытута. У 1963-66 вучыўся ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. Працягваў працу ў педінстытуце ў Гродне (з 1968 — загадчык кафедры замежных моваў). З мовазнаўчымі публікацыямі выступаў з 1964. Даследаваў лексіку нямецкага паходжання ў беларускай мове, беларуска-нямецкія лексічныя сувязі.

**Чачот Аляксандр** (21.05.1896, г. Навагрудак — ?), польскі скульптар. Вучыўся ў Кракаўскай акадэміі мастацтваў (1922-26) у К. Лашчкі. Быў сябрам аб'яднання скульптараў Лодзі. Удзельнічаў у выставах з 1930 (у Лодзі, Варшаве і інш). У 1937 атрымаў (з Я. Кабаном) узнагароду ў конкурсе на помнік Ю. Пілсудскаму.

**Чачот Ян Тадэвушавіч** (7.07.1796, в. Малюшычы Карэліцкага р-на — 23.08.1847), беларускі і польскі асветнік, паэт, фалькларыст. З сям'і беззямельнага шляхціца. Жылі ў маёнтку Рэпіхава (Брэстчына), пазней — пад Баранавічамі. Скончыў у Навагрудку дамініканскую школу (1815) і паступіў на факультэт маральна-палітычных навук Віленскага універсітэта. Праз год пакінуў універсітэт з-за матэрыяльных цяжкасцяў. Працаваў у канцылярыі (бюро) па ўпарадкаванні архіваў Радзівілаў (Вільня). Нярэдка прыязджаў у Лоўчыцы (Навагрудскі р-н), дзе жылі цяпер бацькі. У 1823 за актыўны ўдзел у рабоце таварыства філаматаў арыштаваны і зняволены ў Вільні, пасля сасланы на Урал. У 1833 вярнуўся ў Беларусь. Працаваў у Лепелі сакратаром кіраўніцтва Бярэзінскага канала. З 1839 — бібліятэкар у Шчорсаўскай бібліятэцы Храптовічаў. З 1845 жыў у родных мясцінах — у Бортніках, Вольнай, Далматаўшчыне. Літаратурная творчасць пачынаецца з філамацкіх часоў. Пісаў лірычныя і гістарычныя вершы, песні, пасланні, балады. Збіраў і вывучаў беларускі фальклор. Выдаў 6 зборнікаў "Вясковыя песенькі..." (Вільня, 1837-46), куды ўвайшло каля 1000 народных песень у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале, прыказкі і прымаўкі, беларуская лексіка (200 адзінак) і ўласныя беларускія вершы паэта. Прадмовы да зборнікаў — асветніцкія трактаты аўтара. Напісаў лексікаграфічныя працы на беларускім матэрыяле. Выдаў "Аповесці для маладых дзяўчат" (Вільня, 1846), "Асобныя заўвагі, што датычаць стылю трэцяй песні з "Вітаўтавых баёў" П. Крашэўскага" (Вільня, 1846). Перакладаў на польскую мову з англійскай і французскай моваў.

**Чобат Алесь** (Аляксандр Фёдаравіч, 23.08.1959, мяст. Скідзель Гродзенскага р-на), беларускі паэт, эсэіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1994). З сям'і службоўцаў. Скончыў Скідзельскую СШ №1 (1976), факультэт тэхналогіі арганічных рэчываў Беларускага тэхналагічнага інстытута (1981). Працаваў на Гродзенскім заводзе аўтамагнітол (канструктарам, тэхнолагам, начальнікам канструктарска-тэхналагічнага бюро) у 1981-86, інжынерам на ВА "Азот" (1986-89), інжынерам-канструктарам у кааператыве "Эл ТА" (1989-93), журналістам у "Гродненской правде" (1993-95), навуковым супрацоўнікам

музея М. Багдановіча ў Гродне (1995-97). Друкуецца як паэт з 1976. Выдаў кнігі вершаў "Год" (1992), "Крэсавякі" (1993, у сааўт.), "Новая Галілея" (1995), "Ты не самотны" (Гродна, 1997, у сааўт.), "Маўзалей" (Гродна. 1998), "Дажынкі" (Гродна, 1998).

**Чуйко Наталя Сцяпанаўна** (4.05.1948, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1978). З сям'і службоўцаў. Скончыла СШ №2 г. Гродна. Вучылася на аддзяленні архітэктуры архітэктурна-будаўнічага факультэта Беларускага палітэхнічнага інстытута (1968-72). З 1972 працуе ў інстытуце "Гроднаграмадзянпраект" (архітэктарам, ст. архітэктарам, кіраўнікам групы, галоўным архітэктарам праектаў). Выканала работы ў Гродне: магістраль Поўнач — Поўдзень, інтэрнаты з індывідуальным блокам абслугоўвання па вул. Урублеўскага, 5-, 9-, 13-павярховыя жылыя дамы з убудаванымі памяшканнямі камбіната бытавога абслугоўвання і крамай "1000 дробязяў" па вуд. Горкага, мікраараёны "Дзевятоўка-2", "Дзевятоўка-4" (у сааўт.), банк па вул. Міцкевіча, моладзевы жылы комплекс, рэканструкцыя садоў-ясляў па вуд. Горкага, Савецкай плошчы, мікраараёны ў Лідзе, Навагрудку, Ваўкавыску, будынак пракуратуры ў Лідзе, галантарэйная крама з навучальнымі класамі ў Ваўкавыску.

**Чумак Людміла Мікалаеўна** (дзвоч. Кандратава, 15.05.1950, в. Крамяніца Зэльвенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Доктар філалагічных навук (1998). Скончыла СШ №6 г. Гродна (1967), аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута; (1971). Была настаўніцай у Парэчкай СШ Лідскага р-на і СШ №12 г. Гродна (1971-73). Вучылася ў аспірантуры на кафедры рускай мовы БДУ (1973-76). Выкладае затым на гэтай кафедры, на кафедры рускай мовы як замежнай (з 1987 на пасадзе дацэнта). З 1995 — загадчык кафедры прыкладной лінгвістыкі БДУ. Навуковыя інтарэсы — сінтаксіс, лінгвакультуралогія, руская мова як замежная. Друкуецца ў выданнях Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Славакіі. Выдала (на рус. мове) кнігі "Сінтаксічныя адзінкі мовы як носьбіты нацыянальна-культурнай інфармацыі" (1994), "Сінтаксіс рускай і беларускай моваў у аспекце культуралогіі" (1997).

**Чыгрын Іван Пятровіч** (10.04.1931, в. Чамяры Слонімскага р-на), беларускі літаратуразнавец, паэт. Кандыдат філалагічных навук (1968). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1988). З сялянскай сям'і. У Чамярах скончыў 6 кл. Сярэднюю адукацыю атрымаў у беларускай

СШ №1 г. Слоніма. Вучыўся на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1950-55). Працаваў завучам у Рудаяварскай СШ Дзятлаўскага р-на (1955-57), настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Кракоцкай СШ Слонімскага р-на (1957-58). Скончыў аспірантуру ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі па спецыяльнасці "беларуская фалькларыстыка" (1961). Пасля працаваў у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі (1961-92) Друкаваўся як літаратуразнавец з 1959. Выдаў даследаванні "Станаўленне беларускай прозы і фальклор" (1971), "Проза "Маладняк" (1985), "Крокі. Проза "Узвышша" (1989), "Рэальнае і магчымае. Проза Якуба Коласа" (1991), "Паміж былым і будучым. Проза Максіма Гарэцкага" (1994). Сааўтар даследаванняў "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры" (1977, на рус. мове), "Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці" (1978). Займаўся рэцэнзаваннем, тэксталогіяй, укладаннем зборнікаў літаратурных твораў. Збіраў фальклор. Друкуе вершы, пераклады з рускай мовы паэтычных твораў. Выдаў зборнікі лірыкі "Капеж" (1992), "Трыба" (1998), "Бераг" (1998).

**Чыгрын Сяргей Мікалаевіч** (24.09.1958, в. Хадзявічы Слонімскага р-на), беларускі краязнавец, пісьменнік (паэт, крытык, перакладчык). З сялянскай сям'і. Скончыў у роднай вёсцы 8-годку. Вучыўся на тэатральным аддзяленні Магілёўскай культасветвучэльні (1974-77). Працаваў загадчыкам Сынковіцкага сельскага клуба Зэльвенскага р-на (1977-80). Скончыў філфак БДУ (1985). Настаўнічаў у Глоўсевіцкай СШ Слонімскага р-на (1985-88). У 1988-92 — у раённай газеце "Слонімскі веснік". З 1992 — загадчык літаратурнай часткі Слонімскага драмтэатра. Кіраваў раённым літаб'яднаннем (1987-95). Друкуе вершы (з 1975), рэцэнзіі, літаратурна-краязнаўчыя артыкулы, нарысы. Пераклаў для Слонімскай сцэны на беларускую мову п'есы А. Астроўскага, К. Гальдоні, А. Хайта. Выдаў зборнікі лірыкі "Шчырая Шчара" (Слонім, 1993), "Горад без цябе" (Слонім, 1999), літаратурна-краязнаўчы нарыс "Янка Купала і Слонімшчына" (Слонім, 1993).

**Шавель Сяргей Аляксандравіч** (17.10.1940, в. Гяруцева Свіслацкага р-на), беларускі сацыёлаг, філосаф. Доктар сацыялагічных навук (1990). З сялянскай сям'і. У 1943 вывезены з маці ў Германію (бацька расстраляны гітлераўцамі як удзельнік партызанскага руху). Пасля вайны вярнуліся на радзіму. Вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы. 7-годку скончыў у в. Карэвічы (Свіслацкі р-н), СШ у мяст. Поразава Свіслацкага р-на (1958). Затым скончыў Выбаргскую

авіяцыйную вучэльню і тры гады працаваў па спецыяльнасці ў г. Крамянчуг (Украіна). У 1964-69 вучыўся на філасофскім факультэце Маскоўскага універсітэта. Быў ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі (1969-71), інжынерам-сацыёлагам Беларусьраммантажспецбуда (1970-74), навуковым супрацоўнікам сектара прыкладной сацыялогіі БДУ (1974-81), ст. навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі (1981-90). З 1990 — у Інстытуце сацыялогіі Акадэміі навук Беларусі (загадчыкам аддзела тэорыі, метадалогіі і методыкі сацыяльных даследаванняў у 1990-91, намеснікам дырэктара ў 1991-93, з 1993 — загадчыкам аддзела сацыяльнай палітыкі). Друкуецца з 1970. Вывучае сацыяльную структуру грамадства, сацыяльную палітыку, тэорыю і методыку сацыяльных даследаванняў. Выдаў кнігі (на рус. мове) "Сацыяльная сфера грамадства і асоба" (1989), "Тэндэнцыі змянення сацыяльнай структуры Беларусі" (1996), "Сацыяльная палітыка Беларусі" (1996), "Рынак працы ў Беларусі" (1996).

**Шалемава Антаніна Алегаўна** (дзявоч. Лойка, 18.08.1953, г. Слонім), беларускі літаратуразнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1981). Дацэнт (1986). Дачка А. Лойкі. Дзяцінства прайшло ў Мінску, тут скончыла СШ №41. Вучылася на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака БДУ (1970-75). З 1975 працавала выкладчыкам, з 1986 — дацэнтам кафедры рускай класічнай літаратуры (рускай літаратуры) БДУ. У 1996-98 выкладала беларускую мову ў Йенскім універсітэце (Германія). З 1999 — дактарант кафедры рускай літаратуры Маскоўскага педагагічнага універсітэта. Навуковыя інтарэсы звязаны з тыпалогіяй усходнеславянскіх літаратур, мастацкай фенаменальнасцю "Слова пра паход Ігара". Аўтар шматлікіх літаратуразнаўчых публікацый у Беларусі, Расіі, на Украіне.

**Шалкевіч Віктар Антонавіч** (9.02.1959, мяст. Поразава Свіслацкага р-на), беларускі артыст тэатра і кіно, бард. З сям'і рабочага. Скончыў у Поразаве СШ (1976), тэатральны факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1980). Затым — акцёр Гродзенскага абласнога драмтэатра (1980-81). Служыў у войску (1981-83). Зноў — на сцэне Гродзенскага драмтэатра (1983-87). У 1987-90 выкладаў у Гродзенскай культасветвучэльні. З 1991 працуе акцёрам Гродзенскага тэатра лялек. Сталая бардаўская творчасць — з 1987. Выступаў у Беларусі, Польшчы, Украіне, Расіі, Літве, Чэхіі, Германіі. Лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў. З 1994 — вядучы аўкцыёнаў па продажы аб'ектаў камунальнай маёмасці ў многіх гарадах Бела-

русі. Ролі ў тэатры: Бобік Храмаў ("Заўтра была вайна" Б. Васільева), Шкаляр ("Несцерка" В. Вольскага), дон Луіс ("Зайдросная сама да сябе" Ц. дэ Маліны), Фёдар Лямін ("Ледзі Макбет Мцэнскага павета" паводле М. Ляскова), Спічыні, Лявон Гарошка ("Тутэйшыя" Я. Купалы), Пан-2 ("Стрыптыз" С. Мрожака), Лука ("Лекар па прымусу" Ж. Мальера), Доктар ("Цуд святога Антонія" М. Метэрлінка). Здымаўся ў фільмах Беларускай кінастудыі "Плач перапёлкі", "Мёд асы", "Слёзы блуднага сына", "Салодкае пекла кахання". Друкаваў апавяданні.

**Шандар Алена Іванаўна** (дзявоч. Рыжко, 12.08.1948, мяст. Баяры Гродзенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1989). Дацэнт (1991). З сям'і рабочага. Скончыла ў Гродне СШ №14 (1966). У 1966-67 працавала лабарантам кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі Гродзенскага медінстытута. У 1967-72 — студэнтка факультэта англійскай мовы Мінскага педінстытута замежных моваў. У 1972-75 была перакладчыкам у Іраку. Затым выкладала на кафедры замежных моваў Гродзенскага педінстытута (універсітэта) у 1976-96 (з 1991 — на пасадзе дацэнта). З 1996 — на кафедры англійскай мовы Гродзенскага універсітэта. Стажыравалася ў ЗША (1995). Вывучае культуралагічныя аспекты выкладання замежных моваў (друкуецца з 1980).

**Шандроха Нона Эдмундаўна** (дзявоч. Астраух, 16.05.1969, в. Навасёлкі Лідскага р-на), беларускі педагог-метадыст. Кандыдат педагагічных навук (1998). З сям'і настаўнікаў. Сястра А. Астраух. Скончыла СШ у в. Мінойты Лідскага р-на (1985), Лідскую педагагічную вучэльню (1987), факультэт беларускай філалогіі і культуры Гродзенскага універсітэта (1992). У 1993-96 — аспірантка Нацыянальнага інстытута адукацыі. У 1992 і з 1996 выкладае на кафедры беларускай мовы Гродзенскага універсітэта. Друкуецца з 1993. Вывучае праблемы лінгвадыдактыкі, тэорыі і методыкі навучання роднай мове ў педагагічных ВНУ.

**Шапавалаў Уладзімір Мікалаевіч** (2.05.1949, г. Гродна), беларускі архітэктар, балетмайстар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1990). З сям'і рабочых. Скончыў 8 кл. у СШ №8 (1964). Вучыўся на аддзяленні архітэктуры Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума (1964-68). У 1968-87 працаваў у інстытуце "Гроднаграмадзянпраект" (архітэктарам, ст. архітэктарам, кіраўніком групы архітэктараў). Скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут (1978). У 1987-91 быў галоўным архітэктарам праектаў у інстытуце "Гроднажылпраект".

З 1991 — начальнік архітэктурна-будаўнічага аддзела, з 1997 — галоўны архітэктар інстытута "Гроднагіпрабуд". Сярод работ: 23-кватэрны жылы дом па вул. Парыжскай камуны ў Гродне, Дом Саветаў па вул. Чырвонаармейскай у Слоніме, мікрараён па вул. Кляновай у Гродне, 80-кватэрны жылы дом па вул. Даватара ў Гродне, жылы дом па вул. Пасіянарыі ў Гродне, 12-павярховы інтэрнат будаўнікоў у Лідзе (у сааўт.), трохзальны кінатэатр па вул. Савецкіх пагранічнікаў у Гродне (у сааўт.). Адначасова з 1968 — мастацкі кіраўнік (пазней з жонкай В. А. Шапавалавай) калектыву бальнага танца "Сінтэз" (з 1984 — званне народнага), які працаваў пры Палацы культуры тэкстыльшчыкаў, з 1975 — пры Палацы культуры "Юнацтва" ў Гродне.

**Шарэцкі Віктар Канстанцінавіч** (5.12.1925, мяст. Дзяляцічы Навагрудскага р-на — 22.10.1993), беларускі хормайстар, педагог. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1977). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў Дзяляцічах (1939). З канца 1942 — у партызанскім атрадзе "Мсцівец", быў падрыўніком. Служыў у войску (1944-50). Вярнуўшыся дамоў, працаваў загадчыкам клуба ў Дзяляцічах. Кіраваў мясцовым хорам (1950-54). Ажаніўшыся, жыў у в. Варава Іўеўскага р-на. У Бараўскай 8-гадовай, затым сярэдняй школе выкладаў музыку, спевы, маляванне (1951-86). Завочна скончыў Гродзенскую музычна-педагагічную вучэльню (1969). У 1951-89 кіраваў Бараўскім хорам (з 1965 — званне народнага), які выступаў у розных мясцінах Беларусі, за яе межамі. У калектыве творча развіваліся мясцовыя песенныя традыцыі.

**Шарэцкі Сямён Георгіевіч** (23.09.1936, в. Лаўрышава Навагрудскага р-на), беларускі грамадскі дзеяч, эканаміст, публіцыст. Доктар эканамічных навук. Прафесар. Член-карэспандэнт Аграрнай акадэміі РБ. Акадэмік Украінскай аграрнай акадэміі. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі (1954-59). У 60-я працаваў намеснікам старшыні калгаса, старшынёй калгаса. У 1968-70 вучыўся у Мінскай вышэйшай партшколе, затым працаваў тут ст. выкладчыкам. З 1977 — загадчык кафедры эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці гэтай партшколы. Зноў працаваў старшынёй калгаса (у Валожынскім раёне Мінскай вобл.) у 1984-93. Быў дарадчыкам старшыні Саўміна Беларусі (1993-94). Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13 склікання (з 1996). Аўтар даследаванняў у галіне эканомікі сельскагаспадарчай

вытворчасці. Аўтар шматлікіх артыкулаў (з сярэдзіны 90-х) пра палітычнае жыццё Беларусі на сучасным этапе.

**Швед Вячаслаў Віталевіч** (7.10.1956, г. Гродна), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1984). Дацэнт (1990). З сям'і рабочага. Скончыў СШ №6 г. Гродна (1973). Працаваў чарцёжнікам у праектным інстытуце "Гіпрахіммантаж". У 1974-79 вучыўся на гістфаку БДУ. Быў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў Гарадзішчанскай СШ Баранавіцкага р-на (1979-82). У 1983 скончыў завочна аспірантуру на кафедры гісторыі СССР дасавецкага часу БДУ. У 1982-95 і з 1998 выкладае на кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў Гродзенскага універсітэта. У 1995-98 — у дактарантуры на кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу БДУ. Кірункі навуковых інтарэсаў — рух дзекабрыстаў і Беларусь, эканоміка Беларусі 1-ай паловы XIX ст., гісторыя Гродна канца XVIII — пач. XX ст. Выдаў кнігі "Наш край. Гродзеншчына ў канцы XVIII — першай палове XIX стст." (Гродна, 1990, у сааўт., на рус. мове), "Па слядах Гродзенскай даўніны" (Гродна, 1993, на рус. мове), "Кронан. Летапіс горада на Нёмане. 1116-1990" (Гродна, 1993, у сааўт., на рус. мове), "Гандаль у Беларусі ў перыяд крызісу феадалізму. 1830-1850-я гады" (Гродна, 1995, на рус. мове), "Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны" (Гродна, 1995), "Горадзен. Аповяды з гісторыі горада. X ст. — сярэдзіна XVI ст." (Гродна, 1996, у сааўт.), "Горадня. Аповяды з гісторыі горада. Сярэдзіна 16 ст. — канец 18 ст." (Гродна, 1997, у сааўт.), "Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў" (Гродна, 1998). Сааўтар навучальнага дапаможніка "Гісторыя Расіі. Са старажытных часоў да 1917 г. Ч. 2. XIX — пачатак XX ст." (Гродна, 1992).

**Шкуратаў Ігар Мікалаевіч** (14.11.1945, г. Ашмяны), беларускі мастак, мастацкі педагог. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1993). З сям'і вайскоўца. Жылі пазней у Расіі (г. Тамбоў), дзе скончыў школу. Працаваў на будоўлі ў г. Электрасталь Маскоўскай вобл. Служыў у войску (1964-67). Вучыўся на мастацка-графічным аддзяленні Тамбоўскай педагагічнай вучэльні. У 1976 скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Працаваў у мастацкіх майстэрнях Віцебска. З 1989 выкладае на кафедры малюнка і жывапісу Віцебскага педінстытута (універсітэта). У 1992-93 выкладаў акварэль у Заходнееўрапейскім інстытуце культуры ў Германіі. Працуе як жывапісец у жанрах пейзажа, нацюрморта, партрэта, тэматычных кампазіцый. З 90-х займаецца графікай. У выставах (у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі) удзельнічае з 1981. Аўтар твораў

"Лясная сімфонія", "Палявыя кветкі", "Адзіноцтва", "Поры года", "Вецер", "Шторм", "Памяць", "Цішыня", "Мае сучаснікі", "Бэз", "Мой горад", "Зімовая казка", "Лясная дарога", "Памяць". Аўтар серый "Па пушкінскіх мясцінах", "Кіжы", "Старасць".

**Штоп Яўген Аляксандравіч** (25.10.1939, г. Ваўкавыск), беларускі балетмайстар. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975). З сям'і краўца. Вучыўся ў Ваўкавыскай СШ №2. З 9 кл. (1956), па смерці бацькі пайшоў працаваць токарам на Ваўкавыскі ліцейна-механічны завод. Скончыў школу рабочай моладзі ў 1958. У 1958-59 — артыст-акрабат Беларускай філармоніі. У 1959-60 — артыст Беларускага ансамбля танца. Працаваў дырэктарам Дома культуры ў Ваўкавыску (1960-62). Служыў у войску (1962-64). З 1964 — у Гродне. Быў інструктарам, мастацкім кіраўніком, дырэктарам Палаца культуры тэкстыльшчыкаў. Адначасова (з 1964) — кіраўнік Гродзенскага ансамбля танца "Раніца" (званне народнага — з 1969), які выступаў у Беларусі, Літве, Малдове, Расіі, Польшчы, ГДР, Грэцыі, Францыі, Нідэрландах, Японіі. У 1973 завочна скончыў Вышэйшую прафсаюзную школу ў Ленінградзе. У 1978-79 быў балетмайстрам Беларускага ансамбля танца. Затым вярнуўся ў Гродна і працягваў працаваць з "Раніцай". У 1987 арганізаваў у Гродзенскай абласной філармоніі ансамбль танца, песні і музыкі "Белыя росы", працуе яго кіраўніком, ансамбль выступаў у Польшчы, Расіі, Швейцарыі, Францыі.

**Штэн Аляксандр Адамавіч** (21.11.1949, г. Гродна), беларускі архітэктар. Сябра Беларускага Саюза архітэктараў (1985). З сям'і службоўцаў. Вучыўся ў СШ №1 г. Гродна, у 5-8 кл. — у Гродзенскай школе-інтэрнаце. Затым — у Мінскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме па спецыяльнасці "тэхнік-архітэктар" (1964-68). Працаваў архітэктарам у абласных праектных майстэрнях у Гродне (у 1968-70 служыў у войску). Вучыўся ў Маскоўскім архітэктурным інстытуце (1972-78). З 1978 — у "Гроднаграмадзянпраекце". Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага Саюза архітэктараў (1995). Сярод спраектаваных аб'ектаў — навучальна-вытворчы камбінат Кастрычніцкага р-на, вузлавая клінічная бальніца, жылыя дамы па вул. Гагарына і Гарнавых, дом ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, крама "Прагрэс" па вул. Лермантава, Дом культуры па прасп. Касманаўтаў, хрысціянскі дабрачынны цэнтр па вул. Шчорса ў Гродне, касцёл у Мастах, раённы Дом культуры і Прамбудбанк у Шчучыне, жылыя дамы па вул. Міцкевіча, Валчэцкага, Скарыны ў

Навагрудку, таксама мікрараёны, дзіцячыя сады, школы, крамы ў Лідзе, Смаргоні, Ашмянах, Астраўцы.

**Шукайла Паўлюк** (Павел Захаравіч, 1904, в. Малая Лапенка Ваўкавыскага р-на — 14.04.1939), беларускі пісьменнік (паэт, празаік, крытык), мастацтвазнавец. Прафесар (1933). Удзельнік вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У сярэдзіне 20-х перайшоў у БССР, дзе ўключыўся ў літаратурнае жыццё. У 1925 у Слуцку арганізаваў філію "Маладнякам рэдагаваў акруговую газету. Затым у Расонах працаваў сакратаром райкама КПБ, быў старшынёй Нацыянальнай камісіі па праверцы ходу беларусізацыі ў раёне. З 1926 — у Мінску. Паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ. Стварыў літаратурнае аб'яднанне "Літаратурна-мастацкая камуна" (1927), рэдагаваў часопіс аб'яднання "Росквіт" (1928). У 1928 накіраваны ў Маскву, на вучобу ў Камуністычную акадэмію, пры якой скончыў факультэт чырвонай прафесуры (1930). Працаваў загадчыкам кафедры метадалогіі мастацтва ў Інстытуце кінематаграфіі (1930-31). Быў кіраўніком Беларускай секцыі Маскоўскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, дырэктарам цэнтральнага тэхнікума тэатральнага мастацтва. Рэдагаваў газету "Кино". З 1932 — віцэ-прэзідэнт Акадэміі мастацтваў (Ленінград). З 1936 працуе ў Маскве сцэнарыстам на фабрыцы "Міжрабпамфільм". У 1938 рэпрэсаваны, неўзабаве расстраляны. Друкаваўся з 1925. Выдаў зборнік вершаў і паэм "Акрываўленая зямля" (1930).

**Шукевіч Вандалін Аляксандравіч** (10.12.1852, в. Нача Воранаўскага р-на — 1.12.1919), беларускі археолаг, этнограф, калекцыянер. Член-карэспандэнт Кракаўскай акадэміі навук. Адукацыю атрымаў у Вільні. З 1872 жыў у Начы, дзе заснаваў агранамічны гурток. З 1883 даследаваў шматлікія археалагічныя помнікі каменнага, бронзавага, жалезнага веку на Гродзеншчыне, Віленшчыне, Міншчыне, Віцебшчыне. Першы з беларускіх археолагаў рабіў аналізы старажытных знаходак у садружнасці з хімікамі. На тэрыторыі Лідскага павета выявіў 120 каменных магіл. Аўтар многіх навуковых артыкулаў пра духоўную спадчыну Беларусі (друкаваўся з 1885). Вывучаў старажытны абрад пахавання ў Беларусі, паказаў яго эвалюцыю. Арганізатар і ўдзельнік 9-га Археалагічнага з'езда ў Вільні (1893). У Начы сабраў калекцыю археалагічных, нумізматычных, сфрагістычных прадметаў, матэрыялаў антрапалогіі. Запісваў народныя легенды пра помнікі даўніны. Быў сябрам Віленскага таварыства сяброў навук, Варшаўскага краязнаўчага таварыства. Матэрыялы

сваёй калекцыі перадаў у асноўным у музеі Кракава, Вільні, Пецярбурга, Масквы.

**Шукялойць Антон Антонавіч** (19.07.1915, в. Якелеўшчына Ашмянскага р-на), беларускі культурны дзеяч, этнограф, музеязнавец. З сялянскай сям'і. Скончыў гімназію ў Ашмянах. Вучыўся на гуманітарным факультэце Віленскага універсітэта (1935-39), дзе спецыялізаваўся ў вывучэнні народнага ткацтва, вопраткі беларусаў. З восені 1939 — настаўнік беларускай мовы Ашмянскай СШ, загадчык школьнага аддзела раённай адміністрацыі. Арганізаваў у Ашмянах беларускія настаўніцкія курсы. У 1940 прайшоў перакваліфікацыю ў Мінску пры Камуністычным універсітэце журналістыкі і працаваў у Ашмянах школьным інспектарам. У чэрвені 1941 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, зняволены ў турме. З жніўня 1941 — дырэктар Беларускага краязнаўчага музея ў Мінску. Аначасова з пач. 1944 — загадчык аддзела музеяў і краязнаўства Беларускага культурнага згуртавання. Быў інспектарам аддзела асветы (з 1944). Дэлегат 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). Выехаў летам 1944 у Германію, апекаваўся тут у 1944-45 вывезенымі з Беларусі музейнымі каштоўнасцямі. Пазней пераехаў у ЗША. Быў сябрам управы Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. З 1975 — старшыня Галоўнай управы Беларуска-амерыканскага задзіночання. Шмат друкаваўся ў газеце "Беларус" як этнограф, музеязнавец, мастацтвазнавец.

**Шумскі Генрых Станіслававіч** (15.09.1931, в. Кронькі Шчучынскага р-на), беларускі скульптар. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1977). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Барэйшышкі (Шчучынскі р-н) у 1950 і паступіў у Гродзенскі тэхнікум фізкультуры. У 1952-55 служыў у войску, дзе вучыўся ў вячэрняй школе. Працаваў інструктарам Радунскага райкама камсамола (Воранаўскі р-н) у 1955-58. Затым жыў у Мінску. Быў столярам па будоўлі (1958), працаваў рэзчыкам па дрэве ў мастацка-вытворчым камбінаце (1959). Вучыўся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце па спецыяльнасці "скульптура" (1959-64). Як мастак — у жанрах станковай і манументальнай скульптуры. У выставах — з 1968. Выканаў патртрэты: "Маці" (1964), "Настаўніца першая мая" (1964), "Трактарыст" (1970), "Выпускніца" (1971), партрэты Ю. Гагарына (1972), П. Клімука (1974), С. Манюшкі (1980), героя Савецкага Саюза Б. Дзмітрыева (1982), станковыя кампазіцыі "Бацька і сын" (1964), "Песня юнацтва" (1968), "Хлеб вайны" (1980), "Партызан" (1983), "Той,

хто ідзе да святла" (1983). Сярод манументальннх работ — помнікі піянерам, што загінулі ў 1941-45, Смілавіцкая СШ Мінскай вобл. (1966), воінам і партызанам, што загінулі ў 1941-45, Лагойскі р-н (1966), "Партызанскія сцежкі" ў Старадарожскім р-не (1973), сувязістам, што загінулі ў 1941-75, Мінск, вул. П. Броўкі (1975), бюст І. Мічурына ў калгасе імя Мічурына ў Брэсцкай вобл. (1978), бюст С. Кірава ў калгасе імя Кірава Брэсцкай вобл. (1979), помнік педагогам, што загінулі ў 1941-45, СШ№ I г. Слуцка (1980), землякам, што загінулі ў 1941-45, саўгас "Івесь" Віцебскай вобл. (1990).

**Шунейка Яўген Феліксавіч** (5.05.1954, г. Гродна), беларускі мастацтвазнавец, мастацкі педагог. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1989). З сям'і мастака. Скончыў 8 кл. Гродзенскай СШ №4 (1969), Мінскую мастацкую вучэльню (афармленчае аддзяленне) у 1973. Вучыўся на аддзяленні "Тэкстыль" Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1973-78). Служыў у войску (1978-80). Працаваў метадыстам па народным мастацтве Гродзенскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы (1980-85). У 1984 завочна скончыў аспірантуру ў сектары выяўленчага мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі. З 1985 — у Мінску. Працаваў у Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве (выхавальнікам мастацкага аддзялення). У 1986-88 — загадчык аддзела Беларускага фонду культуры. З 1989 — ст. выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі мастацтва Беларускай акадэміі мастацтваў. Друкуецца з 1981. Вывучае праблемы развіцця народнага мастацтва Беларусі, сучаснае беларускае выяўленчае мастацтва, гісторыю заходнееўрапейскага мастацтва. Аўтар шматлікіх артыкулаў, аглядаў, эсэ, рэцэнзій. Працуе таксама ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (габелен, інсталяцыя).

**Шурпа Уладзімір Канстанцінавіч** (9.09.1939, в. Саволеўка Гродзенскага р-на — 10.05.1998), беларускі паэт, педагог, журналіст. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1998). З сялянскай сям'і. Скончыў 7-годку ў в. Абухава (Гродзенскі р-н) і працаваў у Скідзельскай МТС (прычэпшчыкам, вагаўшчыком на камбайне, трактарыстам) у 1953-57, на Скідзельскім цукровым камбінаце (вучнем электрыка, электрыкам) у 1957-58. Адначасова вучыўся ў вячэрняй школе ў Скідзелі (скончыў у 1959). У 1964 скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага педінстытута, працаваў настаўнікам, дырэктарам 8-годкі ў в. Ірцішкі

Іўеўскага р-на (1964-67), дырэктарам СШ у в. Жамыслаўль Іўеўскага р-на (1968-69), настаўнікам (пэўны час дырэктарам вячэрняй школы) СШ у в. Чарнелі Іўеўскага р-на (1969-72), дырэктарам СШ у в. Каменка Гродзенскага р-на (1972-74). З 1974 працаваў журналістам на Гродзенскім абласным радыё. Друкаваў вершы з 1959. Сааўтар шэрагу калектыўных зборнікаў. У 1996 выдаў у Гродне кнігу лірыкі "Перазвон адліг". Друкаваў апавяданні.

**Шутовіч Віктар Іванавіч** (27.10.1890, в. Шутавічы Смаргонскага р-на — 1.03.1960), беларускі культурны дзеяч, каталіцкі святар. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе ў Ашмянах. У 1909-13 — у Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі, дзе ўсвядоміўся як беларус. У 1913 высвечаны на святара. Быў вікарам у Вільні. У 1914 паступіў у каталіцкую духоўную акадэмію ў Пецярбургу, на 3-ім курсе пакінуў вучобу з-за матэрыяльных цяжкасцяў. У 1917-27 — пробашч у в. Барадзенічы на Браслаўшчыне. Шырока практыкаваў беларускую мову ў касцельнай службе, вёў нацыянальна-патрыятычную працу сярод насельніцтва, за што праследаваўся касцельнымі ўладамі. У 1927 пераведзены з паніжэннем у пасадзе (стаў вікарам) у Ліду, затым у Трысцень на Беласточчыне. У 1929 з'ехаў у ЗША, дзе таксама працаваў сярод эміграцыі як беларускі ксёндз. У 1932 вярнуўся на радзіму і да 1944 служыў вікарам у в. Харошчына на Беласточчыне. З лета 1944 быў ксяндзом у Мінску, затым у Барысаве, зноў у Мінску. Праводзіў актыўную місіянерскую дзейнасць. У канцы 1945 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, зняволены ў канцлагеры у Сібіры. Вызвалены ў 1953, быў пробашчам у Мінску. У 1956 вымушаны пакінуць Мінск, перабрацца ў Барысаў. Тут спраўляў абавязкі ксяндза. Друкаваўся як публіцыст, літаратар з канца 20-х у "Хрысціянскай думцы", "Беларускай крыніцы", "Калоссі", пісаў апавяданні, п'есы. Выдаў "Маёвую чытанку" (Вільня, 1939).

**Шутовіч Янка** (Ян Восіпавіч, 24.01.1904, в. Шутавічы Смаргонскага р-на — 9.12.1973), беларускі культурны дзеяч, літаратуразнавец, выдавец. З сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую беларускую гімназію у 1928. У гэтым годзе арыштоўваўся польскімі ўладамі за беларускую грамадскую дзейнасць. Скончыў юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта (1933). У 1934 выбраны сакратаром "Камітэта помачы беларускай студэнцкай моладзі пры Беларускім нацыянальным камітэце". Актыўна дзейнічаў у Беларускім студэнцкім саюзе, Беларускім інстытуце гаспадаркі і культуры. Быў рэдактарам-выдаўцом часопіса "Калоссе" (1935-39). У 1939 абраны старшынёй

таварыства "Беларускае каталіцкае выдавецтва". У тым жа годзе зняволены ўладамі Польшчы ў Картуз-Бярозе. У час вайны працаваў дырэктарам Віленскага беларускага музея. У 1944 рэпрэсаваны савецкімі ўладамі, зняволены ў Унжлагу (Горкаўская вобл.), затым у Пясчанлагу (Карагандзінская вобл.). У 1954 вызвалены, але затрыманы ў ссылцы. У Вільню вярнуўся ў 1956, працаваў у мастацкім музеі пажарнікам, вартаўнікам. Друкаваўся ў часопісах "Калоссе", "Шлях моладзі", газеце "Беларуская крыніца", пасля вайны — у "Полымі", "Голасе Радзімы". Даследаваў творчасць А. Гурыновіча, пісаў пра заходнебеларускую літаратуру, пра Ш. Руставелі, Т. Шаўчэнку, пра А. Гурло, Ц. Гартнага і інш. У рукапісе засталася яго праца пра Віленскі беларускі музей, пра творчасць М. Забэйды-Суміцкага.

**Шухне Валянцін Міхайлавіч** (6.03.1946, пас. Альбярцін Слонімскага р-на), беларускі эканаміст, педагог. Кандыдат эканамічных навук (1978). Дацэнт (1983). Скончыў Альбярцінскую СШ. У 1965-68 служыў у войску. Вучыўся на аддзяленні палітычнай эканоміі БДУ (1968-73). Працаваў тут выкладчыкам (1973-75). У 1975-78 — аспірант Мінскага педінстытута. Зноў выкладаў у БДУ, на кафедры эканамічных навук філасофска-эканамічнага факультэта (у 1983-86 — выкладчык эканомікі ў Вышэйшай Адміністрацыйнай школе ў г. Бамака Рэспублікі Малі). Адначасова з 1996 — начальнік Інспекцыі па каштоўных паперах РБ. Сааўтар манаграфіі "Параўнальны аналіз сацыяльна-эканамічных сістэм" (1994, на рус. мове), навучальнага дапаможніка "Мікра-макраэканоміка" (1995, на рус. мове).

**Шчасная Ганна Міхайлаўна** (дзявоч. Пушанская, 4.02.1948, мяст. Масты), беларускі псіхолаг, педагог. Кандыдат псіхалагічных навук (1980). Дацэнт (1989). З сям'і вайскоўца, якая пераехала ў Мінск. Тут скончыла СШ. Вучылася на дашкольным факультэце Мінскага педінстытута (1966-70). Была навуковым супрацоўнікам НДІ тэхнічнай эстэтыкі (у аддзеле псіхалогіі) у НДІ педагогікі. У 1976-79 — аспірантка кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі Мінскага педінстытута. Зноў працавала ў НДІ педагогікі. З 1990 — дацэнт кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі Беларускага педагагічнага універсітэта. Вывучае праблемы дашкольнага выхавання дзяцей. Друкуецца з 1975. Выдала кнігу "Па ступеньках маральнасці" (1990, на рус. мове). Сааўтар даследаванняў (на рус. мове) "Педагагічныя праблемы сацыяльнай псіхалогіі" (1979), "Падрыхтоўка дзяцей да навучання ў школе" (1982), "Генетычныя праблемы сацыяльнай псіха-

логіі" (1985). Аўтар метадычных рэкамендацый па пытаннях выхавання дзяцей у сям'і, у дзіцячым садзе.

**Шчасны Уладзімір Рыгоравіч** (25.02.1948, мяст. Смаргонь), беларускі перакладчык, публіцыст. З сям'і службоўцаў. Скончыў СШ №2 у Смаргоні. Вучыўся на перакладчыцкім факультэце Мінскага педінстытута замежных моваў у 1966-72 (стажыраваўся ў Пакістане ў 1969-70). Працаваў перакладчыкам у Пакістане па лініі Міністэрства геалогіі СССР (1972). У 1975-76 служыў у войску. У 1976-77 выкладаў у Мінскім педінстытуце замежных моваў. З 1978 — супрацоўнік службы рускіх пісьмовых перакладаў Сакратарыята ААН у Н'ю-Йорку. З 1993 — дарадчык пасольства РБ у Літве. У 1995-2000 — пасол РБ у Вялікабрытаніі. Друкуецца як перакладчык твораў мастацкай прозы з 1977. Перакладае з англійскай і мовы урду на беларускую. У яго перакладах выйшла кніга прозы К. Макалерса "Балада пра сумнае кафэ" (1988). Складальнік і перакладчык зборніка "Амерыканскае дэтэктыўнае апавяданне" (1993). Друкуе артыкулы пра культурнае жыццё за мяжой.

**Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч** (18.06.1911, в. Мінкі Смаргонскага р-на), беларускі культурны дзеяч, кампазітар. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1960). З сялянскай сям'і. У 1914-22 былі ў бежанстве ў Сімбірску. У 1927 скончыў у Смаргоні 5 кл. і паступіў у Віленскую беларускую гімназію. У 1929 выключаны за падпольную рэвалюцыйную работу. З гэтага ж года — у Клецкай беларускай гімназіі, але хутка па патрабаванні паліцыі выключаны. Неўзабаве — у Вільні, дзе працуе ў сакратарыяце пасольскага клуба "Змаганне", выконвае падпольныя даручэнні КПЗБ. У 1930 арыштаваны на Браслаўшчыне, зняволены ў розных турмах Польшчы. Выйшаў на волю ў 1936 і працаваў у Варшаве (на вугальным складзе, у псіхіятрычнай бальніцы, на будоўлі). Актыўна ўдзельнічаў у рабоце "Беларускага асветнага таварыства". У 1937 зноў трапляў у турму. З 1940 — артыст хору (пазней і вядучы канцэртных праграм) Беларускага ансамбля песні і танца. У складзе ансамбля падчас вайны — у савецкім тыле (Урал, Кузбас, Сярэдняя Азія). У 1943 вярнуліся ў Беларусь, з 1944 — у Гродне. Скончыў завочна гістфак Маскоўскага універсітэта (1951), настаўнічаў у СШ №10 у Гродне. Кіраваў тут хорамі на розных прадпрыемствах. У 1960-95 працаваў дырэктарам (з 1960), загадчыкам аддзела фальклору (з 1971) Дома народнай творчасці (абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці) у Гродне. Метадычна дапамагаў музычным

калектывам вобласці, ствараў новыя. Піша песні на ўласныя словы. Выконваюцца з пач. 50-х прафесійнымі і аматарскімі калектывамі ў Беларусі і за яе межамі. Сярод песень: "Гродзенскі вальс" ("Між зялёных дуброў..."), "Колькі ў небе зор", "Ой, зайграйце, музыкі", "Чараўніца", "Там, пад гаем", "Ой ты, Нёман родны", "Дарагая мая Беларусь", "Дзе ж ты, мара мая", "Ну як не пець?" і інш. Выдаў зборнікі сваіх твораў "Песні" (1964), "Ляці, наша песня" (1990).

**Шыла Мікола** (1888, мяст. Смаргонь — 6.04.1948), беларускі грамадска-культурны дзеяч, выдавец, педагог. Скончыў настаўніцкую семінарыю ў Маладзечне, дзе далучыўся да беларускага руху. Падчас вучобы ўдзельнічаў у нелегальным з'ездзе вучняў настаўніцкіх семінарый Беларусі. Адзін з стваральнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады (1902), выбіраўся неаднаразова ў склад ЦК Грамады. Актыўна дзейнічаў у Беларускім музычна-драматычным гуртку ў Вільні. Арыштоўваўся за беларускую дзейнасць, сядзеў у турме ў Мінску (1906-08). З 1909 жыў у Вільні, дзе працаваў у прыватнай майстэрні зброі. Супрацоўнічаў у газеце "Наша ніва". Затым жыў і вучыўся ў Пецярбургу, дзе ўдзельнічаў у беларускім грамадскім і культурным руху. Быў сябрам "Пецярбургскага таварыства студэнтаў-беларусаў", іграў у спектаклях, спяваў у хоры, танцаваў (пэўны час — у трупе І. Буйніцкага). Цесна кантактаваўся з Б. Эпімах-Шыпілам, Я. Купалам і інш. Быў дэлегатам 3-га з'езду БСГ (кастрычнік 1917). Сябра выканкама Вялікай Беларускай Рады (кастрычнік-снежань 1917). Удзельнік Усебеларускага кангрэса (снежань 1917). Сябра Рады БНР (1918). Працаваў настаўнікам беларускай гімназіі ў Будславе (1918-19). З 1921 — у Вільні. Удзельнічаў у заходнебеларускім вызваленчым руху. Уваходзіў у Беларускі нацыянальны камітэт. Рэдагаваў газету "Змаганне" (1923-24), быў рэдактарам газет Грамады. Арыштоўваўся ўладамі Польшчы. Падчас вайны працаваў на культурна-асветнай ніве. Удзельнік 2-га Усебеларускага кангрэсу (1944). Выехаў у Германію. Быў адным з рэдактараў часопіса "Шляхам жыцця" (1946-48). Жыў у Браўншвейгу. Пакінуў мемуары.

**Шыманоўскі Станіслаў Вінцэнтавіч** (1893, мяст. Данюшава Смаргонскага р-на — 1920), беларускі паэт. Удзельнічаў у 1-ай сусветнай вайне, быў на фронце. Пэўны час быў у Пецярбургу, дзе зблізіўся з патрыятычна настроенай беларускай інтэлігенцыяй. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў у багатых гаспадароў. Вясной 1920 дабраўся ў Мінск, шукаў працу, кантакты з творчым асяроддзем.

Жыў у Трабах (Іўеўскі р-н), у родным мястэчку. Друкаваў вершы ў газетах "Беларускае жыццё", "Крыніца", часопісе "Рунь".

**Шымук Віктар** (Вікенці Мікалаевіч, 2.04.1933, в. Змяёўцы Дзятлаўскага р-на — 18.09.1998), беларускі пісьменнік (паэт, празаік). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1964). З сялянскай сям'і. Скончыўшы 8 кл., працаваў адказным сакратаром Дзятлаўскай райгазеты "За новую вёску" і вучыўся ў вячэрняй СШ у Дзятлаве. У 1951 паступіў на аддзяленне журналістыкі філфака БДУ. З 1953, перавёўшыся на завочнае аддзяленне (скончыў у 1957), працаваў у газеце "Калгасная праўда". Пазней — у газеце "Звязда" (1967-71), тыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (1974-77). Затым — намеснік галоўнага рэдактара Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё (1977-94). Вершы друкуе з 1945. Выдаў паэму "Каля Броннай гары" (1960), зборнік гумарыстычных вершаў "Рагуля на экскурсіі" (1962, у сааўт.), кнігі лірыкі "Дочкі сіняга Нёмана" (1964), "Свіцязянскія хвалі" (1968), "Світанне" (1972), "Спелы жнівень" (1990), зборнік гумарыстычных вершаў і баек "Ад хаты да хаты" (1983), зборнік вершаў і паэм "Святло красавіцкіх бяроз" (1983). Выйшлі кніжкі для дзяцей "Мы вясне дапамагалі" (1962), "Помняць пушчы і паляны" (1969), "Марылі пра шчасце хлапчукі" (1980). Выдаў нарысы "Добрай раніцы, поле" (1964), "Сын каваля" (1970), "Дыханнем ленінскім сагрэтыя" (1971, у сааўт.), "Леў Даватар" (1973), "Пасля працы рупнай" (1977), "Рэха "Аўроры" (1979). Працаваў у галіне перакладу.

**Шынтар Аркадзь Мікалаевіч** (6.02.1946, в. Сяцевіча Навагрудскага р-на), беларускі паэт. З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у в. Ігольнікі Навагрудскага р-на. Служыў у войску (1965-68). Працаваў у Наваполацку на будоўлі (рознарабочым, бетоншчыкам, слесарам-мантажнікам, сантэхнікам) у 1969-72. Быў качагарам у Навагрудскім райбыткамбінаце (1973), грузчыкам Навагрудскай ПМК па газіфікацыі (1974-79), токарам на заводзе газавай апаратуры ў Навагрудку (1979-84). У 1981 завочна скончыў Навагрудскі сельскагаспадарчы тэхнікум. З 1987 працуе намеснікам дырэктара на гаспадарчай частцы Навагрудскай спартыўнай школы. Першы верш надрукаваў у Навагрудскай райгазеце "Новае жыццё" ў 1972. Сааўтар калектыўнага зборніка паэзіі "Лагодны прамень раніцы" (1988). Выдаў у Навагрудку зборнікі сваіх вершаў "Серабрыцца Свіцязь маладая" (1993), "Вішнёвая завея" (1994). Творы прозаю — у кніжцы "Журавіны" (Навагрудак, 1995).

**Шыцік Вітольд Казіміравіч** (8.12.1934, в. Кульбакі Гродзенскага р-на — 20.05.1997), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1975). Дацэнт (1983). З сялянскай сям'і. Скончыў у Гродне СШ №2 (1954). Служыў у войску (1954-57). Вучыўся ў тэхнічнай вучэльні № 7 г. Гродна (1957-58). Працаваў рабочым у гархарчгандлі, грузчыкам управы гандлю БВА ў Гродне (1959-60). У 1960-65 — студэнт рускага аддзялення гістарычна-філалагічнага факультэта Гродзенскага педінстытута. Настаўнічаў у Ваўкавыскай СШ№ 5 (1965-66). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры гісторыі КПСС БДУ (1966-69). З 1969 выкладаў на кафедры гісторыі КПСС Гродзенскага педінстытута, з 1990 — на кафедры палітычнай гісторыі, з 1991 — на кафедры польскай літаратуры і культуры (польскай філалогіі), дзе чытаў гісторыю Польшчы. Друкаваўся з 1969. Вывучаў сацыяльна-эканамічныя працэсы жыцця калгаснай вёскі Беларусі, пытанні гісторыі і культуры Польшчы.

**Шышко Аляксей Сцяпанавіч** (20.08.1972, мяст. Зэльва), беларускі дызайнер. Сябра Беларускага Саюза дызайнераў (1996). Скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў (1996). Жыве і працуе ў Мінску. Спецыялізуецца ў галіне графічнага дызайна, вонкавай рэкламы. У выставах удзельнічае з 1997. Сярод асноўных работ — фірмовыя стылі АКВ "Белбізнесбанк", НП "Аргнафтахім", распрацоўка вонкавай рэкламы кампаніі "Лукойл", Беларусьбанка і інш.

**Южык Павел Тамашавіч** (4.03.1874, в. Вётхава Смаргонскага р-на — 16.03.1944), беларускі мастак, мастацкі педагог. З сям'і садоўніка шляхецкага маёнтка. Пачатковую адукацыю атрымаў у Міхневічах (Смаргонскі р-н). Скончыў настаўніцкую семінарыю ў Маладзечне (1895), рысавальную школу І. Трутнева ў Вільні (1901). Настаўнічаў у вясковай школе на Вілейшчыне. З 1915 — інспектар Віленскай дырэкцыі народных вучэльняў. Падчас бежанства выкладаў маляванне ў Пензе (1918-20), вучыўся тут у "вольных майстэрнях". Па звароце на радзіму жыў у сваёй вёсцы. У 1922-35 — настаўнік малявання Віленскай беларускай гімназіі. Затым жыў у Вётхаве. У 1939-44 настаўнічаў у Залессі і Сіньках (Смаргонскі р-н), выкладаў маляванне. Аўтар пейзажаў, партрэтаў, выкананых пераважна на мясцовым матэрыяле ("Тамаш Южык", "Цётка Марыся", "Хлопчык" і інш.). Пісаў абразы.

**Юргялевіч Пётр Якаўлевіч** (14.01.1894, мяст. Трабы Іўеўскага р-на — 17.04.1973), беларускі мовазнавец, педагог. Дацэнт (1934). З

беднай сялянскай сям'і. Скончыў у Смаргоні 4-класную вучэльню і здаў у Пецярбургу экстэрнам экзамен (1912) на вучня аптэкара. Працаваў у Пецярбургу і вучыўся на 2-гадовых вячэрніх курсах па падрыхтоўцы на атэстат сталасці. З 1914 — у войску, удзельнічаў у І-ай сусветнай вайне. Служыў у Чырвонай Арміі, ваяваў на польскім фронце. Дэмабілізаваны ў 1921. Скончыў факультэт грамадскіх навук БДУ (1925). Працаваў сакратаром Мсціслаўскага райкама КПБ (1925), рэдактарам акруговай газеты "Наш працаўнік" у г. Клімавічы (1926), стыльрэдактарам у Белдзяржвыдавецтве (1927-28). Адначасова — сакратар камісіі па выданні на беларускай мове твораў У. Леніна (1927-29). Быў вучоным сакратаром Інстытута мовазнаўства Беларускай акадэміі навук (1930-35) і па сумяшчальніцтве выкладаў у Мінскім вышэйшым педінстытуце (1934-35). Рэпрэсаваны і зняволены ў канцлагерах у Вятцы (1935-40). Перад вайной выкладаў у Гомельскім педінстытуце. У 1944-69 — на кафедры беларускай мовы Магілёўскага педінстытута (з 1951 — загадчык кафедры). Даследаваў сучасную баларускую літаратурную мову, гісторыю беларускай мовы, беларускія дыялекты. У друку па пытаннях беларускай мовы выступаў з 20-х. Рэдагаваў выпускі беларускай навуковай тэрміналогіі. Падрыхтаваў (у сааўт.) "Анкету для збірання матэрыялаў па беларускай мове" (1931), "Праект спрашчэння беларускага правапісу" (1933), падручнік "Беларуская граматыка: Марфалогія" (1936). Выдаў дапаможнікі для студэнтаў: "Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі: Фанетыка, арфаэпія, графіка і правапіс, лексіка і фразеалогія" (1958, 2-е выд. 1961), "Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі" (1974). Склаў "Праграму па гістарычнай граматыцы беларускай мовы" для студэнтаў-філолагаў (1964). Рэцэнзаваў у друку школьныя падручнікі.

**Юрэвіч Аляксандр** (18.11.1952, г. Ліда), польскі пісьменнік (паэт, празаік, эсэіст). З сям'і краўца. У 1957 пераехалі ў Польшчу. Жылі ў в. Рэдла ля г. Палчына-Здроя (тут скончыў ліцэй). Вучыўся на факультэце польскай філалогіі Гданьскага універсітэта, завочна — на сцэнарным аддзяленні Вышэйшай школы фільма, тэлебачання і тэатра ў Лодзі (1982-83). Працаваў у Гданьскай ваяводскай бібліятэцы (з 1980), у рэдакцыі літаратурных часопісаў "Podpunkt" (1984-89), "Tytuł" (з 1990). Друкуецца з 1973. Выдаў кнігі паэзіі "Сон, які напэўна не быў каханнем" (Варшава, 1974), "Па другім баку" (Гданьск, 1978), "Не страляйце ў Беатлесаў" (Гданьск, 1983), "Як галубы, гнаныя бураю" (Гданьск, 1990), "Пакуль яшчэ і іншыя вершы" (Гданьск, 1991),

кнігі прозы "Сярод ночы" (Гданьск, 1980), "Ліда" (Беласток, 1990, 2-е выд. Гданьск, 1994), "Пан Бог не чуе глухіх" (Гданьск, 1995).

**Юхновіч Станіслаў** (10.06.1923, г. Ліда), польскі архітэктар, даследчык горадабудаўніцтва. Доктар тэхнічных навук габілітаваны (1965). Прафесар (1974). З сям'і вайскоўца і настаўніцы. У сувязі з службовымі перамяшчэннямі бацькі вучыўся ў школах у Ковелі, Самборы, Катавіцах, Львове. Быў салдатам АК. Адначасова вучыўся у Львоўскім палітэхнічным інстытуце (1942-44). Працягваў вучобу ў палітэхнічным інстытуце ў Кракаве (1945-47), у Гданьску (1948). Працаваў кіраўніком майстэрні па адбудове галоўнага горада ў Гданьску (1948-50), кіраўніком праектнай групы, затым праектнага бюро па будаўніцтве г. Новая Гута, праектнай арганізацыі г. Кракава (1950-59). Быў стыпендыятам фундацыі Форда ў універсітэце ў Філадэльфіі (1959-60). Пазней — навукова-дыдактычны супрацоўнік Кракаўскага палітэхнічнага інстытута, кіраўнік установы пры інстытуце па праектаванні гарадоў і мястэчак (1967-70), намеснік дырэктара інстытута горадабудаўніцтва і прасторавага планавання (1970-73). У 1973-81 — кіраўнік арганізацыі па горадабадаўніцтве і рэгіянальным планаванні ў Нігерыі, адначасова ў 1974-76 — дэкан факультэта праектавання асяроддзя ў універсітэце ў Зарыі. Заснавальнік (1986) і кіраўнік Цэнтра ўдасканалення горадабудаўнікоў для краін, якія развіваюцца, пры Кракаўскім палітэхнічным інстытуце. Сябра шматлікіх міжнародных і польскіх навуковых аб'яднанняў, што займаюцца вывучэннем архітэктурнага асяроддзя. Сябра Прэзідуму грамадскага камітэта па аднаўленні помнікаў даўніны Кракава (1989). Выканаў праекты адбудовы галоўнага горада ў Гданьску (1948-50), будаўніцтва Новай Гуты (1950-59, у сааўт.), перабудовы цэнтраў Лодзі, Кракава, Харова, Любліна, Сант'яга (1962-70), рэкультывацыі і рэабілітацыі тэрыторый, пашкоджаных здабычай вугалю ў р-не Вальбрыха (1990-91, кіраўнік і сааўтар). Выдаў у Кракаве кнігі: "Пра сувязі і ўплывы руху на фармаванне цэнтраў гарадоў у ЗША" (1962), "Цэнтры польскіх гарадоў. Вывучэнне ўдасканалення і развіцця цэнтраў" (1971), "Форма і структура плана новай сталіцы Нігерыі" (1976), "Да праблемы аховы і ўдасканалення асяроддзя ў Польшчы" (1990), "Крыніцы паталагічнай урбанізацыі і экалагічнага крызісу Кракава" (1990), "Заходняя Афрыка. Асяроддзе, культура, развіццё. З вопыту праектавання гарадоў у Нігерыі" (1996).

**Юшко Юры Іванавіч** (20.11.1961, г. Ліда), беларускі эканаміст, педагог. Кандыдат эканамічных навук (1989). Дацэнт (1991). З сям'і

рабочага. Вучыўся ў Лідскай СШ №8. Скончыў аддзяленне палітэканоміі гістфака БДУ (1983). Выкладаў на кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў БДУ (1983-85) Вучыўся ў аспірантуры на гэтай кафедры (1985-88). Затым працуе тут дацэнтам. Друкуецца з 1984. Вывучае цэнаўтварэнне ў рынкавай эканоміцы, грашова-крэдытнае рэгуляванне эканомікі, развіццё банкавай сістэмы ў Беларусі. Сааўтар навучальнага дапаможніка "Параўнальны аналіз планавай і рынкавай эканомікі" (1994, на рус. мове).

**Явар Міхась** (сапр. Карась Міхаіл Андрэевіч, 8.11.1903, в. Міневічы Мастоўскага р-на — 27.06.1933), беларускі паэт. З беднай сялянскай сям'і. У роднай вёсцы скончыў 2 кл. У 1914-21 — у бежанстве ў Расіі, дзе працягваў вучобу. Па звароце дамоў уключыўся ў вызваленчы рух, удзельнічаў у рабоце Грамады, ТБШ. Неаднаразова арыштоўваўся. Удзельнік многіх канцэртаў на вёсцы (чытаў уласныя вершы). Працаваў на гаспадарцы, быў рыбаком на Нёмане. Друкаваўся з 1932 (у часопісах "Шлях моладзі", "Летапіс ТБШ", "Беларускай газеце"). Вершы распаўсюджваліся вусна, у рукапісах.

**Ягоўдзік Уладзімір Іванавіч** (14.02.1956, в. Кастровічы Слонімскага р-на), беларускі пісьменнік. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1985). З сялянскай сям'і. Вучыўся ў Дзятлаўскай школе-інтэрнаце, у Кастровіцкай школе (у 6 кл.), у Слонімскай і Зэльвенскай школах-інтэрнатах. Скончыў філфак БДУ (1978). Працаваў карэспандэнтам Брэсцкай абласной газеты "Заря" (1978-79), на Брэсцкай студыі тэлебачання (1979-82), у тыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (1982-90), рэдактарам газеты "Дзеці і мы" (1990-92). Адначасова — у выдавецкай фірме "Ітэкс" (1991-93). У 1993-96 — рэдактар аддзела прозы часопіса "Нёман" (з 1995 выдае экалагічны часопіс-плакат "Лесавік"). З 1997 — галоўны рэдактар часопіса "Бярозка". Друкаваў вершы (з 1972). З 1978 друкуе прозу — апавяданні, аповесці, эсэ, літаратурныя казкі, апрацоўвае народныя казкі. Ставіліся на сцэне яго п'есы для дзяцей "Залатое зярнятка", "Сонейка, свяці", "Пякла баба калачы" (у сааўт.), "Сакрэты Вогніка", "Усміхніся, прынцэса...". Выдаў зборнікі прозы "Стронга" (1984), "Прыручэнне птушкі" (1989), "Вочы начніцы" (1989), кнігу мемуарных нарысаў і эсэ "Белыя росы на чорным полі" (1995). Выйшлі яго зборнікі прозы для дзяцей "Сонейка, свяці!" (1988), "Заклятыя скарбы" (1992), "Янка і Ружа" (1993). "Ці вернецца Кук?" (1993), "У царстве вадзяніка" (1995), "Дзівосны карабель" (1995), "Свята лятаўца" (1996), "Вужовы кароль" (1996). Падрыхтаваў мастацкі альбом "Алена Кіш"

(1990). Кнігі яго прозы выйшлі ў перакладзе на рускую мову ў Маскве (у 1987) і Мінску (у 1992). Выступае з артыкуламі, нарысамі, рэцэнзіямі на тэмы літаратуры, мастацтва, культуры.

**Ядкоўскі Юзаф** (20.12.1890, г. Гродна — 2.01.1950), польскі археолаг, гісторык, краязнавец, калекцыянер, музеязнавец. З сям'і рамесніка. Скончыў гімназію ў Гродне. Вучыўся ў Мастацкай школе і Археалагічным інстытуце ў Маскве (скончыў у 1913). Працаваў у гэтым інстытуце лабарантам, затым — у Румянцаўскім музеі. Вывучаў матэрыяльяую культуру Беларусі, выязджаў у Гродна, Ліду, Крэва, Мір з мэтай кансервацыі помнікаў. Служыў у войску. З 1918 — кіраўнік дзяржаўнай камісіі апекі над помнікамі культуры ў Гродне і Гродзенскім павеце. У 1922 — ваяводскі кансерватар помнікаў у Беластоку. У гэтым годзе пераязджае ў Гродна, дзе стварае і ўзначальвае гарадскі гістарычна-археалагічны музей. Быў яго захавальнікам. Арганізаваў выданне штогодніка "Muzeum w Grodnie". З 1936 — у Варшаве, дзе працаваў у дзяржаўных зборах мастацтва, займаўся нумізматыкай. Пасля вайны аднавіў польскі нумізматычны музей, адрадзіў Варшаўскае нумізматычнае таварыства. Рэдагаваў нумізматычны штомесячнік "Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne". Вёў археалагічныя раскопкі з 10-х, у тым ліку на замкавай гары, на Каложы ў Гродне. Збіраў з гімназічных часоў калекцыю (манеты, рукапісы, друкі, матэрыялы раскопак). Даследаваў найбольш гісторыю і помнікі матэрыяльнай культуры Гродзеншчыны. Друкаваўся як краязнавец з часоў вучобы ў Гродне. Выдаў кнігі "Музей у Гродне. Нарыс стварэння і развіцця. 1920-1922" (Гродна, 1923), "Гродна". (Вільня, 1923), "Гімназія падамініканская ў Гродне" (Гродна, 1924), "Ваўкавыскае гарадзішча" (Гродна, 1925), "Гродзенскія цэхі даўніх часоў" (Гродна, 1926), "Гродна і ваколіцы часоў дзейнасці наднёманскай Літвы і Русі" (Гродна, 1928), "Гродзенскі гарадскі цэнтр у мінулым і заўтра" (Гродна, 1930), "Гродзенскія вуліцы ў святле гісторыі і тапалогіі" (Гродна, 1931), "Назвы гродзенскіх плошчаў і вуліц, ранейшыя і цяперашнія" (Гродна, 1932), "Гродна з ранняга сярэднявечча. У святле раскопкаў, выкананых на Старым Каралеўскім Замку ў 1932 і 1933 гадах" (Варшава, 1934), "Гродна і ваколіцы. Аўгустоўскае паазер'е і Сувальшчына. Турысцкі даведнік" (Гродна, 1934), "Справаздача аб працы на Старым Замку ў Гродне. 1933-1937" (Гродна, 1938).

**Якімовіч Аляксей Мікалаевіч** (15.10.1949, в. Парэчча Слонімскага р-на), беларускі пісьменнік (празаік, драматург), педагог.

Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1990). З сялянскай сям'і. Скончыў Парэцкую 8-годку, СШ №4 г. Слоніма, філфак БДУ (1972). Выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Кастровіцкай 8-годцы Слонімскага р-на (1972-74), Жыровіцкай СШ Слонімскага р-на (1974-79). Быў дырэктарам Дзеравянчыцкай 8-годкі Слонімскага р-на (1979-82). З 1983 выкладае рускую мову і літаратуру ў Касцянёўскай 8-годцы Слонімскага р-на. Жыве ў Слоніме. Друкуецца з 1964.. Піша пераважна для дзяцей (апавяданні, аповесці, п'есы). Выдаў зборнікі прозы "Гордзіеў вузел, альбо нявыдуманыя гісторыі з жыцця Алеся Пятрашкі" (1987), "Эльдарада просіць дапамогі" (1989), "Сакрэт Тунгускага метэарыта. Прыгоды шасцікласніка Максіма" (1993), "Пастка для пярэваратня" (1997). Напісаў п'есы для дзяцей "Чарадзейныя суніцы" (паст. у 1993), "Хітрыкі бабы Ягі" (паст. у 1994), "Апошні дыназаўрык" (паст. у 1994), "Добры змей" (паст. у 1996). Асобныя п'есы ўвайшлі ў калектыўныя зборнікі "Казкі для сцэны" (1992), "Сінязорка" (1995).

**Якалцэвіч Марыя Антонаўна** (дзявоч. Якубовіч, 30.01.1961, в. Дуляўшчына Мастоўскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1990). Дацэнт (1995). З сялянскай сям'і. Вучылася ў Струбніцкай 8-годцы (Мастоўскі р-н), скончыла Пескаўскую СШ (Мастоўскі р-н) у 1978. Скончыла аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1983). Працуе з 1983 асістэнтам на кафедры беларускай мовы гэтага універсітэта (у 1989 скончыла на гэтай кафедры аспірантуру), ст. выкладчыкам, дацэнтам. Даследуе праблемы параміялогіі, параміяграфіі, моўныя асаблівасці мастацкіх твораў.

**Яканюк Вадзім Лявонавіч** (22.03.1946, г. Гродна), беларускі культурны дзеяч, музыкант (фартэпіяна), музычны педагог. Доктар педагагічных навук (1995). Прафесар (1992). З сям'і тэхнолага кандытарскай вытворчасці. Вучыўся ў СШ №3, дзіцячай музычнай школе г. Гродна. Скончыў па класе фартэпіяна Гродзенскую музычна-педагагічную вучэльню (1964). У 1964-69 вучыўся ў Беларускай кансерваторыі (клас фартэпіяна І. Цвятаевай), адначасова працаваў канцэртмайстрам Дома культуры Мінскага аўтазавода. У 1969-72 — загадчык фартэпіяннага аддзялення Мазырскай музычнай вучэльні. У 1972-83 — загадчык кафедры фартэпіяна Мінскага педінстытута (у 1977 завочна скончыў аспірантуру Маскоўскага педагагічнага універсітэта). Працаваў прарэктарам па навучальнай рабоце (1983-86), прарэктарам па навуковай і творчай рабоце (1986-92) Беларускай

кансерваторыі. Адначасова з 1986 — загадчык кафедры музычнай педагогікі, тэорыі і гісторыі выканальніцкага майстэрства кансерваторыі. З 1992 — першы прарэктар Беларускай акадэміі музыкі. Чытаў лекцыі, праводзіў семінары ў замежных музычных цэнтрах (у Расіі, ЗША, Германіі, Іспаніі, Кітаі, Венгрыі, Польшчы, Грузіі, Літве). Сябра міжнародных музычных асацыяцый і ўстановаў. Сябра ўправы Саюза музычных дзеячаў Беларусі. Даследуе метадалогію, структуру, дыдактыку музычнай адукацыі, псіхалогію музычнай дзейнасці, методыку выкладання музычных дысцыплін. Выдаў даследаванні і навучальныя дапаможнікі: "Развіццё цікавасці да прафесіі настаўніка музыкі" (1979, на рус. мове), "Развівальнае навучанне ў класе фартэпіяна" (1985, на рус. мове), "Я іграю на раялі" Ч. І. (1992, 2-е выд. 1994), ч. 2 (1996), "Музыкант. Патрэбнасць. Дзейнасць" (1993, на рус. мове), "Спадчына. Школа ігры на фартэпіяна" (1994).

**Якаўчык Клімент Марцінавіч** (7.11.1898, в. Дольная Свіслач Гродзенскага р-на — 1941), беларускі і рускі пісьменнік. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1934). З беднай сялянскай сям'і. Скончыў у роднай вёсцы 2-класную вучэльню. Падчас бежанства апынуўся ў Самары, дзе жылі браты. Тут скончыў настаўніцкую семінарыю. У 1925 скончыў Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут у Маскве. Тут жыў. Сябра Беларускага студэнцкага зямляцтва. Актыўна ўдзельнічаў у літаратурным жыцці. Уваходзіў у літаб'яднанне "Кузница". У чэрвені 1941 уступіў у Маскоўскае апалчэнне. Загінуў на фронце. Друкаваўся ў маскоўскіх, ленінградскіх, мінскіх выданнях. Публікаваў вершы, літаратуразнаўчыя артыкулы, пераклады з беларускай мовы. Выйшлі ў Маскве і Ленінградзе ў 1929-35 у яго перакладах кнігі твораў Я. Коласа, З. Бядулі, П. Галавача, Я. Нёманскага.

**Ялоўчык Лідзія Парамонаўна** (у замужжы Лісок, 30.12.1911, в. Марцянаўцы Ваўкавыскага р-на — 26.05.1999), беларуская пісьменніца (празаік, паэтка), педагог. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1993). З сям'і сельскага настаўніка. Дзяцінства — у роднай вёсцы, затым у Вільні, дзе бацька атрымаў працу на пошце. Скончыла 4 кл. школы ў Оршы, дзе сям'я апынулася ў бежанстве (1915). З 1921 — на радзіме. Вучылася самастойна пад кіраўніцтвам бацькі. У 1931-34 — у Гродзенскай прамыслова-гандлёвай вячэрняй школе. Два гады наведвала агульнаадукацыйны універсітэт у Гродне. У 1937 экстэрнам здала экзамен за курс жаночай настаўніцкай семінарыі. Працы па спецыяльнасці на атрымала, жыла за кошт

кравецкай прафесіі. У 1939-41 працавала на камутатары пры Часовай управе ў Гродне, справаводам у лясгасе. У 1940 паступіла на літаратурны факультэт Гродзенскага настаўніцкага інстытута (скончыла Гродзенскі пединститут завочна ў 1949). Вайну перажыла у Марцянаўцах. У 1944-67 была настаўніцай рускай мювы і літаратуры у Дзенькаўцах (Мастоўскі р-н), Батароўцы і Рыбніцы (Гродзенскі р-н). У 1939 надрукавала 1-ы верш. У пасляваенныя часы публікавала прозу, вершы, публіцыстыку. Выдала кнігі апавяданняў і аповесцяў: "Карэнне жыцця" (1973), "Дзе яно, шчасце..." (1981), "Па хісткай лесвіцы" (1983).

**Ямант Браніслаў Казіміравіч** (5.08.1886, в. Дакудава Лідскага р-на — 4.02.1957), беларускі і польскі мастак, мастацкі педагог. Доктар мастацтвазнаўства (1953). Прафесар (1937). Вучыўся ў Віленскай рысавальнай школе І. Трутнева і Г. Рыбакова, адначасова ў гімназіі, якую скончыў у 1907. У 1908-10 вывучаў права ў Пецярбургскім універсітэце. З 1910 стала жыў у Вільні (у 1918-19 — настаўнік малявання ў рэальнай школе ў Гомелі). Выязджаў (да 1939) на пленэры ў Кракаў, Крамянец, Гродна, Люблін, Львоў, на Балтыку. З 1919 працаваў у дзяржаўных установах, выкладаў у віленскіх гімназіях. Адзін з заснавальнікаў Віленскага таварыства мастакоў (1920), быў сябрам яго ўправы. У 1928-34 вучыўся з перапынкамі на мастацкім факультэце Віленскага універсітэта. З 1931 — асістэнт кафедры пейзажнага жывапісу (кіраўнік Ф. Рушчыц), з 1936 — намеснік прафесара, у 1937-39 прафесар Віленскага універсітэта. З 1946 — дэкан мастацкага факультэта і прафесар кафедры пейзажнага жывапісу і нацюрморта Торуньскага універсітэта. Пісаў у жанры пейзажа. У выставах — з 1915 (у Вільні, Варшаве, Кракаве, Львове, Познані, Бруселі, Гаазе, Амстэрдаме, Бухарэсце, Маскве, Рызе, Берліне, Сан-Францыска, Балціморы). Сярод твораў: "Матыў старой Вільні" (1909), "Стог сена на лузе" (1913), "Пейзаж з рэчкаю" (1914), "Вясковы пейзаж" (1914), "Фантастычны пейзаж" (1922), "Пейзаж з каплічкаю" (1928), "Віхура" (1929), "Старыя вербы" (1929), "Дубы" (1931), "Падворак пры вул. Татарскай у Вільні" (1931), "Жыдоўская вуліца ў Вільні" (1934), "Вятрак" (1937), "Хата сярод дрэў" (1937), "Касцёл св. Міхала ў Вільні" (1941), "Вятрак" (1940), "Заснежаны падворак" (1944), "Завулак Снапоўка ў Вільні" (1954).

**Янкоўскі Сцяпан Мікалаевіч** (1.05.1957, в. Дубна Мастоўскага р-на), беларускі мастак, мастацкі педагог. Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1989). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у Дубне (1974).

Служыў у войску (1975-77). У 1979 скончыў Бабруйскую мастацкую вучэльню №15. Працаваў мастаком на ВА "Хімвалакно" ў Гродне (1979-83). Вучыўся на аддзяленні манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1983-88). Працаваў у Гродне на камбінаце "Мастацтва" (1988-92). З 1992 выкладае на кафедры выяўленчага мастацтва Гродзенскага універсітэта. Працуе ў галіне манументальнага і станковага жывапісу. У выставах — з 1986. Сярод твораў: роспіс "Гонар зямлі Гарадзенскай" у кнігарні "Раніца" ў Гродне (1988), вітраж "Зімовы краявід" у Доме культуры ў Слоніме (1988), роспіс "Асветнікі Беларусі" у Абухаўскай СШ Гродзенскага р-на (1990) і СШ №32 г. Гродна (1992), вітражы ў бальніцы №4 (1991) і медычнай вучэльні ў Гродне (1992), роспісы на тэмы беларускага нацыянальнага адзення ў СШ №33 г. Гродна (1993), паводле народных матываў у дзіцячым садзе №74 г. Гродна (1998), "Алегорыя медыцыны" ў Гродзенскай медычнай вучэльні (1999). Сярод твораў станковага жывапісу (сюжэтна-тэматычны, пейзаж, партрэт): трыпціх "Лёс Беларусі" (1992), партрэт А. Міцкевіча (1992), "Што там, за ружовым туманам" (1994), "У краіну блакітных матылькоў" (1994), "Каложа" (1994), "Сны пра блакітных матылькоў" (1994), "Да суладдзя душы і цела" (1994), "Белыя дзьмухаўкі на чырвоным полі" (1994), "За грахі чалавечыя" (1994), "Восень" (1994), "Ружовы вечар" (1994), "Малітва" (1994), "Бабіна лета" (1994), "Бітва з крыжакамі пад Гродна" (1995), "Дарога, якая вядзе ў храм" (1996), "Анёл-ахоўнік" (1996), "Зямля продкаў" (1996), "Вясна" (1996).

**Янкоўскі Чэслаў** (у літаратуры Літвін, Ашмянчук, 9.12.1857, в. Паляны Ашмянскага р-на — 6.10.1929), польскі пісьменнік (паэт, літаратуразнавец, перакладчык), гісторык, краязнавец, журналіст. З шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію ў Мітаве (Латвія). Вучыўся на факультэце рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і філасофскім факультэце Кракаўскага універсітэта. З 1883 працаваў у газеце "Kurier Warszawski". З 1889 рэдагаваў "Kurier Codzienny". У 90-я жыў у Палянах. Жыў у Пецярбургу, супрацоўнічаў у часопісе "Kraj" (сакратар часопіса ў 1902-04). Быў дэпутатам Дзяржаўнай Думы (1906). Рэдагаваў "Kurier Wileński" (1906-08). Адначасова ў 1907 пачаў выдаваць тыднёвік "Glos Polski" — орган краёвай партыі Літвы і Беларусі (выйшла 5 нумароў). Удзельнічаў у заснаванні таварыства сяброў навук у Вільні (1907). У 1914-18 жыў то ў Вільні, то ў Варшаве. Быў літаратурным кіраўніком польскага тэатра ў Варшаве (1917-18). З 1919 стала жыў у Вільні. Супрацоўнічаў у газеце "Słowo" (з 1922). У

1920-25 — літаратурны дарадца польскага тэатра ў Вільні. Друкаваў вершы (з 1876), апавяданні, артыкулы на тэмы літаратуры (у тым ліку і беларускай), тэатра, музыкі, гісторыі, этнаграфіі, карэспандэнцыі, нарысы, пераклады з Ф. Шылера, Г. Гейнэ, Вальтэра, Ж. Беранжэ, М. Метэрлінка, С. Чэха, І. Тургенева. Выдаў кнігі твораў: "Вершы". Сшыт. І (Вільня, 1879), сшыт. 2 (Кракаў, 1881), сшыт. 3 (Варшава, 1884), "З песні Ліцвіна" (Кракаў, 1881), "Арабескі — замалёўкі прозаю" (Варшава, 1884), "Капрычыо, цыкл арабесак" (Кракаў, 1889), "З нататкаў турыста" (Варшава, 1891), "Крыху рыфмаў" (Кракаў, 1892), "Выбраная паэзія" (Варшава, 1897), літаратуразнаўчыя, краязнаўчыя, гістарычна-этнаграфічныя працы: "Постаці паэтаў" (Варшава, 1891), "Заўвагі на палях. Літаратурныя эцюды і ўражанні" (Кракаў, 1896), "Ашмянскі павет. Матэрыялы да гісторыі зямлі і людзей" Ч. 1-4 (Пецярбург, 1896-1900), "Шэсцьсот гадоў польска-прускіх адносін Г. Сянкевіча, Б. Пруса і Г. Сважэўскага" (Вільня, 1903), "На працягу двух гадоў. Да пытання пра гісторыю польскай прэсы на Літве" (Варшава, 1908), "Мужыкі" Рэйманта і нямецкая крытыка. Да пытання пра гісторыю нашай літаратуры на чужыне" (Варшава, 1914), "Польскі народ і яго айчына" (Варшава, 1914), "Этнаграфічная Польшча" (Варшава, 1914).

**Яноўскі Самуіл**, (1890, в. Матылі Шчучынскага р-на — 1935), яўрэйскі журналіст, краязнавец, бібліёграф. Скончыў у Гродне гімназію. Тут жыў. Вядомасць набыў як рэпарцёр на працэсе М. Бейліса (1913). Стала супрацоўнічаў з яўрэйскай варшаўскай газетай "Момант", куды пасылаў матэрыялы з мясцовага яўрэйскага жыцця. Імкнуўся мацаваць кантакты яўрэйскага руху з польскім дэмакратычным рухам. Прапагандаваў ідзіш. Склаў бібліяграфію яўрэйскага друку ў Польшчы. У 1924 арганізаваў выставу сваіх бібліяграфічных матэрыялаў. У 30-я жыў у Варшаве.

**Янушкевіч Пётр Вацлававіч** (18.05.1960, в. Клінчаны Гродзенскага р-на), беларускі мастак. Сябра .Беларускага Саюза мастакоў (1988). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ у в. Падліпкі Гродзенскага р-на (1977). Працаваў лабарантам у Падліпскай СШ (1977-79). Служыў у войску (1979-81). Быў бутафорам у Гродзенскім драмтэатры (1981-83). Наведваў заняткі ў студыі выяўленчага мастацтва Палаца культуры хімікаў (1975-79, 1981-83). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва) у 1988. Працаваў у дзіцячай мастацкай школе ў Гродне (1988-91), адначасова з 1988 — у камбінаце

"Мастацтва". Творчасць — у розных жанрах манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (вітраж, мазаіка, роспіс), таксама — у станковым жывапісе. У выставах — з 1986. Сярод твораў: роспіс і вітраж у дзіцячай школе мастацтваў у Шчучыне (1989), вітражы ў Гродзенскай ПТВ №41 (1989), у Доме культуры ў Ваўкавыску (1990), у Доме культуры ў Воранаве (1991), у Доме культуры пас. Фабрычны ля Гродна (1992), іканастас і мазаіка ў капліцы на старых праваслаўных могілках у Гродне (1992), вітражы ў касцёле ў в. Зарачанка Гродзенскага р-на (1993). Работы захоўваюцца ў прыватных зборах у Беларусі, Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Італіі.

**Янушкевіч Станіслаў Антонавіч** (27.10.1961, в. Клінчаны Гродзенскага р-на), беларускі мовазнавец, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1998). З сям'і рабочага. Скончыў Падліпскую СШ Гродзенскага р-на (1978). Быў ст. піянерважатым у Капцёўскай СШ Гродзенскага р-на. У 1980-82 служыў у войску. Скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака Гродзенскага універсітэта (1988). Выкладае на кафедры беларускай мовы гэтага універсітэта (у 1990-93 вучыўся тут у аспірантуры). Друкуецца як мовазнавец з 1989. Даследуе тапаніміку гродзенскага рэгіёну.

**Ярмалковіч Віктар Адамавіч** (23.12.1917, в. Юшкі Астравецкага р-на — 15.12.1997), беларускі юрыст, краязнавец. З сялянскай сям'і. Вучыўся ў гімназіі Марыянаў у Друі, дзе ўсвядоміўся як беларус. У 1935 у сувязі са смерцю бацькі пакінуў вучобу і працаваў на гаспадарцы. У 1937-38 вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі. Затым — студэнт юрыдычнага факультэта Віленскага універсітэта. Актыўна дзейнічаў у Беларускім студэнцкім саюзе, уваходзіў у рэдакцыю "Хрысціянскай думкі". Зарабляў на жыццё рэпетытарствам. У 1939 рэпрэсаваны польскімі ўладамі і пасаджаны ў Картуз-Бярозу. Выйшаў на волю пры Саветах, якія арыштоўвалі ў кастрычніку 1939. Працягваў вучобу ў Віленскім універсітэце (скончыў у 1941). Працаваў юрыстам-практыкантам у павятовым судзе ў Лідзе (1941-42), суддзёй у Шчучыне (1942-44). Летам 1944 выехаў з сям'ёй у Польшчу. Жылі ў Варшаве, пазней у Ольштыне. Працаваў у павятовай адміністрацыі. У 1945 арыштаваны, перададзены ў СССР і высланы ў канцлагер у Сібіры. Праз год атрымаў волю. У 1951 вярнуўся па радзіму. Настаўнічаў на Віленшчыне, быў дырэктарам школы. У 1953 рэпрэсаваны і зняволены ў канцлагеры ў Вятцы. Вызвалены ў 1956. У 1957 з'ехаў з сям'ёй у Польшчу. Працаваў як юрыст. Займаўся беларусазнаўствам, беларускім краязнаўствам. У рукапісе засталіся

яго шматлікія працы. Сярод іх: "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі", "Цярністы шлях Беларусі", "Крывы горад — Вільня", "Летапіс Віленскай беларускай гімназіі. 1919-1944", "З-пад віленскіх палёў", "Пазнавайма родны край", "На жыццёвых хвалях", "Ліда і лідская зямля", "Шчучынскі раён", "Іўеўскі раён" і інш.

**Ярмаловіч Марыя Арцёмаўна** (26.11.1942, мяст. Жыровічы Слонімскага р-на), беларускі педагог. Кандыдат педагагічных навук (1972). Дацэнт (1978). З сялянскай сям'і. Скончыла СШ у Жыровічах (1959). Вучылася ў Лідскім сельскагаспадарчым тэхнікуме (1959-60), які быў пераведзены ў Ашмяны (скончыла ў 1961). Працавала у Мінску інжынерам Белэлектразбыту. У 1961 паступіла на вячэрняе аддзяленне педагагічнага факультэта Мінскага педінстытута. У 1963 перавялася на стацыянар (аддзяленне дэфекталогіі) гэтага інстытута. Актыўна займалася навуковай работай, выступала на студэнцкіх навуковых канферэнцыях у Мінску, Маскве, Ленінградзе, Шаўляі. З 1966 працавала настаўніцай пачатковых класаў, лагапедам СШ №97 г. Мінска (педінстытут скончыла ў 1967). У 1969-72 — аспірантка кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання Мінскага педінстытута. У 1972-74 — ст. навуковы супрацоўнік НДІ педагогікі Міністэрства адукацыі. Адначасова ў 1972-73 выкладала на кафедры педагогікі Мінскага педінстытута замежных моваў. У 1974-83 працуе на кафедры педагогікі і псіхалогіі Беларускага інстытута фізічнай культуры. З 1983 — на кафедры агульнай і дашкольнай педагогікі Мінскага педінстытута (Беларускага педагагічнага універсітэта). Навуковыя публікацыі — у Беларусі, Расіі, Літве, Азербайджане. Выдала "Руска-беларускі слоўнік педагагічных тэрмінаў" (1992, у сааўт.), метадычныя дапаможнікі "Развіццё ў вучняў пазнавальнай і творчай актыўнасці ў вучэбна-выхаваўчым працэсе" (1994), "Дыдактыка" (1995), "Педагогіка агульная" (1995).

**Ярмусік Эдмунд Станіслававіч** (22.02.1955, в. Навасёлкі Гродзенскага р-на), беларускі гісторык, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1988). Дацэнт (1993). З сям'і рабочых саўгаса. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу, у в. Рагачы Гродзенскага р-на — 8-годку. Вучыўся ў Ваўкавыскай педагагічнай вучэльні (1970-74). Нядоўга настаўнічаў у пачатковай школе ў в. Бяляны Гродзенскага р-на. Служыў у войску (1974-76). Быў ст. піянерважатым СШ у в. Польныя Багатыры Гродзенскага р-на (1976-78), СШ №1 г. Гродна (1978-81). Затым — інструктар Гродзенскага абкама камсамола (1981-82), інструктар Ленінскага райкама КПБ

Гродна (1982-84). У 1982 завочна скончыў гістфак Гродзенскага педінстытута. Працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ №1 г. Гродна (1984-85), адказным сакратаром Гродзенскага абласнога таварыства "Веды" (1985-87). У 1987-91 і з 1994 выкладае на кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага універсітэта (у 1991-94 працаваў у навучальна-метадычным і навучальным аддзелах універсітэта). Вывучае міжнародную дзейнасць Беларусі, справы каталіцкай канфесіі Беларусі, методыку выкладання гісторыі ў ВНУ. Друкуецца з 1987. Сааўтар кніг "Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941-1945" (Гродна, 1995), "Гісторыя Беларусі. Навучальны дапаможнік па аднайменным курсе для слухачоў дауніверсітэцкай падрыхтоўкі. Ч. 3. 1928-1990-я гады" (Гродна, 1997, на рус. мове), "Гісторыя Беларусі з самых старажытных часоў да нашага часу" (Гродна, 1998, на рус. мове). Складальнік бібліяграфічных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі.

**Ярэміч Фабіян Мацвеевіч** (20.01.1891, в. Дуляўцы Ваўкаватага р-на — 29.06.1958), беларускі грамадскі і культурны дзеяч. З сялянскай сям'і. Скончыў электратэхнічную школу ў Пецярбургу. Працаваў у Вільні тэхнікам. За сацыял-дэмакратычную работу сярод тэлеграфістаў зняволены ў турме (1912). Старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні. Дэлегат Усебеларускага кангрэса (снежань 1917). Сябра прэзідыуму Беларускай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны. Сябра Рады БНР (1918). У 1919-22 — начальнік тэлефоннай станцыі ў Вільні. Дэпутат сейма Польшчы 3-х скліканняў (1922-35), старшыня Беларускага пасольскага клуба (Нацыянальнага клуба) у 1925-30. Адзін з арганізатараў Беларускага сялянскага саюза (1925), Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (1926). Выдаваў газету "Сялянская доля" (1925-30). У 1926 у складзе дэлегацыі наведаў БССР. Неаднаразова арыштоўваўся ўладамі Польшчы. У час вайны працаваў у органах адміністрацыі ў Мінску і Барысаве. Удзельнік 2-га Усебеларускага кангрэса (1944). Рэпрэсаваны і зняволены савецкімі ўладамі ў канцлагеры (1945-56). Выйшаўшы на волю, жыў у Вільні.

**Ясюкайць Антон Аляксандравіч** (1.03.1944, в. Навіянка Воранаўскага р-на), беларускі мастак (жывапісец, графік). Сябра Беларускага Саюза мастакоў (1977). З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў в. Блажаны Воранаўскага р-на (1957), СШ — у Канвелішках Воранаўскага р-на (1961). Працаваў настаўнікам малявання, чарчэння, працы, фізкультуры ў Блажанаўскай школе (1961-62). У 1962-70 вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педінстытута (у 1963-66 служыў у войску). З 1970 працуе ў

Бабруйскай вышэйшай прафесійна-тэхнічнай вучэльні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (майстрам вытворчага навучання, настаўнікам рысунку, жывапісу, кампазіцыі, у 1982-85 быў ст. майстрам мастацкага цыклу). Жанры творчасці — пейзаж, нацюрморт, сюжэтна-тэматычная кампазіцыя (акварэль, алей). У выставах — з 1967. Сярод твораў: "Вячэрняя цішыня" (1968), "Раніца ў Лучосе" (1969), "Зімовы вечар" (1969), "Вячэрнія цені" (1972), "Азёрны край. Віцебшчына" (1975), "Поле, поле..." (1979), "Чырвонае поле" (1984), "Вехі на рацэ Проня" (1985), "Лодачная станцыя на Беразіне" (1986), "Эгвекінот. Каменны мяшок" (1990), "Мой горад вясною" (1992), "Нябесная вандроўніца" (1993), "Вячэрні нацюрморт" (1994). Таксама - "Хлебнае поле", "Перад дажджом у Навіянцы", "Зорка Венера. Прысвячаецца М. Багдановічу", "Чырвоныя ракі", "Бэз на фоне вячэрняга акна", "Вытокі", "У ценю летняга вечара", серыі "Космас" (1976), "Па Югаславіі" (1980), "Мой кут" (1980), "Па Таймыры" (1983).

**Яцкевіч Мечыслаў** (26.03.1931, маёнт. Бокшышкі Іўеўскага р-на), польскі літаратуразнавец, культуролаг, перакладчык, эсэіст, публіцыст. Доктар гуманітарных навук габілітаваны (1994). Заслужаны дзеяч культуры (1973). З сям'і каваля, якая ў 1932 пакінула Бокшышкі. Жылі ў засценку Венгелішкі каля Быстрыцы (Астравецкі р-н), дзе бацька працаваў у кузні. З 1933 жылі ў Вільні. У 1943 скончыў тут пачатковую школу. Працягваў школьную вучобу ў в. Кемялішкі (Астравецкі р-н), дзе жыла сям'я. Пасля вайны вучыўся ў сярэдняй педагагічнай школе ў мяст. Тракай (Літва). У 1951 пачаў настаўнічаць у Кемялішках. Служыў у войску (1951-54). Затым настаўнічаў у Міцкунах (Літва). У 1956 сям'я пераехала ў Польшчу. Быў кіраўніком 7-годкі ў Заф'ёўцы Люблінскага павета, дырэктарам Дома дзіцяці ў Ольштынку каля Ольштына. Скончыў настаўніцкі інстытут у Крэшавічах (1961), філалагічны факультэт (аддзяленне рускай філалогіі) універсітэта ў Варшаве (1966). Працаваў сакратаром Галоўнай управы грамадска-культурнага Таварыства "Паазер'е" ў Ольштыне (1969-73). З 1973 — на кафедры рускай філалогіі (у 1979-81 — загадчыкам кафедры) Вышэйшай педагагічнай школы у Ольштыне. З 1988 працаваў на кафедры літоўскай філалогіі Пазнанскага універсітэта. З 1998 — генеральны консул Польшчы ў Літве. Друкуецца з 1969. Аўтар артыкулаў, рэцэнзій, эсэ на тэмы рускай і літоўскай літаратур і іх сувязяў з польскай літаратурай, пра пастаноўкі п'ес рускіх пісьменнікаў на польскай сцэне, пра асвету, друк, музыку. Надрукаваў пераклады прозы і вершаў, склаў анталогіі рускіх і літоўскіх пісьменнікаў. Выдаў кнігі "Грамадска-культурнае

Таварыства "Паазер'е". XXX гадоў дзейнасці. 1956-1986" (Ольштын, 1986), "Віленская Роса. Даведнік пра могілкі" (Ольштын, 1993), "Польская літаратура ў Літве XVI-XX стагоддзяў" (Ольштын, 1993).

**Яцэвіч Мікалай Аляксандравіч** (17.08.1955, в. Сімакава Карэліцкага р-на), беларускі бібліятэказнавец, педагог. Кандыдат педагагічных навук (1985). Дацэнт (1992). З сялянскай сям'і. Скончыў 8-годку ў Сімакаве, СШ — у мяст. Мір Карэліцкага р-на. Вучыўся ў Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме (1972-74), у Мінскім педагагічным інстытуце, на факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, на базе якога створаны (1975) Мінскі інстытут культуры. Скончыў гэты інстытут у 1978, працаваў бібліятэкарам і выкладчыкам-сумяшчальнікам на кафедры тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі ў інстытуце культуры (1978-82). Вучыўся ў аспірантуры на кафедры інфарматыкі і тэхнічных сродкаў Ленінградскага інстытута культуры (1982-85). З 1986 выкладае на кафедры агульнай бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры. У 1992-95 выконваў абавязкі загадчыка кафедры інфарматыкі і тэхнічных сродкаў. З 1995 — загадчык кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры. Друкуецца з 1979. Даследуе праблемы бібліятэчнай інфармацыі, інфармацыйна-бібліятэчнага маркетынгу.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

Даведачнае выданне

Пяткевіч Аляксей Міхайлавіч

Людзі культуры з Гродзеншчыны
Даведнік

Рэдактар С.У.Словік Камп'ютэрная вёрстка: А.К.Лаўніковіч
Здадзена ў набор 10.08.2000. Падпісана да друку 06.09.2000.
Фармат 60x84/16. Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура Таймс.
Ум.друк.арк. 20,69. Ум.выд.арк. 19,58. Тыраж 600 экз. Заказ. 2515.
Падатковая льгота — Агульнадзяржаўны класіфікатар
Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-98, ч. I, 22.11.31.000.
Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы. Л В № 96 ад
02.12.97 г. Бул. Ажэшкі, 22, 230023, Гродна.
Надрукавана на Гродзенскім абласным унітарным
паліграфічным прадпрыемстве "Гродзенская друкарня"
Л П № 46 ад 30.10.97 г. Бул. Паліграфістаў, 2, 230019, Гродна.